# ГІСТОРЫЯ РАСІІ

## ад Сярэднявечча да сучаснасці

Нарысы



# ГІСТОРЫЯ РАСІІ
## ад Сярэднявечча да сучаснасці

*Нарысы*

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2018

УДК 94(47+57)
ББК 63.3(2)
Г51

Укладальнік *Лявон Баршчэўскі*

Рэдакцыйна-аўтарскі калектыў:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Алег Трусаў*,
кандыдат філалагічных навук *Лявон Баршчэўскі*,
кандыдат мастацтвазнаўства *Аляксей Хадыка*.

Рэцэнзенты

доктар гістарычных навук, прафесар *Аляксандр Краўцэвіч*,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Павел Церашковіч*.

Крыніцы ілюстрацый:

Карамзин, Н. М. Живописный Карамзин, или Русская история в картинах, издаваемая Андреем Прево: ч. 1–3. С.-Петерб.: тип. Х. Гинце; тип. Эдуарда Праца, 1836–1844; Сарабьянов, В. Д., Смирнова, Э. С. История древнерусской живописи. Москва: ПСТГУ, 2007; Wikimedia Commons; фота аўтараў і інш.

**ISBN 978-985-23-0012-4**

© Трусаў А. А., Баршчэўскі Л. П., Хадыка А. Ю., 2018.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2018.

# 1. ПАЧАТКІ РАСІЙСКАЙ ГІСТОРЫІ

***1.1. Уводзіны.*** Пісаць гісторыю любой імперыі досыць цяжка, бо аўтар сутыкаецца з рознымі міфамі, якія стагоддзямі трывала ляжалі ў падмурку светапогляду большасці насельніцтва імперыі. Расія не з'яўляецца выняткам, пагатоў цяпер назіраецца чарговы ўздым хвалі імперскай ідэалогіі.

Таму ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі мы зрабілі спробу выкласці гісторыю Расіі па-беларуску і з беларускага гледзішча на працэсы гістарычнага развіцця нашага ўсходняга суседа.

У нашай кнізе шмат імён і прозвішчаў. Чытачу няма неабходнасці запамінаць іх усе. Але мы цудоўна разумеем, што любую гісторыю робяць асобы. І гэта не толькі кіраўнікі дзяржавы ды палкаводцы, але і выбітныя грамадскія дзеячы, навукоўцы, пісьменнікі, мастакі, архітэктары, скульптары, кампазітары, акторы, а таксама і тыя звычайныя людзі, якія, напрыклад, пакінулі нашчадкам свае неацэнныя ўспаміны пра ўласныя трыумфы і пакуты.

Асноўныя паняцці і тэрміны з расійскай гісторыі, спісы рэкамендаванай літаратуры, якія падаюцца намі ў канцы кожнага раздзела, павінны разглядацца як дадатак да асноўнага тэксту кнігі.

***1.2. Пачаткі гісторыі велікарускага народа.*** Фактычна гісторыя Расіі і сучаснага велікарускага народа пачынаецца з XII ст., калі ён пачаў складацца на тэрыторыі Уладзіміра-Суздальскага княства. Менавіта тут, на землях, якія насялялі фіна-угры, балты і славяне-вяцічы, у 1147 г., паводле версіі Іпацьеўскага летапісу (іншыя найбольш старадаўнія летапісы пра гэта не згадваюць), адзін з князёў вышэйзгаданай усходнеславянскай дзяржавы Юрый Далгарукі і заснаваў горад *Маскву*, будучую сталіцу Расійскай дзяржавы.

Гісторыю славянскага элемента будучага велікарускага народа можна пачаць са з'яўлення згадак пра славян у розных аўтараў. Шэраг

*Рассяленне славян і іх суседзяў у I тыс. да н. э. (паводле В. Хэнсаля)*




Крыніца: Labuda, G. Słowiańszczyzna starożytna i wczesnośredniowieczna. Antologia tekstów źródłowych. Poznań: PTPN&SORUS, 1999, s. 18

***Умоўныя пазнакі на карце:*** 1 – праславянскія плямёны; 2 – протагерманскія плямёны; 3 – пратакельцкія плямёны; 4 – венета-ілірыйскія плямёны; 5 – протафракійскія плямёны; 6 – пратабалцкія плямёны; 7 – пратаўгра-фінскія плямёны; *зоны ўзаемапранікнення плямён*: 8 – праславянскіх і протагерманскіх; 9 – праславянскіх і пратакельцкіх; 10 – праславянскіх і венета-ілірыйскіх; 11 – праславянскіх і протафракійскіх; 12 – праславянскіх і пратабалтыйскіх; 13 – праславянскіх і пратаугра-фінскіх; 14 – мяжа гіпатэтычнага ядра балтаславянскай племяннной супольнасці каля 2000 г. да н. э.

даследчыкаў лічыць, што праславянскія плямёны яшчэ ў I тыс. да н. э. засялялі некаторыя тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Польскі археолаг Вітальд Хэнсаль у 1984 г. апублікаваў карту, якая адлюстроўвае рассяленне праславян і іх суседзяў у той далёкі ад нас час (*гл. вышэй*).

У пісьмовых крыніцах славяне пачынаюць згадвацца ўжо з VI ст. н. э., хутчэй за ўсё, як *склавіны*, або *склавы*. Аўтары VI ст. лічылі іх сваякамі *антаў* і пісалі, што славяне жылі на левым беразе Ніжняга Дуная і далей на поўнач да вярхоўя Віслы.

У часы Юстыніяна I славяне пачалі свае набегі на балканскія правінцыі Візантыі. Некаторыя з іх служылі ў візантыйскім войску. У другой палове VI ст. частка славян была заваявана *аварамі*.

З VII ст. славяне вядомыя на паўднёвым беразе Балтыйскага мора, на Эльбе, каля Альпаў і на Балканах. Пэўную частку славян у 688 г. імператар Візантыі Юстыніян II перасяліў у Малую Азію. У VII ст. фарміруюцца першыя дзяржаўныя ўтварэнні: сярод іх, напрыклад, група славянскіх плямён на чале з франконскім купцом Са́ма ўтварыла *дзяржаву Сама*, якая паспяхова ваявала з аварамі.

Пасля 670 г. частка славян з Ніжняга Дуная ўвайшла ў склад Балгарскага царства. Некаторыя славянскія плямёны ад 730-х гадоў плацілі даніну хазарам. Пры канцы VIII – на пачатку IX ст. славяне стварылі магутную дзяржаву – *Вялікую Маравію*, з якой звязана дзейнасць прапаведнікаў і першых перакладчыкаў Бібліі на славянскую (старамакедонскую) мову Кірыла і Мяфодзія.

Паступова славянскія плямёны занялі значныя тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і падзяліліся на паўднёвых, заходніх і ўсходніх славян.

***1.3. Усходнія славяне ў VII–VIII стст.*** У VII ст. пачалося вялікае рассяленне славян на землях балтаў і фіна-уграў. Славяне рухаліся па берагах вялікіх рэк, сяліліся там і як вынік – асімілявалі мясцовае насельніцтва. Перайшоўшы цераз Прыпяць, славянскія плямёны накіраваліся ўверх па Дняпры і па цячэнні Дзвіны ў напрамку да Балтыйскага мора. Самым вялікім і моцным племенем, нават племянным саюзам, былі *крывічы*. Першая хваля крывічоў заняла цэнтральную і паўночную Беларусь і разам з мясцовымі балтамі стварыла *археалагічную культуру доўгіх курганоў*. Доўгія курганы – гэта месца пахавання вялікай патрыярхальнай сям'і. Кожны курган мае некалькі пахаванняў. Пры раскопках такіх курганоў акрамя славянскіх рэчаў знаходзяць і балцкія, што сведчыць аб змяшаным насельніцтве адпаведных тэрыторый. Другая хваля крывічоў у VIII–IX стст. заняла ўсё Верхняе Падняпроўе, басейн Заходняй Дзвіны і нават дасягнула Верхняй Волгі (раён Цвяры) і Чудскага возера. Паўднёвую частку Беларусі засялілі *дрыгавічы*. У VIII ст. на тэрыторыю Беларусі з Захаду (сучасная Польшча) прыйшлі *радзімічы*. Яны рассяліліся ў басейне ракі

Сож. Іх пахавальны абрад вельмі адрозніваўся ад суседзяў, бо яны не мелі курганоў, а попел нябожчыкаў з рэчамі клалі ў гліняныя гаршкі (урны) і ставілі іх, як сведчыць летапісец, на прыдарожных слупах. Побач з радзімічамі жылі *северане* (басейн ракі Дзісны). На поўдні Беларусі недалёка ад паселішчаў дрыгавічоў жылі *валыняне* і *драўляне*.

На тэрыторыі Цэнтральнай Украіны жылі *паляне*, якія мелі беспасярэднія кантакты з качэўнікамі, а на фіна-ўгорскіх землях з'явіліся *ільменскія славяне*, якія прыйшлі разам з радзімічамі з тэрыторыі Польшчы.

Менавіта вяцічы (назва племені, хутчэй за ўсё, паходзіць ад імя родапачынальніка – *Вяткі*) сталі продкамі значнай часткі сённяшніх *велікаросаў* і занялі тэрыторыю сучаснай Маскоўскай, Калужскай, Тульскай, Арлоўскай і іншых суседніх абласцей сучаснай Цэнтральнай Расіі. Паводле археалагічных звестак, яны прыйшлі з тэрыторыі левага берага Дняпра і, магчыма, з вярхоўя Днястра (а яшчэ раней – з басейна Віслы). У VIII ст. вяцічы занялі басейн ракі Акі і плацілі даніну Хазарыі.

Варта адзначыць, што вяцічы спачатку не ўваходзілі ў склад Кіеўскай Русі і, наогул, варожа ставіліся да кіеўскіх князёў. Першы раз яны мусілі плаціць даніну князю Святаславу, аднак неўзабаве ад гэтага адмовіліся. У 981 г. князь Уладзімір перамог вяцічаў і зноў прымусіў іх выплачваць даніну, але праз год вяцічы яшчэ раз паўсталі і да канца XI ст. захоўвалі пэўную палітычную незалежнасць. Паселішча вяцічаў археолагі знайшлі і на тэрыторыі сучаснага Маскоўскага Крамля.

Першапачаткова іх жытлом былі зямлянкі (4×4 м), абкладзеныя знутры дрэвам. Над зямлёю былі драўляныя сцены з двухсхільным дахам. Пазней з'явіліся зрубавыя хаты, часам двухпавярховыя, аздобленыя драўлянай разьбой.

Займаліся вяцічы паляваннем, земляробствам, жывёлагадоўляй і бортніцтвам. Доўгі час яны былі язычнікамі і не прымалі хрысціянства. Так, на пачатку XII ст. яны забілі хрысціянскага місіянера Кукшу Пячорскага. Этнічнай рысай культуры вяцічаў лічацца сямілопасцевыя жаночыя скроневыя колцы, а таксама шыйныя грыўні. У басейне Масквы-ракі ёсць шмат курганных могільнікаў вяцічаў з абрадам крэмацыі.

У VIII ст. усе ўсходнеславянскія плямёны мелі шчыльныя кантакты з варагамі і разам з імі рабілі ваенныя набегі на Візантыю. У сярэдзіне IX ст. варажскія *конунгі* (князі) рознымі шляхамі прыйшлі да ўлады ў першых усходнеславянскіх гарадах: Ладазе, Ноўгарадзе, Полацку, Тураве, Белавозеры, Растове, а крыху пазней – у Кіеве.

Славяне прынеслі з сабою навыкі ляднага і ворнага земляробства і жывёлагадоўлі. Яны таксама актыўна займаліся паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам, кавальскай справай і здабычай жалеза. Будучы язычнікамі, яны сваіх памерлых спальвалі на вогнішчы, а іх парэшткі хавалі ў курганах. Кожны саюз плямён меў свае этнічныя прыкметы, якія выразна выяўлялі сябе ў элементах жаночага адзення і ўпрыгожанняў. Дзеля пакланення шматлікім багам славяне мелі адпаведныя месцы – свяцілішчы, ці капішчы: там гарэў свяшчэнны агонь і прыносіліся ахвяры. Кіравалі рытуальнымі абрадамі спецыяльныя людзі – *вешчуны*.

***1.4. Крыніцы сярэднявечнай гісторыі.*** Для вывучэння гісторыі Расіі вельмі каштоўнымі з'яўляюцца *археалагічныя крыніцы*. Найбольш значную працу па выяўленні каштоўных помнікаў матэрыяльнай культуры народаў, якія насяляюць сучасную Расію, правялі археолагі Іван Забелін, Васілій Радлаў, Аляксандр Берцье-Дэлагард, Аляксей Увараў, Аляксандр Андрыянаў, Міхаіл Артамонаў, Мікалай Аўэрбах, Уладзімір Аборын, Марыя Абрамава, Данііл Аўдусін, Леанід Аляксееў, Георгій Аўраменка, Ота Бадэр, Дзмітрый Беразавец, Аляксандр Брусаў, Канстанцін Грыневіч, Васіль Даўжанок, Павел Дзмітрыеў, Лідзія Еўцюхова, Барыс Жукаў, Барыс Латынін, Іван Ляпушкін, Ніяз Мажытаў, Аляксандр Мілер, Мікалай Мерперт, Павел Рапапорт, Барыс Рыбакоў, Алена Рыдзеўская, Мікалай Рэпнікаў, Аляксандр Спіцын, Валянцін Сядоў, Міхаіл Таліцкі, Пётр Траццякоў, Валерый Чарняцоў, Якаў Шэр, Гарун Юсупаў, Валянцін Янін ды інш. Трэба мець на ўвазе, што сярод названых даследчыкаў ёсць і тыя, хто зрабіў адкрыцці ў галіне *палеаграфіі*.

*Пісьмовыя крыніцы* маюць велізарнае значэнне ў гістарычных даследаваннях – асабліва даследаваннях палітычнай і ваеннай гісторыі, гісторыі культуры розных краін і народаў. Для тых, хто займаецца гісторыяй усходніх славян, асабліва важнае вывучэнне *летапісаў*.

Расійскія, беларускія і ўкраінскія навукоўцы на працягу больш як 160 гадоў падрыхтавалі і выдалі *Поўны збор рускіх летапісаў*, з якога выйшлі 43 тамы (некаторыя перавыдаваліся па некалькі разоў).

«*Аповесць мінулых летаў*» (*царкоўна-сл.* «Повѣсть врѣмянныхъ лѣтъ», далей: ПВЛ) – самая важная крыніца па гісторыі Старажытнай Русі і, бадай, самая супярэчлівая. Некаторыя даследчыкі прапануюць ставіцца да яе як да зборніка легендаў і паданняў, іншыя працягваюць вывучаць, знаходзячы новыя факты з гісторыі Русі, трэція (збольшага археолагі) спрабуюць звязаць тапаграфічную і этнанімічную інфармацыю з «Аповесці» з вынікамі археалагічных пошукаў, але гэта далёка не заўсёды атрымліваецца зрабіць. Актуальным пытаннем застаецца праблема суаднясення ПВЛ з шэрагам іншых гістарычных крыніц.

«Аповесць мінулых летаў» мае свае сляды практычна ва ўсіх вядомых сёння навуцы летапісных зводах. Яна стваралася на мяжы XI–XII стст. і мае кампілятыўны характар. ПВЛ складаецца з дзвюх частак. Першая – касмаганічная – апісвае станаўленне «рускага народа» і «рускай» дзяржавы, выводзячы іх генеалогію ад Ноя і яго сыноў. Складаючы першую частку ПВЛ, летапісец апіраўся галоўным чынам на добра вядомую візантыйскую «Хроніку» Георгія Амартола, складзеную ў IX ст. і дапісаную ў сярэдзіне X ст. нейкім Сімяонам Лагафетам. У першай частцы няма ані дат, ані фактаў: яна больш легендарная, былінна-міфічная, і служыць пэўнай мэце – тлумачэнню і замацаванню незалежнасці незадоўга перад гэтым заснаванай рускай праваслаўнай царквы. Гэта досыць лагічна, бо аўтар аповесці – манах Кіева-Пячэрскага манастыра Нестар. Адпаведным чынам, ён тлумачыць гісторыю Русі зыходзячы з хрысціянскай парадыгмы.

Аб фарміраванні славян як этнасу мы даведваемся не з гэтай крыніцы, якая ў першых радках паведамляе нам, што будзе распавядаць пра тое, «адкуль ёсць пайшла руская зямля», а, хутчэй, з хронікі гота Ярдана, які жыў у VI ст. н. э. Дзіўным выглядае тое, што Нестару пра гэтага Ярдана нічога невядома. Прынамсі, ніякіх запазычанняў або суаднясенняў з гэтай хронікай у тэксце ПВЛ няма. Некаторыя даследчыкі таксама адзначаюць пэўныя відавочныя «цёмныя месцы» Нестаравага летапісу. Напрыклад, пад 1037 годам у ім раптам гаворыцца пра тое, што князь Яраслаў Мудры… заснаваў горад Кіеў.

Пры канцы тэксту выяўляецца, дарэчы, што ПВЛ напісаны зусім не манахам Нестарам, а ігуменам Міхайлаўскага манастыра ў Кіеве нейкім Сільвестрам. Гісторыкі высветлілі, што гэты самы Сільвестр жыў ужо за часамі князя Уладзіміра Манамаха – г. зн. больш як праз 200 гадоў пасля таго, як Нестар памёр.

Сучасныя гісторыкі найчасцей прапануюць разглядаць «Аповесць мінулых летаў» менавіта як аповесць – г. зн. літаратурны жанр, а як да гістарычнай крыніцы ставіцца да яе крытычна, з пэўнай дыстанцыяй.

Іншымі аўтарытэтнымі крыніцамі па сярэднявечнай гісторыі Русі лічацца, у прыватнасці, *Іпацьеўскі летапіс*, *Лаўрэнцьеўскі летапіс*, *Першы Наўгародскі летапіс*, *Радзівілаўскі летапіс*, *Цвярскі летапіс*. Трэба адзначыць, што згаданая намі ПВЛ дайшла да нас у складзе Лаўрэнцьеўскага, Іпацьеўскага і Радзівілаўскага летапісаў.

Лаўрэнцьеўскі летапісны звод быў створаны ўжо ў XIV ст. пэўным манахам Лаўрэнціем на замову вялікага князя суздальска-ніжагародскага Дзмітрыя Канстанцінавіча, але першапачатковы тэкст мог быць складзены пры ўладзімірска-цвярскім князю Міхаіле Яраслававічу ў першыя гады існавання Залатой Арды. Тэкст летапісу даведзены да 1305 г. і мае ў сабе шэраг супярэчнасцяў у аповедах пра тыя самыя падзеі.

У Іпацьеўскі летапіс, з якога сёння вядомыя сем розных спісаў, увайшлі таксама *Кіеўскі летапіс*, у якім апавядаецца пра падзеі ад 1119 да 1200 г.; *Галіцка-Валынскі летапіс* (1201–1292). Даследчыкі бачаць у тэксце Іпацьеўскага летапісу шэраг пазнейшых дадаткаў, якія істотна змянілі тэкст дакумента.

Першы Наўгародскі летапіс – найстаражытнейшы летапіс Наўгародскай зямлі. У двух зводах дакумента гаворка ідзе не толькі пра мясцовыя падзеі, пачынаючы з X ст., але і пра падзеі, што адбываліся на іншых усходнеславянскіх і суседніх з імі землях.

Радзівілаўскі летапіс, які вылучаецца не толькі падрабязным тэкстам, але і шматлікімі (больш за 600) каляровымі малюнкамі-ілюстрацыямі, да XVII ст. належаў літоўска-беларускім магнатам Радзівілам, потым патрапіў у прускі Кёнігсберг, адкуль у якасці ваеннага трафея быў вывезены ў Санкт-Пецярбург.

У названых ды іншых летапісах утрымліваюцца сапраўды каштоўныя звесткі пра гісторыю земляў сучаснай Расіі, а таксама

суседніх краін, але, на жаль, не ўсе гэтыя летапісы дайшлі да нас у поўным, нескажоным выглядзе. «Рэдагаванне» версій расійскай гісторыі адбылося падчас уладарання імператрыцы Кацярыны II пры канцы XVIII ст. і прадоўжылася пры пазнейшых імператарах. Імператрыца асабіста займалася складзенай для яе «Гісторыяй Расіі», сама пільна вывучала пры гэтым гістарычныя дакументы, аддаючы распараджэнні, магчыма, і на знішчэнне пэўных крыніц ды напісанне фальшывак. Неабходнасць глабальнай фальсіфікацыі гісторыі менавіта ў гэты час вызначалася захопам Вялікага Княства Літоўскага і Заходняй Русі (Украіны) у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. Сярод палітычных задач такіх дзеянняў імператрыцы бачацца наступныя:

1) любым спосабам абгрунтаваць набыццё гэтых, чужых для Расіі, тэрыторый;

2) дзеля задушэння нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларусаў і ўкраінцаў прыдумаць міф пра тое, што яны нібыта заўсёды марылі апынуцца пад уладай Расіі.

Трэба зазначыць, што яшчэ да прыходу да ўлады Кацярыны II у Расіі былі створаны фундаментальныя гістарычныя працы, сярод якіх найбольш значнае месца займала «Гісторыя Расіі з найстаражытнейшых часоў», напісаная расійскім гісторыкам, географам і дзяржаўным дзеячам Васіліем Тацішчавым. Сучасныя гісторыкі адзначаюць, што Тацішчаў мог мець доступ да летапісных крыніц (у тым ліку да загадкава страчанага Полацкага летапісу), якія яшчэ не трапілі на царскія вочы.

Цікавай крыніцай вывучэння штодзённага жыцця і побыту жыхароў сярэднявечных усходнеславянскіх, у тым ліку цяперашніх расійскіх, земляў з'яўляюцца *берасцяныя граматы*. Найбольш такіх грамат на сённяшні дзень знойдзена ў Вялікім Ноўгарадзе, значна меншая колькасць – у Старой Русе, Таржку, Смаленску, Пскове, адзінкі – у іншых гарадах.

Да іншых пісьмовых крыніц расійскай сярэднявечнай гісторыі належаць помнікі *дзелавой пісьмовасці*, якіх захавалася не так шмат: так, з усяго XII ст. нам вядомыя сёння толькі восем такіх актаў. Для рэканструкцыі мінулага могуць быць выкарыстаны таксама рознага кшталту ілюстрацыйны матэрыял, помнікі фальклору і мастацкай літаратуры.

# 2. КІЕЎСКАЯ РУСЬ І СУЧАСНАЯ РАСІЯ

***2.1. Узнікненне Кіеўскай Русі.*** У VIII і асабліва ў IX ст. у жыцці ўсходніх славян адбываюцца істотныя змены: гісторыкі вядуць гаворку пра гэтак званы варажскі ўплыў. Варагі, на думку шэрагу аўтараў, паспрыялі завяршэнню працэсу фарміравання першых дзяржаўных утварэнняў усходніх славян – княстваў, дапамаглі стварыць з дапамогай сваіх лідараў-конунгаў і іх баявых дружын апарат княжацкай улады, які адпавядаў тагачасным умовам.

На пачатку IX ст. землі ўсходніх славян і іх суседзяў балтаў і фіна-ўграў залежалі ад трох моцных палітычных і эканамічных уплываў. Паўднёвыя і ўсходнія тэрыторыі (у тым ліку і беларускае Пасожжа) былі даннікамі *Хазарскага каганата*, а таксама знаходзіліся ў залежнасці ад Візантыі, якая валодала паўднёвым Крымам. Паўночныя і заходнія землі ўсходніх славян трапілі ў зону палітычных інтарэсаў варагаў (нарманаў). Баявыя атрады славян на чале з нарманскімі дружынамі пачалі называцца «русамі» або «руссю» і рабіць набегі на Візантыю.

Пачаткам утварэння будучай дзяржавы – Кіеўскай Русі – лічаць *862 год,* калі два славянскія плямені, ільменскія славяне і паўночныя крывічы, а таксама два фінскія плямені, *чудзь* і *весь*, запрасілі варага ў якасці свайго кіраўніка. На гэтае запрашэнне з-за мора ў горад *Старую Ладагу* з дружынай прыбыў паўлегендарны конунг (князь) *Рурык*, які пазней перабраўся ў Ноўгарад. Ён зрабіўся правадыром ільменскіх славян, часткі крывічоў, весі і чудзі, а пазней далучыў да Ноўгарада фінскія плямёны *меру* і *мураму*. Ён жа заснаваў *дынастыю Рурыкавічаў*, якая, паводле сцвярджэння расійскіх гісторыкаў, «кіравала Расіяй» з 862 па 1598 г. Рурык стаяў на чале Наўгародскага княства з 862 па 879 г. Пахаваны на беразе Ладажскага возера (ваколіцы горада Прыазёрска цяперашняй Ленінградскай вобласці).



*Б. Чорыкаў*. Рурык, Трувар і Сінеус прымаюць славянскіх паслоў, якія запрасілі іх на княжанне



*Б. Чорыкаў*. Ахвярапрынашэнне Рурыка. 862 г.

У цяперашні час Ладага (Старая Ладага) лічыцца самым старажытным гарадскім паселішчам Расіі, заснаваным, паводле археалагічных звестак, да 753 г. Раскопкі паказалі, што Ладага была заснавана скандынавамі – магчыма, жыхарамі вострава Готланда. У 760-х гг. паселішча было разбурана славянамі, якія прыйшлі сюды пазней за варагаў і пасяліліся на гэтым месцы. У 830-х гг. Ладагу захапілі варагі пад кіраўніцтвам конунга свеяў *Эйрыка*. Ладага стала буйным цэнтрам гандлю і рамёстваў. Тут выраблялася шкляныя пацеркі, якія выконвалі функцыю грошай. Да 786 г. адносіцца першы скарб арабскіх дырхемаў. У 780-х гг. Ладага атрымала першыя ўмацаванні і стала горадам, куды ў 862 г. і прыехаў Рурык. Цяпер існуе версія, што Ладага – першая сталіца Русі, дзе княжыў Рурык з 862 па 864 г.

У 2003 г. сучасная Расія афіцыйна святкавала 1250-годдзе Старой Ладагі як «старажытнай сталіцы Паўночнай Русі».

Большасць сучасных расійскіх гісторыкаў лічыць 862 год пунктам адліку расійскай дзяржаўнасці, хоць да гэтага сцвярджэння можна ставіцца вельмі крытычна. Цікава, што горад Полацк вядомы таксама з 862 г., але ў дзяржаву Рурыка ён не ўваходзіў і меў уласнага князя. Такім чынам,

і мы, як і нашы суседзі, можам лічыць 862 год пунктам адліку нашай беларускай дзяржаўнасці, бо Полацкае княства часова ўвайшло ў Кіеўскую дзяржаву толькі пры канцы X ст.

Трэба адзначыць, што ў IX ст. племянны саюз крывічоў ужо быў падзелены на тры вялікія групы: *полацкія* крывічы (палачане), *смаленскія* крывічы і *пскоўскія* крывічы. Як мяркуецца, Рурыка запрашалі на княжанне да сябе толькі пскоўскія крывічы, сябры і саюзнікі ільменскіх славян (Ноўгарада). Полацкія і смаленскія крывічы ў дзяржаву Рурыка ніколі не ўваходзілі.

У расійскай гісторыі існуюць некалькі версій стварэння Рускай дзяржавы, звязанай з прыходам на княжанне Рурыка. У XVIII ст. з дапамогай нямецкіх навукоўцаў, якія працавалі ў Расіі, створана *нарманская* тэорыя. Паводле яе, Руская (старажытнаруская) дзяржава была заснавана варагамі, або нарманамі. Словам *ruotsi* фінскія плямёны называлі воінаў-весляроў на скандынаўскіх ладдзях. Менавіта такія адмыслоўцы стваралі баявыя дружыны вікінгаў (варагаў). Гэтая версія паходжання назвы «русь» на сёння лічыцца найбольш верагоднай.

З XVIII ст. існавалі і вучоныя-*антынарманісты* на чале з Міхайлам Ламаносавым, якія сцвярджалі, што славяне самі стварылі сваю дзяржаву, а варагі вялікай ролі тут не адыгрывалі. У СССР, у часы Сталіна, у сярэдзіне XX ст., была распрацаваная канцэпцыя існавання асобнай «старажытнарускай» народнасці, якая жыла ў дзяржаве з назвай «Старажытная, або «Кіеўская», Русь». Галоўным прыхільнікам антынарманскай тэорыі ў СССР быў згаданы намі савецкі археолаг, акадэмік Барыс Рыбакоў, які, дарэчы, сваю навуковую кар'еру пачынаў у Беларусі. Сучасны расійскі гісторык Віктар Паранін вылучыў новую, «карэльскую» тэорыю паходжання Кіеўскай Русі. Ён лічыць, што першая дзяржава ўсходніх славян у VI–VIII стст. існавала на тэрыторыі Карэльскага перашыйка (на поўнач ад Санкт-Пецярбурга). На яго думку, гэтае месца і ёсць востраў *Рус*, які згадваецца ў візантыйскіх, арабскіх і іншых пісьмовых крыніцах. Сталіцай гэтага дзяржаўнага ўтварэння была *Старая Ладага*, дзе і жыў яго правадыр *(хакан)*. Менавіта сюды і прыйшоў легендарны Рурык. Адначасова з дзяржавай Рурыка і Полацкай дзяржавай у 30–40-х гг. IX ст. існавала таксама дзяржава палян на Сярэднім Дняпры са сталіцай у Кіеве. Паводле

адной з гістарычных версій, Кіеў быў на той час цэнтрам Хазарскага каганата і меў назву *Самватас*. Вядомыя два князі-варагі, якія ў 864 г. захапілі Кіеў. Іх звалі Аскольд і Дзір. Паміж Ноўгарадам і Кіевам узнік канфлікт за магчымасць кантраляваць гандлёвы шлях з варагаў у грэкі. На гэтым шляху было яшчэ адно княства крывічоў – *Смаленскае*. У IX ст. тут узнікаюць першыя гарадскія паселішчы. Гэта *Гнездава* на Дняпры, а пазней і Смаленск (12 км на ўсход ад Гнездава). Некаторыя даследчыкі лічаць, што насельнікі Гнездава якраз і перасяліліся пазней на месца Смаленска. Вакол Гнездава знаходзіцца вялізны курганны могільнік. Раскопкі выявілі ўнікальныя ўпрыгожанні, што належалі славянам, варагам і фіна-ўграм. Аднак на пачатку IX ст. значная частка жыхароў пакідае Гнездава, і на першае месца выходзіць Смаленск, які ўпершыню згадваецца ў летапісе пад 863 г. У тым самым годзе князі Аскольд і Дзір спрабавалі захапіць Смаленск, але не здолелі гэта зрабіць.

Пасля смерці Рурыка ў 879 г. кіраваць Ноўгарадам пачаў яго сваяк Алег, які быў апекуном малога сына Рурыка – Ігара. У 882 г. ён захапіў Смаленск, потым падманам авалодаў Кіевам, а кіеўскіх князёў пазабіваў. Такім чынам, у яго руках знаходзіўся ўвесь шлях з варагаў у грэкі, а дакладней яго дняпроўская частка. Потым Алег прымусіў драўлян і севяран плаціць яму даніну і вызваліў беларускае племя радзімічаў ад хазарскай даніны. Так пад яго кіраўніцтвам у Еўропе ўзнікла новая вялікая дзяржава, якая пазней у гістарычнай навуцы атрымала назву *Кіеўская Русь*. Напачатку ў яе ўваходзілі кіеўскія, смаленскія і наўгародскія тэрыторыі, якія насялялі саюзы плямёнаў.

Сучасныя ўкраінскія гісторыкі, між іншым, лічаць Кіеўскую Русь сваёй, а не Рускай (Расійскай) дзяржавай, а яе заснавальніка Рурыка – не абавязкова варагам, а, магчыма, і заходнім славянінам (венедам). Родавы знак (татэм) Рурыка, выява сокала, які пáдае на сваю здабычу, – сёння дзяржаўны сімвал Украіны і выглядае як трызубец. Ёсць падставы разглядаць Кіеў у якасці месца канчатковага ўмацавання дынастыі Рурыкавічаў, якая пазней падпарадкуе сабе ўласна расійскія землі.

Так ці інакш, гісторыя Кіеўскай Русі мае толькі апасродкаванае дачыненне да гісторыі сучаснай Расіі, а Уладзіміра-Суздальская і Маскоўская Русь шмат у чым належаць да іншай дзяржаватворчай традыцыі.

***2.2. Кіеўская Русь у X–XI стст.*** У 907 г. Алег, сабраўшы вялікае войска (каля 80 тыс. з розных славянскіх і фінскіх плямён), пайшоў на Канстанцінопаль, які славяне называлі *Царградам*. Візантыя, каб заключыць мір, мусіла заплаціць вялікую кантрыбуцыю: 12 грыўняў на кожнага ваяра і даніну князям-васалам Алега. Наступная дамова была заключана ў 911 г.: згодна з ёй кіеўскія купцы атрымалі права гандляваць у Візантыі.

Другі паход Алега быў накіраваны на Усход. У 909–910 гг. кіеўскае войска на 500 караблях паднялося ўверх па Доне, потым праз волак трапіла спачатку ў Волгу, а пасля і ў Каспійскае мора. З нарабаваным майном захопнікі вярталіся ў Кіеў, але па дарозе на іх напалі хазары і разбілі войскі Алега. Пасля яго смерці вялікім князем стаў Ігар (912–945). Тым часам супраць улады Кіева паўсталі драўляне, і Ігар, перамогшы, абклаў іх утрая большай данінай. Потым тры гады Ігар ваяваў з племенем *улічаў*, разбіў іх і захапіў іх сталіцу, горад *Перасечань*. У 941 г. войска Ігара напала на Візантыю, але візантыйскі флот дзякуючы «грэцкаму агню» спаліў большасць караблёў нападнікаў. У 944 г. паход на Візантыю паўтарыўся, і была заключана новая дамова.

Кіеў пагадзіўся не пускаць балгараў у Крым, дзе былі візантыйскія калоніі, і не нападаць на іх. У 943 г. кіеўскія войскі зноў напалі на берагі Каспійскага мора. Яны захапілі горад Дэрбент і некалькі іншых гарадоў.

Паколькі Ігар абклаў вялікай данінай драўлян, яны ў 945 г. узнялі паўстанне і забілі яго. Кіраваць дзяржавай пачала Ігарава жонка Вольга, якая жорстка задушыла паўстанне, прычым уся драўлянская знаць была забітая.

Пазней Вольга наведала Канстанцінопаль і мела асабістую сустрэчу з імператарам Канстанцінам Парфірародным. У 959 г. пасольства Вольгі на-



*Б. Чорыкаў*. Мір з грэкамі. 944 г.



*Б. Чорыкаў*. Хрышчэнне Вольгі

кіравалася да германскага імператара Атона І. У 961 г. у Кіеў у адказ прыехала нямецкая дэлегацыя на чале з біскупам Адальбертам, якая хацела ахрысціць жыхароў Кіеўскай Русі паводле заходняга абраду. Але Вольга прыняла хрысціянства ў яго ўсходняй версіі, бо саюз з Візантыяй для яе быў важнейшы.

У 965 г. кіеўскім князем стаў сын Ігара і Вольгі Святаслаў, першы ўсходнеславянскі князь са славянскім імем, які ў 964 г. прымусіў племя вяцічаў плаціць яму даніну. Паколькі раней вяцічы плацілі даніну хазарам, у 965 г. войскі кіеўскага князя напалі на Хазарскую дзяржаву. Спачатку яны захапілі горад Саркел і на гэтым месцы паставілі крэпасць Белую Вежу, потым узялі горад Тмутаракань на Тамані. У 968 г. на Кіеў напалі качэўнікі-печанегі, але захапіць яго не здолелі. У 969 г. войскі Святаслава знішчылі галоўныя на той час хазарскія гарады Семендэр і Ітыль. Хазарская дзяржава, якая стрымлівала орды качэўнікаў, была знішчана. Пад мурамі Кіева апынуліся печанегі, якія перарэзалі гандлёвыя шляхі на арабскі Усход. Яны не раз рабілі засады і на дняпроўскім шляху ў Візантыю. У 967 г. імператар Візантыі прапанаваў Ігару напасці на Балгарыю – моцнага ворага імперыі.

У 968 г. вялікае войска Кіева ўварвалася ў Балгарыю, разбіла войскі балгараў і захапіла шмат гарадоў. Святаслаў зрабіў сваёй базай горад *Пераяславец-на-Дунаі* і нават хацеў перанесці туды сталіцу з Кіева. У гэты час вялікае войска печанегаў узяло ў аблогу Кіеў, дзе была княгіня Вольга з малой дружынай, але захапіць яго не здолела. У 969 г. Святаслаў уступіў у саюз з балгарамі супраць Візантыі. Аб'яднанае войска разбіла атрады візантыйцаў, захапіла Македонію і часткова Фракію. У 971 г. новае войска Візантыі разам з балгарскім царом Барысам II пайшло на войска Святаслава, і апошні мусіў пад-

пісаць з Візантыяй дамову аб міры. Святаслаў вяртаўся з войскам на радзіму, але па дарозе яго ўвесну 972 г. забілі печанегі. Кіеўскі пасад заняў старэйшы сын Святаслава князь Яраполк (973–980). Меншыя сыны Святаслава з гэтым не пагадзіліся і пачалі вайну з Яраполкам.



*Б. Чорыкаў.* Яраполк дакарае Свенельда за забойства брата

У гэтай барацьбе перамог наўгародскі князь Уладзімір, які з найманай варажскай дружынай захапіў Полацкую дзяржаву, што не ўваходзіла ў Кіеўскую Русь, гвалтам узяў за жонку полацкую князёўну Рагнеду, а потым захапіў Кіеў і забіў Яраполка. Яго ўлада доўжылася з 980 па 1015 г. Спачатку новы князь у 981 г. абклаў данінай вяцічаў, у 983 – яцвягаў, а ў 984 г. – радзімічаў. Такім чынам, пры канцы X ст. беларускія землі часова трапілі ў склад Кіеўскай дзяржавы.



*Б. Чорыкаў.* Замах Рагнеды на Уладзіміра

У 988 г. Уладзімір правёў адміністрацыйную рэформу. Былі ліквідаваныя мясцовыя «племенныя» княжанні, дзяржаву падзялілі на вобласці вакол вялікіх гарадоў. Замест мясцовых князёў у самыя буйныя гарады кіеўскі князь прызначыў сваіх сыноў, а ў меншыя – сваіх пасаднікаў. На межах краіны Уладзімір пабудаваў новыя гарады і цвярдыні. Такім чынам уся ўлада ў краіне апынулася ў руках аднаго княжага роду. Уладзімір пачаў праводзіць рэформы

і ў галіне ідэалогіі. Афіцыйнай рэлігіяй Кіеўскай Русі раней было язычніцтва. Кожнае племя мела сваіх мясцовых багоў, а агульнага пантэону для ўсёй краіны не было. Уладзімір вырашыў з гэтым разабрацца.

У Кіеве на пагорку паблізу свайго палаца князь аздобіў капішча ідаламі-выявамі на чале з Перуном, богам маланкі і грому. Аднак неўзабаве ў 988 г. Уладзімір прыняў хрысціянства ўсходняга абраду, запазычыўшы яго ў Візантыі. Паўсюль ідалы былі зрынутыя, на іх месцы пачалі будаваць спачатку драўляныя, а потым і мураваныя цэрквы. У 989–996 гг. у Кіеве была пастаўлена першая мураваная царква – *Дзесяцінная*. Яе пабудавалі візантыйскія (магчыма, і балгарскія) дойліды.

Грэцкія дойліды былі знакамітыя ва ўсім хрысціянскім свеце. Яны прынеслі на Русь ужо распрацаваную сістэму *крыжова-купальнага храма*. У аснове яе – квадрат, падзелены чатырма слупамі, прычым прамавугольныя секцыі, што дапасоўваюцца да падкупальнай прасторы, утвараюць архітэктурны крыж.

Храм змяніў уяўленне пра сусвет, які раней успрымаўся ў даволі абстрактных структурах: кола, сіметрыя, дрэва жыцця і г. д., стаўшы яго сімвалічным цэнтрам, што ўвасабляўся ў алтары. Адпаведна з гэтым размяркоўваліся ўсе часткі храма. Ніжняя суадносілася з Зямлёю, верхняя прастора – з Небам, Неба падзялялася на «ніжняе» і «верхняе».

Новае светаўспрыманне прынесла гістарычнае ўсведамленне часу. Вядома, гэта адбілася і на развіцці архітэктуры. Чатыры фасады храма мелі свой пачатак, сярэдзіну і канец. Адпаведна літургіі іх напрамак развіваўся з захаду на ўсход. Заходняя частка (нартэкс) сімвалізавала зямлю, цэнтральная (карабель, або неф) – бачнае неба, усходняя (алтар) – трон бога. Складаная сімволіка абумовіла такі ж складаны архітэктурны вобраз Дзесяціннай царквы: разгалінаваная трохнефавая частка, кругавыя галерэі, шматлікія галовы з купаламі.



Дзесяцінная царква ў Кіеве.
*Украінская манета 1996 г.*

У першай палове XI ст. пры сыне

Уладзіміра Яраславе Мудрым быў узведзены галоўны храм Кіеўскай Русі – *Сафійскі сабор*, які павінен быў увасабляць моц і веліч дзяржавы, стаць не толькі культавым, але і культурна-палітычным цэнтрам Кіева. Але пасля смерці Яраслава адзінства і магутнасць дзяржавы пахіснулася.

Разам з уздымам эканамічнага і культурнага жыцця ў асобных княствах, далёкіх ад Кіева, пачалося мураванае будаўніцтва.

Першыя мураваныя храмы, падобныя да Кіеўскай Сафіі, якія таксама атрымалі назву «Сафія», былі пабудаваны ў Ноўгарадзе і Полацку ў сярэдзіне XI ст. Гэтак наўгародцы і палачане параўноўвалі сябе з Канстанцінопалем і хацелі падкрэсліць сваю незалежнасць ад Кіева, давесці, што іх гарады нічым не горшыя.

Аднак хрысціянства сярод усходніх славян і суседскіх балцкіх і фіна-ўгорскіх народаў, асабліва на вёсцы, распаўсюджвалася вельмі павольна. Пра гэта сведчаць і змены ў пахавальным абрадзе. Славяне-язычнікі сваіх нябожчыкаў спальвалі на вогнішчы, а потым клалі парэшткі ў гліняныя гаршкі-урны і закопвалі ў курганах. Пад уплывам хрысціянства абрад крэмацыі выйшаў з ужытку, але курганы, куды клалі цела памерлага з наборам розных рэчаў, існавалі да пачатку XIII ст. У аддаленых ад гарадоў мясцінах людзі яшчэ ў XIV–XV стст., і нават пазней, прыносілі ахвяры мясцовым багам і іх ідалам, святым камяням, крыніцам і дрэвам.

Сацыяльны склад насельніцтва Кіеўскай Русі быў досыць разнастайны. Вышэйшы слой, *баяры*, паступова сфарміраваўся, з аднаго боку, з нашчадкаў племянных уладароў, а з другога – з найбольш уплывовых княскіх дружыннікаў, сярод якіх ад пачатку значнае месца займалі тыя самыя варагі. Князі са сваімі дружынамі жылі ва ўласна горадзе, за ўмацаванымі сценамі якога знаходзіўся *пасад*. Княская дружына не толькі ўдзельнічала ў войнах, але і выпраўлялася на *палюддзе*, збор даніны з насельніцтва, які ад часу княжання Вольгі праводзіўся ў адмысловых цэнтрах сельскіх абшчын, званых *пагостамі*.

Да сярэдняга слою можна аднесці асноўную масу (шараговых) княжацкіх дружыннікаў і сярэдняе гарадское купецтва.

Ніжэйшы слой насельніцтва Кіеўскай Русі складаўся ў асноўным з сялян-*смердаў*, становішча якіх увесь час пагаршалася, у выніку чаго з іх выдзяляліся катэгорыі ў той ці іншай меры залежных сялян –

*закупы*, блізкія да іх *радовічы*, урэшце самыя бяспраўныя, *чэлядзь і халопы*. Сяляне-вольнаадпушчанікі, тыя, што выйшлі з абшчыны, а таксама халопы, якія выкупіліся, называліся *ізгоямі*.

Важна падкрэсліць, што і баяры, і княскія дружыннікі, і купецтва, і смерды былі свабоднымі людзьмі і фармальна мелі аднолькавыя правы.

Паралельна са свецкім грамадствам існавала таксама значная супольнасць *царкоўных людзей*, якія падпарадкоўваліся царкоўным уладыкам-іерархам.

У 1014 г. Ноўгарад перастаў плаціць даніну Кіеву, і Уладзімір у 1015 г. пачаў рыхтаваць войска дзеля паходу на Ноўгарад, але неўзабаве раптоўна памёр. Уладу пераняў яго старэйшы сын Святаполк. Каб умацаваць свае пазіцыі, ён забіў трох сваіх братоў і выступіў супраць наўгародскага князя Яраслава. Але ў бітве пры Любечы ў 1016 г. яго войска было разбіта наўгародцамі пры ўдзеле варажскіх наймітаў, сам Святаполк уцёк у Польшчу, а Яраслаў (Мудры) заняў кіеўскі пасад. Святаполк разам з польскім каралём Баляславам Харобрым выступіў супраць войскаў Яраслава і ў 1018 г. разбіў іх на Заходнім Бугу. Яраслаў вярнуўся ў Ноўгарад, а Святаполк з Баляславам – у Кіеў. Аднак Яраслаў з новым наўгародскім войскам у бітве на рацэ Альце каля Пераяслава ў 1019 г. разбіў Святаполка і яго хаўруснікаў-печанегаў. Полацкі князь Брачыслаў, які аднавіў незалежнасць ад Кіева, у 1021 г. напаў на Ноўгарад і разрабаваў яго. Аднак на сёмы дзень яго дружыну нагналі кіяўляне і прымусілі вярнуць нарабаванае. У 1023 г. супраць Яраслава выступіў яго брат Мсціслаў Тмутараканскі. У 1024 г. пад Чарнігавам Мсціслаў разбіў дружыну Яраслава, і апошні прызнаў уладу Мсціслава ў Чарнігаве. Але пасля смерці Мсціслава ў 1036 г. Яраслаў Мудры зноў стаў адзіным кіраўніком Кіеўскай Русі. У 1051 г. упершыню мітрапалітам у Кіеве стаў не грэк, а мясцовы святар Іларыён.

Гісторыкі лічаць, што менавіта Іларыён адзін з першых у XI ст. пачаў ужываць тэрмін «рускі народ». Яшчэ раней ужо ўжываўся палітонім «руская зямля». Аднак гэты тэрмін тады не меў ніякага дачынення да сённяшняй Расіі. Гэта была тэрыторыя Сярэдняга Падняпроўя, дзе ўжо распаўсюдзілася хрысціянства і існавалі цэнтры епархій: Чарнігаў, Белгарад, Юр'еў-на-Росі. Цікава, што першая рэзідэнцыя мітрапалітаў

была не ў Кіеве, а ў горадзе *Пераяслаўлі-Рускім* (з 991 па 1037 г.), і толькі потым яна была перанесеная ў Кіеў, дзе заставалася да канца XIII ст. Вёска стала хрысціянскай не раней за XIII ст., калі канчаткова змяніўся пахавальны абрад і зніклі курганныя могільнікі. Асабліва моцна трымаліся некаторыя дахрысціянскія звычкі якраз на тэрыторыі сённяшняй Расіі.



*Б. Чорыкаў*. Яраслаў Мудры вучыць дзяцей

Яраслаў Мудры падчас свайго княжання ў Кіеве вызначыўся тым, што зацвердзіў першы звод права Кіеўскай Русі пад назвай «*Руская праўда*» (1016 г.?), а таксама тым, што засноўваў школы, у якіх дзяцей вучылі чытаць і пісаць.

У 1054 г. князь Яраслаў памёр, і дзяржаву падзялілі паміж яго сынамі і пляменнікамі.

Вялікім кіеўскім князем стаў старэйшы сын Яраслава і Інгігерды Шведскай Ізяслаў, але ён не змог адзін кіраваць вялікай краінай. Уладу ён мусіў падзяліць з двума братамі – Святаславам (чарнігаўскі князь) і Усеваладам (пераяслаўскі князь). Гэты трыумвірат супольна кіраваў 15 гадоў. У 1068 г. на дзяржаву напалі цюркі-полаўцы, якія на той самай рацэ Альце разбілі аб'яднанае войска братоў, пасля чаго трыумвірат распаўся. У дзяржаве пачаліся міжусобныя войны, у якіх удзельнічалі



*Б. Чорыкаў*. Вялікі князь Ізяслаў



*Б. Чорыкаў.* Запавет Уладзіміра Манамаха дзецям. 1125 г.

і польскія войскі разам з полаўцамі. У выніку кіеўскі сталец пасля Ізяслава заняў Святаслаў, потым Усевалад, а пазней зноў Ізяслаў, які загінуў у 1078 г.

Пры канцы XI ст. на кіеўскі трон узышоў сын князя Усевалада – Уладзімір Манамах. Ён пачаў праводзіць сумесныя з’езды князёў (снемы), на якіх абмяркоўвалі пытанні як знешняй, так і ўнутранай палітыкі. Самым важным стаў снем у Любечы, які адбыўся ў 1097 г. Там фактычна быў зафіксаваны падзел Кіеўскай Русі на асобныя самастойныя княствы, якімі паводле спадчыннага права кіравалі мясцовыя князі. Князі дамовіліся не нападаць адзін на аднаго і разам ваяваць з полаўцамі. Аднак гэтае рашэнне не было рэалізаванае, і канфлікты паміж князямі працягваліся. У 1100 і 1103 гг. адбыліся яшчэ два з’езды-снемы, дзе вырашаліся тыя ж пытанні, што і ў Любечы. Апошні ўздым Кіеўскай дзяржавы адбыўся пры ўладзе вышэйпамянёнага Уладзіміра Манамаха (1113–1125) і яго сына Мсціслава Вялікага (1125–1132). Яны паспяхова трымалі ўладу і ўдала ваявалі з самастойнай Полацкай дзяржавай. Так, у 1119 г. у Глеба Мінскага адабралі яго ўдзельнае княства, а потым князь Мсціслаў адолеў і полацкіх князёў ды выслаў іх у Візантыю.

Пасля смерці князя Мсціслава ў 1132 г. Кіеўская дзяржава канчаткова распалася на асобныя самастойныя княствы-землі. Аднак мясцовыя князі, з выняткам полацкіх, увесь час змагаліся паміж сабою за ўладу ў Кіеве, дзеля таго каб хоць бы фармальна называцца вялікімі кіеўскімі князямі.

***2.3. Пачаткі ўласна расійскай дзяржаўнасці. Уладзіміра-Суздальская зямля.*** Доўгі час міжрэчча Волгі і Акі было заселенае living рознымі фіна-ўгорскімі плямёнамі. Так, на Волзе жыло згаданае намі раней племя мера, а на Ацэ – мурама, з якога паходзіць былінны

рускі асілак Ілля Мурамец. Славянскае насельніцтва там было спачатку нешматлікім і жыло ў гарадскіх паселішчах. Выхадцы з Ноўгарада ў X–XI стст. заснавалі тут гарады Белавозера, Растоў і Суздаль. Пазней узніклі гарады Мурам, Уладзімір і Яраслаўль. Да канца XI ст. гэтыя землі былі глухой правінцыяй Кіеўскай Русі.


© Фота. Spalexxx, 2014

Званіца ў Суздальскім крамлі

*Першае княства на тэрыторыі сучаснай Расіі* ўзнікла з цэнтрам у Суздалі. Гэты горад упершыню згадваецца ў летапісе пад 1024 г. у сувязі з паўстаннем там язычнікаў (*валхвоў*). А неўзабаве пасля Любецкага з'езда першым тут пачаў княжыць сын Манамаха Юрый Далгарукі, што дало пачатак фактычнаму ўладаранню ў Суздальскай зямлі кіеўскіх намеснікаў з дынастыі Рурыкавічаў.

На пачатку XII ст. (да 1157 г.) Суздаль быў сталіцай *Растова-Суздальскага княства*. З сярэдзіны XIII ст. самастойнасць Суздальскага княства была адноўлена. Ад пачатку XIV ст. Суздаль – сталіца *Суздальска-Ніжагародскага княства*. Толькі ў 1392 г. горад быў далучаны да Вялікага княства Маскоўскага. У XVI ст. Суздаль – адзін з рэлігійных цэнтраў Масковіі, дзе існавала 11 манастыроў. Захаваліся *Суздальскі крэмль* з трыма храмамі XVI–XVIII стст., пяць манастырскіх архітэктурных ансамбляў, гандлёвыя рады XIX ст. і шматлікія цэрквы ў розных месцах горада.

З 862 г. існуе горад *Растоў*, які знаходзіцца на беразе возера Нера. Гэта адзін з цэнтраў Растова-Суздальскай зямлі, які пазней належаў уладзіміра-суздальскім князям. Іпацьеўскі летапіс пад 1151 г. называе яго цэнтрам асобнага *Растоўскага княства*. Першымі насельнікамі



© Фота А. Грышын

Успенскі сабор і царква ў Растове Вялікім

горада ў IX ст., паводле летапісу, былі зноў-такі прадстаўнікі племені меры. Гэтую інфармацыю пацвердзілі археолагі. Апірышчам славян горад стаў у 920–930-х гг. Да XII ст. Растоў меў два кварталы (канцы) – Чудскі (мяранскі) з язычніцкім капішчам і Рускі (славянскі) – з хрысціянскай царквой.

Першы мураваны храм у горадзе пабудаваны ў 1160 г. (існаваў да пажару 1204 г.). У 1207 г. зноў было ўтворана самастойнае Растоўскае княства на чале з сынам князя Усевалада Канстанцінам, які ў 1214–1231 гг. нанова адбудаваў былы *Успенскі сабор*. На той час горад меў плошчу больш за 1000 га, княскі і епіскапскі двары, больш за 15 храмаў і некалькі манастыроў.

У 1237 г. Растоў не аказаў супраціву войскам хана Батыя і таму не быў разбураны. Пасля 1328 г. княства ўжо залежала ад Масквы і канчаткова далучылася да яе ў 1473–1474 гг. Растоў у XVI–XVII стст. стаў буйным рэлігійным цэнтрам Маскоўскай дзяржавы, з 1589 г. – цэнтрам мітраполіі. У другой палове XVII ст. тут будуюць крэмль, шматлікія гарадскія і прыгарадныя манастыры. На плошчы паблізу Успенскага сабора пабудавалі ўнікальную званіцу з вялікімі тысячапудовымі званамі. Першы суздальскі князь, згаданы раней Юрый Далгарукі заснаваў гарады *Пераяслаў-Залескі, Юр'еў-Польскі* а таксама, магчыма, *Кастраму і* Маскву. Масква паўстала ў 1147 г. на землях, дзе жылі вяцічы, а яшчэ раней – фіна-ўгорскае племя *мяшчэра* і балцкае – *голядзь*. Спачатку гэта было невялікае ўмацаванае паселішча на Маскве-рацэ, але ўжо на мяжы XII–XIII стст. Масква – даволі вялікі горад Уладзіміра-Суздальскага княства.

Значную ролю ў стварэнні вялікай дзяржавы на гэтых землях адыграў князь Андрэй Багалюбскі, сын Юрыя Далгарукага. Ён заснаваў новыя гарады – *Цвер* і *Галіч-Мерскі*. Колькасць славян на

гэтых землях істотна павялічылася, бо гэта былі ўцекачы з поўдня, якія моцна цярпелі ад набегаў полаўцаў.



*Б. Чорыкаў.* Вялікі князь Андрэй (Багалюбскі). Вайна з полаўцамі

Ішла актыўная асіміляцыя і хрысціянізацыя мясцовых фіна-ўгорскіх плямён, на іх аснове пачаў складацца *велікарускі народ*, які цяпер называецца проста рускім. Ворных угоддзяў тут было мала, большасць земляў займаў густы лес. Мясцовыя жыхары актыўна займаліся бортніцтвам, паляваннем, шылі вопратку, выраблялі лыка і мачала. Гарадоў было мала, але існавала шмат невялікіх пасёлкаў. Асноўныя шляхі праходзілі па рэках. У адрозненне ад іншых земляў у Суздальскім княстве, а потым і ва Уладзіміра-Суздальскім уся зямля належала князю, а гарадскога веча фактычна не было. Князь Юрый дзеля будаўніцтва мураваных храмаў запрасіў майстроў з Галіча: яны з мясцовага белага каменю пабудавалі *сабор у Пераяславе-Залескім і царкву Барыса і Глеба ў Кідэкшы* (пад Суздалем). *Царква ў Кідэкшы* – гэта першы белакаменны храм на тэрыторыі княства, які датуецца 1152 г.



© Ded Egor

Царква Барыса і Глеба ў Кідэкшы пад Суздалем

Сын Юрыя ад палавецкай князёўны Андрэй быў моцным і вядомым палітыкам і дыпламатам. Ён апіраўся на простых гарадскіх *пасадскіх людзей* і з іх дапамогай нарэшце разабраўся з растоўскімі і суздальскімі баярамі. Яго войскі нават захапілі і разрабавалі Кіеў, але Андрэй



© Фота Д. Камышыліна

Залатыя вароты ва Уладзіміры

там не застаўся, а вярнуўся на радзіму і сталіцай сваёй вотчыны зрабіў горад *Уладзімір* на рацэ Клязьме, заснаваны, на думку большасці гісторыкаў, пры канцы Х ст. У VIII–X стст. на месцы будучага горада існавала паселішча племені меры. Князь Юрый Далгарукі, які жыў у Суздалі, паставіў ва Уладзіміры сваю загарадную сядзібу . Ад 1157 г., дзякуючы князю Андрэю Багалюбскаму, горад стаў не толькі цэнтрам княства, але і пачаў называць сябе сталіцай былой Кіеўскай Русі. У 1299 г. сюды пераехаў на сталае жыхарства кіеўскі мітрапаліт Максім.

Горад быў умацаванываламі і драўлянымі сценамі, галоўны ўваход у яго быў зроблены цераз мураваную вежу-браму, пабудаваную ў 1164 г. Вежа атрымала назву *Залатыя вароты Уладзіміра.*

На супрацьлеглым канцы горада стаялі такія ж магутныя і белакаменныя *Срэбныя вароты.* У цэнтры горада быў узведзены ўласны *Успенскі сабор* (1158–1161). На яго будоўлю князь Андрэй выдаткаваў дзясятую частку ўсіх сваіх прыбыткаў. У саборы знаходзілася славутая *ікона Уладзімірскай Маці Божай*, вывезеная з Візантыі.



© Hd Elen

Успенскі сабор ва Уладзіміры

На запрашэнне Андрэя Багалюбскага прыехалі нямецкія майстры з імперыі Фрыдрыха Барбаросы, якія дасканала валодалі майстэрствам разьбы па камені. У сваёй загараднай рэзідэнцыі, сяле Багалюбаве, князь Андрэй пабудаваў храм *Раства Багародзіцы і* мураваны палац. У 1166 г. за 1 км ад Багалюбава была ўзведзена *царква Пакрова-на-Нярлі.*

Царква пастаўлена на *мураван*ым цокалі вышынёй 4 м і выдатна глядзіцца ў пойме лугавіны.

У часы ўладарання наступнага князя, Усевалада, брата Андрэя, які атрымаў мянушку «*Вялікае Гняздо*», Уладзіміра-Суздальская зямля дасягае свайго найбольшага росквіту. Пры ім ва Уладзіміры пабудаваны *Дзмітрыеўскі сабор* (1194–1197). Храмы Уладзіміра ды іншых гарадоў княства вылучаюцца сваёй унікальнай белакаменнай разьбою. У 1230–1234 гг. паўстаў апошні храм Уладзіміра-Суздальскай архітэктурнай школы – *Георгіеўскі сабор у Юр'еве-Польскім*. Улада апіралася тут на сярэдніх і малых землеўласнікаў, якія за сваю службу атрымлівалі зямлю разам з сёламі і сялянамі. Буйныя землеўласнікі валодалі вотчынамі.

Аднак узімку 1238 г. войскі хана *Батыя* захапілі Уладзімір. Дзясяткі іншых гарадоў, у тым ліку Масква, былі абрабаваныя і спаленыя. Тысячы людзей трапілі ў палон, загінулі ўнікальныя помнікі культуры і мастацтва.

Характэрным для *літаратуры* паўночна-ўсходнеславянскіх княстваў выглядае створанае прыкладна ў пачатку XIII ст. у Суздальскай зямлі «Маленне Даніїла Заточніка». Для яго аўтара адзінае светлае месца на зямлі – княжацкі двор (канкрэтна маецца на ўвазе суздальска-пераяслаўскі князь Яраслаў Усеваладавіч). Толькі на міласць князя, якая нават захінае сабою міласць Боскую, ускладае свае надзеі раб божы Даніїл. Без княскай увагі чалавек – адно маленькая травінка пад плотам, над якім і сонца не заззяе, і дождж не пройдзе…

Так у Масковіі фарміраваўся культ адзінага, набліжанага да Бога, уладара – культ, наступствы якога, на наш погляд, не пераадоленыя і дагэтуль.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Барабан*** – архітэктурны тэрмін, які азначае верхнюю частку сакральнага будынка, якая абапіраецца на муры і слупы і трымае купал.

***Баяры*** – знаць, найвышэйшы слой сярэднявечнага землеўласніцкага грамадства, у тым ліку ва ўсходнеславянскіх княствах.

***Вотчына*** – зямельны надзел, атрыманы ў спадчынную ўласнасць. Пры пэўных умовах князь мог яго забраць назад.

***Даніна*** – рэгулярны пабор з падпарадкаванага племені або народа.

***Закупы*** – людзі, якія ўзялі ў землеўласніка пазыку («купу») грашыма або таварамі і абавязаны адпрацоўваць у апошняга, пакуль не вернуць купы.

***Ізгой*** – чалавек, пазбаўлены сацыяльнага статусу (халоп, адпушчаны на волю без зямлі).

***Князь*** – правадыр племя, саюза плямён; пазней кіраўнік дзяржавы ва ўсходніх славян.

***Крыжова-купальны храм*** – архітэктурны тэрмін, азначае тып культавай пабудовы (у разрэзе ў форме роўнаканцовага крыжа), якая канструкцыйна складаецца з чатырох вертыкальных апораў, на якія абапіраюцца купал і барабан.

***Пагосты*** – вызначаныя князем месцы збору даніны.

***Палюддзе*** – штогадовы аб'езд князя з дружынай падуладных ім земляў з мэтай збору даніны і кармлення.

***Пасад*** – частка горада за ўмацаванымі сценамі (мурамі).

***Пасадскія людзі*** – гараджане.

***Племя*** – від этнічнай супольнасці і сацыяльнай арганізацыі людзей; у эпоху сталага Сярэднявечча мела сваю структуру самакіравання (агульны сход, нарады родавых старэйшын, вайсковыя і грамадскія правадыры).

***Удзелы*** – тэрыторыі, якімі валодалі прадстаўнікі княскага роду.

***«Урокі»*** – фіксаваны памер даніны або праца, якую трэба было выканаць да пэўнага тэрміну.

***Халопы*** – катэгорыя залежнага насельніцтва, якая знаходзілася ў поўнай залежнасці ад свайго гаспадара.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА

Археология Украинской ССР: в 3 т. Т. 3: Раннеславянский и древнерусский периоды / под ред. И. И. Артеменко. Киев: Наукова думка, 1986. 757 с.

Галушко, К. Український націоналізм. Київ: вид. АБА-ГА-ЛА-МА-ГА, 2017. 129 с.

Грушевский, Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. С. 21–118.

История Киева: в 3 т., 4 кн. Т. 1: Древний и средневековый Киев. Киев: Наукова думка, 1982. 407 с.

Крип'якевич, І. П. Історія України. Львів: Світ, 1990. С. 33–71.

Оргиш, В. П. Древняя Русь: образование Киевского государства и введение христианства / под ред. Е. М. Бабосова. Минск: Наука и техника, 1988. 150 с.

Петрухин, В. Я. Начало этнокультурной истории Руси IX–XI веков. Смоленск: Русич; Москва: Гнозис, 1995. 320 с.

Седов, В. В. Славяне в раннем Средневековье. Москва: Наука, 1995. 416 с.

Темушев, С. Н. Начало Руси: генезис государственности в источниках и исторической традиции. Минск: БГУ, 2008. 158 с.

Темушев, С. Н. Образование Древнерусского государства. 3-е изд., перераб. Москва: Квадрига, 2017. 352 с.

Трусаў, А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Выд. 2-е, папр. Мінск: Выд. Зміцер Колас, 2017. С. 26–30, 66–67.

Шахматов, А. А. Очерк древнейшего периода истории русского языка. Энцикл. славянской филологии / под ред. орд. Акад. И. В. Ягича (Вып. 11.1). Петроград: Типогр. Императ. Академии наук, 1915. 421 с.

Bačič, J. Slav: The Origin and the Meaning of the Ethnonym // Slovene Studies. 1987. # 9/1–2. P. 33–41.

Franklin, S. Greek in Kievan Rus // Dumbarton Oaks Papers. Vol. 46. Homo Byzantinus: Papers in Honor of Alexander Kazhdan, 1992. P. 69–81.

Martin, J. Medieval Russia, 980–1584. 2nd ed. Cambridge University Press, 2012. P. 1–148.

# 3. НАЎГАРОДСКАЯ РУСЬ

***3.1. Узнікненне Наўгародскай рэспублікі.*** Старажытны Ноўгарад стаяў на абодвух берагах ракі *Волхава* за 4 км ад упадзення яе ў возера Ільмень. У летапісах горад упершыню згадваецца пад 859 г. у сувязі з паданнем аб пакліканні ў горад князя Рурыка. Археолагі лічаць, што магчымай яго рэзідэнцыяй было гарадзішча, якое знаходзіцца на правым беразе Волхава, за 3 км на поўдзень ад сучаснага Ноўгарада. Самыя старажытныя пласты ў горадзе, добра вывучаныя археолагамі, датуюцца пачаткам X ст. Першая драўляная грэбля-маставая і сталая забудова гарадскіх вуліц адносяцца да 40-х гг. X ст. Ужо ў X ст. горад складаўся з трох кварталаў (канцоў), якія мелі назвы Славенскі, Людзін і Нярэўскі. У творы візантыйскага імператара Канстанціна «Аб кіраванні дзяржавай», напісаным у 948–952 гг., ёсць звесткі пра Ноўгарад. Згадваюць пра яго і скандынаўскія сагі (пад назвай Хольмгард). Сучасныя даследчыкі лічаць, што першыя славянскія пасяленцы з'явіліся на гэтай зямлі з захаду, і не пазней за IX ст. тут пачаў складвацца асаблівы *наўгародскі дыялект*, які спалучаў у сабе рысы заходне- і ўсходнеславянскіх гаворак.

Ужо ў X ст. горад займаў даволі вялікую тэрыторыю і быў значным рамесна-гандлёвым цэнтрам. Археолагі знайшлі тут шмат манет усходняга паходжання, што сведчыць пра тагачасныя актыўныя гандлёвыя сувязі месцічаў. Каля горада, там, дзе Волхаў выцякае з возера Ільмень, знаходзіцца пагорак Пярынь, дзе было капішча бога Перуна. У 1951–1952 гг. яно было раскапана археолагамі пад кіраўніцтвам Валянціна Сядова.

У цэнтры капішча была круглая пляцоўка дыяметрам 21 м, абмежаваная ровам шырынёй да 7 м і глыбінёй больш за 1 м. У цэнтры пляцоўкі знайшлі я́му ад драўлянага слупа дыяметрам 0,6 м. Тут стаяў стод Перуна, які ў 988 г. ссеклі ды скінулі ў Волхаў. Перад ідалам быў ахвярнік – кола, выкладзенае з камянёў. Роў, выкапаны вакол

Сафійскі сабор у Вялікім Ноўгарадзе


© Фота Алега Трусава

капішча, меў звонку восем акруглых выступаў, таму зверху капішча нагадвала вялікую кветку з васьмю пялёсткамі. У кожным з іх гарэў ахвярны агонь – яго запальвалі падчас святаў.

У XII–XIII стст., па сутнасці, склаўся вядомы цяпер гістарычны цэнтр Ноўгарада. На пагорку, на левым беразе Волхава, знаходзіўся ўмацаваны дзядзінец (*крэмль*), на якім у 1045–1050 гг. пабудавалі згаданы ўжо намі Сафійскі сабор, распісаны ўнікальнымі фрэскамі. Зразумела, чаму гэтая частка горада называлася Сафійскай стараною.

З Ноўгарадам звязана творчасць адметнага іканапісца Алісея



Фрэска з Сафійскага сабора ў Ноўгарадзе


© Фота Алега Трусава

Вежа Наўгародскага крамля


*Алісей Грэчын* (?).
Спас Нерукатворны, *XII ст.*

Грэчына (яго мянушка сведчыць, хутчэй за ўсё, пра яго візантыйскае паходжанне), які працаваў там на мяжы XII і XIII стст.

На правым беразе ракі знаходзілася Гандлёвая старана з *Торгам* і *Яраслававым дварышчам*, дзе збіралася гарадское веча. На пачатку XI ст. абедзве часткі горада злучылі драўляным мостам. Горад быў забудаваны двухпавярховымі драўлянымі дамамі. Людзі жылі на высокім другім паверсе, які абапіраўся на слупы. На першым паверсе былі склады, тут трымалі птушак і дробную рагатую жывёлу. Дамы былі аздоблены разьбою, а вокны мелі шыбы, зробленыя са слюды. Горад меў драўляны водаправод і драўляныя грэблі-маставыя. Археолагі вызначылі, што з X па XVI ст. маставыя налічвалі 30 драўляных ярусаў, напластаваных адзін на адным.

***3.2. Абвяшчэнне незалежнасці Ноўгарада.*** Да другой чвэрці XII ст. Наўгародская зямля належала кіеўскаму князю, які пасылаў туды княжыць або сына, або бліжэйшага сваяка. З 1126 г. наўгародцы пачалі выбіраць *пасадніка* – прадстаўніка горада перад князем, а потым і *тысяцкага* – кіраўніка мясцовага апалчэння. У 1136 г. наўгародцы адмовіліся падпарадкоўвацца вялікаму кіеўскаму князю і абвясцілі незалежнасць сваёй дзяржавы, якую да канца XV ст. яны з гонарам называлі «Гаспадар Вялікі Ноўгарад». Межы дзяржавы даходзілі аж да Белага мора і астравоў у Ледавітым акіяне. Ад 1156 г.

наўгародцы на вечы з ліку мясцовага духавенства выбіралі свайго епіскапа. Дзеля кіравання войскам (дружынай) яны запрашалі *служылага князя*, якому за службу добра плацілі, але ў любы момант маглі звольніць з гэтай пасады. Ад часоў Яраслава Мудрага князі жылі ў цэнтры горада, на ўжо згаданым Яраслававым дварышчы. Пасля 1136 г. князям было забаронена жыць у горадзе, а на месцы, дзе стаяў іхні палац, зрабілі плошчу для гарадскога веча. Археолагі вызначылі, што вечавая плошча ўяўляла сабою суцэльны драўляны мост; ён рэгулярна падмятаўся і быў чысты. На гэтай плошчы збіраліся тысячы чалавек.

Гарадскім судом кіравалі служылы князь і пасаднік – так з часам пачаў называцца выбраны кіраўнік дзяржавы. Горад дзяліўся на *сотні*. Кожная сотня мела сваё мясцовае веча і выбарнага кіраўніка – соцкага. У сваю чаргу сотня дзялілася на *вуліцы*, якімі кіравалі вуліцкія старасты. Вялікія кварталы горада – канцы, якія складаліся з сотняў і вуліц, мелі канчанскага старасту, канчанскае веча і канчанскую ўправу.

Агульнае веча збіраў князь, тысяцкі або пасаднік. Пра гэта званілі ў *вечавы звон*. На веча запрашаліся прадстаўнікі з Пскова і Ладагі – гарадоў, якія ўваходзілі ў Наўгародскую дзяржаву.

Ноўгарад быў багатым горадам дзякуючы развітым тут гандлю і рамёствам. Мёд, воск, футра наўгародскія купцы вывозілі на продаж у Скандынавію, Нямеччыну, Францыю. Адтуль прывозілі каштоўныя металы, віны, сукно, зброю. Фактычна Вялікі Ноўгарад уваходзіў у Ганзейскі саюз, меў свой гандлёвы цэнтр на востраве Готландзе. Вельмі моцным тут быў ліхвярскі капітал.


© Фота Алега Трусава

Георгіеўскі сабор Юр'евага манастыра (Ноўгарад)

Першым наўгародскім загарадным манастыром лічаць

© Фота А. Спірыдонава



Царква
Спаса-на-Нярэдзіцы

*Юр'еў*. Там у 1119 г. пабудавалі *Георгіеўскі сабор*, які захаваўся да нашых дзён.

З сярэдзіны XII ст. складваецца самастойная *наўгародская будаўнічая школа*. Наўгародскія дойліды будавалі невялікія чатырохслупавыя храмы. Іх замоўцамі былі багатыя баяры або жыхары асобных канцоў ці вуліц. Храмы будавалі з мясцовага вапняку, а інтэр'еры распісвалі фрэскамі. Сярод іх вылучаецца ўнікальны *храм Спаса-на-Нярэдзіцы* (1198–1199).

© Фота Алега Трусава



Царква Раства Багародзіцы
ў Пярынскім скіце (Ноўгарад)

Адметнымі помнікамі наўгародскай архітэктуры сталі пабудаваная, як мяркуецца, пры канцы XII або на пачатку XIII ст. *царква Раства Багародзіцы ў Пярынскім скіце і царква Параскевы-Пятніцы* (першапачатковая пабудова ў 1207 г.).

Яшчэ ў другой палове XII ст. дзве мураваныя царквы былі пабудаваны ў Ладазе, якая належала Ноўгараду. Унікальныя фрэскавыя роспісы царквы Спаса-на-Нярэдзіцы, некаторых іншых наўгародскіх храмаў, а таксама *царква св. Георгія* ў Ладазе сведчаць аб існаванні самастойнай наўгародскай мастацкай школы ма-


© Aniacra

Храм Міколы-на-Ліпне
ў Ноўгарадзе


© Фота Алега Трусава

Царква Параскевы-Пятніцы
ў Ноўгарадзе, XIII–XVI стст.

нументальнага жывапісу. Аднак пасля 1240 г. мураванае будаўніцтва ў Ноўгарадзе спыняецца і аднаўляецца толькі пры канцы XIII ст. Першай пасля 1292 г. пабудавалі *царкву Міколы-на-Ліпне*, потым – *царкву Фёдара Страцілата на Шчыркове* (1292–1295).

У 1951 г. археолагі знайшлі ў Ноўгарадзе першую *берасцяную грамату* на грэблі-маставой XIV ст. Агулам такіх грамат знойдзена ўжо болей за тысячу – і не толькі ў Ноўгарадзе, але і ў іншых гарадах.

Берасцяныя граматы ёсць і ў Беларусі. Гэта сведчыць пра тое, што жыхары ўсходнеславянскіх гарадоў, простыя рамеснікі ці купцы,


© gramoty.ru

Берасцяная
грамата
з Ноўгарада,
XII ст.

умелі чытаць і пісаць і, пачынаючы з XII ст., выкарыстоўвалі для пісьма бяросту.

Ноўгарад быў таксама значным цэнтрам сярэднявечнай *музычнай культуры*. Яшчэ ў XII ст. сярод вядомых майстроў царкоўных спеваў згадвалася імя манаха Кірыка, які выявіў сябе не толькі знаўцам пеўчага майстэрства, але і адным з самых адукаваных людзей свайго часу.

***3.3. Пскоў.*** Другім паводле велічыні і значэння горадам, які да XIV ст. уваходзіў у Наўгародскую зямлю, быў *Пскоў*, заснаваны крывічамі. На тэрыторыі сённяшняй Пскоўскай вобласці крывічы з'явіліся ў VII–VIII стст. і дайшлі ажно да паўднёвых берагоў Чудскага возера. Яны ўвесь час кантактавалі з мясцовымі фіна-ўгорскімі плямёнамі і таму склалі асобную групу пскоўскіх крывічоў. Упершыню пскоўскія крывічы згадваюцца ў «Аповесці мінулых летаў» пад 859 г. у сувязі з іх сумесным паходам на Візантыю ў складзе войска кіеўскіх князёў Алега і Ігара. Пад 862 г. у летапісе згадваюцца горад Ізборск і вараг Трувар, які пасяліўся сярод пскоўскіх крывічоў на гарадзішчы, названым у яго гонар Трувараравым.



© Фота Алега Трусава

Трувараў крыж у Ізборску

Пазней, у 1329 г., у Ізборску будуецца мураваная цвярдыня, што дайшла да нашых дзён. Пры канцы XIV – на пачатку XV ст. Ізборск меў пасады і гарадскі могільнік.

У VIII ст. на высокай скале ў сутоцы рэк Вялікай ды Псковы якраз і ўзнікла гарадское паселішча пад назвай Пскоў. Археолагі знайшлі ў гістарычнай частцы горада шматлікія рэшткі дахрысціянскіх ахвярнікаў. Яны мелі авальную форму, былі складзеныя з чыстага рачнога пяску і абкладзеныя

Крэпасць
у Ізборску,
XIV–XV стст.



© Фота Алега Трусава

па перыметры каменнымі плітамі. Побач ляжалі шкілеты коней, прынесеных у ахвяру. Гэта сведчыць пра тое, што горад быў буйным рэлігійным цэнтрам на крывіцкіх землях.

Першы раз у летапісе Пскоў згадваецца пад 903 г. Ад X ст. ён знаходзіўся ў складзе Кіеўскай Русі, а з XII ст. належаў Наўгародскай дзяржаве. У 1240 г. горад захапілі лівонскія (інфлянцкія) рыцары, але двума гадамі пазней яго вызвалілі войскі наўгародскага князя Аляксандра Неўскага.

Самая старажытная частка горада – *дзядзінец*. Спачатку ён меў драўляныя, а потым (з XIII ст.) мураваныя ўмацаванні і атрымаў назву *Пскоўскі крэмль*, або *Кром*. У плане гэта – няправільны шматграннік, абнесены мурамі з вежамі, якія складзены з вапняковых пліт шэрага



© Sachkv

Плоская вежа
Пскоўскага
крамля

колеру. У сярэдзіне XIII ст. пскоўцы зрабілі мураваную паўднёвую частку сцяны Крома. Мур выходзіць на раку Вялікую, адкуль пачынаюцца ўмацаванні іншых гарадскіх кварталаў.

Раскапаныя археолагамі рэшткі першых дамоў гараджан уяўлялі сабою паўзямлянкі чатырохвугольнай формы памерам 3×3,5 м, заглыбленыя ў зямлю на 30–40 см. Сцены пабудоў абмазаныя глінай, жытло ацяплялася вогнішчам, абкладзеным камянямі.

Пры канцы XII ст. за рэчкай Вялікай, на адлегласці 1,5 км ад дзядзінца, быў пабудаваны першы мураваны *Спаса-Міржскі сабор*. Храм выкананы ў тэхніцы мяшанай муроўкі, дзе чаргаваліся рады тонкай цэглы-*плінфы* і каменных пліт. Сабор быў распісаны ўнікальнымі фрэскамі. Яшчэ адзін прыгожы сабор – *Раства Багародзіцы* – быў пабудаваны ў 1310 г. у Снетагорскім манастыры. Храм быў складзены з каменных пліт і меў прыгожы фрэскавы роспіс.

***3.4. Культура Ноўгарада і Пскова ў XIV–XV стст.*** Адносна земляў суседніх «рускіх» княстваў наўгародская і пскоўская культура ажно да паглынання абедзвюх земляў Масквою перажывала ўздым. Гэта, зрэшты, дазволіла Маскоўскай дзяржаве пераняць пэўныя дасягненні дэмакратычных баярскіх рэспублік. З прычыны свайго грамадскага ўладкавання ў гэты час наўгародцы і пскоўцы не будуюць вялікіх (як Наўгародская Сафія) храмаў, хоць па-ранейшаму ўжываюць распрацаваныя архітэктурныя тыпы. Меншыя памеры будынкаў дыктуюць воля і магчымасці замоўцы – не князя, а купецкай грамады, адпаведных «канцоў» у гарадах. У Ноўгарадзе захоўваецца структура 4-слупавога аднагаловага храма, колькасць апсід скарачаецца з трох да адной. Асаблівасцю афармлення фасадаў робіцца трохлопасцевае завяршэнне з павышанай цэнтральнай часткай замест пазакамарнага (якое клалася непасрэдна па ўзроўні скляпенняў кожнага аб'ёму інтэр'ера). Барабан і завяршэнне муроў дэкараваныя сціплымі паяскамі дэкаратыўных выгбачак (арачак). Самі муры набываюць выразную суровую моц: да муроўкі з цэглы, чаргаванай з каменем, дадаюцца груба абчасаныя вапняковыя пліты.

У XIV–XV стст. склаўся класічны тып багата аздобленага наўгародскага храма. У якасці аздобы рабілі выступы на фасадах (лапаткі),

розныя нішы, броўкі, паўвалікі і дэкаратыўныя крыжы. Для будаўніцтва выкарыстоўвалі і тоўстую брусковую цэглу. Да самых выдатных храмаў гэтай эпохі належалі: цэрквы *Успення на Волатавым полі* (1352), *Фёдара Страцілата на Ручаі* (1360–1361), *Пятра і Паўла на Слаўне* (1367), *Спаса-на-Ільіне* (1374), *Раства на могілках* (1381–1382), *Пятра і Паўла ў Кажэўніках* (1406), *Уласа на Воласавай вуліцы* (1407), *Івана-на-Апоках* (1453), *Дванаццаці Апосталаў на Пропасцях* (1454), *Дзмітрыя Салунскага на Слаўкаве* (1462), *Увярэння Фамы на Мячыне* (1463), *Сімяона ў Зверын-Пакроўскім манастыры* (1467).


© Pedro J. Pacheco

Царква Спаса-на-Ільіне ў Ноўгарадзе

Археолагі раскапалі рэшткі гарадскіх умацаванняў, пабудаваных у 1335 г. Таўшчыня мuроў складае каля 3 м. У тым жа годзе быў пабудаваны Наўгародскі крэмль, які захаваўся да нашых дзён. Вышыня яго муроў, абкладзеных цэглай, у межах 8–10 м; таўшчыня ўнізе – да 4 м. У XV ст. паблізу Наўгародскай Сафіі пабудавалі *ансамбль двара ўладыкі (епіскапа) Ноўгарада з Гранавітай палатай*: яна мае вялікую залу, перакрытую дэкаратыўнымі скляпеннямі. У палаце збіралася *рада паноў*, ладзіліся прыёмы для замежных паслоў і знакамітых гасцей. Побач стаіць дазорная вежа Часазвоня, пабудаваная ў 1443 г.


© Фота Алега Трусава

Наўгародскі крэмль. Часазвоня.




*Феафан Грэк*. Тройца
(з роспісу царквы Спаса-на-Ільіне)

У 20–30-х гг. XV ст. наўгародцы заснавалі славуты *Салавецкі манастыр* на астравах у Белым моры.

Пачынаючы ад XIII ст. у Ноўгарадзе існаваў культ Міколы Цудатворца, а ў XV ст. склалася *наўгародская школа іканапісу*. Для яе характэрныя выявы св. Георгія-пераможцы. У 70-х гг. XIV ст. *Феафан Грэк*, які прыехаў сюды з Візантыі, распісаў фрэскамі згаданую вышэй царкву Спаса-на-Ільіне.

Паводле знакамітага расійскага даследчыка Ігара Грабара, «ідэал наўгародца – сіла, і яго прыгажосць – прыгажосць сілы». Паступова да дэкарацыі сцен храмаў вяртаюцца лапаткі, што па ўсёй вышыні разбіваюць кожны фасад на 3 паасобныя сегменты і паўкалонкі на апсідах (згаданыя цэрквы Спаса-на-Ільіне, царква Пятра і Паўла ў Кажэўніках). На падкупальных барабанах узнікаюць дадатковыя ярусы арачак, убранства паступова робіцца больш святочным. Асаблівую цікавасць выклікаюць ужо згаданыя пабудовы: узведзеная наўгародцамі разам з нямецкімі майстрамі Гранавітая палата (1433), узор сувязяў з Еўропай і прататып маскоўскай Гранавітай палаты – з нервюрнымі скляпеннямі і іншымі элементамі паўночнай готыкі, а таксама Часазвоня (1443) – ці не першы выпадак выкарыстання на Русі шатровага завяршэння. Якраз у Гранавітай палаце ў 1478 г. была абвешчана грамата Івана III аб пазбаўленні горада незалежнасці.

Нямала жыхароў Ноўгарада на той час былі пісьменнымі, адукаванымі людзьмі, пра што сведчаць тыя ж берасцяныя граматы, якія пераважна датуюцца XIV ст. Літары на бяросту наносілі касцяным вастрыём. Граматы напісаны простай размоўнай мовай і распавядаюць пра штодзённае жыццё наўгародцаў.



© Sergeant Pepper.

Гранавітая палата Ноўгарада

Росквіт Пскова пачаўся ў XIII ст. Пра гэта сведчаць яго абарончыя збудаванні. У XIII ст. да Крома быў прыбудаваны яшчэ адзін умацаваны гарадскі квартал, які атрымаў назву *Даўмонтаў горад*. На працягу XIV–XV стст. тут узвялі шэсць мураваных храмаў і мураваныя палаты. Археолагі знайшлі рэшткі гэтых будынкаў, а таксама сляды старажытных вуліц, вымашчаных драўлянымі плахамі на лагах. Шырыня іх вагалася ад 3 да 3,15 м; абапал стаялі платы́ з абчасаных бярвёнаў дыяметрам ад 8 да 12 см. Быў знойдзены і драўляны водаправод у выглядзе труб, што складаліся з двух жолабаў, абгорнутых бяростай. Месцічы жылі ў драўляных хатах плошчай на 20–25 кв. м.

У 1309 г. будуюць трэцяе кола гарадскіх муроў, і з'яўляецца ўмацаваны Сярэдні горад. Пры канцы XIV – на пачатку XV ст. гарадскія муры дабудавалі і павялічылі іх таўшчыню да 4 м, а таксама зрабілі 6 вежаў з байніцамі.

© Фота Алега Трусава



Пскоў, абарончая вежа

У другой палове XIV ст. узводзіцца новы мураваны *сабор Святой Тройцы*, 20 мураваных храмаў у розных частках горада (напрыклад, *сабор Раства Багародзіцы Снетагорскага манастыра*, 1311) і чацвёртае кола гарадскіх муроў, абнесенае глыбокім ровам. Асобны раён горада называўся Запскоўскім і знаходзіўся на другім беразе ракі Пскавы.

З XIV ст. склалася самастойная *пскоўская будаўнічая школа*, якая адрознівалася ад наўгародскай. Пскоўскія дойліды стварылі аднакупальную, трохапсідную кубічную кампазіцыю храма, а таксама асобны тып бесслупавога храма з сістэмай прыступкавых скляпенняў. Роўныя пабеленыя сцены падзялялі плоскімі лапаткамі на тры часткі з паўкруглымі аркамі-выгбамі (закамарамі) у завяршэнні храма. У якасці прыкладу найлепшых дасягненняў тагачаснага пскоўскага дойлідства можна назваць цэрквы *Васілія з Горкі* (1413), *Успення з Паромення* (1444), *Казьмы і Дзям'яна з Прымосця* і *Міхаіла Архангела на Гарадзішчы* (абодва – 1462), *Успення ў Мялётаве* (1461–1462), *Мікіты Гусятніка* (1470), *Георгія з Узвозу* (1494). Адной з адметных рысаў шэрагу храмаў пскоўскай школы былі высокія шматпралётныя званіцы.

У XIV–XV стст. расквітнела і *пскоўская школа жывапісу*. Творы пскоўскіх майстроў вылучаюцца павышанай экспрэсіяй вобразаў, падкрэсленасцю блікаў і выразнасцю мазка пэндзля. Гэта фрэскі вышэйзгаданых сабора Раства Багародзіцы і царквы Успення. Да



© Sergeant Pepper

Царква Успення ў Мялётаве

другой паловы XIV ст. належаць унікальныя абразы *Сабор Маці Божай* і *Параскева Пятніца, Варвара і Ульяна*.



Параскева Пятніца, Варвара і Ульяна. *Пскоўскі абраз*

У XV ст. будуецца славуты *Пскоўска-Пячорскі* манастыр у мясцовасці Пячоры, які выконваў абарончую функцыю. У 1473 г. пабудавалі першую падземную пячорную *Успенскую царкву*. У XVI ст. вакол манастыра ўзнікае пасад; яго разам з манастыром абнеслі мурам з дзевяццю вежамі. Уваход вёў цераз *Святыя вароты* з вежай. Падземныя пячоры мелі даўжыню блізу 200 м. У XVI ст. у манастыры зрабілі шматпралётную двух'ярусную вежу-званіцу з гадзіннікам. У XVI–XVII стст. тут узвялі 4 царквы, якія дайшлі да нашых дзён.

У 1465 г. паўстае пятае кола гарадскіх муроў Пскова. Горад дзяліўся на сем канцоў, з іх два – у Запскоўі. Канцы падзяляліся на сотні. За межамі горада з'явіліся рамесныя слабоды. У цэнтрах канцоў, або слабод, пачалі будаваць храмы, якія адначасова былі складамі зброі.

У XVI ст. гарадскія муры мелі даўжыню 9 км і 37 вежаў (самы вялікі на той час мураваны крэмль); асабліва вылучалася *вежа Грымячая*, пабудаваная ў 1524 г. Пскоўскае культавае дойлідства мела свае асаблівасці. Таксама невялікія і ўзведзеныя з выкарыстаннем вапняковых пліт (як у Ноўгарадзе, ад якога Пскоў адасобіўся ў 1348 г.) храмы маюць больш прыземістыя прапорцыі. Асаблівасцю з'яўлялася завяршэнне асноўнага аб'ёму шматлопасцевымі аркамі і васьмісхільным дахавым пакрыццём. Разам з дадатковымі прыбудовамі вакол муроў у ніжнім ярусе гэта ўтварала прыціснутую да зямлі і блізкую да пірамідальнай агульную кампазіцыю. Барабаны аднагаловых цэркваў дэкаравалі паяскі трох- і чатырохкутных паглыбленняў (*царква Васілія-на-Горцы*, 1413).

Царква
Васіля-на-Горцы
ў Пскове




Пскоўскай адметнасцю было ўзвядзенне пры храмах асобных званіц з некалькімі арачнымі пралётамі (*царква Богаяўлення на Запскоўі*, 1496 г.), а таксама ўнікальная на Русі дэкарацыя сцен мураўлёнымі цёмна-зялёнымі кафлямі.

***3.5. Далейшы лёс Наўгародскай Русі.*** XIV ст. было эпохай чарговага росквіту Наўгародскай дзяржавы. Уся тэрыторыя краіны дзялілася на пяціны і воласці. Паблізу Фінскага заліва была Водзьская пяціна, бо там жыло фінскае племя *водзь*. Паміж рэкамі Мста і Лавацць знаходзілася Дзярэўская пяціна, а на рацэ Шалоні – Шалонская. Паблізу Цвяры была Бежацкая пяціна. На поўначы была воласць Завалочча, або Дзвінская зямля; побач Пермская зямля, Югра (Урал) і Пячора. Да сярэдзіны XIV ст. у Наўгародскую дзяржаву на правах аўтаноміі ўваходзіў Пскоў, але потым ён набыў самастойнасць. Іншымі гарадамі Наўгародскай зямлі былі Ладага, Волак-Ламскі, Вялікія Лукі, Таржок, Ржэў і Вятка.

Да 1354 г. у Ноўгарадзе быў адзін пасаднік, аднак потым з'явілася калегія пасаднікаў з шасці чалавек. Кіравалі краінай па чарзе – і кожны толькі адзін год. У 1417 г. калегія ўжо мела да 12 чалавек, а з 1423 г. – да 24. З іх кола прызначаўся пасаднік толькі на паўгода кіравання, і таму паступова пачаў выспяваць крызіс дзяржаўнай улады. Ад 1420 г. Ноўгарад меў свае манеты з выявай святой Сафіі. Гербам горада ў XV ст. стала выява вечавой ступені (прыступка-

вае збудаванне, трыбуна веча), а таксама, уздоўж яе, выява жазла пасадніка.

Насельніцтва краіны складалася з эліты – баяраў, «жытніх людзей» – буйных землеўласнікаў, дробных баяраў і купцоў. Асноўная маса месцічаў – гэта дробныя рамеснікі (*чорныя людзі*). У вёсках жылі сяляне – *палоўнікі* на прыватных баярскіх землях і *смерды* – на дзяржаўных. Былі яшчэ і сяляне-*земцы*; яны мелі ўласную зямлю, але апрацоўвалі яе разам з суседзямі, грамадою. Некаторыя гараджане мелі сваю зямлю за горадам, і таму іх звалі «лутшымі» людзьмі. Самых знатных баяраў у Ноўгарадзе было блізу 50 чалавек. Фактычна яны разам з епіскапамі (большасць з якіх мела, хутчэй за ўсё, грэцкае паходжанне) і кіравалі краінай.

У 1471 г. у Ноўгарадзе ўзнікла хрысціянская плынь («ерась») «жидовствующих», якая пазней пашыралася і ў Маскве. Гэтыя вернікі не прызнавалі Святой Тройцы, не лічылі богам Ісуса Хрыста, не прызнавалі святога крыжа, не верылі ў Багародзіцу і святых і чакалі прыходу Месіі. Доўгі час яны дзейнічалі патаемна, але потым, праз 15 гадоў, гэта стала вядомым. Супраць ерэтыкоў выступіў Іосіф Волацкі і напісаў на гэты конт адмысловую кнігу «Просветитель». На царкоўным саборы 1503 г. згаданую плынь забаранілі, а яе лідараў спалілі жыўцом.

Паступова палітычнае жыццё і сістэма кіравання ў Наўгародскай рэспубліцы пачалі сутыкацца з усё большымі праблемамі.

Заняпад Наўгародскай рэспублікі стаў вынікам найперш неспрыяльнай знешнепалітычнай кан'юнктуры. Мангола-татарская навала і пазнейшая экспансія маскоўскіх князёў, якая рабілася, натуральна, з ведама ўладароў Залатой Арды, моцна падарвалі дэмакратычны лад Ноўгарада і суседніх з ім паўночных княстваў Русі.


*Б. Чорыкаў*. Замірэнне наўгародцаў. 1335 г.

Пасля таго як маскоўскі князь Іван III пачаў называць Ноўгарад сваёй вотчынай, наўгародцы вырашылі прасіць дапамогі ў ВКЛ. Склалася антымаскоўская партыя на чале з удавой наўгародскага пасадніка Марфай Барэцкай і яе сынамі. У 1470 г. наўгародцы запрасілі на пасаду служылага князя Міхайлу Алелькавіча, праўнука Альгерда. У 1471 г. урад краіны накіраваў да вялікага літоўскага князя Казіміра паслоў з просьбаю далучыць Наўгародскую зямлю да ВКЛ на правах аўтаноміі. Гэта вельмі не спадабалася Маскве – яна пачала вайну і на рацэ Шалоні разбіла вялікае, але слабое з вайсковага гледзішча войска наўгародцаў на чале з сынам Марфы Дзмітрыем Барэцкім. Маскоўцы забілі некалькі дзясяткаў тысяч чалавек, некаторых забралі ў палон.

Наўгародская эліта была часткова знішчана фізічна, часткова адпраўленая ў маскоўскія турмы. Усю іх маёмасць забраў маскоўскі князь. Такім чынам, у 1478–1479 гг. Наўгародская рэспубліка канчаткова спыніла сваё існаванне.

***3.6. Пскоўская рэспубліка.*** Пскоўская дзяржава была невялікай і займала тэрыторыю ўздоўж рэк Вялікая і Нарова. З поўдня на поўнач яна мела даўжыню каля 300 км і шырыню блізу 100 км. Акрамя рэк Пскоўская зямля мела і два буйныя возеры – Чудскае і Пскоўскае.

Найвышэйшым органам улады было народнае веча, якое выбірала спачатку аднаго, а ад 1420 г. двух пасаднікаў, а таксама канчанскіх старастаў і соцкіх. Існавала *ўрадавая рада* на чале з запрошаным (найманым) князем, які кіраваў баявой дружынай і служыў за грошы (*корм*). Была таксама судовая калегія – *гаспода*, у якую ўваходзілі выбарныя чальцы з ліку баяраў.

Пскоўскае грамадства складалася з баяраў (якія не былі там вельмі багатымі), купцоў, рамеснікаў і вольных сялян, якіх звалі *земцамі* або *сябрамі*. Бедныя сяляне бралі зямлю ў арэнду і называліся *ізорнікамі*. Халопаў тут не было.

Вялікі ўнёсак у атрыманне Псковам незалежнасці ад Ноўгарада зрабіў князь *Даўмонт*. Гэты нальшчанскі князь у 1263 г. забіў Міндоўга, заснавальніка ВКЛ, і ў 1265 г. з дружынай колькасцю 300 чалавек уцёк у Пскоў, ратуючыся ад войска сына Міндоўга – Вой-

шалка. У 1266 г. ён прыняў хрысціянства, імя Цімафей і быў абраны пскоўскім князем. Доўгі час Даўмонт ваяваў з крыжакамі, а таксама з Полацкам, забіўшы нават полацкага князя Гердзеня. Пасля смерці князя кананізавалі як святога Цімафея – абаронцу Пскова, а яго меч пачаў лічыцца сімвалам незалежнасці.

У часы Гедыміна Пскоў хацеў канчаткова вызваліцца з-пад залежнасці ад Ноўгарада, таму яго адносіны з ВКЛ значна палепшыліся. Актыўна дапамагаў пскоўцам зяць Гедыміна Давыд Гарадзенскі. Калі крыжакі ў 1323 г. узялі ў аблогу Пскоў, ён адагнаў іх ад горада і знішчыў сценабітныя машыны крыжакоў.

У 1341 г. пскоўцы звярнуліся па падтрымку да Альгерда, і ён прыйшоў ім на дапамогу разам з Кейстутам. Сын Альгерда Андрэй быў ахрышчаны і стаў пскоўскім князем (1342–1345). Яго намеснікам быў таксама выхадзец з ВКЛ – Юрый Вітаўтавіч. У 1342 г. падчас абароны Пскова ад рук крыжакоў загінуў сын полацкага князя Воіна – Любка.

У 1348 г., пасля падпісання з Ноўгарадам *Болатаўскай дамовы*, Пскоўская дзяржава канчаткова стала незалежнай. Аднак духоўная ўлада засталася ў руках наўгародскага ўладыкі, які раз у тры гады прыязджаў у Пскоў і здзяйсняў царкоўны суд.

У XV ст. эканоміка Пскова знаходзілася на ўздыме. Сяляне вырошчвалі жыта, пшаніцу, авёс, ячмень. На гародах збіралі добрыя ўраджаі рэпы, цыбулі і капусты. Пскоўскі лён актыўна вывозіўся ў краіны Прыбалтыкі. Плённа развівалася рыбалоўства, выраблялісі вялікія лодкі – *учаны*. Славіліся і мясцовыя рамеснікі: яны шылі адзенне, апрацоўвалі металы і скуры, выраблялі солад і малолі зерне на муку. Пскоўскіх муляроў запрашалі на працу ў Маскоўю ды іншыя краіны Усходняй Еўропы. У Пскове квітнеў выраб званоў. Актыўна развіваўся гандаль з суседзямі – Цвярской дзяржавай, Ноўгарадам, Разанню, ВКЛ і з нямецкімі краінамі. Ад 1424 г. Пскоў наладзіў чаканку ўласнай сярэбранай манеты з выявай рысі – герба горада.

У XV ст. Пскоў паступова пачаў праводзіць прамаскоўскую палітыку, спадзеючыся такім чынам захаваць сваю незалежнасць. Ён падтрымліваў Маскоўю ў войнах з Ноўгарадам і ВКЛ, асабліва падчас вайны 1500–1503 гг. Але гэта не дапамагло пскоўцам, бо Масковія не хацела мець сярод сваіх сяброў незалежную рэспубліку.

13 студзеня 1510 г. маскоўскае войска ўвайшло ў Пскоў, быў спушчаны са званіцы вечавы звон – сімвал волі і незалежнасці. 300 самых багатых сем'яў пскоўскіх баяраў і купцоў маскоўскія ўладары адправілі ў высылку – прычым дазвалялі ўзяць з сабою толькі тое, што ў іх было на целе. Таму на дзяцей надзявалі па 2–3 футры, хавалі залатыя манеты ў жаночую бялізну.

Захаваліся пскоўскія летапісы XIV–XVII стст. колькасцю 25 спісаў. Найбольш цікавы – летапісны збор 1450–1460-х гг., які складаўся пры Траецкім манастыры.

З катастрофай Ноўгарада і Пскова на мяжы XV–XVI стст., як мяркуе вядомы амерыканскі даследчык Рычард Пайпс, са стратай альтэрнатыўных магчымасцяў – кодэксу індывідуальнага чалавека, павагі да прыватнай уласнасці і закона – шляхі развіцця будучай расійскай цывілізацыі (культуры) аж да XXI ст. разыходзяцца з Еўропай.

***3.7. Вялікае княства Цвярское.*** Гэта была ўнікальная дзяржава, на тэрыторыі якой бярэ пачатак найбуйнейшая рака Еўропы Волга і велізарным сапфірам блішчыць возера Селігер. Узнікла гэтая краіна на землях, заселеных смаленскімі крывічамі, у XIII ст. і праіснавала амаль да канца XV ст.

Горад Цвер узнік у XII ст. і спачатку належаў Ноўгараду, а з 1209 г. перайшоў пад уладу Уладзіміра-Суздальскага княства. Яго росквіт прыпадае на XIII–XV стст., калі ён стаў буйным культурным і рамесным цэнтрам. Цвярскія купцы гандлявалі з гарадамі Прыбалтыкі і Каўказа, Блізкага Усходу і Сярэдняй Азіі. Найбольш вядомы сярод іх – Афанасій Нікіцін, які ў 1466–1472 гг. стаў першым вядомым нам еўрапейцам, што здзейсніў вандроўку ў Індыю. Гэта быў адукаваны чалавек: ён валодаў арабскай, татарскай і персідскай мовамі. Спачатку па Волзе ён дабраўся да горада Дэрбента, адтуль пераехаў у Баку і Персію. З Персіі Нікіцін трапіў у арабскі порт Армуз, а потым морам дабраўся да Індыі. Назад вяртаўся праз Персію і горад Трапезунд – порт на Чорным моры. Пераплыўшы цераз Чорнае мора, ён высадзіўся ў Крыме ў горадзе Кафе (цяпер – Феадосія). Пераадолеўшы доўгі шлях з Крыма, ён крыху не даехаў дадому – увосень 1472 г. памёр непадалёк ад Смаленска. Шмат разоў выдаваліся

яго ўспаміны «Хаджэнне за тры моры». У 1955 г. у Цвяры землякі паставілі Афанасію Нікіціну помнік, зроблены з бронзы і граніту.

На пачатку XIII ст. Цвер – цэнтр *Пераяслаў-Залескага княства.* Але пасля разгрому Уладзіміра-Суздальскай зямлі мангола-татарамі Цвер атрымлівае ў 1247 г. незалежнасць пры князю Яраславе Яраславічу, родным браце Аляксандра Неўскага. З 1264 г. ён становіцца вялікім князем уладзімірскім. Неўзабаве ў Цвяры засноўваецца епіскапская кафедра, якую ўзначаліў былы полацкі епіскап Сімяон. Другім цвярскім епіскапам у 1289–1316 гг. быў Андрэй, сын полацкага князя Гердзеня.

Сталіцы новай дзяржавы, як некалі і Полацку, патрэбны быў мураваны сабор. І ён быў закладзены ў 1285 г. князем Міхаілам Яраславічам, яго маці княгіняй Аксінняй і епіскапам Сімяонам. Паколькі будаўніцтва храма ішло доўга, усярэдзіне зрабілі часовую драўляную капліцу.

Яшчэ адну мураваную царкву цверцы пачалі будаваць у 1323 г. на тэрыторыі Фёдараўскага манастыра. Пабудаваў храм у імя святога Фёдара ігумен манастыра Іван Цараградзец. Гэта быў белакаменны храм, які знішчылі ў 1773 г. На месцы гэтага храма археолагі знайшлі шмат кавалкаў белакаменных блокаў (у тым ліку адзін разны́) і вялікапамернай цэглы.

У 1369 г. князь Міхаіл Аляксандравіч умацаваў Цвер драўляным крамлём, а ў 1372-м насыпаў вакол горада земляны вал. Цяпер культурны слой Цвярскога крамля мае таўшчыню ад 4 да 5,6 м.

Вельмі плённа развівалася ў Цвяры выяўленчае мастацтва. Мясцовыя мастакі ў XIII–XV стст. стварылі ўласную *жывапісную школу*. Самыя вядомыя тут абразы і мініяцюры да рукапісаў. Яны вылучаюцца экспрэсіяй вобразаў і лінейнасцю пісьма. У Цвяры пісалі ўласныя *летапісы*, прычым некаторыя рукапісныя шэдэўры дайшлі да нашых дзён.

Найбуйнейшыя гарады Цвярской дзяржавы – Кашын, Ксняцін, Зубцоў, Старыца, Холм, Мікулін і Дарагабуж. На мяжы ВКЛ, Вялікага Ноўгарада, Маскоўскай дзяржавы і Цвяры стаяў горад *Ржэў*, дзе беларуская прысутнасць зафіксавана яшчэ на этнаграфічных картах XIX – пачатку XX ст. Пэўны час Ржэвам адначасова валодалі і ВКЛ, і Ноўгарад, а жыхары горада сваю даніну дзялілі напалам паміж двума вышэйзгаданымі ўладальнікамі.

У XIV ст. змаганне паміж цвярскімі і маскоўскімі князямі за ярлык на вялікае ўладзімірскае княжанне ўзмацнілася. Адзін сучасны расійскі гісторык напісаў: на баку цвярскіх князёў былі правы старшынства, асабістае геройства, юрыдычныя і маральныя сродкі, а на баку маскоўскіх – грошы і майстэрства прыстасоўвацца да абставінаў. Тым часам Цвер наладзіла сяброўскія адносіны з ВКЛ. У 1320 г. дачка Гедыміна Марыя выйшла замуж за цвярскога князя Міхаіла, а неўзабаве дачка Кейстута стала жонкаю князя Івана Міхайлавіча. Нярэдка палкі Цвяры ваявалі разам з войскамі ВКЛ супраць крыжакоў. У змаганні з цвярскімі князямі маскоўскія ўладары ўвесь час апіраліся на Арду і татарскія войскі. Так, маскоўскі князь Юрый Міхайлавіч знішчыў у Ардзе свайго сваяка Міхаіла Цвярскога, але неўзабаве быў сам забіты ягоным сынам.

У 1327 г. Цвер узначаліла паўстанне супраць Арды. У горадзе быў забіты татарскі пасланнік і перабіты ягоны атрад. Тады залатаардынскі хан даручыў маскоўскаму князю Івану Каліце пакараць цверцаў. Каліта ўзначаліў татарскае войска, знішчыў паўстанцаў і дашчэнту разрабаваў Цвярскую дзяржаву. За гэта ў 1328 г. ён атрымаў тытул вялікага князя.

Аднак Цвер паступова адрадзілася, і з дапамогай вялікага князя літоўскага Альгерда, які ў 1347 г. узяў свой другі шлюб з цвярской князёўнай Юльянай, працягвала змагацца з Масквою. У лістападзе 1368 г. Альгерд падтрымаў цверцаў, пайшоў на Маскву, узяў яе ў аблогу і тры дні стаяў пад мурамі горада, пакуль не атрымаў выкуп.

У 1370 г. маскоўскі князь Дзмітрый зноў напаў на Цвер. Альгерд робіць другі паход на Маскву і 6 снежня 1370 г. бярэ яе ў аблогу. Тым часам цвярскі князь атрымаў у Ардзе ярлык на валоданне Уладзімірскім княствам. У 1372 г. войскі ВКЛ на чале з Вітаўтам і Кейстутам зноў уварваліся ў Масковію, каб падтрымаць свайго саюзніка. У 1375 г. маскоўскі князь Дзмітрый арганізаваў своеасаблівы крыжовы паход на Цвер, мабілізаваўшы вайсковыя дружыны 19 удзельных князёў. Цвярскі князь Міхаіл мужна абараняўся, аблога Цвяры доўжылася 5 тыдняў, але горад не здаваўся. Тады захопнікі разбурылі і знішчылі іншыя паселішчы вакол горада. Князь Міхаіл прапанаваў замірыцца, што і было зроблена.

У 1385 г. цвярскі князь Васілій Міхайлавіч ажаніўся з дачкой

кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча, і сувязі з дынастыяй Гедымінавічаў зноў узмацніліся. Гэтаму спрыяла і тое, што сын вялікага князя Альгерда і цвярской князёўны Ягайла ў 1386 г. стаў польскім каралём. У 1430 г. вялікі князь Вітаўт разам з маскоўскім князем Васіліем Васільевічам запрасіў на сваю каранацыю і цвярскога князя Барыса Аляксандравіча. Шэсць тыдняў балявалі госці ў князя Вітаўта, але каранацыя не адбылася, бо на дарозе праз Польшчу карону скралі, а сам Вітаўт неўзабаве памёр. Аднак сувязі цвярскіх князёў і Гедымінавічаў заставаліся моцнымі, бо ад Альгерда цвярская княгіня нарадзіла, акрамя знакамітага Ягайлы, яшчэ сем сыноў.

Найбольшы росквіт эканомікі і культуры Цвярской дзяржавы прыпадае на першыя дзве траціны XV ст., калі ў Масковіі ішлі доўгія грамадзянскія войны і набегі на Цвер спыніліся.

На пачатку XV ст. цвярскі князь Іван Міхайлавіч ужо б'е свае манеты. Шырокая слава ідзе пра цвярскіх гарматнікаў, самых лепшых на ўсходнеславянскіх землях: у пісьмовых крыніцах згадваецца імя знакамітага майстра-гарматніка сярэдзіны XV ст. Мікулы Крачэтнікава.

Апошні росквіт дзяржавы адбываецца пры згаданым вышэй князю Барысе Аляксандравічу. Вядомая яго асабістая зброя – рагаціна (разнавіднасць дзіды) з надпісам, што гэта «рагаціна вялікага князя Барыса Аляксандравіча». Яе рукаяць абкладзена срэбрам і мае шмат гравіровак. Сярод іх – сцэны барацьбы, палявання, гутаркі, мыцця ў лазні, пачастунку і г. д.

Аднак пры Іване III Масковія зноў узмацнілася, вызвалілася ад ардынскай залежнасці і захапіла землі Ноўгарада. Надышла чарга і Цвяры. Спачатку тут, як у Ноўгарадзе, Пскове або Разані, сярод баяраў была створана свая «пятая калона», якую Масква падкупіла грашыма. Вялікі князь літоўскі Казімір, зрабіўшыся адначасова і польскім каралём, не захацеў падтрымаць ні Ноўгарад, ні Цвер. У верасні 1485 г. войскі Івана III узялі Цвер у аблогу. Праз некалькі дзён падкупленыя баяры перайшлі на бок Масквы, і цвярскі князь Міхаіл Барысавіч з невялікай дружынай здолеў дабрацца да межаў ВКЛ, а яго маці, князёўну Анастасію, узялі ў палон і вывезлі ў Маскву. «І так скончылася Вялікае княства Цвярское», – сумна канстатуе летапісец у Валынскім кароткім летапісе.

# АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Абшчына (грамада)*** – форма аб'яднання людзей; характарызуецца агульным валоданнем сродкамі вытворчасці, поўным або частковым самакіраваннем.

***Апсіда*** – тэрмін з архітэктуры; азначае выступ будынка паўкруглай або шматвугольнай формы, накрыты купалам або самкнёным скляпеннем. У галоўнай апсідзе змяшчаўся алтар.

***Веча*** – народны сход у княствах Заходняй, Паўднёва-Заходняй і Паўночна-Заходняй Русі. Складаўся з мужчын. Веча прымала рашэнні па пытаннях вайны і міру, зацвярджала законы, заключала дамовы з іншымі землямі, пазывала і праганяла князёў (галоўная функцыя якіх палягала ў камандаванні рэгулярным войскам-дружынай). У Ноўгарадзе, Пскове і Вяцкай зямлі дзейнічала да XVI ст.

***«Жыцці людзі»*** – грамадскі стан у Ноўгарадзе; займаў прамежкавае становішча паміж баярамі і сярэднім купецтвам.

***Земцы*** – слой сялян-уласнікаў, характэрны для Наўгародскай і Пскоўскай земляў.

***Народнае рушанне (апалчэнне)*** – вайсковыя атрады, якія ствараліся падчас вайны з дваран, гараджан і свабодных сялян.

***Наўгародска-маскоўская ерась*** (***«жидовствующие»***) – рух у Ноўгарадзе і Маскве, які склаўся пры канцы XV ст. і адмаўляў аўтарытэт ды абрады афіцыйнай праваслаўнай царквы.

***Палоўнікі*** – залежныя сяляне, якія працавалі на землеўласніка, аддаючы яму звычайна палову ўраджаю.

***Пасаднік*** – галава выканаўчай улады ў Ноўгарадзе і Пскове.

***Пяціны*** – адміністрацыйныя вобласці ў Ноўгарадзе.

***Рада паноў*** – вышэйшая судовая палата ў Ноўгарадзе і Пскове.

***Радовіч*** – часоваабавязаны, паўсвабодны смерд, які трапіў у часовую залежнасць у выніку «раду» – дамовы, на падставе якой ён працаваў у гаспадара.

***Смерды*** – усё вясковае насельніцтва, вольныя сяляне, якія плацілі даніну; напалову свабодныя княскія даннікі, якія карысталіся княскай зямлёй і адпрацоўвалі павіннасць.

***Тысяцкі*** – камандзір вайсковага народнага рушання.

***Уладыка*** – найвышэйшы царкоўны іерарх у Ноўгарадзе.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА


Андреев, В. Ф. Северный страж Руси: очерки истории средневекового Новгорода. Ленинград: Лениздат, 1989. 175 с.

Мартышин, О. В. Вольный Новгород. Общественно-политический строй и право феодальной республики. Москва: Российское право, 1992. 384 с.

Монин, М. А. Планета Тверь. Культура Тверского княжества периода независимости (1247–1485). Москва: Спутник+, 2016. 333 с.

Мусин, А. Е. Церковь и горожане средневекового Пскова: Историко-археологическое исследование. С.-Петербург: Факультет филологии и искусств СПбГУ, 2010. 364 с.

Подвигина, Н. Л. Очерки социально-экономической и политической истории Новгорода Великого в XII–XIII вв. Москва: Высшая школа, 1976. 154 с.

Трусаў, А. А. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. Выд. 2-е, папр. і дапоўн. Мінск: Кнігазбор, 2013. 124 с.

Штыков, Н. В. Социально-политическое развитие Тверской земли в XIV – первой четверти XV в.: дис. … канд. ист. наук. Санкт-Петербург, 2004. 234 с.

Янин, В. Л. Средневековый Новгород. Москва: Наука, 2004. 416 с.

Leuschner, J. Novgorod: Untersuchungen zu einigen Fragen seiner Verfassungs- und Bevölkerungsstruktur. Berlin: Duncker&Humblot, 1980. 288 S.

# 4. МАСКОЎСКАЕ КНЯСТВА І ЗАЛАТАЯ АРДА

***4.1. Перадгісторыя Залатой Арды.*** На пачатку XIII ст. сітуацыя ва Усходняй Еўропе пачала кардынальна мяняцца. У Прыбалтыцы, дзе жылі розныя балтыйскія і фіна-ўгорскія народы, з'явіліся спачатку нямецкія, а потым і дацкія заваёўнікі. Ужо ў 1200–1201 гг. немцы захапілі вусце ракі Дзвіны і пабудавалі там горад-крэпасць *Рыгу*, узяўшы, такім чынам, пад кантроль гандаль на рацэ Дзвіне. На тэрыторыі Прыбалтыкі ўзнікла нямецкая дзяржава – спачатку *ордэн мечаносцаў*, а потым *Лівонскі* (*Інфлянцкі*) *ордэн* (васал яшчэ больш магутнай крыжацкай дзяржавы – *Тэўтонскага, або Нямецкага, ордэна*).

Адначасова ў Цэнтральнай Азіі мангольскія качавыя плямёны стварылі новую дзяржаву на чале з Тэмуджынам, які пазней атрымаў імя Чынгісхан (1155–1227). Ён рана страціў бацьку, меў вельмі складаны лёс, але ў 1206 г. прыйшоў да ўлады і стаў Чынгісханам (*Вялікім ханам*) манголаў.



Фрагмент помніка Чынгісхану ў аэрапорце Улан-Батара (Манголія)

Менавіта Чынгісхан у значнай ступені заклаў падмурак адзінага мангольскага народа, увёў пісьмовасць на аснове ўйгурскай традыцыі, арганізаваў вядзенне справаводства і судовай справы.

Манголы атрымалі своеасаблівы закон «Ясу»; у іх была свая язычніцкая рэлігія. Спачатку войска Чынгісхана налічвала толькі 13 тыс. ваяроў, але

яно ўвесь час павялічвалася за кошт іншых качэўнікаў. Манголы здолелі разбіць войска Мухамеда, шаха Харэзма, колькасцю да 400 тыс. чалавек, прычым 160 тысяч з іх загінулі. Значная колькасць гарадоў Сярэдняй Азіі была разрабаваная, а іх насельніцтва знішчана.

Манголы былі намадамі (качэўнікамі) і разглядалі аселыя (земляробчыя) народы як крыніцу ўзбагачэння і здабыцця нявольнікаў. Таму яны знішчалі гарады і гарадское насельніцтва, разбуралі помнікі гісторыі і культуры. Загінулі сотні тысяч чалавек у розных краінах. Ацалелае мясцовае насельніцтва абкладалася рознымі падаткамі і павіннасцямі. Улада належала намеснікам Чынгісхана, якія кіравалі мясцовымі калабарантамі з ліку землеўласнікаў, купцоў і святароў.

Чынгісхан стварыў магутную вайскова-адміністрацыйную сістэму. Насельніцтва яго дзяржавы было падзелена на сотні, тысячы і дзясяткі тысяч (*цьмы*), якія выстаўлялі адпаведную колькасць ваяроў. Кіраўнікі вайсковых адзінак адначасова кіравалі пэўнай тэрыторыяй з мірным насельніцтвам. Кіраўніком дзяржавы быў *хан* (*каган*), які нібыта атрымаў уладу са згоды Неба. Пры ім была рада, якая складалася з ягоных сваякоў і буйных землеўласнікаў, а таксама гвардыя. Існавалі чыноўнікі, якія кіравалі ханскім дваром (*ардой*), казной, размяркоўвалі зямлю пад выпас свойскай жывёлы, збіралі падаткі і даніну, выконвалі паліцэйскія функцыі. Каб вырашыць самыя галоўныя пытанні, ханы праводзілі агульныя з'езды (*курултаі*), дзе збіралася мясцовая эліта.

У войску была жалезная дысцыпліна. Манголы мелі захопленую ў кітайцаў аблогавую тэхніку (сценабітныя машыны, балісты і катапульты) для штурму гарадоў. Колькасць войска – ад 150 да 250 тыс. чалавек. Кожны мангол быў цяжкаўзброеным вершнікам, меў лук, шаблю, шалом і панцыр з тоўстай скуры. Рухалася войска вельмі хутка, бо кожны вершнік меў адразу некалькі коняў. Манголы мелі вельмі добрую выведку і таму хутка бралі штурмам гарады ды пераадольвалі рэкі.

У 1207–1215 гг. яны заваявалі Сібір і Паўночна-Заходні Кітай. Таксама былі захоплены Карэя, Паўночная Індыя і Блізкі Усход. Потым мангольскія войскі дабраліся да Еўропы. 31 траўня 1223 г. на

*рацэ Калцы* пад камандай Субэдэя і Джэбэ яны разбілі аб'яднаныя атрады полаўцаў і паўднёва-славянскіх князёў на чале з Мсціславам Удатным, князем галіцкім, і Мсціславам Старым, вялікім князем кіеўскім. Манголы дайшлі да Дняпра, але неўзабаве вярнуліся ў Азію.

Такім чынам, Чынгісхан стварыў самую вялікую ў свеце імперыю. Пасля смерці Чынгісхана ў 1227 г. яго пераемнікам стаў Угэдэй (1229–1241). Ён стварыў сістэму паштовай (ямской) службы. Паштовыя станцыі (*ямы*) мясцовае насельніцтва забяспечвала коньмі, харчаваннем і ўсім неабходным. У 1235 г. Угэдэй пабудаваў горад *Каракарум* – сталіцу Мангольскай імперыі. Сталіца знаходзілася за 320 км на паўднёвы захад ад сённяшняй сталіцы Манголіі – горада Улан-Батара.

***4.2. Утварэнне Залатой Арды.*** Назва краіны «Залатая Арда» ўпершыню згадваецца ў 1566 г. у напісаным па-маскоўску творы «Казанская гісторыя». У персідскіх і ў золатаардынскіх крыніцах краіна называецца Улус. Слова «арда» тут разумеецца як стаўка ці парадны лагер кіраўніка краіны. У славян напачатку «ардой» называлі войска, але на мяжы XIII–XIV стст. гэта слова адносіцца ўжо да краіны. Заходнееўрапейскія крыніцы гэтую дзяржаву ведалі пад назвай «краіна татараў», «зямля татараў» або проста «Татарыя». У гістарычнай літаратуры, асабліва велікарускай, азіяцкіх заваёўнікаў называлі *мангола-татарамі*. Так потым называлі і насельнікаў Залатой Арды. У сапраўднасці, манголы не мелі ніякага дачынення да татараў і сваю дзяржаву называлі мангольскай.

Вызначэнне «татары» мае кітайскае паходжанне і ўзнікла ў XII ст. Татарамі кітайцы звычайна называлі качэўнікаў, якія жылі каля паўночнай мяжы Кітая і ахоўвалі падыходы да Вялікага Кітайскага муру ад нападаў іншых качэўнікаў. За гэта кітайскія імператары плацілі ім грошы і давалі розныя тавары. У шырокім сэнсе гэтага слова татарамі кітайцы называлі адсталых суседзяў, і паняцце «татары» адпавядала значэнню слова «варвары». Таму розныя плямёны паўночных качэўнікаў мелі ў кітайцаў агульную назву «татары». Прычым кітайцы называлі тых татараў, якія ім служылі, «белымі», а іншых, у тым ліку манголаў, – «чорнымі», што вызначала іх больш адсталымі за «белых татараў». Некаторыя

даследчыкі лічаць, што татары зусім не былі хаўруснікамі манголаў, а наадварот, з імі ваявалі.

У XIII–XV стст. усходне- і заходнееўрапейскія крыніцы называюць татарамі жыхароў Залатой Арды, прытым што самі заснавальнікі гэтай дзяржавы лічылі сябе манголамі.

Расійскія гісторыкі, сучаснікі згаданага Васілія Тацішчава і Мікалая Карамзіна, лічылі, што значная частка мангольскага войска складалася з татараў, а манголы толькі імі кіравалі – таму слова «татары» для іх адпавядала значэнню слова «заваёўнікі». Шэраг пісьмовых крыніц сведчыць, аднак, што ў войсках Чынгісхана, а тым больш Батыя, татараў амаль не было. (Дарэчы, сённяшнія татары, якія жывуць у Расіі, хутчэй за ўсё, не маюць ніякага дачынення да тых татараў, якія некалі жылі каля паўночнай кітайскай мяжы.)



Хан Бату (Батый).
*Кітайская мініяцюра XIII ст.*

Перадгісторыю Залатой Арды гісторыкі адлічваюць ад 1224 г., калі Чынгісхан падзяліў сваю імперыю паміж сынамі. У гонар сына Чынгісхана Джучы яго краіну пачалі называць *Улус Джучы*. Пасля заходняга паходу (1236–1242) вышэйпамянёнага Батыя (больш правільна: Бату), сына Джучы, Улус Джучы пашырыўся на захад, і цэнтрам яго стала Ніжняя Волга.

Батыева войска налічвала ад 37,5 да 75 тыс. чалавек і мела дасканалую аблогавую тэхніку для штурму гарадоў. Спачатку яно напала на *Волжскую Булгарыю* – суседа Разанскага і Уладзіміра-Суздальскага княстваў.

***4.3. Волжская Булгарыя.*** Яшчэ ў 965 г., пасля знішчэння Хазарскага каганата, падначаленая яму Булгарыя стала незалежнай краінай. У 922 г. булгары прынялі іслам, а іх правадыр атрымаў тытул

*эміра*. Першай сталіцай Булгарыі быў горад *Булгар*, сучасны Болгар, а ў XII ст. сталіцай стаў *Біляр*.

У 1006 г. Кіеў заключыў з Волжскай Булгарыяй гандлёвую дамову, у адпаведнасці з якой булгарскія купцы маглі вольна гандляваць на Ацэ і Волзе, а кіеўскія – у Булгарыі. У XI – пачатку XIII ст. булгары ваююць з пераменным поспехам з суздальскімі і ўладзімірскімі князямі. У 1223 г., калі войскі манголаў пасля перамогі над Кіевам і полаўцамі ішлі праз землі булгараў, то былі там разбітыя булгарскім войскам. Аднак ужо ў 1229 г. булгары і полаўцы, у сваю чаргу, пацярпелі паражэнне ад манголаў на рацэ *Урале*.

У 1236 г. войска манголаў на чале са згаданым Субэдэем, самым здольным вайскаводам хана Батыя, разграміла краіну, спаліла булгарскія гарады і забіла вялікую колькасць людзей. У выніку чарговых паходаў манголаў у 1239 і 1240 гг. уся тэрыторыя Волжскай Булгарыі ўвайшла ў склад Мангольскай дзяржавы. Аднак у XV ст. булгары аднавілі сваю дзяржаўнасць у выглядзе *Казанскага ханства* са сталіцай у горадзе *Казані*.

Паводле падлікаў навукоўцаў насельніцтва краіны складала 1,5–2 млн чалавек. Волжскія булгары цяпер лічацца продкамі сучасных казанскіх татараў, чувашоў і часткова башкіраў.

***4.4. Новыя паходы Залатой Арды.*** У 1236 г. хан Батый арганізаваў новы паход у заходнім напрамку. Пры канцы 1237 г. яго войскі знішчылі гарады Разань, Каломну, Маскву, Уладзімір, Суздаль, Яраслаўль, Казельск і іншыя вялікія паселішчы. У сакавіку 1238 г. войскі князя Юрыя Уладзіміравіча былі разбіты на *рацэ Сіці*. Атрады заваёўнікаў з’явіліся і на тэрыторыі Смаленскага княства, аднак Смаленск захапіць не здолелі. Пра змаганне смалян з манголамі распавядае «Аповесць пра Меркурыя Смаленскага». Смаляне выстаялі, прытым што пачынаючы з 60-х гадоў XIII ст. і яны мусілі плаціць даніну Залатой Ардзе.

У 1239–1240 гг. манголы разгрэмілі паўднёвыя, а таксама паўднёва-заходнія ўсходнеславянскія княствы: Пераяслаўскае, Кіеўскае і Чарнігаўскае. Разбураны Кіеў не мог аднавіцца цягам больш як 200 гадоў.

Вялікія княствы Уладзіміра-Суздальскае, Разанскае ды некаторыя

іншыя меншыя княствы ўвайшлі ў склад Залатой Арды. Ноўгарад і Пскоў, хоць і не былі захоплены манголамі, мусілі таксама прызнаць вярхоўную ўладу вялікага хана Залатой Арды. Толькі жыхары сучаснай Беларусі, якія разам з рознымі балцкімі плямёнамі стварылі ў XIII ст. новую моцную дзяржаву Вялікае Княства Літоўскае, не прызналі ўладу мангольскіх ханаў і вялі з імі доўгае і пасьяховае змаганне.

Пасля смерці Батыя правадыром імперыі стаў яго брат Берке (1257–1266). Яшчэ ў маладосці ён прыняў іслам, і гэта дапамагло яму атрымаць падтрымку ўплывовых мусульманскіх колаў Волжскай Булгарыі і Сярэдняй Азіі. Шмат адукаваных мусульман сталі дзяржаўнымі чыноўнікамі, што ўмацавала новую дзяржаву. У ардынскіх гарадах будавалі *мячэці* і *мінарэты*, *медрэсэ* і *караван-сараі*. Сталіцай дзяржавы стаў горад *Сарай-Бату* – пазней ён называўся *Сарай-Берке* – непадалёк ад сучаснай Астрахані. Берке запрасіў з Персіі і Егіпта навукоўцаў, багасловаў і паэтаў, а з Харэзма – рамеснікаў і купцоў.

У часы ўладарання чарговага хана, Менгу-Цімура (1266–1282), Улус Джучы канчаткова стаў незалежным ад цэнтральнага ўрада ў Манголіі. Адбылося гэта ў 1269 г. Пасля смерці Менгу-Цімура і міжусобнай барацьбы паміж рознымі кланамі да ўлады ў 1299 г. прыйшоў хан Тахта.



Сцяг Залатой Арды. 1339 г. (*паводле некаторых крыніц – фон быў жоўты*)

Яшчэ да 1240 г. манголы ўключылі ў склад Залатой Арды паўночна-ўсходнія і паўднёвыя землі былой Кіеўскай Русі. Найбольш пацярпелі землі будучай Расійскай дзяржавы, дзе з 1240 па 1480 г. усталявалася *панаванне*, ці *ярмо* («*иго*»), мангольскіх вялікіх ханаў Залатой Арды. З мэтай забеспячэння больш зручнага кіравання апошнія падзялілі захопленыя землі на невялікія ўдзельныя княствы. Каб кіраваць сваім удзелам, адпаведны князь, з'яўляючыся золатаардынскім васалам, мусіў прасіць у вялікага хана дазвол

у выглядзе спецыяльнай граматы, што называлася *ярлыком*. Галоўны ярлык хан даваў уладзімірскаму князю, які, у сваю чаргу, меў уладу над іншымі ўдзельнымі князямі.

Непасрэднымі прадстаўнікамі хана Залатой Арды былі яго намеснікі –*баскакі*, якія мелі карныя вайсковыя атрады для кантролю за зборам даніны. Татары перапісалі ўсё насельніцтва і вызначылі памер даніны для кожнага чалавека. Першым ярлык на вялікае княжанне атрымаў Аляксандр Неўскі, які быў пераяслаўскім князем.

Постаць Аляксандра Неўскага – адна з самых знакавых у расійскай гісторыі. Ён паходзіў з роду вялікіх уладзіміра-суздальскіх князёў: нарадзіўся ў 1219 г. у Пераяславе-Залескім, якім валодаў яго бацька – брат вялікага князя Юрыя Усеваладавіча. Пасля таго як князь Юрый і ўся яго сям'я загінулі, вялікім князем уладзімірскім стаў яго бацька Яраслаў. Менавіта Яраслаў – той першы князь-калабарант, які прызнаў уладу хана Батыя, двойчы быў у Ардзе, а таксама ў Манголіі.

Малады Аляксандр быў служылым наўгародскім князем і камандаваў наўгародскай дружынай. У 1240 г. узнік ваенны канфлікт са шведамі. Марскі флот шведаў з войскам увайшоў у раку Няву і спыніўся ў вусці ракі Іжоры. Камандаваў шведамі ярл (князь) Біргер. Ён і паслаў выклік на бітву дваццацігадоваму князю Аляксандру. Пісьмовыя крыніцы паведамляюць, што войскі Біргера, дзе акрамя шведаў былі нарвежцы і фіны, налічвалі 5 тысяч чалавек, а дружына наўгародцаў – толькі 300 ваяроў і 500 апалчэнцаў. Атрад князя Аляксандра нечакана для шведаў падышоў да іх і раптоўна напаў. У бойцы наўгародцы патапілі тры варожыя караблі і знішчылі шведскі лагер на беразе. Шведы адступілі і адплылі на ацалелых караблях з месца бітвы. Тады пераможца і атрымаў мянушку Аляксандр Неўскі. Але неўзабаве князь пасварыўся з наўгародскімі баярамі, у выніку яго прагналі, і ён паехаў да бацькі ў горад Пераяслаў-Залескі.

Тым часам войскі Лівонскага ордэна захапілі крэпасць Ізборск і горад Пскоў, і ў 1241 г. наўгародскае веча зноў запрасіла Аляксандра Неўскага камандаваць сваім войскам. Апошні пагадзіўся, узяў у бацькі дружыну і вярнуўся ў Ноўгарад. Разам з наўгародцамі Аляксандравы ваяры захапілі лівонскую крэпасць *Капор'е*, а потым і цалкам выгналі лівонцаў са Пскова. 5 красавіка 1242 г. на Чудскім возеры адбылася галоўная бітва з лівонскімі рыцарамі, якая атры-

мала назву *Лядовага пабоішча.* У выніку бітвы загінула больш за 20 прышлых рыцараў. Лівонцы прапанавалі мір і вярнулі Ноўгараду захопленыя тэрыторыі.

У 1246 г. памёр бацька Аляксандра. Сын мусіў вярнуцца ва Уладзімір, дзе стаў вялікім князем. Перад гэтым Папа Рымскі Інакенцій IV даслаў да Аляксандра Неўскага сваіх кардыналаў Гальта і Гемонта з прапановай выступіць разам супраць манголаў, але перад гэтым, безумоўна, прыняць каталіцтва. Ідэю аб'яднання хрысціянскіх сіл супраць манголаў падтрымлівалі князі паўднёвых княстваў, аднак Аляксандр катэгарычна адмовіўся і прыняў прапанову хана Батыя прыехаць да яго на паклон. Хан зацвердзіў яго на пасадзе вялікага князя ўладзімірскага, аддаўшы яму Кіеў і ўсю Паўднёвую Русь. Паводле некаторых сведчанняў, Батый нават назваў Аляксандра Неўскага сваім прыёмным сынам і братам роднага сына – Сартака (які быў праваслаўным). За службу хану прыйшлося дорага заплаціць, і заплаціць крывёй сваіх супляменнікаў. Аляксандр Неўскі задушыў паўстанне наўгародцаў і суздальцаў супраць хана і мусіў ездзіць на паклон да хана Берке, які кіраваў Ардою пасля смерці Батыя.

У сваёй дзейнасці Аляксандр абапіраўся на праваслаўную царкву, якая таксама прызнала ўладу хана і малілася за яго здароўе. Вось жа, духавенства абвясціла Аляксандра Неўскага сваім абаронцам. Увосень 1263 г. па дарозе з Арды ён моцна захварэў і 14 лістапада памёр. Хадзілі чуткі, што ў Ардзе яго папросту атруцілі.



*Б. Чорыкаў.* Аляксандр Неўскі прымае схіму перад сконам

У часы Расійскай імперыі Аляксандр Неўскі зрабіўся яе сімвалам. Пётр I пабудаваў на беразе Нявы манастыр, назваў яго *Аляксандра-Неўскай лаўрай* і загадаў перанесці туды з горада Уладзіміра парэшткі Аляксандра Неўскага. Паводле загаду Пятра I Аляксандра Неўскага

пачалі ўшаноўваць як пераможцу ў самай першай бітве са шведамі. 30 жніўня 1725 г., у дзень чацвёртай гадавіны заключэння Ніштацкага міру са Швецыяй, імператрыца Кацярына I заснавала ордэн святога Аляксандра Неўскага.

Чарговы раз Аляксандра Неўскага ўспомніў Іосіф Сталін. Быў зняты мастацкі фільм у яго гонар, і з'явіўся адпаведны савецкі ордэн, які давалі камандзірам за баявыя заслугі. Не забывала Неўскага і белая эміграцыя. Яна назвала яго заснавальнікам ідэі Еўразіі – асобнага свету і асобнай цывілізацыі. Гэтую ідэю прапаведавалі, сярод іншага, расійскі эмігрант Георгій Вярнадскі і савецкі гісторык Леў Гумілёў. Цяпер Аляксандр Неўскі з'яўляецца адным з галоўных герояў сучаснай афіцыйнай Расіі і Рускай праваслаўнай царквы.

***4.5. Залатая Арда ў XIV–XV стст.*** У першай палове XIV ст. назіраецца росквіт Залатой Арды, асабліва падчас уладарання хана Узбека (1313–1341) і яго сына Джанібека (1342–1357). На пачатку 1320-х гадоў Узбек абвясціў іслам адзінай дзяржаўнай рэлігіяй у краіне. Прыхільнікаў язычніцтва ён жорстка караў і наогул быў вельмі брутальным уладаром. Маскоўскія і цвярскія князі, якія мусілі прасіць права на кіраванне сваімі княствамі, вельмі яго баяліся і перад паездкамі ў сталіцу Арды пакідалі духоўныя тастаменты і наказы сваім дзецям на выпадак сваёй смерці (што і здаралася час ад часу). Хан Узбек пабудаваў новы горад *Сарай-аль-Джэдзід* («Новы палац») і шмат увагі прысвячаў караваннаму гандлю. Арда актыўна гандлявала з краінамі Заходняй Еўропы, Малой Азіі, з Егіптам, Індыяй і Кітаем.

На пачатку XIV ст. Узбек зрабіў у сваёй краіне адміністрацыйна-тэрытарыяльную рэформу. Былі створаны чатыры вялікія ўлусы: Сарай, Харэзм, Крым і Дэшт-і-Кыпчак. На чале іх хан паставіў эміраў (*улусбекаў*). Галоўнага ўлусбека, намесніка хана, называлі *беклербекам*. Наступным паводле пасады быў *візір*. Гэтыя чатыры ўлусы дзяліліся на 70 дробных уладанняў (*туменаў*) на чале з *цемнікамі* (*туменбашы*). Пасля цемніка, які камандаваў дзесяццю тысячамі мангольскіх ваяроў, ішлі пасады тысячніка, сотніка і дзясятніка. У Залатой Ардзе было шмат гарадоў: іх агульная колькасць даходзіла да 150. Самымі вялікімі былі Сарай-Бату, Сарай-Берке, Булгар, Казань, Азык (Азоў), Ургенч ды іншыя.

Для вядзення міжнароднага гандлю Арда выкарыстоўвала гандлёвыя калоніі генуэзцаў у Крыме і вусці Дона. Ардынскія купцы гандлявалі сукном, рознымі тканінамі, зброяй, ювелірнымі ўпрыгожаннямі, каштоўнымі камянямі, футрам, скурай, мёдам, воскам, соллю, збожжам, лесам, рыбай, аліўкавым алеем і нявольнікамі. Галоўнай гандлёвай ракой была Волга. Залатая Арда выпускала свае манеты, срэбныя дырхемы і медныя *пулы* ды *сумы*.

Арда мела вялікае войска, у асноўным гэта былі коннікі. Ардынцы вельмі добра валодалі шабляй і трапна стралялі з лукаў. З XIV ст. яны насілі кальчугі і кольчата-пласцінчатыя даспехі. Пры канцы XIV ст. у войску з'явіліся арбалеты і гарматы.

Значную частку насельніцтва Арды складалі шматлікія цюркскія народы, збольшага качэўнікі. Таксама тут жылі славяне, фіна-ўгорскія і паўночна-каўказскія народы. Пасля таго як пры канцы XIV – на пачатку XV ст. качэўнікі Залатой Арды атрымалі агульную назву (этнонім) «татары», менавіта з іх вылучыліся волжскія і сібірскія татары. З усходняй часткі Залатой Арды паходзяць сучасныя казахі, каракалпакі і нагайцы.

Асаблівыя дачыненні склаліся ў ханаў Залатой Арды з заваяванымі імі ў XIII ст. усходнеславянскімі княствамі. Самыя вялікія з іх – Уладзіміра-Суздальская, Мурамская, Разанская землі – прызналі ўладу вялікага хана Залатой Арды і сталі яго васаламі. Яны мусілі прасіць у яго дазвол на кіраванне сваімі землямі.

Заваёўнікі перапісалі ўсё насельніцтва ў гэтых княствах і абклалі яго данінай-*выхадам*. Гэта быў грашовы падатак у памеры паловы грыўні з кожнай сахі. Спачатку ў сахі было двое мужчын-аратых, а пазней сахой пачалі называць пэўную колькасць ворнай зямлі, з якой і плацілі падатак – *пасошны падатак*. Акрамя выхаду, або царскай даніны, было шмат іншых пабораў. Напрыклад, *ям і падводы* – удзел у перавозках і паштовай службе, *мыт і тамга* – гандлёвыя зборы; *корм* – для прыезджых ардынцаў і г. д.

Паколькі ўсю залатую і срэбную манету ардынцы забіралі, на заваяваных імі славянскіх землях настаў *безманетны перыяд*. У якасці дробных плацежных адзінак выкарыстоўвалі шкуркі звяроў, шыферныя пра́селкі, шкляныя пацеркі і старыя манеты. Гаспадарка была ў цяжкім заняпадзе. Аднак у дачыненні да праваслаўнай царквы

дзейнічала *«Яса Чынгісхана»* – закон, паводле якога манастыры і святары не плацілі даніны і падаткаў, у выпадку калі яны маліліся за хана і яго сям'ю.

Пасля Узбека Ардой кіраваў яго сын, Джанібек, якога славянскія летапісы называлі «добрым». За Джанібекам на сталец прыйшоў яго-ны сын, Бердыбек, якога неўзабаве ў 1359 г. забілі, і на тым дынастыя Батуідаў закончылася. У Залатой Ардзе пачаліся міжусобіцы – з 1359 па 1380 гг. на ханскім троне змянілася больш за 25 ханаў, а некаторыя ўлусы імкнуліся стаць незалежнымі. Гэты перыяд маскоўскія летапісцы назвалі *«Вялікая замятня»*. Тым часам на палітычнай арэне Залатой Арды з'явіўся цемнік Мамай, які стварыў уласны ўлус у заходняй частцы Арды. Ён не быў нашчадкам Чынгісхана, таму не мог стаць вялікім ханам Залатой Арды і меў толькі пасаду беклербека пры тых ханах, якія часта змяняліся на пасадзе кіраўніка. Арда ж тым часам працягвала развальвацца на асобныя ўлусы, якія часта варагавалі паміж сабою.

Мамай пачаў персанальную вайну з раней згаданым маскоўскім князем Дзмітрыем і ў 1378 г. прайграў *бітву на рацэ Вожы*, а потым у 1380 г. – на *Кулікоўскім полі*. Пакуль ішоў узброены канфлікт на Захадзе, у Ардзе да ўлады прыйшоў хан Тахтамыш (1380–1395). Ён спыніў сепаратныя выступы кіраўнікоў розных улусаў у Ардзе і ў бітве на *рацэ Калцы* разграміў рэшткі войскаў Мамая, сабраных апошнім пасля Кулікоўскай бітвы. У 1382 г. Тахтамыш захапіў ды спаліў Маскву і прымусіў князя Дзмітрыя зноў плаціць даніну Ардзе.



*Б. Чорыкаў.* Вялікі князь Дзмітрый Данскі зацвярджае новы парадак перадачы трона ў спадчыну. 1389 г.

Аднак у 1391 г. на Арду напалі войскі Тамерлана, які прыйшоў з Сярэдняй Азіі. У выніку вайны 1391–1396 гадоў сілы Тахтамыша былі разбітыя, а паволжскія гарады, у тым ліку сталіца Арды, –

разбураныя. Пазней Тамерлан абрабаваў і гарады Крыма. Залатая Арда прыйшла ў заняпад і ў першай палове XV ст. пачала распадацца на асобныя незалежныя дзяржавы. На пачатку 1420-х гг. узнікла *Сібірскае ханства*, у 1428 г. – *Узбекскае ханства*, потым – *Казанскае* (1438), *Крымскае* (1441) ханствы, *Нагайская Арда* (1440-я гг.) і *Казахскае ханства* (1465).

Галоўнай дзяржавай сярод новых дзяржаўных утварэнняў лічылася *Вялікая Арда*. У 1480 г. яе хан Ахмат ажыццявіў паход супраць маскоўскага князя Івана III, але мусіў адступіць без бою, пасля чаго Іван III адмовіўся плаціць яму даніну і, як вынік, з 1480 г. пачаў кіраваць незалежнай дзяржавай – *Вялікім княствам Маскоўскім*. На пачатку 1481 г. Ахмата забілі ваяры Сібірскага ханства і Нагайскай Арды. У першыя гады XVI ст. пры дзецях хана Ахмата Залатая Арда спыніла сваё існаванне, але некаторыя яе традыцыі і завядзёнкі трывала ўвайшлі ў палітычную культуру Маскоўскай дзяржавы.

***4.6. Узмацненне Масквы. Палітыка маскоўскага князя Івана I (Каліты).*** Як ужо згадвалася, першы ярлык на вялікае княжанне ад ханаў Залатой Арды атрымаў пераяслаўскі князь Аляксандр Неўскі. Пры ім ардынцы накіравалі ў заваяваныя гарады сваіх дружыннікаў на чале з баскакамі дзеля збору даніны. Пазней збіраць і прывозіць у Арду даніну даручалі таму князю, які меў ханскі ярлык. Вядома, гэты князь, збіраючы даніну, не забываў і пра сябе. Таму за права атрымаць ярлык паміж князямі ішлі вялікія спрэчкі, і нават здараліся бойкі.



*Б. Чорыкаў.* Звадка рускіх князёў у Залатой Ардзе за ярлык на вялікае княжанне

У выніку гэтых спрэчак паступова на першае месца выйшлі маскоўскія і цвярскія князі, што не раз прыводзіла да міжусобных войнаў. Але Масква паступова ў іх перамагала.

Асобнае Маскоўскае княства ўзнікла ў другой палове XIII ст. Першым удзельным маскоўскім князем стаў малодшы сын Аляксандра Неўскага Даніла. Масква мела вельмі выгаднае геаграфічнае становішча, бо стаяла на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў з поўдня на поўнач і з Ноўгарада ў Разань. Перасяленцы з поўдня, якія мусілі ратавацца ад ардынцаў, сяліліся вакол Масквы, бо тут, у лясах, ворагі значна менш іх турбавалі.

Даволі вялікая Масква-рака злучала вярхоўі Волгі і сярэднюю Аку. Па гэтым водным шляху наўгародцы везлі з Разанскай зямлі хлеб, воск і мёд, а маскоўскія князі бралі з іх за гэта немалое мыта. Першыя маскоўскія князі Даніла і яго сын Юрый здолелі прыўлашчыць усё цячэнне Масквы-ракі і забраць у разанскага князя горад Каломну, а ў смаленскага – Мажайск. Таксама князь Даніла атрымаў у спадчыну горад Пераяслаў-Залескі.

Адчуўшы сваю моц, маскоўскі князь Юрый захацеў атрымаць ярлык на вялікае княжанне ўладзімірскае і пачаў змаганне за яго са сваім сваяком, цвярскім князем Міхаілам. Скончылася гэта тым, што ў Ардзе абодвух князёў забілі, а ярлык атрымаў сын Міхаіла Аляксандр Цвярскі. Маскоўскім жа князем стаў яго брат Іван, які атрымаў мянушку Каліта (кашэль). Апошні кіраваў княствам з 1328 па 1340 г.

Іван Каліта праводзіў праардынскую палітыку, чым вельмі спадабаўся вялікаму хану, якому князь заўсёды прывозіў у дадатак да даніны яшчэ і хабар. У 1328 г. ён здолеў адабраць у Цвяры ярлык на



*Б. Чорыкаў.*
Іван Каліта

вялікае княжанне і практычна стаў адзіным прадстаўніком хана на паняволеных ардынцамі землях. Дзякуючы яму хан скасаваў сістэму баскакаў і вывеў у Арду свае карныя атрады. Усю даніну збіраў і адвозіў у Арду толькі князь Іван. Калі ж мясцовыя ўдзельныя князі не маглі заплаціць сваю частку даніны, Каліта за гэта забіраў сабе іх землі.

Сабраўшы немалыя грошы, Іван разгарнуў у Маскве вялікае будаўніцтва. Менавіта ён загадаў пабудаваць з дубовага бярвення першы *Маскоўскі крэмль*, а на яго тэрыторыі ўзвесці пяць белакаменных мураваных храмаў, у тым ліку славуты *Успенскі сабор*. Тут быў пахаваны першаіерарх праваслаўнай Русі мітрапаліт Пётр, які з Уладзіміра пераехаў жыць у Маскву (пазней далучаны да ліку святых). Так Масква стала галоўным рэлігійным цэнтрам паўночна-ўсходніх славянскіх земляў. Паколькі татары не бралі даніны з праваслаўнай царквы, яе матэрыяльнае становішча палепшала. Якраз тады былі заснаваныя *Тройца-Сергіеўскі* і *Кірыла-Белазёрскі манастыры*. Другі крамлёўскі *сабор Архангела Міхаіла* стаў храмам-спачывальніцай маскоўскіх князёў: у ім і пахавалі Івана Каліту.

***4.7. Вялікае княства Маскоўскае ў другой палове XIV – першай палове XV ст.*** Сыны Івана Каліты Сямён Ганарлівы (1340–1353) і Іван Красны (1353–1359) умацавалі і памножылі бацькаву спадчыну. Вакол іх сфарміравалася маскоўская кіраўнічая эліта – удзельныя князі і баяры, а таксама мясцовыя святары. Так, фактычным кіраўніком Масквы ў гады кіравання князя Івана Краснага і яго малалетняга сына Дзмітрыя быў маскоўскі мітрапаліт Аляксій, які паходзіў з багатай баярскай сям'і. Ён меў вялікую падтрымку і ў Залатой Ардзе, бо здолеў вылечыць ад цяжкай хваробы вачэй жонку вялікага хана Тайдулу. Пазней яго таксама далучылі да ліку святых. Другім вядомым маскоўскім святаром быў манах Сергій, які заснаваў згаданы Тройца-Сергіеўскі манастыр непадалёк ад Масквы. У першай палове XIV ст. у Маскоўскае княства ўвайшлі новыя ўдзелы: Дзмітрыеўскі, Галіцкі, Угліцкі, землі Уладзімірскага і часткова Разанскага княстваў.

Сыны Івана Каліты доўга не жылі. Сямён Ганарлівы памёр ад чумы, дзяцей не меў. Яго брат Іван пакінуў двух сыноў і памёр, маючы 31 год. З гэтай прычыны Маскоўскую зямлю не разабралі на ўдзелы сваякі і дзеці вялікіх князёў, што ў выніку паспрыяла яе

ўмацаванню. Аднак пасля раптоўнай смерці Івана ярлык на вялікае княжанне атрымалі суздальскія князі.

Мітрапаліт Аляксій і маскоўскія баяры, якія фактычна кіравалі краінай (князю Дзмітрыю было толькі 10 гадоў), неўзабаве здолелі вярнуць ярлык сабе, і больш Масква яго ўжо ніколі не страчвала. Стаўшы дарослым, князь Дзмітрый стварыў вялікае войска і ў міжусобных войнах перамог разанскага і цвярскога князёў, а потым упершыню наважыўся пачаць вайну з ардынцамі. У Ардзе тады якраз ішло змаганне за ўладу, і тыя сілы, якія ваявалі паміж сабою, каб умацавацца, пачалі рабіць без дазволу вялікіх ханаў набегі на славянскія землі. У 1377 г. вялікі ардынскі атрад разбіў атрады мясцовых князёў на *рацэ П'яне* і разрабаваў Разань ды Ніжні Ноўгарад. Потым прыйшлі войскі ўжо згаданага цемніка Мамая. Апошні спаліў Ніжні Ноўгарад, ад яго таксама пацярпела Разань. Пазней ён рушыў на маскоўскія землі, але, як ужо казалася раней, на рацэ Вожы быў разбіты князем Дзмітрыем. Каб заваяваць Маскву, Мамай сабраў вялікую армію і дамовіўся аб дапамозе з князем ВКЛ Ягайлам і разанскім князем Алегам.

Добра падрыхтаваўся да вайны і маскоўскі князь. 8 верасня 1380 г. каля вусця рэчкі Няпрадвы, дзе яна ўпадае ў Дон, на Кулікоўскім полі адбылася бітва. Мамай быў разбіты і ўцёк з поля бою. Ягайла і разанскі князь на дапамогу Мамаю не прыйшлі, а князю Дзмітрыю дапамаглі беларускія войскі з Полацка і ўкраінскія з Валыні. У гонар гэтай перамогі князь Дзмітрый атрымаў найменне *Данскі*. Аднак замацаваць гэтую перамогу Масква не змагла, бо двума гадамі пазней войска хана Тахтамыша захапіла і спаліла Маскву ды іншыя гарады, а Дзмітрый Данскі мусіў зноў плаціць даніну Ардзе і аддаў Тахтамышу ў закладнікі свайго сына Васілія. Варта адзначыць, што пасля вялікага пажару 1365 г. князь Дзмітрый пабудаваў замест драўлянага мураваны крэмль, пры гэтым павялічыўшы яго памеры. Паколькі будавалі муры з белага каменю, Маскву пачалі называць белакаменнай.

Пасля смерці Дзмітрыя вялікім князем стаў згаданы вышэй Васілій (1389–1425). Ён здолеў забраць у суздальскіх князёў важны гандлёвы цэнтр на Волзе – Ніжні Ноўгарад. У 1408 г. на Маскоўскую дзяржаву раптоўна напаў ардынскі мурза (князь) Едыгей, які моцна разрабаваў краіну і ўзяў Маскву ў аблогу. Васілій мусіў заплаціць яму

вялікую даніну, і Едыгей з трыумфам вярнуўся ў Арду. Значныя тэрыторыі далучыла да сябе і ВКЛ. Васілій маскоўскі ажаніўся з дачкою князя Вітаўта Соф'яй і быў вымушаны прызнаць за мяжу з ВКЛ раку Угру, левы прыток Акі. Пасля яго смерці вялікім князем маскоўскім стаў яго дзесяцігадовы сын, таксама Васілій, з мянушкай Цёмны (1425–1462). Аднак яго дзядзька Юрый, удзельны князь Галіча, гэтага не прызнаў і пачаў змагацца за ўладу ў Маскве. Была развязана доўгая міжусобная вайна, якая з пераменным поспехам доўжылася каля 20 гадоў (1430–1450). Падчас вайны князь Васілій II на нейкі час трапіў у палон, і ворагі пазбавілі яго зроку. З гэтай прычыны ён і атрымаў мянушку Цёмны (гэта азначала: сляпы).



*Б. Чорыкаў*. Князі, баяры і саюзнікі-ардынцы збіраюцца вярнуць Васілію Цёмнаму вялікакняскі трон. 1446 г.

Тым часам ішла міжусобіца і ў Ардзе, якая распадалася на асобныя часткі. Так, хан Улу-Махмет стварыў на Волзе сваю дзяржаву, Казанскае ханства, і пачаў рабіць набегі на Маскву. Войскі князя Васілія выйшлі супраць казанскага хана, але ў 1445 г. пад Суздалем былі разбітыя, а князь Васілій трапіў у палон. За яго прыйшлося заплаціць вялікі выкуп. Васілій прывёў у Маскву з Арды шмат татараў, узяў іх сабе на службу, але гэта выклікала незадаволенасць мясцовага насельніцтва.

У часы ўладарання Васілія Цёмнага маскоўскі мітрапаліт грэк Ісідар наведаў Італію і далучыўся да *Фларэнтыйскай уніі*, заключанай у 1439 г. паміж Папам Рымскім і Візантыяй. У 1441 г. ён вярнуўся ў Маскву і пачаў прасоўваць ідэю уніі. За гэта яго арыштавалі, але ён уцёк спачатку ў ВКЛ, а пасля ў Італію. Маскоўскім мітрапалітам стаў разанскі епіскап Іона, і ў Маскве вырашылі адасобіцца ад Канстанцінопальскага патрыярха ды выбіраць мітрапаліта на сваім саборы з ліку мясцовых святароў.

***4.8. Княства Маскоўскае і іншыя ўсходнеславянскія княствы.*** У XIV ст. сітуацыя ва Усходняй Еўропе стала адносна стабільнай. На поўначы ўзмацнілася Наўгародская рэспубліка, але ад яе канчаткова аддзяліўся Пскоў. Вялікае Княства Літоўскае значна тэрытарыяльна павялічылася падчас княжання Гедымінавічаў. Колькасць усходнеславянскага насельніцтва стала значна большай за мясцовых балтаў – таму поўная назва краіны пачала фігураваць як Вялікае Княства Літоўскае і Рускае. Усё праваслаўнае насельніцтва ВКЛ пачало пазначацца як «рускае», старабеларуская мова, дзяржаўная ў ВКЛ, называлася «рускай», а кірылічны алфавіт – «рускімі літарамі». Дакументы сведчаць, што нашчадкі Гедыміна, якія пасля Крэўскай уніі засталіся праваслаўнымі, пачалі менавацца «рускімі» князямі і пазней, пры канцы XV і ў XVI ст., называлі сябе «рускімі князямі літоўскага роду». Не выпадкова, што значная частка ўсходнеславянскіх княстваў, каб не плаціць даніну Залатой Ардзе, рабілася саюзнікам або і аўтаномнай часткай ВКЛ. Такая сітуацыя існавала да другой паловы XV ст.

***4.9. Вялікае княства Разанскае.*** Разанскае княства ўзнікла ў 1129 г. і займала тэрыторыю Сярэдняй Акі і вярхоўе Дона. Да прыходу манголаў тут жыло славянскае племя вяцічаў і шмат мясцовых фіна-ўгорскіх народаў, у значнай ступені асіміляваных славянамі. Другім пасля Разані лічылі горад *Пронск*, які яшчэ ў 1180 г. стаў удзельным княствам. Яно ўваходзіла ў склад Разанскай зямлі да 1483 г. У 1237 г. войскі хана Батыя разрабавалі сталіцу дзяржавы ў такой ступені, што горад не здолеў адрадзіцца, і людзі яго пакінулі. Цяпер гэтая тэрыторыя называецца *Старая Разань* і ўяўляе сабою вялікае гарадзішча; побач знаходзяцца сляды былога пасада. Археолагі вывучаюць Старую Разань, пачынаючы з XIX ст., і зрабілі шмат унікальных адкрыццяў.

Разанская зямля была васалам Залатой Арды і мусіла плаціць ардынцам даніну, а князі – прасіць у ханаў ярлык на сваё княжанне. Новай сталіцай дзяржавы стаў горад *Пераяслаў-Разанскі* (з 1778 г. менавіта яго пачалі называць Разанню). Такім чынам, сённяшняя Разань знаходзіцца на адлегласці 50 км ад першаснай, Старой Разані. Доўгі час разанскія князі мелі канфлікты з суседзямі, Масквой і ВКЛ.

Яшчэ ў 1300 г. маскоўскія князі забралі ў Разані горад Каломну. У 1381 г. мяжа з Масквою пачала праходзіць па Ацэ.

Росквіт Разані адбыўся падчас кіравання князя Алега Іванавіча (1356–1402). У 1395 г. яго войскі напалі на блізкія да іх землі ВКЛ. У адказ князь Вітаўт разбіў разанскіх князёў: гэта адбылося ў 1395–1396 гг. Тым не менш дружына Алега ў 1401 г. хадзіла на Смаленск, а ў 1402 г. – на Бранск. Аднак пасля 1427 г. Разанская зямля на нейкі час стала васалам ВКЛ: у 1430 г. разанскі князь Іван Фёдаравіч прысягнуў Вітаўту і быў у яго на з'ездзе ў Луцку, дзе чакалі каралеўскую карону.

Пра эканамічную моц княства сведчыць той факт, што з часоў кіравання князя Алега Іванавіча Разань біла сваю манету. Аднак пачынаючы з сярэдзіны XV ст. яна стала васалам Масквы, у Разані з'явіўся маскоўскі намеснік. Потым маскоўцы пасадзілі апошняга разанскага князя Івана Іванавіча ў турму, з якой крыху пазней той здолеў уцячы ў ВКЛ. Канчаткова Разанскае княства было ліквідаванае ў 1521 г.

***4.10. Бранскае і Старадубскае княствы.*** Горад *Бранск* як славянскае паселішча ўзнік у 985 г. на беразе ракі Дзясны. Спачатку ён называўся Брынь, потым Дзябранск. Пад 1146 г. ён згадваецца ў летапісе як горад Чарнігаўскага княства.

Пасля таго як мангола-татары ў 1239 г. разбурылі і знішчылі Чарнігаў, ацалелы чарнігаўскі князь Раман у 1246 г. перанёс сваю сталіцу ў Бранск. Неўзабаве бранскія князі займелі і тытул князёў чарнігаўскіх. У Бранску тады таксама знаходзілася рэзідэнцыя чарнігаўскіх епіскапаў. Менавіта ў Бранск напачатку пераехаў з Кіева згаданы раней мітрапаліт Максім, і толькі пасля захопу Бранска смаленскімі князямі Максім перабраўся далей, у горад Уладзімір. У 1285–1297 гг. бранскія князі перайшлі пад уладу смаленскіх князёў.

Першы раз вярхоўную ўладу ВКЛ бранскія князі прызналі ў 1339 г. Аднак у 1352 г. яны робяцца васаламі Масквы. Ды неўзабаве, каля 1360 г., у Бранску адбылося паўстанне, у якім перамаглі прыхільнікі ВКЛ, у выніку чаго князь Альгерд пасадзіў на бранскі пасад князя Рамана Міхайлавіча Чарнігаўскага. Бранская епархія была падначаленая Літоўскай метраполіі, незалежнай ад Масквы.

У выдадзеным у 2007 г. у Бранску школьным вучэбным дапаможніку па гісторыі краю пра гэтыя падзеі напісана так: «Не варта лічыць, што ўваходжанне Бранскага краю ў склад Вялікага княства Літоўскага было «акупацыяй», захопам ці яшчэ якім-небудзь гвалтоўным дзеяннем. Масква ў 1356 г. яшчэ не была агульнадзяржаўным цэнтрам аб'яднання рускіх земляў, апроч таго, гістарычная Руская зямля, у тым ліку Кіеў, ужо належала літоўцам. Гедымін прыняў тытул вялікага князя літоўскага і рускага. Рускія адыгрывалі ў Літве вялікую ролю – яны служылі ў войску, кіравалі ад імя літоўскіх князёў тэрыторыямі, вялі дыпламатычныя перамовы. У радаслоўных літоўскія князі абвяшчалі сябе нашчадкамі Рурыкавічаў, якія кіравалі ў Віцебску і Полацку. Гедымін і яго спадкаемцы выкарыстоўвалі ў якасці фамільнага герба знак, які нагадвае родавы знак Рурыкавічаў – трызубец, ці двухзубец.

Тут мы бачым выкладзенае ў папулярнай форме сучаснае пацверджанне таго факту, што Літву продкі сучасных рускіх у XIV ст. разглядалі як адзін з цэнтраў свайго нацыянальнага яднання (разам з Масквою і Цвер'ю). Менавіта таму $^2/_3$ літоўскіх земляў былі землямі ўсходнеславянскіх княстваў, і жылі тут людзі даволі мірна, паводле сваіх законаў і звычаяў. Бранскае веча не лічыла сябе горшым за наўгародскае ці пскоўскае і запрасіла, як і яны, літоўскага князя ў горад. З прызнаннем літоўскай улады Бранск атрымаў падтрымку моцнай дзяржавы, пазбавіўся ад мангольскага ярма і цяжкасцяў штогадовага ардынскага «выхаду».

Тым часам у Старадубе вялікім князем Альгердам быў пасаджаны на княжанне Аляксандр Нарымунтавіч, пры якім там, у прыватнасці, пачалі біць уласную манету – старадубскую «дзяньгу».

Бранскі князь Раман Міхайлавіч у 1363 г. перайшоў на бок Масквы. Пасля гэтага войскі Альгерда занялі княства, і новым князем стаў Дзмітрый Альгердавіч. Менавіта ён, разам з ужо згаданым Андрэем Полацкім і Дзмітрыем Баброкам-Валынскім, быў ініцыятарам паходу маскоўскага войска за Дон насустрач Мамаю і ў 1380 г. прыйшоў на дапамогу маскоўскаму князю, прывёўшы на Кулікоўскае поле палкі са Старадуба і Бранска. На Кулікоўскім полі ён камандаваў першым рэзервам Дзмітрыя Данскога на левым флангу, а за ім стаялі войскі валынскага ваяводы.

У персанальным змаганні з ардынцамі вызначыўся манах Аляксандр Перасвет, які паходзіў з бранскіх баяраў (нарадзіўся ў северскім горадзе Любечы). Потым ён загінуў у бітве на рацэ Ворскле. Вітаўт вярнуў былое княства Раману Міхайлавічу, які зноў вярнуўся з Масквы ў ВКЛ і пазней (у 1401 г.) загінуў у Смаленску. У часы Альгерда і Вітаўта назіраецца ўздым северскай зямлі. Менавіта тады расквітнелі гарады Бранск, Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі. Ад 1465 да 1500 г. Бранскім княствам кіруюць князі мажайскія.

Князь Альгерд пасадзіў у забраных северскіх гарадах сваіх сыноў: у Бранску – Дзмітрыя Карыбута, у Трубчэўску – Андрэя Вогунта, у Чарнігаве – Канстанціна Скіргайлу. Былі пабудаваны драўляныя замкі ў Почапе, Радагошчы, Рыльску і Пуціўлі. Вітаўт паставіў вялікія вайсковыя гарнізоны ў Гомелі і Любечы. Бранскі князь Дзмітрый Карыбут пачаў біць сваю манету.

Тым часам на тэрыторыі былой Северскай зямлі ўсё большае значэнне набывае *Старадубскае княства*. Яно ўзмацнілася пасля 1454 г., калі мажайскі князь Іван Андрэевіч уцёк з Масквы ў ВКЛ і атрымаў у вотчыну гарады Гомель і Старадуб. Гэта не было выпадковым: яго бацька, сын Дзмітрыя Данскога князь Андрэй Дзмітрыевіч ажаніўся з дачкою старадубскага князя Аляксандра Патрыкеевіча Аграфенай. У1465 г. да княства далучылі Бранск, у 1496-м – Чарнігаў і ў 1499 г. – Хоцімль.

Варта адзначыць, што ў 1486 г. жыхары Бранска паўсталі і забілі свайго князя Андрэя, сына мажайскага князя Івана. Ад гэтага часу Бранскам кіруюць велікакняскія намеснікі. Старадубскія князі мелі свой двор, сваіх баяраў і сваё войска. У 1499 г. князь Сямён Іванавіч атрымаў тытул князя старадубскага.

Пры канцы XV ст. сітуацыя на ўсходзе ВКЛ ускладняецца. Пачынаецца экспансія суседняга Маскоўскага княства на захад. У 1500 г. маскоўскія войскі на чале з Якавам Захар'іным захапілі Бранск. Старадубскі князь Сямён Мажайскі прысягнуў Івану III Маскоўскаму і перайшоў са сваім княствам на бок апошняга. Пры гэтым ён прыўлашчыў горад Любеч і паўдзельнічаў у захопе Пуціўля. Увосень 1501 г. войскі Шых-Ахмета, цара Заволжскай Арды, захапілі Ноўгарад-Северскі ды іншыя гарады Северскай зямлі, але неўзабаве адступілі, бо не дачакаліся дапамогі ад ВКЛ.

Пэўны час Старадубскае княства захоўвала аўтаномію (да 1518 г.) у складзе Масковіі, аднак пасля смерці апошняга старадубскага князя Васілія перайшло ў непасрэднае падпарадкаванне да згаданага князя Васілія III Маскоўскага. Разам з Бранскам, Старадубам, Чарнігавам у склад Масковіі трапіў і беларускі Гомель.

***4.11. Вялікае княства Смаленскае.*** На захадзе суседам Вялікага княства Смаленскага ў XIV ст. становіцца Вялікае Княства Літоўскае, а на ўсходзе – Вялікае княства Маскоўскае, улус Залатой Арды. На мяжы XIII–XIV стст. Мажайскае ўдзельнае княства захапілі маскоўскія войскі, але ў той самы час смаленскія князі ўзялі пад часовы кантроль бранскія землі. Пасля шлюбу з віцебскай князёўнай вялікі князь Альгерд далучае да ВКЛ Віцебскае княства і выходзіць на межы са Смаленскім. Смаленскі князь Іван прызнае Гедыміна пры канцы 1320-х гадоў сваім «старэйшым братам» з мэтай захаваць шлях па Заходняй Дзвіне, які забяспечваў гандаль з ганзейскімі гарадамі.

У 1333 і 1334 гг. маскоўскія войскі два разы нападаюць на Смаленск, але апошні адбіваецца і спыняе выплату даніны Залатой Ардзе. Пасля гэтага Смаленск становіцца саюзнікам ВКЛ, а смаленскія войскі ўдзельнічаюць у бітве з крыжакамі *на рацэ Страве* (1348) на баку ВКЛ, прычым адзін са смаленскіх князёў гіне ў гэтай бітве.

У 1352 г. на Смаленшчыну з Заходняй Еўропы прыйшла эпідэмія чумы. Шмат людзей памерла, дзяржава аслабела. Скарыстаўшыся гэтым, князь Альгерд далучае да ВКЛ Мсціслаў, Крычаў і Рослаўль. Але потым ён падпісвае саюзную дамову са смаленскім князем Святаславам, і яны супольна ажыццяўляюць паход на Маскву. Пасля смерці Альгерда ўлада ў ВКЛ пераходзіць да Ягайлы, які пасля падпісання Крэўскай уніі (1385) становіцца адначасова і польскім каралём. Яго старэйшы брат, ужо не раз згаданы полацкі князь Андрэй, вырашае з дапамогай крыжакоў і смаленскага князя Святаслава пераняць уладу ў ВКЛ. Святаслаў спачатку спрабуе захапіць Віцебск і Оршу, а потым бярэ ў аблогу Мсціслаў, каб вярнуць сабе Мсціслаўскае княства. Аднак войскі Ягайлы 7 траўня 1386 г. разбілі пад Мсціславам смалян, забілі князя Святаслава і ўчынілі аблогу Смаленска. Смаленскае веча заплаціла вялікі выкуп, і князем стаў сын Святаслава Юрый. Ён мусіў прысягнуць на вернасць Ягайлу і стаць яго васалам.

Тым часам да фактычнай улады ў ВКЛ прыйшоў князь Вітаўт, які быў у шлюбе з дачкою смаленскага князя Святаслава Ганнай. Ён вырашыў далучыць Смаленшчыну да Вялікага Княства Літоўскага. У 1395 г. Вітаўт захапіў у палон смаленскіх князёў, ліквідаваў Вялікае княства Смаленскае і пасадзіў тут свайго намесніка. Аднак князь Юрый Святаслававіч здолеў унікнуць палону і ўцёк.



*Б. Чорыкаў*. Вялікі князь Васілій I дакарае Юрыя Святаслававіча за здачу Смаленска Вітаўту. 1395 г.

Пасля паражэння Вітаўта ў бітве з Залатой Ардой на *рацэ Ворскле* (1399) Юрый вярнуўся ў Смаленск і кіраваў ім да 1403 г., пакуль Вітаўт зноў, і ўжо канчаткова, не заваяваў горад і княства. У 1410 г. тры смаленскія палкі ўзялі чынны ўдзел у знакамітай *Грунвальдскай бітве*: гэта былі палкі з Оршы, Мсціслава і Смаленска. Прытым у расійскіх і савецкіх падручніках іх упарта называюць: «тры рускія смаленскія палкі» – і гэта не выпадкова, бо якраз смаленскія палкі і выратавалі сітуацыю ў цэнтры баявога шыхту саюзных войскаў ды стрымалі крыжацкую навалу, нягледзячы на панесеныя велізарныя страты.

У красавіку 1440 г. жыхары Смаленска ўчынілі ўзброенае паўстанне супраць намесніка вялікага князя ВКЛ ваяводы Андрэя, у выніку чаго смаленскім князем стаў мсціслаўскі князь Юрый Сямёнавіч. Да апошняга далучыліся жыхары Віцебска і Полацка. Новы князь ВКЛ Казімір увосень 1440 г. выступіў супраць паўстанцаў, Юрый уцёк у Ноўгарад, а войскі Казіміра ўзялі Смаленск ды іншыя гарады. Паўстанне згасла.

У XV ст. назіраецца росквіт Смаленска. Смаленскай зямлёй кіруе намеснік вялікага князя, прадстаўнік мясцовых землеўласнікаў у Сойме і Радзе ВКЛ. Існавала і *смаленскае веча*, якое вырашала надзённыя пытанні жыцця горада і вясковага наваколля. Намеснік меў

пры сабе і мясцовую раду. У яе ўваходзілі смаленскі епіскап, маршалак ды іншыя гарадскія службовыя асобы. Мяшчане выбіралі свайго прадстаўніка – *старасту*. Смаленскія землі падзяляліся на валасці: імі кіравалі *цівуны*. Прывілеі жыхароў зямлі былі зафіксаваныя ў велікакняскіх граматах 1404 і 1505 гг. Побач са Смаленскай зямлёй існавалі аўтаномныя Мсціслаўскае, Вяземскае і Дарагабужскае княствы.

На землях цэнтральнай Смаленшчыны з 1404 г. існавала Смаленскае ваяводства. Тады Смаленск зрабіўся адным з найбуйнейшых старабеларускіх культурных цэнтраў, дзе квітнелі летапісанне і духоўная літаратура. Вядомы Смаленскі летапіс, які складаўся з XII да пачатку XV ст., – твор, прасякнуты ідэяй захавання і ўмацавання незалежнасці Смаленскай дзяржавы.

Пры канцы XIV ст. у Пустынскім Успенскім манастыры пад Мсціславам Лука Смалянін стварае славуты *Смаленскі псалтыр,* напісаны на пергаменце, аздоблены мініяцюрамі, 22 застаўкамі, 150 ініцыяламі з выявамі людзей, жывёл, розных фантастычных істот і складаным плеценым арнаментам. Дзеля аздаблення тэксту выкарыстана фарба сіняга, зялёнага і чырвонага колеру, а таксама золата. У 1657 г. на загад патрыярха Нікана падчас маскоўскай акупацыі Смаленскі псалтыр вывезлі на востраў Кій Анежскай губы Белага мора. Цяпер ён знаходзіцца ў маскоўскім Гістарычным музеі.

У XV ст. у Смаленску напісана *Смаленская хроніка*, якую можна лічыць сярэднявечным беларускім літаратурным творам, і такія гістарычна-літаратурныя творы, як «*Пахвала Вітаўту*» і «*Беларуска-Літоўскі летапіс*», дзе апісаны розныя падзеі на тэрыторыі Смаленшчыны і ВКЛ, а таксама на сумежных землях.

Пры канцы XV ст. пры двары смаленскіх епіскапаў манах Аўраамка склаў вялікі летапісны зборнік на 450 старонак. Ён атрымаў назву «*Летапіс Аўраамкі*». Даследчыкі лічаць, што менавіта ў Смаленску ў XV ст. быў створаны згаданы Радзівілаўскі летапіс, які пазней належаў Янушу Радзівілу, потым трапіў у Кёнігсберг, а пазней, у XVIII ст., – у Санкт-Пецярбург, дзе знаходзіцца і цяпер. Летапіс мае каля 600 малых каляровых малюнкаў, якімі ў цяперашні час ілюструюць розныя падручнікі і энцыклапедыі. Выклікаюць цікавасць таксама смаляне-вандроўнікі. Гэта – архімандрыт Аграфіст,

які апісаў сваю вандроўку ў Палесціну ў 1370 г., і смаленскі духоўнік Ігнат. Апошні суправаджаў мітрапаліта Пімена ў 1389 г. у паездцы ў Канстанцінопаль і пакінуў літаратурны твор, прысвечаны гэтай падзеі. Выдатным помнікам беларускага прыгожага пісьменства першай паловы XV ст. з'яўляецца летапісная *«Аповесць пра паўстанне ў Смаленску»*. Даследчыкі адзначаюць высокі мастацкі ўзровень гэтага твора і яго цудоўную старабеларускую мову.

Аднак пры канцы XV ст. мірнае жыццё Смаленшчыны скончылася.

***4.12. Вызваленне ад улады Залатой Арды. Палітыка князя Івана III.*** Іван III пачаў кіраваць Маскоўскай дзяржавай яшчэ пры сваім бацьку, які зрабіў яго суваладаром, бо сам, як адзначалася вышэй, быў сляпы. З 1462 па 1505 г. ён адзін кіруе Маскоўскай дзяржавай і стварае вялікае войска. Напачатку Іван III падпарадкаваў сабе Яраслаўскае і Растоўскае княствы, а потым вырашыў заваяваць Ноўгарад і Цвер. Пасля таго як Ноўгарад у 1471 г. заключыў саюз з ВКЛ, Іван III распачаў вайну. Найперш наўгародцаў разбілі на паўднёвым беразе возера Ільмень, а пазней на рацэ Шалоні.

Пасля канчатковага выхаду з-пад улады Залатой Арды ў 1485 г. Іван III ва ўсіх афіцыйных паперах пачаў ужываць новы тытул – «Гасудар усяе Русі і вялікі князь». Пасля смерці першай жонкі ў 1467 г. ён узяў шлюб з пляменніцай апошняга візантыйскага імператара Зояй (Соф'яй) Палеалог, якая жыла ў Італіі. Разам з Зояй у Маскву прыехала шмат італьянцаў і грэкаў. Іван III шанаваў іх прафесіяналізм і даручаў будаваць цвярдыні, храмы і палацы, біць манеты і адліваць гарматы. Часам замежным гасцям даручалі



*Б. Чорыкаў.* Іван III, Гасудар усяе Русі

выконваць функцыі дыпламатаў. У Маскве італьянцаў называлі фразінамі (ад слова «фраг», ці «франк», і таму майстроў з Італіі іменавалі: Іван Фразін, Марк Фразін, Антоні Фразін і г. д.). Пры двары Івана III былі таксама немцы, асабліва лекары.

У 1497 г. быў прыняты вялікі юрыдычны дакумент *Судзебнік*, які меў агульнадзяржаўнае значэнне як юрыдычная аснова новага Маскоўскага царства. У гэтым дакуменце зафіксавана пачатковая стадыя прыгоннага становішча сялян. У Судзебніку ўпершыню выкарыстаны тэрмін «*памесце*» (зямельны надзел, які давалі за выкананне дзяржаўнай службы). Сяляне маглі пераходзіць ад аднаго *памешчыка* (які валодаў памесцем) да другога толькі за тыдзень да 26 лістапада *(Юр'еў дзень)* або праз тыдзень пасля таго. Пры гэтым селянін мусіў заплаціць памешчыку грошы за карыстанне яго зямлёй – «*пажылое*».

Вельмі цяжкімі былі тагачасныя пакаранні. Акрамя смяротнага пакарання была «гандлёвая кара», калі людзей білі пугай на гандлёвай плошчы; адразанне вушэй ды языка і клеймаванне гарачым жалезам. Усе сяляне падзяляліся на дзяржаўных (*чарнасошных*), якія працавалі на «*чорных*» дзяржаўных землях, і прыватнаўласніцкіх, якія працавалі на землях баяраў і памешчыкаў. Таксама былі манастырскія сяляне і сяляне-каланісты («*сваяземцы*»), якія жылі на межах краіны і засялялі новыя землі, якія яны лічылі сваёй уласнасцю.

Росквіт *праваслаўных манастыроў* прыпадае на XV ст. Яны мелі шмат добрай зямлі і сялян, якія працавалі на гэтых землях. Праводзілася манастырская каланізацыя, калі частка манахаў са старога манастыра засноўвала новы на незаселенай мясцовасці. Так, знакаміты Тройца-Сергіеў манастыр заснаваў не менш за 5 новых манастыроў-калоній. Сярод манахаў з'явіліся асобы, якія добра жылі за кошт гэтых багаццяў. Іншыя манахі лічылі, што манастырскую казну трэба ахвяраваць на грамадскія справы. Былі і такія, хто патрабаваў адмовіцца ад гэтых набыткаў і жыць сціпла, толькі за кошт уласнай працы.

Да канца ўладарання Івана III манастыры сталі настолькі вялікімі і багатымі, што сярод манахаў з'явіліся дзве варожыя плыні. Адну ўзначаліў Іосіф Волацкі, а другую – Ніл Сорскі. Іосіф

Волацкі і яго прыхільнікі выступалі за захаванне і пашырэнне манастырскіх багаццяў, а Ніл Сорскі прапаноўваў ад іх адмовіцца ды жыць сціпла і бедна. Гэтыя спрэчкі вынеслі на царкоўны сабор, які адбыўся ў 1503 г. На саборы перамаглі прыхільнікі Іосіфа, і іх падтрымалі свецкія ўлады. Гэтыя манахі атрымалі назву «іасіфляне», а прыхільнікі Ніла Сорскага – «няхціўцы» («нестяжатели»). Лідарамі няхціўцаў сталі былы князь-манах Васіян Касой і грэцкі манах, які прыехаў у Маскву з Афона, Максім Грэк. У тым змаганні перамаглі іасіфляне, а лідары няхціўцаў сталі вязнямі манастыроў, дзе і памерлі.

Іасіфляне цалкам падтрымалі свецкую ўладу, якая стала самадзяржаўнай. Пасля шлюбу з прадстаўніцай візантыйскага імператарскага дома Соф'яй Іван III пачаў лічыць сябе спадчыннікам візантыйскіх імператараў і прыўлашчыў сабе герб Візантыі – *двугаловага арла*.

Іван III меў шмат сыноў ад розных жонак. Сына ад першай жонкі клікалі Іванам Маладым, але ён памёр у 1490 г., пакінуўшы бацьку ўнука Дзмітрыя. Ад Соф'і ў Івана III быў сын Васілій. Спачатку ён вырашыў перадаць сваю ўладу Дзмітрыю і «вянчаў» яго на «царства» – менавіта на царства, а не на вялікае княжанне. Так, у Маскоўскай дзяржаве з'явіўся тытул «*цар*». Аднак праз год Іван III перадумаў і зрабіў стаўку на Васілія. Васілій атрымаў тытул вялікага князя і пачаў кіраваць дзяржавай разам з бацькам.

Паколькі Іван III абвясціў сябе Гасударом усяе Русі, то ён вырашыў захапіць беларускія землі, пачынаючы са Смаленшчыны.

Спачатку былі невялікія набегі на памежнае Вяземскае княства. Вялікая вайна пачалася ў 1492 г. Узімку 1493 г. маскоўскія войскі захапілі Вязьму, а ў чэрвені 1500 г. – Дарагабуж. 25 ліпеня 1500 г. на *рацэ Ведрашы* пад Дарагабужам войска ВКЛ на чале з гетманам Канстанцінам Астрожскім было разбіта вялікім маскоўскім войскам, а Астрожскі трапіў у маскоўскі палон. У 1501 г. маскоўцы ўзялі ў аблогу Смаленск, але захапіць яго так і не здолелі і адступілі. Новая вайна пачалася толькі ў 1512 г.

Іван III усталяваў дыпламатычныя зносіны з Даніяй, імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі, Венгрыяй, Венецыяй і Турцыяй. Перад смерцю Іван III пакінуў тастамент, у якім прызначаў Васілія гасударом і даў яму 66 большых litarадоў, а чатыром малодшым

сынам – толькі 30 дробных гарадоў і паселішчаў. Такім чынам, працэс цэнтралізацыі Маскоўскай дзяржавы вёў да неабмежаванага самаўладства царскай асобы.

***4.13. Культура Маскоўскага і іншых усходнеславянскіх княстваў у XIV–XV стст.*** Культура разгляданага перыяду адметная найперш захаваным поліцэнтрызмам развіцця, які грунтуецца на рознасці традыцый, закладзеных у папярэдні час, рознаэтнічнасці і нават поліканфесійнасці на асобных тэрыторыях будучай Расійскай дзяржавы. Нараджэнне супольнага дзяржаўнага ўтварэння пад рукою маскоўскіх князёў вымалёўваецца толькі пад канец XV і ў самым пачатку XVI ст. (з падпарадкаваннем Маскве Ноўгарада, Цвяры, Пскова, а таксама драбнейшых княстваў). Пакуль жа паўночна-заходнія канкурэнты Масквы дамінавалі ў культурнай прасторы: іх землі сур'ёзна не пацярпелі ад ардынскіх набегаў, захоўвалася пераемнасць мастацкай традыцыі, да таго ж узбагачанай сувязямі з еўрапейскімі краінамі (праз актыўныя гандлёвыя і эканамічныя стасункі). Ноўгарад і Пскоў выглядалі больш дынамічнымі ў палітычным, філасофскім, літаратурным жыцці. Акрамя таго, заселеныя пераважна славянскімі плямёнамі паўночных крывічоў, яны ўяўлялі сабою ў большай ступені монаэтнічныя і монарэлігійныя грамадствы. У той самы час Уладзіміра-Суздальскія землі вельмі моцна пацярпелі ад мангольскага нашэсця і адпаведных разбурэнняў, асабліва ў XIII–XIV стст., пры гэтым яны яшчэ былі населеныя пераважна фіна-ўгорскімі карэннымі жыхарамі. На фоне дамінавання язычніцтва пашыралася не толькі хрысціянства. Іміграны з метраполіі (Масковія была ўлусам Залатой Арды) прынеслі з сабою несатарыянскую версію хрысціянства, а таксама іслам. Значную частку паноўнай эліты складалі якраз цюркі і манголы, якія мелі свае густы. Само Маскоўскае княства яшчэ толькі ўздымалася (паводле адной з версій, Масква была ў сапраўднасці заснаваная толькі ў 1272 г.). Аднак становішча Масковіі ўзмацняў факт абрання яе князёў праз ардынскіх ханаў адказнымі за збор даніны (ясаку) на памежных тэрыторыях; у выніку завышаныя паборы забяспечвалі маскоўскім князям фінансавы падмурак развіцця і тэрытарыяльнай экспансіі. Прычыну такога выбару можна бачыць у тым, што згаданы намі маскоўскі князь

Юрый Данілавіч, ажаніўшыся ў 1317 г. з сястрой хана Узбека Канчакай, стаў зяцем аднаго з Чынгісідаў. Яшчэ раней, у час гадавання ў Ардзе, адбылося братанне Аляксандра Неўскага з Сартакам, сынам хана Батыя. Як вынік – маскоўскія князі не толькі атрымліваюць у далейшым перавагу ў прэтэнзіях на ханскі ярлык дзеля панавання ў рэгіёне, але і ардынскую вайсковую дапамогу ў змаганні з суседзямі. Нават дзяржаўны сімвал Масквы – шапка Манамаха, хутчэй за ўсё, першапачаткова была жаночай цюбецейкай Канчакі або падарункам маскоўскаму князю (магчыма, ужо Івану Каліце) ад хана Узбека.


© Shakko

Шапка Манамаха

Манеты, якія чаканяць у Маскве ў XIV–XVI стст., часам маюць арабскія надпісы з ухваленнем Алаха. Пасля надання Узбекам у 1320 і 1321 гг. ісламу статусу дзяржаўнай рэлігіі ў Ардзе, у Масковію прыбывае значная колькасць ардынцаў. Уплывы ўсходняй культуры, улічваючы вымушаную рэлігійную талерантнасць маскоўскіх князёў і царквы, значна павялічыліся, найперш у побытавай культуры (мода, убранні) і дэкаратыўным мастацтве.

Уладзіміра-Суздальская зямля падчас мангольскага нашэсця перажыла сапраўдную катастрофу. Серапіён Уладзімірскі, пісьменнік XIII ст., са скрухаю пісаў: «Множайша же братия и чада наша в плен ведены быша, села наши лядиною поростоша, и величество наше смерися, красота наша погыбе…» Таму развіццё культуры рэгіёна – прынамсі, з сярэдзіны XIV ст., – з названых вышэй прычын пачынае вызначаць Масква. Спачатку ў 1330-х гг. на тэрыторыі будучага крамля ўзнікаюць не захаваныя да сёння 4 цэрквы ва ўладзіміра-суздальскім стылі (узор – ужо згаданы намі Георгіеўскі сабор у Юр’еве-Польскім, XIII ст.) і часткова цвярскім. Першыя мураваныя будынкі паўсталі ў Маскве з прычыны пераносу кафедры мітрапаліта з Уладзіміра ў Маскву (1326). Потым узнік першы маскоўскі мураваны крэмль (1367–1368). Актывізавалася мураванае



Успенскі сабор на Гарадку ў Звянігарадзе, канец XIV – пачатак XV ст. *Фота пачатку XX ст.*


© NVO

Царква Спаса маскоўскага Андронікавага манастыра

будаўніцтва і па-за межамі сталіцы, з'явіліся такія адметныя працы дойлідаў, як *Раждзественскі сабор* у *Звянігарадзе*, *царква Тройцы ў Тройца-Сергіеўскай лаўры*, *царква Спаса ў маскоўскім Андронікавым манастыры*.

У першых з іх можна заўважыць успрыманне ўладзімірскай будаўнічай традыцыі як афіцыйнай стылёвай устаноўкі маскоўскага дойлідства. У царкве Спаса наверша ўзбагачаецца да пышнага; падкупальны барабан абступаюць тры ярусы кілепадобных кокошнікаў. Яны памяншаюцца з кожным крокам наверх, утвараючы пірамідальную кампазіцыю: наследаванне полацкай і смаленскай традыцыі акцэнтавання рытму вертыкалі, якое ў XVI ст. зменіцца на шатровыя пакрыцці цэркваў.

Рашучы крок наперад у развіцці новага архітэктурнага стылю Масква зрабіла ў апошняй чвэрці XV ст. Пры канцы XV ст. тут паспяхова працаваў цэлы шэраг італьянскіх дойлідаў (якіх менавалі Фразінамі): бацька і сыны Марка, Антоніа, Алевіз (Алаізіа)-старэйшы, Алевіз-малодшы, а таксама Алевіз Новы. Самым вядомым італьянскім дойлідам быў Арыстотэль Ф'яраванці, які і пабудаваў у Маскве новы *цагляны крэмль* з элементамі позняй італьянскай готыкі.



*В. Верашчагін*. Маскоўскі крэмль з Вялікага каменнага моста. *Карціна 1879 г.*

Дарэчы, італьянцы навучылі маскоўскіх рамеснікаў вырабляць тоўстую чырвоную цэглу, бо раней у Маскоўскай дзяржаве будынкі рабілі толькі з дрэва ці абчасанага каменю. Будаўніцтва новага крамля пачалі ў 1485 г. Адначасова Ф'яраванці пабудаваў на тэрыторыі крамля новы *Успенскі сабор* на месцы старога будынка. Пасля яго смерці будаўніцтва крамля працягвалі Антоніа і Марка Фразіны, а з 1490 г. – П'етра Антоніа Салары. Менавіта апошні пабудаваў славутую Спаскую вежу крамля. У 1499 г. будаўніцтва крамля было скончана, у выніку чаго перыметр крамлёўскіх муроў склаў больш за 2 км.

Маштабнасць задачы ўзвядзення галоўнага і велічнага крамлёўскага сабора змусіла звярнуцца да вопытнага замежніка: распачаты мясцовымі майстрамі Мышкіным і Івашкам Крыўцовым у 1472 г. перша-



© Skif-Kerch.

Успенскі сабор Маскоўскага крамля (1475–1479)

пачатковы будынак праз памылкі ў працы абрынуўся. Ф'яраванці, улічваючы характар замовы, арыентаваўся на нацыянальны ўзор Успенскага сабора ва Уладзіміры – пяцігаловы храм з пяццю апсідамі. Але, ужыўшы прапорцыі залатога сячэння, ён дамогся манументальнай прастаты і яснасці аб'ёму, прыкрыўшы апсіды шырокімі пілястрамі на кутах. Строгі дэкор – аркатурны пояс на сярэдзіне вышыні муроў – таксама падкрэслівае пластыку храма.

Яшчэ шэраг прац італьянскіх майстроў у Маскоўскім крамлі дазваляе даследчыкам казаць пра праявы рэнесансу, прынесеныя замежнікамі на маскоўскую глебу, якія, аднак, не склаліся ў цэласны стыль і ўвасобленыя ў элементы «дэкоруму». Найперш гэта *Гранавітая палата*, пярэдні прыёмны пакой Крамлёўскага палаца (1487–1491 гг., архітэктары Марка Руфа і згаданы раней Салары). Падобная да сучасных італьянскіх палацаў, Палата атрымала назву дзякуючы гранёнаму русту ўсходняга фасада. Скончылася дзейнасць італьянцаў у крамлі будоўляй пахавальні маскоўскіх князёў *Архангельскага сабора* (1505–1508 гг., дойлід – Алевіз Новы). Да звыклай кампазіцыі ўсходнеславянскага храма – кубічнага аб'ёму з пяццю купаламі – італьянцы дадалі рэнесансавыя дэталі: пілястры карынфскага ордару замест лапатак на вышыню муроў, дэкаратыўныя ракавіны ў закамарах (паўкруглых завяршэннях асобных сегментаў фасадаў). Усё XVI стагоддзе больш строгі тып Успенскага сабора і святочна-свецкі Архангельскага будуць вызначаць асноўныя напрамкі развіцця дойлідства Масковіі.

Будаўніцтва развівалася і па-за межамі асноўных цэнтраў краіны. Недалёка ад Калугі ў 1444 г. быў заснаваны *Пафнуцьеў-Бораўскі манастыр*, цэнтральнай пабудовай якога стаў белакаменны *Раждзественскі сабор*, распісаны пазней выдатным майстрам Дыянісіем (пра яго гутарка пойдзе ў наступным раздзеле). У горадзе *Угліч*ы, паблізу Яраслаўля, пры канцы XV ст. узнік *драўляны крэмль з княжацкімі палатамі*, у развіццё традыцый усходнерускага драўлянага дойлідства. У Валагодскай зямлі на беразе Барадаеўскага возера цягам XV ст. быў створаны ансамбль *Ферапонтаўскага манастыра* з велічным *саборам Раства Багародзіцы*, пабудаваным растоўскімі майстрамі і распісаным фрэскамі Дыянісія і яго сыноў.

У багатых на лясы землях Карэліі актыўна развівалася драўлянае

Лазараўская царква Мурамскага манастыра, XIV ст.




дойлідства. Яго дасканалым узорам можна лічыць *Лазараўскую царкву Мурамскага манастыра* (XIV ст.).

Развіццё *жывапісу* ў гэты час адбываецца ў тых самых, найперш не пацярпелых ад ардынскай навалы, цэнтрах (Ноўгарад і Пскоў), а потым, набыўшы моц, ініцыятыву і навацыі ад іх пераймае Масква. Што да знешніх уплываў, то іх аказваюць паўднёваславянскія цэнтры, а таксама Візантыя. Кантакты з Захадам, найперш з Рэччу Паспалітай (вырашальныя ва ўсіх сферах культуры – выяўленчым і дэкаратыўным мастацтве, тэатры, музыцы, літаратуры), яскрава праявяць сябе толькі ў XVI–XVII стст.

*Рэлігійны жывапіс* Растова-Суздальскай (з Масковіяй) зямлі і іншых княстваў разгляданага часу спачатку развіваецца ў межах стылёвай плыні папярэдняга часу (найперш захаваных ад манголь-скага пагрому Ноўгарада і Пскова). Развіваецца іканапіс у Цвяры, якая, у супрацьлегласць Маскве, таксама імкнецца капіяваць наўгародскія, полацкія і паўднёваславянскія ўзоры, а ўсе яны разам – ісці ў фарватары візантыйскага кола. Што праўда, кампазіцыі такіх твораў паступова ўскладняюцца, прапорцыі постацяў выцягваюцца, робяцца вытанчанымі. Але з канца XIV ст. іканапіс раптоўна робіцца, нібы як рэакцыя на культуру Рэнесансу, мастацтвам персанальным: «усплываюць» імёны аўтараў. Безумоўнае лідарства як наватары трымаюць згаданы намі раней Феафан Грэк і Андрэй Рублёў.

Феафан Грэк (1337 – каля 1405) – і манументаліст, і іканапісец, і мініятурыст, выхадзец з Канстанцінопаля – спалучыў найлепшыя навацыі культуры Візантыі з мясцовым мастацтвам. Пачынаў ён



*Феафан Грэк* (?).
Успенне Маці Божай

© Здымак А. Сігачова.



Іканастас Дабравешчанскага манастыра ў Маскве

у сталіцы і візантыйскай правінцыі (у тым ліку ў Феадосіі), а з 1370 г. працаваў у Ноўгарадзе, пасля перакінуў масток культурных сувязяў у Маскву, пераехаўшы туды ў 1392 г. і папрацаваўшы з маладым Андрэем Рублёвым. Жывапіс візантыйца экспрэсіўна-эмацыйны, у фрэсках – амаль манахромны (карычневая охра, высвятленні, блікі), з напружанай лініяй малюнка. Захаваліся фрагменты роспісу наўгародскай царквы Спаса-на-Ільіне вуліцы (1378), якія глыбока ўражваюць напружаным пачуццём, змушаюць казаць пра сувязь яго творчасці з сучаснымі пошукамі ў рэлігійна-філасофскім жыцці паўночнай рэспублікі. Паслядоўнікі Грэка размалявалі царкву Фёдара Страцілата на Ручаі ў Ноўгарадзе. Творчасць майстра паўплывала і на наўгародскі іканапіс. Па пераездзе ў Маскву майстар ажыццявіў шэраг праектаў. Паводле сведчання аўтара «Жыція Сергія Раданежскага» Епіфанія Прамудрага (пам. у 1420), Грэк размаляваў сцены пакояў князя Уладзіміра Андрэевіча панарамным выглядам Масквы. Магчыма, гэта ён аформіў зааморфнымі ініцыяламі старонкі Евангелля баярына,

сына Андрэя Кабылы, Фёдара Кошкі (1392 г., Кошкі і Кабылы былі непасрэднымі родапачынальнікамі Раманавых). З ікон гэтага часу Феафану прыпісваецца двухбаковая – «Успенне Маці Божай»/«Маці Божая Данская» (1392). Ва «Успенні» ён найбольш праяўляецца як каларыст, і менавіта тут відавочная сувязь яго манеры з працамі яго верагоднага вучня – Андрэя Рублёва.

У апошнія гады свайго жыцця майстар працуе разам з Рублёвым і трэцім мастаком, Прохарам з Гарадца, над *іканастасам Дабравешчанскага сабора* ў Маскоўскім крамлі (1405). Тут Феафану прыпісваюць дэісусны чын (Хрыстос Пантакратар з малельна звернутымі да яго Божай Маці, Янам Хрысціцелем, архангеламі, апосталамі і святымі айцамі). Іканастас наватарскі: упершыню ў шмат'яруснай кампазіцыі перадалтарнай перагародкі ў маскоўскім мастацтве постаці пададзеныя ў поўны рост.

Пачатковы перыяд жыцця агульнапрызнанага ў расійскай гісторыі культуры першага іканапісца Андрэя Рублёва (каля 1360–1428) даволі цьмяны. Магчыма, ён нарадзіўся ў Маскоўскім княстве, а магчыма, у Ноўгарадзе. Тады ўплыў на яго вялікага Грэка і далейшае супрацоўніцтва з ім цалкам зразумелыя. Першыя верагодныя звесткі датычаць якраз роспісу (разам з Феафанам) Дабравешчанскага сабора ў Маскоўскім крамлі (фрэскі не захаваліся) і стварэння часткі іканастасу (якая загінула ў 1547 г.). Аднак даследчыкі робяць выснову: высокі статус замовы сведчыць пра асаблівы ўзровень мастака. У 2017 г. на базе тэхналагічных даследаванняў адкінута атрыбуцыя Рублёву Дэісуса (1396–1399, «Звянігарадскі чын» з Успенскага сабора на Гарадку) – выдатнага твора, блізкага рублёўскім паводле гарманічнай каларыстыкі і нават мацнейшага паводле выразу духоўнай экспрэсіі. Гэта само па сабе сведчыць пра прыкметны ўздым іканапісу ў Маскоўскім княстве. Дакладна вядома пра манаскі пострыг Рублёва пад імем Андрэя ў юнацтве ў маскоўскім Андронікавым манастыры, пра яго ўдзел у роспісе Успенскага сабора ва Уладзіміры (з Даніілам Чорным, 1408). Нарэшце, у 1420-х гг. ён з тым жа Даніілам Чорным ствараў роспісы Траецкага сабора Траецка-Сергіевай лаўры, якія не захаваліся. Пэўна, тады ж (або ў 1411 г.) паўстаў ягоны агульнавядомы шэдэўр «Тройца».



*Андрэй Рублёў.*
Тройца




Апостал Павел.
*Цвярская ікона канца XV ст.*

Бясспрэчнай лічыцца прыналежнасць Рублёву фрэсак ва Уладзіміры (верагодна, ікона Божай Маці Уладзімірскай адтуль жа, каля 1408) і прыгаданай «Тройцы». Амаль без сумневу яму належыць аўтарства мініятур «Евангелля Хітрава» (канец XIV ст.; магчыма, з Феафанам Грэкам). Рублёў выступіў як выдатны майстар абсалютна гарманічнага каларыту, меладычнай лініі, збалансаванай яснай кампазіцыі постацяў; ён быў стваральнікам адухоўлена-спакойных, урачыстых вобразаў. Нават драматычная звычайна кампазіцыя «Страшны суд» ва ўладзімірскіх фрэсках выглядае, нібы святочнае шэсце. У яго працах вельмі шмат «малельнай цішыні», затое не хапае экспрэсіі і жывых пачуццяў, уласцівых творам Феафана Грэка.

Менавіта Андрэй Рублёў быў названы кананічным для іканапісцаў паводле рашэння Стагаловага сабору (1551). Яго стыль больш іконны, упарадкаваны для паўтораў. Пры гэтым Рублёў не быў іншаземцам. Рашэнне Сабору не было катастрафічным, але яго вынік – доўгая стагнацыя ў развіцці галоўнага напрамку маскоўскага іканапісу.

Адметным шляхам у XV ст. развівалася *цвярская школа.* Разам з арыентацыяй на паўднёваславянскія і візантыйскія ўзоры (і грэцкі тыпаж твараў: напрыклад, «Апостал Павел», апошняя чвэрць XV ст.) узмацняецца імкненне да высвятлення абліччаў, яскравага блакітнага (з бялiламі) і вішнёвага колераў.

У пэўным сэнсе протарэнесансавая каларыстыка цвярскіх абразоў можа тлумачыцца сувязямі з ВКЛ: Ягайлавай маці (і жонкай Альгерда) была князёўна Юльяна Цвярская, а менавіта Ягайла быў замоўцам для Кракава аналагічных «візантыйска-рускіх» фрэсак. Таму вывезеная з Мінска ў Маскву ў 1910-х гг. ікона «Блакітнага Успення» (першая палова або трэцяя чвэрць XV ст.) дагэтуль у Расіі разглядаецца як «шэдэўр цвярской школы», у якім некаторым сучасным мастацтвазнаўцам «бачны захапляльны водбліск генія Андрэя Рублёва». Стылёвыя паралелі, аднак, тлумачацца шчыльнымі кантактамі Цвяры з ВКЛ (куды апошні цвярскі князь Міхаіл Барысавіч уцёк пасля яе захопу Масквой у 1485 г.). Як бачым, да канца XV ст. на прасторах будучай Расіі існавалі мастацкія цэнтры з рознай арыентацыяй у іконапісанні.

Скульптура, акрамя традыцыйных твораў у нізкім рэльефе (з косці, каменю, дрэва або літых ці чаканеных), у гэты перыяд у Маскоўскім княстве не развіваецца. Адзіны вынятак і безумоўная навацыя – гэта замоўленыя багатым купцом Васіліем Ярмоліным фарбаваныя каменныя аб'ёмныя вобразы святых для Спаскай вежы Маскоўскага крамля (1464; дэмантаваныя яшчэ ў 1491).

Помнікі *сярэднявечнай літаратуры* на маскоўска-рускай мове ствараліся пад выразным уплывам паўднёваславянскай і позневізантыйскай літаратуры: пра гэта сведчаць і іх асноўныя жанры, сістэма вобразаў і асаблівасці ўжывання тых або іншых мастацкіх сродкаў. Гэта характэрна як для помнікаў рэлігійнай літаратуры (жыціі Епіфанія Прамудрага, пачатак XV ст.; Пахомія Серба, сярэдзіна XV ст.), так і для шматлікіх устаўных аповесцяў, якія мы знаходзім у складзе сярэднявечных усходнеславянскіх летапісаў («Летапісная аповесць пра Кулікоўскую бітву», канец XIV ст.; «Жыціе Дзмітрыя Данскога», пачатак XV ст.). З'яўляюцца першыя ўзоры вялікарускага гераічнага эпасу («Задоншчына», каля 1410 г., якая прыпісваецца манаху Сафронію; ананімныя «Паданне пра Мамаева

пабоішча» і «Аповесць пра нашэсце Едыгея», сярэдзіна XV ст.). Раней намі ўжо згадваўся ўзор свецкай прозы «Хаджэнне за тры моры» Афанасія Нікіціна.

З'явіліся і новыя *фальклорныя жанры* – як, прыкладам, *гістарычная песня*, узорам якой можна лічыць прысвечаную антытатарскаму паўстанню жыхароў Цвяры «*Песню пра Шчалкана Дудзенцьевіча*», запісаную ў сярэдзіне XIV ст.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Аркатурны пояс*** – тэрмін з архітэктуры; азначае шэраг дэкаратыўных, несапраўдных выгбачак, якія абапіраюцца на калоны, і да т. п.

***Бабыль*** – адзінокі селянін, які не меў зямельнага надзелу.

***Баскак*** – прадстаўнік ардынскага хана ва Усходняй Русі.

***Басма*** – пласцінка, якая выдавалася ардынскімі ўладарамі ў якасці даверчага ліста.

***Баярская дума*** – найвышэйшы савет Маскоўскай дзяржавы; складаўся з прадстаўнікоў найбуйнейшай знаці, але ніякіх рэальных паўнамоцтваў не меў.

***Выхад*** – рэгулярная даніна, якую збіралі ва Усходняй Русі для хана Залатой Арды.

***Даткавыя сяляне*** – асобы са складу цяглавага насельніцтва, аддадзеныя на пажыццёвую вайсковую службу.

***Дваравыя сяляне*** – чэлядзь і халопы; жылі пры двары землеўласніка і абслугоўвалі яго і яго сям'ю.

***Закамара*** – тэрмін з архітэктуры; азначае паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне знешняга боку сцяны будынка, якое сваёй формай адпавядае скляпенню.

***Іасіфляне*** – паслядоўнікі Іосіфа Волацкага, прадстаўнікі скрайне кансерватыўнай плыні ў маскоўскай праваслаўнай царкве, вострыя крытыкі «няхціўцаў» на чале з Нілам Сорскім.

***Іканастас*** – драўляная перагародка, якой раздзяляюцца алтар і асноўная частка храма; складаецца з некалькіх шэрагаў абразоў, устаноўленых у пэўным парадку на гарызантальных бэльках.

***Какошнік*** – тэрмін з архітэктуры; азначае штучную закамару, якая мае выключна дэкаратыўнае прызначэнне.

***Капітэль*** – тэрмін з архітэктуры; азначае па-мастацку аформленую верхнюю частку калоны або пілястры, якая размяшчаецца паміж ствалом апоры і яе гарызантальным перакрыццем.

***Караван-сарай*** – у мусульманскіх краінах: заезны двор, месца часовага прытулку.

***Кармленне*** – прывілей, які вялікія і ўдзельныя князі давалі сваім васалам; паводле яго мясцовая адміністрацыя пажыццёва ўтрымлівалася за кошт насельніцтва.

***Манахромія*** – тэрмін выяўленчага мастацтва; азначае якасць мастацкага твора, што палягае ў выкарыстанні адной фарбы пры вялікай колькасці градацый яе танальнасцяў.

***Месніцтва*** – сістэма землеўласніцкай іерархіі ў Маскоўскай дзяржаве, паводле якой месца землеўласніка найперш вызначалася яго паходжаннем, знатнасцю роду, заслугамі продкаў.

***Медрэсэ*** – мусульманская сярэдняя навучальная ўстанова.

***Мінарэт*** – вежа пры мусульманскім храме, з якой святар заклікае вернікаў на малітву.

***Мячэць*** – мусульманскі храм.

***Намеснік*** – афіцыйная асоба ў Маскоўскай дзяржаве, якая займалася ў воласці судом, зборам мыта, іншымі адміністрацыйнымі справамі. Пасада была скасаваная ў 1556 г. Замест намеснікаў былі ўведзены «*галовы ўзлюбленыя*».

***Няхціўцы (нестяжатели)*** – прадстаўнікі рэлігійна-палітычнага руху (Ніл Сорскі, Васіян Касой), якія выступалі супраць манастырскага землеўладання і раскошы ў праваслаўных храмах і манастырах. Рух афіцыйна асуджаны праваслаўнай царквой на Саборы ў 1503 г.

***Отракі*** – дваровыя слугі князя, малодшыя ўдзельнікі княскай дружыны.

***Пажылое*** – плата, якая бралася з селяніна за пераход ад аднаго землеўласніка да другога.

***Памесце*** – зямельны надзел, які ўладары Маскоўскай дзяржавы давалі служылай асобе за выкананне вайсковай службы.

***Пілястра*** – тэрмін з архітэктуры; азначае прамавугольны ў плане вертыкальны выступ на паверхні сцяны.

***Путныя баяры*** – баяры, якія атрымлівалі пад сваё кіраванне і ў кармленне ў дарозе асобныя падраздзяленні: лоўчага, канюшага, чашніка і інш.

***Руст*** – тэрмін з архітэктуры; азначае спосаб апрацоўкі фасадаў квадрамі з іншых матэрыялаў.

***Сваяземцы*** (***каланісты***) – сяляне, якія жылі на межах краіны, засялялі новыя землі і лічылі потым іх сваёй уласнасцю.

***Стральцы*** – служылыя людзі, якія знаходзіліся на пастаяннай службе ў маскоўскім войску.

***Судзебнікі*** – зборнікі законаў Маскоўскай дзяржавы.

***Сялянскі вываз*** – вывад сялян землеўласнікам ад папярэдняга землеўласніка гвалтам або па дамоўленасці з сялянамі.

***Цемнік*** – камандзір дзесяці тысяч ваяроў Залатой Арды.

***Цягла*** – грашовыя і натуральныя дзяржаўныя павіннасці сялян і пасадскіх людзей.

***Юр'еў дзень*** – назва рэлігійнага свята, прысвечанага хрысціянскаму святому – Юрыю (Георгію); адзначалася 23 красавіка і 26 лістапада паводле юліянскага календара. Паводле Судзебніка вызначалася, што селянін меў права перайсці да іншага землеўласніка толькі за тыдзень перад Юр'евым днём і не пазней як праз тыдзень пасля яго.

***Ярлык*** – пацверджанне мангольскімі (ардынскімі) ханамі права ўсходнеславянскага князя на княжанне; выдаваўся напачатку ў вуснай, а пазней і ў пісьмовай форме.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА

Греков, И. Б., Шахмагонов, Ф. Ф. Мир истории: Русские земли в XIII–XV веках. Москва: Молодая гвардия, 1986. 334 с.

История русского искусства: в 13 тт. / под ред. И. Э. Грабаря, В. Н. Лазарева, В. С. Кеменова. Т. 2. Москва: Изд-во АН СССР, 1954. 426 с.

Каменская, Е. Ф. Шедевры древнерусской живописи. Москва: Советский художник, 1971. 60 с.

Кульпин, Э. С. Золотая Орда. Москва: Московский лицей, 1998. 243 с.

Кучкин, В. А. Формирование государственной территории Северо-Восточной Руси в X–XIV вв. Москва: Наука, 1984. 353 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мінск: Беларусь, 2010. С. 128–138.

Летапісы і хронікі Беларусі: Сярэднявечча і раньнемадэрны час. / прадм. і ўкл. В. Вароніна. Тэматычны дадатак да часопіса ARCHE. 2009. № 9. 902 с.

Любимов, Л. Д. Искусство Древней Руси: кн. для чтения. Москва: Просвещение, 1974. С. 127–294.

Мыськов, Е. П. Политическая история Золотой Орды (1236–1313). Волгоград: Изд-во Волгогр. гос. ун-та, 2003. 178 с.

Почекаев, Р. Ю. Цари ордынские. Биографии ханов и правителей Золотой Орды. 2-е изд. С.-Петербург: Евразия, 2012. 464 с.

Святая Земля в русском искусстве. Каталог. Москва: ГТГ, 2001. 368 с.

Творогов, О. В. Литература Древней Руси. Москва: Просвещение, 1981. С. 56–93.

Темушев, В. Н. Территория и границы Московского княжества в конце XIII – первой половине XIV в.: дис. … канд. ист. наук. Минск, 2002.

Трусаў, А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Выд. 2-е, папр. Мінск: Выд. Зміцер Колас, 2017. С. 135–169, 268–298.

Шабульдо, Ф. М. Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского. Киев: Наукова думка, 1987. 183 с.

Fennel, John L. I. The Crisis of Medieval Russia 1200–1304. [Harlow:] Longman, 1983. 206 p.

Kirchen und Klöster im alten Russland. Stilgeschichte der altrussischen Baukunst von der Kiewer Rus bis zum Verfall der Tatarenherrschaft. Von Hubert Faensen. Leipzig: Koehler & Amelang, 1982. 267 S.

Martin, J. Medieval Russia, 980–1584. 2nd ed. Cambridge University Press, 2012. P. 149–362.

# 5. ЭТНІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ І ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НЕСЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ НАЎГАРОДСКАЙ, МАСКОЎСКАЙ І ПАЎДНЁВАЙ РУСІ

Было б няслушным разважаць пра гісторыю Наўгародскай, Пскоўскай, Уладзіміра-Суздальскай, Маскоўскай земляў або вялікага рэгіёна на поўдзень ад іх, не закранаючы пытання традыцыйнай культуры карэннага насельніцтва гэтай тэрыторыі, якое мела неславянскія карані.

***5.1. Фіна-угры.*** Пачынаючы з XIX ст. большасць даследчыкаў змяшчае прарадзіму фіна-у граў у раён Урала і самай заходняй часткі Сібіры (археалагічная *культура грабеньчатай керамікі*). Папулярным з'яўляецца меркаванне, што ў глыбокай старажытнасці існавала этнічная супольнасць, якая фарміравалася і развівалася па-за індаеўрапейскай і была асновай для наступнага адасаблення і развіцця як алтайскай, так і ўральскай сем'яў. Час яе існавання ўвязваецца з эпохай верхняга палеаліту. Разам з тым, некаторыя сучасныя навукоўцы сцвярджаюць, што фіна-угры былі наўпроставымі нашчадкамі плямён кундскай, бутоўскай археалагічных культур і культуры Верацце, якія яшчэ ад часоў мезаліту засялялі значную тэрыторыю сённяшняй Паўночна-Усходняй Еўропы. Продкаў фінамоўнага насельніцтва перыяду неаліту прынята атаясамліваць з плямёнамі *ямачна-грабеньчатай* або *воласаўскай* археалагічных культур. Ужо ў жалезным веку развіліся *гарадзецкая культура* (продкі часткі сучаснай *мардвы*), *дзякаўская культура* (продкі *меры* і часткова *весі*), *ананьінская культура* (продкі часткі сучасных *марыйцаў* і *комі-пермякоў*). Продкі *водзі*, *іжорцаў*, часткова той жа весі ў больш позні перыяд належалі да плямён культуры *каменных могільнікаў*. *Вепсы*

ў яшчэ больш позні час належалі да культуры *курганных могільнікаў*. Племя *мяшчэры* (*мішароў*, продкаў часткі мардвы) належала да своеасаблівай культуры *пахаванняў з пласцінчатымі грыўнямі*.

Паводле летапісаў, непасрэдны ўдзел у фарміраванні насельніцтва і пачаткаў дзяржаўнасці ў наўгародскіх, пскоўскіх і цвярскіх землях узялі такія фіна-ўгорскія плямёны, як весь, іжора, водзь; наконт фіна-ўгорскага паходжання чудзі частка сучасных даследчыкаў выказвае сумневы. У Прыкам'і здаўна жыло племя *зыран* – аднаго з продкаў сучаснага народа комі. Для Маскоўскай Русі значэнне мелі такія плямёны фіна-ýграў, як згаданыя ўжо намі мера, мурама, мяшчэра.

Сярод вепсаў досыць рана (XI–XII стст.) распаўсюдзілася хрысціянская рэлігія ў праваслаўнай версіі, але язычніцкія традыцыі доўга заставаліся трывалымі. Вера ў «гаспадара лесу», у «дамавікоў» знайшла сваё адлюстраванне ў чудскім (вепскім) фальклоры. Пазней узніклі паданні пра «паноў-продкаў», што сведчыць, відаць, пра ўплывы прышлых крывічоў.

Для паселішчаў чудзі былі характэрны драўляныя жыллёвыя пабудовы: Т-падобная планіроўка жылой часткі з накрытым двухпавярховым дваром; размяшчэнне стала каля фасаднай сцяны хаты.

Адным з самых блізкіх да чудзі плямёнаў было племя *карэла*. Менавіта прадстаўнікі гэтага племя стварылі адзін з самых унікальных у свеце помнікаў фальклору – цыкл гераічна-міфалагічных песняў, які сёння, у літаратурнай апрацоўцы, вядомыя пад назвай «*Калевала*».

Тыповы двор-дом прадстаўнікоў гэтага народа традыцыйна меў выгляд зрубавай «брусавай» будовы, у якой жылыя і гаспадарчыя памяшканні былі размешчаны пад агульнай двухсхільнай страхой.

Племя іжоры таксама ўнесла свой уклад у складанне рун калевальскага цыклу. Іжорцы жылі ў хатах на высокіх падмурках, а стрэхі выкладалі на накладных кроквах. Іх вопратка вылучалася арыгінальным арнаментам.

Прадстаўнікі племені водзі вылучаліся сваёй незвычайнага крою вопраткай, да якой жанчыны далучалі таксама вельмі арыгінальныя ўпрыгожанні – нагрудныя шпількі, ланцужкі, бронзавыя спіралькі, алавяныя пярсцёначкі. Тыповае жытло водзі вельмі нагадвала хаты ўсходнеславянскага тыпу.



Жаночыя ўборы фіна-ўграў (*паводле археалагічных матэрыялаў*). *Злева направа*: строй жанчыны, пахаванай у Шатрышчынскім могільніку; строй мурамкі; строй мардоўскай жанчыны

Комі-зыране – адно з першых фіна-ўгорскіх плямёнаў, якіх яшчэ ў XII ст. далучылі да Наўгародскай зямлі. У фальклоры зыран папулярныя вобразы Іллі Мурамца ды іншых легендарных асілкаў – Фёдара Кірана і Рамана Прыгожага. Вельмі папулярнымі былі таксама паданні пра чараўнікоў і разбойнікаў. Шэраг паданняў прысвечаны адважнаму вясковаму паляўнічаму Ірку (Іркапу). Адметнымі і разнастайнымі выглядалі народныя строі (асабліва жаночыя) комі-зыран: яны існавалі ў дзясятках варыянтаў, былі аздобленыя арыгінальнымі арнаментамі.

Комі-зыране здаўна развівалі драўлянае дойлідства, формы якога былі вельмі блізкімі да драўлянага дойлідства славян Наўгародскай зямлі. Аднак для жыллёвага будаўніцтва былі характэрны фінскія двухпавярховыя двары.

Паводле меркавання шэрагу даследчыкаў, фіна-ўгорскае племя мера мела дачыненне да ўзнікнення сучаснага *марыйскага народа*, а плямёны мурамы і мяшчэры (з удзелам *макшан* і *эрзян*) з'яўляюцца продкамі сучаснай *мардвы*. Марыйцы здаўна жылі ў двухчасткавых зрубавых хатах з бярвення, каля якіх размяшчаўся П-падобны двор з брамай. Характэрнымі гаспадарчымі пабудовамі былі двухпавярховыя клеці з галерэямі.

Прыкладна ў IX–X стст. этнонім старажытных марыйцаў «чараміс» пачынае згадвацца ў пісьмовых крыніцах: прыкладам, у «Аповесці мінулых летаў» або ў лісце хазарскага цара Ёсіфа.

Самабытным жанрам марыйскага фальклору здаўна былі песні («мура», «мыры»); сярод іх вылучаліся бытавыя, гасцявыя, вясельныя, сірочыя, памінальныя, спевы-роздумы і г. д. Шанаваліся людзі, якія гралі на валынках («шувыра»). Марыйскі фальклор таксама багаты на казкі, паданні і легенды.

Прадстаўнікі племені мурамы ў Высокім Сярэднявеччы пад уплывам волжскіх булгараў пазнаёміліся з ісламам і назвалі «Маамефа» (г. зн. Магамета) сваім прарокам. Толькі ў XVII ст. адбылося ініцыяванае Масквой масавае хрышчэнне тагачаснай мардвы паводле праваслаўнага абраду. Мардва мела арыгінальную міфалогію, сваю версію аб стварэнні свету. Гэтыя ўяўленні знайшлі адлюстраванне ў фальклоры, які ствараўся на дзвюх мовах – макшанскай і эрзянскай.

Для паселішчаў мардвы характэрнымі былі сядзібы, у якіх жылыя і гаспадарчыя памяшканні знаходзіліся ў глыбіні двара. Да традыцыйнага стылю вопраткі здаўна належала нашэнне жанчынамі шараварaў.

Вядома, што прадстаўнікі мяшчэры ў звычайныя дні насілі лапці, плялі іх з вялікім майстэрствам, а па святах надзявалі скураныя боты.

Першыя згадванні *пермскіх фінаў* звязаны с рускімі летапісамі X–XI стст.: «в Афетове же части седят Русь, Чудь и все язици: Меря, Мурома, Весь, Мордва, Заволочская чудь, Пермь, Печера, Ямь, Угра». Важныя звесткі пра пермскіх фінаў у раёне ракі *Вычагды* ўтрымліваюцца ў Жыціі епіскапа Стафана Пермскага (канец XIV ст.). Пры канцы XV ст. упершыню згадваюць ваццкую (удмурцкую) зямлю Казанскага ханства.

Усходнеславянскія плямёны, якія сталі асновай будучых велікаросаў, пазычылі ў фіна-ўграў некаторыя віды драўляных пабудоў, абутку і розных побытавых рэчаў. Запазычанні ў велікарускай (а часткова – і ў беларускай) мове з фіна-ўгорскіх моў збольшага канцэнтруюцца вакол тэрмінаў рыбных і марскіх промыслаў, прадуктаў харчавання, спецыфічных паўночных прыродных з'яў. Гэта словы «камбала», «килька», «сёмга», «салака», «морж», «нерпа», «лайба», «пельмени», «пахта», «пихта», «пурга», «тундра», «саўна» ды іншыя.

***5.2. Балты ў басейне Волгі і Акі.*** Яшчэ ў бронзавым і раннім жалезным веку вялікія тэрыторыі басейна Волгі і Акі займалі плямёны фацьянаўскай археалагічнай культуры, якія сучасныя даследчыкі адносяць да пратабалтаў.

У атачэнні фіна-ўгорскіх плямёнаў у верхнім цячэнні ракі Протвы, левага прытоку Акі, на пераломе I і II тыс. н. э. жыло згаданае намі раней балцкае племя голядзі, паходжанне якога звязана з машчанскай культурай. Згодна з некаторымі сведчаннямі, голяддзю называла сябе адгалінаванне вядомага яшчэ з антычных крыніц племені галіндаў, якое насяляла ўзбярэжжа Балтыйскага мора сённяшняй паўночнаўсходняй Польшчы. Мы надзвычай мала ведаем цяпер пра культуру гэтага племені, але летапісныя крыніцы даюць падставы меркаваць, што яно існавала і захоўвала сваю самабытнасць, прынамсі, да XV ст., калі адбылася славянская каланізацыя гэтага рэгіёна і маскоўскія князі пачалі засноўваць тут новыя гарады.

Даследчыкі лічаць, што наогул балты, якія жылі ў басейне Акі, прынялі ўдзел у этнагенезе славянскага племені вяцічаў. Пра гэта сведчаць, напрыклад, перанятыя вяцічамі жаночыя ўпрыгожанні ў выглядзе *шыйных грыўняў*. У старажытна-ўсходнеславянскія дыялекты, а потым і ў літаратурную велікарускую мову трапілі такія старадаўнія *балтызмы*, як «деревня», «ковш», «пакля», «скирда», «янтарь», «вентерь», «ендова», «баланда», «тюря» ды інш.



Сярэднявечныя балты. *Са старадаўняй мініяцюры*

Народы *цюркскага і іранскага паходжання* далучыліся да этнагенезу сучасных велікаросаў значна пазней за славян і фіна-ўграў, але гэтае далучэнне таксама мела істотнае гістарычнае значэнне.

***5.3. Цюркі.*** Прарадзімай цюркскіх народаў шмат хто з даследчыкаў лічыць стэпы і пласкагор'і Цэнтральнай Азіі, а найперш рэгіён Алтайскіх гор. Пачынаючы з II ст. і заканчваючы XIII ст., змешваючыся з суседзямі, цюркі паступова перасяліліся на тэрыторыю цяперашняй Расіі і занялі тыя землі, на якіх цяпер жывуць іх нашчадкі.

Мовы цюркскіх народаў падобныя: як мяркуюць мовазнаўцы, у глыбокай старажытнасці яны былі дыялектамі адной мовы. З часам блізкасць страцілася. Цюркі рассяліліся на вельмі вялікай прасторы, перасталі размаўляць адзін з адным, у іх з'явіліся новыя суседзі, іх мовы не маглі не зрабіць уплыву на цюркскія. Пры гэтым мова *чувашоў* цюркскай сям'і моў займае крыху адасобленае месца.

У значнай ступені вынікам мангольскага заваявання земляў сучаснай Расіі, удзелу ў ім цюркаў стала наяўнасць вялікай колькасці цюркскіх запазычанняў у сучаснай велікарускай мове: «лошадь», «ковёр», «чертог», «барыш», «казак», «ямщик», «кочевать», «сундук», «кирпич», «арбуз», «башмак», «кафтан», «кинжал», «шаровары», «башлык», «чулок», «тулуп», «сарафан», «колпак», «стакан», «фата», «таракан», «бязь», «бурлак», «туман», «карандаш», «фарфор», «изъян» і многія іншыя.

Сваяцтва цюркаў сёння разглядаецца хутчэй як моўнае, чым генетычнае. У старажытнасці і Сярэднявеччы цюркі-качэўнікі пасяліліся на велізарнай тэрыторыі, якую займалі іншыя плямёны. Некаторыя з гэтых плямёнаў перайшлі на цюркскія гаворкі з прычыны іх прастасці і з часам пачалі адчуваць сябе цюркамі, хоць адрозніваліся ад іх і сваім вонкавым выглядам, і сваімі традыцыйнымі заняткамі.

Традыцыйныя віды гаспадаркі, якімі цюркскія народы Расіі займаліся ў мінулым (а дзе-нідзе працягваюць займацца і цяпер) – таксама досыць разнастайныя. Амаль усе вырошчвалі збожжавыя культуры і гародніну. Шмат хто гадаваў жывёлу: коней, авечак, кароў. Выдатнымі жывёлагадоўцамі здаўна былі татары, башкіры, балкарцы. Рэлігіі у цюркскіх народаў цяпер таксама розныя. Сённяшнія татары, башкіры – мусульмане. Чувашы, пачынаючы з сярэдзіны

XVIII ст., лічыліся самым хрысціянскім народам у Паволжы, але ў апошнія гады некаторыя з іх вяртаюцца да паганства: пакланяюцца сонцу, месяцу, духам зямлі і жытла, духам-продкам; не адмаўляюцца, зрэшты, і ад праваслаўя.

У Расіі цяпер ёсць некалькі народаў, якія называюць сябе *татарамі*. Астраханскія татары жывуць недалёка ад Астрахані, касімаўскія татары – каля горада Касімава, што на Ацэ (на тэрыторыі, дзе некалькі стагоддзяў таму жылі служылыя татарскія царэвічы). І нарэшце, казанскія татары, названыя так паводле найменне цэнтра Татарыі, горада Казані. Усё гэта – розныя, хоць і блізкія адзін аднаму, народы. Аднак проста татарамі ў сённяшнім разуменні варта называць толькі казанскіх.

Самі татары пачалі называць сябе так даволі позна – толькі ў сярэдзіне XIX ст. Вельмі доўга яны гэтай назвы не любілі і лічылі яе зняважлівай. Да XIX ст. яны называліся па-рознаму: «булгарлы» (булгар), «казанлы» (казанскі), «месельман» (мусульманін).



Палавецкі каменны стод з-пад Луганска, не пазней за XIII ст.
*З кыпчакскага архіва*

Летапісныя крыніцы расказваюць пра ваяўнічыя качавыя плямёны цюркаў – *печанегаў* і *палаўцаў*. Полаўцы ўваходзілі ў непасрэдны кантакт з усходнеславянскімі плямёнамі: так, вядома, што маці ўладзіміра-суздальскага князя Андрэя Багалюбскага была палаўчанкай. Полаўцы пакланяліся боству Вечнага Сіняга Неба Тэнгры і багіні Умай, якая ўвасабляла зямны пачатак. Існавала ў іх і татэмнае пакланенне ваўку. У наваколлі ўкраінскага Луганска былі знойдзены шматлікія палавецкія каменныя стоды («бабы»).

Мы ўжо казалі пра дзяржаву цюркаў, якая існавала ў Высокім Сярэднявеччы на Сярэдняй Волзе пад назвай Волжская Булгарыя.

Пра высокі ўзровень культуры булгараў на той час сведчыць існаванне двух відаў пісьмовасці – старажытнай цюркскай рунічнай і больш позняй арабскай, якая прыйшла разам з ісламам у Х ст. Апошняя паступова выцесніла знакі старацюркскай пісьмовасці са сферы дзяржаўнага ўжытку. І гэта было заканамерна: арабскай мовай карыстаўся ўвесь мусульманскі Усход, з якім у Булгарыі былі цесныя палітычныя і эканамічныя кантакты.

Да нашага часу дайшлі імёны выдатных паэтаў, філосафаў, навукоўцаў Булгарыі, чые творы ўваходзяць у залаты фонд народаў Усходу. Гэта – Хаджа Ахмед Булгары (XI ст.), навуковец і багаслоў, знаўца маральных прадпісанняў ісламу; Сулейман ібн Давуд ас-Саксіні-Сувар (XII ст.), аўтар філасофскіх трактатаў з вельмі паэтычнымі назвамі: «Святло промняў – праўдзівасць таямніц», «Кветка саду, якая цешыць хворыя душы». У той самы час паэт Кул Галі (XII–XIII стст.) напісаў «Паэму пра Юсуфа», якая лічыцца класічным цюркамоўным мастацкім творам дамангольскага перыяду.

У сярэдзіне XIII ст. Волжская Булгарыя была заваявана манголамі і ўвайшла ў склад Залатой Арды. Пасля падзення Арды ў XV ст. у Сярэднім Паволжы ўзнікла і Казанскае ханства. Асноўную частку яго насельніцтва ўтваралі ўсё тыя ж булгары, якія да таго часу ўжо паспелі зазнаць моцны ўплыў сваіх суседзяў – фіна-ўгорскіх народаў (мардвы, марыйцаў, удмуртаў), што жылі побач з імі ў басейне Волгі, а таксама манголаў, якія складалі большасць кіраўнічай эліты Залатой Арды.

***5.4. Іранскія народы. Аланы.*** З часоў антычнасці ў літаратуры прысутнічаюць звесткі пра качавыя плямёны, якія вандравалі па абшарах сённяшняга поўдня еўрапейскай часткі Расіі. Гэтыя плямёны размаўлялі на гаворках усходнеіранскай групы індаеўрапейскай моўнай сям'і. Сярод гэтых плямёнаў найперш вылучаюць *аланаў*, нашчадкаў колішніх качавых і ваяўнічых *сарматаў*. Аланы досыць рана пачалі хрысціянізавацца паводле візантыйскага абраду, хоць у іх звычаях захоўвалася шмат язычніцкіх элементаў. Фламандскі манах-падарожнік Гільём дэ Рубрук у сярэдзіне XIII ст. пісаў: «Спытаў той чалавек у нас, ці хочам мы піць кумыс (cosmos), гэта значыць кабылінае малако. Бо знаходзяцца сярод іх хрысціяне – рускія,

Аланскі храм у Архызе (цяпер – Карачаева-Чаркесія)




грэкі і аланы, – якія хочуць моцна захоўваць свой закон, не п'юць яго і нават не лічаць сябе хрысціянамі, калі вып'юць, і іх святары заміраюць іх тады [з Хрыстом], як калі б яны ад яе адмовіліся, ад хрысціянскай веры…

…Напярэдадні Пяцідзесятніцы [7 чэрвеня 1253 г.] прыйшлі да нас нейкія аланы, якія называюцца там «асамі», хрысціяне паводле грэцкага абраду, якія маюць грэцкія пісьмёны і грэцкіх святароў. Аднак яны не схізматыкі, падобна да грэкаў, а шануюць кожнага хрысціяніна без адрознення асобаў».

Прамымі нашчадкамі аланаў лічацца асеціны, якія сёння жывуць на Каўказе і ў Грузіі.

Велікаруская і іншыя ўсходнеславянскія мовы запазычылі нямала слоў з іранскіх моў: «топор», «чаша», «ворс», «штаны», «хмель», «медь», «пан», «гуня», «хата», «бог», «честь», «рай», «каяться» ды іншыя.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Этнас (этнічная супольнасць)*** – устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання.

***Этнічная група*** – група прадстаўнікоў пэўнага народа (частка этнасу), якая пражывае па-за межамі яго этнічнай тэрыторыі. Адрозніваецца ўласнай мовай, культурай, побытам, самасвядомасцю, рэлігіяй, радзей і антрапалагічным тыпам.

***Этнічная тэрыторыя*** – тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа (этнасу), з якой цесна звязаны яго этнагенез і этнічная гісторыя. Вызначаецца ўстойлівасцю на працягу многіх стагоддзяў.

***Этнагенез*** – працэс фарміравання этнічнай супольнасці. У шырокім сэнсе слова «этнагенез» ахоплівае вялікі гістарычны перыяд складвання і існавання этнасу ў розных этнасацыяльных формах.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА

Агусти, Алемань. Аланы в древних и средневековых письменных источниках. Москва: Менеджер, 2003. 608 с.

Аяган, Б. Г. Тюркские народы: Энциклопедический справочник. Алматы: Қазақ энциклопедиясы, 2004. 382 с.

Закиев, М. З. Происхождение тюрок и татар. Москва: Инсан, 2002. 496 с.

Калевала. Літаратурная апрацоўка Эліяса Лёнрута; пераклад з фінскай Якуба Лапаткі. Мінск: Зміцер Колас, 2016. 626 с.

Напольских, В. В. Очерки этнической истории. Казань: Институт археологии им. А. Х. Халикова, 2015. 646 с.

Народы Европейской части СССР. Т. I / под ред. В. А. Александрова [и др.]. Москва: Наука, 1964. С. 61–70.

Народы Европейской части СССР. Т. II / Под ред. В. А. Александрова [и др.]. Москва: Наука, 1964. 918 с.

Народы Поволжья и Приуралья. Коми-зыряне. Коми-пермяки. Марийцы. Мордва. Удмурты / отв. ред. Н. Ф. Мокшин [и др.]. Москва: Наука, 2000. 579 с.

Петрухин, В. Я., Раевский, Д. С. Очерки истории народов России в древности и раннем Средневековье. 2-е изд. Москва: Знак, 2004. 416 с.

Рябинин, Е. А. Финно-угорские племена в составе Древней Руси. С.-Петербург: Изд-во СПбГУ, 1997. 260 с.

Ситдиков, А. Г. Введение в этногенез народов Поволжья и Приуралья. Ч. I: Истоки этногенеза финских народов. Казань: Изд-во Казанского гос. ун-та, 2008. 33 с.

Сулимирский, Т. Сарматы. Древний народ юга России / пер с англ. Москва: Центрполиграф, 2008. 191 с.

Сухорукова, О. А. Этническая история России. Ч. 1. Москва: МГПУ, 2015. 204 с.

Финно-угры в России. *Рэжым доступу*: http://maxpark.com/community/13/content/2140214.

Этнография России. *Рэжым доступу*: http://www.russiafederation.ru/ethnography/.

# 6. МАСКОВІЯ-РАСІЯ Ў XVI СТ.

***6.1. Палітыка Васілія III.*** Васілій III (1505–1533) канчаткова далучыў да Маскоўскай дзяржавы Пскоў і Разань і правёў некалькі войнаў з ВКЛ. Першая вайна 1507–1508 гг., нягледзячы на здраду і пераход на бок Масквы аднаго з найлепшых ваяроў ВКЛ Міхала Глінскага, скончылася для Васілія III безвынікова. Аднак князі Глінскія і іх прыхільнікі атрымалі права вольна пераехаць у Маскоўскую дзяржаву.

Наступная вайна пачалася ў 1512 г. Да яе маскоўскі цар добра падрыхтаваўся і дамовіўся пра вайсковы альянс супраць ВКЛ з Лівонскім і Тэўтонскім ордэнамі. У лістападзе войскі цара атачылі Смаленск, штурмавалі яго шэсць тыдняў, але горад не ўзялі і мусілі адступіць.

Другі паход на Смаленск пачаўся ў ліпені 1513 г. Да восені горад абкружыла 20-тысячнае маскоўскае войска, якое мела шмат гармат і 1,5 тыс. пішчаляў. Але і другі штурм выніку не даў. У лютым 1514 г. Масква заключыла ваенны саюз са Свяшчэннай Рымскай імперыяй, і пры канцы траўня 1514 г. пачаўся трэці паход на Смаленск. Горад няспынна абстрэльвалі 200 гармат, і 31 ліпеня ён капітуляваў. Войскі цара захапілі Мсціслаў, Крычаў і Дуброўну і сустрэліся з войскам ВКЛ 8 верасня 1514 г. у бітве пад Оршай. Маскоўскіх ваяроў было значна больш, аднак дзякуючы вайсковаму таленту гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага яны пацярпелі знішчальнае паражэнне. Шмат нападнікаў загінула, а яшчэ больш трапіла ў палон. Астрожскі выгнаў захопнікаў з тэрыторыі ВКЛ і ўзяў у аблогу Смаленск, але вызваліць яго не здолеў, бо меў усёй вайсковай сілы не больш за 6 тыс. ваяроў і толькі некалькі невялікіх гармат.

Пасля бітвы пад Оршай імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі адмовіўся падтрымліваць Васілія III. У 1522 г. зацікаўленыя бакі падпісалі замірэнне на 5 гадоў. Смаленск застаўся ў Масковіі,



*Б.Чорыкаў.* Васілій III, вялікі князь маскоўскі, уводзіць у палац сваю нявесту Алену Глінскую

а шматлікі маскоўскі палон – у ВКЛ. У 1523 г. Васілій III выгнаў са сваіх гарадоў князёў Северскай зямлі (Браншчыны) і забраў сабе іх землі. Але спакою па-ранейшаму не было. З боку Крымскага і Казанскага ханстваў мелі месца бясконцыя набегі на ўсходнія і паўднёвыя ўскраіны Маскоўскай дзяржавы, што не дазваляла мясцовым сялянам засяліць так званае Дзікае Поле, дзе былі чарназёмныя стэпы. У гарадах Калузе, Туле і Зарайску былі пабудаваны мураваныя крэпасці (крамлі), у якіх увесь час знаходзіліся войскі.

Доўгі час Васілій III не меў дзяцей з першай жонкай, якая паходзіла з баярскага роду. Тады ён прымусіў сваю жонку пайсці ў манастыр і ажаніўся другі раз, з Аленай Глінскай – з роду тых Глінскіх, якія перасяліліся з ВКЛ у Масковію. У яго нарадзіліся два сыны, але калі старэйшаму было толькі тры гады, цар раптоўна памёр.

Васілій III, як і яго бацька, пачаў лічыць сябе адзіным спадкаемцам Візантыі і «ўсяго праваслаўнага свету». Гэтую ідэю абгрунтаваў пскоўскі манах і пісьменнік Філафей, які напісаў цару ліст, даказваючы, што спачатку цэнтрам свету быў стары (першы) Рым, потым другі – Канстанцінопаль, а цяпер ёсць трэці і апошні Рым – Масква. Гэтую ідэю падхапілі прыдворныя пісьменнікі Васілія III і пачалі называць Маскву новым Канстанцінопалем або Царградам, а рускі народ – «новым Ізраілем», народам богаабраным, народам-правадыром для ўсіх праваслаўных. Апірышчам царскай улады сталі баяры і *княжаты* (нашчадкі былых удзельных князёў).

У XV ст. у Маскоўскай дзяржаве стварылася эліта пры ўладзе, на чале якой былі нашчадкі ўдзельных князёў, што ў свой час прызналі ўладу Масквы. На пачатку XVI ст. з'явіліся і дробныя землеўласнікі – памешчыкі, якія не мелі вотчын, як баяры, а карысталіся службовымі землямі і валодалі імі толькі часова, пакуль былі на дзяржаўнай службе. Найбольш памешчыкаў было на межах краіны. Імі кіравалі праз асаблівую дзяржаўную структуру, што была ў Маскве і мела назву «*Памесная ізба*». Іншая структура, якая мела дачыненне як да ўладальнікаў вотчын, так і да памесцяў, называлася *разрадам*.

Тым часам у краіне павялічваецца колькасць гарадскога насельніцтва. Акрамя купцоў і рамеснікаў з'яўляюцца *вайсковыя пасяленцы* (стральцы, пішчальнікі, гарматнікі), яны жылі каля ўмацаваных гарадоў у асобных паселішчах (слабодах) і мелі за вайсковую службу невялікія зямельныя надзелы.

Сяляне павінны былі працаваць на землеўласніка, араць ягоную зямлю і плаціць яму падаткі (аброк). Гэтых сялян разам з іх зямлёй запісвалі ў асобныя «пісцовыя» кнігі; яны не мелі права мяняць месца жыхарства. Але былі і іншыя сяляне, якіх памешчыкі самі запрашалі на працу ўзамен за арэнду зямлі. Такія сяляне мелі права ў так званы Юр'еў дзень (23 красавіка і 26 лістапада) пераходзіць ад аднаго гаспадара да другога.

***6.2. Іван IV***. Найстарэйшы сын Васілія III Іван (1530–1584) меў тры гады, калі памёр яго бацька, і краінай пачала кіраваць разам з баярамі яго маці – Алена Глінская. У гэты час ВКЛ вырашыла вярнуць землі, захопленыя раней Масковіяй, і аб'явіла ёй вайну. Вайна атрымала назву *Старадубскай* і доўжылася з 1534 да 1537 г.

Войскамі ВКЛ камандаваў гетман Юры Радзівіл з мянушкай Геркулес. Аднак Смаленск ды іншыя памежныя гарады Масковіі, акрамя Радагошча, улетку і ўвосень 1534 г. яго войска захапіць не здолела. Улетку наступнага года армія ВКЛ вызваліла Гомель, Почап і Радагошч, а пасля месячнай аблогі 29 жніўня 1535 г. узяла і Старадуб.

Але маскоўскія паслы падкупілі золатам кіраўніка Валахіі, і яго атрады напалі на Польшчу з поўдня. Тады войска ВКЛ вярнулася на радзіму, пакінуўшы сабе толькі Гомель. У 1537 г. быў падпісаны мір,



*Б. Чорыкаў.* Іван Жахлівы і Сільвестр

паводле якога Гомель вярнуўся ў склад ВКЛ, а замкі Себеж і Завалачча адышлі да Масквы.

У 1538 г. памерла Алена Глінская. Магчыма, яе атруцілі незадаволеныя баяры. Краінай пачалі кіраваць розныя баярскія групоўкі, якія не звярталі ніякай увагі на сваіх кіраўнікоў – Івана і яго малодшага брата Юрыя. Баяры часта іх крыўдзілі, часам нават здзекаваліся з хлопцаў. Таму Іван вырас вельмі жорсткім чалавекам і ўжо маючы 13 гадоў загадаў сваім слугам забіць князя Андрэя Шуйскага. Пры гэтым дзякуючы мітрапаліту Макарыю Іван атрымаў добрую адукацыю і ў сваім характары спалучыў адукаванасць з неверагоднай жорсткасцю да людзей і жывёл.

Ва ўзросце 16 гадоў Іван IV выказаў мітрапаліту і баярам жаданне ажаніцца і стаць царом. На пачатку 1547 г. ён узяў шлюб і здзейсніў абрад вянчання на царства, пасля чаго прысвоіў сабе тытул «гасудар, цар і вялікі князь». Але ўзнікла праблема з міжнародным прызнаннем новай пасады кіраўніка Масковіі. Першым гэта зрабіў у 1561 г. патрыярх Канстанцінопальскі, але кіраўнікі іншых краін яшчэ доўга не прызнавалі царскага тытула і называлі Івана IV толькі вялікім князем.

Пры маладым цару была створана *Выбраная рада*, у якую ўвайшлі прадстаўнікі баяраў і дваран. Найбольшы аўтарытэт мелі святар Сільвестр, згаданы мітрапаліт Макарый і дваранін Аляксей Адашаў. Пачаліся рэформы.

Пасля вянчання Івана IV на цара ў 1547 г. была прынята новая афіцыйная назва Маскоўскай дзяржавы – *Расійскае царства*. Быў зацверджаны новы збор законаў – царскі *Судзебнік*, які ў 1551 г. зацвердзіў *Стагаловы сабор*. Згодна з ім роля цэнтральных органаў улады ўзмацнілася за кошт абмежавання ўлады на месцах. Уводзіліся

суровыя пакаранні за несправядлівыя суды і хабарніцтва. Узнік саслоўна-прадстаўнічы орган – *Земскі сабор*, дзе былі дэлегаты ад царквы, баяраў, дваран і гараджан. Саборы вырашалі важныя дзяржаўныя пытанні. Была створана новая структура мясцовага кіравання – *прыказы*. Сярод іх вылучаўся кантрольны орган – *Чалабітны прыказ* на чале з Адашавым. Была ажыццёўлена цэнтралізацыя грашовай сістэмы. Рубель пачаў складацца з капеек. Капейкай называлася манета з выявай вершніка з дзідай (*кап'ём*).

Адбыліся змены ў жыцці царквы. Шмат якія з мясцовых святых зрабіліся агульнарасійскімі, царкоўныя абрады сталі аднолькавымі на тэрыторыі ўсёй краіны. Святарам было забаронена брудна лаяцца, піць моцныя напоі і біцца. Судзіць святароў маглі толькі епіскапы.

Адбыліся і вайсковыя рэформы. У 1550 г. цар стварыў пяхотны атрад – 3 тысячы выбарных стральцоў, якія жылі ў ваколіцах Масквы. Яны мелі дарагое адзенне і добрую зброю. У 1556 г. было прынята Улажэнне аб службе. Усе памешчыкі выступалі ў ваенны паход на конях, са сваёй зброяй і ўзброенымі слугамі. Колькасць паместнага войска складала ад 50 да 70 тыс. чалавек.

Іван IV упершыню пачаў выкарыстоўваць атрады *казакоў* – вольных людзей, якія пасяліліся на Доне і іншых рэках на мяжы Масковіі. У кастрычніку 1552 г. пасля штурму расійскія войскі захапілі Казань, а ў 1556 г. – Астрахань. У склад Маскоўскай дзяржавы былі ўключаны Чувашыя і Башкірыя. Уладу цара прызнала Нагайская Арда. Такім чынам, уся Волга трапіла ў склад Масковіі разам са славутым Волжскім гандлёвым шляхам, які вёў праз Каспійскае мора ў Персію і Турцыю.

З 1555 г. у дачыненні да заваяваных мусульман пачалі праводзіць гнуткую палітыку. Было забаронена іх гвалтам хрысціць і разбураць іх мячэці. Але тых, хто хрысціўся добраахвотна, адразу бралі на царскую службу. У Казані было заснавана архіепіскапства. Татарскія і нагайскія землеўласнікі пасля хросту атрымлівалі памесці з праваслаўнымі сялянамі. Аднак праваслаўныя дваране не мелі права валодаць мусульманскімі прыгоннымі сялянамі.

Захапіўшы Паволжа, Іван IV вырашыў выйсці на берагі Балтыйскага мора і ў 1558 г. пачаў *Лівонскую* (*Інфлянцкую*) *вайну*. Былі захоплены больш за 20 гарадоў, сярод іх – *Нарва* і *Юр'еў* (*Дэрпт*).



*Б. Чорыкаў.* Узяцце Нарвы Іванам Жахлівым

Царскія войскі, на чале якіх стаяў казанскі хан Шах-Алі, вызначаліся асаблівай жорсткасцю да цывільнага насельніцтва захопленых тэрыторый. Як сведчаць дакументы таго часу, акупанты не шкадавалі жанчын, дзяцей, а іх асаблівую нянавісць выклікалі габрэі, неправаслаўныя святары, манахі, якіх палілі жыўцом, садзілі на кол, рассякалі на кавалкі шаблямі…

Аднак супраць захопу Лівоніі, якая ўяўляла сабой канфедэрацыю пяці невялікіх дзяржаў, выступілі ВКЛ, Польшча, Швецыя і Данія. У 1559 г. у Лівонію прыйшлі дацкія войскі і занялі паўночную частку сучаснай Эстоніі. 31 жніўня 1559 г. у Вільні Лівонскі ордэн падпісаў дамову аб тым, што ён робіцца васалам ВКЛ. Войскі ВКЛ увайшлі ў Лівонію, і ўжо ў жніўні 1560 г. адбыліся іх першыя ўзброеныя сутыкненні з царскімі войскамі.

Улетку 1561 г. у склад Швецыі добраахвотна ўвайшоў горад *Рэвель* (цяпер Талін). 28 лістапада 1561 г. у Вільні падзялілі землі Лівонскага ордэна на два герцагствы – *Курляндскае* і *Земгальскае*; таксама было ўтворана *Задзвінскае княства*. Такім чынам, да канца 1561 г. Лівонію падзялілі паміж сабой Данія, Швецыя, ВКЛ і Маскоўская дзяржава.

У сакавіку 1562 г. пачалася вайна Масковіі з ВКЛ. У 1563 г. пасля штурму армія Івана IV захапіла Полацк. На загад цара ў горадзе пазабівалі ўсіх каталіцкіх святароў і манахаў, а габрэяў патапілі

ў Дзвіне. Большасць праваслаўных палачан павялі ў маскоўскі палон. Аднак неўзабаве войска гетмана Мікалая Радзівіла разбіла армію маскоўскага князя Пятра Шуйскага на рацэ *Уле*, і ў выніку цягам 1555–1556 гг. вялікіх сутычак не было, прытым Полацк часова застаўся пад уладай Івана IV.

У 1570 г. ВКЛ і Маскоўская дзяржава заключылі на тры гады замірэнне, якое доўжылася 6 гадоў. За гэты час Польшча і ВКЛ аб'ядналіся ў *Рэч Паспалітую*, і яе кіраўніком стаў кароль *Стэфан Баторый* ( 1576 г.). Тады ж вайна ўзнавілася, і напачатку маскоўскім войскам удалося захапіць значную частку былой Лівоніі. Аднак улетку 1579 г. Баторый пасля штурму вызваліў ад захопнікаў Полацк, а потым і ўсю Полаччыну. Улетку 1580 г. яго армія захапіла Вялікія Лукі, а ў 1581 г. аблажыла Пскоў. І хоць Пскоў узяць не ўдалося, у вёсцы *Ям-Заполле* 15 студзеня 1582 г. было падпісана замірэнне на 10 гадоў, паводле якога Іван IV адмовіўся ад Лівоніі на карысць Рэчы Паспалітай. Прайграў цар таксама вайну са Швецыяй, падпісаўшы з ёю дамову аб замірэнні ў 1583 г.

Пакуль ішла Лівонская вайна, Іван IV разгарнуў змаганне з уласнай элітай, баярамі і князямі. У 1560 г. памерла яго першая жонка і пакінула яму двух сыноў – Івана і Фёдара. Пасля жончынай смерці ў цара ўзнік вялікі канфлікт з баярамі, у тым ліку з чальцамі Выбранай Рады. Сільвестра выслалі ў Салавецкі манастыр, а Адашава – у Лівонію. У 1564 г. у ВКЛ уцёк князь Андрэй Курбскі: ён атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Крэўскае староства і пачаў публічна крытыкаваць палітыку ды паводзіны цара. Усё гэта ў сукупнасці прывяло да стварэння *апрычніны*. У 1565 г. цар падзяліў сваю дзяржаву на дзве часткі. Самыя лепшыя землі ён забраў сабе і назваў іх апрычнінай, а горшыя атрымалі назву «земшчына». У апрычніне існавала свая ўлада, нават прызначаны Іванам IV цар, Дума і прыказы. Іван IV стварыў сваё персанальнае войска апрычнікаў, якое рабавала і забівала жыхароў земшчыны, асабліва баяраў і дваран. Краіна знікала проста на вачах. Людзі ўцякалі куды маглі. У 1572 г. апрычніну адмянілі, але ўжо было позна, бо эканоміка краіны прыйшла ў заняпад. За маскоўскім царом пасля гэтага ў Еўропе трывала замацавалася мянушка Жахлівы.

У 1570 г. цар разам з апрычнікамі разрабаваў Вялікі Ноўгарад

і знішчыў там шмат ні ў чым не вінаватых людзей. Тое самае было і з горадам Цвер'ю. Паводле загаду цара у 1570 г. быў забіты мітрапаліт Філіп, які крытыкаваў бязбожныя паводзіны цара.

Працягвалася шматгадовая вайна з Крымскім ханствам. У 1571 г. крымскі хан здолеў дайсці да Масквы і спаліць маскоўскі пасад.

Пасля смерці ў 1569 г. другой жонкі – Марыі – Іван IV уступаў у незаконныя шлюбы са сваімі падданымі. Гісторыкі налічылі сем такіх жонак. Апошняя з іх, Марыя Нагая, нарадзіла цару ў 1582 г. сына Дзмітрыя.

У 1575 г. цар выдаў указ пра наданне тытула вялікага князя ўсяе Русі ўнуку кіраўніка Вялікай Арды Ахмат-хана Саін-Булату, які пасля хросту пачаў называцца Сімяонам Бекбулатавічам. Вядомы расійскі гісторык Сяргей Салаўёў пісаў, што Іван IV «пасадзіў на Маскве Сімяона Бекбулатавіча і царскім вянцом яго вянчаў, а сам назваўся Іванам Маскоўскім і жыў на Пятроўцы; увесь свой чын царскі аддаў Сімяону, а сам ездзіў проста, як баярын у аглоблях». Сімяон жыў у Маскве ў атачэнні пышнага двара, старшыняваў у думе земскіх баяраў, выдаваў ад свайго імя ўказы. Гэта доўжылася 11 месяцаў; потым Іван вярнуўся на трон, а Сімяон Бекбулатавіч атрымаў тытул вялікага князя Цвярскога.

У часы Івана IV Масковія наладзіла гандлёвыя сувязі з Англіяй. Англічане атрымалі права гандляваць з Маскоўскай дзяржавай без сплаты мыта. Дзеля гэтага ў 1584 г. на Белым моры быў заснаваны горад *Архангельск.* Пазней туды пачалі прыбываць таксама галандцы.

Да канца XVI ст. колькасць насельніцтва Масковіі дасягнула 10 млн чалавек, а тэрыторыя – 5,5 млн кв. км. З практычна монаэтнічнай краіны яна пачынала ператварацца ў поліэтнічную, хоць велікаросы і складалі тады большасць насельніцтва. У Масковіі жылі ўкраінцы, беларусы, татары, карэлы, саамы (лапары), вепсы (весь), ненцы (самаеды), комі (чудзь завалоцкая), удмурты (вацякі), марыйцы (чарамісы), чувашы, мардва, кумыкі, нагайцы, кабардзінцы і шэраг іншых народаў.

Цар Іван Жахлівы памёр у 1584 г., але незадоўга перад смерцю ён падчас спрэчкі забіў свайго старэйшага сына Івана. Наогул, шмат хто з гісторыкаў лічыць, што царыванне Івана IV завяршылася поўным крахам яго ўнутранай і знешняй палітыкі.

Царом стаў яго другі сын Фёдар – хворы і фізічна слабы чалавек. Яго жонка Ірына была сястрой Барыса Гадунова, будучага цара Масковіі. Пры Фёдару Гадуноў стаў фактычным кіраўніком дзяржавы.



*Б. Чорыкаў*. Смерць царэвіча Дзмітрыя. 1591 г.

Гадуноў спыніў крывавыя рэпрэсіі часоў Івана Жахлівага і прывёў да царкоўнай улады на пасаду мітрапаліта растоўскага епіскапа Іова. У 1589 г. у Масковіі было абвешчана патрыяршаства і была створана аўтакефальная руская праваслаўная царква. Вышэйзгаданы мітрапаліт Іоў стаў першым патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі. У цара Фёдара не засталося дзяцей, таму пасля яго смерці царом мог стаць яго малодшы брат, вышэйпамянёны царэвіч Дзмітрый, які разам з маці жыў у горадзе *Угліччы*. Аднак у 1591 г., калі яму было 7 гадоў, ён памёр пры не зусім высветленых абставінах ад «колатарэзанага ранення ў наваколлі шыі».

У выніку расследавання ягонай смерці Баярская дума пагадзілася з тым, што царэвіч пакалоў сабе нажом сам падчас прыпадку эпілепсіі. У 1598 г. цар Фёдар памёр. Яго жонка Ірына адмовілася стаць царыцай і сышла ў манастыр. Дынастыя Рурыкавічаў на гэтым спынілася. З дабраславення патрыярха Іова Земскі сабор выбраў царом Барыса Гадунова.

***6.3. Далучэнне Сібіры.*** На пачатку XVI ст. на велізарных абшарах сібірскага чарназем'я, лесастэпаў, тайгі, тундры жыло не больш за 200 тыс. чалавек. Некалькі дзясяткаў тысяч жылі ў раёнах Прыамур'я і Прымор'я.

У гаспадарцы паўночных сібірскіх народаў дамінавалі паляўніцтва і рыбалоўства. Сяляне жылі абшчынамі. *Мансі* (*вогулы*), *ханты*,

*кузнецкія татары* здабывалі жалеза. Ханты жылі паабапал ракі Обі, лясныя схілы Урала насялялі мансі. І тыя, і другія мелі свае княствы, якія не заўсёды жылі міжсобку мірна.

У паўночнай тундры жылі напалову качавыя ненцы, галоўным заняткам якіх была аленегадоўля. На ўсход ад Енісея знаходзіліся землі *эвенкаў* (*тунгусаў*), якія палявалі на футравую жывёлу. Збольшага выпасам скаціны займаліся жыхары верхняга цячэння Енісея – *хакасы*. У мясцінах паблізу Байкала і Ангары жылі *бураты*. Шмат у чым дзякуючы сваёй адметнай будысцкай рэлігіі яны мелі значныя здабыткі як у гаспадарчым, так і ў духоўным жыцці. Як на той час, высокім узроўнем развіцця гаспадаркі вызначаліся таксама *дауры* – карэнныя жыхары Прыамур'я.

*Якуты* насялялі вялікую тэрыторыю ў басейне рэк Лены, Алдана і Амгі. У іх значнае распаўсюджанне атрымала апрацоўка жалеза: кавальства лічылася амаль што сакральным заняткам. Займаліся яны таксама выпасам буйной жывёлы, паляваннем і рыбалоўствам. Фактычна ў іх існавала дзяржаўнае ўтварэнне на чале з родапачынальнікам-*таёнам*.

У працэсе распаду Залатой Арды ў XV ст. на тэрыторыі, якую засялялі збольшага цюркамоўныя народы, утварылася Сібірскае ханства, якое да сярэдзіны наступнага стагоддзя ўжо займала абшары лесастэпаў Сібіры ад басейна ракі Туры на захадзе да ракі Барабы на ўсходзе. Сістэма кіравання ў ханстве вельмі нагадвала тую, што была прынята ў Залатой Ардзе.

У сярэдзіне XVI ст. купцы і прамыслоўцы *Строганавы* атрымалі падтрымку Івана Жахлівага і вырашылі захапіць для яго Урал і Сібір. Яны сабралі і ўзброілі вялікі атрад казакоў на чале з атаманам Ермаком. У 1582 г. казакі разбілі войскі сібірскага хана Кучума і захапілі яго сталіцу Кашлык (Іскер). Аднак у змаганні з Кучумам Ярмак загінуў. Прытым маскоўская экспансія не спынялася: у 1586 г. каля былой сталіцы Сібірскага ханства Чымга-Туры была ўзведзеная крэпасць Цюмень, а ў наступным годзе ўзнік горад-крэпасць Табольск, які і стаў сапраўдным цэнтрам Маскоўскай дзяржавы ў Сібіры. У гэты рэгіён скіраваўся вялікі паток гандляроў і служылых людзей, следам за імі – казакі, пасадскія людзі, сяляне, якія ўцякалі ад прыгону.

***6.4. Культура Масковіі ў XVI ст.*** У XVI ст., а дакладней, з часу ўладарання вялікага князя Івана III, адбываюцца істотныя змены ў напрамку развіцця культуры і мастацтва на землях Маскоўскай дзяржавы, а таксама ў тых суседніх краінах, якія яна паступова сабе падпарадкоўвала. Калі перад тым існавала два вектары – пярэсты еўразійскі, са змешваннем хрысціянскай і мусульманскай падкладкі (у маладых дзяржаўных утварэннях Растова-Суздальскай зямлі), і праеўрапейскі (у дэмакратыях Ноўгарада і Пскова), то пасля татальнага знішчэння Масковіяй апошніх (Ноўгарад – 1478 г., Пскоў – 1510 г.) другі вектар анулюецца. Нават пры тым, што пэўныя традыцыі, найперш у дойлідстве (тыпалогія сабораў), Масковія пераймае ад культуры вечавых рэспублік.

Калі на мяжы XV–XVI стст. шэраг аўтарытэтных даследчыкаў яшчэ разважае пра культурныя з'явы ў Масковіі, часам ужываючы катэгорыі еўрапейскіх стыляў – готыка, рэнесанс, то пазней падобны інструментарый робіцца непрымальным. Прыгадаем, што ў збудаваным італьянцамі Маскоўскім крамлі назіраюцца элементы готыкі, ва ўзведзеных у тым жа крамлі, зноў-такі італьянцамі, саборах і Гранавітай палаце – праявы рэнесансу і элементы класічнай ордарнай сістэмы. Але пералічанае было вынікам мастацкага імпарту, які не быў засвоены арганічна, аднак перапрацаваны ў якасці дэкоруму.

Затое ў гэты час ужо добра відаць, як, падобна да рэлігійнага жыцця, дзе царква існуе ў відавочнай «сімфаніі» з уладай, мастацтва пачынае абслугоўваць палітычныя дзяржаўныя інтарэсы ды ідэалогію, якая ўсё больш і больш выяўляе свой імперскі характар.

Такім чынам, рэнесанс у Масковію так і не прыходзіць – у прыватнасці, калі гаворка ідзе пра структуру жанраў і відаў мастацтва. У мастацтве Масковіі – і гэта галоўнае – адсутнічае антрапацэнтрычны гуманістычны дух; гэта датычыць нават твораў для вышэйшых, адукаваных колаў грамадства. Іх было папросту замала: фактычна першым вялікім князем, які навучыўся чытаць, быў Іван IV Жахлівы.

Найбольш выразнае і ўражвальнае дасягненне эпохі ў дойлідстве – гэта будаўніцтва вялікіх крамлёў і манастырскіх пабудоў на межах. Гэтыя пабудовы мелі характар вайсковага абарончага тыпу (аб'ектаў падвойнага прызначэння) – своеасаблівых выспаў тэрытарыяль-

Астраханская крэпасць. *Здымак пачатку XX ст.*



най экспансіі дзяржавы. У развіцці будаўніцтва істотную дапамогу аказалі запрошаныя ў Маскву італьянцы, якія пазнаёмілі маскоўцаў з вырабам адпаведнай вялікай, а не плоскай, кшталту плінфы, абпаленай цэглы, і захопленыя ў палон у Казані будаўнікі-рамеснікі. Асабліва значнымі сталі новыя будынкі *Маскоўскага крамля*. У 1530-х гг. тэрыторыя, якая прымыкала да ранейшага крамля з усходу, была абнесеная цагляным мурам і атрымала назву Кітай-горада. Праз паўстагоддзя, паводле праекта дойліда Фёдара Каня, быў узведзены гэтак званы Белы горад (1585–1593) – трэцяя лінія крамлёўскіх муроў з 27 вежамі. Фёдар Конь пабудаваў таксама абарончыя муры ў часова заваяваным Масковіяй Смаленску (1596–1602) з рэкорднай працягласцю муроў (6,5 км).

Мураваныя вартавыя крэпасці былі пабудаваны таксама ў іншых гарадах (Ніжні Ноўгарад, Тула, Каломна, Угліч, Зарайск, Серпухаў, Мажайск, Вялікі Ноўгарад, Пскоў, Ізборск, Пячоры, Царовакакшайск, заваяваныя Маскоўскай дзяржавай Астрахань, Уфа, Казань, Царыцын) і нават на Салавецкіх астравах. Каланізацыйная пабудова крамля і белакаменнага *Дабравешчанскага сабора* ў заваяванай маскоўскім царом мусульманскай Казані, а таксама *Успенскага сабора ў Свіяжску* вялася пскоўскімі дойлідамі, сярод якіх найважнейшую ролю адыгралі Поснік (Якаўлеў) і Іван Шырай. Крэпасць у Астрахані ўзводзілі майстры Міхаіл Вельямінаў, Дзей Губасты ды іншыя.

Суровыя сваім абліччам і абарончыя, паводле другога прызначэння, манастырскія комплексы цягам XVI ст. узводзяцца ў Тройца-Сергіеве, Кірыла-Белазёрску і іншых месцах.

Узоры архітэктурных тыпаў у сакральным будаўніцтве ў асноўным пераймаюцца з папярэдняй практыкі ўладзіміра-суздальскай школы, часткова школ Ноўгарада і Пскова, з уласна маскоўскіх напрацовак – і ніколі з кіеўскай спадчыны. Насуперак пазнейшым спробам дэклараваць «пераемнасць» маскоўскага палітычнага, рэлігійнага і культурнага жыцця ад Кіеўскай Русі такой пераемнасці папраўдзе не існавала. Паказальным з'яўляецца назіранне амерыканскага даследчыка Эдварда Кінана: амаль ніводнай царквы ў гэты час у Масковіі не будуецца ў гонар папулярных у Кіеве святых. Нават у гонар святой Сафіі – хоць другую жонку Івана III, пляменніцу апошняга імператара Візантыі Канстанціна XI, якая шмат зрабіла дзеля стварэння новага архітэктурна-мастацкага вобразу сталіцы, звалі Сафіяй (Зояй). У «разрадных кнігах» часоў Івана III сярод трох тысяч імёнаў знаці амаль няма імёнаў кіеўскай традыцыі: ніводнага Ігара, Святаслава, Мсціслава, толькі тры Глебы і менш за 1 % Уладзіміраў. Часцей можна сустрэць татарскія і мусульманскія прозвішчы – Тэміраў ці Булгакаў. Сярод прадстаўнікоў кіраўнічай маскоўскай дынастыі 20 % звалі Іванамі, 10 % – Васіліямі.

Вызначым тры асаблівасці культавага дойлідства XVI стагоддзя. Традыцыйная плынь, прыгаданая вышэй, – адна- ці пяцікупальныя (крыжовакупальныя паводле архітэктурнай тэрміналогіі) храмы, з колькасцю апсід ад 1 да 5, часта, апрача мясцовых узораў, наследавалі Успенскаму сабору Арыстотэля Ф'яраванці, у якім лакальныя ўзоры былі ўдала абагульнены. Варта адзначыць таксама рашучую замену шаломападобных (візантыйскага тыпу) завяршэнняў падкупальных барабанаў на цыбулепадобныя. Ёсць меркаванні (Барыс Рыбакоў), што яны існавалі яшчэ ў XIII ст., але агульнапрызнана іх масавае выкарыстанне з часоў царавання Івана IV (1547–1584) і афармлення *храма Пакрова-на-Рове* (*Васілія Блажэннага*, 1555–1561 гг.; дойліды Барма і згаданы Поснік) у Маскве.

Перамены адбываліся ў выніку ўплыву мусульманскіх будаўнічых практык і моды, а таксама тэхналогіі драўляных храмаў. «Цыбуліна» першапачаткова мела, насуперак папулярнаму меркаванню пра яе сакральнасць («свечка» Богу), утылітарнае прызначэнне – не даваць збірацца снегу на даху. Другая асаблівасць – гэта выкарыстанне ордарнай сістэмы (аднак адпаведныя дэталі – пілястры, капітэлі,

Святая брама ў Кірылаве



© Мангту

калоны – звычайна выступалі не элементам канструкцыі, а дэкорам). Трэцяя – выпрацоўка тыпу пірамідальнага шатровага храму.

Да традыцыйных пабудоў першай паловы XVI ст. належалі *Траецкі сабор* у *Аляксандраве*, *Праабражэнскі сабор Хутынскага манастыра* ў Вялікім Ноўгарадзе. Ва Уладзіміры быў пабудаваны *Успенскі сабор Княгініна манастыра*, у Растове – *Успенскі сабор*, у Дзмітраве – *Успенскі сабор* з рэльефамі маскоўскіх майстроў (магчыма, праект таго ж Алевіза Фразіна) і *сабор Барыса і Глеба*, у Суздалі – *Пакроўскі сабор*, *Дабравешчанская царква*, *Рызапалажэнскі сабор*, у Кірылаве – цэрквы *Увядзення*, *Архангела Гаўрыіла*, у Яраслаўлі – нанова пабудаваны *Спаса-Праабражэнскі сабор* з пазнейшымі 63 фрэскамі, у Пераяслаўлі-Залескім – *Траецкі сабор* (дойлід *Рыгор Барысаў*, пазнейшыя роспісы Гурыя Нікіціна Кінешамцава), у Ферапонтаўскім манастыры на Барадаеўскім возеры – *Дабравешчанская царква* са звонам, у Пскове – *царква Міколы з Усохі*. У другой палове стагоддзя былі ўзведзеныя, сярод іншага, у Пскове – храм *Уваскрасення Хрыстовага са Стадзішча*, у Яраслаўлі – *Святая брама* (імаверны дойлід Іван Фразін), на Салаўках – *Праабражэнскі сабор*, у Сольвычагодску – *Дабравешчанскі сабор* з пазнейшымі роспісамі Фёдара Савіна і Сцяпана Арэф'ева, у Цвяры – *царква Белай Тройцы*, у Волагдзе – *Сафійскі сабор* са званіцай, у Разані – *Архангельскі сабор*, у Кірылаве – храмы *Іаана Лесвічніка* з разным іканастасам, *Праабражэння*, а таксама *Святая брама* з пазнейшымі фрэскамі.

Шатровыя храмы, як мы маглі заўважыць раней, сталі вынікам доўгай эвалюцыі пірамідальнай, выцягнутай увышкі канструкцыі, вынайдзенай (пазакамарнае пакрыццё вакол цэнтральнага барабана плюс яшчэ больш прыціснутыя да апошняга два ярусы паўкруглых, часцей з кілепадобным завяршэннем, какошнікаў) полацкім дойлідам Іаанам яшчэ ў сярэдзіне XII ст. Ад полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы прыём перайшоў у смаленскую школу дойлідства (XII–XIII стст.). У XV ст. можна бачыць працяг падобнай стылёвай лініі ў Масковіі (храмы Андронікавага манастыра ў Маскве). Але тое, што паўстала ў працы маскоўскіх дойлідаў у XVI ст., з'явілася рэвалюцыйным і шэдэўральным пераўтварэннем старой спадчыны. Мяркуецца, што рашучы крок да шатровасці навершаў быў зроблены таксама пад уплывам драўлянага дойлідства. Найбольш яскрава шатровы стыль увасобіўся ў будынках *царквы Узнясення ў Каломенскім*, *храме Васілія Блажэннага* ў Маскве, *саборы Багаяўленскага манастыра ў Кастраме*, *царкве Пятра Мітрапаліта* ў Пераяславе-Залескім, мурамскай *царкве Казьмы і Дзям'яна*, *царкве Георгія і Дзмітрыя з трапезнай у Серпухаве*, *царкве Праабражэння ў Востраве* пад Масквой (часы Івана IV). Трэба адзначыць, што супраць шатровага стылю ў сакральнай архітэктуры ў той час выступала кансерватыўнае праваслаўнае духавенства.


© Goodvint

Сабор Васілія Блажэннага ў Маскве (дойліды Барма і Поснік)

Знакаміты маскоўскі храм Васілія Блажэннага – гэта комплекс бясслупавых шатровых частак (цэнтральнай і васьмі прыдзелаў), звонку ўпрыгожаны шматквеццем дэкаратыўных элементаў (вынік пераробак XVII ст. у адпаведным гусце, спачатку манахромны з фасадаў). Вынайдзенае аб'ёмнае рашэнне падкрэслівае прысвячэнне частак-капліц асобным бітвам Казанскай кампаніі 1552 г. (пераможны дух якой храм увасабляе) і «паўночнарускім» святым. Мяркуецца, што

зліццё ў адзіны масіў цэнтральнай і бакавых частак сімвалізавала аб'яднанне земляў вакол Маскоўскага княства.

Непераўзыдзеным паводле лёгкасці і гарманічнасці формаў шэдэўрам шатровага стылю з'яўляецца 60-метровая ў вышыню *царква Узнясення ў Каломенскім* пад Масквой. Летапісец адзначае: «Бе же церковь та велми чюдна высотою и красотою и светлостию, такова не бывала прежде того в Руси». Пабудаваная ў гонар нараджэння Івана IV, царква ўзносіцца на беразе Масква-ракі і цудоўна аглядаецца з дыстанцыі. Ідэальнае спалучэнне з краявідам забяспечвае галерэя вакол усяго храма на першым ярусе. Гарманічным спалучэннем формаў у вертыкалі выглядае пераход ад галерэі да васьміграннага асноўнага аб'ёму і такога самага шатра (алтарныя апсіды адсутнічаюць). Рух наверх падкрэсліваюць пілястры з капітэлямі (заўважым: класічнай ордарнай формы); вышэй – кілепадобныя какошнікі і белакаменны дэкор шатра. У гэтым можна бачыць выразную тэндэнцыю: побытавая мода маскоўскай вярхушкі на пачатак XVI ст. (і раней) пад уплывам Залатой Арды набыла ўсходні, «ісламізаваны» характар. У гравюры з выявай прыёму пасла імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунда Герберштэйна вялікім князем Васіліем III (1517) з першага выдання «Запісак аб Масковіі» (1547, Вена) маскоўскі князь выступае ў чалме і пярэстым персідскім халаце. Падобнае захапленне ўсходняй узорыстасцю вызначае і стылістыку мастацтва Масковіі – ад мініяцюр да архітэктуры, і разуменне колеру ў выяўленчай і дэкаратыўнай творчасці. Ордарныя формы ў царкве ў Каломенскім – не вынік канструктыўнага рашэння, а вытанчаны спосаб упрыгожвання.

Звернем увагу на падобную з'яву ў стылістыцы збудаванай у сярэдзіне стагоддзя *царквы Іаана Прадцечы ў Дзякове* паблізу Каломенскага. Больш прыземісты і моцны ў насычаных формах, гэты храм уяўляе сабою спалучэнне пяцікупальнай традыцыйнай кампазіцыі з цэнтральным навамодным шатровым навершам. Элементы розных канцэптуальных падыходаў спалучаюцца тут, нібы ва ўзорыстай мазаіцы. Ад пскоўскага дойлідства паходзяць званіца, круглыя слупы падкупальнай прасторы, ад італьянскіх рэнесансавых перайманняў – машыкулі, круглыя вокны ў франтонах, прафіляваныя гзымсы. У цэлым, здавалася б, неспалучальны сімбіёз розных традыцый

спараджае непаўторнае і цэласнае рашэнне.

Кансерватыўныя погляды духавенства – найперш згаданых раней іасіфлян – істотна ўплывалі на захаванне больш традыцыйных канструктыўных рашэнняў у культавым дойлідстве. Пад моцным уздзеяннем ахоўніцкай ідэалогіі знаходзіўся і Іван IV. Менавіта ён замовіў будаўніцтва Сафійскага сабора ў Волагдзе на ўзор спрошчанага ва ўвасабленні маскоўскага Успенскага сабора Ф'яраванці. Такім чынам, традыцыйная плынь – крыху абноўленая і еўрапеізаваная праз ордарныя элементы ў пахавальні маскоўскіх князёў, Архангельскім саборы крамля тым самым італьянцам Алевізам Новым – праіснавала да канца XVI ст.


© Фота А. Грышына

Царква Іаана Прадцечы ў Дзякове

Здаецца відавочным, чаму ў структуры жанраў *жывапісу* Масковіі не ўзнікае, насуперак з'яўленню пэўных праяў рэнесансу ў архітэктуры (імпартаваных з Італіі), такога тыповага для адраджэння жанру, як *свецкі партрэт*. Пасля таго як у маскоўцаў выспела жаданне абвясціць сябе спадкаемцамі блізкай да пагібелі Візантыі (адсюль замена княскай тытулатуры царскай, пачынаючы з Івана IV у 1547 г.), імпартуецца і выпрацаваны ў Візантыі тэзіс пра сакральную функцыю свецкай улады. Адпаведным чынам, вялікі князь, мітрапаліты і набліжанае баярства ўвасабляюцца выключна ў сакральнай жывапіснай прасторы, у «горным свеце», але не ў зямным. Можна сустрэць аблічча князёў, умоўна-абагульненыя, на іконах, або ва ўвасабленні на *парсунах*, або рэпрэзентатыўных фрэскавых сюжэтах, але не ў рэалістычных, «прыземленых» партрэтных творах («Парсуна Івана IV», «Дабраслаўленае войска», «Мітрапаліт Аляксей у Жыціі» згаданага Дыянісія). Да змагання за «візантыйскую спадчыну» сакралізаванай улады дапасоўваецца выказванне манаха Філафея пра Маскву як «трэці Рым». Што праўда, ёсць абгрунтаванае



*Дыянісій*. Мітрапаліт Аляксій вылечвае царыцу Тайдулу. Кляймо абраза

меркаванне, што Філафей – як іасіфлянін і прыхільнік заможнага ўплывовага інстытуту царквы, ды яшчэ жыхар Пскова, – пісаў той тэкст з нагоды заваявання Масквой Пскова ў 1510 г. і меў на ўвазе параду не рабаваць царкву (як маскоўцы зрабілі перад тым у Ноўгарадзе ў 1481 г.), а пакінуць ёй яе багацці. Дапасаванне ж філафееўскага тэксту пад імперскую ідэю адбылося пазней.

Творчасць не раз намі згаданага Дыянісія (каля 1440 – каля 1502/1508), манументаліста і іканапісца, уяўляе сабою вяршыню рэлігійнага жывапісу разглядапага часу. Не такі экспрэсіўны, як яго папярэднік, прыхільнік манахромнасці Феафан Грэк, не такі засяроджана-стрыманы, як Андрэй Рублёў, ён пераўзыходзіць абодвух у сакавітасці жывой, падобнай да стылю італьянскага ранняга рэнесансу каларыстыцы, не саступаючы Рублёву ў музыкальнасці ліній. Можна было б бачыць у яго працах спантанныя праявы Адраджэння, калі б не прынцыповае захаванне ў іх сакральнай прасторы – насуперак рэалістычна адлюстраванай. Таму гістарычная сцэна аздараўлення жонкі хана Джанібека Тайдулы ў Ардзе мітрапалітам Аляксіем у 1357 г. на запрашэнне хана (кляймо абраза «Мітрапаліт Аляксій у Жыціі») глядзіцца як кананічнае выяўленне падзей святога падання (Жыція Аляксія).

Гістарычны жанр жывапісу не вылучаецца ў гэты час у Масковіі з агульнага абсягу рэлігійнага мастацтва. Постаці тут умоўныя, падзеямі кіруюць нябесныя сілы – так, як у тым самым абразе «Дабраслаўленае войска», прысвечаным казанскай вікторыі маскоўцаў.

Дыянісій праславіўся шэрагам выдатных ікон і роспісаў (прыкладам, Успенскага сабора ў Маскоўскім крамлі). Але галоўным шэдэўрам майстра варта прызнаць *роспісы і іканастас сабора Раства Багародзіцы Ферапонтава манастыра* (Валагодчына), выкананыя



*Дыянісій.*
Прашчур Авель.
Фрагмент
роспісу
Ферапонтавага
манастыра,
1502 г.

разам з сынамі Феадосіем і Уладзімірам. Роспіс быў зроблены ўсяго за некалькі тыдняў, з 6 жніўня па 8 верасня 1502 г. Цыкл, прысвечаны Багародзіцы, ілюструе яе жыццё ды прысвечаныя ёй песняспевы; ён насычаны святочным і радасным духам, адпаведным лейтматыву ўслаўлення Марыі. Фарбы, якія рабіліся на аснове мясцовых мінералаў, уражваюць жыццёвай матэрыяльнай насычанасцю: блакітныя, зялёныя, ружовыя, жоўтыя (фрэска «Акафіст Божай Маці»).

Кажучы пра жывапіснасць, адзначым у фрэсках Дыянісія ў Ферапонтаве наяўнасць архітэктурнага стафажу («Шлюб у Кане»), выяваў постацяў у шыкоўных гістарычных строях (цыкл «Усяленскіх сабораў» і інш.). Аднак пры наяўнасці протарэнесансавых элементаў Дыянісій ўсё ж заставаўся прыхільнікам традыцыйнай «ісціннай» царквы (як паслядоўнік Волацкага) і традыцыяналістам у станковым іканапісе. Асабліва гэта відавочна ў ягоных абразах «Адзігітрыя Смаленская» або «Сашэсце ў пекла».

Пры ўсёй сваёй вядомасці – замовы на роспісы ў Маскоўскім крамлі не выпадковыя: Дыянісій успрымаецца афіцыйнай царквой, пэўна, як залішне смелы наватар. Стагаловы (царкоўны і земскі) сабор у Маскве ў лютым – траўні 1551 г., выпрацоўваючы парады па развіцці рэлігійнага жывапісу, патрабуе трымацца нязменнай традыцыі, канону. Ікона мусіць адпавядаць яе сутнасці і, пажадана, імітаваць копіі найлепшых старажытных ікон грэцкіх майстроў, а не «ізмышленія» іканапісцаў.

Гэтае рашэнне мела вызначальны ўплыў на характар іканапісу Масковіі, абумовіўшы яго пераход да стылёвай кансервацыі і застою ў мастацкім сэнсе (не адмаўляючы прыдатнасць пазнейшых твораў як прылад культавага жыцця). Творчыя выняткі здараліся звычайна пад высокім патранатам – як у выпадку са Строганаўскай школай або школай царскай Збройнай палаты.

Пра рэлігійнае мастацтва XVI ст. кажуць, што яго галоўнымі рысамі былі выяўленне кансерватыўных тэндэнцый, страта былой гарманічнасці, ідэальнасці вобразаў, але пры тым і назапашванне некаторых якасцяў, за якімі была будучыня. Часам тут больш увагі аддаецца краявіду, гістарычным дэталям, алегарычнаму асуджэнню людскіх заганаў. Пры гэтым «гістарычнасць» часцей вядзе да абслугоўвання свецкай улады, праявы прыгаданай «сімфаніі» царквы і дзяржавы. У фрэскі Дабравешчанскага сабору ў Маскве сын Дыянісія Феадосій уводзіць выявы візантыйскіх імператараў і маскоўскіх князёў. Тое ж назіраецца ў пазнейшых, не захаваных роспісах Залатой палаты Крамлёўскага палаца. Іх сюжэты ўслаўлялі царскі дом і найперш самога Івана IV. Але ёсць і іншыя выпадкі. Ва Успенскім саборы Свіяжскага манастыра ў роспісы на месцы «Еўхарыстыі» можна назіраць «Вялікі выхад», адлюстраванне эпізода рэальнай царкоўнай службы – вядома ж, у прысутнасці важных асоб, Івана Жахлівага і настаяцеля манастыра.

Што да павучальных сюжэтаў, то сярод абразоў, заснаваных на літаратурнай канве прытчаў і жыцій святых, неабходна згадаць «З'яўленне Еўлогію».

Тым часам у Масковіі развіваліся і мясцовыя цэнтры іканапісу: найперш у Яраслаўлі, Ніжнім Ноўгарадзе, Кастраме. Больш простанароднай, казачнай, часам наіўнай вобразнасцю вызначаліся творы з паўночных рэгіёнаў: Архангельскага, Валагодскага, Аланецкага.

У развіцці *мініяцюры* (пры захаванні традыцый ілюмінавання рукапісаў ад папярэдняй эпохі) найбольшую цікавасць уяўляюць свецкія манускрыпты – такія, як створаная ў 1535 г. «Хрысціянская тапаграфія» Казьмы Індзікоплава. Кніга замяняла і каментарыі Святога Пісьма, і касмаграфію, і натуральную гісторыю, і гісторыю палітычную і культурную...

Але ў найбольшай ступені прагрэсу асветы ў Маскоўскай дзяржа-

ве паспрыяла кнігадрукаванне. Яно пачалося ў 1563 г. у Маскве: Аляксей Адашаў і Маруша Нядзьеў надрукавалі Евангелле. Прыкладна годам пазней выхадцы з Беларусі Іван Фёдараў (Федаровіч?) і Пётр Мсціславец у прысутнасці цара надрукавалі тамсама свой «Апостал». Акрамя Масквы друкарня была заснавана і ў Аляксандраўскай слабадзе.



*Б. Чорыкаў.* Царскія ігрышчы

У *фальклоры* побач з даўно вядомымі абрадавымі песнямі, былінамі далейшы росквіт зазнаваў жанр гістарычнай песні. Гэтыя песні былі прысвечаны заваяванню Казані, паходу Ермака ў Сібір, войнам на Захадзе або асобе таго ж цара Івана Жахлівага.

Своеасаблівы росквіт, найперш пры двары гэтага самага цара, перажыла творчасць скамарохаў – своеасаблівая версія распаўсюджанай на Захадзе *карнавальнай культуры*. Разам са скамарохамі Іван IV раз-пораз спяваў разгульныя песні або і ўдзельнічаў у маскарадных скоках («машкарах»).

Сярод літаратурных помнікаў XVI ст. вылучаецца дыдактычная аповесць-жыціе Ермалая Эразма «Аповесць пра Пятра і Фяўронню Мурамскіх», а таксама публіцыстыка Івана Перасветава, ліставанне цара Івана Жахлівага і князя Андрэя Курбскага, ананімныя «Гутарка Валаамскіх старцаў» і «Памфлет пра вялікага князя Маскоўскага». Па-ранейшаму стваραліся напалову летапісы, напалову гістарычныя аповесці (напрыклад, «Гісторыя пра Казанскае ханства»).

У гэты самы час у Маскоўскай дзяржаве пачалі з'яўляцца першыя *прыватныя школы*, у якіх вучылі грамаце і арыфметыцы. Пры манастырах засноўваліся новыя бібліятэкі.

# АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Аброк*** – штогадовы збор памешчыкамі грошай і прадуктаў з прыгонных сялян. У Маскоўскай дзяржаве і Расійскай імперыі існаваў да адмены прыгону.

***Акольнічыя*** – прыдворны чын і пасада ў Маскоўскай дзяржаве. Узначальвалі прыказы, выконвалі прыдворныя і вайсковыя абавязкі.

***Апрычніна*** – уведзены Іванам IV Жахлівым (Грозным) асаблівы парадак кіравання Маскоўскім царствам, які грунтаваўся на фізічным тэроры і знішчэнні людзей.

***Бліжняя дума, Выбраная рада*** – колы асоб, асабліва набліжаных да цара Івана IV, якія былі ў сярэдзіне XVI ст. неафіцыйным урадам Масковіі.

***Губныя ўстановы*** – органы мясцовага кіравання ў Маскоўскай дзяржаве, якія існавалі з 1530-х гг., займаліся напачатку вышукам і судом у крымінальных справах, а пазней таксама іншымі адміністрацыйнымі справамі. Ліквідаваныя на пачатку XVIII ст.

***«Дамастрой»*** – звод правілаў хатняга побыту жыцця ў Масковіі, складзены духоўнікам цара Івана IV манахам Сільвестрам.

***Дваранства*** – прывілеяванае, паноўнае саслоўе ў Маскоўскай дзяржаве і пазней у Расійскай імперыі, якое знаходзілася на царскай службе.

***Думныя дзьякі*** – чыноўнікі найніжэйшага рангу; складалі і правілі рашэнні Баярскай думы і царскія ўказы, займаліся справаводствам.

***Думныя дваране*** – трэці паводле значэння, пасля баяраў і акольнічых, ніжэйшы думны чын.

***«Запаведныя леты»*** – гады, у якія ў некаторых рэгіёнах Маскоўскай дзяржавы забараняўся пераход ад аднаго землеўласніка да іншага.

***Захрыбетнікі*** – залежныя ад землеўласнікаў людзі, якія не мелі сваёй гаспадаркі, жылі і працавалі ў дварах сялян або пасадскіх людзей.

***Земскія ізбы*** – выбарныя органы мясцовага самакіравання ў гарадах і валасцях, у пачатку XVIII ст. – толькі ў гарадах, дзе з 1721 г. былі заменены на магістраты і ратушы.

***Земскі сабор*** – найвышэйшая саслоўна-прадстаўнічая ўстанова Маскоўскай дзяржавы з 1549 па 1653 г., сход прадстаўнікоў усіх слаёў насельніцтва (акрамя прыгонных сялян), які склікаўся дзеля абмеркавання палітычных, адміністрацыйных і гаспадарчых пытанняў.

***Земшчына*** – тэрыторыя Масковіі, якая падчас апрычніны не была ўключана ў склад апрычных земляў і якой кіраваў Іван Жахлівы пры пэўным удзеле Баярскай думы і Земскіх сабораў.

***Машыкулі*** – тэрмін з архітэктуры; азначае навесныя адтуліны-байніцы, размешчаныя наверсе муроў або вежаў крэпасці.

***Надзел*** – участак зямлі, які ў Маскоўскай дзяржаве даваўся селяніну ўзамен за выкананне ім розных павіннасцяў.

***Падворны падатак*** – сістэма падаткаабкладання насельніцтва, пры якой урад вызначаў агульную суму падаткаў, а гарадскія і сельскія абшчыны размяркоўвалі яе па асобных дварах.

***Падымшчына*** – падатак у Маскоўскай дзяржаве на карысць мясцовай адміністрацыі, які ўстанаўліваўся з кожнага «дыму» – г. зн. з сялянскай гаспадаркі.

***Палацавыя сяляне*** – прыгонныя сяляне, якія належалі асабіста цару і членам царскай сям'і.

***«Палкі новага строю»*** – вайсковыя атрады, якія фарміраваліся ў асноўным з іншаземных наймітаў і казакоў на ўзор арганізацыі і навучання заходнееўрапейскіх армій.

***Парсуна*** – прымітыўны ранні партрэтны жанр, распаўсюджаны ў Маскоўскай дзяржаве; творы гэтага жанру знаходзіліся ў моцнай залежнасці ад тагачаснага маскоўскага іканапісу.

***Пасошнае*** – дзяржаўны пазямельны падатак «з сахі», ямскія, пяцінныя і іншыя зборы.

***Патрыярх*** – найвышэйшы тытул у маскоўскай праваслаўнай царкве (уведзены ў 1589 г.).

***Прыгоннае права*** – сукупнасць юрыдычных нормаў, паводле якіх сялянам забаранялася пакідаць свае зямельныя надзелы без дазволу землеўласніка. У Маскоўскай дзяржаве замацавалася з 1497 г.

***Прыказы*** – органы цэнтральнага кіравання ў Маскоўскай дзяржаве, якія займаліся галіновым кіраваннем гаспадаркай. Разбойны прыказ выконваў функцыі следства і вышуку. Манастырскі прыказ разбіраў судовыя справы духавенства, датычныя маёмасных адносінаў.

***Стафаж*** – тэрмін з архітэктуры; азначае выявы постацяў людзей, жывёл, паказаных на фоне пейзажу дзеля ажыўлення вобраза.

***Стральцы*** – у дапятроўскі час: выбарныя служылыя людзі, асабіста свабодныя, якія набіраліся з падатных саслоўяў і неслі вайсковую

службу. Былі ўзброены пальнай і халоднай зброяй. Жылі ў адмысловых слабодах, мелі сем'і, займаліся рамёствамі і гандлем. Падпарадкоўваліся Стралецкаму прыказу.

***Чарнасошныя сяляне*** (***«чорныя людзі»***) – цяглыя сяляне, якія ў адрозненне ад прыгонных сялян былі асабіста незалежнымі.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА


Зимин, А. А. Опричнина Ивана Грозного. Москва: Мысль, 1964. 535 с.

История внешней политики России. Конец XV–XVII в. Москва: Международн. отношения, 1999. С. 66–215.

История русского искусства: в 13 т. / под ред. И. Э. Грабаря, В. Н. Лазарева, В. С. Кеменова. Т. 3. Москва: Изд-во АН СССР, 1955. 745 с.

История СССР с древнейших времен до конца XVIII в. / под ред. Б. А. Рыбакова. Москва: Высшая школа, 1983. С. 194–195.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мінск: Беларусь, 2010. С. 138–142.

Россия в XVI веке. Воспоминания иностранцев / пер. с англ. и нем. Смоленск: Русич, 2003. 472 с.

Скрынников, Р. Г. Опричный террор. Ленинград: Изд-во ЛГУ, 1969. 344 с.

Скрынников, Р. Г. Иван Грозный и его время. Москва: Наука, 1983. 250 с.

Скрынников, Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». Москва: Мысль, 1985. 206 с.

Творогов, О. В. Литература Древней Руси. Москва: Просвещение, 1981. С. 94–105.

Тихомиров, М. Н. Россия в XVI столетии. Москва: Изд-во Академии наук, 1962. 589 с.

Шмидт, С. О. У истоков российского абсолютизма. Москва: Прогресс, 1996. 496 с.

Martin, J. Medieval Russia, 980–1584. 2nd ed. Cambridge University Press, 2012. P. 363–447.

Michalonis Litvani De moribus Tartarorum. Litvanorum et Moschorum. Fragmina X. Basileæ: apud Conradum Waldkirchum, MDC(L)XV. 64 p.

# 7. СМУТНЫ ЧАС У МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ. МАСКОЎСКАЕ ЦАРСТВА АД ПАЧАТКУ ЎЛАДАРАННЯ РАМАНАВЫХ І ДА КАНЦА XVII СТ.

***7.1. Смутны час***. Калі цар Фёдар Іванавіч памёр і спынілася дынастыя Рурыкавічаў, 21 лютага 1598 г. на трон узышоў Барыс Гадуноў. Чаканага баярамі фармальнага акта абмежавання ўлады новага гасудара не было. Маўклівую незадаволенасць гэтага саслоўя выклікаў з боку новага цара таемны нагляд за баярамі, у якім асноўнай прыладай былі халопы, якія даносілі на сваіх гаспадароў, а далей ужо ішлі катаванні. Агульная нетрываласць дзяржаўнага парадку не магла быць выпраўленая Гадуновым, нягледзячы на ўсю выяўленую ім энергію. Галодныя гады, якія пачаліся з 1601 г., узмацнілі агульную незадаволенасць царом. Змаганне за царскі пасад у вярхах баярства дапаўнялася хваляваннямі знізу, з'яўленнем новых і новых прэтэндэнтаў на царскі трон, што і паклала пачатак *Смутнаму часу*, які большасць сучасных гісторыкаў адлічвае прыкладна ад 1603 г. У сувязі з гэтым уладаранне Барыса Гадунова можна лічыць першым яго перыядам.

Неўзабаве па Масковіі папаўзлі чуткі пра цудоўнае выратаванне ў Углічы царэвіча Дзмітрыя, які лічыўся раней забітым, і пра яго знаходжанне ў Польшчы. Першыя звесткі пра ўратаванага царэвіча пачалі трапляць у сталіцу ў самым пачатку 1604 г. Ілжэдзмітрый I быў фактычна створаны маскоўскім баярствам з дапамогай палякаў. Яго самазванства не ўяўляла сабою таямніцы для баяраў, і Гадуноў тады наўпрост казаў, што гэта яны падставілі самазванца.

Барыс Гадуноў зрабіў першую да Пятра спробу ліквідаваць культурную адсталасць Масковіі ад краін Заходняй Еўропы. У краіну прыязджае значна больш, чым раней, замежных спецыялістаў –

вайскоўцаў і лекараў, разведчыкаў карысных выкапняў і майстроў. Барыса Гадунова нават абвінавачвалі (як сто гадоў пазней – Пятра I) у залішняй прыхільнасці да «немцаў» (так называлі ў Маскові і ўсіх заходнееўрапейцаў). Упершыню «для навукі розных моў і грамат» было адпраўлена ў Англію, Францыю, Германію некалькі маладых дваран. У Смутны час яны не наважыліся вярнуцца на радзіму: адзін з іх у Англіі перайшоў у англіканства, стаў святаром і нават багасловам.

Магчыма, калі б у распараджэнні Гадунова аказалася яшчэ некалькі спакойных гадоў, Маскоўская дзяржава больш мірна, чым пры Пятру, і на сто гадоў раней пайшла б па шляху мадэрнізацыі. Але тады паляпшэнне эканамічнага становішча толькі намячалася, а паколькі да выйсця з крызісу ішлі прыгонніцкім шляхам, то ў асяроддзі сялянства выспявала незадаволенасць. Магчыма, гэтая глухая незадаволенасць не перарасла б у выбух, калі б лета 1601 г. не было занадта дажджлівым. Да ўборкі ўраджаю ніяк не ўдавалася прыступіць. А пасля адразу, без перапынку, ударылі раннія маразы, і «поби мраз моцный всяку працу справ человечьих в палех». Наступны год быў зноў неўраджайны, акрамя таго, не хапала насення і якасць яго была нізкая. Тры гады ў краіне лютаваў страшэнны голад.

Зразумела, прычынай голаду была не адна непагода. Зруйнаваная цяжкімі падаткамі і ўзмоцненай эксплуатацыяй сялянская гаспадарка страціла ўстойлівасць, не мела ніякага запасу трываласці.

Але пры ўсім гэтым шмат у якіх баяраў, у клецях манастыроў ляжалі запасы збожжа. Паводле сведкаў тых падзей, іх тады хапіла б усяму насельніцтву краіны. Аднак памешчыкі і настаяцелі манастыроў хавалі запасы, бо спадзяваліся на далейшае падвышэнне цэн, якія, урэшце, і выраслі прыкладна ў сто разоў. Людзі былі вымушаны есці сена і траву, справа даходзіла нават да людаедства.

Цар Барыс Гадуноў спрабаваў змагацца з голадам: беднякам раздавалі грошы, арганізоўвалі для іх платныя будаўнічыя работы. Але атрыманыя грошы імгненна абясцэньваліся, бо хлеба на рынку ад гэтага не большала. Тады Барыс распарадзіўся раздаваць бясплатна збожжа з дзяржаўных сховішчаў. Ён спадзяваўся такім чынам даць добры прыклад землеўласнікам, але клеці баяраў, манастыроў і нават патрыярха заставаліся зачыненымі. Людзі, якія марылі пра вырата-

ванне, паміралі ў гарадах проста на вуліцах. Толькі ў Маскве было пахавана больш за 120 тыс. чалавек, і не ўсіх атрымлівалася пахаваць належным чынам. Сабакі жэрлі непахаваныя трупы. Пакуль сяляне ў гарадах паміралі ад голаду, іх палеткі заставаліся неапрацаванымі і незасеянымі.

Голад падарваў уладу Барыса Гадунова. Народныя хваляванні ахоплівалі ўсё большыя тэрыторыі, і цар імкліва страчваў свой аўтарытэт. Тыя магчымасці, якія адкрывала перад краінай кіраванне гэтага дзяржаўнага дзеяча, былі змарнаваныя. У такой сітуацыі перамога Ілжэдзмітрыя была фактычна забяспечаная.

Пра Ілжэдзмітрыя I і ў папулярнай расійскай літаратуры, і ў масавай свядомасці існуе шмат памылковых стэрэатыпаў. У ім бачаць звычайна «агента польскага караля і феадалаў», якія імкнуліся з яго дапамогай захапіць Масковію, іх марыянетку. Цалкам натуральна, што менавіта такую трактоўку асобы Ілжэдзмітрыя ўзмоцнена ўкараняў урад баярына Васілія Шуйскага (апошні заняў маскоўскі трон пасля звяржэння і забойства «імператара Дзмітрыя»). Але сёння можна больш аб'ектыўна паставіцца да дзейнасці маладога чалавека, які год прабыў на маскоўскім пасадзе і ў гонар свайго каранавання, паводле заходняга звычаю, загадаў выбіць залатую манету.

Мяркуючы з успамінаў сучаснікаў, Ілжэдзмітрый I (які падпісваў свае ўказы як Demetreus Imperator) быў разумны і кемлівы. Яго атачэнне дзівілася, як лёгка і хутка ён вырашаў заблытаныя пытанні. Выглядае на тое, што ён і сам верыў у сваё царскае паходжанне. Сучаснікі адзначаюць дзіўную смеласць, з якой малады цар парушаў той этыкет, што склаўся пры двары. Натоўпу ён таксама не баяўся: не раз у суправаджэнні аднаго-двух чалавек ездзіў вярхом на кані па маскоўскіх вуліцах. Народу Ілжэдзмітрый абяцаў кіраваць не суровасцю і пакараннямі, а шчодрасцю і міласэрнасцю і паспеў спадабацца масквіцянам. Ён дзейнічаў з тэмпераментам свайго нібыта-бацькі Івана Жахлівага, але без брутальнасці апошняга. Калі б ён ведаў, што ён не царскі сын, ён, напэўна, здолеў бы загадзя засвоіць этыкет маскоўскага двара, каб усе адразу маглі сказаць пра яго: так, гэта сапраўдны цар. Да таго ж цар Дзмітрый памілаваў самага небяспечнага сведку – згаданага раней князя Васілія Шуйскага. Абвінавачаны ў змове супраць цара, Васілій Шуйскі кіраваў у Угліча



*Б. Чорыкаў*. Demetreus Imperator (Ілжэдзімітрый I)

расследаваннем справы аб гібелі сапраўднага царэвіча і на свае вочы бачыў яго мёртвае цела. Прысудзіў Шуйскага да смерці сабор, памілаваў яго Ілжэдзмітрый.

Найважнейшымі супернікамі Гадунова на шляху да ўлады былі баяры Раманавы-Юр'евы. Найстарэйшы з іх – Мікіта Раманавіч, брат маці цара Фёдара царыцы Анастасіі – лічыўся хаўруснікам Гадунова. Але неўзабаве пасля ўступлення Барыса на пасад пяцёра братоў-Мікітавічаў былі арыштаваны паводле фальшывага абвінавачання ў спробе атруціць цара і высланыя разам са сваімі сваякамі. Самы старэйшы з братоў, паляўнічы і франт Фёдар Мікітавіч, быў пастрыжаны ў манахі пад імем Філарэта і адпраўлены на поўнач, у Антоніева-Сійскі манастыр. Яшчэ ў 1602 г. улюбёны слуга Філарэта паведамляў прыставу, што яго гаспадар з усім змірыўся і думае толькі пра выратаванне душы. Аднак улетку 1604 г. у Польшчы з'явіўся Ілжэдзмітрый, а ўжо ў лютым 1605 г. данясенні прystава пры «старцу Філарэце» рэзка мяняюцца. Перад намі ўжо не сціплы манах, а палітычны змагар. І сапраўды, неўзабаве Філарэт з высланага манаха ператварыўся ў мітрапаліта Растоўскага: у гэты сан яго ўзвялі на загад цара Дзмітрыя. Прычына палягала ў сувязях самазванца з раманаўскай сям'ёй.

Як толькі Ілжэдзмітрый з'явіўся ў Польшчы, урад Гадунова абвясціў, што ён – самазванец Юшка (а ў манастве Рыгор) Багданаў, сын Атрэп'ева, дыякан-расстрыга Чудавага манастыра. Магчыма, яно так і было: урад быў зацікаўлены ў тым, каб назваць сапраўднае імя самазванца. Атрэп'еў жа да пастрыжэння быў халопам Раманавых і пастрыгся ў манахі, мабыць, пасля іх высылкі. Знакаміты гісторык Смутнага часу Сяргей Платонаў пісаў: «Нельга лічыць, што самазванец быў Атрэп'евым, але нельга таксама сцвярджаць,

што Атрэп'еў ім не мог быць: праўда ад нас пакуль што схаваная». Іншыя даследчыкі паказваюць на істотныя разыходжанні Рыгора Атрэп'ева і Ілжэдзмітрыя І ва ўзросце, на засведчаную адначасовую прысутнасць абедзвюх гэтых асоб у розных месцах.

Так або іначай, менавіта Раманавы падрыхтавалі кандыдата на ролю самазванца. У кожным выпадку, само з'яўленне Ілжэдзмітрыя ніяк не звязана з іншаземнымі інтрыгамі. Яшчэ адзін вядомы расійскі гісторык, Васілій Ключэўскі, у XIX ст. пісаў: «Ілжэдзмітрый быў толькі выпечаны ў польскай печы, а заквашаны ён быў у Маскве».

Як сведчаць сучаснікі, Ілжэдзмітрый І быў разумны, і ініцыятыва яго авантуры ўзнікла зусім не ў Польшчы: наадварот, кароль Жыгімонт III Ваза доўга вагаўся, ці варта падтрымліваць гэтага прэтэндэнта на царскі трон. З аднаго боку, было прывабна мець на маскоўскім троне чалавека, які абавязаны каралю – пагатоў малады чалавек лёгка даваў самыя розныя абяцанні. Ілжэдзмітрый патаемна перайшоў у каталіцтва і паабяцаў Папе Рымскаму, што ўся Масковія возьме з яго прыклад. Каралю ён паабяцаў Смаленск і Чарнігава-Северскую зямлю, бацьку сваёй нявесты Марыны, сандамірскаму ваяводзе Юрыю Мнішку (больш правільна: Мнішаху) – Ноўгарад, Пскоў і ў дадатак мільён злотых. Але гісторыя цудоўнага выратавання царэвіча здавалася занадта неверагоднай. Сумневы ў каралеўскім паходжанні «маскоўскага князька» выказвалі амаль усе магнаты Рэчы Паспалітай, да якіх кароль звяртаўся па параду. Апроч таго, замірэнне з Масковіяй, заключанае у 1601 г. пры актыўным удзеле беларускага дзяржаўнага дзеяча, князя Льва Сапегі, тэрмінам на 20 гадоў на ўзаемавыгадных умовах уяўлялася яму больш надзейнай гарантыяй, чым нейкі хаўруснік Рэчы Паспалітай на маскоўскім троне. Жыгімонт III у той момант не мог пайсці на адкрыты ваенны канфлікт з Маскоўскай дзяржавай яшчэ і таму, што Рэч Паспалітая вяла цяжкае змаганне са Швецыяй за Прыбалтыку.

Менавіта таму кароль не наважыўся аказаць Ілжэдзмітрыю поўную і безумоўную падтрымку: ён толькі дазволіў сваім шляхцічам, калі тыя пажадаюць, уступаць у ягонае войска. Такіх набралася крыху больш за паўтары тысячы. Да іх далучыліся некалькі сотняў дваран-эмігрантаў ды яшчэ данскія і запарожскія казакі, якія бачылі ў паходзе Ілжэдзмітрыя добрую магчымасць разжыцца ваеннай зда-

бычай. Прэтэндэнт на трон меў, такім чынам, усяго толькі жменьку ваяроў – каля 4 тысяч. З імі ён і перайшоў цераз Дняпро.

Ілжэдзмітрыя ўжо чакалі, але чакалі каля Смаленска, бо адтуль адкрываўся больш просты і кароткі шлях на Маскву. Ён жа ўпадабаў шлях больш надзейны: цераз Дняпро ён перабраўся каля Чарнігава. Пасля гэтага войскам Ілжэдзмітрыя трэба было ісці праз Северскую зямлю, дзе было шмат незадаволеных сваім становішчам людзей: дробныя служылыя людзі, сяляне невялікіх маёнткаў, рэшткі разгромленых войскамі Гадунова казакоў, якія паднялі пад кіраўніцтвам атамана Хлапушы паўстанне; урэшце, мноства ўцекачоў – тых, хто сабраўся тут у галодныя гады. Менавіта гэтыя незадаволеныя масы, а не іншаземная дапамога, паспрыялі Ілжэдзмітрыю ў тым, каб дайсці да Масквы і ўзяць там уладу.

У Маскве Ілжэдзмітрый таксама не ператварыўся ў польскага стаўленіка. Ён не спяшаўся выконваць свае абяцанні. Праваслаўе заставалася дзяржаўнай рэлігіяй – больш за тое, цар так і не дазволіў будаваць у Масковіі рымакаталіцкія касцёлы. Ані Смаленск, ані Северскую зямлю каралю ён так і не аддаў, а толькі прапанаваў заплаціць за іх выкуп. Ілжэдзмітрый нават уступіў у канфлікт з Рэччу Паспалітай. Рэч у тым, што ў Варшаве не прызнавалі за маскоўскімі вяльможамі царскага тытула і называлі іх толькі вялікімі князямі, а Ілжэдзмітрый пачаў менавацць сябе нават цэсарам, г. зн. імператарам. Падчас урачыстай аўдыенцыі ён доўга адмаўляўся ўзяць з рук польскага амбасадара грамату, адрасаваную «вялікаму князю». У Рэчы Паспалітай былі відавочна незадаволеныя Ілжэдзмітрыем, які дазваляў сабе дзейнічаць нагэтулькі самастойна.

Трагедыя Ілжэдзмітрыя палягала, аднак, у тым, што ён быў авантурнікам паводле свайго характару. Тыя сродкі, якія ён рэальна меў у сваім распараджэнні, не былі ў сапраўднасці адэкватныя яго мэтам. Надзеі, якія ўскладалі на яго розныя сілы, супярэчылі адна адной. Мы ўжо бачылі, што ён не апраўдаў тых чаканняў, якія звязвалі з ім у Рэчы Паспалітай. Каб заручыцца падтрымкай дваранства, Ілжэдзмітрый шчодра раздаваў землі і грошы, якія ён пазычаў у манастыроў. Але і тое, і другое не магло адбывацца бясконца. Чуткі пра нібыта каталіцкую веру новага цара, якія распаўсюджваліся сярод святарства, а таксама царскія пазыкі трывожылі і выклікалі неза-

даволенасць. Сяляне спадзяваліся, што добры цар Дзмітрый адновіць права пераходу ў Юр'еў дзень, якое было адабранае ў іх Гадуновым. Але, не ўступіўшы ў канфлікт з дваранствам, Ілжэдзмітрый ніяк не мог гэтага зрабіць. Таму прыгоннае права было пацверджана: адно толькі сялянам, якія пайшлі ад сваіх гаспадароў у галодныя гады, быў дадзены дазвол заставацца на новых месцах. Гэтая мізэрная саступка не задаволіла сялян, але разам з тым выклікала незадаволенасць у часткі дваран. Калі падагульніць, то ніводзін сацыяльны слой унутры краіны, ніводная сіла па-за яе межамі не мелі сур'ёзных прычын падтрымліваць новага цара – менавіта таму ён так лёгка і быў зрынуты з пасаду.

Гэта адбылося ў надзвычай брутальнай форме. 17 траўня 1606 г. згаданы ўжо намі не раз Васілій Шуйскі, выкарыстоўваючы незадавальненне прысутнасцю ў горадзе вялікай колькасці іншаземцаў, падбухторыў жыхароў Масквы на бунт. Ваявода Пётр Басманаў загадзя папярэджваў цара Дзмітрыя пра магчымасць перавароту ў дзяржаве, але апошні яго не паслухаўся. Калі натоўп на чале з Васіліем Шуйскім уварваўся ў крамлёўскія палаты, Ілжэдзмітрый здолеў вылезці цераз акно на рыштаванні каля свайго палаца і паклікаць дадатковую ахову, але раптам сарваўся ўніз і трапіў у рукі бунтаўнікоў. Масквічы, якія яшчэ на пярэдадні захапляліся сваім гасударом, доўга здзекаваліся з яго, а потым забілі і выцягнулі яго цела на Красную плошчу. На твар яму надзелі маску блазна, у рот уставілі скамарохавую дудку, і цягам трох дзён цела было аддадзена на ганьбаванне натоўпу... Пазней труп быў спалены, попел зарадзілі ў гармату і выстралілі з яе ў заходнім накірунку.

На імправізаваным Земскім саборы (які склалі людзі, што ў той момант з розных прычын знаходзіліся ў Маскве) царом быў абраны князь Васілій Шуйскі. Па вялікім рахунку, у гісторыі ён выявіў сябе як ганебны інтрыган, заўсёды гатовы змяніць і нават падмацаваць хлусню прысягай на крыжы, – такі быў гэты чалавек, які ўступіў у 1606 г. на крамлёўскі трон. Але незалежна ад асабістых якасцяў Васілія Шуйскага яго ўладаранне таксама магло стаць пачаткам пазітыўных перамен у палітычным ладзе Маскоўскай дзяржавы. Гаворка ідзе пра абяцанні, якія ён вымушаны быў даць пры ўступленні на царскі трон.

Васілій Шуйскі ўпершыню ў гісторыі Масковіі прысягнуў падданым: даў «запіс», захаванне якога ён замацаваў цалаваннем крыжа. Само абмежаванне самадзяржаўя, хоць бы і на карысць баяраў, магло б мець пазітыўнае значэнне. Але ў «крыжацалавальным запісе» зусім не было рэальнага абмежавання ўлады цара. Так ці іначай, Васілій Шуйскі абяцаў не караць баяраў без адпаведнага суда. Такім чынам ствараліся заканадаўчыя гарантыі супраць пазасудовых пераследаў і пакаранняў смерцю часу апрычніны. Далей новы цар прысягаў не адбіраць маёмасці ў спадчыннікаў і сваякоў асуджаных, калі «яны ў той віне нявінныя»; такія самыя гарантыі даваліся купцам і ўсім «чорным людзям». У дадатак цар Васілій абавязваўся не слухаць ілжывых даносаў і вырашаць справы толькі пасля стараннага расследавання.

Што праўда, Шуйскі на практыцы рэдка лічыўся са сваім запісам: мяркуючы па ўсім, ён проста не ведаў, што такое святасць прысягі. Але ўжо само па сабе ўрачыстае абвяшчэнне цалкам новага прынцыпу ажыццяўлення ўлады не магло прайсці бясследна: нездарма асноўныя палажэнні «крыжацалавальнага запісу» пазней паўтараліся ў дзвюх дамовах, што былі заключаны маскоўскімі баярамі з Жыгімонтам III, аб пакліканні на маскоўскі пасад каралевіча Уладзіслава.

Да часу ўладарання Васіля Шуйскага адносіцца паўстанне пад кіраваннем Івана Балотнікава. Фактам з'яўляецца вялікая колькасць дваран у войску правадыра сялянскай вайны, якім звычайна называюць Балотнікава. Сёння цяжка зразумець яго сапраўдную праграму: да нас дайшоў толькі пераказ яе ў дакументах, што паходзілі з урадавага лагера. Выкладаючы заклікі паўстанцаў, патрыярх Гермаген пісаў, што яны «змушаюць баярскіх людзей пабіваць сваіх баяраў». Але ў сапраўднасці мы не знаходзім там закліку да змены існага ладу, а толькі намер вынішчыць цяперашніх баяраў і самім заняць іх месца. Наўрад ці выпадкова, што «ў зладзейскіх палках» казакам (так называліся ўсе ўдзельнікі паўстання) раздавалі маёнткі. Некаторыя памешчыкі-балотнікаўцы, дарэчы, працягвалі валодаць землямі і ў першай палове XVII ст.

Натуральна, што пад сцягамі Балотнікава і ў лагеры «тушынскага зладзея», які абвясціў сябе другім выратаваным цудам «царом Дзмітрыем», было нямала абяздоленых, якія не прымалі жорсткага

прыгонніцкага ладу і чый пратэст раз-пораз выліваўся ў не менш жорсткія, а нярэдка і разбойныя, формы. Нянавісць да прыгнятальнікаў была толькі адным са складнікаў шырокага руху ў пачатку XVII ст.

«Тушынскі злодзей» Ілжэдзмітрый II успадкаваў ад свайго прататыпа авантурніцтва, але не таленты; ён быў вартай жалю пародыяй на папярэдніка, у шэрагу выпадкаў сапраўды выглядаў цацкай у руках прадстаўнікоў караля Рэчы Паспалітай. Ён не ўвасабляў сабой, як той жа Балотнікаў, ніякай сур'ёзнай альтэрнатывы таму шляху развіцця, якім пайшла Маскоўская дзяржава.



*Б. Чорыкаў.* Абарона Смаленска ад войскаў Жыгімонта. 1610 г.

У лютым 1610 г., расчараваўшыся ў «тушынскім царку», група баяраў з яго лагера адправілася да Жыгімонта III, які на той момант трымаў у аблозе Смаленск, і запрасіла на трон каралевіча Уладзіслава.

На дапамогу абложанаму Смаленску пайшло вялікае маскоўскае войска на чале з братам цара князем Дзмітрыем Шуйскім. 24 чэрвеня (4 ліпеня) 1610 г. адбылася бітва каля сяла *Клушына* пад Гжацкам (цяпер горад Гагарын). У складзе войска кароннага польнага гетмана Рэчы Паспалітай Станіслава Жулкеўскага было 6325 чалавек конніцы, 200 – пяхоты, а да таго 4 невялікія гарматы. Войска складалася з польскіх і беларускіх коннікаў ды ўкраінскіх казакоў. У атрадах Дзмітрыя Шуйскага было 35 тыс. чалавек, сярод якіх 5 тысяч складалі найміты-шведы, французы і немцы. Але Шуйскі перад бітвай абяцанай сумы ім не заплаціў, бо разлічваў на тое, што ў бітве частка з іх загіне, а грошы ён забярэ сабе. Тады частка наймітаў наогул адмовілася змагацца.

Пяць гадзін доўжылася бітва невялікага войска Жулкеўскага з маскоўскім войскам, і першае ў выніку перамагло. Атрады Масквы



*Б. Чорыкаў*. Цар Васілій Шуйскі сыходзіць у манаства

пачалі ўцякаць, а потым паўцякалі ўсе, пакінуўшы адных наймітаў. Войска Дзмітрыя Шуйскага страціла забітымі і палоннымі 15 тыс. чалавек; астатнія разбегліся па сваіх дамах. Частка наймітаў перайшла на службу да караля Жыгімонта Вазы, частка была адпушчана па дамах. Пераможцы разрабавалі маскоўскі лагер і забралі ўсе боезапасы ды іншыя рэчы.

Паражэнне расійскага войска было настолькі ганебным, што ў Маскве адбыўся чарговы дзяржаўны пераварот. Цар Васілій Шуйскі быў скінуты з трона і пастрыжаны ў манахі (пазней вывезены ў Польшчу, дзе і памёр). Быў створаны баярскі ўрад («Сямібаяршчына») на чале з князем Фёдарам Мсціслаўскім (унукам апошняга мсціслаўскага ўдзельнага князя з роду Гедымінавічаў).

Скарыстаўшы паражэнне царскага войска ў бітве пад Клушынам, Ілжэдзмітрый II зноў падышоў да Масквы. З другога боку да Масквы набліжаўся Жулкеўскі, на бок якога пераходзілі царскія войскі і гарады. У самой глыбінцы Масковіі гарады прысягалі на вернасць Сямібаяршчыне. Частка баяраў і дваран ехала ў лагер пад Смаленск да караля Жыгімонта, каб служыць будучаму цару Уладзіславу. Такім чынам, у Маскоўскай дзяржаве на той момант мелася фактычна некалькі ўрадаў.

У выніку названых падзей у жніўні 1610 г. ужо самі маскоўскія баяры запрасілі на царства каралевіча Уладзіслава. Як «тушынцаў», так і расійскіх баяраў традыцыйна таўруюць як здраднікаў, гатовых «аддаць Расію замежнікам». Аднак уважлівае чытанне пагадненняў 1610 г. не дае сур'ёзных падстаў для такіх абвінавачванняў.

У сапраўднасці ў абодвух дакументах былі прадугледжаны разнастайныя гарантыі супраць паглынання Масковіі Рэччу Паспалі-

тай: і забарона прызначаць выхадцаў з Польшчы і Літвы на адміністрацыйныя пасады ў Маскоўскай дзяржаве, і адмова ў дазволе будаваць каталіцкія храмы, і захаванне ўсіх парадкаў, што існавалі ў дзяржаве. У прыватнасці, непарушным заставалася і прыгоннае права: «на Русі паміж сябе хрысціянам выхаду не быці», «людзям рускім паміж сябе выхаду не кажа кароль яго міласць дапушчаці». У заключанай «тушынцамі» ў лютым 1610 г. дамове можна заўважыць і водгук гадуноўскіх часоў: «А для науки вольно кождому з народу московского людем ездити в иншые господарства хрестиянские».

Зрэшты, у абодвух пагадненнях застаўся няўзгодненым адзін істотны пункт – аб веравызнанні будучага цара Уладзіслава. І «тушынцы», і маскоўскія баяры настойвалі на тым, каб ён перайшоў у праваслаўе. Ваяўнічы католік, які страціў праз сваю прыхільнасць да рымакаталіцкай веры шведскі трон, Жыгімонт III з гэтым не пагаджаўся. Прызнанне Уладзіслава царом да вырашэння гэтага пытання – цяжкая паводле наступстваў памылка маскоўскіх баяраў. Рэч тут не ў параўнальных вартасцях і недахопах абедзвюх канфесій, а ў элементарным палітычным разліку. Паводле законаў Рэчы Паспалітай кароль мусіў абавязкова быць католікам. Праваслаўны Уладзіслаў пазбаўляўся такім чынам правоў на польскі трон. Тым самым перспектывы спачатку асабістай, а потым і дзяржаўнай уніі Масковіі і Рэчы Паспалітай рэальна не існавала. Але прызнанне ўлады «цара і вялікага князя Уладзіслава Жыгімонтавіча ўсяе Русі» Баярскай думай адкрыла шлях у Маскву гарнізону войскаў Рэчы Паспалітай на чале з гетманам Жулкеўскім.

Можна меркаваць, што ўзыходжанне праваслаўнага Уладзіслава на маскоўскі трон прынесла б зусім някепскія вынікі. Гаворка не ідзе пра яго асабістыя якасці: стаўшы пасля каралём Рэчы Паспалітай, Уладзіслаў нічым асабліва выбітным сябе не праявіў. Істотна іншае: тыя элементы дамоўных адносінаў паміж манархам і краінай, якія былі намечаныя «крыжацалавальным запісам» Васілія Шуйскага, атрымлівалі сваё далейшае развіццё. Само ўзыходжанне Уладзіслава было абумоўлена шматлікімі артыкуламі пагаднення. Пры гэтым Уладзіслаў ператварыўся б у маскоўскага цара польскага паходжання, гэтаксама як яго бацька Жыгімонт Ваза быў польскім каралём шведскага паходжання.

Аднак і гэтая магчымасць была ўпушчаная. Пасля звяржэння Шуйскага і забойства ўласнымі прыхільнікамі Ілжэдзмітрыя II пачалася рэальная *інтэрвенцыя* супраць Маскоўскай дзяржавы. Швецыя, войскі якой былі запрошаныя Шуйскім дзеля дапамогі ў вайне супраць Рэчы Паспалітай, скарыстала зручны выпадак, каб захапіць Ноўгарад і значную частку Поўначы.

Пад Смаленскам, абложаным войскамі каралевіча Уладзіслава, маскоўскае пасольства на чале з мітрапалітам Філарэтам вяло перамовы аб умовах уступлення Уладзіслава на трон. Паколькі пытанне аб веры будучага цара вырашыць не атрымалася, перамовы праваліліся, а дэлегацыя Масковіі апынулася ў становішчы палонных.

Гарнізон Жулкеўскага тым часам размясціўся ў Маскве. Каралевічу было ўсяго 15 гадоў, і ягоны бацька, натуральна, не адпускаў яго аднаго ў далёкую і небяспечную Маскву, дзе зусім нядаўна адзін цар быў забіты, а другі скінуты з трона. Намеснік Уладзіслава вяліжскі староста Аляксандр Корвін-Гасеўскі самаўладна распараджаўся ў краіне, раздаваў землі прыхільнікам інтэрвентаў, канфіскуючы іх у тых, хто не прызнаваў чужаземнай улады. Што праўда, гэтыя раздачы збольшага існавалі толькі на паперы: экспедыцыйныя войскі каралевіча Уладзіслава ў Маскве праз нейкі час былі фактычна акружаныя спачатку першым (на чале з Пракопіем Ляпуновым,



*Б. Чорыкаў*. Начальнікі народнага апалчэння. 1612 г.

князем Дзмітрыем Трубяцкім і Іванам Заруцкім), а потым і другім (на чале з ніжагародскім купцом-разніком Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім) апалчэннямі. Цэнтральнай жа ўлады як бы і не існавала: розныя гарады самастойна вырашалі, каго ім прызнаваць за кіраўнікоў. Па краіне блукалі і рабілі аблогі гарадоў і манастыроў атрады польскіх і беларуска-літоўскіх шляхцічаў, якія займаліся не гэтулькі ваеннымі дзеяннямі, колькі простым рабункам. Ад іх не адставалі і свае ўласныя казакі. Такая сітуацыя не магла працягвацца занадта доўга: у краіне ўсё больш мацнела імкненне да парадку – хай сабе не да вельмі зручнага. У кожным разе, у тых падзеях прымалі ўдзел вялікія масы людзей.

Сілы парадку, што ўзніклі ў такіх абставінах, былі, як часта здараецца, даволі кансерватыўнымі. Такімі поглядамі вызначаліся і «ратавальнікі Расіі» Мінін ды Пажарскі.

У жніўні 1612 г. Аляксандру Корвін-Гасеўскаму са сваім атрадам удалося пакінуць Маскву. Частка гарнізона ў крамлі і Кітай-горадзе была заменена. Камандзірам гарнізона стаў палкоўнік Мікалай Струсь (шляхціч з Падоліі), ён жа і камандзір аднаго з палкоў. Двума другімі палкамі, пераважна з беларусаў, камандавалі беларускія шляхцічы Язэп (Юзаф) Будзіла, які меў ганаровы тытул харунжага Мазырскага, і Эразм Стравінскі (род паходзіў з Менскага і Мсціслаўскага ваяводстваў). Як пісаў беларускі гісторык, прафесар Анатоль Грыцкевіч, «такім чынам, польскі элемент у крамлёўскім гарнізоне быў значна меншы, чым беларускі. Большасць гарнізона складалі беларусы». На другім месцы паводле колькасці былі немцы, на трэцім – французы, на чацвёртым – палякі. Так што вызваленне крамля было не ад палякаў, а ад беларусаў і дапаможнага ім кантынгенту наймітаў з заходніх краін. Гарнізон у той час агулам налічваў 1,5 тыс. чалавек. Масква неўзабаве была занятая апалчэнцамі Пажарскага і Трубяцкога. У самым канцы кастрычніка крамлёўскі гарнізон капітуляваў на ганаровых умовах.

Падзеі Смутнага часу з сённяшняга гледзішча ацэньваць складана. З аднаго боку, яны прывялі да мацнейшага ўсведамлення элітай велікаросаў свайго дзяржаватворчага значэння. З іншага боку, перамога кансерватыўнага крыла гэтай эліты ў выніку прывяла яе значную частку да ўспрымання Захаду як заклятага ворага Масковіі.

***7.2. Пачатак дынастыі Раманавых. Цараванне Міхаіла Фёдаравіча.*** Выгнанне з Масквы інтэрвентаў дало магчымасць тамтэйшым баярам склікаць *Земскі сабор* дзеля абрання новага цара. Такім чынам, выбарнасць вярхоўнай улады магла атрымаць новы імпульс. Але гэта быў апошні выбарчы сабор: Міхаіл Раманаў, шаснаццацігадовы сын мітрапаліта Філарэта, станавіўся царом як «суродзіч» цара Фёдара Іванавіча і спадчыннік «ранейшых вялікіх высакародных і дабраверных і Богам Вянчаных Расійскіх Міласцяў цароў».

Пры выбарах (дакладней, у кулуарах сабора) усплывалі і іншаземныя кандыдатуры. Адмоўны досвед выбару цара з баяраў (Гадуноў і Шуйскі) ужо існаваў: аўтарытэт такога гаспадара не быў бы вялікі. Шмат хто з баяраў мог лічыць сябе нічым не горшым за ўладара. З гэтага гледзішча цар з замежнікаў, з прыраджэння вяльможа, нейтральны ў дачыненні да кланавых груповак, быў больш даспадобы. Патрабавалася толькі адна галоўная ўмова – праваслаўе. Менавіта таму была адпрэчаная кандыдатура шведскага прынца, якую прапаноўвалі некаторыя баяры.

У выніку ўсіх дэбатаў і інтрыг царом стаў вышэйпамянёны Міхаіл Фёдаравіч (Філарэтавіч) Раманаў. Недурны чалавек, з моцнай воляй, але без асаблівага бляску і таленту, ён стаў зручным амаль для ўсіх. У гэтым яму дапамагла, у прыватнасці, выкрутлівасць. Яго падтрымлівалі тыя, хто вылучыўся ў гады апрычніны: бо Раманавы – радня першай жонкі цара Івана; сярод іхніх сваякоў былі апрычнікі, а бацька Філарэта, Мікіта Раманавіч, пастаянна займаў высокае становішча пры двары даўнейшага цара-тырана. Але і пацярпелыя ад апрычніны маглі лічыць Філарэта сваім: сярод яго радні таксама былі пакараныя ў гады апрычных рэпрэсій, а ў Мікіты Раманавіча была ўстойлівая папулярнасць заступніка, які нібыта ўмеў прыцішыць гнеў цара.

Падтрымлівалі Філарэта і прыхільнікі Ілжэдзмітрыя: бо менавіта яго халопам быў Грышка Атрэп'еў, а ініцыятывай Ілжэдзмітрыя было вяртанне Філарэта з высылкі. Не маглі быць супраць і прыхільнікі Васілія Шуйскага: пры гэтым цару ў сё той жа мітрапаліт Філарэт Мікітавіч удзельнічаў ва ўрачыстай цырымоніі перанясення мошчаў нявінна забітага царэвіча Дзмітрыя, дзействе, якое мелася засведчыць, што забіты ў Маскве «цар Дзмітрый» – у сапраўднасці расстрыга, самазванец, які прыняў на сябе імя святога і дабравернага

царэвіча. Расійскі гісторык Сяргей Платонаў пісаў, што ў гэтым выпадку цар Васілій гуляўся са святыняй, а Філарэт добра дапамог яму ў гульні. Але і для галоўных праціўнікаў Шуйскага – тушынскіх казакоў – Філарэт быў сваім чалавекам. У 1608 г. войскі «тушынцаў» узялі Растоў, а там Філарэт якраз быў мітрапалітам. З тых часоў ён і апынуўся ў тушынскім лагеры – ці то як палонны, ці то як ганаровы госць. Філарэта ў Тушыне называлі нават патрыярхам. Нездарма голас, пададзены за Міхаіла Фёдаравіча казацкім атаманам, быў апошнім вырашальным голасам на карысць новага цара. Што праўда, згода самога юнага Міхаіла была атрыманая не адразу. Асабліва пярэчыла маці будучага цара – чарніца Марфа. Яе можна зразумець: не было ў тыя гады больш небяспечнага занятку, чым выкананне абавязкаў цара. Толькі калі будучаму цару і яго маці прыгразілі, што яны будуць вінаватыя ў «канчатковым спусташэнні» краіны, яны нарэшце пагадзіліся.



*Б. Чорыкаў.*
Цар Міхаіл Фёдаравіч Раманаў

11 ліпеня 1613 г. у Маскве Міхаіл Раманаў узяў шлюб і заснаваў новую царскую дынастыю. Асноўныя падзеі Смутнага часу на гэтым скончыліся, але цвёрды парадак у Маскові давялося ўсталёўваць яшчэ вельмі доўга.

Суседзі напачатку не прызналі новага ўладара і па-ранейшаму лічылі царом каралевіча Уладзіслава. Вайна з Рэччу Паспалітай працягвалася. У 1617–1618 гг. войска на чале з Уладзіславам пайшло на Маскву. Да яго далучыліся гетман ВКЛ Караль Хадкевіч і запарожскія казакі гетмана Пятра Сагайдачнага.

Армію Уладзіслава таксама падтрымалі данскія казакі і рэшткі сялянскіх атрадаў Івана Балотнікава. Маскоўскія ваяводы здалі тым, хто наступаў, Вязьму і Дарагабуж.

У кастрычніку 1618 г. атрады Уладзіслава з захаду, а ўкраінскія казакі з поўдня атачылі Маскву, але ўзяць яе не здолелі. Таксама аблогу вытрымалі Мажайск і Тройца-Сергіеў манастыр. У снежні 1618 г. у вёсцы *Дзявуліне* каля Тройца-Сергіева манастыра канцлер ВКЛ Леў Сапега падпісаў з Маскоўскай дзяржавай замірэнне на 14,5 года. ВКЛ вярнула сабе Смаленшчыну (акрамя Вязьмы), а Польшча забрала Чарнігаў і частку северскіх земляў. Землі вярталіся разам з сялянамі і мяшчанамі. Дваране, служылыя людзі, святары і купцы мелі права выехаць у Масковію.

Каралевіч Уладзіслаў захаваў тытул цара маскоўскага і ўсяе Русі, але на троне ў Маскве застаўся сядзець Міхаіл Раманаў. Пры гэтым апошні мусіў адмовіцца ад тытулаў князя Лівонскага, князя Смаленскага і князя Чарнігаўскага. Пытанне пра канчатковы мір было адкладзена.

У першыя гады царавання Міхаіла Раманава значную ролю адыгрываў Земскі сабор. Ён збіраў падаткі, кіраваў войскам і прыказамі. У 1619 г. з палону вярнуўся ў Маскву бацька цара, патрыярх Філарэт, які пачаў кіраваць Маскоўскай дзяржавай разам з сынам.

Сітуацыя ў краіне пасля Смутнага часу была вельмі цяжкою. Масковія страціла амаль трацілу насельніцтва. Баяры фактычна згубілі свой уплыў, і на першае месца выйшлі служылыя дваране.

Адбыўся ўздым нацыянальнай самасвядомасці, што было выкарыстана Раманавымі дзеля зацвярджэння самадзяржаўнай улады. Адсутнасць выхаду да Балтыйскага мора затармазіла развіццё эканомікі краіны.

Данскія казакі перасталі нападаць на Маскву і ўсталявалі з ёй добрыя стасункі. Яны стварылі на ніжнім Доне сваю дзяржаўную структуру, якую назвалі войскам, выбіралі сабе кіраўнікоў (атаманаў) і мелі свой орган самакіравання – *казацкі круг*. Яны збольшага займаліся паляваннем і рыбалоўствам, а таксама нападалі і рабавалі татарскія ды турэцкія тэрыторыі.

Адначасова з вайной супраць Рэчы Паспалітай ішла вайна Масковіі са Швецыяй. У 1615 г. войскі шведаў аблажылі Пскоў, але ўзяць горад не здолелі. Пачаліся мірныя перамовы. У 1617 г. у вёсцы Сталбавое (каля Ладагі) была падпісана *Сталбоўская мірная дамова*. Ноўгарад з іншымі гарадамі вярнуўся да Маскоўскай дзяржавы, але

ўзбярэжжа Фінскага заліва ад Нарвы да Карэлы засталіся ў шведаў.

Каб папоўніць дзяржаўны скарб, у Маскоўскай дзяржаве змянілі сістэму падаткаў. Кожны сялянскі двор мусіў плаціць канкрэтную суму грошай незалежна ад колькасці ворнай зямлі, якую ён апрацоўваў. Таксама пачаў развівацца замежны гандаль. У 1614 г. цар Міхаіл даў вялікія льготы англійскім ды галандскім купцам, і ў краіне з'явілася шмат еўрапейскіх срэбных манет (талераў). Разам з купцамі ў Масковію прыехалі замежныя вайскоўцы, рамеснікі, лекары і іншыя спецыялісты. Іншаземныя майстры мелі добрыя заробкі, таму заставаліся жыць і працаваць у гэтай краіне. У Маскве яны сяліліся ў Нямецкай слабадзе. Пры канцы каравання Міхаіла там ужо жыло каля тысячы пратэстанцкіх сем'яў іншаземцаў.

У 1632 г. памёр кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза. Маскоўскія ўлады скарысталіся адсутнасцю караля, вырашылі вярнуць Смаленск і ў верасні 1632 г. напалі на ВКЛ.

Пачалася чарговая вайна, якая атрымала назву Смаленскай. На Смаленск рушыла 32-тысячная армія, якой кіраваў князь (ваявода) Міхаіл Шэін, і пачалася аблога горада. Маскоўскія войскі захапілі шэраг памежных гарадоў, аблажылі Мсціслаў, Крычаў і Полацк. Аднак Смаленск мужна абараняўся, атрымаўшы дапамогу ад гетмана ВКЛ Крыштафа Радзівіла. Увесну 1633 г. на Маскоўскую дзяржаву зрабілі набег крымскія татары, і частка войскаў з захаду была перакінута на поўдзень.

У жніўні новы кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV з вялікім войскам на 25 тыс. чалавек падышоў да Смаленска і акружыў лагер ваяводы Міхаіла Шэіна. Шэін трапіў у двайную аблогу. Атрад караля захапіў горад Дарагабуж, дзе былі склады з правіянтам. Застаўшыся без ежы, у лютым 1634 г. Шэін падпісаў капітуляцыю. У палон трапілі 22 тыс. чалавек. Рэшткі маскоўскіх войскаў (8 тыс. чалавек) разам з Шэіным, пакінуўшы пераможцам 123 гарматы, ручную агнястрэльную зброю і 129 штандараў, мусілі вярнуцца ў Маскву. Там Шэіна назвалі здраднікам і забілі. У 1634 г. быў падпісаны *Паляноўскі мір*. Межы паміж дзяржавамі засталіся амаль без змен. Адбыўся абмен палоннымі. Кароль Уладзіслаў IV адмовіўся ад прэтэнзій на маскоўскі трон за 200 тыс. рублёў золатам. Міхаіл Раманаў нарэшце стаў адзіным паўнапраўным царом Маскоўскай дзяржавы.

У 1637 г. данскія казакі захапілі турэцкую крэпасць – горад Азоў і звярнуліся па дапамогу да маскоўскага цара. Але ён не захацеў сварыцца з моцнай Турцыяй і казакоў не падтрымаў.

У 1641 г. ужо вялікае турэцкае войска аблажыла Азоў, але казакі адбіліся і зноў паслалі дэлегацыю ў Маскву, каб тая забрала горад сабе, а казакам дала грошай і правіянту. Цар звярнуўся да Земскага сабору ў студзені 1642 г. Земскі сабор пагадзіўся забраць горад, але служылыя людзі выступілі супраць вайны, і цар загадаў казакам пакінуць горад. Яны разбурылі яго і сышлі, а горад зноў стаў турэцкім.

***7.3. Цар Аляксей Міхайлавіч.*** Улетку 1645 г. памерлі цар Міхаіл і яго жонка. Царом стаў іх адзіны сын Аляксей, якому было толькі 16 гадоў.

Першыя гады яго царавання дзяржавай кіраваў баярын Барыс Марозаў, які апіраўся на чыноўнікаў, што моцна прыгняталі маскоўцаў. Як толькі Аляксей у 1648 г. узяў шлюб з дачкой баярына Міласлаўскага, Марозаў адразу ажаніўся з сястрою царыцы і стаў сваяком цара, зрабіўшыся тым самым другім чалавекам у краіне.

Жыхары Масквы, абураныя паводзінамі Марозава і яго сяброў, улетку 1648 г. узнялі паўстанне, забілі і абрабавалі шмат службоўцаў



*Б. Чорыкаў.* Цар Аляксей Міхайлавіч

ды запатрабавалі ў цара пакараць Марозава смерцю. Тады цар схаваў Марозава ў манастыры, але адхіліў яго ад улады. На яго месца Аляксей прызначыў баярына, князя Адоеўскага.

Пасля маскоўскага бунту цар пайшоў на рэформы. У ліпені 1648 г. ён склікаў разам Баярскую думу і савет патрыярха, каб абмеркаваць будучыя змены ў дзяржаўным жыцці. Князю Адоеўскаму з чатырма памочнікамі даручылі сабраць усе старыя законы (Судзебнікі 1550 г.) і новыя ўказы, каб Земскім саборам прыняць на іх аснове новае заканадаўства краіны.

У верасні 1648 г. пачаў працаваць Земскі сабор, дзе сабраліся прадстаўнікі ад 130 гарадоў. Усе старыя і новыя законы абмяркоўваліся і потым іх зацвярджаў цар. Былі прыняты і новыя правілы грамадскага жыцця, а менавіта:

– царква не мела права набываць сабе новыя землі;

– баяры і духавенства не мелі права сяліць у слабодах каля гарадоў сваіх людзей;

– дваране мелі права бестэрмінова шукаць і вяртаць сваіх беглых сялян;

– замежныя купцы страцілі права гандляваць на тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы, акрамя Архангельска.

У 1649 г. быў прыняты і надрукаваны вялікім накладам (2000 асобнікаў) новы звод законаў – *Саборнае ўлажэнне*.

Маскоўскае кіраўніцтва пасля заканадаўчай рэформы ўзмацнілася і пачало марыць пра пашырэнне сваёй дзяржавы на захад. Яны хацелі зноў захапіць Смаленск, а пры нагодзе – і ўсю тэрыторыю ВКЛ. І такая нагода здарылася ў 1648 г., калі ў Рэчы Паспалітай пачалося казацкае паўстанне на чале з Багданам Хмяльніцкім.

***7.4. Гетманская Украіна***. Украінскае казацтва склалася на поўдні ВКЛ пры канцы XV ст. Спачатку гэта былі прафесійныя вайскоўцы з прыдняпроўскіх гарнізонаў Кіева, Канева і Чаркасаў (у Маскоўскай дзяржаве спачатку запарожцаў называлі чаркасамі).

Пазней да іх пачалі далучацца беглыя сяляне Прыдняпроўя з Беларусі і Украіны. Казакі пачалі займаць гэтак званае *Дзікае Поле*, тэрыторыю ў стэпах паміж ВКЛ і Крымскім ханствам. У першую чаргу гэта быў Вялікі Луг, плаўні ніжэй за дняпроўскія парогі. У вольны

ад службы час казакі займаліся рыбалоўствам і бортніцтвам, не цураліся і рабаўніцтва.

У 1489 г. казакі з Кіева і Чаркасаў упершыню напалі на турэцкі карабель у ніжняй частцы Дняпра. Камандавалі казакамі атаманы: спачатку гэта былі старасты. Дзмітро Вішнявецкі, з мянушкай Байда, пабудаваў крэпасць на востраве Малая Хорціца, першую казацкую Сеч, якую потым знішчаць туркі і татары. Але пазней Сеч зноў адновіцца і стане цэнтрам запарожскага казацтва. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. украінскія землі разам з Запарожжам увайшлі ў склад польскай Кароны. У 1572 г. кароль Рэчы Паспалітай фарміруе першы казацкі рэестр – спіс казакоў, узятых на дзяржаўную службу. Казакі былі падзелены на дзве групы: запарожскіх, якія жылі ў Сечы на самазабеспячэнні, і рэестравых, якія неслі службу ў вайсковых гарнізонах за грошы.

Пасля Брэсцкай уніі 1596 г. ва Украіне пачаўся і рэлігійны раскол. Частка ўкраінцаў, асабліва ў Галіччыне, далучылася да грэка-каталіцкага касцёла, а запарожцы засталіся праваслаўнымі. На рэлігійнай глебе пачынаюцца пры канцы XVI ст. першыя сялянска-казацкія паўстанні Крыштафа Касінскага (1591–1593) і Севярына Налівайкі (1594–1596). На пачатку XVII ст. гетманам запарожцаў стаў Пётр Сагайдачны. Ён лаяльна ставіўся да Варшавы, рабіў шматлікія марскія паходы па Чорным моры і ў 1616 г. захапіў горад Кафу (Феадосію), дзе прадавалі нявольнікаў-хрысціян. Яго войскі ўдзельнічалі ў паходзе на Маскву ў 1618 г., пасля чаго да Украіны вярнулася Чарнігаўшчына. Дзякуючы яму ў 1620 г.Украіна зноў атрымала свайго праваслаўнага мітрапаліта. У 1621 г. Сагайдачны дапамог палякам разбіць туркаў пад Хоцінам.

Аднак пасля задушэння дробных казацкіх паўстанняў у 1620–1630 гг. польскія ўлады забаранілі казакам самастойна выбіраць гетманаў і рабіць самім вайсковыя паходы. Новае вялікае паўстанне казакоў у 1648 г. і ўзначаліў Багдан Хмяльніцкі. Атрымаўшы перамогу над польскімі войскамі ў 1649 г., ён узяў пад сваю ўладу тры ваяводствы (Брацлаўскае, Кіеўскае і Чарнігаўскае). Але вайна з Польшчай прадоўжылася. У 1651 г. казакі прайгралі *бітву пад Берастэчкам*, але атрымалі перамогу *пад Батогам* (1652). Каб выйграць вайну канчаткова, патрэбны былі хаўруснікі. Пасля здрады ў 1651 г. крымскага хана казакі вырашылі зрабіць стаўку на Маскву і адправілі туды сваіх паслоў.

*Б. Чорыкаў.*
Багдан Хмяльніцкі
(на Пераяслаўскай радзе)



Цар вырашыў параіцца з Земскім саборам. Пасля доўгіх спрэчак (1651–1653) вырашылі прыняць запарожцаў пад царскую руку. Гэтую навіну прывёз Хмяльніцкаму царскі пасол, баярын Бутурлін. У студзені 1654 г. у горадзе *Пераяславе* Хмяльніцкі склікаў агульную раду, якая прагаласавала за далучэнне да Маскоўскай дзяржавы на правах аўтаноміі. Лік рэестравых казакоў на той момант склаў 60 тыс., гетман нават меў права знешніх зносінаў, акрамя стасункаў з польскім каралём і турэцкім султанам. Масковія пачала рыхтавацца да вайны з Рэччу Паспалітай.

***7.5. Першы этап вайны (1654–1655).*** 23 кастрычніка 1653 г. Аляксей Міхайлавіч ва Успенскім саборы ў Крамлі абвясціў пра будучую вайну. Пачатак вайны прызначылі на 20 траўня 1654 г. Увосень 1653 г. былі створаны тры групы войска. Першая група збіралася ў Пскове і Ноўгарадзе, мела 16 тыс. салдат і павінна была захапіць Невель, Віцебск, Полацк. Камандзірамі былі прызначаны ваяводы Васілій Шарамецеў і Афанасій Ардын-Нашчокін.

Галоўнае войска на чале з царом канцэнтравалася ў Маскве. Яно мела 40 тыс. салдат і рушыла на Смаленск. Трэцяя група, колькасцю 18 тыс. салдат, фарміравалася ў Бранску, кіраўнік – ваявода князь Аляксей Трубяцкой. Ён павінен быў захапіць Рослаўль, Мсціслаў, Барысаў. Атрады Хмяльніцкага (15 тыс. чалавек) ішлі на Гомель, Стары Быхаў і Магілёў.

У Рэчы Паспалітай ведалі пра будучую вайну, але кепска да яе падрыхтаваліся. Войскі ВКЛ былі невялікія, а польскія знаходзіліся толькі ў Заходняй Украіне. Моцна дзейнічала маскоўская прапа-

ганда, якая здолела на пачатку вайныператварыць значную частку праваслаўнага насельніцтва ў сваю «пятую калону».

Як і было запланавана, Маскоўская дзяржава пачала вайну менавіта 20 траўня 1654 г. Заняўшы без бою некалькі невялікіх гарадоў, цэнтральная армія 2 ліпеня ўзяла ў аблогу Смаленскі крэмль, які не быў належным чынам падрыхтаваны да абароны: у ім знаходзілася толькі блізу 3 тыс. абаронцаў ды крыху больш за 6 тыс. цывільных жыхароў горада. Тым не менш горад абараняўся доўга. Галоўны штурм пачаўся ноччу 26 жніўня, аднак на гарадскія муры выйшлі не толькі салдаты, але і мірныя жыхары, у тым ліку і жанчыны. На ворага скідалі камяні і цэглу, нават вуллі з пчоламі. Штурм доўжыўся сем гадзін, але поспеху не дасягнуў.

Гетман войска ВКЛ Януш Радзівіл меў толькі 11 тыс. коннікаў, але біўся мужна і нават выйграў некалькі невялікіх бітваў. Аднак каля вёскі Шапялевічы ён быў разбіты і мусіў адступіць да Смалявічаў ды Ігумена. Смаленск ва ўмовах голаду мусіў 23 верасня на ганаровых умовах капітуляваць. Смаленскі гарнізон і шляхта склалі свае штандары і пайшлі ў бок Оршы. Мяшчане засталіся ў горадзе.

Паўночная групоўка маскоўцаў захапіла без бою Невель і 17 чэрвеня аблажыла Полацк, які здаўся 10 ліпеня. Большую частку палачан узялі ў палон і вывезлі ў глыб Маскоўскай дзяржавы. Потым пераможцы пайшлі на Віцебск, пры гэтым іх войскі мелі да 20 тыс. салдат і казакоў. Абаронцаў горада было каля 10 тыс., у тым ліку 1000 ваяроў з ліку коннай шляхты. Віцебск доўга абараняўся, бо меў тры замкі, і быў захоплены толькі ў сярэдзіне лістапада.

З 3 па 22 ліпеня войска Трубяцкога штурмавала Мсціслаў. Калі нападнікі захапілі Мсціслаўскі замак, то пазабівалі ўсіх яго абаронцаў. Агулам загінула ад 6 да 10 тыс. чалавек. Гэтая падзея атрымала назву «Трубяцкая разня».

Вялікі горад Магілёў здаўся амаль без бою 28 жніўня. Гарадскі магістрат прысягнуў на вернасць маскоўскаму цару. Да 12 кастрычніка змагаўся гарнізон горада Дуброўны. 17 кастрычніка горад спалілі, а жыхароў пагналі ў маскоўскі палон. Украінскія казакі на чале з атаманам Іванам Залатарэнкам на пачатку чэрвеня ўзялі ў аблогу Гомель, але захапілі яго толькі 13 жніўня. Частка абаронцаў здолела вырвацца з аблогі і дайсці да Старога Быхава, які казакі

ўзяць не здолелі. Але яны без бою авалодалі Рэчыцай, Чачэрскам і Прапойскам.

За 7 месяцаў вайны царскія войскі захапілі 33 гарады ды мястэчкі Беларусі на ўсход ад Дзвіны і Дняпра. Акупанты грамілі ўніяцкія і каталіцкія цэрквы, касцёлы і манастыры. Не давяралі яны і мясцовай праваслаўнай царкве, асабліва святарам. Вялікарасійскія баяры і дваране хапалі беларускіх сялян як рабоў і адпраўлялі ў свае памесці. Таксама масава бралі ў палон мяшчан і прадавалі іх у рабства па кошце ад 3 да 6 рублёў за «галаву». У Маскве ўзнік асобны квартал, дзе пасялілі палонных беларусаў, які атрымаў назву «Мяшчанская слабада».

Сяляне і шляхта пачалі ствараць партызанскія атрады: яны мелі ад некалькі соцень да 3 тыс. чалавек, якія не давалі спакою ворагам і мясцовай шляхце, што прысягнула цару. Увосень і ўзімку 1654 г. частка войскаў вярнулася ў Масковію, дзе пачалася эпідэмія чумы. Войскі ВКЛ пачалі контрнаступ і ўзялі ў аблогу Магілёў, але захапіць яго не здолелі.

Пры гэтым Януш Радзівіл здолеў вызваліць Дуброўну і Оршу. У лютым войскі ВКЛ штурмавалі Віцебск, але безвынікова. У траўні 1655 г. Масква пачала новы наступ.

У чэрвені-ліпені маскоўскія войскі захапілі Лукомль, Смілавічы, Свіслач, Барысаў і Менск. Асноўныя сілы на чале з царом пайшлі на Вільню. 8 жніўня салдаты цара і казакі захапілі горад ды віленскія замкі. Яны забілі больш за 10 тыс. чалавек, іншых забралі ў палон і падпалілі горад, які гарэў тыдзень. 14 жніўня цар прыехаў у Вільню і абвясціў сябе вялікім князем Літвы, Валыні і Падоліі.

У гэты час у паўночныя раёны ВКЛ увайшла шведская армія, якая ўжо захапіла Польшчу. Царскія войскі ўзялі Гродна, Коўна і Кейданы. Казакі Івана Залатарэнкі акупавалі Ліду, Іўе, Любчу, Мір, Карэлічы і Стоўбцы. Толькі Слуцк здолеў адбіць націск ворага. Былі захоплены Наваградак, Клецк, Слонім ды іншыя гарады і мястэчкі Панямоння. Пры гэтым здолелі адбіць ворага гарнізоны Нясвіжа, Ляхавічаў, Старога Быхава і Берасця.

Аднак у вайну з Масковіяй уступіла Швецыя, і ўвосень 1655 г. ВКЛ і Маскоўская дзяржава пайшлі на замірэнне тэрмінам на два гады, якое ў рэальнасці праіснавала на год даўжэй. За Масквой засталіся ўсе акупаваныя землі, але вайна часова спынілася.

17 траўня 1656 г. Маскоўская дзяржава пачала вайну са Швецыяй, і значная частка войскаў з тэрыторыі ВКЛ выправілася на новую вайну. У 1657 г. памёр Багдан Хмяльніцкі, казакі выбралі новага гетмана, Івана Выгоўскага, які выступіў супраць Масковіі і ў 1659 г. разбіў пад Канатопам маскоўскія войскі. Аднак неўзабаве ўладу ва Украіне захапіў сын Хмяльніцкага Юрый, які зноў перайшоў на бок Масквы. Потым Украіна паступова падзялілася на дзве часткі.

У 1663 г. казацкая дзяржава канчаткова раскалолася на два гетманствы. Гетманства на правым беразе Дняпра спачатку арыентавалася на Польшчу, а потым на Турцыю; гетманы на левым беразе Дняпра прызнавалі ўладу Масквы. Гетман Іван Брухавецкі (1663–1668) атрымаў ад цара вялікія падарункі і баярскі тытул. За гэта маскоўскія ваяводы пачалі збіраць ва Украіне падаткі, а ў гарадах з'явіліся маскоўскія гарнізоны. На правым беразе кіраваў гетман Пётр Дарашэнка (1665–1676). Ён заключыў дамову супраць Польшчы з Турцыяй, і некалькі гадоў на Заходняй Украіне ішла вайна, у выніку якой туркі ў 1677–1678 гг. знішчылі сталіцу Украіны часоў Хмяльніцкага – Чыгірын, які абаранялі войскі Масквы і прамаскоўскага гетмана Івана Самайловіча.

У 1658 г. у Варшаве сейм адмовіў Аляксею Міхайлавічу ў польскай кароне, выбраў новага караля і запатрабаваў ад цара вярнуць усе захопленыя землі. Вайна зноў пачалася і доўжылася некалькі гадоў. Стан маскоўскіх войскаў увосень і ўзімку 1658–1659 гг. значна пагоршыўся. На акупаванай тэрыторыі актыўна дзейнічалі беларускія партызаны. Жыхары Старога Быхава, Мсціслава, Крычава, Чавусаў і Рослаўля перайшлі на бок Рэчы Паспалітай. Супраць Масквы выступіў чавускі казацкі палкоўнік Іван Нячай. Аднак у 1659 г. з Масквы прыйшло карнае войска і зноў захапіла Мсціслаў, Крычаў і Рослаўль.

Паўгода, з траўня па снежань, мужна абараняўся гарнізон Старога Быхава; толькі дзякуючы здраднікам, якія адчынілі браму замка, карнікі ўварваліся туды і выразалі «ў пень» усіх абаронцаў. Гродна некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі і было цалкам разбуранае.

У студзені 1660 г. маскоўскае войска ваяводы беларускага паходжання Івана Хаванскага захапіла Берасце і ў сакавіку ўзяло ў аблогу замак у Ляхавічах, але захапіць яго не здолела. У гэты час Аляксей

Міхайлавіч замірыўся са Швецыяй і вырашыў перакінуць на Беларусь армію з Украіны. Але запарожцы пад Канатопам 29 чэрвеня 1659 г. разам з крымскімі татарамі забілі 12 тыс. маскоўскіх ваяроў, узялі ў палон, а потым забілі яшчэ каля 5 тыс. палонных. Найлепшая частка маскоўскай кавалерыі была знішчана за адзін дзень.

Польшча выгнала шведаў са сваёй тэрыторыі і 3 траўня 1660 г. заключыла мірную дамову са Швецыяй. Мяжа паміж ВКЛ і Швецыяй прайшла па Заходняй Дзвіне. Аб'яднанае войска ВКЛ і Польшчы пад камандай гетманаў Стэфана Чарнецкага і Паўла Сапегі ў чэрвені 1660 г. разбіла маскоўскую армію князя Хаванскага на *рацэ Палонцы* пад Ляхавічамі. Хаванскі страціў больш за 4 тыс. салдат і вялікі абоз.

11 ліпеня саюзныя войскі вызвалілі сталіцу ВКЛ Вільню, але маскоўскі гарнізон у Верхнім замку здаўся толькі 3 снежня. 22 жніўня быў вызвалены Мсціслаў, а неўзабаве – таксама Крычаў і Шклоў.

Новае паражэнне маскоўская армія пацярпела ў кастрычніку 1661 г. ад войскаў ВКЛ пад *Кушлікамі* (Полаччына). З 12 тысяч у Полацк уцяклі з поля бітвы толькі каля 3 тыс. ваяроў Маскоўскай дзяржавы.

Пасля атрыманых паражэнняў акупанты пачалі масава рабаваць і вывозіць у Масковію ўсё, што толькі можна было вывезці, у тым ліку абразы, кнігі, зброю, грошы і хлебныя прыпасы. Гэта выклікала вялікі голад і эпідэмію чумы, пра што паведамлялі цару яго чыноўнікі.

У лютым 1661 г. паўсталі жыхары Магілёва: яны вызвалілі горад і знішчылі амаль цалкам вялікі царскі гарнізон. У снежні 1661 г. пасля доўгай аблогі быў вызвалены горад Стары Быхаў. У лістападзе 1661 г. вайна часова (да траўня 1662 г.) спынілася. Увесну 1662 г. пачаліся перамовы, але вынікаў яны не далі, і зноў пачалася вайна. Войскі Рэчы Паспалітай у 1662 г. вызвалілі Барысаў і Усвяты. У 1663–1664 гг. ішлі баі мясцовага значэння пад Магілёвам, Віцебскам і Полацкам. Потым былі спробы перамоў і ваенныя дзеянні ўлетку 1666 г. пад Магілёвам, Шкловам і Копысем.

Нарэшце, у студзені 1667 г. у *вёсцы Андрусаве* пад Смаленскам варожыя бакі заключылі замірэнне на 13,5 года (да чэрвеня 1680 г.). За Масквой засталіся Смаленскае ваяводства і Старадубскі ды Чарнігаўскі паветы, а таксама частка Украіны на левым беразе Дняпра і (часова) г. Кіеў. ВКЛ вярнула Віцебскае і Полацкае ваяводствы,

а таксама частку Лівоніі (Інфлянты). Да Польшчы адышла Правабярэжная Украіна.

У 1686 г. быў падпісаны «Вечны мір». Да ВКЛ дадаткова адышлі гарады Невель, Себеж і Вяліж, а таксама землі ўздоўж Сожа. Кіеў на доўгія гады застаўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы.

***7.6. Унутраная палітыка Маскоўскай дзяржавы падчас вайны з Рэччу Паспалітай.*** На пачатку вайны ў краіне пачалася эпідэмія чумы, таксама спыніўся замежны гандаль, і срэбра для чаканкі грошай пачало не хапаць. У той час існавалі срэбныя рублі і дробныя капейкі. Каб ашчадзіць срэбра, у 1650 г. маскоўскі ўрад замяніў срэбныя капейкі на медныя. Нягледзячы на тое што медзь была ў 20 разоў таннейшай за срэбра, медныя капейкі загадалі лічыць як срэбраныя – гэта выклікала вялікую інфляцыю і абурэнне насельніцтва. Кошты на харчы моцна выраслі, і ў краіне пачаўся голад. У 1662 г. паўсталі жыхары Масквы: яны натоўпам рушылі да цара і запатрабавалі выдаць ім баяраў. Цар мусіў разагнаць бунтаўнікоў, пры гэтым шмат людзей загінула. Аднак у 1663 г. медныя грошы забаранілі і зноў пачалі выкарыстоўваць срэбра.

Шмат сялян, якія былі ў гаротным становішчы, паўцякала ад сваіх дваран на Дон. Але казакі не вельмі добра да іх ставіліся, у свой асяродак не прымалі і забаранялі араць зямлю. Новыя перасяленцы атрымалі мянушку «галыцьба» і пачалі пераходзіць з Дона на Волгу. Некаторыя дабраліся да ракі Урала (тады яна называлася Яік). Іх узначаліў атаман Сцяпан Разін. У 1668 г. ён павёў казакоў рабаваць персідскія землі на паўднёвых берагах Каспійскага мора. Казакі Разіна захапілі і абрабавалі некалькі гарадоў, а ў 1669 г. вярнуліся на Волгу і прыплылі на захопленых караблях у Астрахань. Царскія ваяводы забралі ў іх караблі і частку зброі і з вялікай здабычай адпусцілі на Дон.

Да Разіна далучылася шмат новых казакоў, і ён вырашыў захапіць уладу ў краіне. Увесну 1670 г. Разін распачаў вайну з царскімі ваяводамі. Яго атрады захапілі Астрахань, Царыцын, Саратаў і Самару.

Казакі забівалі і рабавалі баяраў і дваран, а таксама купцоў. Да казакоў далучыліся сяляне, якія паўсталі супраць сваіх памешчыкаў, а таксама паволжскія народы (мардва, татары ды іншыя).

Разін дайшоў да Сімбірска, але тут яго сустрэлі царскія войскі на чале з князем Юрыем Барацінскім. Рэгулярныя войскі разбілі Разіна, і ён уцёк на Дон, дзе яго схапілі багатыя казакі і выдалі цару. У 1671 г. атамана публічна чацвертавалі ў цэнтры Масквы.

***7.7. Царкоўная рэформа.*** У 1652 г. патрыярхам у Масковіі стаў былы наўгародскі мітрапаліт Нікан.

Ён карыстаўся вялікай павагай цара, быў здольным і адукаваным чалавекам. Цар надаў яму тытул «вялікі гасудар» і нават пакінуў яго кіраваць краінай, калі сам пайшоў на вайну з Рэччу Паспалітай. Нікан пачаў паводзіць сябе вельмі ганарліва, і гэта вельмі не падабалася прыдворным.

Нікан вырашыў, што маскоўская праваслаўная царква павінна быць падобнай да грэцкай і змяніў некаторыя правілы штодзённага жыцця вернікаў Масковіі. Ён запатрабаваў, каб абразы цалкам адпавядалі грэцкім узорам, каб вернікі хрысціліся не двума, а трыма пальцамі, як грэкі; таксама былі ўнесены змены ў царкоўныя кнігі. Гэта не спадабалася шмат якім святарам, і супраць Нікана выступілі пратапопы Авакум, Іван Няронаў і іншыя. Пасля гэтага Авакума выслалі ў Сібір (у Табольск), а Няронава – у Валагодскі край.

У 1654 г. Нікан склікаў у Маскве царкоўны сабор, і той падтрымаў яго рэформы. У 1655 г. Нікана падтрымаў і Канстанцінопальскі патрыярх.

Аднак частка святароў на чале з Няронавым і Авакумам выступіла супраць – яны адмаўляліся карыстацца новымі «папраўленымі» царкоўнымі кнігамі. Іх пачалі называць прыхільнікамі старой веры, або стараабрадцамі.

У 1666 г. цар склікаў новы царкоўны сабор, які зноў не



Патрыярх Нікан.
*Выява з «Тытулярніка» 1672 г.*

падтрымаў Нікана, пазбавіў яго сану патрыярха і святарства і саслаў як простага манаха ў манастыр, дзе ён 15 гадоў быў фактычна ў якасці вязня.

Аднак усе змены ў царкоўным жыцці сабор падтрымаў і абвясціў прыхільнікаў старой веры раскольнікамі і ерэтыкамі. Супраць сабору выступіў Салавецкі манастыр, які 8 гадоў (1668–1676) змагаўся ў аблозе супраць царскіх войскаў. Стараверы ацалелі і падзяліліся на дзве плыні: папоўшчыну і беспапоўшчыну. Першыя мелі сваіх святароў – папоў, а другія – не.

Дзеля выпраўлення царкоўных кніг у Маскву прыехалі адукаваныя святары з Грэцыі і Украіны, якія ведалі замежныя мовы і друкарскую справу. Вялікую ролю ў духоўным жыцці царскага двара адыграў беларускі манах Сімяон Полацкі, які быў настаўнікам царскіх дзяцей, вучыў моладзь пісаць вершы, намагаўся, каб яна вывучала лацінскую і грэцкую мовы. Сярод маскоўскіх інтэлектуалаў вылучаліся дварэцкі Фёдар Рцішчаў, начальнік Пасольскага прыказа дыпламат Афанасій Ардын-Нашчокін і яго намеснік баярын Артамон Мацвееў.

У 1659 г. у Маскву прыехаў каталіцкі святар харват Юрый Крыжаніч, які назваў сябе праваслаўным. Ён, вярнуўшыся дадому, падрабязна апісаў маскоўскія парадкі.

На пачатку 1676 г. Аляксей Міхайлавіч памёр. Новым царом стаў яго сын Фёдар (1676–1682), якому было толькі 14 гадоў. Аляксей Міхайлавіч быў двойчы жанаты. Ад першай жонкі, якая памерла, ён меў двух сыноў, Фёдара і Івана, і некалькі дачок. Ад другой жонкі ў 1672 г. нарадзіўся сын Пётр. У выніку пры царскім двары склаліся дзве варожыя групоўкі: сваякі першай і другой жонак, якія прэтэндавалі на ўладу пасля смерці цара.

У 1677 г. Турцыя пачала вайну з Маскоўскай дзяржавай. Вялікае войска султана і крымскіх татараў з'явілася на Правабярэжнай Украіне. Пасля аблогі яны захапілі сталіцу гетманаў горад Чыгірын. Значная частка казакоў пачала перасяляцца на левы бераг Дняпра і заняла тэрыторыю на Паўночным Данцы. Так узнікла *слабадская Украіна*.

13 студзеня 1681 г. у Бахчысараі было падпісана замірэнне на 20 гадоў. Турцыя прызнала правы Масковіі на Кіеў. Землі паміж Дняпром і Бугам пачалі лічыцца нейтральнымі, і засяляць іх абодвум

бакам не было дазволена. Цягам XVII ст. Масковія плаціла даніну Крымскаму ханству.

На працягу XVII ст. ішло заваяванне Сібіры і засяленне яе сялянамі з Масковіі. Маскоўская дзяржава да канца стагоддзя заняла Заходнюю Сібір аж да берагоў Ціхага акіяна, далучыла Камчатку і Курыльскія астравы. У 1648 г. казак Сямён Дзяжнёў адкрыў праліў паміж Азіяй і Паўночнай Амерыкай.

У 1645 г. Васілій Паяркаў па Амуры выйшаў у Ахоцкае мора і адтуль вярнуўся ў Якуцк. У сярэдзіне XVII ст. Ерафей Хабараў дайшоў да Дауры. Уладу цара прызналі вялікія сібірскія народы якуты і бураты, а таксама шматлікія маленькія плямёны, што займаліся рыбалоўствам і паляваннем. У Сібіры будаваліся *крэпасціастрогі*. Сярод іх – Енісейскі астрог (1619) і Краснаярскі (1628). Мясцовае насельніцтва мусіла плаціць даніну (ясак), у першую чаргу сабалінымі шкуркамі, якія дорага каштавалі. Да канца XVII ст. у Сібіры ўжо жыло 150 тыс. велікарускага насельніцтва (на той час ва ўсёй Масковіі налічвалася блізу 10,5 млн чалавек).

Былі зроблены спробы ажыццявіць вайсковую рэформу. Сабор 1682 г. адмяніў месніцтва; былі складзены новыя спісы ўсяго патомнага дваранства.

Пасля смерці цара Фёдара пачалася барацьба за ўладу паміж дзвюма варожымі баярскімі групоўкамі. Паколькі Фёдар дзяцей не пакінуў, спачатку Нарышкіны царом абвясцілі Пятра I, але Міласлаўскія, сваякі першай жонкі Аляксея Міхайлавіча, з дапамогай стралецкага войска абвясцілі царамі і Пятра I і Івана, Фёдаравага брата, які быў хворы і кіраваць краінай не мог. Пакуль Пётр быў малалетнім, краінай сем гадоў кіравала царэўна Соф'я з дапамогай князя Васілія Галіцына.



*Б. Чорыкаў.* Нараджэнне Пятра I

Пётр з маці жыў гэты час не ў Маскве, а ў падмаскоўных вёсках, дзе гуляў у вайну і стварыў сабе для гэтых гульняў два салдацкія палкі – Сямёнаўскі і Праабражэнскі, якія потым стануць яго гвардыяй. Ён з дзяцінства сябраваў з немцамі, якія жылі непадалёку ад сяла Праабражэнскага ў Нямецкай слабадзе, і авалодаў нямецкай мовай. Дзякуючы сяброўству з галандцамі ён пачаў будаваць лодкі і невялікія караблі з ветразямі. Вялікі ўплыў на яго зрабіў палкоўнік Франц Лефорт, які служыў у маскоўскім войску, прыехаўшы са Швейцарыі.

У 1689 г. урад Соф'і падпісаў *Нярчынскую дамову* з Кітаем, з якім у Масковіі існавалі спрэчкі за раку Амур. Маскоўская дзяржава перадала Кітаю берагі Амура, і гэтыя канфлікты спыніліся. Князь Галіцын здзейсніў два няўдалыя ваенныя паходы (1687 і 1689) у Крым, захапіць які ён так і не здолеў.

У 1689 г. Пятру споўнілася 17 гадоў, і ягоныя сваякі на чале з яго маці, царыцай Наталляй, пачалі змаганне за ўладу з Соф'яй. У выніку дзяржаўнага перавароту і смерці другога цара Івана ў 1696 г. адзіным царом урэшце стаў Пётр I.

У 1690 г. патрыярх склікаў царкоўны сабор, дзе быў выказаны недавер кіеўскім святарам і манахам.

***7.8. Культура і пачаткі навукі ў Маскоўскай дзяржаве XVII ст.*** *У* разгляданы перыяд культура маскоўскіх земляў набывала больш свецкі характар і пачынала паступовае збліжэнне з культурай Захаду. Пэўную ролю ў гэтым адыграў Смутны час, які змусіў людзей Масковіі па-новаму зірнуць на сваё становішча ў свеце.

Вялікі ўплыў на Маскоўскую дзяржаву ў той час мелі Беларусь і Украіна, якія ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Менавіта адсюль, хоць і з цяжкасцямі, ішлі агульнаеўрапейскія каштоўнасці і паняцці, адсюль ішлі імпульсы да пашырэння вучонасці, засваення патрэбных людзям ведаў.

У выніку на працягу стагоддзя істотна вырас узровень пісьменнасці людзей у Масковіі: сярод памешчыкаў ён дасягаў 65 %, сярод пасадскіх людзей такіх было да 40 %, сярод сялян – да 15 %, а сярод купцоў – нават да 96 %. Самым нізкім (каля 1 %) ён заставаўся сярод стральцоў, пушкароў, казакоў. У 1649 г. баярын Фёдар Рцішчаў

адкрыў у маскоўскім Андрэеўскім манастыры першую буйную прыватную школу. У 1687 г. у Маскве была заснавана *Славяна-грэка-лацінская акадэмія* – правобраз універсітэта. Ініцыятыву стварэння такой установы першым выказаў наш зямляк Сімяон Полацкі, а першымі выкладчыкамі ў ёй былі грэкі, браты Ліхуды, якія таксама сталі аўтарамі першых падручнікаў па граматыцы, рыторыцы, псіхалогіі, фізіцы.

У другой палове стагоддзя маскоўскі Друкарскі двор выпусціў каля 300 тысяч кніг для навучання грамаце, самымі вядомымі сярод якіх былі «Азбука» Васілія Бурцава-Пратапопава (1634) і «Буквар» Карыёна Істоміна (1694–1696). Агулам за XVII ст. у Маскоўіі было надрукавана больш за 480 найменняў кніг. У 1672 г. у Маскве адчынілася першая кнігарня.

Заняткі навукай канцэнтраваліся збольшага на засваенні і пашырэнні канкрэтных, ужытковых ведаў. Матэматыка, механіка, фізіка, хімія вывучаліся дзеля прымянення іх у гандлёвай і вайсковай справах, а таксама дзеля стварэння геаграфічных апісанняў земляў, складання картаў. У сярэдзіне стагоддзя ў краіне пазнаёміліся з геліяцэнтрычнай сістэмай Мікалая Каперніка. Пэўнае развіццё атрымала і медыцына: у Аптэкарскім прыказе навучалі лекараў і зельнікаў-фармацэўтаў. Дзеля працягу адукацыі пэўнай колькасці дваран дазвалялася выязджаць з Маскоўіі ў заходнія краіны.

Істотныя зрухі адбыліся ў разуменні і пашырэнні гістарычных ведаў. З'явіліся такія працы, як «Врѣмянникъ» (1616–1619) дзяка Івана Цімафеева, «Сказанне пра Траецкую аблогу» (каля 1620) манаха Аўраама Паліцына, ананімны «Хранограф 1617 года», «Новы летапісец», складзены каля 1630 г., магчыма, наўгародскім мітрапалітам Кіпрыянам. Ніканаўская рэформа праваслаўнай царквы стала штуршком для напісання ўнікальнага Жыцця (1672–1675) пратапопа Авакума. Наогул, у *літаратуры* названага часу дамінантнымі робяцца творы сатырычна-алегарычнага характару – найчасцей, натуральна, ананімныя: «Аповесць пра Ярша Яршовіча», «Аповесць пра Фаму і Ярому» (1-я палова ст.), «Аповесць пра Шамякін суд», «Аповесць пра бражніка» (сярэдзіна і 2-я палова ст.) ды іншыя. Сярод побытава-рэалістычных твораў трэба вылучыць таксама ананімную «Аповесць пра гора-злашчасце» (пачатак ст.),



Сімяон Полацкі. *Гравюра 1818 г. з калекцыі Платона Бекетава*

«Аповесць пра Саву Грудцына», «Аповесць пра Ульянію Асор'іну» (2-я палова ст.).

На заваяваных Масковіяй татарскіх землях працягвала развівацца рэлігійная суфісцкая паэзія, найбольш значным прадстаўніком якой у той час быў Маўлі Калый.

Новы стыль для літаратуры Масковіі і фактычна новую літаратурную мову стварыў выхаванец Віленскай езуіцкай акадэміі і Кіева-Магілянскай акадэміі, стваральнік полацкай школы літаратурнага барока Сімяон Полацкі, аўтар, сярод іншага, выдадзеных у Маскве паэтычна-філасофскіх кніг «Арол расійскі» (1676), «Вертаград мнагацветны» (1678), «Рыфмалагіён» (1679). Ён жа быў драматургам і заснавальнікам аматарскага прыдворнага тэатра. Самы ж першы тэатр у Масковіі ў 1672 г. стварыў пастар Ёган Готфрыд Грэгеры пры лютэранскай царкве ў маскоўскай Новай нямецкай слабадзе.

Развіццё маскоўскай *архітэктуры* ў XVII ст. вызначалася ўзмацненнем яе свецкага характару, большай складанасцю кампазіцый, арнаментальнай дэкаратыўнасцю. Працэс «абміршчэння» датычыў не толькі непасрэдна свецкай архітэктуры (менавіта тады пашырылася будаўніцтва каменных палатаў, церамоў, рэпрэзентатыўных царскіх і баярскіх пабудоў), але выразна праявіўся і ў кампазіцыях храмаў – як мураваных, так і драўляных.

У царкоўным дойлідстве працягваецца ўзвядзенне *шатровых комплексаў*, пры гэтым дахавае завяршэнне прапарцыянальна выцягваецца і вянчаецца часцей за ўсё невялікімі «цыбулінамі». Папулярнай робіцца структура васьмярык на чацверыку – калі над кубападобным асноўным аб'ёмам узводзіцца васьміграннае наверша.

У масавым *грамадзянскім дойлідстве*, якое застаецца драўляным і таму моцна церпіць ад частых пажараў, назіраецца нават вытвор-

часць цэлых модуляў. Так, у Маскве на Трубнай плошчы ў XVII ст. гандлявалі гатовымі зрубамі. З той жа прычыны абароны ад агню царскі ўказ 1688 г. забараняў будаваць жылыя дамы вышэй за два паверхі.

Выняткі складалі царскія палаты. Церамны палац, узведзены ў 1635–1636 гг. дойлідамі Анціпам Вазауліным (Канстанцінавым), Трэфілам Шаруціным, Ларыёнам Ушаковым і Бажэнам Агурцовым, можна лічыць архітэктурным шэдэўрам і ўвасабленнем новых тэхналогій свайго часу. Ён таксама чароўна-казачны, але адносіцца да больш трывалага мураванага будаўніцтва. Пры ўзвядзенні муроў выкарыстоўвалі металічныя мацаванні, што дазволіла паменшыць іх канструкцыйную таўшчыню. Упершыню ў Масковіі майстры выкарысталі анфіладную планіроўку пакояў. Тры новыя паверхі былі надбудаваны над двума ўзроўнямі, узведзенымі яшчэ Алевізам Старым для Івана III. Апошні паверх, «церамок», дадалі ў 1637 г.; тады ж майстар Іван Осіпаў аздобіў дах срэбрам і сусальным золатам, у вокны ўставілі каляровую слюду, а ўпрыгожванне інтэр'ераў завершыў роспісам мастак Сіман Ушакоў. Афармленне фасадаў дапаўнялі два лазурныя глазураваныя гзымсы.

У XVII ст. на важных замовах, як і раней, працуюць замежнікі. Збудаваную раней Спаскую вежу Маскоўскага крамля ў 1624–1625 гг. скончыў шатландскі архітэктар Крыстафер Гэлаўэй (Хрыстафор Галавей) пры удзеле Бажэна Агурцова, узвёўшы над вежай шмат'ярусны



Церамны палац у Маскоўскім крамлі (архітэктары Б. Агурцоў ды іншыя)

© DocPlayer.ru

верх у гатычным стылі (у пятым ярусе выкарыстаны аркбутаны). Да элементаў маньерызму можна аднесці скульптуры, аголенасць якіх адразу прыкрылі тканінамі, а ў 1628 г. увогуле прыбралі. Тады ж на вежы з'явіўся гадзіннік. У 1672–1686 гг. былі надбудаваныя і астатнія вежы крамля, з выняткам Мікольскай.

У 1667–1678 гг. пад кіраўніцтвам цяслярскага старосты Сямёна Пятрова і стральца Івана Міхайлава ў Каломенскім пад Масквой будуецца вялікі драўляны палацавы комплекс (часткова дабудаваны ў 1681 г. Савам Дзяменцьевым). Пабудовы ўражваюць памерамі, бо налічваюць ажно 270 пакояў і каля 3000 вокнаў ды акенцаў. Падобны да незвычайнага кулінарнага вырабу, палац утрымліваў усе тыповыя для дойлідства Масковіі дэкаратыўныя элементы: вежачкі і купалы з лускаватымі дахамі, какошнікі, «гульбішчы» і ганкі з вітымі калонкамі і балясінамі. У выніку архітэктары надалі агульнаму спалучэнню розных аб'ёмаў і розных дэкаратыўных хадоў жывапісны характар і тыповую для дойлідства эпохі казачнасць. А вось усімі разьбянымі працамі ў Каломенскім палацы займаліся беларускія майстры пад кіраўніцтвам Кліма Міхайлава і старца Арсеня. Імі зроблены разьбяныя, залочаныя, распісныя карнізы, аконныя рамы, капітэлі, кранштэйны. Іх калегі, цаніннікі-беларусы, рабілі кафляныя печы. Роспісамі кіраваў Сіман Ушакоў.



© Фота Алега Трусава

*Сцяпан Іваноў-«Палубес».* Выява евангеліста

У Таганскім раёне Масквы на тэрыторыі Круціцкага падвор'я ў 1693–1694 гг. быў узведзены Круціцкі церамок, што злучае сабой Успенскі сабор і палаты мітрапалітаў. Архітэктар Ларыён Кавалёў выкарыстаў у дэкоры вокнаў багатыя ліштвы з ордарнымі элементамі; паверхню першага і другога паверхаў абрамляюць паўкалонкі – рысы, уласцівыя стылю маскоўскага, або нарышкінскага, барока. Чытачу з Беларусі будзе асабліва цікава, што ў выкананні рознакаляровага цаніннага арнаменту браў удзел беларускі кафляр з Мсціслава Сцяпан Іваноў-«Палубес»: шэраг кампазіцый




Кафлі ў муры царквы на Берсенеўцы (Масква), XVII ст.

паўтараюць яго вырабы ў Нова-Іерусалімскім манастыры, дзе ён працаваў разам з іншымі беларусамі на замову патрыярха Нікана. Гэтаксама не тыповыя для ўласна маскоўскіх кафляроў выявы звярыных масак і лап з мячамі паміж іншымі ўзорамі.

Дзеля прадстаўнічых мэтаў на загад цара, яго чыноўнікаў і багатых людзей былі ўзведзены мураваныя палаты на Салаўках , заезны двор у Архангельску (архітэктар Восіп Старцаў), палаты баяраў Рамаданаўскіх у Курску, Красная палата ў Растове, палаты Раманавых у Кастраме, дамы Лапіна, Трубінскага, Гур'ева, Сутоцкага, Меншыкава (Якаўлева), Прыказныя палаты ў Пскове, дом Пушнікава ў Ніжнім Ноўгарадзе, дом Зялейшчыкава ў Чэбаксарах, «Пугачоўская палатка» ў Саранску, палаты баяраў Галіцына, Волкава, Траякурава ў Маскве, царскія чартогі ў Загорску. Пачалося таксама актыўнае ўзвядзенне адміністрацыйных будынкаў – найперш у сталіцы дзяржавы Маскве (Друкарскі двор, Манетны двор, Сухарава вежа, будынак Земскага прыказа).

Багацце і разнастайнасць формаў, імкненне да дэкаратыўнасці і аздобнасці ў значнай ступені запазычвалі ў *культавай архітэктуры* з досведу будоўлі драўляных храмаў. Да таго ж разнастайнасць формаў дасягалася выкарыстаннем новага тыпу цэглы – фігурнай. *Царква Успення Багародзіцы ў Угліччы* (1628), названая за незвычайную форму «Дзіўнай», уяўляе сабой адзін з нешматлікіх прыкладаў храма з трыма шатрамі. Белая, стромкая, лёгкая, з дэкорам з какошнікаў і аркатурнага паяска, яна, тым не менш, не мела стылёвых нашчадкаў. Пры канцы 1640-х гг. кансерватыўна настроены патрыярх Нікан

забараніў будоўлю шатровых цэркваў (шатры дазваляліся толькі на званіцах), запатрабаваўшы следаваць візантыйскім канонам.

Храм *Пакрова Багародзіцы ў Мядведкаве* і *царква Зосімы і Савація* ў Троіца-Сергіевай лаўры (1630-я гг.) – адны з апошніх шатровых пабудоў, дзе пакрыццё храма знаходзіцца на магутным чацверыку. Другая з іх наследуе галоўнаму храму Салавецкага манастыра (*Праабражэнскі сабор*, 1558) і названая ў гонар заснавальнікаў манастыра. Яе асаблівасць – аздобы каляровымі кафлямі, выраб якіх шырока распаўсюджваецца ў сярэдзіне XVII ст., у значнай ступені дзякуючы працы палонных майстроў з ВКЛ.

© vadimpl



Міхайла-Архангельскі сабор у Ніжнім Ноўгарадзе (архітэктары Л. Сямёнаў і інш.)

Да сабораў шатровага тыпу належыць *Міхайла-Архангельскі сабор у Ніжнім Ноўгарадзе* (1628–1631), узведзены архітэктарам Лаўрэнціем Сямёнавым з памочнікамі на падмурках XIV ст., але цалкам у новай стылістыцы.

Як традыцыйны шатровы адзначым *храм Праабражэння ў сяле Астраве* – падмаскоўным падвор'і патрыярха маскоўскага і ўсяе Русі (першая палова XVII ст.). Этапнымі маскоўскімі пабудовамі сталі *царква Раства ў Пуцінках* (1649–1652) або *царква Міколы Цудатворца ў Хамоўніках* (1679–1682). Тут нарадзіўся стыль, называны расійскім узорыстым, багацце формаў якога тлумачыцца выкарыстаннем фігурнай цэглы. Рознавысокасць аб'ёмаў – гзымсаў, какошнікаў, пяці шатроў (найбольшы з якіх званіца) – надаюць працы своеасаблівую жывапісную пампезнасць і святочнасць.

Той самы эфект быў дасягнуты ў пабудовах

© Pegushev



Царква Раства Багародзіцы ў Пуцінках

маскоўскіх цэркваў *Тройцы ў Нікітніках* (1628–1651) і *Міколы Цудатворца на Берсенеўцы* (1657), дзе асіметрыя і жывапіснасць формаў блізкія да архітэктуры баярскага двара.



© Фота Алега Трусава

Царква Міколы Цудатворца ў Хамоўніках

Наступным праграмным этапам у гісторыі дойлідства Масковіі сталі часы патрыярха Нікана. Частка згаданых раней ніканаўскіх рэформаў датычыла дойлідства: за ўзор браліся афонскія царкоўныя будынкі, дзеля ўвасаблення чаго паблізу Ноўгарада быў заснаваны *Іверскі Валдайскі манастыр Багародзіцы*, збудаваны на ўзор Іверскага манастыра на Афоне. Асноўны *Успенскі сабор* манастыра (1650-я гг.) увасобіў нараджэнне новага, архаізавальнага напрамку ў дойлідстве Масковіі сярэдзіны XVII ст.: шасціслупавы храм на прыўзнятым падклецці з галерэямі і пяццю вялікімі купаламі.

У 1655 г. у манастыр былі пераселены палонныя манахі Аршанскага Куцейнаўскага манастыра (больш за 70 чалавек). Прывезеная імі друкарня некалькі гадоў працавала на Валдаі, дзе выдалі чарговае (пасля Оршы) «Брашна духоўнае» і яшчэ некалькі кніг. Потым, у 1665 г., на загад Нікана друкарскія варштаты перавезлі ва Уваскрасенскі Новаіерусалімскі манастыр пад Масквой, а ў 1676 г. перадалі маскоўскаму Друкарскаму двару.

Апрача друкароў з ВКЛ (Копысі, Шклова, Дуброўны) у Іверскі манастыр і манастырскія сёлы было перaселена нямала цаніннікаў, разьбяроў і іншых рамеснікаў. Пад кіраўніцтвам Ігната Максімава з Копысі была наладжана вытворчасць каляровай кафлі і мураўлёнай дахоўкі; першая ўпрыгожыла вокны і інтэр'еры настаяцельскага корпуса, другая пайшла на дах. Майстэрня пачала пашыраць рамяство па Маскоўскім царстве; кафлю вывозілі на замову ў Пскоў, Ноўгарад, Маскву.

Манументальна-рэпрэзентацыйны стыль Нікан падтрымліваў як у рэлігійнай, так і ў свецкай архітэктуры. Узорам служыць Патры-

яршы палац і царква *Дванаццаці апосталаў* у Маскоўскім крамлі. Тут працавалі ў 1635–1656 гг. маскоўскія дойліды Анціп Вазаулін (Канстанцінаў) і Бажэн Агурцоў, а таксама Давыд Ахлебін і яраславец Тарас Цімафееў.

Але самым амбіцыйным праектам Нікана было ўзвядзенне *Уваскрасенскага храма Новаіерусалімскага манастыра* пад Масквой (1658–1684), які меўся стаць Другім Іерусалімам у адзіным на свеце праваслаўным царстве – Маскоўскім. Адпаведным чынам, пры праектаванні галоўнага храма манастыра арыентаваліся на спецыяльна атрыманыя планы і абмеры Храма Дамавіны Гасподняй. Манастырскі пагорак назвалі Сіёнам; побач былі Елеон і Фавор. Разам з Ніканам, які вёў агульнае назіранне за працэсам, першым архітэктарам манастыра быў беларус Пётр Заборскі, «золотых, серебряных и медных, ценинных и всяких рукодельных хитростей изрядный ремесленный изыскатель» (надпіс на яго надмагільнай пліце). Таксама працавалі на будоўлі рамеснікі Прыказа каменных спраў Аверка Макееў, Іван Белазёр, іншыя беларускія і заходнееўрапейскія майстры. Пасля смерці Заборскага і апалы Нікана ды яго высылцы ў Ферапонтаў манастыр працы прыпыніліся, а беларускіх майстроў (31 чалавек) перавялі ў Збройную палату. Аднак ужо ў 1679 г. выхаванец Нікана і вучань Сімяона Полацкага, 18-гадовы цар Фёдар Аляксеевіч узнавіў працы ў манастыры, якія скончыліся асвячэннем Уваскрасенскага сабора ў 1685 г. Сабор быў прызнаны бясспрэчным архітэктурным шэдэўрам XVII ст. і першым помнікам стылю барока ў Масковіі. Фактычна ад архітэктурнай задумы да дэкарацыі шматлікімі каляровымі кафлямі (абліцоўка вокнаў, дзвярэй, арак) разам з цанінным іканастасамі, дапоўненымі залочанай разьбой па дрэве, – усё гэта было вынікам працы беларускіх майстроў. Форма ж манументальнай будыніны – класічная: цэнтральная частка ўяўляе сабою 4-слупавы крыжова-купальны храм. З усходу да яго прымыкае падземная *царква святых Канстанціна і Алены* (заглыбленая на 6 м), з поўдня прыбудаваная шмат'ярусная званіца. Нарэшце, з захаду кампазіцыю замыкае вялізная *ратонда* над капліцай Дамавіны Гасподняй.

Дойлідства правінцыйных цэнтраў Маскоўскай дзяржавы XVII ст. мае свае асаблівасці, але збольшага храмы правінцыі саступаюць

прэтэнцыёзным праектам сталіцы. У Суздалі будуюць невялікія цэрквы з пяццю або адной галавою; сілуэт ускладняюць прыдзелы, а паверхню муроў часам аздабляюць даволі складаныя дэкаратыўныя паяскі (*царква Узнясення Аляксандраўскага манастыра*, 1695). У Яраслаўлі, багатым рамесна-купецкім цэнтры, узводзяць вялікія храмы – звычайна пяцігаловыя, якія адначасова служаць і месцам сустрэч, заключэння гандлёвых кантрактаў, а падклеці – сховішчам тавараў. Шатровыя званіцы падобныя да маскоўскіх, цыбуліны купалаў – цяжкаватыя, накрытыя лускаватай дахоўкай. Часта выкарыстоўваюцца кафля і роспіс муроў знадворку, фігурная муроўка цэглы – у аздабленні ганкаў і вокнаў. Яшчэ адна асаблівасць: большасць пабудоў утварае цікавыя паводле кампазіцыі ансамблі, дзе 2–3 храмы спалучаюцца з вялікай званіцай (цэрквы *Міколы Мокрага*, *Іаана Залатавуснага*, *Маці Божай Фёдараўскай* і званіца ў Кароўніках, сярэдзіна ст.).


© DistoDen

Уваскрасенскі храм Новаіерусалімскага манастыра (архітэктары П. Заборскі і інш.). Гравюра XVIII ст.

Выдатны ансамбль – крэмль і пяць цэркваў – быў збудаваны ў Растове Вялікім пры мітрапаліце Іоне Сысоевічу (1660–1690-я гг.). Тут маецца цікавае спалучэнне крыху архаічнай, арыентаванай на маскоўскія ўзоры XVI ст. (у прыватнасці, на Успенскі сабор Крамля), пластыкі храмавых будынкаў з аб'ёмамі крамлёўскіх муроў (царква *надбрамная Уваскрасення*, 1670).

Ад традыцыйных стылёвых напрамкаў трэба зноў звярнуцца да нарышкінскага, або маскоўскага, барока, характэрнага для некалькіх храмаў у ваколіцах Масквы (у тым ліку маёнткаў праеўрапейскіх баяраў Нарышкіных). Іх абрысы ў дэкаратыўна-арнаментальным ключы запазычваюць новыя стылёвыя элементы з Еўропы і, такім чынам, як бы перакідваюць масток да сапраўднага ранняга маскоўскага барока – «пятроўскага» ў Санкт-Пецярбургу. Самы яскравы прыклад – царква *Пакрова ў Філях*, сядзіба брата Нарышкіных


© Фота С. Кароўкіна

Царква Пакрова ў Філях
(архітэктар Я. Бухвостаў)

(1690-я гг.). Лёгкасць канструкцыі падкрэслівае аркатурны падклет, базавы ярус; потым ідуць упрыгожаныя паўкалонкамі чацвярык і васьмярык, а таксама васьмярык-званіца з маленькай галоўкай. Вытанчанасць будынка падкрэслівае рытмічны дэкор. Аўтарам убранства і іканастаса лічыцца майстар Збройнай палаты Карп Залатароў; у вобразе архідыякана Стэфана некаторыя даследчыкі бачаць партрэтныя рысы пляменніка замоўцы – маладога Пятра I.

Званіца Новадзявочага манастыра, пабудаваная ў 1689–1690 гг., мае пяць ярусаў, што складаюцца з пастаўленых адзін на аднаго васьмерыкоў і завяршаюцца васьміграннымі барабанам з галавой-цыбулінай.


© Фота Алега Трусава

Званіца Новадзявочага
манастыра ў Маскве

Царква *Спаса-ва-Уборах* – як і папярэдні храм, узведзеная архітэктарам Якавам Бухвоставым (1690-я гг.) – падаецца больш строгай і цяжкавагавай, але таксама вылучаецца ясным выяўленнем канструкцыйнага рашэння. Прымыкае да гэтай групы і *храм Барыса і Глеба* ў падмаскоўным *Зюзіне* (1688 –1704).

Завяршае эвалюцыю мураванага дойлідства Масковіі XVII ст. царква *Знамення ў Дубровіцах* (1690–1704), арыгінальнае ўбранства якой разам з выкарыстаннем скульптуры схілялі раней прыпісваць яе аўтарства ўкраінцу Івану Заруднаму. Цяпер аўтарамі часцей на-

зываюць дойлідаў з італьянскай Швейцарыі. Пры блізкасці яе плана да нарышкінскіх пабудоў яе цэнтрычны тэтраконх, насычанасць стылёвымі ўпрыгажэннямі дазваляе казаць пра наступны крок выканаўцы да засваення сапраўднага барока.



Спаса-Праабражэнская
і Пакроўская цэрквы ў Кіжах
(Карэлія), пачатак XVIII ст.

Значнае месца ў сакральным дойлідстве Маскоўскай дзяржавы XVII ст. займалі *драўляныя храмы*. Вельмі распаўсюджаныя яны былі на Поўначы – асабліва ў Архангельскай зямлі (цэрквы ў вёсках *Панілава*, *Чучхарма*, *Варзуга*, *Пучуга*). Шырокавядомыя таксама драўляныя цэрквы, пабудаваныя на Цвершчыне – у Таржку, у вёсцы Пагост – і ў Карэліі.

Да твораў *жывапісу* Смутнага часу можна аднесці рэпліку іконы Божай Маці Казанскай (арыгінал з'явіўся ў Казані ў 1579 г., цяпер не існуе) – так званы маскоўскі спіс.

Верагодна, твор узнік у час вызвалення Масквы ад войскаў Рэчы Паспалітай у 1612 г. Першапачаткова гэты скарочаны (*аплечны*) варыянт Адзігітрыі быў змешчаны ў сямейную царкву Пажарскіх – *Увядзення Багародзіцы на Лубянцы*. Пазней, у 1620-х гг., абраз перанеслі у спецыяльна збудаваны на Краснай плошчы храм Казанскай Божай Маці (зруйнаваны ў 1936 г.; тады абраз быў перанесены ў маскоўскі Ялохаўскі сабор; храм Казанскай Божай Маці адноўлены ў 1990–1993 гг.). У стылістыцы іконы захоўваецца кансерватыўная візантыйская плынь. Сам жа сабор працягвае развітыя ў XVI ст. формы пірамідальных з выгляду храмаў, абрыс якіх вырашалі ярусы какошнікаў пад падкупальным барабанам.



Рэпліка іконы
Маці Божай Казанскай

Наогул на жывапіс Масковіі XVII ст. можна паглядзець з нетыповага ракурсу: а менавіта з канстатацыі нараджэння свецкага жанру – парсуны, потым партрэта. Першы тэрмін выкарыстоўваюць да ранніх, больш падобных да іконных, прац. Але сам факт цікавасці да персоны (адсюль «парсуна») яскрава супадае з канстатаваным у размове пра ўладаранне Васілія Шуйскага фактам з'яўлення акта прысягі цара (дадзенай баярам з цалаваннем крыжа). Сімвалічны знак нараджэння грамадзянскай дамовы выразна адпавядае нараджэнню вобраза чалавека ў выяўленчым мастацтве.

Першыя парсуны – такія як *партрэт Івана Жахлівага* (каля 1600) ці *партрэт Міхаіла Скопіна-Шуйскага* (першая чвэрць XVII ст.), намаляваныя тэмперай на дошцы, з захаваннем пераважна іканапісных прыёмаў, – гэта, імаверна, *труменныя* (*намагільныя*) выявы. Вырашальны пералом адбываецца толькі бліжэй да сярэдзіны стагоддзя. Гэта час, калі ў Маскву, а таксама на службу да патрыярха Нікана (на Валдай і ў Новы Іерусалім) трапляе багата рамеснікаў і мастакоў з ВКЛ, дзе з рэалістычным партрэтным мастацтвам былі знаёмыя ўжо больш за сто гадоў. Менавіта тады (1660-я гг.) паўстае псіхалагічна выразны *партрэт патрыярха Нікана*, які паходзіць менавіта з Новага Іерусаліма, – намаляваны ўжо алеем на палатне. Як памятаем, у 1667 г. рамеснікі з Новага Іерусаліма былі накіраваныя ў Маскву, часткова ў Збройную палату. Пры канцы 1670-х (гіпатэтычна) паўстае вельмі стылістычна блізкі, адначасова і псіхалагічны, і парадна-рэпрэзентатыўны, *партрэт цара Аляксея Міхайлавіча*. Заўважым, што атрыбуцыя гэтага твора невядомаму мастаку Збройнай палаты – магчыма, немцу Даніілу Вухтэрсу або Івану Безміну – таксама чыста гіпатэтычнае. З другога боку, вядомы па дакументах Збройнай палаты шляхціч са Смаленска Станіслаў Лапуцкі, жывапісец, двойчы – у 1657 і ў 1661 гг. – пісаў «парсуну» Аляксея Міхайлавіча, а Іван Безмін быў ягоным вучнем. А ў 1686 г. Соф'я Аляксееўна замовіла Багдану Салтанаву (таксама вучню Лапуцкага; разам з Ерафеем Еліным і Лукой Смалянінавым) пасмяротны партрэт брата, цара Фёдара Аляксеевіча для Архангельскага сабора (царскай пахавальні) у крамлі.

У апошнія дзесяцігоддзі XVII – пачатку XVIII ст. цікавасць да рэалістычнага свецкага партрэту, хай яшчэ не дасканалага ў ма-

стацкіх формах, пашыраецца на княска-баярскія колы (Галіцыны, Нарышкіны, Рапніны). Але застаецца бясспрэчным, што засваенне партрэтнага жанру, пачынаючы з узроўню царскай сям'і і патрыярхаў, адбылося ў Масковіі ў трэцяй чвэрці XVII ст. пры беспасярэднім (або апасродкаваным, праз вучняў у Збройнай палаце) удзеле мастакоў з ВКЛ.

Цяжкія наступствы Смутнага часу затрымалі развіццё *фрэскавага жывапісу* ды *іканапісу* ў Масковіі XVII ст. Вядома, што толькі ў 1642–1643 гг. у Маскве былі сабраныя самыя лепшыя жывапісцы для роспісаў крамлёўскага Успенскага сабору (Іван Паісеін, Сідар Осіпаў, Марк Мацвееў, Іван Барысаў). Толькі пасля гэтага працягваюцца роспісы іншых крамлёўскіх сабораў: Рызапалажэння (1644) і Архангельскага (пасля 1652). Больш за тое, XVII ст. звычайна не лічыцца часам росквіту выяўленчага мастацтва. На гэта былі фармальныя прычыны: прадстаўнікі супрацьлеглых рэлігійных плыняў – і патрыярх Нікан, і пратапоп Авакум – аднолькава схіляліся да падтрымкі, хоць і ў крыху розных формах, кансерватыўнага напрамку ў мастацтве царквы. Аж да збэшчвання напісаных «не па грэцкім чыне» абразоў, як гэта рабіў Нікан.

Аднак развіццё выяўленчага мастацтва няўхільна рухалася да паступовага ўвасаблення больш рэалістычнай манеры, знаходзячы нават сваіх тэарэтыкаў. Да апошніх належаў «іканапісец, сценапісец і знаменшчык» Збройнай палаты Іосіф Уладзіміраў. У пасланні (1656–1658) да іншага майстра, Сімана Ушакова, ён заўважае: «Христов или Богородичен образ на стенах и на досках подобно живым пишут, и на листах печатают искусно… и земных царей своих… пишут, и всякие вещи и события в лицах представляют и как живых изображают».

Не дзіва, што ў роспісах Архангельскага сабора, царскай пахавальні, за кошт скарачэння кананічных сюжэтаў пашыраецца тэма трыумфу свецкай ўлады, уводзяцца вобразы вялікіх князёў і цароў (мастакі Збройнай палаты Якаў Казанец і Сцяпан Разанец, пасля 1652). У роспісах Праабражэнскага сабора ў Суздалі (1689) зямная ўлада ўвогуле сакралізуецца: царам Міхаілу Фёдаравічу і Аляксею Міхайлавічу мастакі дадаюць німбы.

У выяўленчым мастацтве разгляданага часу, як манументальным,



*Сіман Ушакоў.*
Спас Нерукатворны

так і станковым, паступова ўзмацняюцца рэалістычна-аб'ёмнае адлюстраванне твараў, увага да побытавых дэталяў і прыгажосці краявіду. Апошняе праявілася ў творах Строганаўскай школы, якая складаецца з канца XVI ст. пад патранатам заможных купцоў і прамыслоўцаў Строганавых. Найлепшыя ўзоры строганаўскага жывапісу створаны кіраўніком іканапісцаў Збройнай палаты (з 1664) Сіманам Ушаковым, выхадцам з маскоўскіх пасадскіх людзей. Знаходзячыся ў фаворы ў Аляксея Міхайлавіча і пераемнікаў, нават уведзены ў дваранства, Ушакоў мог дазволіць сабе, не адкідаючы іканапісных узораў, уважліва прыглядацца да новай, «фражскай» манеры, арыентаванай на заходнееўрапейскае мастацтва. У яго праграмным «Спасе Нерукатворным» перададзены класічна правільны твар, аб'ёмнасць, фактура тканіны, дзе адбіта аблічча Хрыста.

Іншая важная работа Ушакова – «Маці Божая Уладзімірская – Дрэва дзяржавы Расійскай» – гэта фактычна першае маскоўскае генеалагічнае дрэва. Вакол вобраза Багародзіцы змешчаныя медальёны з маскоўскімі князямі і царамі на галінках дрэва, якое ўнізе, побач з адлюстраваннем Успенскага сабора, паліваюць Іван Каліта і мітрапаліт Пётр. Выявы цароў пададзеныя максімальна партрэтна. Вобразы анёлаў у «Старазапаветнай тройцы» Ушакова, у адрозненне ад Рублёва, перададзеныя максімальна матэрыяльна і адчувальна, з мноствам дадатковых рэалістычных дэталяў.

Ушакоў пакінуў па сабе вялікую школу сваіх вучняў (Рыгор Зіноўеў, Ціхан Філацьеў, Мікіта Паўлавец, Фёдар Зубаў), якія мелі вырашальны ўплыў на развіццё маскоўскага жывапісу канца XVII ст.

Яшчэ адным «строганаўцам» лічыцца кастраміч Гурый Нікіцін, іканапісец і манументаліст, які акрамя Кастрамы працаваў у Маскве, Пераяславе-Залескім, Растове. Найбольш адметны яго манументальны

цыкл – *фрэскі царквы Іллі Прарока* ў Яраслаўлі (1680-я гг., кампазіцыя «Жніво»). У гэтым цыкле выкарыстаныя сюжэты цудаў Хрыста, дзеяў апосталаў і жыццій пракаў Іллі і Елісея. У больш складаных кампазіцыях мастак звяртаецца да гравюр галандскага выдання ілюстраванай Біблії Піскатара XVII ст., што дазваляе яму ствараць цікавыя сюжэты на побытавыя тэмы («Жніво»). Тамсама ў Яраслаўлі, рамесна-купецкае асяроддзе якога, як мы ўжо заўважылі на прыкладзе архітэктуры, падтрымлівала рэалістычныя, «жывыя» тэндэнцыі ў царкоўным мастацтве, у 1690-х гг. іншы майстар, Дзмітрый Грыгор'еў, стварыў *фрэскі царквы Іаана Прадцечы*, дзе вернікі ўпершыню ў маскоўскім рэлігійным жывапісе ўбачылі нават любоўныя тэмы біблейскай гісторыі – аголеную Вірсавію, Саламею ў танцы.




Іканастас Смаленскага сабора маскоўскага Навадзявочага манастыра (майстры Клім Міхайлаў ды іншыя)

Само пранікненне заходняй культуры (праз замежных мастакоў, гравюры ілюстраваных выданняў, кантакты) у Масковію ў XVII ст. з'явілася вынікам росту свецкай культуры і рыхтавала надыход новай эпохі ў наступным стагоддзі.

Нельга тут не згадаць беларускіх рамеснікаў, што трапілі ў Масковію палоннымі падчас вайны 1648–1667 гг. Вельмі таленавітыя працы належалі майстрам *дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва* (Клім Міхайлаў, Герасім Акулаў, Сцяпан Зіноўеў, Давыдка Паўлаў ды іншыя). Працы беларускіх майстроў актыўна выкарыстоўваліся пры аздабленні Навадзявочага (разьбяны іканастас Смаленскага сабора, майстэрня Кліма Міхайлава), Данскога, Ізмайлаўскага, Новаіерусалімскага (на Істры), Іверскага (на Валдаі) манастыроў, крамлёўскіх палат і г. д.

Узнікненне кнігадрукавання ў Масковіі дало штуршок развіццю

*кніжнай графікі*, дзе вылучыліся майстры Іван Максімаў, Дзмітрый Львоў, Макарый Міцін-Патапаў, Мацвей Андрэеў.

Шэдэўрамі мастацтва сёння лічацца ізразцы (кафлі) беларуса Сцяпана Палубеса з *Успенскага сабора Іосіфа-Волацкага манастыра*, званіцы Пафнуцева-Бораўскага манастыра, храма Успення ў Ганчарах, царквы св. Тройцы ў Хахлоўскім завулку.

Сусветна вядомы цяпер цэнтр народных промыслаў пачаў фарміравацца ў XVII ст. у сяле *Хахламе*, што на Ніжагародчыне.

Адметным відам тагачаснага рэлігійнага *музычнага мастацтва* было *гранне на званах*, якое існавала ў формах простага звону, packзвону, трызвону і г. д. Самыя знакамітыя званы цэркваў Усходняй Русі мелі свае найменні: Цар-звон у Маскоўскім крамлі, «Сысой», «Лебедзь», «Баран» у Растоўскім крамлі і іншыя.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Абсалютызм*** – нічым не абмежаваная манархічная ўлада. У Маскоўскай дзяржаве канчаткова склалася пры канцы XVII ст.

***Аркбутан*** – тэрмін з архітэктуры; азначае вонкавую мураваную паўарку.

***Атаман*** – найвышэйшы начальнік казацкага войска.

***Гарадавыя ваяводы*** – асобы, звычайна з адстаўных служылых людзей, якія ў XVII і XVIII стст. (да 1745) загадвалі ў гарадах і ўездах (паветах) вайсковымі, паліцэйскімі, судовымі, адміністрацыйнымі, фінансавымі памеснымі справамі.

***Астрог*** – пункт размяшчэння вайсковых атрадаў, умацаваных драўлянай агароджай.

***Васьмярык, чацвярык*** – тэрміны архітэктуры, азначаюць васьмі- або чатырохгранную (васьмі- ці чатырохвугольную) у плане пабудову.

***Казакі*** – вайсковае саслоўе ў Маскоўскай дзяржаве, да якога належала насельніцтва некаторых рэгіёнаў і якое мела асаблівыя правы, ільготы і перавагі ўзамен за сваю абавязковую вайсковую службу.

***Інтэрвенцыя*** – гвалтоўнае ўзброенае ўмяшальніцтва адной або некалькіх дзяржаў у справы іншай.

***Лаўра*** – назва вялікага мужчынскага праваслаўнага манастыра, падпарадкаванага непасрэдна патрыярху.

***Меркантылізм*** – гаспадарчая палітыка, скіраваная на першачарговае развіццё айчыннай прамысловасці і гандлю.

***Памеснае права*** – пераважнае права маскоўскага вайскова-служылага дваранства валодаць дзяржаўнымі землямі з сялянствам, што на іх сядзіць.

***Перапісныя кнігі*** – зводныя дакументы падворных перапісаў мужчынскага насельніцтва цяглых падатных двароў з указаннем узросту і сваяцкіх адносінаў.

***Пяцінныя грошы*** – надзвычайны падатак, які спачатку спаганяўся з маёмасці свецкіх і царкоўных землеўласнікаў, пазней з сялян – у памеры пятай часткі іх гадавога прыбытку.

***Раскол (царкоўны)*** – рэлігійна-грамадскі рух у Масковіі, які ўзнік у сярэдзіне XVII ст. і прывёў да падзелу маскоўскай праваслаўнай царквы і ўзнікнення стараабрадніцтва.

***Рэгент*** – асоба, якая ажыццяўляе паўнамоцтвы кіраўніка манархічнай дзяржавы падчас малалецтва або недзеяздольнасці законнага манарха.

***Саборнае Улажэнне*** – звод законаў Маскоўскай дзяржавы, прыняты Земскім саборам у 1648–1649 гг.

***«Слова і справа гасударава»*** – сістэма палітычнага вышуку ў Маскоўскай дзяржаве. Кожны царскі падданы павінен быў пад страхам смерці даносіць пра вядомыя яму змовы супраць цара і членаў яго сям'і, зневажанне яго тытула, падазрэнне ў дзяржаўнай здрадзе.

***«Стаўбавыя дваране»*** – патомныя дваране знатных родаў, якія былі ўпісаныя ў адмысловыя рэестры («стаўбцы»).

***Сямібаяршчына*** – сярод іншага назва маскоўскага ўрада, створанага ў ліпені 1610 г. пасля звяржэння з трона Васілія Шуйскага.

***Тэтраконх*** – тэрмін архітэктуры, азначае храм, які ў плане нагадвае чатыры пялёсткі.

***Урочныя леты*** – уведзеныя ў 1597 г. летнія тэрміны, падчас якіх землеўласнікі маглі ўзбудзіць зыск аб вяртанні ім сялян-уцекачоў.

***Цанічнікі*** – майстры шматколернай рэльефнай кафлі, пакрытай эмаллю («цынай»); ужывалася для аздаблення інтэр'ераў і фасадаў будынкаў.

***Царкоўныя сяляне*** – сяляне, якія належалі праваслаўным царкоўным землеўласнікам і ўстановам.

***Чалабітная*** – прашэнне, скарга, заява.

***Ям*** – паселішча на паштовым шляху.

***Ярыжкі*** – размоўная назва бедных людзей, якія займаліся цяжкай фізічнай працай (грузчыкі і да т. п.).

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА


Буганов, В. И. Мир истории. Россия в XVII столетии. Москва: Молодая гвардия, 1989. 318 с.

Всеобщая история России с древнейших времён до конца XVIII в. / под ред. проф. О. А. Яновского. Москва: Эксмо, 2008. 592 с.

Геллер, М. История Российской империи: в 3 т. Москва: МИК, 1997. Т. I. С. 262–416.

Горсей, Дж. Записки о России XVI – начала XVII в. / пер. с англ. Москва: Изд-во МГУ, 1990. 288 с.

Грушевский, Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. С. 240–378.

Грыцкевіч, А. 1612 год у гісторыі Расіі… і яго тлумачэнне расійскімі палітыкамі і гісторыкамі // А. Грыцкевіч. Выбранае. Мінск: Кнігазбор, 2012. С. 537–551.

История русского искусства: в 13 т. / под ред. И. Э. Грабаря, В. Н. Лазарева, В. С. Кеменова. Т. 4. Москва: Изд-во АН СССР, 1959. 697 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мінск: Беларусь, 2010. С. 143–148.

Любимов, Л. Д. Искусство Древней Руси: кн. для чтения. Москва: Просвещение, 1974. С. 295–336.

Платонов, С. Ф. Смутное время. Очерки истории внутреннего кризиса и общественной борьбы в Московском государстве в XVI–XVII вв. С.-Петербург, 1910. 648 с.

Поссевино, А. Исторические сочинения о России XVII в. / пер. с лат. Москва: Изд-во МГУ, 1983. 272 с.

Творогов, О. В. Литература Древней Руси. Москва: Просвещение, 1981. С. 106–124.

Andrusiewicz, A. Dzieje Dymitriad: 1602–1614. T. 1: Nadzieje i oczekiwania. Warszawa: Akademia Nauk Społecznych. Wyd-wo Naukowe, 1990. 335 s.

Andrusiewicz, A. Dzieje Dymitriad: 1602–1614. T. 2: Na rozdrożu dziejów. Warszawa: Akademia Nauk Społecznych. Wyd-wo Naukowe, 1990. 367 s.

# 8. РАСІЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ Ў XVIII СТ.

***8.1. Рэформы Пятра I і іх вытокі.*** У XVI–XVII стст. Маскоўская дзяржава ў Заходняй Еўропе разглядалася як варварская перыферыя еўрапейскай прасторы. Пасля таго як яна страціла выхад да Чорнага і Балтыйскага мораў, яе перасталі лічыць за сур'ёзнага канкурэнта і ўспрымалі толькі як краіну, якая пастаўляе на еўрапейскія рынкі хлеб і футра каштоўных звяроў, асабліва собаля. У Масковіі ж да каталіцкіх і пратэстанцкіх краін ставіліся варожа.

У краіне існавала ксенафобія, непавага да замежных звычак, вопраткі, стылю жыцця. Звычайны жыхар Маскоўскай дзяржавы лічыў сябе адзіна правільным хрысціянінам, а ўсіх, хто жыве за мяжою, – нехрысцямі, басурманамі. Аднак пры канцы XVII ст. сітуацыя пакрысе пачала мяняцца. Так, фаварыт царэўны Соф'і Васілій Галіцын прапаноўваў змяніць стаўленне да сялян, надзяліць іх зямлёй і спаганяць з іх падатак у дзяржаўны скарб. Гэтыя грошы планавалася перадаваць на аплату дваранам за дзяржаўную службу. Аднак без марскога гандлю эканамічныя рэформы ў Масковіі былі немагчымыя. Чорнае мора было пад кантролем Турцыі, а Балтыйскае – Швецыі.

Пётр I пачаў з поўдня. У 1696 г. яго войскі, падмацаваныя створаным царом флотам, у выніку двух паходаў захапілі турэцкую крэпасць Азоў. Будаўніцтва флота стала агульнадзяржаўнай справай. Землеўласнікі (дваране) мусілі з разліку 10 тыс. сялянскіх двароў пабудаваць адзін баявы карабель. Квота для царкоўнікаў была 8 тыс. сялянскіх двароў за карабель, а ўсе гараджане Масковіі (пасадскія людзі) будавалі 12 баявых караблёў. На новы флот (да 50 караблёў) было патрэбна паўмільёна рублёў, у той час як гадавы даход краіны складаў 2 млн рублёў. Таксама цар у 1697 г. загадаў вучыць марской справе 50 чалавек таленавітай дваранскай моладзі.

Задумай Пятра было стварыць супраць Турцыі вайсковы саюз усіх хрысціянскіх дзяржаў Еўропы. З гэтай мэтай увесну 1697 г. за мяжу



*Б. Чорыкаў.*
Пётр I сярод галандскіх майстроў

паехала вялікае пасольства разам з царом. Але цар там быў замаскіраваны пад урадніка Праабражэнскага палка Пятра Міхайлава. Пасольства было за мяжой паўтара года. За гэты час Пётр прывык да еўрапейскага ладу жыцця і ўспрыняў яго вонкавыя прыкметы.

Цар напачатку пабываў у Курляндыі і Прусіі, а потым у Галандыі, дзе працаваў на верфі як просты цясляр, жыў у маленькім дамку і апранаўся як рабочы. Пасля ён паехаў у Англію, вывучаў ліцейную справу, наведваў фабрыкі і музеі. Нарэшце яго пасольства апынулася ў Вене. Аднак там пасля перамоваў з германскім імператарам стала канчаткова зразумела, што ніхто з Турцыяй у сапраўднасці ваяваць не хоча, і трэба вяртацца на радзіму. Па дарозе цар заехаў да курфюрста Саксоніі, які нядаўна быў абраны каралём Рэчы Паспалітай, Аўгуста і пасябраваў з ім. Падчас сяброўскіх размоў упершыню ўзнікла думка пра вайну са Швецыяй.

У гэты час у дзяржаве пачаліся хваляванні стральцоў. У жніўні 1698 г. цар прыехаў у Маскву. І адразу пачаліся вялікія змены. Сваю жонку Еўдакію Пётр выправіў у манастыр, а сына Аляксея перадаў на выхаванне сваёй сястры Наталлі. Пачаліся расправы са стральцамі, якіх некалі падтрымлівала царэўна Соф'я. Пётр загадаў адправіць яе ў манастыр, а стралецкае войска ліквідаваць. Падчас ліквідацыі каля дзвюх тысяч стральцоў у розных раёнах Масквы пакаралі смерцю.

Адначасова ў краіне пачаліся рэформы з мэтай надаць ёй вонкава еўрапейскі выгляд. Асноўныя змены адбыліся ў сістэме кіравання, ва ўзброеных сілах, у фінансах, падатках і дачыненнях з праваслаўнай царквой. Таксама было загадана ўсім дваранам і службовым людзям згаліць бароды і насіць еўрапейскую вопратку. Дазвалялася курыць

тытунь і піць каву. Але сялян і духавенства гэтыя змены не закранулі. З 1 студзеня 1700 г. у Масковіі ўводзіўся новы каляндар. Гады пачалі лічыць не ад стварэння свету, а ад Раства Хрыстовага, як у Еўропе. Пачатак года цяпер прыпадаў не на 1 верасня, а на 1 студзеня. З'явілася першая газета, увялі грамадзянскі алфавіт, стварылі органы самакіравання (*ратушу* ў Маскве, *земскія ізбы* ў іншых гарадах).

У 1699 г. адбыўся першы *рэкруцкі набор* у войска: кожныя 20 сялянскіх двароў накіроўвалі аднаго салдата на пажыццёвую вайсковую службу. Так узнікла прафесійнае войска.

У часы Пятра ў Масковіі жыло каля 7 млн чалавек, з іх каля 30 тыс. дваран (разам з сем'ямі). Становішча апошніх цар узмацніў. Кожны дваранін з 15 гадоў павінен быў знаходзіцца на дзяржаўнай службе. Каб гэтая служба была прывабнай, у 1722 г. увялі «Табелі аб рангах»: кожны дваранін (мешчанін) пачынаў службу з самага малога 14-га рангу (класа) і потым меў магчымасць падымацца па кар'ернай лесвіцы. Вайсковую службу дваране пачыналі шараговымі салдатамі ў элітных Праабражэнскім ці Сямёнаўскім палку.

Усе дваране павінны былі абавязкова вучыцца ў школах, а здольныя пасылаліся на вучобу за мяжу. Дваранін, які не меў дыплома аб заканчэнні школы, не меў права на шлюб. Пры канцы ўладарання Пятра ў Расіі існавалі школы (іх называлі *цыфіркамі*) у 42 гарадах, дзе вучыліся 2 тыс. чалавек. Прычым палову з іх складалі зусім не дваране, а дзеці святароў ды гараджан. Мяшчане, якія паступалі на вайсковую ці грамадзянскую службу, маглі за добрую працу атрымаць дваранства, калі дасягнулі пэўнай пасады і атрымалі ордэн. Розніца паміж баярамі і дваранамі была ліквідавана. Памесці прыраўнялі да вотчын, іх ужо можна было перадаваць у спадчыну. У 1714 г. з'явіўся ўказ, паводле якога спадчыну мог атрымаць толькі адзін з сыноў. Астатнія ішлі на дзяржаўную службу. Раз на 10 гадоў праводзілі перапісы (*рэвізіі*) насельніцтва, якое абкладалася *падушным падаткам*. З кожнай мужчынскай душы – селяніна ці пасадскага чалавека – незалежна ад яго ўзросту бралі грашовы падатак.

Пётр I фактычна прыватызаваў праваслаўную царкву. Трэба сказаць, што стараверы выступалі супраць цара і лічылі яго антыхрыстам. Прыхільнікі Нікана таксама яго не любілі і групаваліся вакол патрыярха Андрыяна (1690–1700).

Калі Андрыян неўзабаве памёр, цар загадаў новага патрыярха не выбіраць і прызначыў часова кіраваць царквой разанскага мітрапаліта. У 1721 г. адбылася *царкоўная рэформа*, у выніку якой расійская праваслаўная царква страціла аўтаномію і стала часткай дзяржаўнага механізму. Пасаду патрыярха ліквідавалі, царквой пачала кіраваць духоўная калегія (*сінод*) на чале з прэзідэнтам. Царкоўныя сяляне ў 1701 г. разам з вотчынамі былі забраныя з манастыроў; іх абклалі падаткамі, якія ішлі ў дзяржаўную казну. Таксама яны мусілі паставіць рэкрутаў у войска. У 1724 г. цар выдаў указ аб манахах, забараніўшы ім пераходзіць з манастыра ў манастыр. Быў зацверджаны штат царкоўных служак. Пасля смерці святара на яго месца станавіўся старэйшы сын, які да гэтага быў дыяканам пры бацьку. Малодшыя сыны былі дзячкамі і панамарамі. Святары мусілі служыць цару, ухваляць яго рэформы і ўказы, дапамагаць выяўляць ворагаў улады. Супраць старавераў пачаліся рэпрэсіі: яны ўцякалі ў Сібір і за мяжу, найчасцей на тэрыторыю ВКЛ.

У часы кіравання Пятра колькасць *мануфактур* дасягнула 200, прычым існавалі як дзяржаўныя, так і прыватныя прадпрыемствы. Аднак у адрозненне ад заходніх краін, дзе ў прамысловасці існавалі наёмныя працы, у Масковіі працавалі або прыгонныя сяляне, або іншыя катэгорыі насельніцтва, таксама пад прымусам.



*Б. Чорыкаў.*
Пётр І на будаўніцтве Пецярбурга

Таксама ў значнай ступені была абмежавана дзейнасць купцоў. Гандаль таварамі, якія давалі добры прыбытак (у першую чаргу – алкаголь і тытунь), рабіўся дзяржаўнай манаполіяй, і прыбытак ішоў у дзяржаўны скарб.

У краіне быў створаны *ваенна-прамысловы комплекс*: ён патрабаваў значных выдаткаў, і людзі моцна беднелі.

У 1703 г. на рацэ Няве і берагах Фінскага заліва Пётр І заснаваў новую сталіцу дзяржавы *Санкт-Пецярбург*, дзе ў 1704 г. заклалі Адміралцейства і дзе паводле стану на 1721 г. працавала 5300 рабочых розных прафесій.

З 1707 па 1725 г. у сталіцы пабудавалі 59 вялікіх караблёў і 203 малыя. Такім чынам узнік балтыйскі флот. Санкт-Пецярбург зрабіўся найважнейшым гандлёвым портам дзяржавы (замест Архангельска).

У Масковіі існавала вялікае войска. Гэта былі рэгулярная армія (палявая і гарнізонная – каля 200 тыс. чалавек), нерэгулярнае войска (данскія і запарожскія казакі – 75 тыс. чалавек) і флот (28 тыс. чалавек). Пётр І цалкам памяняў сістэму дзяржаўнага кіравання. Да яго дзейнічала Баярская дума, якая кіравала прыказамі. Усіх прыказаў было каля 40, там працавалі чыноўнікі баяры і дзякі (сакратары). Прыказы таксама кіравалі гарадамі з іх паветамі (уездамі). Гарадамі і паветамі кіравалі ваяводы, або *губныя старасты*. Замест Баярскай думы ў 1711 г. Пётр стварыў урадавы Сенат, куды прызначаў сваіх людзей. Дзеля кантролю за дзейнасцю Сената ў 1722 г. утварылі асобную пракуратуру на чале з *генерал-пракурорам*.

Існавала і таемная служба кантролю за дзейнасцю чыноўнікаў, дзе працавалі *фіскалы*: яны пісалі даносы на тых, хто злоўжываў службовым становішчам. Замест прыказаў у 1718 г. утварылі 12 калегій. Галоўнымі сярод іх былі: вайсковая, Адміралцейская і замежных спраў. Калегіі працавалі калектыўна ў так званых *прысутнасцях* (присутствиях), што складаліся з прэзідэнта, віцэ-прэзідэнта, калежскіх саветнікаў і асесараў. У 1708 г. былі створаны *губерні* на чале з *губернатарам* або *генерал-губернатарам*. Губерні складаліся з правінцый і паветаў. Губернатары падпарадкоўваліся непасрэдна Сенату. Таксама цар загадаў біць новыя манеты – рублі і *палціны* (паўрублёўкі).

Пётр І увесь час вёў малыя і вялікія войны са сваімі суседзямі. Пасля захопу Азова разам з Даніяй і Саксоніяй ён распачаў Паўночную вайну супраць Швецыі. У 1700 г. ён падпісаў мір з Турцыяй, якая пагадзілася саступіць яму Азоў, потым накіраваў сваю армію да Фінскага заліва і абкружыў шведскую крэпасць Нарву. Шведскі кароль Карл XII тут жа разбіў войскі Даніі і змусіў яе да міру. Потым Карл хутка прывёў свае войскі да Нарвы і нечакана напаў

на маскоўскі лагер каля горада. 19 лістапада 1700 г. войскі Пятра разбегліся, і Карл захапіў увесь лагер ды ўсе гарматы праціўніка. Аднак шведы не пайшлі ў Масковію, а накіраваліся ваяваць з Саксоніяй, прычым у вайну была ўцягнутая і Рэч Паспалітая. Ваенныя дзеянні цягам некалькіх гадоў адбываліся на тэрыторыі ВКЛ, пры гэтым галоўным ваенным тэатрам стала Беларусь.

Пётр за зіму 1700–1701 гг. сабраў новае войска і зрабіў 300 новых гармат, прычым для іх вырабу загадаў зняць медныя званы з цэркваў Масковіі. Вайна адначасова ішла на тэрыторыі Прыбалтыкі і Рэчы Паспалітай. Войскі Пятра спачатку захапілі гарады Ям і Капор'е, потым крэпасць Нотэбург у вусці ракі Нявы – там, дзе некалі быў наўгародскі горад Арэшак. На гэтым месцы была закладзена новая крэпасць Шлісельбург. У траўні 1703 г. на рацэ Няве Пётр пабудаваў вялікую Петрапаўлаўскую крэпасць, а пад яе мурамі – новы горад Санкт-Пецярбург.

У гэты самы час на востраве Котліне была пабудавана марская крэпасць Краншлот (будучы Кранштат). У 1704 г. войскі Пятра захапілі горад Дэрпт (Юр'еў) і Нарву. Такім чынам, пакуль Карл XII ваяваў з Саксоніяй і Рэччу Паспалітай, а таксама з маскоўскімі войскамі на яе тэрыторыі, Пётр I атрымаў выхад да Балтыйскага мора.

У 1707 г. шведы прымусілі капітуляваць Саксонію, і Аўгуст перастаў быць каралём Рэчы Паспалітай. Карл XII вырашыў ісці цераз Беларусь на Масковію. Маскоўскія войскі паводзілі сябе на беларускай тэрыторыі, як і шведы: фактычна былі акупантамі, рабавалі і забівалі мірнае насельніцтва. Так, паводле загаду Пятра, у яго прысутнасці былі пасечаныя шаблямі ўніяцкія святары ў Полацкай Сафіі, а сам храм спачатку пераўтварылі ў склад пораху, а потым адбыўся выбух, пасля чаго большая частка сабора была разбурана. На загад Пятра быў спалены самы багаты горад Беларусі Магілёў.

Пакуль ішла вайна, на тэрыторыі Масковіі пачаліся паўстанні. У 1705 г. адбыўся бунт у Астрахані, тады ж паўсталі башкіры, якія змагаліся з маскоўскімі ваяводамі аж да 1709 г. Адначасова збунтаваліся данскія казакі на чале з Кандратам Булавіным. У 1708 г. паўстанне было жорстка задушана, а данскія казакі страцілі сваю аўтаномію. Неспакойна было і ва Украіне, дзе гетман Іван Мазепа вырашыў перайсці на бок Карла XII.

На пачатку 1708 г. Карл XII выбіў маскоўскія войскі з Гродна і пайшоў на Маскву, маючы 90-тысячнае войска. З Ліфляндыі яму на дапамогу рушыў корпус генерала Адама Людвіга Левенгаўпта, які меў 16 тыс. салдат і вайсковыя прыпасы. Шведы разбілі маскоўскае войска каля вёскі Галоўчын і перайшлі Дняпро каля Магілёва. Спачатку яны збіраліся ісці на Смаленск, дайшлі да Мсціслава, але потым павярнулі на поўдзень, каб аб'яднацца з гетманам Мазепам. У гэты час каля вёскі Лясной на Сожы Пётр I нечакана напаў на корпус Левенгаўпта, разбіў яго і захапіў увесь абоз.

Ва Украіне маскоўскія войскі захапілі новую сталіцу гетманскай Украіны горад Батурын, а Мазепа з невялікім вайсковым атрадам далучыўся да Карла XII. Увесну 1709 г. шведы вырашылі захапіць горад Палтаву, але не здолелі гэта зрабіць – не хапіла запасаў пораху.

Тады Пётр вырашыў даць шведам генеральную бітву, якая адбылася тамсама, пад Палтавай, 27 чэрвеня 1709 г. У шведаў было каля 30 тыс. чалавек і толькі 4 гарматы, а іх праціўнікі мелі 42 тыс. салдат. Шведы былі цалкам разбітыя, Карл XII і Мазепа здолелі ўцячы ў Турцыю. У 1710 г. маскоўскія войскі захапілі Рыгу, Рэвель (Талін) і Выбарг.

Аднак пры канцы 1710 г. Карл XII намовіў Асманскую імперыю пачаць вайну з Масковіяй. Пётр I з вялікім войскам (40 тыс. чалавек) увесну 1711 г. пайшоў праз стэпы Малдавіі да Дуная. Вялікае турэцкае войска (200 тыс. чалавек) атачыла войскі Пятра I каля ракі Прут. Паражэнне і палон былі амаль непазбежныя, але туркі неча-



*Б. Чорыкаў.*
Пётр I прымае тытул імператара Усерасійскага

кана прапанавалі мір. Пётр вярнуў Турцыі Азоў і падпісаў мірную дамову. Вайна са Швецыяй прадоўжылася.

Маскоўская армія захапіла амаль усю Фінляндыю, а ў 1714 г. – Аланскія астравы (пры гэтым быў разбіты шведскі флот). У 1721 г. Швецыя падпісала мірную дамову ў горадзе *Ніштаце* (Фінляндыя). У выніку Масковія атрымала Ліфляндыю разам з Рыгай, Эстляндыю (з Рэвелем і Нарвай) і частку Карэліі (з Выбаргам). Пётр прыняў тытул Усерасійскага імператара і назваў сваю краіну *Расійскай імперыяй*. Сенат надаў яму тытулы «Вялікі» і «бацька айчыны».

Сын Пятра I Аляксей, па сутнасці, гадаваўся без бацькі і не любіў яго. Пётр прымусіў сына ўзяць шлюб з браўншвейгска-вольфенбютэльскай прынцэсай Шарлотай Крысцінай Сафіяй, якая нарадзіла цару ўнука Пятра.

Аляксей уцёк за мяжу і папрасіў палітычнага прытулку ў германскага імператара. Аднак яго намовілі вярнуцца ў Расію, а там пасадзілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць, дзе ён і памёр у 1718 г.

З 1712 г. Пётр пачаў жыць у неафіцыйным шлюбе з простай жанчынай Кацярынай Скаўронскай, якая паходзіла з беларускалатвійскага памежжа, а падчас Паўночнай вайны стала жонкай шведскага вайскоўца і трапіла ў расійскі палон. Спачатку яна жыла з пратэжэ Пятра князем Аляксандрам Меншыкавым, а потым цар забраў яе да сябе. У 1724 г. ён каранаваў яе і даў тытул імператрыцы. У іх былі дзве дачкі – Ганна і Лізавета. Гадаваў Пётр I і дзвюх сваіх пляменніц (дачок брата цара Івана), Ганну і Кацярыну. Ганну выдалі замуж за герцага Курляндскага Фрыдрыха Вільгельма. У 1722 г. Пётр выдаў закон аб перадачы царскай улады, згодна з якім ён мог перадаць уладу любому спадчынніку.

Скончыўшы Паўночную вайну, Пётр пачаў вайну з Персіяй. У 1722 г. ён захапіў гарады Дэрбент і Баку. У 1723 г. Персія падпісала мір і аддала Расіі заходні бераг Каспійскага мора. Увосень 1724 г. Пётр захварэў і 28 студзеня 1725 г. памёр.

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі стаўленне да ўладарання Пятра I рознае. Адны лічаць яго рэфарматарам, які ажыццявіў мадэрнізацыю краіны на еўрапейскіх пачатках (вестэрнізаваў Расію), і называюць Вялікім. Крытыкі лічаць, што сапраўднага еўрапейскага досведу Пётр да ўвагі не ўзяў: напрыклад, парламент не быў ство-

раны, а прыватны бізнэс цалкам залежаў ад дзяржавы. У выніку ўзнікла паліцэйская дэспатычная дзяржава, дзе ўсе жыхары былі толькі слугамі і халопамі цара.

Так ці іначай, Расія стала вядучай еўрапейскай краінай, якой пачалі баяцца. Узнікла думка аб прыроднай агрэсіўнасці расійцаў ды іх кіраўнікоў, якія не спыняцца, аж пакуль не захопяць усю Еўропу.

***8.2. Эпоха палацавых пераваротаў (1725–1762)***. Пасля смерці Пятра І на ўладу ў краіне пачалі прэтэндаваць яго шматлікія сваякі, у першую чаргу – па жаночай лініі. Іх прадстаўнікі захаплівалі ўладу з дапамогай войска, а дакладней гвардзейскіх палкоў, дзе служылі толькі дваране. Паколькі ўлада была нетрывалай, групоўка каля ўлады атрымлівала мянушку дачаснікі (временщики).

Першымі ўладу захапіла групоўка Аляксандра Меншыкава, якая з дапамогай войска абвясціла імператрыцай жонку Пятра Кацярыну. Супраць іх выступіў князь Дзмітрый Галіцын, які вельмі шкадаваў з тае нагоды, што цар ліквідаваў Баярскую думу. Паводле яго прапановы ў 1726 г. быў створаны ўрад з шасці чалавек, які атрымаў назву «Вярхоўны таемны савет». Гэтай структуры падпарадкавалі Сенат і сінод.

На прапанову Меншыкава Кацярына І прызначыла сваім пераемнікам 12-гадовага ўнука Пятра І, сына царэвіча Аляксея і нямецкай прынцэсы Пятра ІІ. Неўзабаве, у 1727 г., яна памерла. У давер да Пятра ІІ увайшлі князі Далгарукія, якія здолелі адхіліць ад улады Меншыкава і выслалі яго ў Сібір, дзе ён і памёр.



*Б. Чорыкаў.*
Імператар Пётр ІІ адпраўляецца на ловы

Часовы ўрад разам з Пятром II пераехаў у Маскву, аднак у 1730 г. малады цар раптоўна захварэў на воспу і памёр.

Сябры ўрада на чале з канцлерам графам Гаўрылам Галоўкіным і князем Дзмітрыем Галіцыным вырашылі зрабіць імператрыцай пляменніцу Пятра I – дачку яго брата Івана, курляндскую герцагіню Ганну. Яны прапанавалі ёй падпісаць сакрэтную дамову аб тым, што яна не будзе выходзіць замуж, прызначыць сабе спадчынніка, а ўсю ўладу, у тым ліку над войскам, перадасць таемнаму савету. Ганна Іванаўна гэтыя ўмовы (кандыцыі) падпісала і прыехала ў Маскву, дзе ўжо сабраліся дваране і гвардыя. Дваране даведаліся пра кандыцыі і выказалі свой пратэст супраць іх. Дачакаўшыся прыезду Ганны 25 лютага 1730 г., яны прыйшлі да яе ў палац і запатрабавалі адмовіцца ад кандыцый, распусціць таемны савет і вярнуць правы Сенату. Ганна з гэтым пагадзілася і ліквідавала Вярхоўны таемны савет. Яна запрасіла сабе на дапамогу з Курляндыі нямецкіх чыноўнікаў на чале з Эрнстам Ёганам Біронам, які стаў яе фаварытам. Немцы занялі ўсе дзяржаўныя пасады, у тым ліку ў арміі. Каб умацаваць сваю ўладу, Ганна загадала стварыць два новыя гвардзейскія палкі, Конны і Ізмайлаўскі. У 1731 г. яна ўтварыла пры сабе кабінет з трох міністраў на чале з Біронам.



*Б. Чорыкаў*. Імператрыца Ганна Іванаўна і Бірон

Пасля таго як у 1711 г. памёр муж Ганны Іванаўны, герцаг Курляндыі (васал Рэчы Паспалітай), расійскі ўрад запатрабаваў ад Курляндыі плаціць штогод па 40 тыс. рублёў на ўтрыманне Ганны, будучай імператрыцы Расіі.

У 1726 г. ландтаг (парламент) Курляндыі выбраў герцагам Морыца Саксонскага, пазашлюбнага сына караля Рэчы Паспалітай Аўгуста II Моцнага. Аднак у верасні 1727 г. у Курляндыю ўвайшлі расійскія войскі і прызначылі герцагам

Фердынанда, дзядзьку мужа імператрыцы Ганны. У 1737 г. герцагам абралі згаданага графа Бірона, які ўжо сем гадоў жыў пры двары Ганны Іванаўны і быў фактычным рэгентам Расіі.

У расійскай гісторыі і літаратуры існуе тэрмін «біронаўшчына» – як напамін пра час, калі некаранаваны муж Ганны Іванаўны практычна кіраваў Расіяй. Шмат якія расійскія гісторыкі вельмі не любяць гэты перыяд і лічаць яго перыядам стагнацыі і ўпадку. Але менавіта пры Біроне да 25 гадоў абмежавалі тэрмін вайсковай і адміністрацыйнай службы, у 1731 г. заснавалі кабінет міністраў, а ў 1734 г. падпісалі гандлёвую дамову з Брытаніяй. Апроч таго, расійскія войскі здолелі забраць у туркаў горад Азоў.

У 1740 г. Ганна Іванаўна памерла, але паспела пакінуць сталец сыну сваёй пляменніцы Ганны Леапольдаўны Ёгану Антонавічу, які толькі паспеў нарадзіцца. Рэгентам пры ім стаў Бірон. Аднак гвардзейцы выступілі супраць – спачатку арыштавалі і выслалі Бірона, а потым адхілілі ад улады Ганну Леапольдаўну і яе сына.

Гвардыя прапанавала імператарскі трон дачцэ Пятра I і Кацярыны I Лізавеце, якая і атрымала ўладу. 25 лістапада 1741 г. Лізавета I ліквідавала кабінет і перадала кіраванне краінай Сенату, куды прызначыла сваіх давераных асоб.

Фаварытамі імператрыцы сталі графы Разумоўскія – Аляксей і Кірыла. Яны паходзілі з Украіны. Аляксей быў грамадзянскім мужам царыцы, а Кірыл – гетманам Украіны і прэзідэнтам Акадэміі навук. Таксама мелі ўладу і ўплыў браты графы Шувалавы.

Расія прыняла ўдзел у Сямігадовай вайне, якая пачалася ў 1756 г. У 1757 г. расійскія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Усходняй Прусіі



*Б. Чорыкаў.*
Узыходжанне на трон Лізаветы Пятроўны

і разбілі прускія войскі. Яны захапілі гэтыя землі разам з Кёнігсбергам, а потым у 1760 г. акупавалі Берлін і ўзялі з яго кантрыбуцыю. Лізавета I аб'явіла будучым імператарам унука Пятра I па кудзелі Пятра III (да ўзыходжання на расійскі трон – прынца Шлезвіг-Гальштэйна і Готарфа Карла Петэра Ульрыха), які жыў у Гальштыніі (Гальштэйне) і быў там герцагам. У 1742 г. ён прыехаў у Расію і прыняў праваслаўе. У 17 гадоў яго ажанілі з прынцэсай Сафіяй Аўгустай Фрэдэрыкай Ангальт-Цэрбст-Дорнбургскай. Нявесту прывезлі ў Санкт-Пецярбург, ахрысцілі ў праваслаўе і далі новае імя – Кацярына. У 1754 г. яна нарадзіла сына Паўла, якога ў яе забралі і гадавалі асобна пры двары Лізаветы. Пётр III меў за свайго куміра караля Прусіі Фрыдрыха II і любіў усё нямецкае, асабліва прускія парадкі ў войску. Кацярына ўвесь час займалася адукацыяй, ахвотна чытала французскую літаратуру. У 1761 г. Лізавета памерла, і да ўлады прыйшоў Пётр III.

***8.3. Цараванне Пятра III, Кацярыны II. Рэфармаванне дзяржаўных устаноў і эканомікі*.** Пётр III загадаў вывесці войскі з Прусіі і фактычна падараваў свайму куміру, прускаму каралю, усе захопленыя ў выніку вайны землі. 18 лютага 1762 г. ён падпісаў маніфест, паводле якога дваране атрымалі права служыць або не служыць цару па сваім жаданні. Пётр III нядобра ставіўся да расійскай праваслаўнай царквы, не прызнаваў абразоў, забраў у царквы права валодання сялянамі і царкоўнымі землямі. Ён таксама не любіў гвардыю і хацеў замяніць яе нямецкімі жаўнерамі з Гальштэйна, што выклікала незадавальненне пры двары.



*Б. Чорыкаў.*
Імператрыца Кацярына II

Гэтым скарысталася яго жонка Кацярына, якая разам з гвардзейскімі афіцэрамі на чале

з братамі Арловымі арганізавала і ўлетку 1762 г. учыніла дзяржаўны пераварот. Пётр III падпісаў сваю адстаўку, быў арыштаваны і неўзабаве забіты афіцэрамі аховы.

Кацярына II (так яна пачала называцца пасля атрымання ўлады) кіравала Расійскай імперыяй 34 гады (1762–1796). Ведаючы ментальнасць велікаросаў, маючы добрую еўрапейскую адукацыю, яна пабаялася пайсці на кардынальныя рэформы. Але гэтая імператрыца збіралася ператварыць Расію ў дзяржаву з хоць бы адносна разумнымі законамі і адукаванымі грамадзянамі на чале з абсалютным манархам. Таму час яе панавання расійскія гісторыкі называюць «асвечаным абсалютызмам». Каб зрабіць новае заканадаўства (Улажэнне), у 1767 г. яна склікала адпаведную Камісію, куды абралі 572 дэпутаты ад розных саслоўяў (акрамя прыгонных сялян і духавенства). Аднак унутры Камісіі пачаліся вялікія спрэчкі, бо ў розных дэлегатаў былі зусім розныя інтарэсы. Таму, выкарыстаўшы ў якасці нагоды расійска-турэцкую вайну, якая пачалася ў 1768 г., Камісію распусцілі, і запланаваныя ёй рэформы не адбыліся.

Адміністрацыйная рэформа была праведзена ў 1775 г. Краіну падзялілі на 50 губерняў (па 300–400 тыс. жыхароў у кожнай). Губернямі кіравалі губернатары. Тэрыторыю з некалькіх губерняў узначальваў генерал-губернатар або намеснік, які меў вялікія паўнамоцтвы. Губерні дзяліліся на паветы-ўезды. На чале павета стаялі *капітан-спраўнік* і *ніжні земскі суд*.

Аўтаномія Украіны і Дона была цалкам ліквідаваная. Знішчылі Запарожскую Сеч, а казакоў перасялілі на Кубань (частка іх эміґравала).

У 1785 г. была абвешчана Жалаваная грамата гарадам, дзе, у выніку, былі створаны органы мясцовага самакіравання. На захопленых у Турцыі тэрыторыях будаваліся новыя гарады. Сярод іх – база новага Чарнаморскага флоту Севастопаль і новы гандлёвы порт Адэса. Сваім фаварытам Кацярына раздала да 800 тыс. дзяржаўных сялян. Так, пасля захопу Беларусі князь Рыгор Пацёмкін атрымаў Крычаў, Румянцаў – Гомель, Чарнышоў – Чачэрск, а Сувораў – Кобрын.

Усе манастырскія землі забрала дзяржава, выдаткі на царкву скараціліся ў пяць разоў. Апірышчам імперыі былі дваране, прывілеі якіх былі запісаныя ў адмысловай Жалаванай грамаце. Дваране не плацілі падаткаў, і толькі яны валодалі сялянамі ды зямлёй. Іх таксама

вызвалілі ад фізічных пакаранняў. Кар'еру маглі зрабіць толькі тыя, хто меў чыны за дзяржаўную службу.

Жыхары гарадоў былі падзелены на шэсць катэгорый і мусілі плаціць розныя падаткі, выконваць рэкруцкую павіннасць.

Сяляне былі пазбаўлены ўсялякіх правоў: іх становішча было падобным да становішча нявольнікаў. Паншчына даходзіла да шасці дзён на тыдзень. Паводле закону памешчыкі не мелі права забіваць сялян, біць пугай, прымушаць да шлюбу. Але гэтае правіла існавала толькі на паперы. Вядома, напрыклад, што дваранка Дар'я Салтыкова забіла да смерці 90 сваіх прыгонных сялян.

У 1768 г. у Расіі з'явіліся першыя папяровыя грошы (*асігнацыі*); іх можна было ў любой колькасці мяняць на металічныя манеты. Спачатку так і было, але пры канцы кіравання Кацярыны II асігнацый выпусцілі так многа, што выбухнула інфляцыя, і адзін папяровы рубель пачаў каштаваць не больш за 68 капеек.

У краіне развівалася медыцына: была створана медыцынская калегія, у гарадах з'явіліся аптэкі і лекары, а таксама шпіталі, бальніцы і прытулкі для фізічна і разумова хворых. Пачалі рабіць прышчэпкі ад воспы.

***8.4. Паўстанне Емяльяна Пугачова* (*1773–1775*)**. Емяльян Пугачоў быў данскім казаком, удзельнічаў у Сямігадовай вайне, ваяваў з туркамі і за адвагу атрымаў чын афіцэра. Каб узняць паўстанне, ён абвясціў сябе царом Пятром III, але быў схоплены і апынуўся ў казанскай турме. Адтуль ён уцёк і праз нейкі час з'явіўся сярод казакоў на рацэ Яіку (цяпер – Урал). У 1773 г. ён зноў аб'явіў сябе царом і ўзначаліў народнае паўстанне. Захапіўшы некалькі крэпасцяў-астрогаў і зброю, у тым ліку гарматы, ён стварыў вялікае войска (да 25 тыс. чалавек). Акрамя ўцекачоў, велікарускіх сялян і казакоў, да яго далучыліся башкіры, калмыкі і татары (асабліва шмат было башкіраў на чале з Салаватам Юлаевым). Не засталіся ўбаку і рабочыя горных мануфактур. 5 кастрычніка 1773 г. войскі Пугачова ўзялі ў аблогу губернскі горад Арэнбург, але шэсць месяцаў не маглі яго захапіць. Урадавыя войскі 22 сакавіка 1774 г. разбілі Пугачова каля Тацішчавай крэпасці. Пугачоў зняў аблогу горада і пайшоў на Урал і ў Башкірыю. Потым ён прыйшоў на Волгу, дзе яго войска папоўнілі ўдмурты, марыйцы і чувашы.

12 ліпеня 1774 г. Пугачоў аблажыў Казань. Урадавыя войскі разбілі атрады Пугачова, і ён перайшоў на правы, заходні, бераг Волгі, дзе захапіў гарады Пензу і Саратаў.

Каб прыцягнуць на свой бок сялян, 31 ліпеня 1774 г. Емяльян Пугачоў выдаў маніфест, у якім вызваляў сялян ад падаткаў і прыгону. Пасля гэтага да яго далучыліся бурлакі, данскія, волжскія і ўкраінскія казакі. У жніўні 1774 г. войскі Пугачова падступілі да горада Царыцына. Тады Кацярына загадала накіраваць супраць паўстанцаў з турэцкага фронту генерала Аляксандра Суворава. Калі ён падышоў да Царыцына 12 верасня 1774 г., уральскія (яіцкія) казакі схапілі Пугачова і выдалі яго царскім войскам.

10 студзеня 1775 г. Пугачова і яго паплечнікаў публічна пакаралі смерцю на Балотнай плошчы ў Маскве. Паўстанне задушылі, а яго ўдзельнікаў, асабліва казакоў, жорстка пакаралі.

***8.5. Народы Паволжа, Прыўралля, заходняга і цэнтральнага Казахстана ў XVIII ст.*** У гэты перыяд народы Сярэдняга Паволжа – татары, чувашы, мардва, мары – пашыралі арэалы свайго рассялення ў напрамку Паўднёвага правабярэжжа Волгі, у Заволжы і Закам'і. Пад уплывам пашырэння рынкавых дачыненняў насельніцтва Паволжа паступова далучалася да гандлю і абмену вырабамі вясковых рамёстваў. Разам з тым родавая знаць Паволжа была пазбаўлена сваіх прывілеяў. Уласнікам усіх земляў з'яўляўся расійскі цар, таму сяляне мусілі ў вялікай колькасці сплачваць ясак ды выконваць іншыя натуральныя павіннасці: рэкруцкую, дарожную і г. д. Пачынаючы з 1740-х гадоў царскі ўрад пачаў узмоцнена пераводзіць мясцовыя народы ў праваслаўе. Асабліва шчыраваў у гэтай справе наўгародскі епіскап Дзмітрый Сечанаў. У адказ на гвалт з боку царскіх уладаў у 1747 г. мардва ўзняла паўстанне ў Цярушчаўскай воласці Ніжагародскай губерні.

У *Башкірыі* супраць велікарускага нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту раз за разам уздымалі паўстанні (у 1705–1711, 1735–1740, 1755 гг.); самым значным сярод іх было выступленне *цепцяроў і бабылёў* (1747).

Башкірскія – як, прыкладам, і калмыцкія – сяляне, даволі актыўна падтрымалі антыцарскае выступленне Сцяпана Разіна. У сваю чаргу

уладары *Калмыцкага ханства* (існавала ў XVI–XVIII стст.) імкнуліся захоўваць лаяльнасць да царскай і імператарскай улады.

Каланізацыя *Сібіры* велікарускімі купцамі і праваслаўнай царквой выяўлялася ў масавым спойванні мясцовага насельніцтва: так ім было лягчэй здабываць футравую сыравіну за чыста сімвалічныя кошты. Разам з тым каланізатары прыносілі ў Сібір і больш высокую культуру ўраблення зямлі, а таксама пачаткі прафесійнай мастацкай культуры.

На працягу другой трэціны XVIII ст. да Расійскай імперыі былі далучаны Малы і Сярэдні жузы Казахстана. Гэта, з аднаго боку, паспрыяла актывізацыі гандлю з расійскімі землямі, куды з Казахстана ішлі скаціна, футравыя вырабы, лой, шэрсць ды іншыя прадукты. З іншага боку, казахі пратэставалі супраць каланізатарскай палітыкі цара: так, у 1783–1797 гг. яны арганізавалі магутнае паўстанне на чале з Батыр Срымам. У выніку гэтага пасля 1791 г. царскі ўрад мусіў пагадзіцца з аднаўленнем ханскай улады, якая дзеля вырашэння самых важных праблем пачала склікаць усеагульныя з'езды – курултаі.

***8.6. Захопніцкая знешняя палітыка Расійскай імперыі. Экспансія ў Еўропе, Азіі і Паўночнай Амерыцы.*** Галоўныя інтарэсы Расіі ў часы Кацярыны II – Усходняя Еўропа і Прычарнамор'е. У 1764 г. дзякуючы намаганням Расіі каралём Рэчы Паспалітай абралі шляхціча з тэрыторыі ВКЛ (цяпер – Беларусь, мястэчка Воўчын) Станіслава Панятоўскага. У маладосці ён быў амбасадарам Рэчы Паспалітай у Санкт-Пецярбургу, дзе стаў каханкам Кацярыны II (тады яна была пабраная шлюбам з Пятром III) і меў з ёй дачку, якая неўзабаве памерла. Хадзілі чуткі, нібыта і Павел I быў сынам Станіслава Панятоўскага. Менавіта Панятоўскі быў выбраны каралём Рэчы Паспалітай пад іменем Аўгуста IV.

Каб мець уплыў на новага караля, у 1765 г. Расія і Прусія прапанавалі яму праект закона, паводле якога трэба было ўраўнаваць у правах каталіцкую шляхту і так званых *дысідэнтаў* – пратэстанцкую і праваслаўную шляхту. Сейм Рэчы Паспалітай адмовіўся прыняць гэты закон – і тады ў лютым 1767 г. на тэрыторыю ВКЛ увайшлі расійскія войскі. Калі яны занялі беларускі горад Слуцк, князь Мікалай Рапнін, амбасадар Расіі, сабраў там падкупленых

ім шляхцічаў. Быў прыняты дакумент, які падпісалі 248 чалавек. Падпісанты патрабавалі роўных правоў для каталіцкай і некаталіцкай шляхты. Кацярына II адразу ж іх падтрымала і накіравала новыя войскі ў ВКЛ. У 1768 г. варшаўскі сейм мусіў адпаведны закон усё ж прыняць.

Частка каталіцкіх магнатаў і біскупаў выступіла супраць гэтага закона і ў 1768 г. у горадзе Бáры (Украіна) стварыла сваю канфедэрацыю. Пачаліся грамадзянская вайна і паўстанне ўкраінскіх сялян супраць паноў і шляхты (Каліїўшчына). Станіслаў Панятоўскі папрасіў у Расіі дапамогі, і ўжо ўлетку 1768 г. царскія войскі захапілі Бар, Львоў і Кракаў. Аднак барскія канфедэраты не здаліся: яны распачалі партызанскія дзеянні як на тэрыторыі Польшчы, так і ВКЛ. 13 верасня 1768 г. атрад канфедэратаў быў разбіты Аляксандрам Суворавым каля вёскі Арэхава (Брэсцкі павет). За гэта Сувораў атрымаў званне генерал-маёра. Новую перамогу Сувораў атрымаў каля Сталовічаў (паблізу Слоніма), калі ў верасні 1771 г. разбіў атрад гетмана ВКЛ Міхаіла Агінскага. Апошнія бітвы Сувораў выйграў увесну 1772 г. на тэрыторыі Польшчы. Грамадзянскія войны скончыліся, кароль застаўся на троне.

Пасля перамогі над барскімі канфедэратамі 5 жніўня 1772 г. у Санкт-Пецярбургу Расія, Прусія і Аўстрыя падпісалі акт пра *першы падзел Рэчы Паспалітай*. Войскі ВКЛ не аказалі супраціву, але некаторыя польскія цвярдыні супраціўляліся. 28 красавіка 1773 г. Сувораў узяў Кракаў, а аўстрыйскія войскі 15 верасня таго самага года – Львоў.

Расія захапіла Інфлянцкае ваяводства, большую частку Полацкага ваяводства (горад Полацк падзялілі папалам), амаль усё Віцебскае і Мсціслаўскае ваяводствы, усходнюю частку Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. Новая мяжа прайшла па Заходняй Дзвіне, Дняпры і Друці.

Тут былі ўтвораны Полацкая і Магілёўская губерні. 11 красавіка 1775 г. Варшаўскі сейм зацвердзіў гэты падзел, нягледзячы на супраціў дэпутатаў з ВКЛ Тадэвуша Рэйтана, Самуіла Корсака і Станіслава Багушэвіча.

3 траўня 1791 г. сейм Рэчы Паспалітай зацвердзіў Канстытуцыю, якая фактычна ліквідавала ВКЛ і абвясціла ўнітарную дзяржаву без

«ліберум вета», канфедэрацыі шляхты і выбарнасці караля. Гэта вельмі не спадабалася суседзям, якія ўжо былі напалоханы Вялікай французскай рэвалюцыяй. У сакавіку 1792 г. магнаты Рэчы Паспалітай, якія хацелі захаваць ВКЛ і былі супраць Канстытуцыі, Станіслаў Патоцкі і Севярын Ржавускі, дамовіліся ў Санкт-Пецярбургу з Кацярынай II аб дапамозе і 14 траўня 1792 г. абвясцілі ў мястэчку Таргавічы (каля Умані ва Украіне) канфедэрацыю супраць улады і караля.

Вялікае расійскае войска ўступіла на землі Рэчы Паспалітай. 24 ліпеня 1792 г. Станіслаў Панятоўскі спыніў ваенныя дзеянні. Пачаўся *другі падзел Рэчы Паспалітай* паміж Прусіяй і Расіяй, які завяршыўся ў 1793 г. на Гродзенскім сейме 28 чэрвеня. Расія захапіла Цэнтральную Беларусь і ўтварыла Мінскую губерню. У Кракаве ў сакавіку 1794 г. пачалося паўстанне на чале з генерал-лейтэнантам Тадэвушам Касцюшкам, які паходзіў з тэрыторыі Беларусі. Ён выступіў за вяртанне межаў Рэчы Паспалітай паводле стану на 1772 г. і аднаўленне дзейнасці Канстытуцыі 3 траўня 1791 г. Паўстанне ахапіла Варшаву (18 красавіка) і Вільню (23 красавіка). На чале паўстанцаў ВКЛ стаў палкоўнік Якуб Ясінскі. Расійскія войскі адступілі на тэрыторыю Мінскай губерні. Некаторыя атрады войскаў ВКЛ зрабілі шэраг рэйдаў на тэрыторыю Мінскай губерні, але былі там разбітыя. 11 жніўня царская армія заняла Вільню, а 6 чэрвеня прускія і расійскія войскі перамаглі Касцюшку пад Кракавам. З Украіны прыйшло войска Суворава. 10 кастрычніка 1794 г. пад Варшавай атрады Касцюшкі былі яшчэ раз разбітыя, ён сам быў паранены і трапіў у палон. 4 лістапада Суворaў захапіў варшаўскі прыгарад Прагу, дзе выразаў амаль усё мірнае насельніцтва (каля 12 тыс. чалавек). Расійскі генерал Леў Энгельгард апісваў гэтыя падзеі наступным чынам: «Каб уявіць сабе праўдзівую і жахлівую карціну штурму Прагі пасля яго заканчэння, трэба было быць іх навочным сведкам. Да самай Віслы на кожным кроку спрэс ляжалі забітыя, а таксама людзі розных станаў, якія паміралі; на беразе ракі штабялямі ляжалі жаўнеры, цывільныя людзі, габрэі, ксяндзы, манахі, жанчыны і дзеці. Калі нехта ўсё гэта бачыў, сэрца ў яго замірала, а гідкасць гэтай карціны абурала яго душу. Падчас бітвы чалавек не толькі не адчувае ў сабе ніякай літасці, але і яшчэ звярэе, але забойствы пасля бітвы – гэта ганьба». 6 лістапада

1794 г. Варшава капітулявала, 16 лістапада паўстанцы прайгралі апошні бой на поўдні ад Варшавы. Паўстанне скончылася.

24 кастрычніка 1795 г. у Санкт-Пецярбургу Аўстрыя, Прусія і Расія падпісалі акт пра *трэці падзел Рэчы Паспалітай*. 25 лістапада кароль Станіслаў Панятоўскі падпісаў адмаўленне ад трона на карысць Кацярыны II. Рэч Паспалітая спыніла сваё існаванне. Расія атрымала Заходнюю Беларусь і Валынь; на беларускіх землях былі створаны Слонімская і Віленская губерні.

***8.7. Войны з Турцыяй. Палітыка Паўла І.*** У 1768 г. Асманская імперыя запатрабавала вывесці расійскія войскі з Рэчы Паспалітай і аб'явіла вайну Расіі. За два першыя гады вайны Расіі ўдалося захапіць турэцкія крэпасці Хоцін, Ясы, Бухарэст і Ізмаіл. У чэрвені 1770 г. расійскі флот, абагнуўшы Еўропу з Балтыкі, прыплыў у Міжземнае мора і разбіў турэцкі флот пад Чэсмай.

Праз месяц адбылася *бітва пры Кагуле*, дзе туркі таксама пацярпелі паражэнне. У 1772 г. пачаліся мірныя перамовы. Расія запатрабавала незалежнасці Крымскага ханства, але Турцыя адмовілася. Зноў пачалася вайна; у чэрвені 1774 г. войскі Аляксандра Суворава разбілі туркаў каля Казлуджы. 10 ліпеня 1774 г. у балгарскай вёсцы Кючук-Кайнарджы бакі падпісалі мірную дамову.

Расія атрымала Кабарду і горад Керч у Крыме, а таксама права мець ваенны флот на Чорным моры. Расійскія гандлёвыя судны цяпер маглі свабодна хадзіць цераз турэцкія пралівы.

У 1775 г. туркі паставілі ў Крыме ханам свайго чалавека, Даўлет-Гірэя. Тады Кацярына II увяла ў Крым свае войскі і паставіла ханам Шагін-Гірэя. 8 красавіка 1783 г. Расія цалкам захапіла Крым і далучыла паўвостраў да сваёй імперыі.

У тым жа годзе Расія падпісала з Усходняй Грузіяй Георгіеўскі трактат, які прызнаў інтарэсы Расіі ў Закаўказзі. Улетку 1787 г. пачалася новая вайна з Турцыяй, а яшчэ праз год – вайна са Швецыяй. Сувораў адбіў напад туркаў на крэпасць *Кінбурн*, а расійскі флот разбіў флот Швецыі. Працяг шведска-расійскай вайны ў 1789–1790 гг. ніякіх пераваг Швецыі не прынёс. У гэтыя часы ў 1790 г. адмірал Фёдар Ушакоў перамог турэцкі флот, а войскі Суворава ў снежні 1790 г. захапілі крэпасць Ізмаіл. Пры канцы снежня 1791 г. Турцыя

падпісала з Расіяй чарговую мірную дамову, у якой прызнала яе захоп Крыма і пратэктарат над Грузіяй.

У XVIII ст. Расія выйшла да берагоў Паўночнай Амерыкі: 21 жніўня 1732 г. расійскія маракі высадзіліся на Алясцы.

Расійскі прадпрымальнік Рыгор Шэліхаў у апошняй трацціне стагоддзя арганізаваў гандлёвыя марскія зносіны паміж Курыльскімі і Алеуцкімі выспамі. Ён жа ў 1783–1786 гг. узначаліў экспедыцыю на амерыканскі кантынент, дзе заснаваў першыя расійскія паселішчы. Засвоеная тэрыторыя атрымала назву «Руская Амерыка». У 1867 г. гэтыя тэрыторыі будуць прададзены Паўночна-Амерыканскім Злучаным Штатам за 7 млн 200 тыс. тагачасных долараў.

Кацярына ІІ не любіла свайго сына Паўла, але была вымушана аб'явіць яго сваім спадчыннікам. Яна забрала ў Паўла ягонага сына Аляксандра і выхоўвала асобна, бо хацела аддаць уладу яму, а не ягонаму бацьку. Павел стаў імператарам, маючы 43 гады, і кіраваў Расіяй з 1796 па 1801 г. У 1797 г. ён адмяніў указ Пятра І аб сістэме спадчыннасці і выдаў свой пад назвай «Аб імператарскай фаміліі». Улада перадавалася ад бацькі да найстарэйшага сына, а калі няма дзяцей – найстарэйшаму брату. Таксама быў створаны асобны *імператарскі дамен*: прыбыткі з яго ішлі на імператарскую сям'ю.

У 1797 г. Павел І выдаў указ аб паншчыне. Сяляне пачалі працаваць на памешчыка не больш за тры дні на тыдзень. Аднак цар раздаў дваранам 600 тыс. дзяржаўных сялян, якія сталі прыгоннымі. На тэрыторыі ВКЛ Павел І аднавіў дзейнасць статута ВКЛ і дазволіў шляхце збіраць павятовыя сеймікі. Ён вызваліў з турмы Тадэвуша Касцюшку і даў яму дазвол выехаць у Швейцарыю.

Павел І збольшага добра ставіўся да католікаў. Ордэн езуітаў, ад 1773 г. забаронены ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе, актыўна дзейнічаў у Расійскай імперыі, меў Полацкую езуіцкую акадэмію, якая з 1812 г. існавала на правах універсітэта.

У 1794 г. Кацярына ІІ выдала ўказ аб пераводзе ўніятаў у праваслаўе. Павел гэты ўказ скасаваў, і ўніяцкая царква ацалела. Мясцовая шляхта магла карыстацца польскай мовай без усялякіх абмежаванняў. Аднак мяжу аселасці для габрэяў, вызначаную Кацярынай ІІ 23 чэрвеня 1794 г., Павел І пакінуў без змен. Габрэі і надалей не мелі права жыць на велікарускіх этнічных землях. У 1800 г. Павел увёў

двухгадовы тэрмін для шляхты ВКЛ, каб яна пацвердзіла свой статус дваранства ў новай дзяржаве.

Французская рэвалюцыя вельмі напалохала Кацярыну II і яшчэ ў большай ступені Паўла I. Кацярына II уступіла у ваенны альянс з Англіяй, Аўстрыяй і Прусіяй супраць Францыі і загадала Сувораву рыхтаваць войска у французскі паход. Павел I адмяніў гэты паход, але абвясціў поўную блакаду Францыі. Расійцы не мелі права ездзіць у Францыю, у тым ліку на вучобу. Была нават забаронена французская мода (капелюшы і касцюмы). Прыхільнікаў новых французскіх павеваў высылалі ў Сібір або кідалі ў турму.

У 1798 г. Павел I далучыўся да антыфранцузскай кааліцыі ў складзе Англіі, Аўстрыі, Турцыі і Неапалітанскага каралеўства. Расійскі флот на чале з адміралам Ушаковым разам з турэцкім флотам выгнаў французаў з Іанічных выспаў, потым ваяваў на Неапалітанскім узбярэжжы. На дапамогу Аўстрыі паслалі сухапутную армію на чале з генерал-фельдмаршалам Аляксандрам Суворавым. Так пачаўся знакаміты італьянскі паход. У 1799 г. армія Суворава ўвайшла на тэрыторыю Паўночнай Італіі і захапіла гарады Мілан і Турын. У некалькіх бітвах французы былі разбітыя, і войскі Расіі занялі ўсю паўночную Італію.

Пад уплывам Аўстрыі Павел I загадаў Сувораву перадаць паўночную Італію Аўстрыі, а самому ісці ў Швейцарыю, якую перад тым акупавала Францыя. Сувораў зрабіў некалькі ўнікальных пераходаў цераз горныя перавалы і здолеў вывесці армію са Швейцарыі, калі французы падрыхтавалі яму ваенную пастку. За гэты паход Сувораў атрымаў чын генералісімуса. У 1800 г. Павел I заключыў мір з Францыяй і яе кіраўніком *Напалеонам Банапартам.*



*Б. Чорыкаў.* Імператар Павел I ускладае на фельдмаршала графа Суворава Вялікі крыж св. Іаана Іерусалімскага

Неўзабаве супраць Паўла I быў арганізаваны замах на чале з губернатарам Санкт-Пецярбурга графам

Пятром Па́ленам. 11 сакавіка 1801 г. імператар Павел быў забіты. Да ўлады прыйшоў яго сын, Аляксандр І, які надаў новы імпульс існаванню дэспатычнай манархічнай улады ў Расіі.

***8.8. Культура і навука Расіі ў XVIII ст.*** Расійскі імператар Пётр І, беручы прыклад з Захаду, імкнуўся развіваць асвету і навуку ў краіне. Правёўшы рэформы летазлічэння і ўжытковага шрыфту для рускай мовы (паводле праекта, прапанаванага беларусам Іллём Капіевічам), ён заняўся стварэннем спецыялізаваных школ. Першай такой школай стала *Школа матэматычных і навігацкіх навук* у Маскве, заснаваная ў 1701 г. Пазней яна была пераведзена ў Пецярбург і ў 1715 г. пераўтворана ў *Марскую акадэмію.* У Маскве і Пецярбургу пачалі таксама працаваць інжынерная і артылерыйская школы, пазней да іх дадалася медыцынская школа ў Маскве. Падвысіўся ўзровень выкладання ў маскоўскай Славяна-грэка-лацінскай акадэміі. Пры самых буйных мануфактурах засноўваліся рамесныя школы. У кожнай з губерняў ствараліся так званыя цыфірныя школы: там вучылі пачаткам граматы і арыфметыкі. У праваслаўных епархіях адкрываліся царкоўныя школы.

У другой палове стагоддзя тэмпы развіцця адукацыі паскорыліся. У 1758 г. у Казані была адкрытая гімназія для дваран і разначынцаў, у 1764 г. у Пецярбургу запрацавала першая жаночая навучальная ўстанова пры Смольным манастыры. Разам з тым адставанне Расіі ў галіне асветы і адукацыі ад вядучых краін Еўропы да канца стагоддзя было вельмі вялікім. Яно добра заўважнае нават пры параўнанні колькасці навучэнцаў у гімназіях Расіі і былога ВКЛ. На 1808 г. у Маскоўскай навучальнай акрузе (10 губерняў) іх было 447, у Пецярбургскай (5 губерняў) – 294, у Віленскай (8 губерняў) – 1305.

У XVIII ст. у Расіі пачынаюцца больш-менш сур'ёзныя самастойныя *навуковыя даследаванні.* Загадам Пятра І у Пецярбургу была заснаваная Кунсткамера – калекцыя цікавых для навуковага вывучэння рэчаў. Ладзяцца геаграфічныя экспедыцыі; запрошаныя з-за мяжы і свае спецыялісты актыўна займаюцца картаграфічнай працай.

Гэтыя напрамкі дзейнасці развіваліся і пасля смерці Пятра І. Землі Сібіры і Далёкага Усходу сталі аб'ектам пільнай увагі расійскіх падарожнікаў і даследчыкаў таго часу. Іх экспедыцыі паспрыялі

арганізацыі на Урале прамысловага комплексу, які забяспечваў Расійскую імперыю металургічнай прадукцыяй. Цягам стагоддзя расійскія падарожнікі здзейснілі нямала важных геаграфічных адкрыццяў. Так, экспедыцыі руска-дацкага падарожніка *Вітуса Берынга* на Камчатку адкрылі новы праліў, які злучае Еўропу і Азію. Падарожнікі пачалі выпускаць фундаментальныя навуковыя працы, якія дапамагалі ў засваенні новых земляў. У 1745 г. быў выпушчаны «Атлас Расійскай імперыі», які падрабязна апісваў тагачасныя расійскія тэрыторыі.



*Б. Чорыкаў.* Ламаносаў прадстаўляецца імператрыцы Лізавеце Пятроўне

Аўтарам значных прац у самых розных галінах навукі – хіміі, фізіцы, астраноміі, геалогіі, геаграфіі, філалогіі, гісторыі – быў знакаміты Міхайла Ламаносаў, які паходзіў з сям'і архангельскага купца.

Уклад у развіццё тэхналогій вырабу зброі зрабіў рускі механік Андрэй Нартаў, які, акрамя таго, апублікаваў энцыклапедычную працу пра станкабудаванне, медальернае і такарнае ўмельства пад назвай «Тэатрум махінарыум, або Яснае відовішча машын» (1755).

У XVIII ст. новыя крокі наперад зрабіла расійская гістарычная навука. Акрамя згаданай раней працы Васілія Тацішчава, сваёй грунтоўнасцю вылучаліся працы першых акадэмікаў Расійскай акадэміі навук немцаў Готфрыда Зігфрыда Баера, Герхарда Фрыдрыха Мілера, рускага Міхайлы Ламаносава, які палемізаваў з апошнімі ў пытаннях нарманскай тэорыі паходжання старажытнай Русі. Купец Іван Голікаў сабраў вялікую колькасць дакументаў пра Пятра I і апублікаваў 30-томную працу «Дзеі Пятра Вялікага» (1788–1789). Сямітомную «Гісторыю Расіі з найстаражытных часоў» (1770–1791) стварыў яшчэ адзін акадэмік, Міхаіл Шчарбатаў. Першыя спробы адысці ад сервільна-імперскіх трактовак расійскай гісторыі папярэднімі гісторыкамі зрабіў яшчэ Іван Болцін, аўтар «Крытычных заўваг да гісторыі Шчарбатава» (2 тамы, 1793–1794).

Крытычнае мысленне пачынае выяўляць сябе і ў дачыненні да дзяржаўнага ўладкавання Расійскай імперыі. Важную ролю тут адыгрывала выдавецка-публіцыстычная дзейнасць масона Мікалая Навікова, заснавальніка сатырычных часопісаў «Трутень», «Живописец», «Кошелек». Рэпрэсіі з боку Кацярыны II зазнаў Аляксандр Радзішчаў за надзвычай крытычную кнігу «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» (1790).

Расійская літаратура XVIII ст. у цэлым прайшла вельмі значны шлях – ад паўграфаманскіх практыкаванняў Васілія Традзьякоўскага, Антыёха Кантэміра, Аляксандра Сумарокава, Міхаіла Хераскава да таленавітых узораў лірыкі таго ж Міхайлы Ламаносава, Гаўрылы Дзяржавіна, цікавых камедый Дзяніса Фанвізіна. Адметнай з'явай сталі напісаныя ў 1738–1759 гг. мемуары Андрэя Болатава. У гэты час пачынаюць заяўляць пра сябе і творцы неславянскіх этнасаў Расіі: башкірскія песняры-імправізатары (сэсэны) Салават Юлаеў і Баік Айдар, башкірскі рэлігійны паэт Таджэтдзін Ялсыгул, калмыцкі пісьменнік Габан Шараб, татарскі аўтар дакументальных падарожных нататак Ісмагіл Бікмухаметаў. Сярод калмыкаў пры канцы XVII і ў XVIII ст. склаўся вялікі гераічны эпас «Джангар».

Своеасаблівым феноменам культуры Расіі пачатку стагоддзя стала ініцыяванае Пятром I будаўніцтва новай расійскай сталіцы на Заечым востраве ля вусця ракі Нявы. Новы горад атрымаў галандскую назву «Санкт-Пітэр-Бурх». Пачалося ўсё з земляных умацаванняў і невялікага горада для самога імператара. Пасля гэтага пачалі ўзводзіць дамы для найбліжэйшых пятроўскіх паплечнікаў. Горад будавалі збольшага запрошаныя з-за мяжы архітэктары і інжынеры (Андрэас Шлютэр, Даменіка Трэзіні, Джавані Марыя Фантана, Готфрыд Ёган Шэдэль, Крыстаф Конрад, Гаэтана К'яверы ды іншыя). Першапачатковую канцэпцыю планіроўкі горада (услед за праектамі ўзорных дамоў) распрацаваў італьянец са Швейцарыі Трэзіні (1714–1716). Аднак галоўным архітэктарам горада быў прызначаны па прыездзе летам 1716 г. больш дасведчаны архітэктар і інжынер Жан-Батыст Аляксандр Леблён. Што праўда, прапанаваны ім праект (1716–1717), падобны да працы Трэзіні і дапоўнены размешчанымі па эліпсе 56 бастыёнамі для агульнай абароны горада (кварталы «подлага люду», могілкі і гароды выносіліся за межы), за-

цверджаны не быў. Пабудова бастыёнаў уяўлялася занадта дарагой. Да таго ж план Леблёна закранаў ужо здзейсненыя пабудовы Траецкай плошчы, Адміралцейскага боку і Летняга сада. Праекты Трэзіні і Леблёна сыходзіліся ў галоўным: дзякуючы ім у Расіі ў глабальным маштабе адбыўся пераход ад радыяльна-кальцавой да рэгулярнай планіроўкі горада, якая прадугледжвае геаметрычную правільнасць, сіметрычнасць, адзіныя правілы забудовы вуліц і тыповыя суадносіны памераў і вышыні будынкаў. На працягу 1710–1730-х гг. Даменіка Трэзіні стварыў праекты такіх значных будынкаў у Санкт-Пецярбургу, як Летні палац Пятра I (1710–1714 гг., барэльефы таго ж Шлютэра), будынак Дванаццаці калегій (1721–1742 гг., разам з рускім дойлідам Міхаілам Зямцовым) і Гасцінны Двор (1723–1735) на Васільеўскім востраве. Былі пастаўлены таксама Пятроўская брама (1714–1717) і Петрапаўлаўскі сабор у Петрапаўлаўскай крэпасці (1712–1733).

Такім чынам, пасля смерці Леблёна (1719) Трэзіні зноў кіраваў працамі ў горадзе. Пабудовы Трэзіні вызначылі стылістыку дойлідства пятроўскага барока. Ім уласцівыя строгая рэгулярнасць планаў, сціплы дэкор, выкарыстанне класічных ордарных элементаў разам з барочнай арнаментыкай.



© Фота І. Аляксеева

Петрапаўлаўскі сабор
у Санкт-Пецярбургу
(архітэктар Д. Трэзіні)

Дзеля рэалізацыі маштабных праектаў расійскія прыгоннікі пастаўлялі штогод прыкладна па 20 тыс. рабочых на будаўніцтва горада. Шмат хто з іх не мог вытрымаць цяжкой працы ў вельмі складаным паўночным клімаце.

Італьянец Джавані Фантана разам з немцам Готфрыдам Шэдэлем пабудавалі палацы Меншыкава ў Пецярбургу (1710–

1720-я гг., адзін з першых гмахаў новага горада) і Араніенбаўме (1711–1727). Абодва аўтары не лічацца высокакласнымі дойлідамі: мяркуецца, што Фантана (якога Меншыкаў наймаў яшчэ ў Маскве ў 1706 г.) для сваіх праектаў выкарыстоўваў гатовыя малюнкі з архітэктурных кніг. Больш выразны, нават шыкоўны праект Араніенбаўма – а менавіта закругленыя галерэі, якія вядуць ад двухпавярховага цэнтральнага корпуса да бакавых павільёнаў – дапрацоўваўся архітэктарамі Ніколам Піно і Шлютэрам.

Дойлід Міхаіл Зямцоў, які пачаў сваю адукацыю ў Маскве ў Збройнай палаце, а потым у новай сталіцы ў Трэзіні (1710) і сваёй стараннасцю звярнуў увагу Пятра I, акрамя супольнай працы з настаўнікам, выконваў самастойныя праекты. У стылі ранняга барока ён узвёў царкву Сімона і Ганны (1731–1744), а затым спраектаваў першы варыянт Анічкавага палаца. Працаваў ён і як скульптар над статуямі для Кунсткамеры.

Потым надышоў час выдатнага барочнага дойліда італьянскага паходжання Франчэска Барталамеа Растрэлі, обер-архітэктара Ганны Іванаўны, а пазней Лізаветы Пятроўны. Перад пачаткам бліскучай кар'еры ў Пецярбургу ён выязджаў на стажыроўку ў Італію і Францыю. Вяртаючыся, пабудаваў у 1730-х гг. для Бірона ў Курляндыі палацы ў Рундале і Мітаве. У гэты час ён саспеў як майстар сталага высокага барока, адначасова засвоіўшы элементы маскоўскага нарышкінскага стылю (кантрасныя колеры фасадаў, цыбулепадобныя макаўкі).

У паўночнай сталіцы яму належаць праекты будынкаў Зімовага палаца (1754–1762), сабора Смольнага манастыра (1748–1764), палаца Варанцова


© Фота А. Грышына

Кацярынінскі палац у Царскім Сяле
(архітэктар Б. Растрэлі)

(1749–1757), Кацярынінскага палаца ў Царскім Сяле (1752–1756) і перабудова Вялікага палаца ў Пецяргофе (1747–1752).

Даследчыкі адзначаюць, што Растрэлі імкнуўся напоўніць фасад пластычнай гульнёй калон, пілястраў, рустоўкі, разнастайнасцю ліштваў і вокнаў з паўколавым верхам, а таксама багаццем афарбоўкі. Да таго ён вырашыў праблему слабых піцерскіх грунтоў, закладаючы магутныя платформы і па́лі. Асабліва выдатны ансамбль Вялікага палаца ў Пецяргофе, спраектаванага на ўзор Версаля, – з шыкоўна дэкараванымі залочанай разьбой па дрэве і скульптурамі параднай лесвіцай ды анфіладай залаў уздоўж фасада. Смольны сабор мае ў плане грэцкі крыж з цэнтральным храмам і бакавымі капліцамі, мае пяць галоваў (паводле праваслаўнай традыцыі, як патрабавала Лізавета Пятроўна), з якіх чатыры бакавыя вянчаюць званіцы, і шыкоўны ніжні ярус, фасады якога больш падобныя да палацавых.

Зімовы палац у Пецярбургу – вяршыня творчасці Растрэлі, самы высокі будынак сталіцы, з 1500 пакоямі плошчай 60 000 кв. м. Аднак пры ўсёй яго пампезнасці, з прычыны сыходу моды на барока, новая імператрыца Кацярына II у 1762 г. адхіліла Растрэлі ад прац, і афармленнем інтэр'ераў займаліся ўжо Юрый Фельтэн і Антоніа Рынальдзі, носьбіты ідэй больш строгага ранняга класіцызму.

Акрамя Растрэлі ў новай сталіцы і яе наваколлях плённа працавалі рускія дойліды: Сава Чавакінскі, архітэктар барочнага Мікольскага марскога сабора (1753–1762); Дзмітрый Ухтомскі, які сваімі трыумфальнымі аркамі афармляў каранацыю Лізаветы Пятроўны, шмат працаваў у Маскве. Ён выхаваў архітэктараў новага пакалення – Аляксандра Какорынава, Івана Старова, Мацвея Казакова. Нарэшце, Андрэй Квасаў (1720–1777) быў разам з Барталамеа Растрэлі аўтарам праекта Вялікага палаца ў Царскім Сяле.

11 снежня 1762 г. на пачатку царавання Кацярыны II, была створана камісія пад кіраўніцтвам Івана Бецкага. Яе дзейнасць скіроўвалася на перанясенне прынцыпаў увасобленай у сталіцы рэгулярнай planіроўкі ў правінцыйныя гарады. За 34 гады працы, да смерці самой Кацярыны, камісія перапланавала 416 расійскіх гарадоў з 497 існуючых (на 1787 г.), прасоўваючы новыя ідэі за межы сталіцы.

У другой палове XVIII ст. у час дамінавання ранняга класіцызму вылучаюцца працы італьянска-расійскіх архітэктараў. Згаданы

раней Антоніа Рынальдзі у 1760-х – пачатку 1780-х гг. збудаваў Мармуровы палац, палац малых формаў Пятра III у Араніенбаўме, палац у Гатчыне (разам з Вінчэнца Брэннам). Мармуровы палац быў аблямаваны натуральным каменем – гранітам і 32 гатункамі каляровых мармураў (упрыгожаны па фасадах скульптурамі Фядота Шубіна). Разам з парадным Гатчынскім палацам гэта былі яскравыя ўвасабленні расійскага класіцызму.

Італьянец Джакама Кварэнгі быў у Расіі ці не самым актыўным у працы прадстаўніком паладыянства – ранняга класіцызму, што пераймаў ідэі італьянскага рэнесансавага архітэктара Андрэа Паладыа. Яго працы – Эрмітажны тэатр, Аляксандраўскі палац у Царскім Сяле, будынкі Акадэміі навук, Асігнацыйнага банка, Смольнага інстытута (1780-я – 1800-я гг.) – вызначаюцца строгай сіметрыяй і наследаваннем прынцыпам класічнага храмавага дойлідства Старажытных Грэцыі і Рыма.

Шатландзец Чарльз Кэмеран, таксама паладыянец, на загад Кацярыны II і пад яе густ будуе ў Царскім Сяле павільёны і галерэі ў старажытнарымскім стылі: Камеронаву галерэю, Вісячы сад і Агатавыя пакоі, а таксама Вялікі палац і Храм дружбы ў Паўлаўску (1780-я гг.).

У другой палове XVIII ст. працуе згаданы раней выхадзец з Табольска Аляксандр Какорынаў, з 1769 г. рэктар Імператарскай Акадэміі мастацтваў і будаўнік галоўнага корпуса гэтай установы (1764–1788, разам з французам Жанам Вален-Дэлямотам).

Дойлід Іван Староў узвёў Траецкі сабор Аляксандра-Неўскай лаўры (1776–1790). Значнай з'явай былі таксама працы чувашскага архітэктара Пятра Ягорава: Раждзественская царква на Пясках (1787, у стылі сталага класіцызму) і пераробкі агароджы Летняга сада (1772) з мэтаю прыстасавання яго для публічнага наведвання і абароны ад эпізадычных паводак.

Цягам XVIII ст. Пецярбург склаўся як рэгулярна спланаваны горад еўрапейскага тыпу, у ансамблях якога ўвасобіліся сучасныя мастацкія стылі і тым самым засведчылі пераход архітэктуры Расіі на новы якасны ўзровень.

Масква, у адрозненне ад новай сталіцы, захоўвала гістарычна складзеную радыяльна-кальцавую сістэму планіроўкі з нерэгулярнай

забудовай кварталаў, а ў першыя дзесяцігоддзі XVIII ст. заставалася вернай рускай стылістыцы нарышкінскага барока. У горадзе і Падмаскоўі ўкраінскі архітэктар Іван Зарудны пабудаваў царкву Архангела Гаўрыіла (Меншыкава вежа, пачатак ст.) і некалькі трыумфальных брам. Яго манера вызначалася адаптаваннем еўрапейскага барока праз украінскія ўзоры і блізкасцю нарышкінскім помнікам 1690-х гг.

Найбольш выдатным дойлідам старой сталіцы XVIII ст. быў Васілій Бажэнаў, аўтар царквы Абразá Маці Божай Балеснай на Ардынцы (1783– 1791), дома Юшкова (1780-я гг.), комплексу будынкаў Вялікага палаца ў Царыцыне (руская готыка, 1776–1786). Ён разам з жывапісцам Антонам Ласенкам першым сярод расійскіх майстроў быў накіраваны Акадэміяй мастацтваў па навуку за мяжу (у Парыж), стаў прапагандыстам класіцызму і псеўдаготыкі; пры канцы жыцця – стацкі саветнік і віцэ-прэзідэнт Акадэміі мастацтваў. Яго шэдэўр – дом Пашкова (1784–1786), складзены з цэнтральнага корпуса з ратондай і двух флігеляў, доўгі час лічыўся найпрыгажэйшым будынкам Масквы.

Мацвей Казакоў, вучань Ухтомскага, захапляўся паладыянствам (і ў часы Кацярыны II адпаведным чынам перабудоўваў цэнтр Масквы), а таксама псеўдаготыкай. Яго галоўныя працы – будынак Сената (1776–1787), будынак Галіцынскай бальніцы (1796–1801), цэрквы-ратонды Піліпа Мітрапаліта, Узнясення, Казьмы і Дзям'яна (1780-я – 1790-я гг.).

Елізвой Назараў, прыгонны з паходжання, вырас як памочнік у Бажэнава і Казакова, а ў самастойных праектах аддаваў перавагу класіцызму. Яго працы – Знаменская царква Навaспаскага манастыра (1791–1795), царква на Лазараўскіх


© Фота В. Зіміна

Дом Пашкова ў Маскве (архітэктар В. Бажэнаў)

© Sergeant Pepper



Барысаглебскі сабор
у Таржку
(архітэктар М. Львоў)

могілках (1780–1787), «Странноприимный» дом графа Шарамецева (1803–1810).

Вядомыя архітэктары прапаноўвалі праекты і для правінцыі. Той жа Дзмітрый Ухтомскі збудаваў Смаленскую царкву ў Загорску (з удзелам Ёгана Шумахера, Івана Мічурына, перад 1770 г.).

Да значных архітэктурных помнікаў Расіі XVIII ст. належаць таксама досыць традыцыйны пяцігаловы Успенскі сабор у Астрахані (1699–1710, архітэктар Дарафей Мякішаў), Падарожны палац Кацярыны II у Цвяры (1764–1766, дойлід Пётр Нікіцін) і царква-ратонда Узнясення ў Каломне (1792–1799, архітэктар Мацвей Казакоў), комплекс прысутных месцаў у Калузе (1780–1809, архітэктары Пётр Нікіцін, Іван Ясныгін), гасцінны двор у Кастраме (1775, архітэктары Карл фон Клер, Сцяпан Варацілаў, Васілій Стасаў ды іншыя), дом Дзянісьева ў Курску (1771–1790, архітэктар Джакама Кварэнгі), Барысаглебскі сабор у Таржку (1785–1796, дойлід Мікалай Львоў), комплекс прысутных месцаў і будынак сіроцкага дома ў Яраслаўлі (1781-1787, архітэктар Іван Левенгаген).

© Фота В. Індзейкіна



Мячэць аль-Марджані ў Казані
(імаверны арх. В. Кафтыраў)

У Казані ў 1766 г. быў пабудаваны значны помнік мусульманскай сакральнай архітэктуры – мячэць аль-Марджані.

Па-ранейшаму сваёй адметнасцю вылучалася сакральнае драўлянае дойлідства, якое займела свае чарговыя шэдэўры.

Агульная тэндэнцыя еўрапеізацыі стыляў датычыла таксама правінцыі; на чале гэтага працэсу стаялі дзяржаўныя архітэктурныя ўстановы, а для ўсіх відаў мастацтва важнай была наяўнасць новай сістэмы адукацыі і прафесійнага асяродка – Імператарскай Акадэміі мастацтваў.

У першай палове XVIII ст. у расійскім *жывапісе* дамінаваў партрэтны жанр. У ім вызначыўся француз Луі Каравак, які стварыў, акрамя парадна-афіцыйных («Партрэт імператрыцы Елізаветы»), жывыя (хоць і рэпрэзентатыўныя) дзіцячыя вобразы («Партрэт хлопчыка ў паляўнічым строі» (канец 1720-х – пачатак 1730-х).

Расійскі мастак Іван Нікіцін, вучань немца Ёгана Танаўэра, пазней стажыраваўся ў Венецыі і Фларэнцыі. Выявіў сябе як партрэтыст (вобраз напольнага гетмана, афіцыйны партрэт Пятра I на смяротным ложы, 1720-я гг.). Наўгародзец Андрэй Мацвееў, майстар партрэтаў і манументальных палотнаў, як і Нікіцін, стаў першым – яшчэ да заснавання Акадэміі – расійскім замежным пенсіянерам (у Амстэрдаме). Яго творчы багаж разнастайнейшы: манументальныя палотны (для Петрапаўлаўскага сабора) і партрэты, сярод іх вылучаецца падвойны «Аўтапартрэт з жонкаю» (1729). У той жа час увагу на сябе звярнулі графічныя працы галандцаў Адрыяна Шхонэбека, Пітэра Пікарта, а таксама гравюры Аляксея Зубава, вучня Шхонэбека.


© Фота Алега Трусава

Капліца з вёскі Кашыра на Ноўгарадчыне, XVIII ст.

У другой палове XVIII ст. у расійскі жывапіс прыйшлі вельмі значныя асобы, і хоць па-ранейшаму яны шліфавалі майстэрства найчасцей у замежных стажыроўках ці ў прыез-

джых мастакоў, якасны рост расійскай мастацкай школы тлумачыцца новай сістэмай навучання ў Акадэміі мастацтваў.

Антон Ласенка, сын купца і ў дзяцінстве спявак сталічнага прыдворнага хору, – пачынальнік расійскага гістарычнага жывапісу («Уладзімір перад Рагнедай», 1770) і аўтар шэрагу партрэтаў. Фёдар Рокатаў навучаўся ў замежных мастакоў – Луі Ларэна і П'етра Ратары. З 1757 г. ён вучань Акадэміі, дзе вырас у найбуйнейшага партрэтыста эпохі Асветніцтва. Працаваў збольшага ў Маскве. Найлепшыя творы – афіцыйна-парадны партрэт Кацярыны II (1780-я гг.) і шэраг інтымных – такіх, як «Партрэт Аляксандры Струйскай» (1772). Дзмітрый Лявіцкі (Нос), сын украінскага святара з Кіева, майстар параднага і інтымнага партрэта, які пераехаў у 1758 г. у Пецярбург ужо сталым жывапісцам і працягнуў навучанне ў Аляксея Антропава ў Акадэміі. Асабліва цікавыя «Партрэт Аляксандра Какорынава» (1770), архітэктара і кіраўніка Акадэміі (за яго Лявіцкі атрымаў званне акадэміка Акадэміі мастацтваў), і парны інтымны «Партрэт выхаванак Смольнага інстытута Хрушчовай і Хаванскай» (1773). Уладзімір Баравікоўскі, сын украінскага іканапісца з Міргарада, пачынаў з вывучэння рэлігійнага мастацтва ў свайго бацькі. Трапіўшы у Пецярбург, ён увайшоў у колы сталічнай інтэлігенцыі і прадоўжыў навучанне ў Дзмітрыя Лявіцкага і Ёгана Лампі. Партрэтыст, з 1795 г. – акадэмік. Дзве грані яго дару адлюстравання мадэлі – парадная і прыватная. Першая – вобраз князя Аляксея Куракіна (1801–1802). Другая – славуты партрэт Марыі Лапухіной (1797).



*У. Баравікоўскі.*
Партрэт Марыі Лапухіной

Тварылі ў гэты час і значныя скульптары – найперш італьянец Карла-Барталамеа Растрэлі, бацька не раз ужо згаданага архітэктара Франчэска Бартала-

меа; француз Эцьен-Марыс Фальканэ; рускія разьбяры Фядот Шубін, Фёдар Гардзееў, Міхаіл Казлоўскі, Феадосій Шчадрын. Найбольш значным сярод іх лічыцца класіцыст і майстар партрэта Фядот Шубін.


© Shakko

*Ф. Шубін.*
Бюст Захара Чарнышова

Большасць яго прац – бюсты, часам выразна-псіхалагічныя; адзін з найлепшых – Паўла І (1798). Аднак і працу Міхаіла Казлоўскага «Самсон, які раздзірае пашчу льву» (1800) галоўнага фантана Пецяргофа можна лічыць агульнавядомай. Пры гэтым самым значным скульптурным творам XVIII ст. у Расіі варта прызнаць конны помнік Пятру І у Пецярбургу (1766–1782). На замову Кацярыны ІІ (і паводле рэкамендацыі Дэні Дзідро) яго выканаў выкліканы з Парыжа Фальканэ разам з вучаніцай Мары Ан Кало. Усталяваны да 20-годдзя царавання Кацярыны ІІ, ён стаў першым агульнадзяржаўным манументам, які заклаў новую традыцыю грамадска значнай прапагандысцкай мемарыяльнай скульптуры. Яна атрымала свой працяг у пазнейшыя часы.

У Палеху, недалёка ад Іванава, узнік цэнтр іканапісу і фрэскавага ды тэмпернага жывапісу. Працы народных умельцаў-самародкаў з Палеха сёння вядомыя далёка за межамі Расіі.

У музыцы Расіі XVIII ст. пачаў развівацца жанр песеннай оперы (творы Міхаіла Сакалоўскага, Васілія Пашкевіча, Еўсцігнея Фаміна). У галіне інструментальнай музыкі звярталі на сябе ўвагу творы для скрыпкі Івана Хандошкіна. Вядомым у Расіі кампазітарам таго часу быў украінец Дзмітрый Бартнянскі, аўтар хароў, канцэртаў, шэдэўраў рэлігійнай музыкі.

У 1702 г. у Маскве ствараецца першы Публічны тэатр, у якім працавалі (да 1706 г.) збольшага прыезджыя акторы з Заходняй Еўропы.

У 1740-х гг. у Яраслаўлі з'явілася першая расійская прафесійная тэатральная трупа на чале з Фёдарам Волкавым, якая з 1752 г. працавала ў Пецярбургу, а яшчэ праз 4 гады пераехала ў пастаянны



*А. Ласенка.* Фёдар Волкаў

будынак, у дом Галавіна на Васільеўскім востраве.

У Маскве ў 1757 г. пачала працаваць італьянская опера Лакатэлі. У Эрмітажным тэатры пры двары Кацярыны II арганізоўваліся аматарскія спектаклі. Вядомыя былі прыгонныя тэатры князя Юсупава ў Архангельскім, графа Шарамецева ў Астанкіне, графа Зорыча ў беларускім Шклове (пасля анексіі яго Расіяй). Пры канцы стагоддзя ў Пецярбургу працавалі ўжо каля 160 актораў, сярод іх і першыя расійскія актрысы – Мар'я і Вольга Ананьіны.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Аднадворцы*** – дзяржаўныя сяляне (да 1866), якія адначасова з заняткам сельскай гаспадаркай на атрыманых імі невялікіх зямельных надзелах ажыццяўлялі ахову паўднёвых межаў Расійскай дзяржавы.

***Адыходнікі*** – сяляне, змушаныя адыходзіць на заробкі ў іншыя мясцовасці.

***Бурмістр*** – пасаджаны царом (пачынаючы ад Пятра I) кіраўнік горада, падпарадкаваны бурмістарскай палаце.

***Ваенна-прамысловы комплекс (ВПК)*** – саюз сістэмы нацыянальнай ваеннай вытворчасці і палітычных сіл, зацікаўленых у яе прыярытэтным развіцці.

***Вялікі князь*** – прыватны родавы тытул членаў расійскай імператарскай сям'і.

***Вярхоўны таемны савет*** – найвышэйшы дарадчы орган у Расіі (1726–1730), які складаўся з 7–8 асоб.

***Гараднічы*** – галава адміністрацыйнай улады ў Расіі на ўзроўні ўезда (павета). Пасада існавала да 1862 г.

***Генерал-губернатар*** – найвышэйшага рангу службовая асоба ў Расійскай імперыі, якая валодала вайсковай і цывільнай уладай на тэрыторыі адной або некалькіх губерняў.

***Граф*** – дваранскі тытул у Расіі, устаноўлены Пятром І. Усяго было вызначана больш за 300 графскіх родаў.

***Грэнадзёры*** – з часоў Пятра І адборныя пяхотныя роты (пазней – палкі) у расійскай арміі.

***Губерня*** – з 1708 г. галоўная адміністрацыйная адзінка тэрыторыі Расіі, якая падзялялася на ўезды (паветы).

***Дзяржаўныя (казённыя) сяляне*** – з XVIII ст. былыя чарнасошныя сяляне і сяляне-аднадворцы. Жылі на дзяржаўных землях, выконвалі павіннасці на карысць дзяржавы, але лічыліся асабіста свабоднымі.

***Калегіі*** – органы цэнтральнага галіновага кіравання, створаныя ў 1718 г. Пятром І замест прыказаў.

***«Кандыцыі»*** – умовы, выстаўленыя Ганне Іванаўне ў 1730 г. пры запрашэнні яе заняць расійскі трон. Стаўшы імператрыцай, яна адмовілася выконваць большасць «кандыцый».

***Магістраты*** – саслоўныя органы мясцовага самакіравання, створаныя ў 1720-х гг. для вырашэння судовых, паліцэйскіх, фінансавых пытанняў (нейкі час называліся таксама ратушамі). У 1775 г. пераўтвораны ў суды для гарадскіх саслоўяў. Ліквідаваны пасля судовай рэформы 1864 г.

***Маёнтак (имение)*** – землеўладанне з сядзібай.

***Манастырскія сяляне*** – сяляне, якія належалі манастырам. У сярэдзіне XVIII ст. колькасць такіх сялян-мужчын складала агулам каля 900 тыс. чалавек. Пазней утварылі катэгорыю эканамічных сялян.

***Мануфактура*** – форма прамысловай вытворчасці, заснаваная на ручной працы і падзеле працоўных аперацый.

***Месячына*** – шасцідзённая паншчына прыгонных сялян, пазбаўленых сваіх надзелаў, за месячны харчовы паёк; фактычна форма нявольніцтва. Існавала ў XVIII – першай палове XIX ст.

***Мяшчане*** – падатнае саслоўе ў Расійскай імперыі, былыя пасадскія людзі – рамеснікі, гандляры і домаўласнікі.

***Намесніцтва*** – у апошняй чвэрці XVIII ст. адміністрацыйная адзінка ў Расійскай імперыі, якая складалася з дзвюх-трох губерняў.

***Обер-пракурор*** – у Расійскай імперыі высокі чыноўнік, які ўзначальваў Сінод, а таксама начальнік канцылярыі Сената.

***Падатныя саслоўі*** – сяляне і мяшчане, якія плацілі падушныя падаткі, выконвалі рэкруцкую ды іншыя натуральныя павіннасці.

***Пасесійныя сяляне*** – у XVIII – першай палове XIX ст. сяляне, якія на-

кіроўваліся на працу на мануфактурах і маглі надалей быць прададзены толькі разам з імі.

***Рэкруты*** – асобы з падатных саслоўяў, якія прымаліся на вайсковую службу паводле найму або павіннасці. Рэкруцкая павіннасць напачатку была пажыццёвай, але ў 1793 г. была скарочана да 25 гадоў.

***Сенат*** – найвышэйшы орган кіравання Расіі, створаны Пятром I у 1711 г. Спачатку функцыянаваў як орган калектыўнага кіравання пры адсутнасці цара, пазней стаў заканадаўчым органам і судовай інстанцыяй. Рэформу Сената, падзел яго на дэпартаменты правяла Кацярына II. З 1782 г. Сенат існаваў як найвышэйшы судовы орган.

***Сінод*** – найвышэйшы орган кіравання расійскай праваслаўнай царквой, заснаваны Пятром I пасля скасавання пасады патрыярха.

***Табель аб рангах*** – закон, зацверджаны Пятром I у 1722 г., згодна з якім у Расійскай імперыі ўводзілася 14 рангаў (чыноў) дзяржаўнай службы – вайсковай, цывільнай і прыдворнай.

***Таемная канцылярыя*** – орган палітычнага нагляду і вышуку, створаны Пятром I, а пасля яго смерці ўзноўлены імператрыцамі Ганнай Іванаўнай і Лізаветай Пятроўнай. У 1762–1801 гг. існаваў як дэпартамент Сената пад назвай «таемная экспедыцыя».

***Улажэнскія (уложенные) камісіі*** – часовыя калегіяльныя органы, якія ствараліся ў XVIII ст. дзеля кадыфікацыі законаў, што былі прыняты і пачалі дзейнічаць пасля прыняцця Саборнага Улажэння ў 1649 г.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА

Алленов, М. Русское искусство XVIII – начала XX века. Т. 2. Москва: Трилистник, 2000. С. 3–115.

Анисимов, Е. В. Время петровских реформ. Ленинград: Лениздат, 1989. 496 с.

Анисимов, Е. В. Россия без Петра. С.-Петербург: Лениздат, 1994. 496 с.

Громыко, М. М. Западная Сибирь в XVIII в. Русское население и земледельческое освоение. Новосибирск: Наука, Сибирское отделение, 1965. 267 с.

Грушевский, Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. С. 378–481.

История СССР с древнейших времен до конца XVIII в. / Под ред. Б. А. Рыбакова. Москва: Высшая школа, 1983. С. 385–390, 393.

Краткий курс истории России с древнейших времён до начала XXI в.: учеб. пособие / Р. А. Арсланов [и др.]; под ред. В. В. Керова. Москва: Астрель, 2013. С. 183–281.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. XVII–XVIII стагоддзі. Мінск: Беларусь, 2010. С. 133–171.

Ливанова, Т. Н. Русская музыкальная культура XVIII века в ее связях с литературой, театром и бытом: исследования и материалы. Т. 1. Москва: Музгиз, 1952. 536 с. Т. 2. Москва: Музгиз, 1953. 476 с.

Миронов, Б. Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.). С.-Петербург: Дмитрий Буланин, 2000. Т. 1: 548 с.

Мыльников, А. С. Искушение чудом. Русский принц и самозванцы. С.-Петербург: Наука, 1990. 272 с.

Немцы в истории России: документы высших органов власти и военного командования. 1652–1917 / сост. В. Ф. Дизендорф. Москва: Материк, 2006. С. 55–350.

Павленко, Н. Вокруг трона. Москва: Мысль, 1999. 864 с.

Российские государи. Их происхождение, интимная жизнь и политика. Москва: Новости, 1993. С. 5–190.

Россия в XVIII веке глазами иностранцев / пер. с англ. Ленинград: Лениздат, 1989. 544 с.

Русское искусство барокко / авт.-сост. М. Алексеева [и др.]. Москва: Наука, 1977. 240 с.

Три века: От Смуты до нашего времени / под ред. В. В. Каллаша. Москва: Юнвес, 2006. Т. 3: 320 с., т. 4: 384 с.

Художественная культура. XVIII – начало XXI века: пособие / авт.-сост. С. Ю. Лебедев. Минск: Дизайн ПРО, 2007. С. 26–40, 77–83, 95–108.

Черкасов, П., Чернышевский, Д. История Императорской России от Петра Великого до Николая II. Москва: Междунар. отношения, 1994. С. 3–180.

Энгельгард, Л. Н. Записки. Русские мемуары. Избранные страницы. XVIII в. / сост. И. И. Подольская. Москва: Изд-во «Правда», 1988. 560 с.

Cracraft, J. The Revolution of Peter the Great. Harvard University Press, 2003. 240 p.

Korotyński, Bruno W. Rzeź Pragi. Warszawa: Komitet Obchodu Rocznicy, 1924. 23 s.

# 9. РАСІЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

***9.1. Спробы ліберальных пераўтварэнняў пры Аляксандру І.*** Улюбёны ўнук Кацярыны ІІ Аляксандр атрымаў добрую адукацыю, ажаніўся з бадэнскай прынцэсай Луізай Марыяй Аўгустай. У цэлым ён трымаўся ліберальных поглядаў. Аляксандр І вырашыў пачаць у Расіі рэформы і дзеля іх распрацоўкі стварыў Негалосны камітэт. Адным з галоўных распрацоўшчыкаў рэформаў у Расіі стаў Міхаіл Спяранскі, сын простага святара. У 1802 г. замест калегій у Расіі стварылі *міністэрствы*, якія складаліся з асобных дэпартаментаў. Спяранскі атрымаў пасаду дзяржаўнага сакратара і лічыўся другой асобай у імперыі. Ён падрыхтаваў «Уводзіны ва ўкладанне дзяржаўных законаў» (1808–1809) і прапанаваў праводзіць выбары ў органы мясцовага самакіравання (*валасныя*, *павятовыя* і *губернскія думы*) на чале з *Дзяржаўнай думай* Расіі. Галасаваць мелі б права мужчыны (акрамя прыгонных сялян) пачынаючы з 25 гадоў. Разглядалася пытанне і аб скасаванні прыгону.

У 1810 г. быў створаны *Дзяржаўны савет*, члены якога прызначаліся царом. У 1811 г. Спяранскі здолеў скараціць дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту за кошт увядзення новых падаткаў. У галіне адукацыі з'явіліся *ліцэі* і новыя гімназіі, адкрываліся новыя ўніверсітэты. Так, у 1803 г. быў урачыста адкрыты Віленскі ўніверсітэт – на месцы колішняй езуіцкай акадэміі. Аднак увесну 1812 г. Спяранскага выслалі ў Ніжні Ноўгарад, і большасць яго прапаноў так і засталася на паперы.

***9.2. Удзел Расіі ў напалеонаўскіх войнах.*** Аляксандр І заключыў ваенны саюз з Аўстрыяй, і ў 1805 г. пачалася вайна з Францыяй. *Пад Аўстэрліцам* расійская і аўстрыйская арміі былі разбітыя, у выніку чаго Аўстрыя падпісала мір з Францыяй, а парадзелыя расійскія войскі вярнуліся дадому. У наступным 1806 г. Аляксандр І стварыў

ваенны альянс з Прусіяй і зноў пачаў вайну з Францыяй. У дзвюх бітвах пруская армія была разбіта; Напалеон захапіў Берлін і заняў большую частку Прусіі.

Кароль Прусіі схаваўся ў Кёнігсбергу, куды на дапамогу яму прыйшлі расійскія войскі. Усю зіму 1806–1807 гг. ішлі баі вакол Кёнігсберга. Улетку 1807 г. Напалеон разбіў расійскае войска пад *Фрыдландам* і акупаваў усю Прусію. Расійская армія адступіла на правы бераг Нёмана.

Аляксандр І заключыў замірэнне з Напалеонам, пры гэтым сустрэўся з ім асабіста ў горадзе *Тыльзіце.* Расійскі цар дамогся захавання Прусіі, якая страціла палову сваіх земляў. На тых польскіх тэрыторыях, якія Прусія забрала падчас падзелаў Рэчы Паспалітай, Напалеон стварыў напалову марыянеткавую дзяржаву *Герцагства Варшаўскае.* Беластоцкую вобласць пры гэтым атрымаў Аляксандр І.

Таксама ў Тыльзіце была заключана таемная дамова пра падзел сфер уплываў у Еўропе паміж Расіяй і Францыяй. Адпаведна дамове за 7 ліпеня 1807 г. у сферу інтарэсаў Расіі ўключылі Швецыю разам з Фінляндыяй, Турцыю з дунайскімі княствамі і пралівамі і Заходнюю Арменію. Аляксандр мусіў далучыцца да кантынентальнай блакады Англіі, прызнаць аўтаномію Герцагства Варшаўскага і адмовіцца ад уплыву на краіны, якія былі захопленыя Францыяй.

Новую сакрэтную канвенцыю Напалеон і Аляксандр І падпісалі 12 кастрычніка 1808 г. у горадзе *Эрфурце.* Яе ўмовы паўтарылі Тыльзіцкі мір. Аднак Расіі вельмі не падабалася паступовае адраджэнне Польшчы, якая магла аднавіцца ў межах Рэчы Паспалітай 1772 г. Таму 16 студзеня 1810 г. у Санкт-Пецярбургу падрыхтавалі новую канвенцыю, паводле якой Францыя абяцала цалкам не аднаўляць польскую незалежнасць. Аднак Напалеон яе не падпісаў. Тады Аляксандр І вырашыў напасці на польскую аўтаномію і ў кастрычніку 1811 г. заключыў саюз з Прусіяй.

Была зроблена і адпаведная ідэалагічная падрыхтоўка. Яшчэ ў верасні 1806 г. Аляксандр сваім маніфестам загадаў расійскай праваслаўнай царкве рыхтаваць насельніцтва імперыі да «айчыннай вайны» з французамі і бязбожнікамі. Вось жа, невыпадкова ў Расіі вайну з Напалеонам 1812 г. называюць Айчыннай. Наогул у царскім

*Б. Чорыкаў.*
Імператар Аляксандр I
у Вільні, 1812 г.



атачэнні распрацавалі каля 10 розных планаў вядзення вайны з Напалеонам: некаторыя з іх прадугледжвалі напад на французскую армію ў Прусіі.

Выведка данесла Напалеону аб падрыхтоўцы Аляксандра I да вайны, і французскі імператар пачаў актыўна дзейнічаць. У лютым 1812 г. ён заключыў саюз з Прусіяй і вырашыў пачаць вайну з Расіяй першым. Дзякуючы Тыльзіцкаму міру Аляксандр I здолеў пачаць вайну са Швецыяй (1808–1809), падчас якой ён забраў Фінляндыю. Потым ён напаў на Турцыю (1811). У 1812 г. Расія атрымала ад Турцыі Бесарабію.

Адначасова ў Расіі ішла актыўная падрыхтоўка да вайны з Напалеонам. На месцы гістарычнага цэнтра беларускага горада Бабруйска была пабудаваная вялікая крэпасць, а на мяжы з Польшчай, уздоўж Нёмана, паставілі дзве арміі – Пятра Баграціёна і Міхаіла Барклая-дэ-Толі. Сам Аляксандр I тады знаходзіўся ў Вільні.

Напалеон сабраў Вялікую армію (жаўнераў з усёй Еўропы) і ў чэрвені 1812 г. без абвяшчэння вайны напаў на Расію. Ён адразу захапіў Вільню, а потым пачаў пераследаваць дзве асобныя расійскія арміі, каб па чарзе іх разбіць.

Аляксандр I прызначыў камандзірам усіх войскаў Барклая, а сам паехаў спачатку ў Маскву, потым – у Санкт-Пецярбург. Асноўныя ваенныя дзеянні разгарнуліся на беларускіх тэрыторыях. Расійскія войскі вельмі хутка адступалі і ўрэшце здолелі аб'яднацца пад Смаленскам. Некалькі дзён ішоў бой пад мурамі Смаленска, і расійскія войскі зноў адступілі. Тым часам Аляксандр прызначыў камандзірам сваіх войскаў генерала ад інфантэрыі Міхаіла Галянішчава-Кутузава.

26 жніўня 1812 г. Кутузаў вырашыў даць генеральны бой Напалеону пад Мажайскам, каля Барадзіна. Падчас *Барадзінскай бітвы* ў расійскім войску было каля 110 тыс. салдат, а ў французаў – каля 130 тыс. За дзень бітвы загінула, было паранена і знікла без вестак з абодвух бакоў да 100 тыс. чалавек. Фактычна ў гэтай бітве пераможцаў не было, хоць кожны бок лічыў пераможцам сябе.



*Б. Чорыкаў.* Галоўны камандзір войскаў князь Кутузаў. 1812 г.

Кутузаў, які страціў ледзьве не палову арміі, пачаў адступаць да Масквы і вырашыў здаць горад Напалеону без бою. 2 верасня 1812 г. у горад увайшоў Напалеон. Захапіўшы Маскву, Напалеон чакаў паслоў ад Аляксандра I, але той не спяшаўся. У Маскве палыхалі пажары, харчавання не было, а войскі Кутузава не пускалі французаў у глыбіню Расіі. У сярэдзіне кастрычніка Напалеон пакінуў Маскву і пайшоў на Калугу, але быў разбіты пад *Малаяраслаўцам* і мусіў павярнуць на Смаленскую дарогу.

Яшчэ ў Вільні Напалеон паабяцаў аднавіць ВКЛ і пачаў вербаваць у сваю армію мясцовую шляхту. Тая шляхта, якая не паспела трапіць у расійскую армію, пайшла да французаў. У войскі ВКЛ мабілізавалі каля 21 тыс. чалавек, прытым некаторыя нават трапілі ў гвардыю Напалеона. У лістападзе 1812 г. адбылася вялікая *бітва на Бярэзіне*, каля горада Барысава. Расійскія войскі нанеслі французам паражэнне, але не здолелі іх абкружыць, і тыя адступілі да Вільні. Напалеон вывеў з Расіі толькі 15–20 тыс. салдат, астатнія загінулі ці трапілі ў палон.

Аляксандр I распачаў вялікую вайну ў Еўропе. Да яго далучыліся Прусія, Аўстрыя, Швецыя і Англія. Аднак Напалеон стварыў новую армію, і пасля гэтага на нямецкай тэрыторыі адбылося некалькі вялікіх бітваў. Самая вялікая, Бітва народаў, адбылася пад *Ляйпцыгам*. Напалеон гэтую бітву прайграў і адступіў на тэрыторыю

Францыі. Увесну 1814 г. войскі Расіі і Прусіі захапілі Парыж, Напалеон падпісаў капітуляцыю і быў высланы на італьянскі востраў Эльбу.

Каб вызначыць межы ў Еўропе, у 1814 г. пачаўся Венскі кангрэс, дзе рэй вялі Расія, Аўстрыя і Прусія. Польскія землі зноў перадзялілі. Цэнтральную Польшчу забрала Расія і ўтварыла Царства Польскае на чале з расійскім імператарам. Познань аддалі Прусіі, а Галіччыну – Аўстрыі.

Пакуль ішоў Венскі кангрэс, Напалеон уцёк з вострава Эльбы і зноў захапіў уладу ў Францыі. Адбылася *бітва пры Ватэрлоа*, дзе войскі Прусіі і Англіі яшчэ раз разбілі французаў. Напалеона выслалі на востраў святой Алены ў Індыйскім акіяне, там ён і памёр. Расійскія войскі зноў часова акупавалі Францыю.

14 верасня 1815 г. пераможцы падпісалі Свяшчэнны саюз. Гэта была кансерватыўная арганізацыя, мэтай якой было задушэнне ў Еўропе любых рэвалюцый, вальнадумства і рэлігійнай талерантнасці.

***9.3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст.*** На пачатку XIX ст. Расія была абсалютнай манархіяй з феадальна-прыгонніцкай сістэмай гаспадарання. Паводле колькасці насельніцтва і ўзброеных сіл Расія была самай моцнай у Еўропе, але эканоміка яе была адсталай і архаічнай. Толькі 5 % памешчыцкіх гаспадарак былі перадавымі, мелі машыны і ўжывалі новыя формы апрацоўкі зямлі. Аднак у XIX ст. у Расіі пакрысе пачала фарміравацца *нацыянальная буржуазія*. Гэта былі купцы, арандатары зямлі, уласнікі млыноў, заезных двароў (корчмаў) і мануфактур. У 1801 г. была дазволена вольная купля-продаж незаселенай зямлі. У 1803 г. памешчыкі атрымалі магчымасць за выкуп вызваліць сваіх прыгонных сялян. Ад 1818 г. сяляне мелі права ісці на будаўніцтва фабрык і заводаў. Узніклі цэлыя буржуазныя дынастыі: Прохаравы, Марозавы, Рабушынскія, Тучковы і іншыя.

Хоць Расія заставалася тэхнічна адсталай краінай, першы параход тут з'явіўся ў 1815 г., першая чыгунка – у 1837 г. Аляксандр I хацеў палепшыць становішча сялян. У 1808 г. ён забараніў памешчыкам прадаваць сялян на базарах, а ў 1809 г. – высылаць іх на катаргу. Пас-

ля перамогі над Напалеонам быў ліквідаваны прыгон у Эстляндыі, Ліфляндыі і Курляндыі.

Пасля перамогі над Францыяй на першыя ролі ў імперыі выйшаў граф Аляксей Аракчэеў. Ён пачаў ствараць на базе дзяржаўных сялян ваенныя пасяленні. Гэтыя сяляне павінны былі араць зямлю і адначасова служыць у войску. Іх дзеці (*кантаністы*) з малых гадоў таксама прыцягваліся да вайсковай службы. Сяляне як маглі аказвалі супраціў, які жорстка тлуміўся.

Другі ўлюбёнец цара князь Аляксандр Галіцын кіраваў міністэрствам спраў асветы і духоўных спраў. Былі адчынены ўніверсітэты ў Дэрпце (Юр'еве) у 1802 г., Вільні (1803), Казані (1804) і Харкаве (1804). У сталіцы стварылі педагагічны інстытут, які ў 1819 г. стаў універсітэтам. Амаль ва ўсіх губернскіх гарадах адкрыліся гімназіі, а ў павятовых – вучылішчы. Было створана таксама некалькі ліцэяў, у тым ліку знакаміты Царскасельскі, які закончыў будучы вялікі паэт Аляксандр Пушкін.

***9.4. Пачаткі апазіцыйных рухаў: таемныя таварыствы, дзекабрысты і іх выступленне ў 1825 г.*** У XIX ст. у Расіі сфарміраваліся тры грамадскія плыні: кансерватары, лібералы і рэвалюцыянеры. Кансерватары выступалі за захаванне абсалютнай манархіі, лібералы няспынна прапаноўвалі розныя рэформы, а рэвалюцыянеры выступалі за гвалтоўную змену ўлады.

Прадстаўніком кансерватараў быў вядомы гісторык і літаратар, згаданы раней Мікалай Карамзін. Менавіта ён у 1811 г. накіраваў Аляксандру I «Нататку аб старажытнай і новай Расіі», у якой выступіў за захаванне абсалютнай манархіі. Адразу ж пасля напалеонаўскіх войнаў у Расіі сярод маладых афіцэраў, актыўных удзельнікаў вайны 1812 г., узнікае рух людзей, якіх пазней назавуць дзекабрыстамі. Пасля таго як яны пабачылі Еўропу, яны захацелі вялікіх змен і ў Расіі.

Іх першая таемная арганізацыя «Союз спасения» была створана ў сталіцы Расіі ў 1816 г. Удзельнікі выступалі за адмену прыгону. На грунце Саюза выратавання ў 1818 г. у Маскве стварылі «Союз благоденствия», куды ўваходзіла каля 200 чалавек. Яны выступалі за адмену прыгону і паступовыя, цягам 10 гадоў, ліберальныя змены ў жыцці краіны. На падпольным з'ездзе ў Маскве ўдзельнікі

выказаліся за змену ўлады праз узброенае паўстанне. У 1821–1822 гг. былі створаны Паўднёвае і Паўночнае таварыствы.

У 1823 г. ва Украіне ўтварылася падпольная арганізацыя «Таварыства паяднаных славян», якая ў восень 1825 г. далучылася да Паўднёвага таварыства. Кожнае таварыства мела свае праграмныя дакументы. Гэта былі «Руская праўда» (аўтар Павел Пестэль) і «Канстытуцыя» (аўтар Мікіта Мураўёў). Паводле Мураўёва Расія мелася быць канстытуцыйнай манархіяй з парламентам (народным вечам). Абвяшчаліся свабода слова, перасоўвання і веравызнання. Пестэль прапаноўваў ліквідаваць манархію, абвясціць Расію рэспублікай. Улада, паводле яго, павінна была знаходзіцца ў руках парламента, які б выбіралі мужчыны з 20-гадовага ўзросту тэрмінам на 5 гадоў. Пестэль і Мураўёў выступалі за ліквідацыю прыгону. Аднак дзекабрысты, асабліва Пестэль, выступалі супраць нацыянальнага самавызначэння любых народаў імперыі (абмежаваныя выключэнні дапускаліся толькі ў дачыненні да Фінляндыі і Польшчы).

Самае вялікае выступленне адбылося 14 снежня 1825 г. у сталіцы неўзабаве пасля таго, як раптоўна памёр Аляксандр І. Другое паўстанне выбухнула 20 снежня 1825 г. у Чарнігаве. Улады жорстка задушылі спробы паўстанняў і арыштавалі іх кіраўнікоў. Самых актыўных пакаралі смерцю, астатнія пайшлі ў Сібір на катаргу.

***9.5. Унутраная і знешняя палітыка Мікалая І.*** Паколькі ў Аляксандра дзяцей не засталося, імператарам павінен быў стаць яго брат Канстанцін Паўлавіч, які жыў у Варшаве. Аднак той адмовіўся ад трона, і ўлада перайшла да малодшага сына Паўла І і яго жонкі Сафіі Марыі Даратэі Аўгусты Вюртэмбергскай – Мікалая Паўлавіча, жанатага з прускай прынцэсай Фрыдэрыкай Луізай Шарлотай Вільгельмінай.

Пасля жорсткага пакарання дзекабрыстаў Мікалай І пачаў умацоўваць абсалютную ўладу і змагацца з вальнадумствам. Сваім апірышчам ён зрабіў памешчыкаў і рознага кшталту бюракратыю (чыноўнікаў усіх табеляў і рангаў). На пачатку 30-х гадоў XIX ст. з'явілася ідэалагічнае абгрунтаванне рэакцыйнай палітыкі царызму – тэорыя афіцыйнай народнасці, распрацаваная міністрам народнай асветы графам Сяргеем Уваравым.

У 1832 г. Увараў у сваім дакладзе Мікалаю I вылучыў формулу падмурку існавання расійскай імперыі: «Самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць». Паводле гэтай канцэпцыі, рускі народ складаецца з трох плямён – велікаросаў (самае галоўнае), маларосаў (украінцаў) і бела русаў. Астатнія жыхары імперыі – іншародцы: яны не маюць тых правоў, што «рускія». Любы выступ супраць самадзяржаўя ці праваслаўнай царквы разглядаўся як злачынства.



Мікалай I. *Гравюра Т. Райта* (?), 1826 г.

Пачалі прапагандавацца чарговыя гістарычныя міфы – напрыклад, пра селяніна Івана Сусаніна, які нібыта ў 1613 г. «загінуў ад рук інтэрвентаў-палякаў», але не выдаў ім месцазнаходжання цара.

Ва ўмовах рэакцыі і рэпрэсій у 40-х гадах XIX ст. у Расіі склаліся дзве ідэалагічныя плыні: заходнікі і славянафілы. Лідарамі славянафілаў былі Іван Кірэеўскі, Аляксей Хамякоў, Юрый Самарын, Канстанцін Аксакаў. Сярод заходнікаў былі Павел Аненкаў, Іван Ганчароў, Іван Тургенеў, Пётр Чаадаеў. Пазней па некаторых пытаннях апошніх падтрымлівалі Аляксандр Герцэн і Вісарыён Бялінскі.

Абедзве плыні выступалі за скасаванне прыгону. Славянафілы разважалі пра асаблівы гістарычны шлях Расіі, галоўнай каштоўнасцю называлі праваслаўе, лічылі, што аснова Расіі – гэта сялянская грамада (абшчына). Яны моцна крытыкавалі Пятра I ды яго празаходнія рэформы і лічылі, што менавіта ён павёў Расію «не туды» і пазбавіў краіну сваёй самабытнасці. Заходнікі адзначалі, што велікаруская самабытнасць – гэта негатыўная з'ява, хвалілі рэформы Пятра I, аднак крытыкавалі ягоны дэспатызм. Яны казалі, што Расія і Заходняя Еўропа ідуць адным гістарычным шляхам і што Расія павінна пазычыць досвед Еўропы. Яны лічылі, што краінай павінна кіраваць адукаваная меншасць.

Ліберальныя ідэі заходнікаў і славянафілаў сур'ёзна паўплывалі на расійскае грамадства. Іх ідэі зноў адрадзіліся ў сучаснай Расіі; зноў ідуць і не спыняюцца спрэчкі сярод расійскай эліты. Адныя чарговы раз даводзяць, нібыта Расія адыгрывае месіянскую ролю цэнтра сапраўднага (праваслаўнага) хрысціянства і Трэцяга Рыма. Другія (на жаль, іх меншасць) бачаць Расію часткай Еўропы, якая ідзе звычайным шляхам сусветна-гістарычнага развіцця.

У 30–40-х гг. XIX ст. у расійскім жыцці пачынае ўзнікаць плынь рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі. Яе заснавалі згаданыя вышэй Вісарыён Бялінскі і Аляксандр Герцэн. З аднаго боку, яны крытыкавалі славянафілаў і казалі пра адзіны гістарычны шлях Заходняй Еўропы і Расіі, з іншага – выступалі супраць замены феадальнай эксплуатацыі капіталістычнай. Яны сталі прыхільнікамі сацыялізму. Але пасля 1848 г., калі рэвалюцыя ў Еўропе была задушана, яны ўжо разглядалі будучыню Расіі як лад, створаны ў выніку сялянскай рэвалюцыі. Узнікла тэорыя Герцэна пра *расійскі сялянскі сацыялізм*, угрунтаваны на сялянскай грамадзе.

Пасля знішчэння руху дзекабрыстаў узмацніўся паліцэйскі вышук і цэнзура. У 1826 г. у складзе імператарскай канцылярыі ўтварылі *ІІІ аддзяленне* – таемную палітычную паліцыю. У 1836 г. пры гэтым аддзяленні быў створаны *жандарскі корпус*, сапраўднае апірышча самадзяржаўя. Вярнулі з працяглай высылкі Сперанскага, які склаў 45 тамоў Поўнага збору законаў Расійскай імперыі. У 1837–1841 гг. з ініцыятывы графа Пятра Кісялёва была праведзена рэформа дзяржаўных сялян. У 1839 г. адбылася фінансавая рэформа, ініцыятарам якой быў граф Георг Людвіг (Ягор) Канкрын.


© Фота І. Ностыца

Імам Шаміль, 1859 г.

Яшчэ ў 1817 г. пачалася Каўказская вайна, якая доўжылася да 1864 г. Горныя плямёны, асабліва чачэнцы, пад камандай імама Шаміля з дапамогай Англіі, Турцыі і Персіі цягам

доўгіх гадоў мужна стрымлівалі расійскія войскі, вялі няспынную горную партызанскую вайну.

У задушэнні супраціву каўказскіх народаў асабліва змрочную ролю адыграў царскі генерал Аляксей Ярмолаў, іменем якога жанчыны Паўночнага Каўказа яшчэ доўгі час палохалі сваіх дзяцей.



Іван Паскевіч-Эрыванскі, 1859 г.
*Гравюра П. Барэля*, да 1865 г.

У 1830 г., калі ў Польшчы хацелі паслаць мясцовых жаўнераў на Каўказ, адбылося ўзброенае выступленне на чале з афіцэрамі войска Царства Польскага. Узначаленыя імі атрады здолелі захапіць тэрыторыю Царства Польскага, і паўстанне перакінулася на былую тэрыторыю ВКЛ (Літву і Заходнюю Беларусь). Супраць паўстанцаў накіравалі вялікае войска, якое пад камандай генерал-фельдмаршала Івана Паскевіча 28 жніўня 1831 г. захапіла Варшаву і самым брутальным чынам задушыла паўстанне.

Польскую Канстытуцыю 1815 г. скасавалі. У 1832 г. быў зачынены Віленскі ўніверсітэт. Царства Польскае абвясцілі неад'емнай часткай Расійскай імперыі. Палітыка паланізацыі на былой тэрыторыі ВКЛ змянілася на інтэнсіўную русіфікацыю. У 1839 г. намаганнямі свецкіх уладаў была ліквідаваная царкоўная унія. Большасць уніятаў далучылі да расійскай праваслаўнай царквы, а рэшта стала рымакаталікамі. У 1849 г. Мікалай I накіраваў у Аўстрыю вялікую армію, якая задушыла венгерскую рэвалюцыю. Цара пачалі называць *жандарам Еўропы*.

***9.6. Крымская вайна. Смерць Мікалая I***. На працягу XVIII ст. Расія страціла ў войнах з Турцыяй ад 220 да 265 тыс. чалавек. Мікалай I быў чалавекам вельмі амбіцыйным і праводзіў актыўную ваенную палітыку на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. Захапіўшы Прычарнамор'е, Расія пачала імкнуцца на Балканы, каб пад маскай

сяброў праваслаўных народаў, што пакутуюць пад турэцкім прыгнётам, узяць у свае рукі міжземнаморскія пралівы. Гэтаму спрыялі паўстанне 1821 г. грэкаў супраць Турцыі і вайна Егіпта супраць Асманскай імперыі ў пачатку 30-х гадоў XIX ст.

Адначасова Расія аказвала ваенны ціск на Персію і Турцыю ў Закаўказзі. Армяне атрымалі права вольнага перасялення на тэрыторыі Расіі: у 1828 г. з Эрыванскага і Нахічэванскага ханстваў была вылучана армянская вобласць пад расійскім кіраваннем. Персіі было забаронена мець ваенны флот на Каспійскім моры, дзе расійскія караблі атрымалі свабоду перамяшчэння. На працягу 1846–1854 гг. быў канчаткова далучаны да Расіі Казахстан з насельніцтвам больш за 2 млн чалавек. У 1854 г. расійцы заснавалі горад *Верны* (цяпер *Алматы*).

У 1853 г. узнікла спрэчка паміж каталікамі і праваслаўнымі за храмы ў гарадах Бэтлееме і Іерусаліме, якія ў той час належалі Турцыі. У справу ўмяшаўся спачатку Мікалай І, а потым Францыя і Англія. Гэтыя краіны разам з Турцыяй заключылі ваенны альянс супраць Расіі. У лістападзе 1853 г. расійскі флот на чале з адміралам Паўлам Нахімавым напаў на базу турэцкага флоту ў горадзе Сінопе, знішчыў турэцкія караблі і берагавыя ўмацаванні. Гэта стала нагодай для ўступлення ў вайну Англіі і Францыі.

На пачатку сакавіка 1854 г. яны абʼявілі вайну Расіі. Саюзнікі заблакавалі ў Балтыйскім моры расійскія базы Кранштат і Свеаборг, нават паспрабавалі захапіць Петрапаўлаўск-Камчацкі. Асноўныя сілы высадзіліся ў Крыме, і з верасня 1854 г. пачалася блакада Севастопаля, якая доўжылася 11 месяцаў.



Бітва за Севастопаль.
1854 г.
*З гравюры XIX ст.*

Вайна паказала жахлівую адсталасць царскай Расіі ад заходніх краін. 1,5 млн чалавек былі мабілізаваныя ў рэкруты і апалчэнне. Дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту ў той час узрос да 800 млн рублёў, вываз хлеба з краіны скараціўся ў 13 разоў, ільну – у 8, пянькі – у 6, нават сала – у 4 разы. Вёска паставіла на фронт вялікую колькасць людзей, а таксама вазоў з коньмі.

Адсутнасць чыгункі і брукаваных дарог да Крыма прывяла да здачы Севастопаля. Расійскі флот, які яшчэ хадзіў пад ветразямі, быў затоплены каля ўваходу ў севастопальскую бухту. Еўрапейскія жаўнеры, якія мелі новую зброю, што страляла на значную адлегласць, забівалі на падыходах да сваіх пазіцый расійскіх салдат, узброеных крамянёвымі стрэльбамі. Дарэчы, расійскія гарматы стралялі яшчэ ядрамі замест снарадаў.

Мікалай І нечакана памёр на пачатку 1855 г. Існуе версія, што ён прыняў атруту ў выніку прайгранай вайны. Пасля яго смерці новы цар Аляксандр ІІ падпісаў у Парыжы мірную дамову. Расіі было забаронена мець на Чорным моры крэпасці, арсеналы і ваенны флот. У Расіі таксама забралі вусце Дуная і частку Бесарабіі. Яна ўжо не мела права падтрымліваць Сербію і Дунайскія княствы. На пэўны час Расійская імперыя страціла прэстыж вялікай еўрапейскай дзяржавы.

***9.7. Першыя рэформы Аляксандра II***. Аляксандр II (гады ўладарання – 1855–1881), які прыйшоў да ўлады дарослым чалавекам (у 36 гадоў) і быў жанаты з гесэнскай прынцэсай Максімільянай Аўгустай Вільгельмінай Сафіяй Марыяй, атрымаў добрую адукацыю. Пасля паражэння ў Крымскай вайне ён зразумеў, што без рэформаў краіна можа спыніць сваё існаванне.

Пасля пэўнай падрыхтоўкі 19 лютага 1861 г. цар падпісаў *Маніфест аб скасаванні прыгону*. Гэта значна змяніла сітуацыю ў краіне, дзе жылі 22 млн прыгонных,19 млн дзяржаўных



Аляксандр II.
*Гравюра XIX ст.*

і 2 млн удзельных сялян. Сяляне атрымалі права браць шлюбы без дазволу памешчыкаў, вольна перамяшчацца па краіне ў пошуках працы, займацца прадпрымальніцтвам. Яны займелі прозвішчы і пашпарты.

Аднак галоўнае зямельнае пытанне засталося. Прысядзібную зямлю, дзе стаялі іх дамы, сяляне атрымалі бясплатна, а панскія ворныя землі засталіся ў памешчыкаў. Сяляне павінны былі атрымаць надзелы. Гэтую зямлю мусілі даваць памешчыкі ў карыстанне, каб сяляне з яе харчаваліся і плацілі падушны падатак. За гэта сяляне або працавалі на памешчыка, або плацілі прадуктамі ці грашыма падатак (*аброк*).

Каб атрымаць зямлю ва ўласнасць, сяляне мусілі заплаціць выкуп, а грошай яны не мелі. Таму 80 % сумы за зямлю аплаціла дзяржава, а 20 % – самі сяляне. Сяляне апынуліся ў падвойнай кабале. 49 гадоў (да 1906 г.) сяляне вярталі сваю пазыку дзяржаве, а таксама мусілі адначасова працаваць (да 1883 г.) на памешчыкаў.

Самі памешчыкі захапілі частку былых сялянскіх земляў, якімі тыя карысталіся да 1861 г. (лугі, лясы, сенажаці, вадаёмы) і прымусілі сялян плаціць арэнду за карыстанне імі. Аднак і пасля ўсіх выкупаў сяляне не атрымалі зямлю ў прыватную ўласнасць, бо зямля перадавалася сялянскай грамадзе, і сяляне маглі гэтай зямлёй карыстацца без права продажу.

Кожная грамада дзяліла зямлю на 10–20 палеткаў, кожны палетак меў сваё прызначэнне (розныя сельгаскультуры, гароды і г. д.). Кожны палетак дзяліўся на палоскі – іх і атрымлівалі сялянскія сем'і. Кожная палоска мела мяжу. У 1860 г. на сярэднюю сялянскую душу прыпадала па 4 дзесяціны зямлі, а ў 1900 г. – толькі па 2 дзесяціны. Усё гэта выклікала незадавальненне сялян: пачасціліся іх бунты.

У студзені 1862 г. быў упершыню апублікаваны дзяржаўны бюджэт Расіі. У 1863 г. адбылася *ўніверсітэцкая рэформа*. Пачалі выбіраць рэктара, дэканаў і прафесараў. ВНУ пачалі атрымліваць замежную літаратуру, а таксама без цэнзуры друкаваць сваю. Усе ўнутраныя праблемы вырашала ўніверсітэцкая рада.

Былі праведзены *школьныя рэформы*. У 1864 г. быў зацверджаны статут гімназій. Сярэднюю адукацыю маглі атрымаць усе грамадзяне

незалежна ад саслоўя і веравызнання. За вучобу ў гімназіі трэба было плаціць. Існавалі тры тыпы пачатковых школ: міністэрскія, земскія і царкоўна-прыходскія. Працавалі класічныя і рэальныя гімназіі. Узнікла жаночая адукацыя. У 1858 г. з'явіліся жаночыя вучылішчы, а з 1862 г. – жаночыя гімназіі. У 70-х гг. XIX ст. былі створаны Вышэйшыя жаночыя курсы. Самыя вядомыя з іх, *Бястужаўскія*, існавалі ў Пецярбургу.

*Земская рэформа* пачала дзейнічаць з 1864 г., але земствы былі створаныя толькі ў 34 губернях Цэнтральнай Расіі. Гэта былі структуры мясцовага самакіравання, якія выбіраліся на 3 гады на трох выбарчых з'ездах: землеўласнікаў, сялян і гараджан. Земствы займаліся праблемамі адукацыі, аховы здароўя, поштай, дарогамі, мясцовай прамысловасцю і гандлем. Яны мелі права збіраць падаткі і браць на працу службоўцаў.

У 1870 г. пачалася *гарадская рэформа*, якая прывяла да стварэння гарадскога самакіравання, падобнага паводле сваёй сутнасці да земскага. Раз на 4 гады заможныя жыхары гарадоў (іх было 509) выбіралі *гарадскія думы*, якія потым стваралі *гарадскія ўправы*. Думай і ўправай кіраваў гарадскі галава.

***9.8. Іншыя рэформы***. У 1864 г. пачалося ажыццяўленне *судовай рэформы* – самай значнай рэформы ў тагачаснай Расіі. Стварыліся новыя суды: *каронны і міравы*. Каронны суд складаўся з дзвюх інстанцый: *акруговы суд* (у межах губерні) і *судовая палата*. Суд стаў агульным для ўсіх грамадзян Расійскай імперыі. Дробныя грамадзянскія справы вырашаў міравы суд. Складаныя справы вырашалі акруговыя суды з дапамогай *калегіі прысяжных-лаўнікаў*: іх выбіралі з ліку дваран, гараджан і сялян. Прысяжныя канчаткова вырашалі, з'яўляецца падазраваны вінаватым ці не. Былі ўведзены пасады адваката, пракурора і судовага следчага; створана сістэма апеляцый.

Самая высокая судовая інстанцыя – Сенат. Кароннага суддзю пажыццёва прызначаў міністр юстыцыі. Таму суды сталі фактычна незалежнымі і праходзілі адкрыта, з удзелам прэсы. У газетах і часопісах з'явіліся раздзелы судовай хронікі. Рэформа друку пачалася ў 1865 г. Папярэднюю цэнзуру ліквідавалі, але ўвялі карную

цэнзуру за асобныя публікацыі, справа даходзіла нават да закрыцця выдання. Існавала і духоўная цэнзура.

Адбылася *царкоўная рэформа*. Цяпер святарамі маглі стаць не толькі дзеці святароў, але і іншыя ахвотныя грамадзяне. Існавалі духоўныя семінарыі і акадэміі. Пэўныя правы атрымалі старавeры, сектанты і прадстаўнікі іншых рэлігій.

Даволі паспяхова ажыццяўлялася *вайсковая рэформа*. У 1874 г. скасавалі рэкруцкі набор і ўвялі для мужчын ва ўзросце з 20 гадоў абавязковую вайсковую службу, аднолькавую для ўсіх саслоўяў. Краіну падзялілі на 15 вайсковых акруг, стварылі вайсковыя суды, заснавалі вучэльні для афіцэраў.

Служба на сушы доўжылася 6 гадоў, а на флоце – 7. Прызваных у войска салдат вучылі чытаць і пісаць. Чым большая была адукацыя ў прызыўніка, тым менш ён служыў у войску. Студэнты ад абавязковай вайсковай службы вызваляліся. На загад міністра абароны ў 60-х гадах XIX ст. да ўсіх заходніх і паўднёвых межаў імперыі праклалі чыгункі, а ў 1870 г. з'явіліся чыгуначныя войскі.

***9.9. Знешняя палітыка Аляксандра II.*** Пасля катастрофы царскага ўрада ў Крымскай вайне пэўныя колы на тэрыторыі Польшчы пачалі рыхтаваць чарговае паўстанне супраць Расіі. Улетку 1862 г. у Варшаве быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт, якому падпарадкоўваўся Літоўскі правінцыйны камітэт у Вільні. Паўстанцы прапанавалі захаваць панам прыватную ўласнасць на зямлю, а сялянам аддаць без выкупу зямлю, якую ім перадалі ў карыстанне пасля 19 лютага 1861 г. Прапаноўвалі таксама скасаваць рэкруцтва, адрадзіць уніяцкую царкву.

Паўстанне пачалося ў Варшаве 22 студзеня 1863 г. Неўзабаве да паўстання далучыўся і Віленскі камітэт на чале з беларусам Вінцэнтам Канстанцінам (Кастусём) Каліноўскім. Паўстанцы падзяліліся на дзве групоўкі: белых і чырвоных. У склад белых уваходзілі магнаты і буйная шляхта, якія спадзяваліся на падтрымку Англіі і Францыі і хацелі захаваць свае буйныя землеўладанні. Чырвоныя, на чале з вышэйзгаданым Каліноўскім, рабілі стаўку на сялян, у тым ліку выпускалі для іх на беларускай мове газету «Мужыцкая праўда». Паўстанне насіла партызанскі характар і адбывалася ў вясковай

мясцовасці. Асноўная частка паўстанцаў – гэта дробная шляхта, чыноўнікі, студэнты, некаторыя афіцэры царскай арміі, крыху сялян, а таксама прадстаўнікі каталіцкага духавенства.

У красавіку 1863 г. амбасадары Англіі, Аўстрыі і Францыі звярнуліся да міністра замежных спраў Расіі Аляксандра Гарчакова з заявай аб занепакоенасці лёсам польскага народа. Францыя і Англія прапанавалі склікаць еўрапейскую канферэнцыю дзеля абмеркавання лёсу Царства Польскага. Але Расія выказала нязгоду і накіравала значныя вайсковыя сілы дзеля задушэння паўстання. На тэрыторыі Польшчы імі камандаваў граф Фёдар Берг, на тэрыторыі былога ВКЛ – граф Міхаіл Мураўёў, вельмі жорсткі царскі чыноўнік.

Да лета 1864 г. паўстанне было задушана; пачаліся вялікія рэпрэсіі. Аўтаномію Царства Польскага ліквідавалі, падзялілі яго тэрыторыю на 10 губерняў і назвалі Прывісленскім краем. Велікарускую мову ўвялі ва ўсе сферы жыцця. У 1875 г. канчаткова ліквідавалі унію на тэрыторыі Люблінскай губерні. Намаганнямі Міхаіла Мураўёва хваля русіфікацыі на тэрыторыі Беларусі і Літвы дасягнула свайго апагею.

Наогул, Аляксандр II праводзіў актыўную знешнюю палітыку. Дзякуючы ціску на Кітай у 1858 г. да Расіі далучылі Амурскую вобласць, а ў 1860 г. – Усурыйскі край. Паўднёвы Сахалін абмянялі з Японіяй на Курыльскія астравы. У 1876 г.было канчаткова знішчана Какандскае ханства: на яго тэрыторыі стварылі *Ферганскую вобласць*. У 1868 г. расійскія войскі захапілі горад Самарканд і частку Бухарскага ханства, у выніку чаго хан Бухары стаў васалам Расіі. У 1873 г. Расія заняла горад Хіву, і хіванскі хан таксама прызнаў уладу цара. У 1881 г. расійцы захапілі галоўную туркменскую крэпасць Геок-тэпе і выйшлі на мяжу з Афганістанам.

Да 1864 г. быў канчаткова заваяваны Каўказ. Блізу 200 тысяч горцаў перасяліліся ў Турцыю, каб не жыць пад расійскім прыгнётам.

У кастрычніку 1870 г. Расія, скарыстаўшыся франка-прускай вайной, абвясціла пра скасаванне ўмоў Парыжскага трактата. У 1871 г. на Лонданскай канферэнцыі Расія атрымала права на аднаўленне Чарнаморскага флоту і сваіх пазіцый на Балканах. У 1873 г. Германія, Аўстрыя і Расія падпісалі Альянс трох імператараў, паводле якога Расія канчаткова выйшла з міжнароднай ізаляцыі і пачала актыўныя дзеянні на Балканах.

Спачатку Расія запатрабавала ад Турцыі даць аўтаномію Босніі і Герцагавіне, потым у 1876 г. падтрымала Сербію і Чарнагорыю ў вайне з Турцыяй і, нарэшце, 12 красавіка 1877 г. сама аб'явіла вайну Турцыі. Улетку таго самага года адбыліся вялікія *баі за Шыпкаўскі перавал*, у лістападзе была ўзятая вялікая турэцкая крэпасць Плеўна. 3 студзеня расійцы захапілі Сафію, потым разбілі туркаў пад Канстанцінопалем. Адначасова на Каўказе расійскія войскі захапілі гарады-крэпасці Ардаган і Карс. 19 лютага 1878 г. у мястэчку *Сан-Стэфана* Турцыя падпісала мірную дамову з Расіяй. У адпаведнасці з ёй Сербія, Румынія і Чарнагорыя атрымалі поўную незалежнасць, Балгарыя стала аўтаномнай, а Расія вярнула сабе паўднёвую Бесарабію і захапіла вялікія тэрыторыі на Каўказе, дзе жылі пераважна армяне (гарады Ардаган, Карс, Батум і Баязет).

Аднак пад ціскам заходніх краін Расія мусіла падпісаць 1 ліпеня 1878 г. з Асманскай імперыяй новую (*Берлінскую*) дамову, паводле якой тэрыторыя аўтаномнай Балгарыі зменшылася, Аўстра-Венгрыя атрымала Боснію і Герцагавіну, а закаўказскія тэрыторыі, забраныя Расіяй у Турцыі, абмежаваліся толькі трыма гарадамі (Карс, Батум і Ардаган).

***9.10. Грамадска-палітычныя плыні і тэрарыстычныя арганізацыі Расіі ў другой палове XIX ст.*** У 1861 г. *разначынцы* (ліберальная расійская інтэлігенцыя) стварылі таемную рэвалюцыйную арганізацыю «Зямля і воля» (праіснавала да 1864 г.). Яна складалася з асобных гурткоў, якія заняліся прапагандай сярод сялян, але вялікіх поспехаў не дамагліся.

Пад уплывам ідэй Герцэна і Чарнышэўскага ў Расіі ўзнік рэвалюцыйны *рух народнікаў*. Яны былі прыхільнікамі ўтапічнага сацыялізму, калі селянін – натуральны сацыяліст, а вясковая грамада – «зародак» сацыялізму. Народнікі выступалі супраць капіталістычнага развіцця Расіі, ідэалізавалі ролю ў гісторыі асобы (героя), што вядзе за сабою масы («натоўп») на сацыялістычную рэвалюцыю. Лідарамі народнікаў сталі Міхаіл Бакунін, Пётр Лаўроў, Мікалай Міхайлоўскі і Пётр Ткачоў. Яны сфарміравалі тры плыні народнікаў: бунтары-анархісты, прапагандысты-асветнікі, змоўшчыкі-тэрарысты.

Лідарам анархістаў стаў Міхаіл Бакунін, які выступаў супраць лю-

бой дзяржавы як апарату гвалту і прымусу. Ён выступаў за сялянскі бунт і сялянскую рэвалюцыю. У выніку апошняй, на яго думку, замест дзяржавы павінна ўзнікнуць федэрацыя вольных сялянскіх грамадаў і рабочых арцеляў. Лідар прапагандыстаў Пётр Лаўроў сваю тэорыю выклаў у «Гістарычных пісьмах», надрукаваных у 1868–1869 гг. Ён лічыў, што цёмнае сялянства не гатова да рэвалюцыі – яго трэба вучыць ды рыхтаваць да яе. Ён выступаў за стварэнне моцнай партыі на прынцыпах дэмакратычнага цэнтралізму. Ідэалам Лаўрова быў маральна чысты беззаганны рэвалюцыянер – лідар будучай рэвалюцыі. Пётр Ткачоў быў лідарам змоўшчыкаў: ён лічыў, што ўладу можа ўзброеным шляхам захапіць група рэвалюцыянераў, каб потым пачаць будаваць сацыялістычнае грамадства. Адзін з прыхільнікаў Ткачова Сяргей Нячаеў стварыў таемнае таварыства «Народная расправа» і напісаў працу «Катэхізіс рэвалюцыянера», у якой сцвярджаў, што рэвалюцыйная мэта апраўдвае любыя сродкі дзеля яе ажыццяўлення. У 1869 г. у Маскве ён забіў студэнта, якога лічыў здраднікам, а потым уцёк за мяжу. Але ў 1872 г. швейцарскія ўлады выдалі яго ў Расію, дзе ён быў зняволены на 20 гадоў і памёр у турме.

Увесну 1864 г. народнікі арганізавалі акцыю «паход у народ» з мэтай агітацыі сярод сялян. Аднак акцыя пацярпела поўную няўдачу, і шмат якія яе ўдзельнікі былі арыштаваны. У 1876 г. народнікі стварылі новую падпольную арганізацыю з ужо вядомай назвай «Зямля і воля», у якую ўвайшлі будучыя вядомыя рэвалюцыянеры і тэрарысты. Яны выступалі за перадачу зямлі сялянам, за тое, каб перасяляцца ў вёску ў якасці настаўнікаў, фельчараў, пісараў, дробных чыноўнікаў. Але і гэтая акцыя плёну не прынесла.

У жніўні 1879 г. на аснове «Зямлі і волі» стварыліся яшчэ дзве арганізацыі: «Народная воля» (1879–1882) і «Чорны перадзел» (1879–1884). Прыхільнікі «Чорнага перадзелу» (да іх залучалі сябе Георгій Пляханаў, Павел Аксельрод, Леў Дэйч і Вера Засуліч) крытыкавалі тэрор і выступалі за асвету і прапаганду сярод сялян. Тым часам народавольцы (Аляксандр Міхайлаў, Мікалай Марозаў, Андрэй Жалябаў, Соф'я Пяроўская ды іншыя) зрабілі стаўку на тэрор і арганізавалі сем замахаў на жыццё цара. У лютым 1880 г. імператар ледзьве не загінуў ад выбуху ў Зімовым палацы. Міністрам унутраных спраў паставілі



Замах на Аляксандра II
у Пецярбургу
1 сакавіка 1881 г.
*Гравюра з нямецкай газеты XIX ст.*

генерала, армяніна паводле паходжання Міхаіла Лорыс-Мелікава, які прапанаваў цару прадоўжыць ліберальныя рэформы. Аднак раніцай 1 сакавіка 1881 г. беларускі шляхціч-нарадаволец Ігнат Грынявіцкі забіў цара і сам загінуў падчас замаху. Час аляксандраўскіх рэформаў скончыўся, пачалася рэакцыя.

***9.11. Унутраная і знешняя палітыка Аляксандра III (1881–1894).*** Пасля прыходу да ўлады Аляксандр III пад уплывам кансерватара обер-пракурора Сінода Канстанціна Пабеданосцава практычна згарнуў ліберальныя рэформы, распачатыя Аляксандрам II.

Нягледзячы на пэўныя поспехі ў навуцы і культуры, Расія заставалася адсталай краінай, у якой пры канцы XIX ст. тры чвэрці насельніцтва заставаліся непісьменнымі. На пачатку 80-х гг. XIX ст. у Еўропе назіраўся эканамічны крызіс, які паўплываў і на эканоміку Расіі. Сітуацыю ў краіне пагоршыў голад 1891 г.

У 1893 г. Аляксандр III прызначыў міністрам фінансаў Расіі Сяргея Вітэ, які заставаўся на гэтай пасадзе да 1903 г. і адыграў важную ролю ў эканамічным жыцці краіны. Пры ім істотна вырас экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі, была ўведзена дзяржаўная манаполія на продаж гарэлкі і тытуню, што прынесла казне вялікі даход.

З развіццём капіталізму ў Расіі пачынаецца *рабочы рух*. Першыя страйкі рабочых адбыліся на мануфактурах у 1870 і 1872 гг. У 1875 г. у Адэсе выхадзец з дваранскай сям'і народнік Яўгеній Заслаўскі стварыў першы ў Расіі Паўднёва-расійскі саюз рабочых, куды ўваходзіла каля 250 чалавек. Саюз меў статут, у якім ішла гаворка пра

забеспячэнне правоў рабочых праз страйкі і гвалтоўны пераварот. Аднак у снежні 1875 г. паліцыя разграміла гэтую арганізацыю. 15 чалавек разам з лідарам былі арыштаваны і трапілі на катаргу або ў высылку.

У 1878 г. у сталіцы стварыўся Паўночны саюз рускіх рабочых колькасцю больш за 200 чалавек. Кіраўнікамі яго былі рабочыя Віктар Абнорскі і Сцяпан Халтурын. У 1879 г. саюз нелегальна надрукаваў сваю праграму «Да рускіх рабочых», у якой роля рабочага класа была вызначаная як ключавая ў сацыяльнай рэвалюцыі. У лютым 1880 г. выйшла першая нелегальная газета «Рабочая заря». Але друкарню неўзабаве разграміла паліцыя, лідары арганізацыі былі арыштаваны, і яна спыніла сваё існаванне.



Аляксандр III са сваёй жонкай, дацкай прынцэсай Дагмарай (Марыяй Фёдараўнай)

У 1885 г. адбыўся Марозаўскі *страйк рабочых* на тэкстыльнай фабрыцы каля горада Арэхава-Зуева (Уладзімірская губерня). Супраць рабочых накіравалі войскі, лідараў страйку арыштавалі, але суд іх апраўдаў. У 1882 г. закон забараніў начныя працы дзецям да 12 гадоў, была створана *фабрычная інспекцыя*. У 1885 г. прынялі закон, які забараняў начныя працы жанчынам і падлеткам. У 1886 г. з'явіўся яшчэ адзін закон: ён абмежаваў памеры штрафаў да адной трацiны ад заробку рабочага.

У 1883 г. у Жэневе Георгій Пляханаў стварыў групу «Вызваленне працы», куды ўступілі былыя народнікі з групы «Чорны перадзел». Галоўнай мэтай гэтай групы стала распаўсюджванне ў Расіі ідэй марксізму праз пераклад на рускую мову твораў Маркса і Энгельса. Пляханаў адмовіўся ад ідэй народнікаў і іх стаўкі на сялян. Ён лічыў, што да сацыялізму можна прыйсці дзякуючы рабочаму класу, або *пралетарыяту*. У 1884 г. з'явілася праграма арганізацыі, а ў 1887 г. – праект праграмы *расійскіх сацыял-дэмакратаў*.

Пасля таго як у 1882 г. Германія, Аўстра-Венгрыя і Італія падпісалі *Траісты саюз*, Расія пачала ў сваёй знешнепалітычнай арыентацыі пераключацца на Францыю. У 1887 г. з'явіліся царскія ўказы, якія абмежавалі прыток нямецкага капіталу ў Расію. Тады ж Расія пачала рэгулярна атрымліваць французскія пазыкі.

Улетку 1891 г. у Кранштат прыплыла французская вайсковая эскадра, і 27 жніўня было заключана сакрэтнае расійска-французскае пагадненне аб узаемадапамозе. Праз год падпісалі вайсковую канвенцыю. У студзені 1894 г. Аляксандр III ратыфікаваў вайсковую дамову з Францыяй, і яна набыла міжнародную моц. Дарэчы, у часы праўлення Аляксандра III Расія ні з кім не ваявала, што з'яўляецца ўнікальным выпадкам у гісторыі гэтай краіны.

Аляксандр III працягваў палітыку русіфікацыі і вёў яе не толькі ў дачыненні да палякаў, але і да прыбалтыйскіх (остзейскіх) немцаў. Так, у 1893 г. Дэрпт (сёння Тарту ў Эстоніі) атрымаў старую назву Юр'еў, а ў мясцовым універсітэце з нямецкай мовы выкладанне перавялі на велікарускую.

У 1890 г. Аляксандр III абвясціў, што Фінляндыя – гэта складовая частка Расійскай імперыі і істотна абмежаваў яе аўтаномію.



Мікалай II

Увосень 1894 г. расійскі імператар раптоўна захварэў і 20 кастрычніка 1894 г. памёр у сваім палацы Лівадзія (недалёка ад Ялты ў Крыме). Да ўлады прыйшоў яго сын Мікалай II (1894–1917).

Амбасадар Францыі ў Расіі ў 1915–1916 гг. Марыс Палеалог падлічыў, што ў крыві Мікалая II толькі $^{1}/_{128}$ частка была рускай, невялікі працэнт складала дацкая кроў, уся ж астатняя кроў – нямецкая. Сам жа Мікалай ажаніўся з дачкой вялікага герцага гесэнска-рэйнскага і брытанскай прынцэсы Вікторыяй Алісай Геленай Луізай Беатрысай, якая пасля праваслаўнага хросту прыняла імя

Аляксандры Фёдараўны і адыгрывала істотную ролю ў дзяржаўных справах Мікалая пасля таго, як той зрабіўся імператарам. Калі ў 1913 г. у Расіі адзначалася 300-годдзе дынастыі Раманавых, у краіне былі забароненыя выданні, у якіх царская дынастыя называлася дынастыяй Гальштэйн-Готарф-Раманавых.

***9.12. Культура і навука Расіі ў XIX ст.*** Немалыя здабыткі культуры Расіі ў XIX ст. у вялікай ступені звязаны з тым, што ў краіне пачала абуджацца нацыянальная свядомасць як колькасна самага вялікага этнасу – велікаросаў, так і іншых этнічных і нацыянальных супольнасцяў імперыі. Пэўным чынам гэтаму паспрыяла вайна з Напалеонам 1812 г., у выніку якой высветлілася, што дагэтуль вялікая частка расійскага дваранства ў штодзённым жыцці аддавала перавагу мове акупантаў перад мовамі, на якіх гаварылі прыгонныя сяляне гэтага самага дваранства. Праблема, аднак, палягала ў тым, што адсталая, замкнёная сацыяльна-эканамічная сістэма царскай краіны, адсутнасць усерасійскага рынку, магчымасці свабоднага абмену думкамі паміж рознымі пластамі інтэлігенцыі яшчэ доўгі час былі вялікай перашкодай для нацыянальнай кансалідацыі расійскіх этнасаў. Толькі эканамічныя зрухі другой паловы XIX ст. дазволілі больш ці менш аформіць нацыянальна-кансалідацыйныя працэсы.

Пэўныя захады царскі ўрад рабіў і зверху: адкрываліся губернскія бібліятэкі, стваралася больш-менш адзіная адукацыйная прастора. У 1802 г. было заснавана міністэрства народнай асветы, а згаданы намі раней універсітэцкі статут 1804 г. замацаваў пэўную аўтаномію ўніверсітэтаў. Вакол універсітэцкіх гарадоў ствараліся вучэбныя акругі, якім падпарадкоўваліся ўсе навучальныя ўстановы ніжэйшай і сярэдняй ступеняў адукацыі на адпаведнай тэрыторыі. У сярэдзіне XIX ст. пачала стварацца сетка спецыяльных навучальных устаноў – кадэцкіх карпусоў, вайсковых акадэмій, тэхнічных інстытутаў, камерцыйных вучэльняў. Падрыхтоўка будучых чыноўнікаў пачала ажыццяўляцца на базе ліцэяў. Сямікласныя гімназіі давалі фармальную магчымасць вучыцца ў іх дзецям прадстаўнікоў розных саслоўяў, хоць высокая плата за вучобу абмяжоўвала такія магчымасці. Аднак у 1887 г. урадам Аляксандра III быў выдадзены цыркуляр пра так званых «кухарчыных дзяцей», згодна з якім у гімназіі ўжо было заба-

ронена прымаць дзяцей прадстаўнікоў ніжэйшых класаў – дробных крамнікаў, рамізнікаў, прачак, лёкаяў і да т. п. У сваю чаргу, у 1884 г. быў прыняты новы Уўніверсітэцкі статут, які фактычна скасоўваў аўтаномію ВНУ. У гэты самы час была істотна падвышана плата за ўніверсітэцкую адукацыю, а таксама была закрытая большасць вышэйшых жаночых курсаў.

Пры канцы XIX ст. расійскі ўрад выдаткоўваў на асвету ў сярэднім толькі каля 2 % бюджэту імперыі: на адукацыю адной асобы прыпадала прыкладна ў 10 разоў менш грошай, чым у Англіі ці ў Францыі. Тым не менш у гэты час у Расіі ўжо дзейнічалі 10 універсітэтаў, у якіх навучалася каля 30 тыс. студэнтаў. Акрамя таго, працавалі яшчэ 53 іншыя ВНУ (інстытуты, кадэцкія карпусы, установы шляхетных дзяўчат і да т. п.).

На базе ўніверсітэтаў узніклі пэўныя навуковыя цэнтры. Так, на ўвесь свет была вядомая астранамічная абсерваторыя Віленскага ўніверсітэта, якую на працягу доўгіх гадоў, яшчэ з канца 1770-х, узначальваў беларус Марцін Пачобут-Адляніцкі. У 1839 г. падобная абсерваторыя на чале з таленавітым руска-нямецкім астраномам Фрыдрыхам Георгам (Васіліем) Струвэ была закладзеная ў Пулкаве, пад Пецярбургам.

Важныя адкрыцці ў галіне матэматыкі здзейснілі Мікалай Лабачэўскі (Казанскі ўніверсітэт), Пафнуцій Чабышоў (Пецярбургскі ўніверсітэт); у галіне хіміі значныя дасягненні мелі Мікалай Зінін, Аляксандр Бутлераў (Казанскі ўніверсітэт), Дзмітрый Мендзялееў (універсітэт і тэхналагічны ўніверсітэт у Санкт-Пецярбургу), у галіне фізікі – Аляксандр Сталетаў (Маскоўскі ўніверсітэт; апісанне фотаэлектрычных з'яў).

Супрацоўнік аматарскага гуртка пры Маскоўскім політэхнічным музеі Павел Яблачкаў вынайшаў дугавую лямпу і ўпершыню здзейсніў трансфармацыю пераменнага току. Выкладчык Пецярбургскага электратэхнічнага інстытута Аляксандр Ладыгін сканструяваў лямпу напальвання. Значныя напрацоўкі для будучага тэлеграфа стварылі член-карэспандэнт Пецярбургскай Акадэміі навук руска-нямецкі інжынер Паўль (Павел) Шылінг фон Канштат, а значна пазней – супрацоўнік тэхнічнага вучылішча Марскога ведамства ў Кранштаце, расійскі вынаходнік Аляксандр Папоў. Расійска-ўкра-

інскі фізіка-хімік Мікола Бекетаў з Харкаўскага ўніверсітэта стварыў тэорыю выцяснення адных металаў другімі.

У сферы электраграфіі, распрацоўкі тэхналогіі прыёму электрамагнітных хваляў на адлегласці пазней вылучыўся сваімі эксперыментамі расійска-беларускі навуковец, супрацоўнік Пецярбургскага інстытута эксперыментальнай медыцыны Якуб Наркевіч-Ёдка.

Свой унёсак у развіццё навук рабіла і Расійская акадэмія навук. Расійска-ўкраінскія матэматыкі Міхайла Астраградскі і Віктар Бунякоўскі вывучалі праблемы матэматычнай статыстыкі і тэорыі імавернасцяў.

За межамі Расіі навуковую кар'еру ў галіне матэматыкі (тэорыя дыферэнцыяльных ураўненняў з частковымі вытворнымі) зрабіла народжаная ў Маскве прадстаўніца даўняга беларускага шляхецкага роду Соф'я Кавалеўская.

Даследаваннямі прыроды электрычнасці і магнетызму паспяхова займаліся расійскі даследчык Васілій Пятроў, руска-нямецкія вучоныя Эміль Ленц, Морыц (Барыс) Якобі.

Каля вытокаў расійскай школы фізіёлагаў стаяў прафесар Маскоўскага ўніверсітэта Іван Сечанаў. У развіцці агранамічнай навукі вялікае значэнне мелі працы прафесара Пецярбургскага ўніверсітэта Васілія Дакучаева, прафесара Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі Канстанціна Ціміразева, армянскага хіміка Андрэаса Арцруні і іншых. У галіне медыцыны заслугоўвалі ўвагі працы анатама і хірурга, члена-карэспандэнта Пецярбургскай Акадэміі навук Мікалая Пірагова, прафесара сталічнай Медыка-хірургічнай акадэміі Сяргея Боткіна.

У XIX ст. не менш значнымі дасягненнямі маглі пахваліцца навукоўцы ў сферы гуманістыкі. Сярод іх расійскія філосафы і літаратары Пётр Чаадаеў, Уладзімір Салаўёў, татарскія мусульманскія багасловы і філосафы Габдэннасыр Курсаві і Шыгабутдзін Марджані, велікарускія гісторыкі Мікалай Карамзін, Сяргей Салаўёў, Цімафей Граноўскі, Васілій Ключэўскі, расійска-ўкраінскія гісторыкі Дзмітрый Бантыш-Каменскі, Мікола Кастамараў, украінскія гісторыкі Уладзімір Антановіч, Міхайла Драгаманаў, беларускія гісторыкі Ігнат Даніловіч, Міхал Баброўскі, беларуска-літоўскі гісторык Тэадор Нарбут, польскі гісторык Яўхім Лялевель, аварскі гісторык і этнограф Хайдарбек аль-Гінічукі, адыгейскі гісторык і этнограф Султан Хан-

Гірэй, беларускія этнографы Зарыян Далэнга-Хадакоўскі, Адам Ганоры Кіркор, Іван Насовіч, рускія лінгвісты Фёдар Буслаеў, Уладзімір Даль, Піліп Фартунатаў, украінскія этнографы Міхайла Максімовіч (першы рэктар Кіеўскага ўніверсітэта), Фёдар Воўк, Паўло Чубінскі, украінска-расійскія лінгвісты Восіп Бадзянскі, Ізмаіл Сразнеўскі, Аляксандр Патабня, руска-нямецкія мовазнаўцы Фрыдрых (Васілій) Радлаў, Ота Бётлінк, расійска-беларускія лінгвісты Эдуард Пякарскі, Іосіф Гашкевіч ды іншыя.

Рускія географы і падарожнікі Міхаіл Лазараў, Пётр Сямёнаў-Цяньшанскі, расійска-ўкраінскі – Мікола Міклуха-Маклай, расійска-беларускія – Мікалай Пржавальскі, Пётр Казлоў, Ян Чэрскі, руска-нямецкія – Ёган (Іван) Крузенштэрн, Фабіян (Фадзей) Белінсгаўзен, Тэадор (Фёдар) Літке, Аляксандр Мідэндорф здзейснілі і апісалі свае падарожжы ў далёкія краіны і рэгіёны свету – ад Арктыкі да Антарктыды, ад Сярэдняй Азіі да Новай Гвінеі.

Пры канцы XIX ст. у Расіі дзейнічалі больш за 20 навуковых таварыстваў: Таварыства рускіх дактароў, Рускае тэхнічнае таварыства, Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, Рускае геаграфічнае таварыства з шэрагам філіялаў ды іншыя.

Асаблівую ролю ў XIX ст. адыгрывала *мастацкая літаратура*: яе самых выбітных майстроў успрымалі як нацыянальных, народных прарокаў. Царскі ўрад пэўным чынам спрыяў пашырэнню сеткі бібліятэк і кнігарняў, у якіх даступнымі рабіліся кнігі – пераважна на велікарускай мове.

Найвышэйшага ўзроўню ў першай палове стагоддзя дасягнулі велікаруская, польска-беларуска-літоўская, украінская літаратуры, якія займелі вядомасць і па-за межамі Расійскай імперыі. На мяжы XVIII–XIX стст. у літаратуры сцвярджае сябе сентыменталізм, найбольш яскравымі прадстаўнікамі якога былі велікарускі пісьменнік, вышэйзгаданы Мікалай Карамзін, польска-беларускія паэты Францішак Князьнін, Францішак Карпінскі. Актуальным застаецца класіцызм (творы велікарускіх літаратараў: познія вершы паэта Гаўрылы Дзяржавіна, элегіі Канстанціна Бацюшкава, раннія вершы Аляксандра Пушкіна, творы ўкраінскіх паэтаў і драматургаў Івана Катлярэўскага, рэктара Харкаўскага ўніверсітэта Пятра Гулак-Арцямоўскага, Рыгора Квіткі-Аснаўяненкі, Яўгена Грабінкі).

Рамантычную плынь развіваюць велікарускія творцы Васіль Жукоўскі, той жа Пушкін, а таксама Міхаіл Лермантаў, Яўгеній Баратынскі, Фёдар Цютчаў, украінскія паэты Ляўко Баравікоўскі, Паўло Грабоўскі, руска-ўкраінскі празаік Мікалай Гогаль (першы этап творчасці), украінскі празаік Панцеляймон Куліш, польска-ўкраінскія паэты Севярын Гашчынскі, Багдан Залескі. Вяршыняй украінскага рамантызму становіцца зборнік паэзіі Тараса Шаўчэнкі «Кабзар» (1840). У 1817–1821 гг. у Віленскім універсітэце дзейнічаюць таемныя таварыствы філаматаў і філарэтаў, якія робяцца асяродкам фарміравання магутнай плыні польска-беларуска-літоўскага рамантызму, найбольш яскравыя прадстаўнікі якой – Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Антон Эдвард Адынец,



Аляксандр Пушкін.
*Гравюра Т. Райта*



Тарас Шаўчэнка



Адам Міцкевіч.
*Малюнак В. Ваньковіча*, 1823 г.

Ануфрый Петрашкевіч, Міхал Рукевіч, Аляксандр Ходзька ды іншыя. Пазней да творцаў польска-беларуска-літоўскага рамантызму далучыліся Уладзіслаў Сыракомля і Вінцэсь Каратынскі.

Позняя творчасць Пушкіна, Лермантава, Гогаля дала штуршок развіццю магутнай плыні расійскага рэалізму ў літаратуры, найбольш яскравымі прадстаўнікамі якой у сярэдзіне і пры канцы XIX ст. сталі Іван Ганчароў, Іван Тургенеў, Міхаіл Салтыкоў-Шчадрын, Мікалай Някрасаў, а ў найбольшай ступені – Фёдар Дастаеўскі, Леў Талстой, Антон Чэхаў.

Пры гэтым не трэба забываць, што літаратары тварылі ва ўмовах жорсткай цэнзуры. Адпаведныя ведамствы «ўдасканальвалі» сваю працу. У 1848 г. дзеля нагляду за перыядычнымі выданнямі быў створаны адмысловы сакрэтны (бутурлінскі) камітэт.

Ва ўкраінскай літаратуры рэалістычную плынь увасобілі позні Тарас Шаўчэнка, а таксама паэт і празаік Леанід Глібаў, празаікі і драматургі Марка Ваўчок, Іван Нячуй-Лявіцкі, Панас Мірны, Міхайла Старыцкі, Іван Карпенка-Кары, Марка Крапіўніцкі. Шырокую вядомасць ва Украіне мелі творы пісьменніка Івана Франко, які жыў і тварыў ва ўкраінскай Галіччыне.



Леў Талстой. *Партрэт мастака І. Казакова*, 1900 г.

У занятай Расіяй частцы Польшчы і ў Беларусі набылі папулярнасць творы прадстаўнікоў польскай разнавіднасці рэалізму – так званага *пазітывізму*, найбольш яскравымі прадстаўнікамі якой былі празаікі Генрык Сянкевіч, Баляслаў Прус, народжаная ў Беларусі Эліза Ажэшка, а таксама паэтка і празаік Марыя Канапніцкая. Да гэтай плыні можна аднесці і творчасць беларускіх паэтаў Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны. У сваю чаргу рысы рэалізму можна заўважыць і ў позняй творчасці беларускага драматурга Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

У рэчышчы агульнаеўрапейскіх літаратурных плыняў тварылі таксама

пісьменнікі Прыбалтыкі – латышскія пісьменнікі Рэйніс і Маціс Каўдытысы, Андрэй Пумпурс, Эдуард Вейдэнбаўм, Аспазія, літоўскія паэты Антанас Баранаўскас, Майроніс, Вінцас Кудзірка, празаік Мацеюс Валанчус, эстонскія пісьменнікі Крысціян Ян Петэрсан, Петэр Якабсан, Эдуард Борнхёэ, эстонска-нямецкі паэт Фрыдрых Рэйнгольд Крэйцвальд.

Сваё адметнае слова ў літаратуры гэтай эпохі сказалі таксама адыгейскі пісьменнік Умар Берсей, азербайджанскія пісьменнікі Мірза Фаталі Ахундаў, Сеід Азім Шырвані, Наджаф-бек Везіраў, армянскія пісьменнікі Хачатур Абавян, Рафі, Авецік Ісаакян, Аляксандр Шырванзадэ, Рафаэл Патканян, асецінскія паэты Іван Ялгузідзэ-Габараеў і Тэмірбалат Мамсураў, асецінскі празаік Інал Канукаў, башкірскі паэт і празаік Шахімардан Кашафетдзін, башкірскі і татарскі паэт Галі Чакрый, грузінскія лірыкі Нікалоз Бараташвілі, Грыгол Арбеліяні, Ілья Чаўчавадзэ, Акакій Цэрэтэлі, дагестанскія аварскія паэты Эльдарылаў з Ругуджы, Махмуд з Кахаб-Расо і Тажутдзін Чанка, дагестанскія даргінскія паэты Сукур Курбан і Амала Батырай, дагестанскія кумыкскія пісьменнікі Нухай Батырмурзаеў, Ірчы-Казак, дагестанскі лезгінскі паэт Ецім-Эмін, кабардзінскі паэт і філолаг Шора Ногмаў, кабардзінскія празаікі Султан Казы-Гірэй і Казі-Бек, казахскія пісьменнікі Абай Кунанбаеў, Ібрай Алтынсарын, калмыцкі паэт Анчхан Джыргал, комі паэт і празаік Іван Куратаў, малдаўскія пісьменнікі Канстанцін Стамаці, Багдан Хашдэу, таджыкскі пісьменнік Шамсідзін Шахін, татарскія паэты Ібатула Саліх, Шамсэтдзін Закі, Курмашы, Міфтахетдзін Акмула, татарскія пісьменнікі Абдульманіх Габдэсалям-Каргалы, Габдэлжабар Кандалый, Фаціх Халідзі, Габдрахман Ільясі, туркменскія паэты Мятаджы, Міскін-Клыч, узбекскія паэты Агахі, Насімі, Анбар-Атын, Мукімі, Фуркат, чувашскі пісьменнік Міхаіл Фёдараў ды іншыя.

*Выяўленчае мастацтва* позняга класіцызму XIX стагоддзя адзначана творчасцю расійскага жывапісца Фёдара Бруні, расійска-ўкраінскага мастака Васіля Трапініна, польскага мастака Антонія Брадоўскага, польска-беларускіх мастакоў Францішка Смуглевіча, Юзафа Аляшкевіча.

У рамантычнай плыні выяўленчага мастацтва асабліва плённа працавалі велікарускія мастакі Арэст Кіпрэнскі, Карл Брулоў,

польскія мастакі Аляксандр Арлоўскі, Пётр Міхалоўскі, беларуска-польскія жывапісцы Валянцін Ваньковіч, Юзаф Пешка, Януарый Сухадольскі, беларуска-літоўскі мастак Вінцэнт Дмахоўскі, расійска-ўкраінскі мастак Васіль Штэрнберг.

Плынь акадэмізму і новага акадэмізму рэпрэзентавалі расійскі мастак Аляксандр Іваноў, расійска-беларускі мастак Сяргей Заранка, беларускія мастакі Іван Хруцкі, Апалінар Гараўскі, Канут Русецкі, польскія мастакі Юзаф Сімлер, Генрык Семірадскі.

У 1870 г. у Расіі ўзнікае Таварыства перасоўных выставаў (рускі скарот: «передвижники»), якое дае мастацтву плеяду таленавітых жывапісцаў-рэалістаў, такіх як расійскія мастакі Іван Крамской, Мікалай Ге, Аляксей Саўрасаў, Васілій Пяроў, Васілій Паленаў, Васілій Сурыкаў, Іван Шышкін, Віктар і Апалінарый Васняцовы, расійска-ўкраінскія мастакі Архіп Куінджы, Ілья Рэпін, беларускія мастакі Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Іван Трутнеў. Да майстроў рэалістычнага жывапісу трэба таксама аднесці расійскага мастака Паўла Фядотава, расійска-ўкраінска-армянскага жывапісца Івана Айвазоўскага (Айвазяна), беларускага мастака Казіміра Альхімовіча, украінскага мастака Міколу Піманенку.

Пры канцы XIX ст. у жывапісе Расіі прыкметны ўплыў мадэрнізму, які асабліва яскрава выяўляе сябе ў палотнах расійскіх мастакоў Міхаіла Урубеля, Канстанціна Каровіна, беларуска-польскіх мастакоў Генрыха Вейсенгофа, Фердынанда Рушчыца, польскіх мастакоў Юзафа Панкевіча, Уладзіслава Падкавіньскага, Вітальда Вайткевіча.

У расійскім разьбярстве прыкметнымі з'явамі былі працы расійскіх скульптараў Фёдара Гардзеева, Міхаіла Казлоўскага, Барыса



*І. Рэпін.*
Бурлакі на Волзе,
1870–1873 гг.

Арлоўскага, Мацвея Чыжова, Аляксандра Апякушына, руска-нямецкага скульптара Пятра Клота, расійска-ўкраінскага скульптара Івана Мартаса, расійска-беларускага творцы Міхайлы Мікешына, габрэйска-беларускага скульптара Марка Антакольскага, польскага скульптара Вацлава Шыманоўскага.

У расійскай архітэктуры на пачатку XIX ст. запанаваў стыль ампір, да якога адносяцца працы такіх расійскіх дойлідаў, як Андрэй Вараніхін, Андрэян Захараў, а таксама французска-рускага архітэктара Жана Тама дэ Тамона, руска-італьянскага архітэктара Карла Росі, беларускіх архітэктараў Караля Падчашынскага, Казіміра Хршчановіча. У рэчышчы традыцыйнага класіцызму працягвалі працаваць расійскі архітэктар Васілій Стасаў, руска-італьянскі дойлід Восіп Бавэ, руска-французскі архітэктар Агюст дэ Манферан, польскі архітэктар Якуб Кубіцкі, польска-беларускі дойлід Францішак Яшчалд. Заснавальнікамі руска-візантыйскага стылю сталі Канстанцін Тон і Аляксандр Разанаў. У рускім або псеўдарускім стылі тварылі расійскія архітэктары Дзмітрый Чычагоў, Анатолій Сямёнаў, Уладзімір Шэрвуд, Віктар Гартман, руска-нямецкі архітэктар Франц-Альберт (Фёдар) Шэхтэль. У эклектычным стылі вызначыліся польскія архітэктары Гіляры Маеўскі, Густаў Ландау, нямецка-ўкраінскі дойлід Фердынанд Фельнер. Майстрамі неаготыкі праявілі сябе польскія архітэктары Уладзіслаў Лушчкевіч, Юзаф Лэпкоўскі.

Сярод будынкаў грамадзянскага прызначэння звяртаюць на сябе ўвагу гасцінныя двары, пабудаваныя ў шэрагу гарадоў Расійскай імперыі. Да іх, прыкладам, належыць збудаваны у самым пачатку XIX ст. гасцінны двор у Верхнеўдзінску (Улан-Удэ).

© Livehearted



Казанскі сабор у Санкт-Пецярбургу (*архітэктар А. Вараніхін*)



Пётр Чайкоўскі

У станаўленне класічнай музыкі на тэрыторыі Расійскай імперыі неацэнны ўклад унеслі беларускія кампазітары Восіп Казлоўскі, Антон Абрамовіч, польскі кампазітар Фрыдэрык Шапэн, беларуска-польскія кампазітары Міхал Клеафас Агінскі (вучань Казлоўскага), Напалеон Орда, Станіслаў Манюшка, Мечыслаў Карловіч, Міхал Ельскі ды іншыя.

Фактычным пачынальнікам рускай класічнай музыкі стаў кампазітар беларускага паходжання Міхаіл Глінка. Закладзеныя ім традыцыі ўвасобіліся ў творчасці Аляксандра Даргамыжскага, Пятра Чайкоўскага, а таксама кампазітараў створанай на пачатку 1850-х гг. творчай супольнасці пад назвай «Магутная кучка» (Мадэст Мусаргскі, Мікалай Рымскі-Корсакаў, Аляксандр Барадзін, Цэзар Кюі, Мілій Балакіраў і інш).

Значны ўклад у станаўленне ўкраінскай прафесійнай музыкі ўнеслі кампазітары Іван Віткоўскі, Мікола Лысенка, Мікола Аркас ды іншыя.

Важнай часткай культурнага жыцця Расійскай імперыі стала тэатральная культура. Царская ўлада аказвала вялікую падтрымку выключна тэатральным трупам, якія працавалі на велікарускай мове. Вынікам гэтага было заснаванне Малога тэатра ў Маскве (1824), Александрынскага тэатра ў Пецярбургу (1832). У першым з названых тэатраў раскрыліся таленты такіх выбітных актораў, як Павел Мачалаў, Міхаіл Шчэпкін, Марыя Вальберхава, Проў і Міхаіл Садоўскія, Кацярына Васільева, Глікерыя Фядотава, Леанід Леанідаў, Марыя Ярмолава, Аляксандра Яблачкіна. У другім вялікую папулярнасць набылі Васілій і Пётр Каратыгіны, Паліна Стрэпетава, Уладзімір Давыдаў, Вера Камісаржэўская, Канстанцін Варламаў. У іншых расійскіх тэатрах адзначыліся сваім майстэрствам Павел Васільеў, Іван Барэцкі, Аляксандра Стралкова, Хіёнія Таланава,

Лідзія Яворская, Дзмітрый Карамазаў ды іншыя. У Нацыянальным польскім тэатры ў Варшаве раскрываўся талент геніяльнай актрысы Хелены Маджаеўскай.

За кошт прыватных спонсараў у імперыі існавалі і нацыянальныя тэатральныя трупы, у якіх, сярод іншага, з поспехам выступалі армянскія акторы Пятрос Адамян, Мкртыч Авалян, Сірануш, Пагос Араксян, грузінскія артысты Васілій Абашыдзэ, Нато Габунія, азербайджанскі актор Джангір Зейналаў, украінскія актрысы Марыя Занькавецкая, Ефрасіння Зарніцкая, Ганна Затыркевіч-Карпінская, Марыя Садоўская-Барылоці, латышская актрыса Берта Румніецэ ды іншыя.

У 1825 г. на месцы былога маскоўскага прыватнага тэатра быў створаны Вялікі тэатр, на падмостках якога ў XIX ст. вызначаліся сваім выканальніцкім майстэрствам расійскія оперныя спевакі Мар'я Кліментава, Аляксандра Меньшыкава, Фёдар Камісаржэўскі, Дзмітрый Усатаў, руска-чэшскі спявак Антон Барцал, беларуская спявачка Яўгенія Лінёва, руска-французская балерына Феліцата Гюлень-Сор, расійскія балерыны Ганна Сабяшчанская, Праскоўя Лебедзева. У пецярбургскіх Марыінскім і Вялікім тэатрах бліскучую кар'еру зрабілі расійскія оперныя выканаўцы Ганна Бічурына, Лізавета Касецкая, Яўгенія Мравіна, Леанід Якаўлеў, руска-чэшскі спявак Ёзэф Палечак, армянская спявачка Алена Тэр'ян-Карганава, расійскія балерыны Аўдоцця Істоміна, Кацярына Целешава, Матыльда Мадаева ды іншыя. У Марыінскім тэатры працяглы час працаваў знакаміты французска-рускі балетмайстар і танцоўшчык Марыус Петыпа.

***9.13. Палітычнае жыццё Расіі ў пачатку XX ст. Набліжэнне крызісу самаўладдзя.*** У 90-я гг. XIX ст. у Расіі з'явілася палітычная плынь пад назвай «легальныя марксісты». Яны стараліся абысці царскую цэнзуру і ў сваіх кнігах і артыкулах папулярна растлумачыць сутнасць марксізму. Яны крытыкавалі народнікаў, лічылі капіталізм прагрэсіўнай з'явай і абавязковай прыступкай на шляху да сацыялізму. Легальныя марксісты выступалі супраць рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыяту. У гэты час у розных гарадах Расіі пачалі з'яўляцца марксісцкія гурткі, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі рабочых і інтэлігенцыі. Найбольш актыўна працаваў пецярбургскі

«Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Сярод яго кіраўнікоў з'явіўся малады рэвалюцыянер Уладзімір Ульянаў.

Ульянаў (які пазней возьме сабе псеўданім *Ленін*) нарадзіўся ў горадзе Сімбірску, выгадаваўся ў сям'і інспектара народных вучэльняў. Яго родны брат Аляксандр, адзін з арганізатараў Тэрарыстычнай фракцыі «Народнай волі», у 1887 г. разам са сваімі аднадумцамі спрабаваў зрабіць замах на жыццё Аляксандра III, быў арыштаваны, асуджаны на смерць і павешаны. Уладзімір Ульянаў, яшчэ навучаючыся ў Казанскім універсітэце, захапіўся марксізмам і быў вялікім прыхільнікам заснавальніка рабочага руху ў Расіі Георгія Пляханава, з якім пазней разышоўся ў поглядах.

У сакавіку 1898 г. у Мінску адбыўся нелегальны з'езд па стварэнні Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), дзе прысутнічала 9 дэлегатаў з розных гарадоў Расіі. З'езд абраў Цэнтральны камітэт і абвясціў стварэнне партыі. Потым быў надрукаваны Маніфест РСДРП, у якім гаварылася пра два этапы рэвалюцыі – буржуазна-дэмакратычны і сацыялістычны. У 1900 г. убачыла свет нелегальная газета «Іскра», якая заклікала правесці II з'езд партыі.

II з'езд РСДРП адбыўся ў ліпені-жніўні 1903 г. спачатку ў Бруселі, а потым пераехаў у Лондан. Яго галоўная мэта – прыняць статут і праграму партыі. Праграма мела дзве часткі. Праграма-мінімум – гэта буржуазна-дэмакратычная рэспубліка і ліквідацыя самадзяржаўя. Асноўныя задачы: палітычная (правы чалавека, правы нацый на самавызначэнне, ліквідацыя станаў); эканамічная (8-гадзінны працоўны дзень, паляпшэнне ўмоў жыцця рабочых) і аграрнае пытанне (адмена выкупаў за зямлю, вяртанне забраных земляў і стварэнне сялянскіх камітэтаў). Праграма-максімум – сацыялістычная рэвалюцыя і дыктатура пралетарыяту. Таксама быў прыняты статут партыі. Варта адзначыць, што ўдзельнікі II з'езда падзяліліся на дзве палітычныя групы падчас выбараў у кіраўнічыя органы партыі: бальшавікоў на чале з Уладзімірам Ульянавым і меншавікоў, лідарам якіх быў Юлій Мартаў (Цэдэрбаўм).

У 1901–1902 гг. на базе былых народнікаў узнікла *партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (*эсэраў*) на чале з Віктарам Чарновым.

Гэта была самая вялікая і ўплывовая немарксісцкая сацыялістычная партыя Расіі. Існавалі і дзейнічалі шматлікія *анархісцкія арганізацыі*. Сярод іх вылучаліся «Хлеб і воля», «Бунтар» і «Чорны сцяг».

***9.14. Развіццё расійскай гаспадаркі. Расійска-японская вайна.*** Пры канцы XIX ст. Расія заставалася аграрнай краінай. З 125,6 млн чалавек 93,7 млн (75 %) працавалі ў сельскай гаспадарцы. Дзякуючы рэформам Вітэ ў краіне актыўна развіваўся капіталізм. Хутка будаваліся фабрыкі і заводы, і асабліва чыгунка. У перыяд з 1895 па 1899 г. будавалася каля 3 тыс. км чыгуначных шляхоў штогод. У 1900 г. Расія заняла сусветнае першае месца ў здабычы нафты.

Міністр фінансаў Сяргей Вітэ ў 1895–1898 гг. правёў *фінансавую рэформу*. Замест срэбнага быў уведзены залаты рубель. У краіне з'явіліся новыя залатыя манеты па 5 і 10 рублёў, якія можна было памяняць на папяровыя асігнацыі. Гэта прыцягнула чарговыя замежныя інвестыцыі, у краіне з'явіліся новыя банкі з удзелам іншаземнага капіталу.

У 1896 г. Расія заключыла дамову з Кітаем на будаўніцтва Кітайскай Чаньгуньскай чыгункі. У 1898 г. яна ўзяла ў арэнду Квантунскі паўвостраў з горадам *Порт-Артурам* (Люйшунем) і пабудавала там магутную ваенна-марскую базу. Падчас задушэння Іхэтуаньскага паўстання, калі войскі Расіі акупавалі тэрыторыю Маньчжурыі (1899–1901), інтарэсы Расіі ў Кітаі і Карэі сутыкнуліся з інтарэсамі Японіі. Японія стварыла моцнае войска, значна большае за расійскае, і нечакана ноччу 27 студзеня 1904 г. напала на расійскі флот у карэйскім порце Чэмульпа. Крэйсер «Вараг» і карабель «Карэец» пасля доўгага бою былі затоплены. Адначасова японцы напалі на флот Расіі, які стаяў на рэйдзе Порт-Артура. У вайне ўпершыню скарысталі новыя віды ўзбраенняў: хуткастрэльную зброю, гарматы і кулямёты, а таксама ручныя гранаты і мінамёты.

Японскае войска высадзілася ў Карэі і Кітаі. Пасля баёў у красавіку – чэрвені 1904 г. расійскае войска адступіла з Карэі і Ляадунскага паўвострава. Армія Японіі акружыла і пачала штурмаваць крэпасць Порт-Артур. Пасля працяглай абароны камандзір расійскага войска Анатолій Стэсель, насуперак волі цара, 2 студзеня 1905 г. абвясціў капітуляцыю.

Марская бітва
пад Цусімай



На пачатку 1905 г. японцы разбілі расійскую армію, якая страціла 89 тыс. забітымі, параненымі і палоннымі. У траўні 1905 г. японцы разграмілі расійскую эскадру ў марской бітве *пад Цусімай*, каля берагоў Японіі.

Гэтыя буйныя паражэнні ўзрушылі Расію, і ў жніўні 1905 г. у *Портсмуце* бакі падпісалі мірную дамову. Згодна з палажэннямі Портсмуцкай мірнай дамовы Расія перадала Японіі паўднёвы Сахалін, правы на арэнду Ляадунскага паўвострава з гарадамі Порт-Артур і Дальні (Далянь), а таксама прызнала Карэю сферай уплыву Японіі. Японцы атрымалі права лавіць рыбу ўздоўж усяго далёкаўсходняга ўзбярэжжа Расіі.

***9.15. Рэвалюцыя 1905–1907 гг.*** У чэрвені 1904 г. эсэры забілі міністра ўнутраных спраў Расіі Вячаслава Плеве, які быў ідэолагам «моцнай рукі». Новы міністр, князь беларускага паходжання Пётр Святаполк-Мірскі выступаў за ліберальныя рэформы, але цар Мікалай II яго не падтрымаў. На земскіх сходах гучалі ідэі пра магчымае прыняцце канстытуцыі. У лістападзе-снежні 1904 г. пачалася «банкетная кампанія» – калі на ўрачыстых сходах з нагоды саракагоддзя судовай рэформы ў Расіі загучалі прапановы прыняць канстытуцыю і склікаць устаноўчы сход.

Рэвалюцыя ў краіне фактычна пачалася ў нядзелю 9 студзеня 1905 г. у Санкт-Пецярбургу, калі праваслаўны святар Георгій Гапон арганізаваў мірнае шэсце рабочых і іх сем'яў да Зімовага палаца. Дэманстранты ішлі з абразамі і партрэтамі цара і выказвалі эканамічныя патрабаванні. У петыцыі, якую рабочыя неслі цару,



*В. Косак.*
Крывавая нядзеля ў Санкт-Пецярбургу, 1905 г.

былі патрабаванні склікаць праз выбары усеагульны (устаноўчы) сход і атрымаць дэмакратычныя свабоды. Шэсце было расстралянае царскімі войскамі (загінула і было паранена каля 1500 чалавек) – гэта і стала пачаткам рэвалюцыі.

У студзені-лютым пачаліся страйкі, а ўлетку 1905 г. адбыліся выступленні рабочых у Маскве, Варшаве, Адэсе, Лодзі, Рызе і Баку. З'явіліся першыя *рабочыя саветы* ў некаторых гарадах. Першы такі савет быў створаны ў Іванаве-Вазнясенску. Збунтаваліся маракі Чарнаморскага флота, якія захапілі і сагналі ў Румынію браняносец «Князь Пацёмкін-Таўрычаскі». Улады паабяцалі стварыць парламент – Дзяржаўную думу, але толькі з дарадчымі функцыямі. Гэтую ідэю дэмакратычная супольнасць не падтрымала.

У кастрычніку 1905 г. адбыўся ўсерасійскі страйк, у якім узялі ўдзел каля 2 млн чалавек. Да яго далучыліся чыгуначнікі, якія перавозілі салдат, што вярталіся дадому з расійска-японскай вайны. Усё гэта прымусіла імператара Мікалая II 17 кастрычніка 1905 г. падпісаць Маніфест «Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку». Цар абяцаў стварыць заканадаўчую Дзяржаўную думу, абвясціў палітычныя свабоды, права ствараць прафсаюзы і палітычныя партыі, свабоду друку. Пасля таго як сяляне разгрмілі каля 3 тыс. памешчыцкіх маёнткаў, ім паабяцалі зменшыць плату за арэнду зямлі і ў два разы скараціць выкупныя плацяжы.

Аднак рэвалюцыя працягвалася. У лістападзе паўсталі маракі на крэйсеры «Ачакаў» у Севастопалі на чале з лейтэнантам Пятром Шмітам, а ў снежні адбылося ўзброенае паўстанне рабочых у Маскве, на задушэнне якога была паслана армія. 23 красавіка 1906 г.

Мікалай II падпісаў новую рэдакцыю «Асноўных дзяржаўных законаў Расійскай імперыі». 27 красавіка 1906 г. адбылося першае пасяджэнне *Дзяржаўнай думы.* З гэтага моманту імператар ажыццяўляў заканадаўчую ўладу разам з Дзяржаўным саветам і Дзяржаўнай думай. Усе законы маглі стаць дзейнымі толькі пасля ўхвалення іх Дзяржаўнай думай; яна таксама мела права зацвярджаць бюджэт краіны, які прапаноўваў урад. Аднак фактычная ўлада засталася ў імператара, бо ён праводзіў знешнюю палітыку, камандаваў войскам, аб'яўляў вайну і заключаў мір, меў права чаканіць манету і заставаўся найвышэйшым кіраўніком расійскай праваслаўнай царквы. Цар асабіста прызначаў кіраўніка ўрада і міністраў, меў права распускаць Дзяржаўную думу.

20 лютага 1906 г. урад надрукаваў палажэнне аб Дзяржаўным савеце, які складаўся з дэлегатаў ад дваран і духавенства, прычым палову сяброў савета прызначаў сам цар. Дзяржаўны савет атрымаў права зацвярджаць законы, прынятыя Дзяржаўнай думай. Паступова (перыяд ад студзеня 1906 г. па 3 чэрвеня 1907 г.) рэвалюцыйны рух у краіне пайшоў на спад. Тым часам, пачынаючы з лістапада 1906 г., праводзіцца *аграрная рэформа*, якая атрымала назву сталыпінскай, бо яе ініцыятарам выступіў чарговы царскі міністр унутраных спраў Пётр Сталыпін.



Пётр Сталыпін.
*Здымак 1902 г.*

Сяляне атрымалі права выходзіць з сялянскай грамады разам са сваёй зямлёй і ствараць на ёй сваю сядзібу, якая атрымала назву «хутар». Індывідуальныя сялянскія гаспадаркі пачалі называць фермерскімі.

З 10 млн сялянскіх двароў выйшлі з грамады прыкладна 2,5 млн двароў. Да 1915 г. было створана 1 млн 265 тыс. хутароў. Астатнія сяляне прадалі сваю зямлю і паехалі жыць і працаваць у гарады, дзе сталі рабочымі. У Сібір, Паўднёвы Урал і Паўночны Казахстан за 10 гадоў перасялілася больш за 3 млн чалавек.

Аднак прыватнымі землеўласнікамі там зрабілася толькі менш як палова перасяленцаў, а каля 1 млн чалавек вярнуліся ў еўрапейскую частку Расіі, дзе яны папоўнілі клас гарадскіх рабочых або пачалі батрачыць у вёсках.

Найбольш фермераў з'явілася ва Украіне і ў Беларусі. Хлебны імпарт Расіі ўзрос на адну траціну. Пашырылася выкарыстанне мінеральных угнаенняў; сяляне пачалі купляць сельскагаспадарчыя машыны. Да 1917 г. у Расіі дзейнічала 63 тыс. розных *кааператываў*, а сельская кааперацыя абслугоўвала 94 млн чалавек.

***9.16. Дзейнасць расійскай Дзяржаўнай думы; эканамічная і палітычная сітуацыя напярэдадні Першай сусветнай вайны.*** Падзеі 1905 г. актывізавалі ў Расіі фарміраванне розных палітычных партый. Акрамя згаданых сацыял-дэмакратаў і сацыял-рэвалюцыянераў на палітычнай арэне з'явіліся не толькі чарговыя левыя палітычныя ўтварэнні – такія, як партыя нар одных сацыялістаў, але і партыі ліберальна-буржуазнага кшталту (канстытуцыйныя дэмакраты, або кадэты, і Саюз 17 Кастрычніка, або акцябрысты).

У адпаведнасці з законам аб выбарах у Дзяржаўную думу (за 11 снежня 1905 г.) права голасу не атрымалі жанчыны, студэнты, вайскоўцы і моладзь ва ўзросце да 25 гадоў. Выбаршчыкі (25 млн чалавек) былі падзелены на 4 *курыі*: землеўласнікі, сяляне, маёмасныя гараджане і рабочыя. У памешчыкаў адзін выбаршчык быў ад 2 тысяч чалавек, якія валодалі правам голасу, у сялян – ад 30 тыс., у рабочых – ад 90 тыс. Першыя выбары ў Дзярждуму адбыліся ў сакавіку-красавіку 1906 г. Агулам абралі 499 дэпутатаў, з іх на першым месцы былі кадэты – 179 чалавек.

Галоўным пытаннем у думе стала аграрнае. Частка дэлегатаў патрабавала перадачы сялянам памешчыцкіх земляў. Некаторыя прапаноўвалі скасаваць прыватную ўласнасць на зямлю.

У ліпені 1906 г. цар распусціў Дзярждуму і кіраўніком урада прызначыў Пятра Сталыпіна. Былі зачынены ліберальныя газеты і часопісы, уведзены вайскова-палявыя суды для пакарання радыкальных элементаў. Выбралі Другую думу, першае пасяджэнне якой адбылося 20 лютага 1907 г. Сярод дэпутатаў гэтага складу думы былі цэнтрысцкія акцябрысты ды кадэты і левыя – эсэры, сацыял-

дэмакраты, «трудавікі», народныя сацыялісты, прычым калі б сярод апошніх існавала хоць мінімальная згода, яны маглі б кантраляваць большасць дэпутатаў. Але так ці інач ай, гэтая дума праіснавала толькі некалькі месяцаў, да па чатку лета 1907 г. 3 чэрвеня 1907 г. Мікалай II распусціў II Дзяржду му. Без яе згоды быў прыняты новы выбарчы закон, які п ераразмеркаваў колькасць выбаршчыкаў на карысць цэнтрысцкіх, правых і нацыянал-шавіністычных дэпутатаў. III Дзярждума адпрацавала ўвесь тэрмін, з лістапада 1907 г. па чэрвень 1912 г. Пачатак дзейнасці III Дзярждумы называюць «трэцячэрвеньскім пераваротам» і канцом першай расійскай рэвалюцыі.

Апошняя, IV Дзярждума праіснавала амаль 5 гадоў (1912–1917). Кансерватараў у гэтым складзе думы была большасць, а з пачаткам вайны і ажно да в осені 1916 г. яна н е працавала. Аднак менавіта IV Дзяржаўная дума стала адным з цэнтраў антыманархічнай рэвалюцыі ў лютым 1917 г.

Новы эканамічны ўздым у Расіі пачаўся з 1908 г. Нямала грошай было выдаткавана на аднаўленне ваеннага флоту і іншых узброеных сіл. Добрыя ўраджаі ў 1909–1913 гг. (акрамя 1911 г.) дазволілі значна павялічыць экспарт хлеба за мяжу. У 1909–1913 гг. у Расіі ўтварыліся манаполіі вышэйшага класа – *трасты* і *канцэрны*, узнікла *фінансавая алігархія*. Доля замежнага капіталу ў эканоміцы павялічылася з 25 % у 1889 г. да 43 % у 1914 г. За 1890–1913 гг. аб'ём прадукцыі цяжкой і лёгкай прамысловасці павялічыўся ў 7 разоў.

У краіне існавала вялікая доля дзяржаўнай уласнасці, якой кіраваў непасрэдна імператар. У 1913 г. гэта былі: ⅓ усіх земляў, ⅔ лясоў, ⅓ чыгуначных шляхоў, $^7/_8$ тэлеграфнай камунікацыі, шмат руднікоў і казённых заводаў, асабліва ваенных. Расійскі бізнэс вельмі моцна залежаў ад царскай бюракратыі, таму ў краіне квітнела карупцыя.

***9.17. Расія ў Першай сусветнай вайне.*** У 1906–1907 гг. знешнепалітычны курс Расіі змяніўся. У 1907 г. была падпісана расійска-японская канвенцыя, якая размежавала сферы ўплыву адпаведных краін. У 1910 г. Японія па ўзгадненні з Расіяй анексавала Карэю. У жніўні 1907 г. Расія падпісала канвенцыю з Вялікабрытаніяй, згодна з якой поўнач Персіі (Ірана) трапіла пад расійскі ўплыў, паўднёва-ўсходнюю частку Персіі і Афганістан мелася кантраля-



Першая сусветная вайна. Расійская пяхота ідзе ў атаку

ваць Вялікабрытанія, а цэнтр быў нейтральным. Так быў створаны антыгерманскі саюз *Антанта* (Вялікабрытанія, Францыя і Расія). У 1905 і 1911 гг. паміж Францыяй і Германіяй узнікла спрэчка за Марока. Неўзабаве адбыўся Баснійскі крызіс (1908–1909), калі Аўстра-Венгрыя захапіла Боснію і Герцагавіну. Потым пачаліся балканскія войны (1912–1913).

Расійскія імперыялісты марылі пра захоп Галіччыны, кантроль над Балканамі, а таксама пра захоп праліваў Басфор і Дарданелы.

Пасля забойства ў чэрвені 1914 г. у баснійскім горадзе Сараеве спадчынніка аўстра-венгерскага трону Франца Фердынанда сербскім тэрарыстам пачаўся сусветны крызіс, які прывёў да вайны. З 1 жніўня 1914 г. па 11 лістапада 1918 г. доўжылася Першая сусветная вайна, якая ў розных краінах свету забрала жыцці больш за 20 млн вайскоўцаў і мірнага насельніцтва. Першай вайну Расіі аб'явіла Германія, якая прэтэндавала на Украіну, Прыбалтыку і частку Польшчы. Расія ж была не супраць захапіць Усходнюю Прусію. У жніўні-верасні 1914 г. расійскія войскі, якія дзвюма арміямі ўварваліся ў Прусію, былі разбітыя і мусілі адступіць.

У лютым-сакавіку 1915 г. расійскія войскі паспяхова ваявалі ў Карпатах, захапіўшы крэпасць Перамышль, а таксама разбілі туркаў на Каўказскім фронце і падышлі да Эрзрума.

Аднак у траўні 1915 г. немцы разгарнулі вялікі наступ на Усходнім фронце. У жніўні яны захапілі Варшаву і ўсю Польшчу, потым Вільню. Добра ўмацаваныя Гродзенскую і Брэсцкую крэпасці расійцы здалі практычна без бою. Расійская армія, якая адступала па тэрыторыі Беларусі, выкарыстоўвала тактыку выпаленай зямлі і выганяла ў глыб Расіі мясцовых жыхароў, асабліва праваслаўных, а іх вёскі знішчала. Так, у 1915 г. больш за 1,5 млн беларусаў мусіла

пакінуць родную зямлю. Фронт спыніўся толькі ў кастрычніку на лініі Рыга–Крэва–Смаргонь–Баранавічы–Пінск–Чарнаўцы.

Камандаванне расійскім войскам узяў на сябе сам Мікалай ІІ, які абсталяваў сваю стаўку ў Магілёве і адтуль кіраваў імперыяй. У 1916 г. немцы зноў перанеслі асноўны ўдар на Францыю, дзе каля года ішла бітва за крэпасць Вердэн. Англічане і французы ў чэрвені – кастрычніку пачалі наступ на рэчцы Соме, але поспеху не дасягнулі. У сакавіку 1916 г. праваліласяаперацыя расійскіх войскаў у раёне возера Нарач: там загінулі 65 тыс. расійскіх салдат. Другі, таксама безвыніковы, наступ у ліпені пад Баранавічамі пакінуў на полі бітвы 80 тыс. чалавек.

У ліпені 1916 г. Паўднёва-Заходні фронт на чале з генералам Аляксеем Брусілавым разбіў войскі Аўстра-Венгрыі, якія страцілі 1,5 млн чалавек забітымі, палоннымі і параненымі. Асабліва масава здаваліся ў палон чэхі і славакі, якія не хацелі ваяваць з расійцамі. Брусілаў захапіў Букавіну і Паўднёвую Галіччыну. Немцы былі вымушаныя зняць з Заходняга фронту 11 дывізій, каб дапамагчы саюзнікам спыніць расійскі наступ (які ў гісторыі прынята называць брусілаўскім прарывам). Былі ў цара перамогі і на Каўказскім фронце, дзе расійскае войска заглыбілася на 250–300 км на тэрыторыю Турцыі. Дзеянні расійскіх войскаў дапамаглі італьянцам спыніць наступ аўстрыйцаў і падштурхнулі Румынію ўступіць у вайну на баку Антанты. У выніку баёў 1916 г. стратэгічная ініцыятыва ўжо была на баку Антанты. Германія перайшла да абароны на ўсіх франтах. Аднак вынікі ваенных дзеянняў для Расіі былі вельмі адчувальныя: да 1918 г. яна страціла забітымі каля 1,7 млн чалавек, параненымі каля 5 млн і палоннымі каля 2 млн чалавек.

***9.18. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.*** У 1916 г. Расійская імперыя знаходзілася ў стадыі крызісу. У гэтым годзе ў страйках і меншых забастоўках удзельнічаў больш за 1 млн чалавек. Пачаліся сялянскія хваляванні. Выбухнула вялікае паўстанне мясцовага насельніцтва ў Сярэдняй Азіі, якое імкнулася да незалежнасці. На расійска-германскім фронце пачалося дэзертырства і братанне з праціўнікам. Вялікую адмоўную ролю адыграў фаварыт царскай сям'і (асабліва царыцы) Рыгор Распуцін. Дзякуючы яго намаганням і падтрымцы жонкі цар у студзені 1916 г. прызначыў кіраўніком урада немца Бары-

са Шцюрмера, што выклікала вялікае абурэнне ў насельніцтва. У войску і гарадах дзейнічалі рэвалюцыйныя агітатары. Меншавікі ды эсэры выступалі за спыненне вайны і дэмакратычны мір. Бальшавікі на чале з Леніным, які жыў у Швейцарыі, выступалі за паразу Расіі ў вайне і заклікалі народы Расіі «ператварыць імперыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую».

Аднак рэвалюцыі ў Расіі ніхто не чакаў, не мог прадбачыць, і здарылася яна нечакана. У сярэдзіне лютага 1917 г. у Петраградзе ў сувязі з перабоямі ў пастаўках хлеба забаставалі 90 тыс. рабочых. 18 лютага да іх далучыліся рабочыя Пуцілаўскага завода, які ўласнікі хацелі закрыць.

23 лютага ў сталіцы пачаліся дэманстрацыі рабочых і жанчын: яны патрабавалі хлеба, спынення вайны і ліквідацыі самадзяржаўя. 25 лютага страйкі, вулічныя пратэсты і дэманстрацыі ахапілі ўсю сталіцу. Увечары 25 лютага Мікалай II загадаў войскам спыніць беспарадкі, але салдаты адмовіліся страляць у народ. Паліцыя ўчыніла сілавыя дзеянні, у выніку якіх загінула больш за 300 чалавек. Тады гвардзейцы Паўлаўскага палка перайшлі на бок рабочых і пачалі страляць па паліцыі.

27 лютага гарнізон горада перайшоў на бок рабочых і захапіў арсенал Петрапаўлаўскай крэпасці. У гэты ж дзень адбыліся выбары ў Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Быў абраны кіраўнічы орган – Выканаўчы камітэт. Яго ўзначаліў меншавік Мікалай (Карло) Чхеідзэ, а намеснікам старшыні выбралі эсэра Аляксандра Керанскага. Тады ж, 27 лютага, быў створаны *Часовы камітэт Дзяржаўнай думы* на чале з Міхаілам Радзянкам, які ўзяў пад кантроль усе міністэрствы.

28 лютага 1917 г. Мікалай II выехаў з Магілёва да сваёй сям'і ў Царскае Сяло, але быў затрыманы рэвалюцыйнымі войскамі і мусіў паехаць у Пскоў, у штаб Паўночнага фронту. Пасля кансультацый з кіраўнікамі ўсіх франтоў цар убачыў, што не мае ў іх падтрымкі і 2 сакавіка адмовіўся ад трона на карысць брата, вялікага князя Міхаіла Аляксандравіча.

***9.19. Культура і навука Расіі ў пачатку XX ст.*** Росквіт велікарускай літаратуры і мастацтва ў гэты час прынята называць Сярэбраным векам. Адчуванне набліжэння крызісу і вялікіх ката-

строф так або іначай прысутнічае ў творах празаікаў Івана Буніна, Максіма Горкага, Аляксандра Купрына, Уладзіміра Караленкі, Дзмітрыя Меражкоўскага і іншых. Імкненне спасцігнуць сутнасць новай эпохі выклікала да жыцця розныя літаратурныя плыні, такія як акмеізм (Мікалай Гумілёў, Ганна Ахматава, Восіп Мандальштам, Міхаіл Кузмін), сімвалізм (Канстанцін Бальмонт, Зінаіда Гіпіус, Фёдар Салагуб, Валерый Брусаў, Андрэй Белы, Леанід Андрэеў, Аляксандр Блок), футурызм (Уладзімір Маякоўскі, Велімір Хлебнікаў, Аляксей Кручоных), новасялянская паэзія (Сяргей Ясенін, Мікалай Клюеў, Сяргей Клычкоў). Як асобныя з'явы можна разглядаць творчасць Максімільяна Валошына і Марыны Цвятаевай.

У сваю чаргу ідэалы нацыянальна-культурнага адраджэння сваіх народаў у сваёй творчасці адстойвалі азербайджанскія пісьменнікі Джаліл Мамедкулізадэ, Нарыман Нарыманаў, Мухамед Хадзі, армянскія паэты Ваан Тэр'ян, Місак Мецарэнц, Сіяманто, Аванес Туманян, асецінскія літаратары Аляксандр Кубалаў, Коста Хетагураў, Блашка Гуржыбекаў, Сека Гадзіеў, Цамак Гадзіеў, Георгій Цаголаў, балкарскі паэт Кязім Мечыеў, башкірскія паэты Шайхзада Бабіч, Кашфі Карыпаў, Ямалетдзін Юмаеў, Гарыфула Кіікаў, Сафуан Якшыгулаў, класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, бурацкія драматургі ДаніІл Абашэеў і Сяргей Балдаеў, габрэйскія паэты Іцхок-Лейбуш Перац, Хаім Нахман Бялік, грузінскія творцы прыгожага пісьменства Аляксандр Абашэлі, Грыгол Рабакідзэ, Міхаіл Джавахішвілі, інгушскі пісьменнік Тэмбот Бекаў, казахскія пісьменнікі Міржакіп Дулатаў, Магжан Жумабаеў, калмыцкі будысцкі паэт Бааван Бадма, карачаеўскія паэты Ісмаіл Сямёнаў, Іслам Крымшамхалаў, кіргізскія паэты Клыч Мамырканаў, Абылкасым Джутакееў, крымска-татарскі драматург і празаік Сеіт-Абдула Азенбашлы, кумыкскія пісьменнікі Шыхамат Кадзі з Эрпелі, Зайналабід Батырмурзаеў, Манай Алібекаў, латышскія пісьменнікі Ян Райніс, Карліс Скалбэ, Рудольф Блаўманіс, Яніс Яўнсундрабіньш, літоўскія літаратары Ёнас Білюнас, Юлія Жэмайце, Юозас Тумас-Вайжгантас, Людас Гіра, Лаздзіну Пяледа, марыйскі паэт Г. Мікай, марыйскі паэт і драматург Сяргей Чавайн, татарскія пісьменнікі Габдула Тукай, Галімджан Ібрагімаў, Гаяз Ісхакі, Галіаскар Камал, Муса Ак'егетаў, таджыкскі пісьменнік Таш-

хаджа Асіры, туркменскія літаратары Мала-Дурды, Бічарэ-Мухамед-Клыч, удмурцкія пісьменнікі Іван Міхееў, Міхаіл Можгін, узбекска-таджыкскі паэт Хамза Хакімзадэ Ніязі, украінскія паэты, празаікі і драматургі Леся Украінка, Аляксандр Олэсь, Уладзімір Самійленка, Уладзімір Вінічэнка, Барыс Грынчанка, чувашскія паэты Канстанцін Іваноў, Мікалай Шэлебі, Якаў Турхан, эстонскія літаратары Густаў Суйтс, Юхан Лійв, Анна Хаава, Эдуард Вілдэ.



Янка Купала.
*Здымак 1911 г.*

У *жывапісе* рэалістычны напрамак (рускія жывапісцы Ілья Рэпін, Віктар і Апалінарый Васняцовы, беларуска-габрэйскія мастакі Юдаль Пэн, Янкель Кругер, Леў Альпяровіч, латышскі мастак Вільгельм Пурвіціс, удмурцкі мастак Афрыкан Беркутаў) існуе паралельна з мадэрнісцкімі групамі «Свет мастацтва» (рускія творцы Аляксандр Бенуа, Яўгеній Лансэрэ, Канстанцін Сомаў, беларуска-габрэйскі жывапісец Леў Бакст, літоўска-рускі мастак Мсціслаў Дабужынскі), сімвалісты (расійскі жывапісец Міхаіл Урубель, расійска-башкірскі мастак Міхаіл Несцераў, літоўскі мастак Мікалоюс Чурлёніс), «Званковы валет» (рускія мастакі Арыстарх Лентулаў, Міхаіл Ларыёнаў, Ілья Машкоў, ПётрКанчалоўскі), «Блакітная ружа» (рускія мастакі Наталля Ганчарова, Павел Кузняцоў, Мікалай Сапуноў, армянскі мастак Матэвос Сар’ян), постімпрэсіяністы і неарамантыкі (украінскія мастакі Аляксандр Мурашка і Сяргей Васількоўскі), абстракцыяністы (рускі мастак Васілій Кандзінскі, украінска-беларускі мастак Казімір Малевіч). У Пецярбургу зрабіў свае першыя крокі ў мастацтве будучы геній авангардызму ў жывапісе габрэйска-беларускі творца Марк Шагал. Бліскучым майстрам прымітывісцкага напрамку паказаў сябе грузінскі мастак Ніка Пірасмані (Пірасманашвілі).

Значныя творы належалі расійскім *разьбярам* Сяргею Валнухіну, Паўлу Трубяцкому, Сяргею Канёнкаву, Ганне Галубкінай, Аляксандру Матвееву, руска-нямецкаму скульптару Роберту Баху, украінскаму



Будынак тэатра МХТ у Маскве. 1902 г. (*архітэктар Ф.-А. Шэхтэль*)

скульптару-кубісту Аляксандру Архіпенку, асецінскаму народнаму разьбяру Сасланбеку Язідзіеву.

Сярод *архітэктараў* гэтага часу трэба вылучыць расійскіх дойлідаў Аляксея Шчусева, Сяргея Малюціна, Уладзіміра Пакроўскага, украінскага – Аляксандра Бекетава, беларускага – Станіслава Шабунеўскага. Бацькам мадэрну ў расійскім дойлідстве апа праве лічыцца Франц-Альберт Шэхтэль.

Велізарную ролю ў культурным жыцці Расіі гэтай эпохі адыгрываў *тэатр*. У 1898 г. пачаў сваю працу Маскоўскі мастацкі тэатр (руская абрэвіятура МХТ, пазней – МХАТ), заснавальнікамі якога сталі выбітныя тэарэтыкі гэтага віду мастацтва Канстанцін Станіслаўскі і Уладзімір Немiровіч-Данчанка.

У Пецярбургу збірае аншлагі Тэатр імя Веры Камісаржэўскай пад мастацкім кіраўніцтвам Усевалада Меерхольда. У тэатральнай студыі МХТ-3 таленавітыя пастаноўкі робіць руска-армянска-асецінскі рэжысёр Яўгеній Вахтангаў. Паспяхова працуе Тбіліскі тэатр драмы на чале з таленавітым рэжысёрам і акторам Уладзімірам Алексі-Месхішвілі. У тэатры Міколы Садоўскага ў Палтаве яскрава праявіўся талент украінскай актрысы Марыі Занькавецкай. У 1907 г. пачала сваю дзейнасць першая беларуская прафесійная тэатральная трупа пад кіраўніцтвам Ігната Буйніцкага, якая з поспехам гастралявала па Беларусі.

Цэнтрамі опернага мастацтва застаюцца Марыінскі тэатр у Пецярбургу і Вялікі тэатр у Маскве. Сусветную славу здабывае расійскі балет, у якім бліскуча выступаюць Ганна Паўлава, Матыльда Кшасінская, Вацлаў Ніжынскі. Антрэпрэнёр Сяргей Дзягілеў ладзіць рускія сезоны балета за межамі імперыі.

У *музычным мастацтве* яскрава праяўляюць сябе рускія кам-

пазітары Мікалай Рымскі-Корсакаў, Аляксандр Глазуноў, Сяргей Рахманінаў, Аляксандр Скрабін, кампазітары беларускага паходжання Ігар Стравінскі, Ян Тарасевіч, латышскі кампазітар Яніс Медыньш, татарскі піяніст і кампазітар Загідула Ярулін, украінска-нямецкі кампазітар Рэйнгольд Гліэр, украінскія кампазітары і дырыжоры Парфірый Дэмуцкі, Мікалай Леантовіч. Таленавітыя сімфанічныя паэмы, кантаты, уверцюры напісаў літоўскі творца Мікалоюс Чурлёніс. Сусветную вядомасць набыла творчасць расійскіх оперных спевакоў Фёдара Шаляпіна (бас-барытон), Антаніны Нежданавай (лірычна-каларатурнае сапрана), Надзежды Ланской (мецца-сапрана), Леаніда Собінава (лірычны тэнар), украінскай спявачкі Саламеі Крушальніцкай (драматычнае сапрана).



Фёдар Шаляпін у ролі Мефістофеля ў оперы Ш. Гуно «Фаўст»

У 1908 г. на экраны выходзіць першы расійскі *мастацкі фільм* «Сценька Разін» (рэжысёр Уладзімір Рамашкаў). У наступныя гады папулярнымі робяцца мастацкія фільмы рэжысёра Якава Пратазанава. Хутка набываюць шырокую вядомасць расійскія акторы нямога кіно Іван Мазжухін, Вера Халодная.

Менш аптымістычнай выглядала сітуацыя ў сферы адукацыі. За 1900–1914 гг. расійскаму міністэрству народнай асветы ўдалося павялічыць колькасць навучэнцаў пачатковых школ з 2,6 да 6 млн чалавек, але каля 40 % ад агульнай колькасці такіх школ складалі царкоўна-прыходскія, дзе ўзровень адукацыі быў істотна ніжэйшы, чым у дзяржаўных. Што, аднак, яднала абодва тыпы школ – гэта тое, што яны былі інструментамі татальнай русіфікацыі. Існуюць звесткі пра колькасць непісьменных мужчын, якія, паводле стану перад пачаткам Першай сусветнай вайны, прызываліся на вайсковую службу. У Германіі такіх было 0,04 %, у Вялікабрытаніі – 1 %, у Францыі – 3,4 %, у ЗША – 3,8 %, а ў Расіі – аж 61 %. Пры гэтым трэба браць пад



Лаўрэат Нобелеўскай прэміі фізіёлаг Іван Паўлаў

увагу тую акалічнасць, што ў расійскую армію жыхары Сярэдняй Азіі, дзе ўзровень непісьменнасці быў яшчэ нашмат вышэйшы, не прызываліся наогул.

Пры ўсім гэтым навука ў перадрэвалюцыйнай Расіі мела несумненныя поспехі. Тут значныя працы стварылі рускія вучоныя Уладзімір Вярнадскі (біяэкалогія, геахімія, радыегеалогія), Мікалай Жукоўскі, Сяргей Чаплыгін (паветраплаванне і аэрадынаміка), Іван Паўлаў (фізіялогія, Нобелеўская прэмія 1904 г.), Уладзімір Іпацьеў (хімія), Уладзімір Зварыкін (радыёэлектроніка), Аляксандр Ляпуноў (матэматыка і механіка), расійска-ўкраінскія навукоўцы Ілья Мечнікаў (імуналогія), Мікола Гамалія (мікрабіялогія і эпідэміялогія), Ігар Сікорскі (самалётабудаўніцтва), руска-польскі навуковец Канстанцін Цыялкоўскі (засваенне космасу, тэорыя руху ракет).

Перадрэвалюцыйны час у Расіі можна лічыць часам росквіту гуманітарных навук. Расійскую філасофскую школу стваралі Мікалай Бярдзяеў, Леў Шастоў, Сямён Франк, Пётр Струвэ, Сяргей Булгакаў. У гістарычнай навуцы плённа працавалі расійскія гісторыкі Мацвей Любаўскі, Сяргей Платонаў, Аляксандр Праснякоў, украінскі гісторык Міхайла Грушэўскі, руска-нямецкі гісторык Роберт Віпер, украінска-габрэйскі гісторык Яўгеній (Гірш) Тарле, беларускі і ўкраінскі гісторык і этнограф Мітрафан Доўнар-Запольскі. У філалагічных навуках высокім узроўнем адзначаліся працы расійскіх мовазнаўцаў Аляксея Шахматава, Васілія Багародзіцкага, Барыса Ляпунова, польска-расійскіх лінгвістаў Яна Бадуэна дэ Куртэнэ, Мікалая Крушэўскага, беларускага лінгвіста і этнографа Яўхіма Карскага, украінскага мовазнаўцы Аляксандра Томсана.

# АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Акцябрысты («Союз 17 Октября»)*** – руская палітычная партыя памешчыкаў і буйных прадпрымальнікаў, якая прапаведавала ідэю моцнай манархічнай улады пры адначасным атрыманні ад імператара пэўных дэмакратычных свабод. Лідарамі партыі былі Аляксандр Гучкоў, Міхаіл Радзянка ды іншыя. У Дзярждуме ІІ склікання колькасць фракцыі акцябрыстаў дасягала 154 чалавек, пазней яна змяншалася.

***Антанта*** – саюзны блок Вялікабрытаніі, Францыі і Расіі, які склаўся ў 1904–1907 гг., а падчас Першай сусветнай вайны аб'яднаў больш за 20 дзяржаў, у тым ліку ЗША, Італію, Японію. Моц Антанты была ў пэўнай ступені падарваная ў выніку цеснага супрацоўніцтва расійскіх бальшавікоў з Германскай імперыяй.

***Аракчэеўшчына*** – у часы ўладарання Аляксандра І палітыка вайсковага міністра графа Аляксея Аракчэева: яна грунтавалася на інтэнсіўным стварэнні вайсковых пасяленняў – асаблівай арганізацыі ўзброеных сіл, пры якой служба ў страі сумяшчалася з заняткам гаспадаркай.

***Бульбяныя бунты*** – масавыя хваляванні дзяржаўных і ўдзельных сялян у Расіі ў 1830-х гг., выкліканыя прымусовым увядзеннем пасадкі бульбы.

***Бутурлінскі камітэт*** – найвышэйшы орган царскай цэнзуры, які існаваў у часы ўладарання Мікалая І (1848–1855).

***Валасное праўленне*** – орган сялянскага мясцовага самакіравання, які складаўся з валаснога старшыні, сельскіх старастаў. З'явіўся ў другой палове ХІХ ст.

***Водруб*** – на пачатку ХХ ст. зямельны ўчастак, вылучаны з абшчыннай зямлі ў аднаасобную сялянскую ўласнасць.

***Вольныя аратыя («хлебопашцы»)*** – сяляне, вызваленыя (пасля 1803 г.) з прыгону на аснове добраахвотнага пагаднення з памешчыкамі.

***Газават*** – свяшчэнная вайна горцаў-мусульман супраць расійскіх іншаверцаў у 1817–1864 гг., на чале якой доўгі час быў Шаміль.

***Дарнікі («дарственники»)*** – былыя прыгонныя сяляне, якія пасля рэформы 1861 г. атрымалі зямельны надзел у якасці дару.

***Дзекабрысты*** – удзельнікі дваранскага рэвалюцыйнага руху ў Расіі, якія зрабілі спробу ўзброенага выступлення на Сенацкай плошчы

ў Пецярбургу 14 снежня 1825 г., спрабуючы выкарыстаць момант «міжцаравання» ў краіне. Ідэі дзекабрыстаў фарміраваліся ў таемных Паўночным і Паўднёвым таварыствах. Актыўнымі ўдзельнікамі гэтых т аварыстваў былі Мікіта Мураўёў, Мікалай Тургенеў, Кандрат Рылееў, Яўгеній Абаленскі, Павел Пестэль, Сяргей Мураёў-Апостал ды іншыя.

***Дзяржаўная дума*** – законапрадстаўнічая, дарадчая ўстанова ў Расійскай імперыі ў 1906–1917 гг. (чатыры скліканні). Разглядала праекты законаў, якія потым абмяркоўваліся ў Дзяржаўным савеце і зацвярджаліся імператарам.

***Дзяржаўны савет*** – найвышэйшы дарадчы орган пры імператару Расійскай імперыі, які існаваў у 1810–1917 гг. і разглядаў законапраекты перад вынясеннем іх на зацвярджэнне апошняму. З утварэннем Дзярждумы палова Дзяржсавета прызначалася імператарам, а другая палова была выбарнай.

***Заходнікі*** – прадстаўнікі напрамку расійскай грамадска-палітычнай думкі, якія а дстойвалі шлях развіцця краіны паводле заходнееўрапейскіх узораў. Ім супрацьстаялі і жорстка іх крытыкавалі так званыя славянафілы.

***Земствы*** – выбарныя саслоўныя органы мясцовага самакіравання (земскія сходы і земскія ўправы), створаныя ў Расіі ў выніку земскай рэформы 1864 г.

***Кадэты*** – гутарковая назва членаў створанай у 1905 г. рускай партыі канстытуцыйных дэмакратаў. Самымі ўплывовымі лідарамі гэтай партыі былі Пётр Мілюкоў і Пётр Струвэ.

***Канцэрн*** – фінансава-прамысловая група кампаній розных галін вытворчасці.

***Крывавая нядзеля*** – дзень 9 (22) сн ежня 1905 г., калі ў Пецярбургу ўрадавымі войскамі была расстраляная мірная рабочая дэманстрацыя. Лічыцца днём пачатку рэвалюцыі 1905 г. у Расіі.

***Купчая зямля*** – зямельныя ўчасткі, купленыя сялянамі звыш вызначанага памеру надзела. Былі ўласнасцю адпаведных сялян без якіх-небудзь абмежаванняў.

***Курыя*** – разрад выбаршчыкаў, вызначаны паводле маёмаснай, нацыянальнай або іншай прыкметы.

***Міравы суд*** – найніжэйшае звяно расійскай судовай сістэмы, створанае пасля судовай рэформы 1864 г.

***Народніцтва*** – ідэалогія антыцарскага руху разначыннай расійскай інтэлігенцыі, якая прапаведавала ідэю вызвалення Расіі праз сялянскую рэвалюцыю і фактычна адмаўляла капіталістычныя адносіны. Ідэйнымі натхняльнікамі руху былі літаратары Аляксандр Герцэн і Мікалай Чарнышэўскі. Самымі ўплывовымі народніцкімі арганізацыямі былі «Народная воля» і «Чорны перадзел».

***Негалосны камітэт*** – кола ліберальна настроеных сяброў і дарадцаў Аляксандра I, у якое ўваходзілі графы Павел Строганаў, Віктар Качубей, Мікалай Навасільцаў, князь Адам Ч артарыйскі. Дзейнічаў у 1801–1803 гг.

***Нігілізм*** – папулярная сярод часткі расійскай моладзі сярэдзіны XIX ст. ідэалогія суцэльнага адмаўлення існуючага дзяржаўнага ўладкавання, маралі, нормаў паводзінаў.

***Петрашэўцы*** – гурток разначыннай расійскай моладзі (1844 – пачатак 1849 г.), якая з ахаплялася ўтапічна-сацыялістычнымі поглядамі. Выкрыты царскімі следчымі, шмат хто з актывістаў быў адпраўлены ў высылку.

***Разначынцы*** – выхадцы з розных, звычайна недваранскіх, саслоўяў, якія займаліся разумовай працай і былі носьбітамі дэмакратычных ідэалогій.

***Сакрэтныя камітэты*** – часовыя дарадчыя органы, якія ствараліся ў Расіі ў першай палове XIX ст. Займаліся ў тым ліку і пытаннямі аграрнай рэформы, магчымага скасавання прыгоннага права.

***Сацыял-дэмакраты*** – прадстаўнікі Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), а таксама адпаведнай партыі Польшчы і Літвы. Існавала таксама габрэйская сацыял-дэмакратычная партыя. Сацыял-дэмакарты выступалі за зварджэнне самадзяржаўя, 8-гадзінны працоўны дзень, права народаў Расіі на самавызначэнне, адмену або абмежаванне прыватнай уласнасці, найперш на зямлю. РСДРП фармальна ўтварылася ў 1898 г. на з'ездзе ў Мінску. Далейшыя яе з'езды праходзілі за межамі Расійскай імперыі. У 1903 г. партыя раскалолася на плыні бальшавікоў і меншавікоў. Лідарам бальшавікоў быў Уладзімір Ленін, у 1917 г. да яго далучыўся Леў Троцкі; меншавікоў узначальвалі Юлій Мартаў, Георгій Пляханаў, Карло Чхеідзэ, Фёдар Дан.

***Сацыялісты-рэвалюцыянера (эсэры)*** – найбуйнейшая расійская палітычная партыя ў 1901–1917 гг., якая ўзнікла на аснове ранейшых

народніцкіх арганізацый. Дзейнічала нелегальна, бо прызнавала тэрор як сродак эфектыўнай палітычнай барацьбы. Распрацавала праграму надзялення зямлёй сялян і розных дэмакратычных пераўтварэнняў. Лідарамі партыі былі Віктар Чарноў, Рыгор Гершуні, Андрэй Аргуноў, Барыс Савінкаў, Абрам і і Міхаіл Гоцы.

***Траст*** – сістэма адносінаў у бізнэсе, пры якой маёмасць, якая першапачаткова належала заснавальніку, перадаецца ў распараджэнне іншага, давернага ўласніка.

***Трэцяліпеньская манархія*** – уведзены 3 ліпеня 1907 г. з парушэннем дзейных законаў новы парадак кіравання Расіяй, які пачаўся з роспуску II Дзяржрдумы.

***Удзельныя землі*** – зямельная ўласнасць расійскай імператарскай сям'і, створаная ў 1797 г. з ранейшых палацавых земляў.

***Удзельныя сяляне*** – катэгорыя залежных сялян у Расіі, якія працавалі на ўдзельных землях, плацілі аброк і выконвалі дзяржаўныя павіннасці.

***Фінансавая алігархія*** – вузкая групоўка найбуйнейшых прадстаўнікоў фінансавага капіталу, якія займаюць дамінантнае становішча ў эканамічным і палітычным жыцці краіны і фактычна кантралююць цэлыя галіны эканомікі.

***Хутар*** – зямельны ўчастак, выдзелены селяніну пры выхадзе яго з абшчыны, на які ён перасяляецца з вёскі.

***Часоваабавязаныя сяляне*** – былыя памешчыцкія сяляне, вызваленыя ад прыгону ў 1861 г., але не пераведзеныя на выкупныя выплаты. За карыстанне зямлёй яны мусілі выконваць пэўныя павіннасці.

***Шасцігалосныя думы*** – выканаўчыя органы гарадскога самакіравання ў Расіі (1785–1880); займаліся пытаннямі гарадскога добраўпарадкавання.

# ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА

Алленов, М. Русское искусство XVIII – начала XX века. Т. 2. Москва: Трилистник, 2000. С. 120–315.

Анчиполовский, З. Я. Люди русского театра. Воронеж: Центр.-Черно-зем. кн. изд-во, 1983. 216 с.

Грушевский, Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. С. 486–560.

Заичкин, И. А., Почкаев, И. Н. Русская история. От Екатерины Великой до Александра II. Москва: Мысль, 1994. 765 с.

История России и Украины (XIX – начало XX в.): пособие для студентов: в 2 ч. Ч. 1 / под ред. О. А. Яновского, В. В. Сергеенковой. Минск: БГУ, 2008. 367 с.

Карлов, В. В. Введение в этнографию народов СССР. Москва: Изд-во МГУ, 1990. 160 с.

Корнилов, А. А. Курс истории России XIX века. Москва: Высшая школа, 1993. 447 с.

Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Рускае і беларускае мастацтва XIX – пачатку XX стагоддзя. Мінск: Беларусь, 2011. 548 с.

Миронов, Б. Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.). Т. 2. С.-Петербург: Дмитрий Буланин, 2000. 568 с.

Немцы в истории России: Документы высших органов власти и военного командования. 1652–1917 / сост. В. Ф. Дизендорф. Москва: Материк, 2006. С. 370–775.

Первая мировая война. Энциклопедический словарь. Москва: Изд-во «Весь Мир», 2014. 481 с.

Россия, 1900–1917: документы, материалы, комментарии / сост. И. К. Кирьянов. Пермь: ПермГУ, Западно-Уральский учебно-науч. центр, 1993. 188 с.

Третьякова, Л. С. Русская музыка XIX века: книга для учащихся старших классов. Москва: Просвещение, 1976. 205 с.

Три века: От Смуты до нашего времени / под ред. В. В. Каллаша. Москва: Юнвес, 2006. Т. 5: 384 с. Т. 6: 416 с.

Художественная культура. XVIII – начало XXI века: пособие / авт.-сост. С. Ю. Лебедев. Минск: Дизайн ПРО, 2007. С. 123–143, 179–198, 259–262.

Черкасов, П., Чернышевский, Д. История Императорской России от

Петра Великого до Николая II. Москва: Междунар. отношения, 1994. С. 190–460.

Черкасский, Я. Династия Романовых и немцы // Русская Германия. *Рэжым доступу* (07.06.2013): http://www.rg-rb.de/index.php?option=com_rg&task =item&id=9472&Itemid=0.

Fuller, William C. Strategy and Power in Russia. 1600–1914. N. Y.: Simon & Schuster, 1998. 576 p.

Hasegawa Tsuyoshi. The February Revolution: Petrograd, 1917. Seattle: University of Washington Press, 1981. 652 (+xxii) p.

Lincoln, W. Bruce. In war's dark shadow: The Russians before the Great War. Northern Illinois Univ. Press, 2003. 573 p.

Seton-Watson, H. The Russian Empire 1801–1917. (Oxford History of Modern Europe). Oxford: Clarendon Press, 1988. 813 p.

# 10. АСАБЛІВАСЦІ ЎЗНІКНЕННЯ І ЭВАЛЮЦЫЯ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (ПАДАГУЛЬНЕННЕ)

***10.1. Імперыя азіяцкага тыпу.*** Традыцыя ўзнікнення тэрытарыяльна вялікіх імперый сягае ў далёкія старажытныя часы. Нярэдка яны фарміраваліся якраз на межах свету з развітой цывілізацыяй (імперыя Аляксандра Македонскага, Рымская імперыя, імперыі манголаў ва Усходняй Азіі або Атаманская імперыя ў Малой Азіі і на Блізкім Усходзе). Нягледзячы на тое што, ператвараючыся ў імперыю, Маскоўская дзяржава шмат у чым ішла шляхам згаданых імперскіх утварэнняў, ёй аж да канца XVIII ст. так і не ўдалося заваяваць дамінантнага становішча нават у блізкай ёй Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Прычына гэтага палягала ў тым, што стварыць сваю высокую культуру, якая б апіралася на традыцыі ўласнага народа, маскоўскім уладарам не ўдавалася. Узамен апошнія мусілі прыўлашчваць і адаптаваць еўрапейскую культуру, якая ў тыя часы стаяла на больш высокім узроўні і вельмі дынамічна развівалася. Як падкрэслівалі, у прыватнасці, амерыканска-аўстрыйскі палітолаг Джон Каўцкі і брытанскі гісторык Джэфры Хоскінг, Расійская імперыя ад самага пачатку фарміравалася як імперыя чыста *азіяцкая* – г. зн. тая, у якой найвышэйшая ўлада сюзерэна над вялікай колькасцю этнічных супольнасцяў забяспечваецца з дапамогай мультыэтнічнай знаці. Апошняя, у сваю чаргу, эксплуатуе названыя супольнасці метадамі задушэння, выкарыстання кругавой запарукі, гвалтам навязваючы ім высокую (фактычна чужую!) культуру і сваю мову, патрабуючы за гэта выключна абсалютнага падпарадкавання сваёй волі. У імперыях такога тыпу арыстакратыя і сялянства (носьбіт уласнай культуры і традыцый) раздзеленыя паміж сабой прорвай, і гэтая прорва не змяншаецца на працягу стагоддзяў. Калі ў Еўропе ў перыяд з XVI па XIX ст. дзяржава так ці іначай эвалюцыянавала ў напрамку інтэграцыі мас у нацыянальную супольнасць, то Маскоўская

(пазней – Расійская) дзяржава ўвесь час стаяла на раздарожжы: яе бюракратычная сістэма заставалася азіяцкай, а культура, збольшага гарадская, імкнулася пераняць рысы еўрапейскай.

Велікарускі народ у працэсе сваёй дзяржаватворчасці мог пайсці іншым, неімперскім шляхам. Прыклады такога шляху падавалі Вялікае Княства Літоўскае, Наўгародская і Пскоўскія феадальныя рэспублікі, але ў выніку перамаглі тыя палітыкі, якія выпрацавалі асаблівыя метады «збірання земляў» вакол паўночна-ўсходнеславянскіх княстваў – напачатку Уладзіміра-Суздальскага, а потым Маскоўскага. Чаму гэта адбылося? У гэтым пытанні варта звярнуць увагу на меркаванні сучаснага расійскага філосафа і гісторыка Андрэя Буроўскага, які фармулюе асноўныя асаблівасці ментальнасці славянскага насельніцтва гэтага рэгіёна.

Па-першае, гэта марнатраўнасць – гатоўнасць лёгка і безадказна абыходзіцца з прыроднымі і людскімі рэсурсамі. Каланізатары гэтага краю мелі на ўсход ад сябе бясконцыя абшары, дзе багацце прыроды ўяўлялася ім невычарпальным, а мясцовыя «адсталыя» народы можна было скарыць праз вялікую вайсковую перавагу.

Па-другое, у паўночна-ўсходніх славянскіх каланізатараў быў выпрацаваны ўстойлівы стэрэатып: каштоўнасць мае не тое, што ёсць вынікам напружанай працы, а ўсё, што «стварае і дае матухна-прырода».

Па-трэцяе, кароткая працягласць сельскагаспадарчага года ў гэтым рэгіёне змушала жыхароў вёскі пастаянна працаваць метадам аўралу – амаль звышчалавечага, але і надзвычай кароткатэрміновага высілку.

Нарэшце, аддаленасць рэгіёна ад цывілізацыйных цэнтраў выхоўвала ў яго жыхароў адчуванне ізаляванасці і самадастатковасці ва ўсім.

У выніку згаданаму намі даследчыку асноўныя рысы паўночна-ўсходняй цывілізацыі бачацца наступным чынам:

1) яна грунтуецца на вельмі архаічных формах культуры, у выніку чаго ў яе прадстаўнікоў фарміруецца міфалагізаванае ўяўленне пра саміх сябе, якое яны імкнуцца навязаць народам-суседзям;

2) яна ўсяляк падтрымлівае ізаляцыянізм, адсутнасць якіх-колечы кантактаў з «не-сваімі»;

3) запазычваючы што заўгодна са здабыткаў іншых народаў, яна непазбежна стварае сваю ўласную версію любой успрынятай культуры;

4) яна функцыянуе праз аўралы – аж да поўнага вычэрпвання сваіх сіл і рэсурсаў, пасля чаго ў пэўныя перыяды вядзе спакойны лад жыцця;

5) яе практычна немагчыма знішчыць: прадстаўнікі гэтай цывілізацыі супрацьпастаўляюць любому праціўніку ўсё той жа аўрал, гэтым разам у ваенным сэнсе, дзякуючы чаму мабілізуюцца велізарныя чалавечыя рэсурсы, якімі ўладары распараджаюцца не шкадуючы;

6) яна была, ёсць і заўсёды будзе небяспечнай для суседзяў: ёй чужое разуменне натуральных інтарэсаў іншых.

Яшчэ ў дамангольскі перыяд паўночна-ўсходнія славянскія князі стварылі сістэму ўладарання, якая грунтавалася не на дачыненнях сюзерэна і васала (як гэта мела месца ў суседніх усходнеславянскіх дзяржавах і ў Заходняй Еўропе), а на безумоўным падпарадкаванні сабе дружыны: апошняя складалася не з баяраў (якія мелі рысы землеўласніцкага гонару – асабістага і родавага), а з дваран – душой і целам адданых князям маладых служылых людзей (якія ўзамен за гэтую адданасць атрымлівалі зямлю, кармленне, іншыя шчодрыя падарункі). З цягам часу дваране рабіліся ўсё больш значнай супрацьвагай баярам у палітычнай сістэме Масковіі і дапамагалі яе найвышэйшым уладарам ісці шляхам да абсалютнай улады.

Акрамя гэтага, паўночна-ўсходнія князі ўпарта і няспынна імкнуліся цалкам падпарадкаваць сабе царкоўную іерархію і фактычна стаць на чале праваслаўнай царквы. Крызіс, а потым і падзенне Візантыі паспрыялі стварэнню новага тыпу царквы – структуры, фактычна цалкам падпарадкаванай свецкім уладарам.

Мангольскае нашэсце толькі паспрыяла ўмацаванню такой сістэмы ўладарання і распаўсюджванню яе на шэраг земляў суседзяў – паўночна-ўсходніх славянскіх княстваў. Маскоўскія і ўладзімірскія князі выкарысталі ярлыкі на княжанне, атрыманыя ад мангольскіх ханаў, на ўмацаванне сваёй дэспатычнай, фактычна неабмежаванай ніякімі грамадскімі дамовамі ўлады. Аслабленне і распад Залатой Арды дазволіў уладарам Масковіі ўсё больш актыўна займацца ўмацаваннем і пашырэннем межаў імперыі.

***10.2. Зона стэпаў.*** Тут асіміляцыя новых тэрыторый, падпарадкаваных Маскве, адбывалася паводле адладжанай схемы. Валадары імкнуліся напачатку ўчыняць разлад паміж групоўкамі мясцовых эліт, пераваблівання незадаволеных праз подкуп і абяцанні прывілеяў. Гэта было рабіць досыць проста, беручы пад увагу тое, што народы стэпавых тэрыторый яшчэ не да канца перайшлі да аселага ладу жыцця і адпаведныя кланы не былі вельмі ўстойлівымі. Перахапіўшы ўладныя лейцы, царскія стаўленікі бязлітасна тлумілі супраціў мясцовага насельніцтва, усімі сродкамі паказваючы яму «новага гаспадара». Пасля захопу Казані царскімі войскамі ў 1561 г. такая палітыка праводзілася і ў былым Казанскім ханстве, і ў Чарамісіі (сённяшняя Мары-Эл). Казань гвалтам пераtваралі ў маскоўска-праваслаўны горад, яе засялялі маскоўскія службоўцы, атрымоўваючы ў якасці ўзнагароды землі; у той самы час магчымасць засяляць наваколлі атрымлівалі прышлыя сяляне; услед за імі з Расіі масава прыбывалі купцы… Далучанымі тэрыторыямі цвёрдай рукой кіравалі прысланыя з Масквы губернатары, а мясцовае насельніцтва пазбаўлялі любых палітычных правоў. Пазней, пасля канчатковага падпарадкавання тэрыторый і адпаведных народаў, цэнтральная ўлада давала пэўныя паслабленні, рабілася менш бязлітаснай да мясцовых традыцый і рэлігійных устанаўленняў. Аднак ужо ў XVIII ст. ад тых жа мясцовых татарскіх эліт імперыя запатрабавала прыняць праваслаўе.

Непадпарадкаванне непазбежна вяло да страты сацыяльнага статусу. Але масавы народны супраціў, сярод гэтага і паўстанне Емяльяна Пугачова, тым не менш быў перашкодай да поўнага здзяйснення царскіх імперскіх планаў.

У якасці інструмента асіміляцыі народаў стэпавай зоны (Волжска-Камскага басейна) цары выкарыстоўвалі і такую сілу, як казацтва. Казакі (*татарск.* «вольныя людзі») фактычна былі рабаўнікамі, якія качавалі па «нічыйных» землях, паміж Асманскай імперыяй, Рэччу Паспалітай і Расіяй, і лічылі, што займацца апрацоўкай зямлі – гэта занятак, які прыніжае іх годнасць. Яны ахвотна ішлі на службу да тых, хто наймаў іх дзеля аховы сваіх межаў. Цікава, што ў будучым крымінальныя структуры ў Расіі ахвотна пераймалі мадэлі самаарганізацыі казацтва: у супольным прыняцці рашэнняў, метадах падзелу здабычы і да т. п.

***10.3. Сібір.*** Заваяванне Сібіры Расійскай дзяржавай ішло пры выразнай падтрымцы царскай улады, але вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі актыўныя людзі-*першапраходцы*. У канкрэтным выпадку гаворка ідзе пра сям'ю купцоў і прамыслоўцаў Строганавых, якая здаўна займалася прыбытковым гандлем футрамі і соллю. Менавіта Сямён, Мікіта і Максім Строганавы нанялі войска вышэйзгаданага казацкага атамана Ермака дзеля заваявання Сібарскага ханства. Далей перад заваёўнікамі ляжаў шлях праз неабсяжныя абшары тайгі і тундры. Народы, якія ў той час іх насялялі, не мелі дзяржаўнай арганізацыі і якой-колечы развітой высокай культуры. Часам яны актыўна супраціўляліся прыхадням з захаду, але звычайна цярпелі паражэнні ў сутыкненнях з больш высокаарганізаванымі ўзброенымі атрадамі апошніх. Рухаючыся на ўсход і на поўнач і пакідаючы ў месцах найважнейшых рачных пераправаў свае ўмацаваныя паселішчы-астрогі, казакі-першапраходцы ў 1639 г. дасягнулі Ціхага акіяна, а ў 1648 г. заснавалі Ахоцкую гавань. Фармальна ўсе гэтыя дзеянні засведчылі, што Расійская дзяржава ператваралася ў адну з найбуйнейшых імперый свету, але ў рэальнасці панаванне маскоўцаў на новых тэрыторыях стабілізавалася вельмі павольна. Напачатку гэта былі выключна купцы, рабаўнікі, шукальнікі прыгодаў, і толькі пазней царскі ўрад пачаў паслядоўна каланізаваць вялікі край, высылаючы туды атрады рэгулярнага войска, праваслаўнае духавенства, службоўцаў, палонных войнаў з ВКЛ, да якіх дадаваліся нешматлікія групы перасяленцаў-сялян.

Як адзначае згаданы раней гісторык Джэфры Хоскінг, далучэнне Сібіры стала першым прыкладам расійскага імперыялізму – тэндэнцыі папярэджваць магчымую небяспеку захопам той прасторы, якую патэнцыйна можа заняць варожы бок. Такі светапогляд сфарміраваў у маскоўскіх уладароў уяўленне пра межы сваёй дзяржавы як пра нешта няпэўнае і непастаяннае, звязанае з канцэнтрацыяй сваіх сіл у адпаведны момант. Экспансія гэтай імперыі спынялася толькі тады, калі яна ўваходзіла ў непасрэднае сутыкненне з іншай сілай, здольнай аказаць эфектыўны супраціў. Толькі ў такіх выпадках яна пачынала ўжываць не толькі ваенныя, а і дыпламатычныя сродкі. У выніку маскоўска-расійскі імперыялізм выпрацаваў у сабе парадаксальнае спалучэнне агрэсіўнасці і асцярожнасці.

Захапіўшы велізарныя тэрыторыі на ўсход ад Урала, маскоўскі ўрад мусіў браць пад увагу досыць хісткае, няпэўнае становішча сваіх перасяленцаў. Ён быў змушаны, з аднаго боку, жалезнай рукою насаджаць свае правілы і структуры, а з іншага – даваць магчымасць мясцоваму насельніцтву мець ранейшы традыцыйны лад жыцця, атрымоўваючы ўзамен даніну футрамі. Правадыры родаў і плямёнаў збольшага захоўвалі свой статус, але ў адрозненне ад татараў іх не прымалі ў кола маскоўска-расійскай знаці. Нягледзячы на гэта, паміж маскоўскімі перасяленцамі і мясцовым насельніцтвам раз за разам успыхвалі канфлікты, і тады прысланыя ўрадам ваяводы ўціхамірвалі бунтаўнікоў з дапамогай вайсковай сілы.

Заваяванне велізарных абшараў Сібіры стварала ў падданых маскоўскага цара адчуванне велічы сваёй імперыі, хоць эканамічны патэнцыял, звязаны з такімі заваёвамі, выкарыстоўваўся ў надзвычай малой ступені. Так, здабыча карысных мінеральных рэсурсаў тут, па сутнасці, пачалася толькі ў XX ст., і менавіта яна ў той ці іншай меры пачала служыць гарантыяй існавання кожнага чарговага рэжыму ў Расійскай і Савецкай дзяржавах. У сваю чаргу, футравы промысел ад самага пачатку вёўся рабаўніцкімі, нікім не кантраляванымі метадамі, што яшчэ ў XVII ст. прывяло да велізарнага скарачэння пагалоўя адпаведных відаў жывёлы. Да канца наступнага, васямнаццатага, стагоддзя прыбыткі футрапрамыслоўцаў істотным чынам скараціліся. Нават у спрыяльных для развіцця сельскай гаспадаркі рэгіёнах заходняй і паўднёвай Сібіры гэтая галіна заставалася надзвычай слаба развітай.

***10.4. Стэпы Поўдня і Усходу***. Займаючыся каланізацыяй гэтых краёў, маскоўскія ўладары, каб абараніцца ад набегаў качавых плямёнаў, і тут выкарыстоўвалі тактыку, выпрабаваную на Волзе. Яны пабудавалі вялікую сетку крэпасцяў і адпаведных фартыфікаваных умацаванняў на тэрыторыі ад Паўднёвага Урала да Алтая, стварыўшы казацкія патрулі і ўзброіўшы сялян. Фактычна гэта паклала пачатак стварэнню ваенізаваных вёсак, становішча працаўнікоў у якіх мала чым адрознівалася ад становішча салдат. Але маскоўская экспансія на паўднёвы ўсход напаткала мноства перашкод. Войскі ўвесь час сутыкаліся адно за адным з напаловуаселымі

пляменамі – башкірамі, нагайцамі, калмыкамі, а пазней і з казахамі. Тут выкарыстоўвалася тактыка, выпрабаваная пры заваяванні Казанскага ханства. Распальвалася варажнеча паміж плямяннымі правадырамі; іх прыцягвалі на царскую службу, якая ператваралася ў поўную падпарадкаванасць маскоўскім чыноўнікам. Спробы супраціву жорстка караліся, у выніку чаго служба цару пачала інтэрпрэтавацца як пастаянны абавязак. Узнікалі як бы спецыяльныя палкі маскоўскага войска, сфарміраваныя з мясцовага насельніцтва. Некага ў гэтае войска зацягвалі шантажом і пагрозамі, некага – праз наданне гаспадарча-гандлёвых прывілеяў.

Найбольш эфектыўны супраціў маскоўскім заваёўнікам аказвалі *крымскія татары*. Яны дасягнулі значных поспехаў у арганізацыі свайго войска і апіраліся на падтрымку іншай моцнай імперыі – Асманскай. Каб набраць нявольнікаў, крымскія татары раз-пораз рабілі набегі ў паўночным напрамку, а ў 1571 г. нават абрабавалі Маскву. Велізарныя ўрадлівыя абшары на поўнач ад Чорнага мора доўгі час заставаліся вольнымі ад маскоўскай улады. Толькі ў 1771 г. расійскім войскам удалося падпарадкаваць сабе Крымскае ханства, якое яшчэ праз 12 гадоў было ліквідавана, і на чале Крыма паставілі расійскага губернатара. У гэтых умовах шмат хто з крымскіх татараў быў змушаны эміграваць у Асманскую імперыю, а на сваіх родных землях крымскія татары з часам ператварыліся ў залежную ад расійскай улады меншасць.

Атрымаўшы перамогу ў Крыме, Расійская дзяржава цягам некалькіх дзесяцігоддзяў здолела захапіць таксама ўрадлівыя землі Паўночнага Прычарнамор’я. У выніку на працягу XIX ст. вытворчасць збожжа стала галоўнай крыніцай прыбыткаў імперыі.

***10.5. Каўказ.*** Мясцовае насельніцтва гэтага рэгіёна складалася з вялікай колькасці этнічных груп, часам надзвычай малалікіх, якія, аднак, у асноўным спавядалі іслам і былі гарачымі прыхільнікамі самастойнага ўладкавання свайго жыцця і незалежнасці. Захоп гэтых тэрыторый Расійскай імперыяй ускладняўся тым, што побач існавалі ўплывовыя на той час Асманская імперыя і Персідская манархія, якія ў сваю чаргу мелі пэўную падтрымку з боку Брытаніі.

Тым не менш, ужываючы вайсковую сілу, яшчэ ў XVIII ст. Расій-

ская імперыя здолела істотна ўмацаваць свае пазіцыі, збудаваўшы і ўзяўшы пад кантроль шэраг крэпасцяў уздоўж ракі Церака. Але заваяваць цалкам навакольныя тэрыторыі яе ўладарам не ўдавалася нават пасля таго, як Расія падпарадкавала сабе краіны, якія знаходзіліся на поўдзень ад іх, у Закаўказзі, – Грузію і Арменію (канец XVIII – першая палова XIX ст.). У 1785 г., пасля моцнага землятрусу, лідар чачэнскіх суфітаў шэйх Мансур заклікаў усе паўночнакаўказскія народы даць адпор расійскай экспансіі. Ідэалагічным падмуркам змагання за сваю свабоду для гэтых народаў стала менавіта дактрына суфітаў, згодна з якой «мусульманін павінен быць свабодным чалавекам, а паміж усімі мусульманамі павінна існаваць роўнасць». У XIX ст. расійскай арміі і чыноўнікам удалося ўключыць паўночнакаўказскія тэрыторыі ў склад імперыі толькі праз вельмі жорсткую палітыку ўціхамірвання мясцовага насельніцтва, якая пачыналася з масавай высечкі лясоў, знішчэння ўраджаю, разбурэння мясцовых аулаў, а потым вылілася ў масавы генацыд, ахвярамі якога рабіліся горскія народы. Расійскія ўлады перасялялі горцаў у даліны, але вялікая іх частка не падпарадкавалася і пакінула радзіму. За савецкім часам справа дайшла да масавай дэпартацыі цэлых народаў і этнічных супольнасцяў.

У той ці іншай форме на працягу апошніх больш як 200 гадоў антыімперыялістычныя войны на Каўказе ўспыхвалі шмат разоў: па сутнасці, яны не спыніліся і па сёння.

***10.6. Бесарабія***. Бесарабія прымыкала да паўднёвай часткі Правабярэжнай Украіны, дзе было поліэтнічнае мяшчанства, а таксама сялянства, якое размаўляла на румынскай мове. Гэтую тэрыторыю, якая складала паўночна-ўсходнюю частку некалі вялікага княства Малдовы, Расія заваявала ў 1812 г. Ва ўмовах беднасці большай часткі мясцовага насельніцтва імперыі ўдалося раскалоць і пасварыць паміж сабою групоўкі мясцовых элітаў. На пачатку Расія дала Бесарабіі аўтаномію накшталт той, што мела з 1809 г. Фінляндыя, але ў 1828 г. гэтая аўтаномія была скасаваная.

***10.7. Украіна, Беларусь, Літва.*** Імкнучыся падпарадкаваць сабе гэтыя краіны, Расійская імперыя і тут ужывала метады падбухторвання розных груповак мясцовых эліт да ўзаемнай варажнечы.

Найбольш відавочнай нагодай да ўмяшання ва ўнутраныя справы адпаведных народаў расійскія каланізатары разглядалі рэлігійнае пытанне, бо вельмі ўплывовыя магнацкія роды тут спавядалі або праваслаўе, або каталіцтва (у рымскай або грэцкай (уніяцкай) версіі). Расійскія ўладары здаўна культывавалі прынцып падпарадкавання духоўнай улады свецкай («цэзарапапізм»), сфармуляваны (хоць і не ў такой радыкальнай форме) яшчэ візантыйскімі імператарамі. Стварыўшы ў 1589–1593 гг. падпарадкаваны сабе Маскоўскі патрыярхат і гвалтоўна ліквідаваўшы ў 1686 г. канкурэнтную для сябе Кіеўскую метраполію, расійскія цары, імператары, камуністычныя генсекі і прэзідэнты ніколі не саромеліся выкарыстоўваць найвышэйшае праваслаўнае духавенства дзеля сцвярджэння сваіх імперскіх мэтаў. У выпадку з Беларуссю і Літвой адпаведныя праблемы вырашаліся выключна гвалтоўнымі метадамі, што мела сваё яскравае адлюстраванне ў трох падзелах Рэчы Паспалітай (канец XVIII ст.). Пры гэтым царская ўлада напачатку зрабіла шырокі жэст у бок каталіцкага насельніцтва: у імперыі была надалей дазволена дзейнасць ордэна езуітаў, у справаводстве і школьніцтве поўная перавага аддавалася польскай мове. Усе гэтыя прывілеі, а таксама права на самастойнае існаванне грэка-каталіцкай царквы былі, аднак, скасаваныя царскімі ўказамі і рашэннямі адпаведных органаў імперыі на працягу 1830-х гг.

Разам з тым дзеля падпарадкавання сабе ўкраінскіх земляў маскоўскім і пецярбургскім уладарам давялося ўжываць і дыпламатыю. Украінскія казакі, якія масава рассяліліся ў ніжнім цячэнні Дняпра, мелі свабодны лад жыцця: палявалі, займаліся рыбалоўствам, здзяйснялі набегі на тэрыторыі Асманскай імперыі. Пры гэтым яны фармальна падпарадкоўваліся каралю Рэчы Паспалітай, ахоўвалі паўднёвыя межы шляхецка-дэмакратычнай дзяржавы. Масква ў той самы час актыўна спрыяла ўзнікненню канфліктаў паміж, з аднаго боку, праваслаўнымі казацкімі атаманамі, а з другога – з каталіцкімі магнатамі ды шляхтай Украіны, якая належала да розных веравызнанняў.

Гэта прывяло, у прыватнасці, да выхаду з падпарадкавання Варшаве гетмана Багдана Хмяльніцкага, які, каб абараніць свае пазіцыі, заключыў з царом Аляксеем Міхайлавічам Пераяслаўскую дамову,

што была юрыдычна дзейнай толькі ў 1654–1657 гг., але пазней расійскія цары і імператары выкарысталі яе дзеля поўнай ліквідацыі самастойнасці казацкай дзяржавы – Запарожскай Сечы. Гетманства як сімвал самастойнай улады было канчаткова скасавана да 1780 г., а Украіну з часам падзялілі на такія самыя губерні, што існавалі ў астатняй частцы Расійскай імперыі. Умацаванні, зробленыя казакамі Сечы, былі разбураны і дашчэнту знішчаны. Частку казакоў прымусова перасялілі на Кубань, некаторыя перабраліся ў Турцыю.

У той жа час за адмаўленне ад памяці пра продкаў, ад сваіх нацыянальных традыцый і моў эліты згаданых краін атрымлівалі прывілеі: іх сяляне рабіліся цалкам прыгоннымі, а самі яны маглі займаць розныя дзяржаўныя і вайсковыя пасады ў імперыі.

***10.8. Латвія і Эстонія***. Дзеля падпарадкавання сабе тэрыторый сучаснай Латвіі – Курляндыі, Ліфляндыі і Задзвінскага герцагства – Расійская імперыя напоўніцу выкарыстала ваенныя сродкі і дыпламатычныя захады. У выніку Паўночнай вайны (пачатак XVIII ст.) Расія атрымала кантроль над Ліфляндыяй. Сваячка Пятра I Ганна Іванаўна ў 1730 г. узышла на расійскі трон і пабралася шлюбам з курляндскім герцагам, немцам Эрнстам Біронам, які прагнуў сам кіраваць імперыяй і дзеля гэтага пагадзіўся фактычна цалкам падпарадкаваць Курляндыю Пецярбургу. Гэтае становішча было замацаванае і праз далейшае актыўнае далучэнне этнічных немцаў (остзейскай знаці) да кіравання Расійскай імперыяй (Кацярына II і яе нашчадкі). Наогул балтыйскія немцы вельмі ахвотна паступалі на службу Расійскай імперыі, бо на землях, дзе яны жылі, яны папросту не мелі партнёраў, з якімі патэнцыйна маглі б фарміраваць супольныя нацыі. Задзвінскае герцагства, што знаходзілася пад пратэктаратам Рэчы Паспалітай, канчаткова трапіла ў склад імперыі пасля падзелаў апошняй.

Эстонія (даўней Эстляндыя і частка Ліфляндыі) моцна пацярпела падчас Паўночнай вайны: там істотна скарацілася вясковае насельніцтва, пацярпелі і гарады. Як і ў выпадку з Курляндыяй, тут увесь час захоўваліся пазіцыі той самай остзейскай знаці, якая ў выніку пагадзілася падпарадкавацца Пецярбургу і дазволіла стварыць Рэвельскую губерню, перайменаваную ў 1783 г. у Эст-

ляндскую. Істотным чыннікам, які спрыяў гэтаму працэсу, было тое, што Расійская імперыя да пары да часу прызнавала для лютэран-пратэстантаў роўныя правы з правамі праваслаўных жыхароў краю.

***10.9. Фінляндыя***. Гэтая краіна заставалася шведскай правінцыяй да таго, як была захоплена расійскімі войскамі ў вайне 1808–1809 гг. Фіны, аднак, не надта хацелі перайсці пад царскую ўладу і пэўны час вялі партызанскую вайну. Каб прыцягнуць хоць частку эліты на свой бок, Аляксандр I вырашыў дзейнічаць нестандартнымі метадамі. У сакавіку 1809 г. ён склікаў у Борга (Порва) фінскі сейм, які прыняў рашэнне прыняць дараваную царскім маніфестам канстытуцыю. Згодна з ёй, Фінляндыяй надалей павінен быў кіраваць фактычна свой урад (сенат), падсправаздачны толькі цару як Вялікаму князю Фінляндскаму. Пазней імперскія інстынкты расійскіх уладароў пачалі выяўляць сябе мацней і мацней: у 1812 г. сталіца краіны была перанесена са шведскамоўнага горада Або (Турку) бліжэй да расійскіх тэрыторый, у Гельсінгфорс (Хельсінкі); яшчэ пры канцы кіравання Аляксандра I перасталі склікацца фінляндскія сеймы; пасля 1827 г. на дзяржаўнай службе былі ўзаконеныя праваслаўныя чыноўнікі; пасля 1830 г. краінай пачалі кіраваць расійскія генерал-губернатары; пасля 1848 г. было фактычна забаронена кнігадрукаванне на фінскай мове; з канца 90-х гг. XIX ст. велікаруская мова была ўведзеная ў афіцыйнае справаводства. Але пры ўсім гэтым намаганнямі прадстаўнікоў фінскай эліты (найперш Ёхана Снэльмана) у 1863 г. быў зноў скліканы сейм (надалей збіраўся раз на 5 гадоў), а фінская мова атрымала афіцыйны статус. У 1865 г. фінская марка стала самастойнай і досыць моцнай грашовай адзінкай. Пры канцы 90-х гг. сейм адхіліў патрабаванні царскіх стаўленікаў прыняць закон аб праходжанні фінамі вайсковай службы ў расійскім войску (яшчэ Аляксандр I дазволіў Фінляндыі мець невялікую ўласную армію).

Фінляндыя стала другой (пасля Новай Зеландыі) краінай у свеце і першай у Еўропе, дзе падчас выбараў жанчыны атрымалі права голасу.

***10.10. Габрэі***. Да падзелаў Рэчы Паспалітай у складзе Расійскай імперыі жыла невялікая колькасць габрэяў. Але пасля гэтых падзелаў

іх колькасць раптоўна вырасла амаль да паўмільёна. Для расійскай адміністрацыі габрэі адразу ж сталі ці не самай «нязручнай» часткай насельніцтва. Яны спавядалі вельмі старажытную рэлігію, мелі высокаразвітую культуру. Паводле ўзроўню пісьменнасці і згуртаванасці яны, як і палякі, звычайна стаялі значна вышэй за праваслаўных велікаросаў. У самых розных сферах дзейнасці – а найперш у гандлі, рамёствах, юрыспрудэнцыі – габрэі перамагалі ў любой канкурэнцыі. Царскі ўрад рабіў адпаведныя захады, каб абараніць велікаросаў ад такога суперніцтва. Так, калі ў 1791 г. маскоўскія купцы запатрабавалі прыбраць канкурэнтаў-габрэяў, ён прыняў пастанову аб забароне габрэям сяліцца ў сталічных гарадах. З часам (1827) была ўзаконеная рыса аселасці, якая рэзка абмяжоўвала правы габрэяў і дазваляла ім жыць і працаваць амаль выключна на тэрыторыях сучасных Беларусі, Літвы, Латвіі, Украіны, Малдовы і Польшчы. Аднак «Палажэнне аб габрэях», прынятае ў 1804 г., усё-такі гарантавала прадстаўнікам гэтай нацыянальна-рэлігійнай супольнасці пэўныя істотныя правы ў сферы атрымання адукацыі, арганізацыі самакіравання (у выглядзе *кагалаў*), вядзення рамесна-гандлёвай дзейнасці. Тым не менш у большасці аспектаў дыскрымінацыя габрэяў у Расіі была рэаліяй штодзённага жыцця. На пачатку XX ст. пашырэнне арганізаванага чарнасоценскага руху спрыяла таму, што ў межах рысы аселасці адбываліся жахлівыя *пагромы*, падобныя да таго, што здарыўся ў Кішынёве ў 1903 г.

***10.11. Цэнтральная Азія.*** Тэрыторыі Туркестана і аазісаў Цэнтральнай Азіі былі далучаны да Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст. Імперскія палітыкі абгрунтоўвалі гэта выключна неабходнасцю абараніць паўднёвыя межы Расіі, якія праходзілі па пустынях. Як тлумачыў Аляксандр Гарчакоў, згаданы намі раней расійскі міністр замежных спраў у 1856–1882 гг.: «Інтарэсы бяспекі межаў і гандлёвых зносінаў заўсёды патрабуюць, каб больш цывілізаваная дзяржава мела поўную ўладу над суседзямі, якія сваімі дзікімі і неўтаймоўнымі звычкамі робяць нямала непрыемнасцяў». Да таго ж для Расіі гэты рэгіён быў важны з гледзішча магчымасцяў атрымання таннай бавоўны. Паводле канцэпцыі таго самага Гарчакова, Расіі таксама было неабходна «ўзнавіць статус вялікай еўрапейскай дзяржавы

пасля паражэння ў Крымскай вайне». Гэтыя рэгіёны доўгі час былі аб'ектам жорсткай эканамічнай эксплуатацыі, але расійская ўлада не рабіла ніякіх сур'ёзных спробаў асіміляваць мясцовае насельніцтва, зрусіфікаваць яго. Сярод мясцовых кланавых эліт падшукваліся тыя лідары, якія былі згодныя на вонкавае падпарадкаванне Пецярбургу, маючы пры гэтым вялікую свабоду дзейнасці.

***10.12. Працэс фарміравання імперыі: агульныя рысы.*** Калі падвесці вынікі разгляду найчасцей ужываных метадаў стварэння і пашырэння Расійскай імперыі, трэба адзначыць наступнае:

1) у асноўных сваіх рысах яе фарміраванне нагадвала тое, як гэта адбывалася з тыповымі азіяцкімі імперыямі: галоўная ўвага аддавалася стварэнню наднацыянальных, пераважна вайсковых, эліт, якія паступова былі інтэграваны ў імперскую структуру;

2) у якасці важнага інструмента сцвярджэння і ўмацавання Расійскай імперыі актыўна выкарыстоўваліся фіскальныя метады ў выглядзе збору на месцах даніны (падаткаў);

3) законы імперыі атрымлівалі абсалютную перавагу перад мясцовымі традыцыямі і звычаёвым правам;

4) праваслаўныя сяляне і казакі атрымоўвалі ад царскай улады магчымасць, а часам і заданне, перасяляцца на здабытыя гэтай уладай землі;

5) праваслаўныя жыхары, якія не паходзілі з арыстакратыі, не атрымлівалі ніякіх прывілеяў перад іншымі народамі імперыі;

6) Расійская дзяржава мела рысы сухапутнай вайсковай імперыі; эканамічная палітыка на падпарадкаваных землях вялася найперш з улікам інтарэсаў узброеных сіл і цывільнай адміністрацыі;

7) стабільнасць Расійскай імперыі падтрымлівалася збольшага за кошт інтэгравання мясцовых эліт у расійскую бюракратыю; тых, хто не падпарадкоўваўся, рознымі спосабамі выключалі з імперскага грамадства; таксама істотным чыннікам дасягнення стабільнасці імперыі было тое, што расійскія ўладары, запазычыўшы высокую культуру з Захаду, спалучылі гэты працэс з насаджэннем велікарускай мовы імперыі (асабліва ў XIX – пачатку XX ст.); пры гэтым велікаруская нацыянальная самасвядомасць пастаянна нівелявалася, набываючы рысы расійскай імперскай свядомасці;

8) Расійская імперыя мела межы, фактычна адкрытыя як для захопніцкіх нападаў на суседнія тэрыторыі, так і для гандлю з імі;

9) усё насельніцтва імперыі падзялялася на пануючы народ, рускіх (да іх далучалі ўкраінцаў – маларосаў – і беларусаў) і іншародцаў, да якіх адносілі людзей іншых этнічных груп і веравызнанняў;

10) цягам усёй сваёй гісторыі Расійская імперыя вяла войны: выняткам быў час кіравання імператара Аляксандра III пры канцы XIX ст.;

11) спецыфічны характар мелі гарады імперыі: у іх адсутнічала самакіраванне; характэрным для імперыі было таксама існаванне вайсковых пасяленняў;

12) прыгон сялян у Расійскай імперыі меў больш жорсткія формы ў параўнанні з краінамі Еўропы;

13) бальшавікі ў першыя 10–15 гадоў свайго кіравання паспрабуюць стварыць свае нацыянальныя эліты, але потым павернуць палітыку ў бок насаджэння псеўдаэліт праз элімінацыю сапраўдных;

14) постсавецкая Расія збольшага вернецца да палітыкі каланізацыі, распрацаванай у Расіі царскай.

***10.13. Развіццё нацыянальных рухаў у XIX – пачатку XX ст. і перадумовы першага распаду Расійскай імперыі.*** Мадэрнізацыя і пашырэнне масавай пісьменнасці ў другой палове XIX ст. падштурхоўвалі развіццё вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці на нацыянальных ускраінах імперыі. У сувязі з гэтым пачалі ўтварацца новыя генерацыі мясцовай інтэлігенцыі разначыннага, часцей за ўсё сялянскага, паходжання. У іх асяроддзі ўзнікалі нацыянальныя рухі, якія вылучалі патрабаванні абароны мовы і культуры ўласных народаў, стварэння на іх падмурку сучаснай, мадэрнай культуры, замацавання яе ў адукацыі, справаводстве. З цягам часу гэтыя лозунгі спалучаліся з дэмакратычнымі патрабаваннямі: нацыянальны суверэнітэт, першапачаткова ў форме мясцовага самакіравання, а па меры дасягнення масавасці руху – і незалежная нацыянальная дзяржава. На першым этапе развіцця, у так званай этнаграфічнай фазе, актывісты нацыянальных рухаў займаліся амаль выключна навуковай дзейнасцю, на другім – пачыналі нацыянальную агітацыю («абуджэнне народаў»), якая першапачаткова не сустракала значнай

падтрымкі. Сведчаннем масавасці (трэцяй ступені) станавілася стварэнне нацыянальных палітычных партый, іх ідэалагічная дыверсіфікацыя, што адбывалася падчас крызісу цэнтральнай імперскай улады.

*Украінскія землі* ў XIX ст. становяцца рэгіёнам інтэнсіўнага гаспадарчага развіцця: найбольш яскрава гэта выявіла сябе ў развіцці прамыслова-гандлёвай спецыялізацыі і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі, што спрыяла стварэнню дынамічнага рынку. У Левабярэжнай Украіне (Харкаўшчына, Палтаўшчына) дзейнічалі буйныя гуртавыя кірмашы: там мясцовыя гандляры мелі безумоўную перавагу ў рэалізацыі розных відаў прадукцыі сярод мясцовых жыхароў-сялян. У Правабярэжжы і на поўдні краю ўкраінскія прадпрымальнікі адчувалі вельмі сур'ёзных канкурэнтаў з боку габрэйскай дробнай буржуазіі. На поўдні Украіны імкліва расла колькасць буйных сялянскіх гаспадарак: у 1897 г. яны складалі 20 % ад агульнай колькасці ўкраінскіх гаспадарак. Украінамоўнае насельніцтва складала значную меншасць у вялікіх гарадах: тут часцей гучалі велікаруская, габрэйская, нават армянская, нямецкая, грэцкая мовы. Аднак глыбокія традыцыі народнай украінскай культуры, яе тэмперамент і эмацыйная насычанасць далі штуршок фарміраванню культуры прафесійнай. Велізарную ролю ў гэтым адыгрывала інтэлігенцыя, спрыяльным асяроддзем для фарміравання якой былі ўніверсітэты ў Харкаве (з 1805 г.), Кіеве (з 1834 г.), Адэсе (з 1865 г.), ліцэі ў Нежыне, Крамянцы і Адэсе. Нямала ўкраінцаў вучылася ў расійскіх універсітэтах, некаму ўдалося атрымаць навуку ў Галіччыне (Львоўскі ўніверсітэт існаваў з 1784 г.) або ў Заходняй Еўропе. Веды маладых украінскіх інтэлігентаў узбагачаліся праз вандроўкі па родным краі, падчас якіх яны шукалі сувязяў са сваім народам. Неацэнную ролю адыгрывала новая ўкраінская літаратура, імёны найважнейшых прадстаўнікоў якой на чале з Тарасам Шаўчэнкам згадваліся ў раздзелах, прысвечаных культуры гэтага перыяду. Каля сярэдзіны стагоддзя пачалі ўзнікаць таемныя і паўпадпольныя арганізацыі выразна ўкраінскага характару: Кірыла-Мяфодзьеўскае брацтва (Кіеў, 1845 г.), Грамада (Кіеў, з 1862 г.), «Брацтва тарасаўцаў» (з 1892 г.), Усеагульная Украінская Арганізацыя, Украінскае навуковае таварыства, гурткі Рэвалюцый-

най Украінскай партыі, Народнай Украінскай партыі, Украінскай дэмакратычнай партыі, Украінскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, Украінскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Таварыства Украінскіх Прагрэсістаў (канец 1890-х – 1900-я гг.). Царскі ўрад усяляк процідзейнічаў гэтаму працэсу: былі закрытыя кіеўская «Прасвіта», кіеўскае Таварыства пісьменнасці і яго «Народны дом», забаронена рэгістрацыя іншых філій «Прасвіты», а падчас Першай сусветнай вайны гвалтам перапыняліся практычна ўсялякія праявы ўкраінскай грамадскай дзейнасці.

У Пецярбургу ў 1861–1862 гг. выходзіў штомесячны часопіс «Аснова». Пасля таго як Аляксандр II у 1876 г. падпісаў указ аб забароне друкавання па-ўкраінску любых арыгінальных мастацкіх твораў і перакладаў, а таксама ўвозу ўкраінскіх кніг з-за мяжы, у Кіеве з 1882 г. па-руску пачала выходзіць «Киевская старина», якая адыграла істотную ролю ў пашырэнні ведаў украінцаў пра сваю гісторыю. Пасля царскага маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. колькасць украінскіх перыядычных выданняў і кніг на ўкраінскай мове ўзрастала вельмі хуткімі тэмпамі (газеты «Громадська думка», «Рада», «Рідна справа», «Хлібороб», «Засів», «Село», «Рілля», «Рідний край» ды іншыя); пачала досыць актыўную дзейнасць прыдняпроўская філія львоўскай «Прасвіты». Наогул жа магчымасці прапаганды ўкраінскай мовы і культуры ў Аўстра-Венгрыі часоў імператара Франца-Ёзэфа, у параўнанні з царскай імперыяй, сёння цяжка пераацаніць.

Падобнага ў XIX і на пачатку XX ст. не маглі чакаць дзеячы *беларускага адраджэння*: уся тэрыторыя краю знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, а вынікам паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. было ўзмацненне паліцэйскага рэжыму, рэпрэсіі супраць значнай часткі краёвай шляхецкай інтэлігенцыі. У 1832 г. улады зачынілі Віленскі ўніверсітэт – практычна адзіную вышэйшую навучальную ўстанову, на той час больш-менш даступную для беларусаў. У гарадах і мястэчках большасць насельніцтва звычайна складалі этнічныя габрэі; увесь час павышалася колькасць сем'яў вялікарасійскіх чыноўнікаў. Наогул гарадское насельніцтва Беларусі на пачатку XIX ст. складала не больш за 5 % ад яго агульнай колькасці, а ў другой палове – не больш за 10 %. Згодна з перапісам насельніцтва

Расійскай імперыі 1897 г., у вёсках жыло 97,7 % беларускамоўнага насельніцтва краю. Рыма-каталіцкая царква мела магчымасць бесперашкодна выхоўваць значную частку беларусаў у польскім духу, а пасля далучэння грэка-каталіцкай царквы да расійскай праваслаўнай царквы (1839 г.) апошняя пачала весці досыць актыўную праімперскую прапаганду. У 1840 г. Мікалай I ухваліў указ імперскага Сената аб забароне ўжываць назвы «Беларусь» і «Літва» ў афіцыйных зносінах і дакументах; тады ж была ўведзена забарона публікацый арыгінальных выданняў на беларускай мове (з выняткам зборнікаў фальклорных матэрыялаў). Навязаная царскімі ўрадамі спецыялізацыя сельскай гаспадаркі (таварная вытворчасць бульбы для вырабу гарэлкі, малочна-мясная жывёлагадоўля, вырошчванне льну) спрыяла хуткаму расслаенню беларускай вёскі, тым часам як прамысловасць у гарадах развівалася надзвычай слаба. З гэтых прычын ні сялянскае, ні рабочае насельніцтва не магло стаць калыскай беларускага нацыянальнага руху. Беларуская шляхта на працягу XIX і пачатку XX ст. захоўвала збольшага прапольскую арыентацыю, свядома карысталася ў публічных зносінах польскай, а пазней і велікарускай мовай.

Прыкметы нацыянальнага абуджэння сярод шляхты пачалі праяўляцца яшчэ ў першай палове XIX ст. (асяроддзе філаматаў і філарэтаў у Вільні, з'яўленне першых беларускіх фалькларыстаў). Аднак больш-менш яны інстытуалізаваліся толькі пасля катастрофы падчас паўстання 1863–1864 гг., калі ў часткі гэтай самай шляхты пачала слабець вера ў магчымае адраджэнне Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага як яе складовай часткі. Падчас самога паўстання гэта выявілася ў дзейнасці Канстанціна Каліноўскага і яго найбліжэйшых паплечнікаў. Пасля паўстання ініцыятыву пераянялі такія дзеячы, як згаданыя раней Францішак Багушэвіч, Янка Лучына (Іван Неслухоўскі), а таксама Вайніслаў Суліма-Савіч-Заблоцкі, Адам Гурыновіч, Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі), якія, аднак, вызначыліся амаль выключна літаратурна-асветніцкай працай. Першыя праявы самаўсведамлення беларускай нацыі як суб'екта гісторыі можна аднесці да 1884 г., калі ў Пецярбургу з'явіліся два нумары нелегальнага рускамоўнага часопіса «Гомон», дзе сярод іншага сцвярджалася, што «беларуская народнасць, захаваўшы сваю адасо-

бленасць, павінна будзе без сумневу заняць у Расіі такое самае месца, якое імкнуцца заняць іншыя больш-менш буйныя народнасці».

У другой палове XIX – пачатку XX ст. актывізавалася таксама фальклярыстычная дзейнасць, у якой сябе выявілі, між іншага, Павел Шпілеўскі, Іван Насовіч (таксама аўтар першага «Слоўніка беларускай мовы»), Павел Шэйн, Мікалай Нікіфароўскі, Еўдакім Раманаў, пазней Міхал Федароўскі, Аляксандр Сержпутоўскі. Іх даследаванні дапамаглі, у прыватнасці, прафесару Яўхіму Карскаму на пачатку 1900-х гг. напісаць капітальную трохтамовую працу «Беларусы». Тады ж узнікла другая, значна мацнейшая, хваля палітызацыі беларускага руху: у гэтым велізарную ролю адыгралі такія асобы, як браты Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Алаіза Пашкевіч (Цётка). У 1902 г. іх намаганнямі была створаная палітычная партыя – Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, якая пазней атрымала назву сацыялістычнай. Менавіта дзеячы гэтай арганізацыі пасля царскага маніфеста 17 кастрычніка заснавалі першую легальную газету на беларускай мове пад назвай «Наша доля», а пасля яе закрыцця ўладамі арганізавалі выпуск тыднёвіка «Наша ніва», які адыграў неацэнную ролю ў стварэнні і гуртаванні нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі. У перыяд да пачатку Першай сусветнай вайны пачалі выходзіць іншыя перыядычныя выданні, друкаваліся кнігі беларускіх паэтаў і празаікаў (Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага), былі заснаваныя першыя тэатральныя трупы і гурткі. Вацлаў Ластоўскі ў 1910 г. апублікаваў першую «Гісторыю Беларусі» на беларускай мове. У ваенны час на акупаванай нямецкімі войскамі тэрыторыі пачало ствараццца школьніцтва з навучаннем па-беларуску.

Усё гэта не спыніла працэсу гвалтоўнай русіфікацыі беларусаў, але ў пэўнай меры яго запаволіла. Трагедыя беларусаў палягала і ў тым, што падчас вайны царскі ўрад змусіў вялікую колькасць жыхароў краю зрабіцца ўцекачамі, выехаць у аддаленыя рэгіёны Вялікарасіі. Што праўда, камітэты ўцекачоў, створаныя ў шэрагу расійскіх гарадоў, пэўным чынам дапамагалі беларусам у самаарганізацыі і ўсведамленні сябе як нацыі.

Нацыятворчыя працэсы ў *прыбалтыйскай частцы Расійскай імперыі*, сярод літоўцаў, латышоў і эстонцаў, маюць пэўныя агуль-

ныя рысы, але адначасова вызначаюцца сваёй адметнасцю. Калі ў Эстоніі і на большай частцы сучаснай тэрыторыі Латвіі пры поўнай падтрымцы пецярбургскай улады ў разгляданы перыяд ключавыя маёмасныя і палітычныя правы мелі землеўласнікі (остзейскія бароны), чыноўнікі, гандляры, пастары (у гарадах) нямецкага паходжання, то ў этнічнай Літве сітуацыя складвалася падобным чынам, як і ў Беларусі: мясцовая шляхта існавала, але яна была моцна арыентаваная на польскую мову і на ідэю адраджэння Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай. Любое ўзмацненне эксплуатацыі сялян у Латвіі і Эстоніі з боку іншамоўных землеўласнікаў выклікала вялікае незадавальненне, што спрыяла фарміраванню іх нацыянальных ідэнтычнасцяў. З іншага боку, этнічныя немцы Прыбалтыкі выяўлялі высокую ступень ініцыятыўнасці ў развіцці прамысловасці і гандлю: гэтаму спрыяла і адносная блізкасць рэгіёна да сталіцы імперыі. З гэтай прычыны ў Эстоніі і на большай частцы латвійскай тэрыторыі больш актыўна, чым у суседніх рэгіёнах, фарміравалася праслойка гарадскіх *фабрычных рабочых*, куды людзі рэкрутаваліся з эстонскіх і латышскіх паводле этнічнага складу вёсак. У этнічнай Літве цеснага супрацоўніцтва мясцовай шляхты з царскімі ўладамі нават у гаспадарчай сферы не атрымлівалася, найперш з прычыны дачынення яе да паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. і пераважна рыма-каталіцкай канфесійнай прыналежнасці. Парэформенныя працэсы ва ўсёй Прыбалтыцы прывялі да масавага пашырэння такога тыпу сельскіх паселішчаў, як хутары, што надавала сялянам усведамленне сваёй большай індывідуальнай свабоды. З іншага боку, латышы, эстонцы маглі трымаць шынкі, чайныя, заезныя двары і праз гэта выходзілі на пастаянныя кантакты са сваім сялянствам. Разбагацеўшы, частка гэтых людзей пачынала ўкладаць грошы ў больш буйныя праекты і, як вынік, ствараць усё большую канкурэнцыю прадпрымальнікам нямецкага паходжання. Да таго ж на пачатку Першай сусветнай вайны нямала нямецкіх сем'яў з балтыйскага рэгіёна Расійскай імперыі выехала ў Германію.

Натуральна, што вельмі важным чыннікам нацыятворчых працэсаў у гэтым рэгіёне было станаўленне і ўмацаванне пазіцый нацыянальных супольнасцяў інтэлігентаў. Віленскі ўніверсітэт стаў,

сярод іншага, асяроддзем, у якім сябе праявілі дзеячы жамойцка-літоўскага адраджэння. Сіманас Даўкантас у 1822 г. напісаў першую на літоўскай мове «Гісторыю Літвы» (апублікавана ў 1905 г.), а Сіманас Станявічус у 1829 г. апублікаваў зборнік сваіх літоўскіх вершаў.

У Мітаве (Елгаве) у 1822 г. пачала выходзіць першая ў гісторыі газета на латышскай мове «Латвіешу Авізэс».

Вялікую ролю для нацыянальнага адраджэння эстонцаў і латышоў адыграў заснаваны ў 1802 г. Дэрпцкі ўніверсітэт. Менавіта тут у 1820-х гг. узнік гурток патрыятычна настроенай эстонскай інтэлігенцыі, у якім вялі рэй Фрыдрых Роберт Фэльман і будучы ўкладальнік эстонскага нацыянальнага эпасу «Калевіпоэг» (надрукаваны на эстонскай мове ў 1862 г.) Фрыдрых Рэйнгольд Крэйцвальд. Там жа ў Дэрпце (Тарту) у 1850-х гг. утварыўся гурток маладых латышскіх літаратараў-асветнікаў, да якога належалі Юрыс Алунанс, Крыш'яніс Ба́ранс, Крыш'яніс Валдэмарс. На гэтай глебе нарадзіўся *рух маладалатышоў*, удзельнікі якога ставілі сабе за мэту спрыяць фарміраванню мадэрнай латышскай нацыі эвалюцыйным шляхам, найперш праз асвету. У той час пачалі выходзіць газеты на латышскай мове, «Маяс Віесіс» (у Дэрпце) і «Петэрбургас авізэс» (у Пецярбургу), на эстонскай мове – «Пэрна Постымэс» (у Пярну) і «Эсці Постымэс» (у Дэрпце-Тарту). Літоўскі грамадска-палітычны друк пачынаўся ва Усходняй Прусіі: штомесячны часопіс «Аўшра», які пачаў выдаваць Ёнас Басанавічус, нелегальна завозіўся ў літоўскія паветы Расійскай імперыі. Пазней, у 1889 г., варшаўскае таварыства студэнтаў-літоўцаў пачало выдаваць часопіс «Варпас», які рэдагаваў Вінцас Кудзірка. Яго ж рэдакцыя выдавала таксама прызначаную вяскоўцам газету «Укінінкас». Рыма-каталіцкі касцёл заснаваў газету «Цевінес саргас», у якім галоўную ролю адыгрываў ксёндз Юозас Тумас-Вайжгантас.

У сярэдзіне XIX ст. працэсы нацыянальнага адраджэння пачаліся ў асяроддзі літоўскага рыма-каталіцкага касцёла. Біскуп Мацеюс Валанчус не толькі напісаў па-літоўску гісторыю Жамойцкага біскупства ды шэраг дыдактычных празаічных твораў, але стаў ініцыятарам руху за цвярозасць – з часам досыць папулярнага сярод простых літоўцаў. Імёны іншых літаратараў прыбалтыйскіх народаў, якія адыгралі важную ролю ў нацыятворчых працэсах,

згадваліся ў адпаведных раздзелах. Істотнае значэнне, як і ў выпадку з Беларуссю, мела праца збіральнікаў фальклору – таго ж Ёнаса Басанавічуса, а таксама Антанаса Юшкі, Адолфаса Сабаляўскаса, Ёнаса Юшкі і іншых.

У Латвіі і Эстоніі ўсё большую папулярнасць набывалі *святы спеваў*, якія дапамагалі нацыянальнаму самаўсведамленню іх удзельнікаў. У другой палове XIX ст. у Эстоніі з'явіліся тэатральна-спеўнае таварыства «Вайнемуйнэ», Эстонскае студэнцкае таварыства. У 1878–1882 гг. педагог, пісьменнік і журналіст Карл Роберт Якабсан выдаваў першую палітычную газету на эстонскай мове «Са́кала»: на яе старонках была сфармулявана эканамічная і палітычная праграма адраджэння Эстоніі. У той самы час пастар і мовазнаўца Якаб Хурт сцвярджаў, што самавызначэнне эстонцаў як маленькага народа магчымае толькі ў культурнай сферы. У апошняй чвэрці XIX ст. заявілі пра сябе нефармальны рух за народную школу і Таварыства эстонскіх літаратараў.

На пачатку 1880-х гг. на загад імператара Аляксандра III сенатар Мікалай Манасеін распрацаваў план татальнай русіфікацыі прыбалтыйскіх губерняў. Замест остзейскіх немцаў на кіраўнічыя пасады пачалі прызначаць велікаросаў, якія, прыехаўшы на месца службы, часта надзвычай варожа ставіліся да «іншародцаў». Да канца XIX ст. усе навучальныя ўстановы ўключна з Дэрпцкім універсітэтам былі пераведзеныя з нямецкай, эстонскай або латышскай моў навучання на велікарускую. Тым не менш, калі ў самой Расіі ў гэты час чытаць і пісаць умелі каля 27 % ад агульнай колькасці насельніцтва, то ў Прыбалтыцы гэты паказчык у некаторых рэгіёнах дасягаў амаль 80 % і – што вельмі важна – пісьменнымі ў вялікай колькасці былі жанчыны. Напрыклад, у літоўскай Ковенскай губерні колькасць пісьменных жанчын (55 %) нават перавышала адпаведную колькасць мужчын (52 %).

У Латвіі пры канцы 1880-х гг. сфарміраваўся ідэйна-палітычны адраджэнскі рух левага кшталту пад назвай «Новая плынь», найважнейшымі прадстаўнікамі якога былі згаданы раней паэт і драматург Яніс Райніс (Пліекшанс), а таксама Яніс Янсанс і Петэрыс Стучка. Апошні стаў пазней актыўным дзеячам створанай у 1904 г. Латвійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, якая карысталася знач-

най папулярнасцю сярод насельніцтва краю ў перыяд паміж дзвюма рэвалюцыямі (хоць нацыянальныя лозунгі ў яе праграме гучалі досыць прыглушана). Сяляне Латвіі вельмі актыўна ўдзельнічалі ў кааператыўным руху: у 1914 г. дзейнічала ўжо 860 разнастайных сельскагаспадарчых таварыстваў.

Адным з сімвалаў эпохі сталі латвійскія ўцекачы – людзі, якіх прымусова эвакуявалі з Рыгі і іншых гарадоў краіны на ўсход, у Расію.

У Літве ў 1896 г. была створана першая звязаная з нацыянальным рухам палітычная арганізацыя – Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя.

Пры гэтым літоўцы заставаліся сялянскай нацыяй: пры канцы XIX ст. толькі каля 26 тыс. працавалі на фабрыках або займаліся рамёствамі, блізу 5 тыс. належалі да інтэлігенцыі.

Трэба адзначыць, што фарміраванню сучаснай літоўскай нацыі ў гэты перыяд актыўна перашкаджалі не толькі расійскія імперскія ўлады, але і мясцовая спаланізаваная шляхта. Справа дайшла да публікацыі кніжкі шляхціча Людвіка Чаркоўскага пад назвай «Аніколі», дзе адмаўлялася само права літоўцаў на сваё нацыянальна-культурнае і рэлігійнае адраджэнне.

У час рэвалюцыйных падзей у снежні 1905 г. у Вільні быў скліканы вялікі з'езд літоўцаў з усіх мясцовасцяў краю. З'езд прыняў рэзалюцыю з заклікам надаць Літве палітычную аўтаномію.

Перыяд паслярэвалюцыйнай рэакцыі вызначаўся імкненнем літоўцаў адстаяць свае нацыянальныя правы. У гэтым значную ролю зноў-такі адыгрываў рыма-каталіцкі касцёл, а таксама рэдагаваны Антанасам Смятонам часопіс «Вільціс». У Вільні пачало сваю дзейнасць Літоўскае навуковае таварыства, якое развівала нацыянальныя памкненні этнічных літоўцаў. У пашырэнні ведаў пра Літву ў свеце значную ролю адыгрывала вельмі актыўная ўжо тады літоўская эміграцыя ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы.

У сваю чаргу, Эстонія ўжо на пачатку XX ст. стала ў эканамічным і культурным аспекце ці не самым развітым рэгіёнам Расійскай імперыі, а да пачатку Першай сусветнай вайны прамысловасць давала тут больш за палову нацыянальнага даходу. На праблемы нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст. тут найбольшую ўвагу звяртала партыя сацыялістаў-федэралістаў, якую ўзначаліў журналіст,

рэдактар газеты «Уўдысэд» Петэр Спэк. Пазней на палітычную арэну выйшла нацыяльна-ліберальная Эстонская народная партыя прагрэсістаў. У апошняе дзесяцігоддзе перад Лютаўскай рэвалюцыяй у Эстоніі імкліва павялічвалася колькасць акадэмічнай інтэлігенцыі: паводле гэтага паказчыка эстонцы былі сярод першых у свеце. Створаная прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі арганізацыя «Маладая Эстонія» імкнулася навязаць шчыльныя кантакты з Паўночнай і Заходняй Еўропай, са скандынаўскай, англасаксонскай, раманскай культурай і адасобіцца ад нямецкай і велікарускай культуры. Тут працавалі нацыянальныя тэатры, музеі, культурна-адукацыйныя таварыствы.

У расійскай *Бесарабіі* ўмовы для ўтварэння *малдаўскага руху* не былі спрыяльнымі. На поўначы краю пасля яго далучэння да Расійскай імперыі было шмат вольнай зямлі. Таму тут не аформілася прыгоннае права, сяляне заставаліся асабіста вольнымі, хоць існавала іх эканамічная залежнасць ад землеўласнікаў – баяраў і манастыроў. Памешчыкі, аднак, не мелі дазволу на самавольнае перасяленне да сябе сялян з глыбі Расіі. Аднак насельніцтва краю і без таго было вельмі стракатым: тут жылі акрамя малдаван таксама ўкраінцы, велікаросы, грэкі, габрэі, цыганы, балгары, гагаузы, армяне, немцы, сербы. Міграцыя ў гэты рэгіён стымулявалася вызваленнем на некалькі гадоў ад падаткаў і на 50 гадоў – ад рэкруцкай павіннасці. Значную колькасць буйных сялянскіх гаспадарак у першай палове XIX ст. трымалі каланізатары, найперш немцы і балгары. У паслярэформенны перыяд аграрны вектар развіцця эканомікі Бесарабіі яшчэ больш узмацніўся, у той час як прамысловасць спецыялізавалася менавіта на перапрацоўцы сельгаспрадукцыі.

У першай палове XIX ст. некаторыя дзеячы культурнага адраджэння яшчэ трымаліся выразна прарасійскай, праімперскай арыентацыі. Да іх належалі, у прыватнасці, пісьменнік Канстанцін Стамаці, выдавец першай газеты на румынска-малдаўскай мове «Албіна ромыняскэ» (з 1829 г.), літаратар Георге Асакі.

Аднак такія майстры пяра, як Аляксандр Доніч, Канстанцінэ Негруцы, Багдан Петрычэйку Хашдэу, Віктар Крэсеску, Замфір Арбарэ-Ралі; пазней, на пачатку XX ст., Аляксей Матэевіч, Тудосе Роман былі больш арыентаваны на заходнія традыцыі і выказвалі непрыманне

таго прыгнёту, які панаваў у Расійскай імперыі. Не чужой для адукаваных малдаван была творчасць выдатных румынскіх паэтаў Васіле Александры і асабліва Міхая Эмінэску, празаіка і драматурга Міхая Кагэлнічану, празаіка Іона Лукі Караджале, дзіцячага пісьменніка Іона Крангэ і іншых. З 1914 г. пачынаецца рэгулярнае выданне штотыднёвай газеты «Кувынт малдавенэск». Але распаўсюджванню нацыянальна-адраджэнскіх ідэй моцна перашкаджаў вельмі нізкі ўзровень пісьменнасці сярод тамтэйшага насельніцтва: у 1897 г. колькасць непісьменных мужчын складала 90 %, жанчын – нават 98,3 %.

Далучэнне *Крыма* да Расійскай імперыі напачатку ніякім істотным чынам не паўплывала на пазіцыі тамтэйшага мусульманскага духавенства. У самым канцы XVIII ст. у Крыме дзейнічала каля 1600 мячэцяў, 25 медрэсэ і мноства пачатковых мусульманскіх школ – *мектэбаў*. З часам, аднак, царскі ўрад стварыў падкантрольнае яму Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне (1831 г.) і ўзмацніў сваю каланізатарскую палітыку ў гэтым рэгіёне. У выніку да 1850 г. адбыліся дзве магутныя хвалі эміграцыі крымскіх татараў, найперш у суседнюю Асманскую імперыю. Гэта стала прычынай заняпаду сельскай гаспадаркі і практычна поўнага абязлюдзення стэпавай часткі Крыма. Менавіта тады Крым пакінула вялікая частка крымска-татарскай эліты. Побач з гэтым ішла каланізацыя Крыма за кошт прыцягнення расейскім урадам перасяленцаў з тэрыторыі метраполіі. Усё гэта прывяло да таго, што з мільёна крымчан, якія жылі на паўвостраве на момант анексіі яго Расіяй, пры канцы XIX ст. засталося менш за 200 тысяч, што складала каля чвэрці ўсяго колішняга крымскага насельніцтва.

Крымска-татарскае адраджэнне было ў значнай ступені звязана з іменем выдатнага дзеяча культуры Ісмаіла Гаспрынскага, які прыклаў вялікія намаганні, накіраваныя на адраджэнне і выжыванне крымскага народа. Ён фактычна стварыў новую літаратурную крымска-татарскую мову і пачаў выдаваць першую крымска-татарскую газету «Тэрджыман», якая неўзабаве набыла вядомасць далёка за межамі Крыма і стала фактычна першай газетай для ўсіх цюркаў Расійскай імперыі. Гаспрынскі таксама распрацаваў новую методыку школьнай адукацыі: дзякуючы ёй сфарміравалася новая генерацыя крымска-татарскай інтэлігенцыі. Ён жа і першым пачаў

выкарыстоўваць лацінскі алфавіт замест арабскіх літар, што пазней было пазычана шмат якімі цюркскімі народамі.

У 1898 г. Хасан Нуры заснаваў у горадзе Алупцы падпольную арганізацыю «Неджат», якая ставіла сабе за мэту стварэнне дэмакратычнай і нейтральнай, падобнай да Швейцарыі, рэспублікі. Пасля смерці Нуры гэтую арганізацыю ўзначаліў яшчэ адзін значны крымска-татарскі асветнік і грамадскі дзеяч Асан Сабры Айвазаў. Рупарам арганізацыі (разгромленай царскімі ўладамі ў 1907 г.) была газета «Ватан хадзімі».

У снежні 1917 г. быў скліканы *першы курултай* (*з'езд*) *крымска-татарскага народа*, які абвясціў курс на стварэнне шматнацыянальнай Крымскай Народнай Рэспублікі.

Гвалтоўнае перасяленне вялікай колькасці *запарожскіх казакоў* на Кубань, заселеную ў той час збольшага паўночнакаўказскімі этнічнымі супольнасцямі, якое ажыццяўлялася за часоў Кацярыны II, стварыла пэўныя першасныя перадумовы для ўзнікнення асобнага кубанскага этнасу. У прыбылых казакоў у выніку ўзаемадзеяння з рэшткамі гэтых этнасаў пачалі фарміравацца прыкметы спецыфічнай, «казацкай» самаідэнтыфікацыі, што выявілася ў новым ладзе жыцця і нават у элементах прафесійнай культуры. Так, сённяшнія мастацтвазнаўцы вылучаюць арыгінальны тып кубанскай народнай іконы, які быў распаўсюджаны ў храмах гэтага рэгіёна пры канцы XVIII – на пачатку XX ст. Пасля захопу ўлады бальшавікамі ў Петраградзе ў студзені 1918 г. Кубанская краёвая вайсковая рада ўтварыла Кубанскую народную рэспубліку на чале з казацкім харунжым Мікалаем Рабаволам, якая 16 лютага таго самага года была абвешчана незалежнай. Адгалоскі тых падзей маюць месца па сёння. Так, у студзені 2012 г. група кубанскіх казакоў звярнулася да тагачаснага прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева з пратэстам з нагоды зробленай, на іх думку, фальсіфікацыі вынікаў Усерасійскага перапісу насельніцтва 2010 г., згодна з якімі казакі «прадстаўленыя не як самастойны этнас, а толькі як субэтнас рускага народа». У 2017 г. створаны раней Камітэт вызвалення Кубані прыняў дэкларацыю аб абвяшчэнні суверэннай Кубанскай Народнай Рэспублікі са сваім сцягам, гербам і гімнам.

Развіццё сацыяльна-эканамічных стасункаў у трох найбуйней-

шых *народаў Закаўказзя* – грузінаў, армян, азербайджанцаў – адбывалася ў XIX ст., з аднаго боку, пад вялікім уплывам расійскай імперскай палітыкі, а з іншага боку, свае правы ў гэтым рэгіёне імкнулася адстойваць Асманская імперыя. Хоць названыя народы мелі глыбокія культурныя традыцыі, якія сягалі ў глыб стагоддзяў, а Каўказ знаходзіўся на перасячэнні важных гандлёвых шляхоў паміж Еўропай, Вялікарасіяй і ўсходнімі краінамі, названыя чыннікі тут моцна перашкаджалі палітычнаму і нацыянальна-культурнаму развіццю. Пры ўсім гэтым царскі ўрад не мог праводзіць палітыку русіфікацыі настолькі паспяхова, як гэта было ў некаторых іншых рэгіёнах імперыі.

На момант далучэння Усходняй Арменіі да Расійскай імперыі там была фактычна знішчана мясцовая землеўласніцкая праслойка: землямі валодалі толькі царква і чужаземныя (найперш азербайджанскія) памешчыкі, ад якіх моцна залежалі мясцовыя сяляне. У той жа час актыўна развівалася гандлёва-купецкая праслойка, якая мела разгалінаваныя сувязі не толькі на Каўказе, але і ў Еўропе, і ў краінах Усходу. У суседняй Грузіі (з выняткам некаторых горных супольнасцяў) сярэднявечная сістэма гаспадарання мела яшчэ трывалыя карані: сяляне былі прыгоннымі і належалі князям або іх васалам-дваранам, а таксама царкве; пры гэтым катэгорыі і формы залежнасці сялян былі разнастайнымі. У Азербайджане сяляне знаходзіліся яшчэ ў больш заблытанай сітуацыі: адны плацілі фіксаваную рэнту памешчыкам-бекам, іншыя былі аб'ектам пастаянных пабораў з боку вышэйшай улады і землеўласнікаў. У гарадах досыць актыўна развіваліся рамёствы і гандаль, але і тыя, хто гэтым займаўся (сярод іх было нямала армян), мелі няшмат магчымасці абараніць сябе ад гвалтоўных дзеянняў з боку ўладатрымальнікаў. Царскі ўрад імкнуўся насадзіць у Закаўказзі сваіх чыноўнікаў, але тут яго інтарэсы сутыкаліся з інтарэсамі карэннай знаці. Даўшы напачатку армянам нейкае падабенства аўтаноміі ў выглядзе *Армянскай вобласці*, гэты ўрад да сярэдзіны XIX ст. фактычна яе ліквідаваў. У Грузіі і Азербайджане імперскія ўлады забралі землі ва ўсіх, хто не быў дастаткова лаяльны да царскага рэжыму. Імперыя нанесла ўдар і непасрэдна па мясцовых элітах. Нягледзячы на тое што Грузія ўвайшла ў склад імперыі з ініцыятывы свайго цара Іраклія II, на

працягу наступных дзесяці гадоў была прымусова вывезена ў глыб Вялікарасіі ўся шматлікая грузінская царская сям'я: царэвічам дазвалялася займацца выключна навукова-літаратурнай дзейнасцю.

Найбольш актыўнымі ў тагачасным духоўным жыцці гэтага рэгіёна былі армяне. Пасля адкрыцця ў 1815 г. маскоўскага *Лазараўскага інстытута ўсходніх моў* там атрымаў адукацыю шмат хто з будучых дзеячаў армянскага нацыянальна-культурнага адраджэння. У 1824 г. у Тыфлісе была заснавана армянская *школа Нерсесян*, якая праіснавала 100 гадоў і была зачыненая толькі пра савецкай уладзе. У другой палове XIX ст. значную ролю ў армянскай адукацыі пачала адыгрываць заснаваная ў 1874 г. у Эчміядзіне *семінарыя Геваргян*.

З XIX і пачаткам XX ст. звязаны шэраг згаданых намі раней значных імён армянскіх, грузінскіх, азербайджанскіх літаратараў, уклад якіх у фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці адпаведных народаў цяжка пераацаніць.

Наяўнасць вялікай колькасці прадпрымальнікаў і гандляроў, сярод якіх значная частка жыла за межамі краю, дазволіла армянам развіваць прагрэсіўныя на той час сацыяльныя ідэі. У 1858–1864 гг. маскоўскія армяне выпускалі часопіс «Юсісапайл», які прапагандаваў ліберальна-нацыянальныя ідэі. Рэдактарам выдання быў Сцяпан Назаран, а найбольш яркім публіцыстам – рэвалюцыйны дэмакрат Мікаэл Налбандзян, чые ідэі мелі значны ўплыў на працэс фарміравання навачаснай армянскай нацыі. У 1868 г. у Эчміядзіне пачаў выходзіць часопіс «Арарат». У 1870-х – 1880-х гг. выразна ліберальную арыентацыю мела газета «Мшак», якую рэдагаваў вядомы публіцыст Рыгор Арцруні. У сваю чаргу, кансерватыўныя погляды адстойвала газета «Мегу Аястані». З 1880 г. у Ерэване выходзіла досыць уплывовая і папулярная газета «Псак». Праз чатыры гады яна была зачынена царскімі ўладамі, якія пасля ў зыходжання на пецярбургскі трон Аляксандра III узяліся душыць любыя праявы вальнадумства і ў гэтым рэгіёне.

Досыць актыўнае развіццё прамысловасці, найперш горназдабыўчай і харчовай, у апошняй трэці XIX ст, што мела месца ў Закаўказзі, істотна павялічвала там уплывы слою прадпрымальнікаў. Гэта спрыяла палітычнаму гуртаванню нацый. Так, у 1890 г. у Тыфлісе (на той час надзвычай інтэрнацыянальным горадзе) утварыўся

армянскі нацыяльна арыентаваны «Дашнак-цуцюн» («Рэвалюцыйны саюз»). У 1903 г. ўузнікла і Армянская сацыял-дэмакратычная партыя («Гнчак»).

Значна слабейшымі, чым у Арменіі і Азербайджане, у другой палове XIX ст. былі пазіцыі прадпрымальніцкай праслойкі ў *Грузіі*: тут шмат якімі прадпрыемствамі валодалі азербайджанцы, армяне, велікаросы, габрэі.

Актывізацыі эканомікі Грузіі ў другой палове XIX ст. паспрыяла будаўніцтва Закаўказскай чыгункі, якая, аднак, інтэнсіўнаму росту прамысловасці ў той час не дапамагла.

Разам з тым у 1860-х гг. тут узнік досыць уплывовы літаратурна-філасофскі рух «Тэргдалеулі», які гуртаваўся вакол пісьменнікаў і публіцыстаў Ільі Чаўчавадзэ, Акакія Цэрэтэлі, а таксама Ніка Ніколадзэ. Пазней папулярнай зрабілася газета «Іверыя» на чале з тым жа Чаўчавадзэ (выходзіла ў 1877–1906 гг.). Агрэсіўна-русіфікатарская палітыка Аляксандра III нарадзіла актыўны рух нацыянальна-вызваленчага супраціву. У ім значную ролю адыграла сацыял-дэмакратычная арганізацыя «Месаме-дасі», заснаваная ў 1892 г. Больш імклівае развіццё грузінскай прамысловасці, якое мела месца ў пачатку XX ст., спрыяла пашырэнню сацыял-дэмакратычных і нацыянальна-адраджэнскіх ідэй.

Развіццё эканомікі *Азербайджана* ў другой палове XIX ст. адметнае тым, што расслаенне вёскі тут адбывалася значана больш павольна, чым у Арменіі і Грузіі, у сувязі з чым у гэтым краі ад пачатку вельмі значную ролю адыгрывалі прамыслоўцы і гандляры. Пэўную асветніцкую ролю сярод сялянства ў апошняй трэці стагоддзя пачала выконваць газета «Экінчы» – наогул першае перыядычнае выданне на цюркскай мове, якое выходзіла ў Расійскай імперыі, што праўда, толькі цягам двух гадоў (1875–1877). Пасля скасавання ў 1872 г. адкупной сістэмы тут сапраўдны бум перажывала нафтаздабыўная прамысловасць, а горад Баку ператварыўся ў адзін з найбуйнейшых прамысловых цэнтраў імперыі. Разам з тым, пры канцы XIX ст. толькі ⅓ ад агульнай колькасці рабочых на бакінскіх нафтапромыслах былі мясцовымі жыхарамі. Сярод уласнікаў гэтых прадпрыемстваў азербайджанцы (тады іх там называлі татарамі) складалі 29,3 %. Пэўная трывога за лёс нацыянальных капіталаў пачала выказвацца

на старонках газеты «Кешкюль», якая выходзіла па-азербайджанску ў Тыфлісе пры рэдагаванні Джалала Унсізадэ.

Станаўленню нацыянальна-арыентаванай азербайджанскай інтэлігенцыі спрыяла так званае татарскае аддзяленне *Гарыйскай настаўніцкай семінарыі* (адчынена ў 1879 г.). Намаганнямі інтэлігенцыі ў пачатку XX ст. узніклі азербайджанскія асветніцкія таварыствы «Нешр маарыф», «Ніджат», «Сафа» ды іншыя. Пры гэтым, аднак, у 1897 г. школы ў Азербайджане наведвалі толькі 2,5 % дзяцей адпаведнага ўзросту (у 1904 г. гэты паказчык вырас да 17,5 %). У 1914 г. была заснавана настаўніцкая семінарыя ў Гянджы.

Пры канцы XIX і ў пачатку XX ст. узніклі і азербайджанскія палітычныя партыі. Сярод іх у першую чаргу трэба назваць Мусульманскую дэмакратычную партыю «Мусават» (заснавана ў 1911 г. пад кіраўніцтвам Мамеда Эміна Расулзадэ), якая яшчэ да Лютаўскай рэвалюцыі займела нямала прыхільнікаў сярод розных слаёў азербайджанскага насельніцтва. Сярод агульнадэмакратычных праграмных палажэнняў партыйнай праграмы знайшлося месца і патрабаванню нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі для Азербайджана.

Мы ўжо адзначалі вышэй, што Расійская імперыя мела вялікія праблемы з падпарадкаваннем сабе *народаў Паўночнага Каўказа*. Іх рэлігійная аднастайнасць (спавяданне ісламу), наяўнасць харызматычных лідараў супраціву – такіх, як раней згаданы Шаміль, – а таксама пражыванне ў цяжкадаступных для любых захопнікаў горных раёнах зрабілі ўсталяванне трывалага акупацыйнага рэжыму ў перыяд да часовага заканчэння расійска-чаркескай вайны (1864) практычна немагчымым. Пасля таго як расійскія войскі ўсё ж збольшага ўзялі гэты рэгіён пад свой кантроль, вялікая колькасць чачэнскіх, чаркескіх, інгушскіх, дагестанскіх, кабардзінскіх, адыгейскіх сем'яў – усяго разам не менш як паўмільёна чалавек – пакінула родныя аулы і перасялілася ў Турцыю, пры гэтым *убыхі* Заходняга Каўказа эмігравалі ў поўным складзе. Астатняе насельніцтва засталося жыць на тэрыторыі, адміністрацыйны падзел якой царскі ўрад рэгулярна змяняў. Пакінутыя карэнным насельніцтвам землі былі аддадзеныя велікарускім памешчыкам і сялянам-каланістам. Традыцыйныя сацыяльныя і гаспадарчыя дачыненні тамтэйшых народаў былі вельмі разнастайнымі і складанымі, і гэта, вядома,

замінала этнакансалідацыйным працэсам. Царскі ўрад імкнуўся не ўступаць у сур'ёзныя канфлікты з тымі карэннымі землеўласнікамі, якія не сышлі ў выгнанне. Сялянам былі прапанаваны вельмі цяжкія ўмовы свайго выкупу з прыгону, і гэты працэс, напрыклад, у Дагестане зацягнуўся ажно да 1913 г. Пры такіх абставінах перавагу ў таварнай вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі атрымалі прышлыя каланісты. Вялікая колькасць сялян была змушана ісці ў адыходныя промыслы. Тым часам прадпрымальнікі, збольшага зноў-такі прыезджыя, пачалі распрацоўваць радовішчы мінеральных рэсурсаў у некаторых рэгіёнах Паўночнага Каўказа.

Ведучы гаворку пра культуру народаў Паўночнага Каўказа, варта звярнуць увагу на такую сферу, як адукацыя. Напрыклад, да XIX ст. на тэрыторыі Дагестана не было свецкіх школ, але паўсюль працавалі мусульманскія школы – *мактабы* і медрэсэ. У мактабах вучылі чытаць Каран, пісаць; выкладалі элементарныя веды па арыфметыцы. Школай больш высокага ўзроўню з'яўлялася медрэсэ. Лепшыя вучні маглі працягнуць сваё навучанне далей, бо існавалі таксама навукова-асветніцкія цэнтры, якія складваліся вакол выбітных паўночнакаўказскіх навукоўцаў-*алімаў*, напрыклад, такіх як Магамед Ярагскі, Джамалутдзін Казікумухскі ды іншыя. Да іх сцякаліся вучні з самых розных частак рэгіёна. Па-сапраўднаму адукаваны чалавек павінен быў прайсці найбольш значныя асветніцкія цэнтры, навучаючыся ў алімаў розным навукам. Сярод навук, якія распрацоўвалі мясцовыя мусульманскія вучоныя, вялікае значэнне мела гісторыя. У гэты перыяд з'яўляюцца шматлікія, таленавіта напісаныя гістарычныя творы, якія апавядаюць пра розныя падзеі мінулага і сучаснасці – прыкладам, даследаванне вучонага з Дэрбента Мухамеда Хайдара Візіра, прысвечанае барацьбе народаў Дагестана з іранскім шахам Надзірам. Варта таксама адзначыць гістарычныя працы вядомага дагестанскага вучонага Махамеда Тахіра ал-Карахі. Самая значная з іх – «Хроніка дагестанскіх войнаў», прысвечаная вызваленчай барацьбе каўказскіх народаў пад кіраўніцтвам Шаміля. Выдатным мусульманскім тэолагам і актыўным грамадскім дзеячам быў Узун-хаджы.

Імёны літаратараў паўночнакаўказскіх народаў, якія тварылі ў XIX – пачатку XX ст., згадваліся намі ў адпаведных раздзелах, прысвечаных культуры гэтай эпохі.

У 1870-х гг. у *Асецii* адкрыліся першыя пачатковыя школы, у якіх два гады навучанне ажыццяўлялася на асецінскай мове, а потым яшчэ два гады працягвалася на велікарускай. Узнік таксама рух за вызваленне краю ад каланіяльнай залежнасці. Ідэолагам стварэння на Паўночным Каўказе дэмакратычнай дзяржавы аб'яднаных горцаў на пачатку XX ст. выступіў асецінскі сацыял-дэмакрат меншавік Ахмет Цалікаў.

Асвета для дзяцей Чачні арганізоўвалася царскімі ўладамі, пачынаючы з 1870-х гг., выключна на велікарускай мове. Першы чачэнскі буквар быў выдадзены ў 1911 г у Тыфлісе выбітным асветнікам і літаратарам Таштэмірам Эльдарханавым.

*Цэнтральная Азія* была ўключана ў склад Расійскай імперыі позна: гэты працэс пачаўся ў 1730-х гг., але завяршыўся толькі ў 1885 г., калі былі інкарпараваныя землі паўднёвага Туркменістана. Бухарскі эмірат і Хівінскае ханства заставаліся фармальна незалежнымі да 1920 г., але існавалі пад фактычным пратэктаратам расійскай улады.

Гэты рэгіён цікавіў заваёўнікаў найперш як крыніца сыравіны для тэкстыльнай прамысловасці і новы рынак збыту. Ідэя зрусіфікаваць яго або падарваць у ім пазіцыі ісламу (а дзе-нідзе яшчэ і даўніх язычніцкіх вераванняў) выглядала ўтапічнай нават для самых агрэсіўных імперскіх палітыкаў. Элементы сярэднявечнага ладу жыцця, качавы характар існавання істотнай часткі насельніцтва, непахісная пазіцыя мясцовых моў (цюркскіх і іранскіх), жузава-кланавы характар мясцовых эліт – усё гэта знішчыць або перайначыць для каланізатараў было немагчыма. Але магчымым аказалася стварэнне досыць ажыўленага рынку каланіяльнага тыпу: стварэнне апорных пунктаў гуртавога гандлю, а таксама стацыянарных складоў-магазінаў і крам; выкарыстанне безграшовых формаў гандлю; атрыманне значнай колькасці сыравіны за бясцэнак праз выкарыстанне ціску і шантажу. Разам з тым гандлёвая праслойка ў краінах Сярэдняй Азіі і асабліва ў паўночнай і цэнтральнай частцы Казахстана да пачатку XX ст. узмацнілася настолькі, што пачалі ўзнікаць мясцовыя палітычныя групоўкі і партыі. Так, у Казахстане ў 1905 г. была заснавана мясцовая філія партыі кадэтаў, на базе якой у 1917 г. паўстала нацыянальна-арыентаваная партыя «Алаш» на чале з Аліханам Букейханавым.

Раёны вакол Ферганы, Самарканда, а таксама Сырдар'інская вобласць і Зарафшанская даліна адразу пасля захопу іх Расіяй ператварыліся ў галоўных пастаўшчыкоў бавоўны для прамысловасці метраполіі. Галоўнымі дзейнымі асобамі ў эканоміцы такога тыпу сталі не дэхкане (сяляне), а скупшчыкі гатовай прадукцыі, якія дыктавалі ім цэны. Апошнія паходзілі з катэгорый багацеяў (*баяў*) і ліхвяроў.

Буйныя расійскія тэкстыльныя манаполіі мелі непасрэдна ў названых рэгіёнах свае закупныя канторы і бавоўнаачышчальныя прадпрыемствы. Увоз капіталу, які праз мясцовыя філіі камерцыйных банкаў накіроўваўся на крэдытаванне вытворцаў, у значнай ступені ажыццяўляўся праз рукі мясцовых баяў: на іх аснове сфарміравалася праслойка ўзбекскай і таджыкскай буржуазіі. Частка з іх, праз стварэнне сваіх гандлёвых дамоў і фірмаў, моцна разбагацела (браты Вадзьяевы, Юсуф Давыдаў і іншыя).

У духоўным жыцці вялікага рэгіёна непадзельна панавалі ісламскія плыні. Сярод іх вылучаўся асветніцкі рух мусульман-рэфармістаў пад назвай *джадыдызм*. Прадстаўнікі гэтага руху лічылі сваім пакліканнем працу на карысць прагрэсу. Яны працавалі найперш у сферы асветы, імкнуліся даводзіць святарству (мулам) перавагі сучаснай цывілізацыі. Яны былі збольшага прыхільнікамі развіцця навукі, раўнапраўя жанчын. Да выбітных джадыдыстаў Сярэдняй Азіі належалі Мунавар Абдурашыдханаў, Казі Ісахон Шырынхужаеў, Саіднасыр Мірджалілаў, Хаджы Муін Шукрула, Маджыд Кадыры, Абдурауф Фітрат, Абдула Кадыры, Мустафа Шакай, Мамудхаджа Бекбудзі ды іншыя.

Згаданы Мунавар Абдурашыдханаў у 1917 г. узначаліў навастворанную партыю «Шура-і-Іслам» («Ісламская Рада»), якая выступіла за наданне сярэднеазіяцкім народам нацыянальна-рэлігійнай аўтаноміі. Крыху пазней з шэрагаў гэтай масавай партыі вылучылася грамадская арганізацыя «Шура-і-Улема» («Рада духавенства»).

У той жа час дзеячы збольшага свецкага нацыянальнага адраджэння народаў Сярэдняй Азіі – такія, як Чакан Валіханаў, Ібрай Алтынсарын, Хамза Хакімзадэ Ніязі, а таксама, прыкладам, Ахмад Даніш – імкнуліся чэрпаць гуманістычныя ідэі з расійскіх крыніц і адпаведным чынам былі настроеныя.

У самых складаных умовах ішлі нацыятворчыя працэсы ва *Урала-Паволжы* і *Сібіры*, бо гэтыя велізарныя рэгіёны трапілі пад маскоўскую ўладу яшчэ ў Высокім і Познім Сярэднявеччы або на самым пачатку Новага часу. Раней за ўсё гэта адбылося з Паволжам. У складзе Маскоўскай дзяржавы абсалютная большасць сялян паволжскіх народаў – марыйцаў, мардвы, удмуртаў, чувашоў – трапіла ў разрад дзяржаўных, якія плацілі падаткі непасрэдна ў дзяржаўную казну. Зямля *комі-пермякоў* была аддадзена ва ўласнасць прамыслоўцам Строганавым; у выніку тамтэйшыя сяляне з часам трапілі да апошніх у прыгон. *Комі-зыране* заставаліся ў якасці чарнасошных сялян. Гэта, а таксама недахоп у рэгіёне ўрадлівых земляў паспрыяла таму, што да пачатку XIX ст. у межах гэтай этнічнай групы сфарміравалася досыць вялікая група багатых купцоў (напрыклад, Суханавы і Апарыны), а таксама гандляроў-пасярэднікаў. Сярод значнай часткі комі-зыранскіх сялян распаўсюдзілася такая з'ява, як адыходніцтва: цэлыя сем'і арцелямі адпраўляліся нават у далёкую Сібір. Дзейнасць прадпрымальніцкай праслойкі комі адбывалася пад велізарным уплывам вялікарускай прафесійнай культуры. З часам, аднак, гэтая этнічная група аказалася здольнай даць свету сваіх літаратараў і вучоных (раней згаданы літаратар і лінгвіст Іван Куратаў, празаік Фёдар Філіпаў, этнограф Георгій Лыткін).

Сярод *удмуртаў*, *мардвы*, *марыйцаў* і *чувашоў* у выніку пашырэння сельскагаспадарчай таварнай вытворчасці ў XIX ст. сфарміравалася моцная верхавіна з ліку багатых сялян, якая імкнулася скарыстацца з абшчынна-калектывісцкіх традыцый вёскі. Досыць актыўна развіваліся і бытавыя промыслы, але пад прэсам моцнай прафесійнай вялікарускай культуры ўласныя культуры там знаходзіліся збольшага ў зачаткавым стане, хоць у галіне літаратуры гэтыя этнасы мелі ўжо свае здабыткі (гл. раздзелы, прысвечаныя культуры XIX і пачатку XX ст.).

Два народы Паволжа, *башкіры* і *калмыкі*, яшчэ да сяр эдзіны XIX ст. займаліся амаль выключна гадоўляй скаціны, і гэта фарміравала іх асаблівы лад жыцця. У паслярэформенны час значная частка башкірскіх сялян была пазбаўлена ранейшых пашаў і апынулася ў надзвычай цяжкім стане. Пачалося масавае адыходніцтва, збольшага ў батракі, або выезд на працу на ўральскіх заводах. Рост праслойкі

мясцовых прадпрымальнікаў адбываўся ў асноўным у выніку арганізацыі прадпрыемстваў перапрацоўкі сельгаспрадукцыі, гандлёва-перакупной дзейнасці, а таксама за кошт узаемавыгадных здзелак з багатымі сялянамі-башкірамі.

Уфа і Арэнбург былі ў той час вядучымі цэнтрамі мусульманскай адукацыі ў Расіі: тут існавала каля 300 медрэсэ, у шэрагу якіх з ініцыятывы бацькоў навучэнцаў пачалі выкладаць і некаторыя свецкія навукі. З гэтых навучальных устаноў выходзілі прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі (самыя яскравыя асобы – Міфтахетдзін Акмула, Ахметзакі Валідзі, Мухаметсалім Уметбаеў, Зайнула Расулеў, Сагіт Мрасаў, Юнус Бікбоў ды іншыя), хоць станаўленне сваёй прафесійнай культуры адбывалася павольнымі тэмпамі. У 1892 г. у Арэнбургу башкірскі асветнік і лінгвіст Уладзімір Катарынскі выдаў першы буквар на башкірскай мове; ён жа стаў аўтарам першых башкірска-рускага і руска-башкірскага слоўнікаў.

Толькі ў 1917 г. было створана *Цэнтральнае башкірскае шуро* (рада), пачалі адбывацца ўсебашкірскія курултаі (з’езды), на якіх башкіры узнялі голас за свае нацыянальныя правы.

У *Калмыкіі* на пачатку XIX стагоддзя панаваў традыцыйны сярэднявечны лад, звязаны з качавым укладам жыцця большасці мясцовага насельніцтва. У 1822 г. ва ўрочышчы Зінзілі быў скліканы з’езд калмыцкіх ламаў і землеўласнікаў, на якім быў прыняты поўны звод звычаяў калмыцкага народа. Яшчэ праз тры гады, у нязбыўным клопаце пра тое, як усталяваць кантроль над качавым народам будысцкага веравызнання, царскі ўрад выдаў свае адмысловыя «Правілы для кіравання калмыцкім народам».

У другой палове XIX ст. сфарміравалася праслойка багатых калмыцкіх прамыслоўцаў-уласнікаў вялікіх статкаў, якія наймалі беднякоў пастухамі скаціны. Развіваліся таксама прамысловае бахчаводства і агародніцтва. Гэта спрыяла пераходу качэўнікаў-сялян на аселы лад жыцця. Патрэбы калмыкаў у пісьменнасці і шырэйшай асвеце былі ў асноўным звязаны з будысцкай рэлігіяй. Сярод асветнікаў і літаратараў пачатку XX ст. найбольш вядомае імя згаданага намі раней Баавана Бадмы, які быў прыхільнікам рэфармавання традыцыйнага будызму і арганізаваў вышэйшую багаслоўскую і філасофскую школу ў Малых Дэрбетах.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі *татарскіх земляў* мясцовыя сяляне таксама пачалі належаць казне. З часоў Сярэднявечча ў гарадах існавала досыць моцная праслойка татарскіх рамеснікаў і гандляроў. Пасля далучэння да Расійскай дзяржавы Татарыя робіцца цэнтрам экспартнага гандлю, найперш з мусульманскімі краінамі Каўказа, гістарычнай Персіі, Сярэдняй Азіі. Мясцовыя знатныя роды (Урусавы, Юсупавы, Адашавы, Мяшчэрскія, Карамзіны) з часам абрусачыліся і пачалі належаць да найбуйнейшых землеўласнікаў Расіі.

Традыцыі свецкай адукацыі на татарскай мове былі закладзены яшчэ ў 1769 г., калі ў Казанскай гімназіі аўтар «Татарскага слоўніка і граматыкі» Сагіт Хальфін пачаў выкладаць родную мову вучням. Гэтую справу прадоўжылі яго сын Ісхак і ўнук Ібрагім.

У XIX ст. розныя слаі татарскага грамадства былі даволі моцна інтэграваныя ў розныя сферы агульнарасійскай жыццядзейнасці, але ўнутрыэтнічныя сувязі былі істотным чынам аслабленыя. Арыентаванасць татарскіх гандляроў і прадпрымальнікаў на аддаленыя рынкі прыводзіла да таго, што ўнутры краю ініцыятыва ў значнай ступені апыналася ў руках велікарускіх гандляроў і прамыслоўцаў. Спробы татарскіх прадпрымальнікаў заснаваць буйныя прамысловыя прадпрыемствы натыкаліся на жорсткую канкурэнцыю з боку тых, каму спрыяла цэнтральная ўлада. Сярод сялян, як і ў выпадку з шэрагам іншых народаў Паволжа, пачало распаўсюджвацца адыходніцтва. Усё гэта пазітыўна не ўплывала на магчымасці нацыянальнай кансалідацыі татараў напярэдадні бурных падзей пачатку XX ст. Інтэлігенцыя краю, мусульманская паводле свайго характару, пачала шукаць шляхоў, патрэбных дзеля таго, каб вырашаць гэтую праблему. Менавіта сярод паволжскіх татараў (поруч з башкірамі і крымскімі татарамі) узнік раней згаданы прагрэсіўна-рэфармісцкі рух джадыдызму, які адстойваў свае ідэі ў змаганні з кансерватыўнай плынню кадымізму. Татарамі былі заснавальнікі джадыдызму: Шыгабутдзін Марджані, Хусаін Фаізханаў, Муса Бігееў, Рызаэтдзін Фахрэтдзінаў; джадыдыстаў актыўна падтрымлівалі татарскія прадпрымальнікі Ахмед Хусаінаў, Закір Раміеў, Абдулвалі і Мулагалі Яушавы.

Першая ў гісторыі газета на татарскай мове «Нур» пачала выходзіць у Пецярбургу ў 1905 г. і праіснавала да пачатку Першай сусветнай вайны. Крыху пазней ужо ў самой Татарыі з'явіліся такія

перыядычныя выданні, як «Ёлдыз», «Каяш», у Арэнбургу – «Вакыт». У іх, сярод іншага, публікаваліся згаданыя ў папярэдніх раздзелах татарскія паэты, празаікі, публіцысты.

Татарскія палітычныя актывісты прынялі актыўны ўдзел у стварэнні першай усерасійскай ісламскай партыі «Ітыфак-аль-Муслімін» («Мусульманская Згода»), якая ўжо ў жніўні 1905 г. сабралася ў Ніжнім Ноўгарадзе на свой з'езд. Досыць моцную арганізацыю ў Татарстане ў той час мела і РСДРП.

У лістападзе 1917 г. на з'ездзе Мілет-Меджліса народаў Паволжа было прынята рашэнне аб намеры абвясціць на тэрыторыях тагачасных Казанскай і Уфімскай губерняў *Рэспубліку* (*Штат*) *Ітыль-Урал*.

Абсалютная большасць народаў *Сібіры* пасля іх далучэння да Расійскай імперыі і да 1917 г. так і не здолела выйсці на ўзровень самастойных нацый. Як мы адзначалі, прычына гэтага палягала ў тым, што ад самага пачатку велікарускія каланізатары адчувалі ў гэтым рэгіёне сваё вайскова-палітычнае дамінаванне і самым рашучым чынам узялі ў свае рукі вытворчасць і гандаль футравымі вырабамі, якія да XIX ст. заставаўся галоўнай галіной сібірскай эканомікі. Мясцовыя ж народы, з рэдкім выняткам, не мелі традыцый самастойнага дзяржаўнага ці нават протадзяржаўнага існавання, іх культура абмяжоўвалася падтрыманнем старадаўніх традыцый, збольшага звязаных з шаманскімі культамі. Гандаль, які вялі велікарускія купцы ў Сібіры, не быў эквівалентным: неадукаванае насельніцтва не магло мець нават прыблізнага ўяўлення пра рынкавыя кошты футра. Панавалі ашуканства, спойванне абарыгенаў, скуплянне за бясцэнак, марадзёрскія метады ўзаемаадносінаў. Больш устойлівымі выглядаў гаспадарчы побыт тых народаў, у якіх у сельскай гаспадарцы дамінавала жывёлагадоўля (бураты, хакасы, алтайскія народы, якуты ды іншыя). Гандлёва-прамысловая дзейнасць стварыла пэўныя ўмовы для фарміравання сваіх праслоек прадпрымальнікаў, але гэтыя праслойкі былі надзвычай тонкімі. Сёй-той з іх прадстаўнікоў, павучыўшыся ў рускіх школах, пачынаў задумвацца пра лёс свайго народа, пра стварэнне прафесійнай культуры, але наогул такіх было няшмат (імёны прадстаўнікоў літаратуры гэтых народаў пералічваюцца ў адпаведных раздзелах, прысвечаных культуры). Крыху асобна сярод названых народаў стаяць *бураты*,

сярод якіх існавала гістарычная памяць аб велічы колішняй Мангольскай дзяржавы; у гэтым краі ўзнік вялікі эпас «Гэсэр», а самае галоўнае было тое, што бураты спавядалі будызм, мелі значную праслойку святароў-*ламаў*. У разгляданы перыяд існавала багатая перакладная літаратура будысцкай традыцыі. Галоўнымі асяродкамі культурніцкай дзейнасці былі манастыры-дацаны, якія нярэдка мелі багатыя бібліятэкі.

На пачатку XX ст. разгарнулася фальклярыстычная дзейнасць Цыбена Жамцарано і згаданага раней Сяргея Балдаева. Жамцарано і Данііл Абашэеў склалі праграму для пачатковай бурацкай школы.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі паводле праекта бурацкага гісторыка Міхаіла Багданава была ўтворана нацыянальная дзяржава буратаў – *Дзяржава Бурат-Манголія*, найвышэйшым органам якой быў Буратнацкам на чале з прабальшавіцкім дзеячам Элбекам-Даржы Рынчыно.

Падагульняючы змест гэтага раздзела, варта адзначыць, што, нягледзячы на вялікія поспехі каланізатарскай палітыкі расійскіх цароў, апошні перыяд іх уладарання над вялікімі нярускімі абшарамі імперыі быў адзначаны ростам этнічнай самасвядомасці шматлікіх народаў і нястрымным працэсам нацыяўтварэння, найперш сярод тых народаў, якія мелі традыцыі сваёй дзяржаўнасці. Усё гэта паспрыяла працэсу распаду Расійскай імперыі (1917–1921), гаворка пра якія пойдзе ніжэй.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Асіміляцыя*** – зліццё, прыпадабненне, прысвойванне; уліццё аднаго народа ў іншы, мацнейшы, якое цягне за сабой страту першым сваёй мовы, культуры, нацыянальнай свядомасці.

***Імперыя*** – тэрытарыяльна вялікая, цэнтралізаваная і іерархізаваная поліэтнічная дзяржава, звычайна манархічнага або таталітарнага тыпу, у якой душыцца дзейнасць адцэнтрабежных сілаў. Ствараецца шляхам падпарадкавання раней незалежных народаў, подкупу і/або запалохвання мясцовых эліт.

***Калонія*** – залежная тэрыторыя, якая знаходзіцца пад уладай іншазем-

нага дзяржаўнага ўтварэння (метраполіі), з дапамогай спецыяльнага рэжыму кіруецца і, як правіла, эксплуатуецца апошнім.

***Метраполія*** – дамінантнае ў дачыненні да сваіх калоній і/або залежных тэрыторый і тэрыторый, якія эксплуатуюцца, дзяржаўнае ўтварэнне.

***Нацыянальны рух*** – арганізаваная грамадзянская дзейнасць, арыентаваная на абарону мовы і культуры пэўнага народу, замацаванне іх адукацыі, дасягненне розных формаў самакіравання – ад лакальнага да стварэння незалежнай нацыянальнай дзяржавы.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА


Блауг, М. Экономический империализм // *Яго ж.* Экономическая мысль в ретроспективе / пер. с англ. Москва: Дело, 1994. С. 240–244.

Буровский, А. Оживший кошмар русской истории. Страшная правда о Московии. Москва: Эксмо, 2010. 384 с.

Бутуліс, І., Зунда, А. Гісторыя Латвіі / пер. з латыш. Мінск: Зміцер Колас, 2017. С. 55–64, 78–87.

Валіцкі, А. Нацыя, нацыяналізм, патрыятызм / пер. з пол. Мінск: Медысонт, 2012. 528 с.

Гісторыя Беларусі. Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі / аўт: М. Біч [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2005. С. 67–74, 94–102, 269–291, 401–433.

История СССР с древнейших времен до конца XVIII в. / под ред. Б. А. Рыбакова. Москва: Высшая школа, 1983. 415 с.

Карлов, В. В. Введение в этнографию народов СССР (Стадийные закономерности и локально-исторические особенности этнокультурных процессов в XIX–XX вв.). Москва: Изд-во Моск. ун-та, 1990. С. 43–120, 130–133.

Крип'якевич, І. П. Історія України. Львів: Світ, 1990. С. 294–298.

Магун, А. В. Империализация (Понятие империи и современный мир) // Полис. Полит. исследования. 2007. № 2. С. 63–80.

Мейнандэр, Х. Гісторыя Фінляндыі: лініі структуры, пераломныя моманты / пер. са швед. Мінск: Маст. літ., 2017. С. 83–87, 94–97.

Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа: X–XXI стст. / рэд. і ўкл. тэксту: М. Семаковіч; пер. з пол. Выд. 3-е. Варшава: DEMART, 2007. С. 122–125, 144–145, 151–153, 161–163.

Новая имперская история Северной Евразии / И. Герасимов, М. Могильнер, С. Глебов при уч. А. Семенова. В 2 ч. Казань: «Ab imperio», 2017. Ч. 1: 364 с.; ч. 2: 630 с.

Радзік, Р. Вытокі сучаснай беларускасці / пер. з пол. Мінск: Медысонт, 2012. 376 с.

Рерих, Ю. Н. История Средней Азии. Москва: Междунар. Центр Рерихов, 2004. 472 с.

Российский Кавказ: кн. для политиков / под ред. В. А. Тишкова. Москва: Росинформагротех, 2007. С. 73–103.

Сибирь в составе Российской империи / отв. ред. Л. М. Дамешек, А. В. Ремнев. Москва: Новое лит. обозрение, 2007. 368 с.

Сміт, Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / пер. з англ. Мінск: БФС, 1995. С. 11–14.

Федотов, Г. П. Судьба и грехи России. Киев: София, 1991. 704 с.

Хоскинг, Дж. Россия: народ и империя (1552–1917) / пер. с англ. Смоленск: Русич, 2000. 512 с.

Эйдзінтас, А. [і інш.]. Гісторыя Літвы / пер. з літ. Вільня: SANTARA, 2014. С. 99–129.

Allworth, E. (ed.). Central Asia: A Century Of Russian Rule. Columbia Univ. Press, 1967. 552 p.

Hobsbawm, E. J. Nations and Nationalism since 1780. 2nd ed. Cambridge University Press, 1992. 206 p.

Kappeler, A. Rußland als Vielvölkerreich: Entstehung, Geschichte, Zerfall. München: C. H. Beck, 2008. 416 S.

Marturano, Aldo S. La nascita dell'Impero Russo. [Raleigh, NC:] Lulu.com, 2016. 380 p.

Nolde, B. La formation de l'empire russe. Etudes, notes et documents. Vol 1 et 2. Paris: Institut d'études slaves, 1952–1953. 300 et 408 p.

The Cambridge History of Russia. Vol. 2 / ed. by Dominic Lieven. Cambridge University Press, 2006. P. 9–63.

Κατσόβσκα-Μαλιγκούδη, Γ. Η αυτοκρατορική Ρωσία 1613–1917. Αθήνα: Gutenberg, 2008. 311 σελ.

# 11. САВЕЦКАЯ РАСІЯ І ЗАЛЕЖНЫЯ АД ЯЕ КРАІНЫ (1917–1991)

***11.1. Распад старой імперскай структуры.*** Гісторыкі да гэтага часу спрачаюцца наконт існавання дзвюх версій паводзінаў царскай Расіі падчас заключнага этапу Першай сусветнай вайны. Большасць лічыць, што царызм хацеў дамагчыся перамогі за любы кошт і такім чынам падоўжыць сваё палітычнае існаванне.

Калі Лютаўская рэвалюцыя перадала ўладу ў краіне тым, каго называлі змоўшчыкамі і хто ў сапраўднасці, свядома ці несвядома, руйнаваў царскі лад, выявілася, што праграмы ў новых кіраўнікоў краіны не было.

Створаны Камітэтам Дзярждумы і зацверджаны апошнім указам цара Мікалая II *Часовы ўрад* на чале з былым старшынёй Земскага саюза князем Георгіем Львовым, які ўключаў прадстаўнікоў былой парламенцкай апазіцыі, абвясціў сваёй мэтай працяг вайны і скліканне Устаноўчага сходу дзеля вызначэння будучага дзяржаўнага ладу Расіі. Вялікі князь Міхаіл Аляксандравіч, на карысць якога 2 (15) сакавіка адрокся ад трона апошні расійскі імператар, назаўтра ж, пасля сваёй сустрэчы з кіраўнікамі думскіх фракцый, абвясціў, што ён можа прыняць уладу толькі паводле рашэння Устаноўчага сходу. Асноўнай сілай Часовага ўрада былі канстытуцыйныя дэмакраты (кадэты – такія як міністр замежных спраў Пётр Мілюкоў, міністр земляробства Андрэй Шынгароў) і акцябрысты («Саюз 17 кастрычніка») на чале з вайсковым і марскім міністрам Аляксандрам Гуч-



Князь Георгій Львоў

ковым. Быў у першым складзе ўрада таксама прадстаўнік Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў (Петрасавета) Аляксандр Керанскі, які заняў пасаду міністра юстыцыі.


Аляксандр Керанскі

Рэвалюцыйныя партыі, якія цвёрда ведалі, што паводле вучэння Маркса ў Расіі на чарзе была буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, не прэтэндавалі на ўладу: буржуазія мусіла выканаць прызначаную ёй гісторыяй задачу, а толькі потым мелася прыйсці чарга сацыялістаў. Не паверыў у Лютаўскую рэвалюцыю і бальшавіцкі правадыр Уладзімір Ленін (Ульянаў), які ўбачыў з Цюрыха, што падзеі ў Петраградзе з'яўляюцца вынікам «змовы англа-французскіх імперыялістаў».

Слабасць Часовага ўрада, што выявілася з першых жа дзён яго існавання: адсутнасць дакладнай праграмы, няўпэўненасць у сабе – дазволілі Петраградскаму савету, які з моманту стварэння 27 лютага 1917 г. узначальвалі раней згаданыя Чхеідзэ (старшыня), Керанскі, а таксама Мацвей Скобелеў (намеснікі старшыні), зрабіцца фактычна другой уладай у краіне. Асабістая вядомасць Чхеідзэ і Керанскага спрыяла імкліваму росту ўплываў эсэраў і меншавікоў. Поспех эсэраў забяспечвала іх папулярная аграрная праграма, меншавікі ж у сваёй прапагандзе рабілі акцэнт на ўсталяванне ў краіне свабоды і вяршэнства права. Партыя эсэраў была па тым часе самай масавай у Расіі (ад 800 тыс. да 1 млн членаў), другое месца паводле колькасці займалі меншавікі (каля 240 тыс.). Эсэры і меншавікі падтрымлівалі лозунгі «абарончай рэвалюцыйнай вайны», склікання Устаноўчага сходу, кантролю за размеркаваннем і цэнаўтварэннем з боку дзяржавы пры адначасовым захаванні прыватнай уласнасці. Пачынаючы з сакавіка 1917 г., патрабаванні склікання Устаноўчага сходу на аснове ўсеагульнага, роўнага, беспасярэдняга і таемнага галасавання зрабіліся ў Расіі дастаткова масавай з'явай. Варта адзначыць таксама, што на пачатку сакавіка 1917 г. мандаты Петрасавета мелі каля 1300 дэпутатаў, і толькі не больш за 40 з іх належала бальшавікам.

Але і саветы на чале з Петраградскім не трымаліся выразнай лініі паводзінаў у пытаннях вайны і міжнароднай палітыкі. 1 (14) сакавіка 1917 г. Петрасавет выдаў знакаміты «загад № 1», згодна з якім у частках сталічнага гарнізона ўводзіліся выбарныя камітэты. У іх распараджэнні знаходзілася зброя, якая не павінна была выдавацца афіцэрам. Гэты загад, які таксама скасоўваў традыцыйныя вайсковыя формы дысцыпліны, быў неадкладна распаўсюджаны на ўсю расійскую армію, нягледзячы на тлумачэнні савета, што ён датычыцца выключна тылавых частак. Загад № 1 стаў найважнейшым чыннікам дэмаралізацыі расійскай арміі, на якую савет так ці іначай разлічваў дзеля працягу вайны з Германіяй (апошняя не адказвала на прапанову заключыць мір без анексій і кантрыбуцый). Ваганіся і бальшавікі. 12 (25) сакавіка з высылкі ў Петраград прыбылі былы дэпутат Дзярждумы Мацвей Муранаў, член старой рэдакцыі «Правды» Леў Каменеў (Разенфельд) і член ЦК бальшавіцкай партыі Іосіф Сталін (Джугашвілі). Яны тут жа захапілі кіраўніцтва газеты «Правда», у якой 15 сакавіка быў апублікаваны артыкул Каменева, дзе, у прыватнасці, гаварылася: «Калі армія стаіць супраць арміі, самай недарэчнай палітыкай была б тая, якая прапанавала б адной з іх скласці зброю і разысціся па хатах... Свабодны народ будзе трывала стаяць на сваім пасту, на кулю адказваць куляй...»

На палітычную сцэну краіны ў 1917 г. выйшлі тры палітычныя сілы: буржуазія і памешчыкі ў выглядзе партыі кадэтаў (або «буржуазна-ліберальная» дэмакратыя), дробная буржуазія, сяляне і сярэднія слаі гараджан у выглядзе партый меншавікоў і эсэраў (або «дробнабуржуазная» дэмакратыя), пралетарыят у выглядзе партыі бальшавікоў (або «пралетарская» дэмакратыя).

Манархісты і чарнасоценцы, а таксама акцябрысты перайшлі ў апазіцыю і сталі апірышчам контррэвалюцыі. Кадэты сталі кіраўнічай партыяй і занялі ў Часовым урадзе ўсе галоўныя пасты. Яны выступалі за парламенцкую рэспубліку, за выкуп дзяржавай і сялянамі земляў у памешчыкаў і за працяг вайны да перамогі на баку Антанты.

Эсэры былі самай масавай партыяй. Яны выступалі за стварэнне федэратыўнай рэспублікі вольных нацый, за перадачу зямлі сялянам і заключэнне міру без анексій і кантрыбуцый. Улетку 1917 г. сярод

іх утварылася *левая фракцыя*, якая адмаўлялася ад супрацоўніцтва з Часовым урадам. Увосень левыя эсэры сталі самастойнай палітычнай арганізацыяй.

Меншавікі выступалі за дэмакратычную рэспубліку, правы нацый на самавызначэнне, канфіскацыю зямлі ў памешчыкаў і перадачу яе ў валоданне органам мясцовага самакіравання.

Кадэты, эсэры і меншавікі адкладалі рэалізацыю сваіх планаў да канца вайны і склікання Устаноўчага сходу.

Сярод правых партый у 1917 г. найбольшую арганізаванасць выяўлялі кадэты, якія ў сакавіку і траўні паспелі правесці два свае з'езды і галоўнай мэтай краіны абвясцілі «вайну да пераможнага канца».

Петраградскі савет падтрымаў Часовы ўрад, і ў краіне склалася двоеўладдзе. Часовы ўрад стаў афіцыйнай, але намінальнай уладай, а Петраградскі савет, які апіраўся на войска, прымушаў Часовы ўрад узгадняць з ім усе свае дзеянні. Двоеўладдзе ў Расіі існавала з сакавіка да пачатку ліпеня 1917 г.

Часовы ўрад абвясціў амністыю палітычным зняволеным, увёў палітычныя свабоды, скасаваў абмежаванні ў правах па нацыянальнай і рэлігійнай прыкметах, адмяніў смяротнае пакаранне і вайскова-палявыя суды. Пачалася падрыхтоўка да выбараў ва Устаноўчы сход на аснове ўсеагульнага, беспасярэдняга, роўнага і таемнага галасавання. Царская сям'я была арыштавана і выслана ў Табольск.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Петрасавет пачалі прыходзіць «наказы»: так было прынята называць скаргі і прапановы грамадзян, перш за ўсё сялян і рабочых. Аналіз першых ста сялянскіх наказаў паказвае, што яны патрабавалі перш за ўсё канфіскацыі памешчыцкіх, дзяржаўных і іншых земляў і перадачы іх сялянам, а таксама неадкладнага заключэння «справядлівага міру». Першыя сто рабочых наказаў сведчаць, што рабочыя былі настроены менш рэвалюцыйна, чым сяляне. Іх патрабаванні мелі перадусім эканамічна-побытавы характар (8-гадзінны працоўны дзень, падвышэнне зарплаты і г. д.). Характэрна, што патрабаванне міру ўтрымлівалася ў 23 з 100 сялянскіх наказаў і толькі ў двух са ста рабочых наказаў. Пасля прыезду ў Расію з эміграцыі Уладзіміра Леніна і іншых лідараў бальшавіцкая партыя, якая раней выступала супраць прыватнага сялянскага землеўладання, пераймае галоўны лозунг партыі эсэраў: «Зямля – сялянам».

У гэты самы час Часовы ўрад ніяк не мог выпрацаваць больш-менш выразную праграму сваіх дзеянняў. За першыя два з паловай месяцы яго існавання змяніліся чатыры склады ўрада, прычым міністэрскія пасты займалі прадстаўнікі амаль дзясятка розных палітычных партый: кадэты, акцябрысты, прагрэсісты, трудавікі; пазней да іх далучыліся эсэры, меншавікі, народныя сацыялісты, радыкальныя дэмакраты. У эканамічнай палітыцы Часовы ўрад спрабаваў дзейнічаць праз ужыванне метадаў дзяржаўнага рэгулявання. 25 сакавіка (7 красавіка) 1917 г. была ўведзена манаполія на куплю і продаж збожжа. Уводзіліся хлебныя карткі, атаварванне якіх, аднак, улады не гарантавалі. Стварыўшы «Хлебармію забеспячэння», урад паспрабаваў ажыццявіць ідэю харчразвёрсткі, але вялікага поспеху ў гэтым не дамогся. Да восені ў Паволжы, Калужскай, Разанскай і іншых губернях лютаваў сапраўдны голад, які суправаджаўся масавай смерцю дзяцей. Усё гэта стварала глебу для папулярнасці чарговага бальшавіцкага лозунга: «Хлеб – галодным!» Аднак зрабіць канкрэтныя крокі ў вырашэнні актуальнага і балючага зямельнага пытання ніводзін са складаў Часовага ўрада так і не наважыўся.

Да восені 1917 г. прамысловая вытворчасць у Расіі перажыла спад на 35 %. Рубель абясцэніўся ў 15 разоў, а дзяржаўная запазычанасць павялічылася на 14 млрд руб. і склала да канца восені 49 млрд залатых рублёў.

Распачаты 18 чэрвеня (1 ліпеня) з ініцыятывы новага вайсковага і марскога міністра Керанскага наступ расійскіх войскаў на Паўднёва-Заходнім фронце ўжо 6 (19) ліпеня скончыўся поўным правалам.

Толькі 1 (14) верасня 1917 г. Расія была фармальна абвешчана рэспублікай. Гэтаму папярэднічала стварэнне двух *кааліцыйных складаў Часовага ўрада* (у якіх частку міністэрскіх пасад занялі эсэры і меншавікі): 5 (18) траўня зноў на чале з князем Львовым і 24 ліпеня (6 жніўня) на чале з эсэрам Керанскім.

Што да нацыянальнага пытання, дык тут таксама ніякіх істотных зрухаў не адбывалася – найперш таму, што кадэты, якія адыгрывалі істотную ролю ў Часовым урадзе, цвёрда стаялі на пазіцыях адзінай і непадзельнай Расіі. На словах Часовы ўрад быў згодны прызнаць аўтаномію Фінляндыі і Польшчы, але калі ў ліпені 1917 г. фінскі сейм абвясціў незалежнасць краіны, ён быў разагнаны расійскімі войскамі.

На пачатку кастрычніка Керанскі фактычна разарваў адносіны са створанай яшчэ ў сакавіку *Украінскай Цэнтральнай Радай*.

Усё гэта спрыяла пашырэнню антыўрадавых настрояў. Колькасць тых, хто страйкаваў у гарадах, у верасні-кастрычніку склала блізу 2,4 млн чалавек; адбылося больш за 5 тыс. сялянскіх выступленняў у розных рэгіёнах былой імперыі.

Трэба адзначыць, аднак, што ў той самы час быў зламаны рэпрэсіўны апарат старой царскай улады: ліквідаваны паліцыя (яе замянілі атрады міліцыі), жандармерыя, установы цэнзуры. У траўні – кастрычніку 1917 г. былі распушчаны Дзяржаўны савет і Дзяржаўная дума. Заканадаўчыя акты прымаліся непасрэдна распараджэннямі Часовага ўрада. Рэформа мясцовага самакіравання палягала ў пашырэнні на ўсю Расію сеткі земстваў; пачынаючы з траўня, галоўнымі органамі ўлады на месцах рабіліся *грамадскія выканаўчыя камітэты*.

Адначасова адбывалася і фарміраванне *савецкіх органаў*. Увесну 1917 г. на ўсёй неакупаванай тэрыторыі Расіі былі створаны 593 розныя саветы, да кастрычніка іх колькасць павялічылася да 1,5 тыс.; у арміі таксама стварылася некалькі тысяч *салдацкіх камітэтаў*. У траўні таго самага года адбыўся Усерасійскі з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў, у чэрвені – першы з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Дэлегатаў на гэтыя з'езды выбіралі адкрытым галасаваннем, без захавання дэмакратычных працэдур па месцы працы або службы вылучаных кандыдатаў. Абодва з'езды стварылі свае кіраўнічыя органы – *Выканкам Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў* і *Усерасійскі цэнтральны выканаўчы камітэт* (*УЦВК*). Закладзеная адразу пасля звяржэння манархіі сістэма двоеўладдзя атрымала фактычнае падмацаванне. Саветы, як і Часовы ўрад, імкнуліся спадабацца насельніцтву: публічна выступалі з прапановамі грамадзянскага міру, сацыяльных рэформаў, цвёрдых спажывецкіх цэн на тавары першай неабходнасці, скарачэння дзяржаўных выдаткаў. У знешняй палітыцы яны прапагандавалі ідэю вядзення выключна абарончай вайны.

***11.2. Узмацненне бальшавіцкай партыі.*** У дні Лютаўскай рэвалюцыі бальшавіцкая партыя, да як ой тады належала крыху больш за 10 тыс. актывістаў, не адыгрывала практычна ніякай ролі.

Адной з яе праблем было тое, што Ленін і іншыя лідары партыі працяглы час жылі далёка ад Расіі, у Заходняй Еўропе. Але вядомыя сёння дакументы сведчаць пра тое, як у 1917 г. кайзераўскія спецслужбы актыўна падтрымлівалі і фінансавалі прыход да ўлады ў Расіі менавіта бальшавіцкай партыі. Так, у сакрэтнай запісцы начальніка берлінскай секцыі палітычнага аддзела германскага Генеральнага штаба на адрас германскага МЗС за 17 (30) сакавіка 1917 г. прапаноўвалася вырашыць пытанне аб пропуску ў Расію праз тэрыторыю Германіі групы палітыкаў з ліку бальшавікоў, эсэраў і бундаўцаў. У запламбаваным вагоне, які пасля Германіі яшчэ праехаў праз тэрыторыю Швецыі і Фінляндыі, 3 (16) красавіка ў Расію прыбыла 31 асоба на чале з бальшавіцкімі дзеячамі Леніным і Георгіем Зіноўевым (Радамысльскім). У данясенні нямецкага Генеральнага штаба за 8 (21) красавіка 1917 г. кайзераўскі ўрад атрымаў наступную інфармацыю ад свайго прадстаўніка ў Стакгольме: «Прыезд Леніна ў Расію ўдаўся. Ён працуе цалкам паводле нашых пажаданняў…»

Аднак нямецкія ўлады не проста даставілі бальшавіцкіх правадыроў да месца прызначэння: яны шчодра фінансавалі іх дзейнасць, скіраваную супраць Часовага ўрада. Пра гэта пераканаўча сведчаць апублікаваныя ў 40-х – 50-х гг. XX ст. дакументы германскага міністэрства замежных спраў, а яшчэ ў пачатку 1921 г. нямецкі сацыял-дэмакрат Эдуард Бернштайн засведчыў, што на той момант бальшавікі атрымалі з нямецкіх крыніц велізарную суму – больш за 50 млн залатых марак. (*Для даведкі*: вартасць адной залатой маркі ў той час адпавядала 0,36 г чыстага золата.)



Уладзімір Ульянаў (Ленін)

У красавіку 1917 г. колькасць членаў бальшавіцкай партыі ўжо істотна вырасла (да 77 тыс. членаў). Бальшавіцкія правадыры пачалі атрымліваць салідныя заробкі, ад 250

да 5000 руб. у месяц, прычым выдавалі іх і ў нямецкіх марках (часам фальшывых), і ў шведскіх кронах, і ў швейцарскіх франках. Дзеля параўнання: жалаванне паручніка расійскай арміі ў той час складала 55 рублёў.

Партыя Леніна актыўна разбудоўвала свае структуры, і было б памылкай сцвярджаць, што гэта вынікала толькі з факту добрай матэрыяльнай забяспечанасці бальшавікоў. Прыняўшы на ўзбраенне эсэраўскі («Зямля – сялянам») і левапапулісцкі («Хлеб – галодным») лозунгі, бальшавікі выразна сфармулявалі і лозунг іншы: «Мір – народам!» Такія лозунгі бальшавіцкіх агітатараў леглі на прыдатную глебу: вялікая колькасць жыхароў тагачаснай Расіі адчувала не толькі стомленасць вайною, нястачамі і няпэўнасцю што да будучыні ўсёй краіны, але і прагнула перамен менавіта ў размеркаванні зямлі і нерухомасці.

Пры ўсім гэтым петраградскі Часовы ўрад быў упэўнены, што ахвотнікаў узяць уладу ў Расіі няма. Словы Леніна аб тым, што ўладу гатовыя атрымаць бальшавікі, тады сур'ёзна не ўспрымаліся. Палітычных дзеячаў звычайна папракаюць за тое, што яны хлусяць, утойваюць свае планы. Гісторыя дэманструе, аднак, што, калі палітычныя дзеячы – такія як Ленін, Сталін, Мусаліні, Гітлер, Мао Цзэдун, Пол Пот, – кажуць праўду пра свае планы, ім ніхто не верыць.

Слабасць улады ў краіне зняла ўсе перашкоды на шляху рэвалюцыйнай хвалі ў Расіі. Рэвалюцыя ператваралася ў бунт, які дазваляў выліцца шматвяковай нянавісці, назапашанай у народзе. І чым больш відавочнай рабілася слабасць улады, тым мацнейшым станавіўся бунт. Часовы ўрад, урад расійскага капіталу і інтэлігенцыі, няўхільна ішоў налева, імкнучыся паспець за бунтам народа, але ўвесь час прайграваў у гэтым спаборніцтве.

У ліпені 1917 г. бальшавікі паспрабавалі выкарыстаць чарговы ўрадавы крызіс і арганізавалі ў Петраградзе выступленне, вельмі падобнае да спробы путчу. Дэманстранты, якіх актыўна падбухторвалі бальшавікі, акружылі Таўрычаскі палац (сядзіба Петрасавета і УЦВК) і запатрабавалі ад савета ўзяць усю ўладу ў свае рукі. На вуліцах пачаліся сутыкненні. У адказ урад выклікаў вайсковыя падраздзяленні з фронту (дзе 18 чэрвеня пачаўся напачатку адносна паспяховы наступ расійскай арміі) і спыніў беспарадкі. Гэтыя

меры падтрымаў УЦВК. 20 ліпеня быў аддадзены загад аб арышцце Леніна, які, аднак, сышоў у падполле; паліцыя затрымала Льва Каменева і Льва Троцкага (апошні далучыўся да бальшавіцкай партыі незадоўга перад тым). Сама партыя, аднак, працягвала дзейнічаць абсалютна легальна. Ацэньваючы праваленую спробу путчу, Сталін казаў: «Узяць уладу 3 (16) і 4 (17) ліпеня мы маглі; мы маглі абавязаць УЦВК санкцыянаваць нашу ўладу. Але пытанне ў тым, ці маглі мы ўтрымаць гэтую ўладу. На нас падняліся б фронт, правінцыі, саветы… Захопам улады пры такіх умовах мы б аскандаліліся».

На ролі Троцкага ў падзеях 1917 г. трэба спыніцца асобна.

Леў Троцкі (сапраўдныя імя і прозвішча Лейба Бранштэйн) нарадзіўся ва Украіне ў 1879 г. у багатай сям'і. Ён рана далучыўся да рабочага, а потым і сацыял-дэмакратычнага руху. Актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыі 1905 г., быў некалькі разоў арыштаваны, потым жыў у эміграцыі.

Палітычныя погляды Троцкага былі прамежкавымі паміж бальшавіцкай і меншавіцкай ідэалогіяй, і ён часта выступаў за аб'яднанне гэтых плыняў у межах РСДРП. Перад Лютаўскай рэвалюцыяй Троцкі знаходзіўся ў Нью-Ёрку, і калі пра яе даведаўся, адразу вырашыў вярнуцца ў Расію. Па дарозе яго арыштавалі англічане, і толькі дзякуючы просьбе Часовага ўрада яго вызвалілі, пасля чаго ён здолеў праз Швецыю і Фінляндыю 4 (17) траўня 1917 г. вярнуцца ў Петраград.



Леў Троцкі

У ліпені на VI з'ездзе РСДРП(б) Троцкі канчаткова далучыўся да бальшавікоў і, нягледзячы на тое што ён знаходзіўся падчас правядзення з'езду ў турме, быў абраны ў склад ЦК. На пачатку верасня яго вызвалілі, а 7 (20) верасня абралі старшынёйм Петраградскага Савета. Паколькі Ленін хаваўся ад арышту ў Фінляндыі, Троцкі стаў фактычным лідарам бальшавікоў.

Падзеі ў краіне развіваліся імкліва, і Часовы ўрад спужаўся тэмпаў дэмакратычных пераўтварэнняў. 12 (25) жніўня 1917 г. у Маскве ім была склікана *Дзяржаўная нарада*, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх палітычных партый, акрамя бальшавіцкай, а старшыняваў на нарадзе міністр-старшыня, вайсковы і марскі міністр Аляксандр Керанскі. Нарада запатрабавала ліквідацыі двоеўладдзя і стала на бок урада. На нарадзе з праграмай уратавання краіны з дапамогай вайсковай дыктатуры выступіў і генерал Лаўр Карнілаў, які з 6 (19) ліпеня меў паўнамоцтвы Вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскай арміі. 25 жніўня (7 верасня) на загад Карнілава на Петраград рушыў 3-і конны корпус на чале з генералам Аляксандрам Крымавым. У гэтай сітуацыі Керанскі звярнуўся па дапамогу да саветаў, рабочых і салдат Петраграда. Спроба вайсковага путчу была ліквідаваная 30 жніўня (12 верасня), а ўдзел бальшавікоў у антыкарнілаўскіх дзеяннях падвысіў падупалы аўтарытэт гэтай партыі. Яе колькасны склад пачаў зноў павялічвацца і да кастрычніка 1917 г. дасягнуў прыкладна 400 тыс. чалавек.

Радыкалізацыя мас, стымуляваная дзяржаўным бязладдзем, узрастала. У верасні 1917 г. бальшавікі ўжо мелі большасць як у Петраградскім, так і ў Маскоўскім саветах. Усё гэта натхняла самых радыкальных бальшавіцкіх правадыроў на чале з Леніным на спробу нарэшце захапіць уладу ўзброеным шляхам. 10 (23) і 16 (29) кастрычніка адбыліся пасяджэнні Цэнтральнага камітэта партыі бальшавікоў (дакладней – часткі членаў ЦК і групы партыйных актывістаў), на якіх абмяркоўваліся пытанні арганізацыі ўзброенага перавароту. 12 (25) кастрычніка пры Петрасавеце быў утвораны *Ваенна-Рэвалюцыйны камітэт* (ВРК) на чале з Троцкім, які і стаў штабам перавароту. Супраць гвалтоўнага захопу ўлады, дарэчы, выступілі Каменеў і Зіноўеў: яны прапанавалі партыйнаму кіраўніцтву ўзяць курс на парламенцкае змаганне ў будучым Устаноўчым сходзе, а на дадзеным этапе прыняць удзел у працы Дэмакратычнай нарады і так званага *Перадпарламента*. Іх жорстка раскрытыкаваў Ленін, які пачаў патрабаваць неадкладнага выступлення, пакуль Часовы ўрад не здолеў перадыслакаваць франтавыя часткі ў расійскую сталіцу. Напачатку ЦК не падтрымаў Леніна, але пасля таго як сваю пазіцыю ў падтрымку ўзброенага выступлення выказаў Троцкі, рашэнне было

прынята. Сам жа Ленін ажно да вечара 24 кастрычніка працягваў хавацца ў загрыміраваным выглядзе на адной з канспіратыўных кватэр.

***11.3. Кастрычніцкі пераварот 1917 г. і прыход да ўлады бальшавікоў.*** 25 кастрычніка (7 лістапада) у Петраградзе пачынае працу Другі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У ноч на 26 кастрычніка (8 лістапада) 1917 г. на загад Льва Троцкага баявыя групы ВРК пад камандай Уладзіміра Антонава-Аўсеенкі захапілі рэзідэнцыю Часовага ўрада – Зімовы палац у Петраградзе, які на той момант абаранялі толькі падраздзяленні юнкераў і ўдарніцы добраахвотніцкага жаночага батальёна (колькасна вялікі Петраградскі гарнізон аб'явіў аб сваім нейтралітэце). Кіраўнік урада Керанскі пакінуў сваю рэзідэнцыю яшчэ днём 25 кастрычніка, не даўшы ніякіх указанняў астатнім міністрам.

З'езд Саветаў (які пасля сыходу правых эсэраў і меншавікоў, што адмовіліся прызнаць бальшавіцкі пераварот, складаўся выключна з бальшавікоў і левых эсэраў) зацвердзіў склад часовага рабоча-сялянскага ўрада – *Савета народных камісараў* (СНК). Гэты ўрад павінен быў кіраваць краінай надалей, аж да склікання Устаноўчага сходу. У склад урада ўвайшлі толькі бальшавікі. Старшынёй СНК быў зацверджаны Ульянаў-Ленін, наркамам замежных спраў – Троцкі, унутраныя справы даручаліся Аляксею Рыкаву, фінансы – Івану Скварцову-Сцяпанаву, земляробства – Уладзіміру Мілюціну, юстыцыя – Георгію Ломаву (Апокаву), гандаль і прамысловасць – Віктару Нагіну, праца – Аляксандру Шляпнікаву, пошта і тэлеграф – Мікалаю Глебаву-Авілаву, харчаванне – Івану Тэадаровічу, асвета – Анатолю Луначарскаму, справы нацыянальнасцяў – Сталіну. За вайсковыя і марскія справы павінен быў адказваць трыўмвірат у складзе згаданага Антонава-Аўсеенкі, а таксама Мікалая Крыленкі і Паўла Дыбенкі.

Трэба заўважыць, што ніхто з гэтых асоб, акрамя Сталіна, не дажыве да 1941 года, прычым сваёй смерцю памруць толькі Ленін, Нагін, Скварцоў-Сцяпанаў і Луначарскі. Астатнія будуць фізічна знішчаны ў 1937–1940 гг., фактычна на загад свайго былога калегі Сталіна. Пры гэтым ахвярамі бальшавіцкага тэрору стануць і жонкі першых народных камісараў Рыкава, Антона-Аўсеенкі, Троцкага, Шляпнікава, у некаторых расстраляюць і дзяцей.

Новым старшынёй УЦВК на з'ездзе быў выбраны бальшавік Леў Каменеў. Былая імперыя атрымала новую назву – *Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка* (*РСФСР*).

Другі з'езд Саветаў зацвердзіў падрыхтаваныя Леніным *дэкрэты аб міры і аб зямлі.* У першым дэкрэце бальшавікі прапаноўвалі Германіі і Аўстра-Венгрыі пайсці на замірэнне і неадкладна пачаць перамовы аб міры на сваіх Паўночна-Заходнім, Заходнім і Паўднёва-Заходнім франтах. У дэкрэт аб зямлі былі ўключаны асноўныя пастулаты эсэраўскай аграрнай праграмы: скасаванне прыватнай уласнасці на зямлю, перадача дзяржаве прыбытковых гаспадарак, недапушчэнне наёмнай працы на зямлі, канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных землеўладанняў, ураўнавальнае землекарыстанне.

2 (15) лістапада бальшавікі апублікавалі Дэкларацыю правоў народаў Расіі, падпісаную наркамам па справах нацыянальнасцяў Сталіным і старшынёй Саўнаркама Леніным. У ёй абвяшчаліся наступныя палажэнні:

1) роўнасць і суверэннасць народаў Расіі;

2) права народаў Расіі на свабоднае самавызначэнне, аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў;

3) скасаванне любых нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў;

4) свабоднае развіццё нацыянальных меншасцяў і этнічных груп, што насяляюць тэрыторыю Расіі.

І абодва дэкрэты, і згаданая дэкларацыя, відавочна, былі створаны бальшавікамі найперш з адной-адзінай мэтай – любым коштам утрымацца ва ўладзе, выбіўшы як мага больш козыраў з рук сваіх палітычных праціўнікаў. Пазнейшае развіццё бальшавіцкага рэжыму выразна паказала, што грамадзян Расіі і залежных ад яе савецкіх тэрыторый чакалі высылкі, катаванні і расстрэлы – за імкненне сялян мець сваю ўласную зямлю і працаваць на ёй, за выказванне кім бы тое ні было сумневу ў правамернасці вядзення войнаў у імя міфічнай «сусветнай рэвалюцыі» або захопаў тэрыторый бліжэйшых суседзяў, нарэшце, за самае асцярожнае выступленне ў абарону сваёй нацыянальнай мовы і культуры.

Першыя дні пасля кастрычніцкага перавароту не былі для бальшавікоў лёгкімі. Выехаўшы з Петраграда ў Пскоў, Керанскі здолеў

угаварыць камандзіра 3-га коннага корпуса генерала Пятра Краснова з яго 700 кавалерыстамі рушыць на сталіцу. Красноў займае Гатчыну, Царскае Сяло, але на Пулкаўскіх узвышшах яго наступ спыняе атрад Чырвонай гвардыі, камандавацы якім пагадзіўся армейскі палкоўнік Павел Вальдэн.

Найбольш сур'ёзны супраціў у першы тыдзень пасля прыходу да ўлады бальшавікі сустрэлі ў шэрагах найбліжэйшых таварышаў: у ЦК і ўрадзе. Калі Усерасійскі выканкам прафсаюза чыгуначнікаў 29 кастрычніка, палохаючы ўсеагульнай чыгуначнай забастоўкай, запатрабаваў стварэння аднастайнага сацыялістычнага ўрада з усіх прасавецкіх партый, у ЦК бальшавіцкай партыі і ва ўрадзе адбыўся раскол. У дні кастрычніцкага перавароту нейтралітэт прафсаюза, які не прапускаў эшалоны з фронту ў Петраград, спрыяў перамозе бальшавікоў. І калі кіраўніцтва прафсаюза выставіла свой ультыматум, ЦК у адсутнасць Леніна і Троцкага, занятых мабілізацыяй сіл супраць Краснова, пагадзіўся з «неабходнасцю пашырэння ўрадавай базы і магчымасцю змены складу ўрада». Дэлегацыя ЦК, якая з'явілася на нараду, скліканую прафсаюзам, дала згоду на стварэнне кааліцыйнага ўрада з 18 членаў, які ўключаў бы 5 бальшавікоў, але без Леніна і Троцкага.

Ленін, падтрыманы Троцкім, адхіліў саму думку аб кааліцыі і прыгразіў сваім партыйным калегам звярнуцца па дапамогу да матросаў Балтыйскага флоту. У адказ на гэта Каменеў, Рыкаў, Зіноўеў, Мілюцін і Нагін выйшлі са складу ЦК; акрамя таго, Рыкаў, Тэадаровіч, Мілюцін і Нагін адмовіліся далей працаваць у Саўнаркаме. У сваёй заяве яны падкрэслівалі, што ёсць толькі адзін шлях захавання чыста бальшавіцкага ўрада – «сродкамі палітычнага тэрору». У сваю чаргу Ленін заклікаў публічна да ўстанаўлення ў краіне дыктатуры пралетарыяту (лозунг, запазычаны ў позняга Карла Маркса і ідэолагаў Парыжскай камуны 1871 г.).

Што праўда, ужо ў снежні 1917 г. Ленін быў усё-такі вымушаны пагадзіцца на ўключэнне ў склад свайго ўрада некалькіх левых эсэраў: наркамам земляробства стаў Андрэй Калягаеў, поштаў і тэлеграфа – Прош Праш'ян, мясцовага самакіравання – Уладзімір Трутоўскі, юстыцыі – Ісак Штэйнберг, маёмасці – Уладзімір Карэлін. Зразумела, што пры канцы 1930-х гг. і гэтыя асобы (з выняткам памерлага ад

тыфусу яшчэ ў 1918 г. Праш'яна, а таксама Штэйнберга, які эміграваў з Расіі ў сярэдзіне 20-х) былі расстраляны сталінскімі памагатымі.

Савецкая ўлада (так пачала называць свой рэжым партыя бальшавікоў) распаўсюджвалася па значнай частцы расійскіх тэрыторый, не сустракаючы сур'ёзнага ўзброенага супраціву. Што праўда, у Маскве, пра якую Ленін казаў, што «перамога там забяспечана і біцца няма каму», супраціў доўжыўся 8 дзён. Найчасцей, аднак, мясцовыя гарнізоны і ўзброеныя працоўныя атрады адносна лёгка спраўляліся з усімі спробамі перашкодзіць захопу ўлады бальшавікамі. Забойства чырвонагвардзейцамі і натоўпам людзей у цывільным вярхоўнага галоўнакамандуючага генерала Мікалая Духоніна ў Магілёве, на тэрыторыі Беларусі, якое мела месца 20 лістапада (3 снежня) 1917 г., фактычна завяршыла знішчэнне старой расійскай арміі.

У пазнейшай міфалагізаванай бальшавікамі псеўдагістарычна-прапагандысцкай літаратуры бальшавікі ды іх духоўныя нашчадкі назавуць падзеі кастрычніка-лістапада 1917 г. у Петраградзе і шэрагу гарадоў Расіі «Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыяй». На пачатку, аднак, яны выказваліся больш сціпла: так, Сталін свайму артыкулу, прысвечанаму першай гадавіне згаданых падзей і апублікаванаму ў газеце «Правда» 6 лістапада 1918 г., дасць назву «Кастрычніцкі пераварот».

Бальшавіцкая ўлада здолела адразу ўсталяваць свой кантроль далёка не над усёй тэрыторыяй былой імперыі. 7 (20) лістапада 1917 г. у Кіеве была абвешчана *Украінская Народная Рэспубліка*, якая імкнулася не дапусціць прыходу бальшавізму на не акупаваныя нямецкімі войскамі тэрыторыі. На чале Генеральнага сакратарыята (урада) УНР стаяў пісьменнік і грамадскі дзеяч, сябар Украінскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі Уладзімір Вінічэнка. 15 (28) лістапада ў Тыфлісе (Тбілісі) быў утвораны небальшавіцкі кааліцыйны ны*Закаўказскі ўрад* на чале з меншавіком Яўгенам Гегечкоры. 14 снежня 1917 г. у Сімферопалі была абвешчана *Крымская Народная Рэспубліка*; яе ўзначаліў аўтарытэтны крымска-татарскі дзеяч Наман Чэлебіджыхан (праіснавала кароткі час, да канца студзеня наступнага года). У лістападзе 1917 г. на тэрыторыі цяперашніх Чачні, Інгушэціі, Дагестана была абвешчана *Горская рэспубліка* і створаны самастойны ўрад на чале з землеўласнікам і нафтапрамыслоўцам

Абдул-Меджыдам Чармоевым. 28 лістапада 1917 г. на тэрыторыі Сярэдняй Азіі ўтварылася і *Туркестанская аўтаномія*, на чале якой стаяў прэм'ер-міністр Мухамеджан Тынышпаеў (пазней яго замяніў Мустафа Шакай). На яе месцы ў красавіку 1918 г. бальшавікам удалося стварыць *Туркестанскую аўтаномную савецкую рэспубліку* (ва ўрад якой, ачолены Фёдарам Колесавым, не ўваходзіў ніводзін прадстаўнік карэнных нацыянальнасцяў), але *Хівінскае ханства* (на чале з Саідам-Абдулой) і *Бухарскі эмірат* (на чале з Сеід Алім-ханам) абвясцілі пра сваю незалежнасць ад Масквы.

Вынікі кастрычніцкага перавароту з першага дня не былі прызнаны атаманам Арэнбургскага казачага войска, палкоўнікам Аляксандрам Дутавым. Войскі Дутава ўзялі пад свой кантроль вялікую частку тэрыторыі Паўднёвага Урала. 7 (20) снежня 1917 г. у Арэнбургу быў утвораны вайсковы ўрад, пад кіраўніцтвам якога антыбальшавіцкая вайна Арэнбургскага казачага войска працягвалася аж да далучэння яго ўвесну 1919 г. да белай арміі адмірала Аляксандра Калчака.

Менш працяглым і менш эфектыўным было існаванне *Данскога вайсковага ўрада*, галоўную ролю ў якім адыгрывалі згаданы раней Лаўр Карнілаў і яшчэ адзін генерал, Міхаіл Аляксееў. На чале ўрада стаяў генерал кавалерыі Аляксей Каледзін. Бальшавікам удалося задушыць казацкія выступленні да пачатку лютага 1918 г.

***11.4. Устаноўчы сход і пачатак грамадзянскай вайны. Брэсцкая дамова.*** Штуршком да пачатку працяглай і кровапралітнай *грамадзянскай вайны ў* Расіі сталі дзве падзеі: разгон бальшавікамі Устаноўчага сходу і заключэнне ленінскім урадам Брэсцкага міру.

Выбары ва Устаноўчы сход адбыліся 12 (25) лістапада 1917 г. і не прынеслі жаданай перамогі бальшавікам, якія атрымалі толькі 24 % галасоў выбаршчыкаў, у той час як 40,4 % выбаршчыкаў прагаласавала за эсэраў, 16 % – за кадэтаў ды іншыя правыя і правацэнтрысцкія партыі, 2,7 % – за меншавікоў. Устаноўчы сход сабраўся ў петраградскім Таўрычаскім палацы 5 (18) студзеня 1918 г. Старшыня УЦВК Якаў Свярдлоў (які яшчэ ў сярэдзіне лістапада 1917 г. замяніў на гэтай пасадзе Каменева) зачытаў бальшавіцка-леваэсэраўскую дэкларацыю, у якой было прапанавана прыняць вынікі бальшавіцкага перавароту. Аднак Устаноўчы сход пад кіраўніцтвам

абранага ім старшыні, эсэра Віктара Чарнова адразу перайшоў да раней запланаванага абмеркавання зямельнага пытання. Пасля гэтага бальшавікі і левыя эсэры выйшлі з залы пасяджэнняў, а бальшавіцкая ахова сходу аб'явіла аб спыненні працы Устаноўчага сходу. У ноч на 7 (20) студзеня УЦВК абвясціў сваё рашэнне аб яго роспуску, фактычна здзейсніўшы гэтым заключны этап дзяржаўнага перавароту. Дэманстрацыя рабочых некалькіх петраградскіх заводаў на знак пратэсту супраць разгону Устаноўчага сходу была расстраляна Чырвонай гвардыяй. Так у савецкай Расіі скончылася эпоха парламенцкай дэмакратыі, хоць на той час і вельмі абмежаванай.

Рэалізацыяй даўнейшых дамоўленасцяў бальшавікоў з кайзераўскай Германіяй выглядае заключэнне 3 сакавіка 1918 г. мірнай *Брэсцкай дамовы*, якое, аднак, адбылося не ў тым выглядзе, якое напачатку планавалі бальшавікі. У кіраўніцтве ленінскай партыі зноў адбываліся жорсткія дэбаты наконт таго, якімі тэрыторыямі можна заплаціць Германіі за мір ва ўмовах адсутнасці ў савецкай Расіі баяздольнай арміі. Ленін, які ўступіў у зацятую спрэчку з Троцкім, Апокавым-Ломавым, а таксама з Мікалаем Бухарыным, Майсеем Урыцкім, Феліксам Дзяржынскім, іншымі членамі бальшавіцкага ЦК і левымі эсэрамі, паставіў ультыматум: мір з Германіяй павінен быць заключаны за любы кошт! У выніку тэкст падпісанай у Брэсце дамовы змяшчаў наступныя палажэнні:

– бальшавіцкая Расія адмаўлялася ад прэтэнзій на ўладу ў Польшчы, Літве і Курляндыі: будучы статус гэтых тэрыторый павінен быў рэгулявацца Германіяй па ўзгадненні з мясцовымі народамі згодна з іх правам на самавызначэнне;

– Эстонія і Ліфляндыя, а таксама амаль уся тэрыторыя Беларусі (на захад ад Дняпра) заставаліся пад кантролем нямецкіх войскаў;

– Украіна і Фінляндыя прызнаваліся ў якасці незалежных дзяржаў;

– Цэнтральныя дзяржавы адмаўляліся ад анексій і кантрыбуцый;

– Расія страчвала 26 % ранейшай еўрапейскай тэрыторыі, 27 % ворнай зямлі, 26 % чыгуначнай сеткі, 33 % тэкстыльнай, 73 % металургічнай прамысловасці, 73 % вугальных шахтаў;

– народы былых ускраін Расійскай імперыі мянялі расійскую ўладу на пратэктарат з боку Цэнтральных дзяржаў.

Усе тэрыторыі, ад прэтэнзій на якія адмовіўся расійскі бальшавіцкі

ўрад пасля падпісання вышэйзгаданай дамовы, агулам складалі 1,42 млн кв. км, на якіх тады жыло каля 60 млн чалавек – больш за ⅓ ад агульнай колькасці насельніцтва былой Расійскай імперыі. Паводле дадатковага пагаднення, падпісанага кайзераўскім і бальшавіцкім урадамі ў Берліне 27 жніўня 1918 г., Расія адмаўлялася ад прэтэнзій на Эстонію, Ліфляндыю ды Грузію і абавязвалася выплаціць кампенсацыю ў памеры 6 млрд залатых марак за раней адчужаныя Расіяй без кампенсацыі нямецкія актывы. Кайзераўскі бок даў абяцанне, пры ўмове атрымання адпаведных выплат, вывесці войскі з тэрыторыі Беларусі на ўсход ад ракі Бярэзіны і не ўмешвацца ў справы на баку праціўнікаў бальшавіцкага ўрада, а таксама не спрыяць утварэнню новых дзяржаў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі.

Гісторыкі дагэтуль не могуць прыйсці да адзінай высновы, навошта бальшавікам спатрэбілася падпісваць згаданае дадатковае пагадненне з кайзераўскім урадам. У жніўні 1918 г. сітуацыя Германіі на Заходнім фронце стала крытычнай: нямецкая армія якраз пацярпела вырашальнае паражэнне ў *бітве пад Ам'енам*. Згода бальшавіцкага ўрада заплаціць немцам велізарную суму кантрыбуцыі (узамен за зафіксаваны ў Брэсце мір без рэпарацый і кантрыбуцый) можа тлумачыцца не інакш, як неабходнасцю расплаціцца за ранейшую кайзераўскую дапамогу бальшавікам.

***11.5. Грамадзянская вайна на тэрыторыі Расіі. «Чырвоны» і «белы» тэрор.*** 7 (20) снежня, праз 5 тыдняў пасля кастрычніцкага перавароту, бальшавікі ствараюць новы орган – *Усерасійскую надзвычайную камісію па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам* (руская абрэвіятура: ВЧК). Думка пра такі орган нарадзілася ў Леніна адразу пасля перавароту, і ён шукаў адпаведнага чалавека, які б яго ўзначаліў. Такі кандыдат быў знойдзены ў асобе Фелікса Дзяржынскага, колішняга шляхціча беларускага паходжання. Выступаючы ў Саўнаркаме, апошні выклаў сваё крэда: «Не думайце, што я шукаю формаў рэвалюцыйнай юстыцыі: юстыцыя цяпер нам не патрэбна. Цяпер патрэбна барацьба – грудзі з грудзьмі, барацьба не на жыццё, а на смерць – чыя возьме! Я прапаную, я патрабую арганізацыі рэвалюцыйнай расправы над дзеячамі контррэвалюцыі!»

За фармулёўкай «барацьбы з сабатажам» зноў-такі хавалася ім-

кненне бальшавікоў любым коштам захаваць сваю ўладу, нягледзячы на ўсе правалы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якія сталі відавочнымі яшчэ да сярэдзіны 1918 г. У траўні таго года старшыня Усерасійскага цэнтральнага савета прафсаюзаў (УЦСПС) Міхаіл Томскі канстатаваў: «Падзенне прадукцыйнасці працы ў цяперашні момант дайшло да той фатальнай рысы, за якой (дакладней, на якой) краіне пагражае найпаўнейшы распад і крах». Зніжэнне прадукцыйнасці працы было адным з праяў росту незадаволенасці рабочых: шмат дзе пачаліся забастоўкі, а частка рабочых, дзеля таго каб выжыць, рушыла на вёску.


Фелікс Дзяржынскі

Радыкальная *аграрная рэформа*, якая прайшла па краіне, дала вынікі нечаканыя: на долю спрадвечных земляробаў прыйшлося ў сярэднім, у пераважнай большасці губерняў, не больш за паўдзесяціны прырэзанай зямлі. Кінуўшыся з горада ў вёску, рабочыя заводаў, рамеснікі, прыслуга і іншыя запатрабавалі сабе надзелаў і атрымалі іх «ад Савецкай улады». Асноўнай прычынай расчаравання сялянства было, аднак, не гэта: зрэшты, пэўны надзел зямлі атрымаў шмат хто, канчаткова было ліквідавана памешчыцкае землеўладанне. Незадаволенасць новай уладай пачалося з таго моманту, калі апошняя запатрабавала ад сялян сельскагаспадарчых прадуктаў, не даючы нічога ўзамен. Да гэтага часу інфляцыя цалкам абясцэніла грошы, прамысловасць перастала выпрацоўваць тавары, патрэбныя вёсцы. Да сабатажу пралетарскага далучыўся сабатаж сялянскі. Калі ў лістападзе 1917 г. была нарыхтавана 641 тыс. т збожжа, то ў снежні гэты паказчык склаў 136 тыс., у студзені 1918 г. – 46 тыс., у красавіку – 38 тыс., у траўні – 3 тыс., у чэрвені – 2 тыс. т. У гарадах шэрагу рэгіёнаў Расіі фактычна зноў пачынаўся голад.

Бальшавіцкаму ўраду не выпадала разлічваць і на падтрымку ін-

тэлігенцыі. Праз тыдзень пасля кастрычніцкага перавароту УЦВК спрабаваў арганізаваць сустрэчу новай улады з творчай інтэлігенцыяй, на якую, аднак, з'явіліся толькі рэжысёр Усевалад Меерхольд ды паэты Аляксандр Блок, Уладзімір Маякоўскі і Рурык Іўнеў (апошнія двое належалі да бальшавіцкай партыі). Нават самы вядомы на той час празаік, якога самі бальшавікі абвяшчалі пралетарскім, Максім Горкі, вельмі крытычна ставіўся да тагачаснай дзейнасці ленінскай партыі, публікуючы рэзкія крытычныя артыкулы ў меншавіцкай газеце «Новая жизнь».

Правадыры бальшавікоў, захапіўшы ўладу, пачалі жорстка змагацца не толькі са сваімі традыцыйнымі палітычнымі праціўнікамі – манархістамі, палітычнымі партыямі правага кірунку, «класавачужымі элементамі». У марах пра светлую сацыялістычную будучыню Расіі яны пачалі барацьбу на вынішчэнне са сваімі колішнімі паплечнікамі. Увесну 1918 г., неўзабаве пасля смерці бацькі расійскай сацыял-дэмакратыі Георгія Пляханава, яны разграмілі Усерасійскую сацыял-дэмакратычную партыю «Адзінства», якая рэзка асуджала бальшавікоў за вайсковы пераварот і паслякастрычніцкую палітыку. Бальшавіцкі друк у адзін голас пачаў называць меншавікоў «сацыял-здраднікамі»; іх абвінавачвалі ў непасрэдным саўдзельніцтве ў контррэвалюцыі, супрацоўніцтве з інтэрвентамі і замежнымі спецслужбамі. У сапраўднасці меншавікі, як і левыя эсэры, спрабавалі працягваць працу ў саветах, займаючыся збольшага канструктыўнай крытыкай канкрэтных дзеянняў бальшавіцкай улады. Мы адзначалі, што з канца лістапада – пачатку снежня 1917 г. некалькі левых эсэраў уваходзілі ў склад Саўнаркама; прадстаўнікі гэтай партыі працавалі і ў УЦВК. Але пасля ратыфікацыі апошнім органам Брэсцкай дамовы і зацвярджэння дэкрэтаў аб харчовай дыктатуры і камітэтах беднаты (травень–чэрвень 1918 г.) левыя эсэры выйшлі са складу ленінскага ўрада. У сваіх знешнепалітычных сімпатыях яны арыентаваліся не на Германію, як бальшавікі, а хутчэй на Антанту, а палітыка харчразвёрсткі наўпрост пярэчыла асноўным палажэнням праграмы партыі сацыял-рэвалюцыянераў.

Яшчэ ў большай ступені сітуацыя абвастрылася ў сярэдзіне лета 1918 г. На V з'ездзе саветаў 5 ліпеня адна з лідараў левых эсэраў Марыя Спірыдонава ахарактарызавала бальшавікоў як «здраднікаў

рэвалюцыі» і «прадаўжальнікаў палітыкі Керанскага», а назаўтра ў Маскве блізкімі да левых эсэраў баевікамі быў забіты нямецкі амбасадар граф Вільгельм фон Мірбах. Пасля гэтага эсэраўскія дэлегаты з'езда саветаў былі арыштаваны бальшавіцкай ВЧК, але неўзабаве адзін з палкоў ВЧК перайшоў на эсэраўскі бок і фактычна ўзяў пад кантроль уладу ў Маскве. Леніну і Троцкаму ўдалося, аднак, мабілізаваць самыя баяздольныя чырвоныя часткі латышскіх стралкоў (вярхоўным камандзірам Чырвонай арміі на той момант быў латыш, палкоўнік Юкумс Вацэціс) і задушыць выступленне левых эсэраў. З гэтага моманту ў падсавецкай Расіі рэальна запанавала *аднапартыйная дыктатура* (пазнейшая, падчас будучай грамадзянскай вайны, кароткатэрміновая легалізацыя некаторых груповак меншавікоў і правых эсэраў істотным чынам на гэтае становішча не паўплывала).

Натуральна, што палітыка бальшавікоў няўхільна вяла кантраляваныя імі абшары былой імперыі да *грамадзянскай вайны*, пачатак якой шэраг гісторыкаў адносіць яшчэ да студзеня – красавіка 1918 г. Але тады гаворка ішла пра ўтрыманне антысавецкімі сіламі ўлады ў тых рэгіёнах, куды, нягледзячы на стварэнне Дэкрэтам Саўнаркама ў студзені 1918 г. *Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі*, бальшавіцкая ўлада дайсці не магла, у тым ліку і пасля высадкі падраздзяленняў замежных узброеных сіл (*інтэрвенцыі*) у Мурманску (французы, англічане) і ва Уладзівастоку (англічане, японцы, пазней амерыканцы), якая абгрунтоўвалася заключанымі раней саюзніцкімі дамовамі Расіі і Антанты.

Асноўныя падзеі *першага перыяду* грамадзянскай вайны (травень – кастрычнік 1918 г.) былі звязаны з задушэннем бальшавікамі бунту Чэхаславацкага корпуса* на сібірскай магістралі (травень),

---

* Чэхаславацкі корпус – нацыянальнае добраахвотніцкае воінскае злучэнне, сфарміраванае ў складзе расійскай арміі ў гады Першай сусветнай вайны, збольшага з палонных чэхаў і славакаў – былых вайскоўцаў аўстра-венгерскай арміі, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у вайне супраць Германіі і Аўстра-Венгрыі. На падставе дэкрэта французскага ўрада аб арганізацыі аўтаномнай Чэхаславацкай арміі ў Францыі Чэхаславацкі корпус у Расіі з 15 студзеня 1918 г. быў фармальна падпарадкаваны французскаму камандаванню.

сялянскіх выступленняў у Паволжы і Заходняй Сібіры пад лозунгамі «свабоды гандлю» і «абароны Устаноўчага сходу» (травень–чэрвень). У гэты час мелі месца: стварэнне антыбальшавіцкіх урадаў у Самары (т. зв. *Камітэт членаў Устаноўчага сходу*, паводле рускай абрэвіятуры: «Камуч»), у Новамікалаеўску, на Доне, у Архангельску і ўтварэнне Усходняга фронту бальшавікоў (чэрвень); антысавецкія бунты ў Цэнтральнай Расіі (Рыбінск, Яраслаўль, Мурам, ліпень); узяцце Казані меншавіцка-эсэраўскімі сіламі і чэхаславацкімі атрадамі, баі ў наваколлі Свіяжска (жнівень); наступы вайсковых злучэнняў пад камандай генералаў Антона Дзянікіна на Кубані, вышэйзгаданага Краснова ў раёне Варонежа і Царыцына (ліпень – жнівень); падзенне савецкай улады ў Сібіры і на Далёкім Усходзе (ліпень – верасень).

У ліпені 1918 г. бальшавікі прынялі *першую савецкую канстытуцыю*, якая заклала падмурак жорсткага цэнтралізаванага аднапартыйнага кіравання дзяржавай. Тады ж Саўнаркам РСФСР зацвердзіў новы *герб краіны*. У якасці дзяржаўнага сцяга бальшавікі па першым часе выкарыстоўвалі прамавугольнае чырвонае палотнішча без якіх-колечы дадатковых знакаў на ім.

Яшчэ раней, у траўні, была ўведзена абавязковая вайсковая павіннасць «для працоўных». На ўсіх прыступках уладнай лесвіцы ўводзілася адзінаўладдзе. 2 верасня быў утвораны *Рэўваенсавет рэспублікі*, які ўзначаліў наркам па вайсковых і марскіх справах Леў Троцкі. З ініцыятывы апошняга ў Чырвоную армію пачалі прыцягвацца былыя царскія вайсковыя спецыялісты, вышэйшыя афіцэры і нават генералы. У вялікай ступені дзякуючы гэтаму бальшавіцкім сілам удалося перайсці ў наступ на Усходнім фронце і ўвосень 1918 г. захапіць Сімбірск і Казань. Трэба заўважыць, што ў гэты перыяд савецкай улады ўжо не існавала амаль на 75 % тэрыторыі былой царскай імперыі. Але антыбальшавіцкія сілы былі моцна раздробленыя.




Першапачатковы герб РСФСР (магчымы аўтар Аляксандр Леа)

Гэты час вызначыўся пачаткам *чырвонага тэрору*. У якасці непасрэднай нагоды для яго ўвядзення бальшавікі выкарысталі замах на жыццё свайго правадыра Леніна, здзейснены 30 жніўня ў Маскве эсэркай Фанні Каплан. Комплекс карных мераў супраць «класавачужых элементаў» (як патэнцыйных контррэвалюцыянераў) быў легалізаваны пастановай Саўнаркама РСФСР за 5 верасня 1918 г. «Аб чырвоным тэроры». Гістарычныя дакументы і паказанні сведкаў данеслі да нашчадкаў звесткі пра лютыя катаванні і забойствы, здзейсненыя такімі бальшавіцкімі апрычнікамі, як Петэрс, Краўзе, Арлоў (Масква), Урыцкі (Петраград), Пласцініна (Волагда), Саенка, «таварыш Эдуард» (Харкаў), Лацыс (Судрабс), Аўдохін, Роза Шварц, «таварыш Вера» (Кіеў), Фрыдман (Екацярынадар), Грабеннікава, Дэйч, Яўлінская, Віхман (Адэса), Бэла Кун, Ашыкін, Дземышаў (Крым) ды іншыя.

Для «чырвонага тэрору» характэрна тое, што яго ахвярамі рабіліся не толькі асобы, якія актыўна змагаліся супраць улады бальшавікоў, але і цэлыя класавыя праслойкі – памешчыкі, святары розных канфесій, прадпрымальнікі, студэнты і нават гімназісты. Як сведчыла ўжо ў 1970-х гг. колішняя бальшавічка Маргарыта Фофанава, яе тагачасныя аднапартыйцы проста ў лазарэтах расстрэльвалі параненых і хворых салдат ды афіцэраў. Практыкавалі яны таксама расстрэлы дактароў, медыцынскіх сясцёр, санітараў. Расстрэльвалі пажылых людзей, жанчын і нават малых дзяцей. Турмы ў гарадах былі поўныя закладнікаў. Напрыклад, у Керчы (Крым) палонных салдат і афіцэраў бальшавікі вывозілі на баржах у адкрытае мора і тапілі.



Ахвяры «чырвонага тэрору» ў Еўпаторыі (Крым)

Паводле ацэнкі англійска-амерыканскага гісторыка, даследчыка «чырвонага тэрору» Роберта Конквеста, агульная колькасць асоб, замучаных і расстраля-

ных у 1917–1922 гг. бальшавіцкімі карнымі органамі, складае каля 140 тыс. чалавек. Расійскі даследчык, доктар гістарычных навук Сяргей Волкаў ацэньвае агульную колькасць смяротных ахвяр бальшавізму, з улікам людзей, якія памерлі ў гэты час ад голаду, выкліканай палітыкай бальшавізму страты карміцеляў у сем'ях і г. д., прыкладна ў два мільёны чалавек.

У 1919 г. ВЧК стварае першы комплекс канцэнтрацыйных лагераў на поўначы Расіі, які атрымае назву: *Паўночныя лагеры спецыяльнага прызначэння* (руская абрэвіятура: СЛОН). За 14 гадоў існавання найцяжэйшыя ўмовы чалавечага існавання ў іх перажывуць дзясяткі тысяч палітзняволеных, тысячы загінуць ад хвароб і жорсткага абыходжання ахоўнікаў.

Дзеянні з боку праціўнікаў бальшавіцкай улады таксама нярэдка выходзілі далёка па-за межы цывілізаваных. Гэтую з'яву прынята ў гістарычнай літаратуры называць *белым тэрорам*. Пачатак «белага тэрору» можна аднесці да зімы 1918 г., калі генерал Лаўр Карнілаў, узначаліўшы першы паход белай Добраахвотніцкай арміі на Кубань, звярнуўся да сваіх вайскоўцаў са словамі: «Я аддаю вам загад, вельмі жорсткі: палонных не браць! Адказнасць за гэты загад перад Богам і рускім народам я бяру на сябе!» Пра падзеі названага паходу яго ўдзельнік Мікалай Багданаў сведчыў наступнае: «Асобы, узятыя ў палон, пасля атрымання ад іх звестак аб дзеяннях бальшавікоў, расстрэльваліся каменданцкім атрадам. Афіцэры гэтага атрада пры канцы паходу былі зусім хворымі людзьмі... У Корвін-Крукоўскага з'явілася нейкая адмысловая балючая жорсткасць. На афіцэрах каменданцкага атрада ляжаў цяжкі абавязак расстрэльваць бальшавікоў, але, на жаль, я ведаў шмат выпадкаў, калі пад уплывам нянавісці да бальшавікоў афіцэры бралі на сябе абавязкі добраахвотна расстрэльваць звычайных ваеннапалонных...»

Прыход да ўлады прыхільнікаў Устаноўчага сходу ў гарадах Паволжа ўлетку 1918 г. суправаджаўся расправай над многімі партыйна-савецкімі работнікамі, забаронай бальшавікам і левым эсэрам служыць ва ўладных структурах. На тэрыторыі, якую кантраляваў «Камуч», былі створаны структуры дзяржаўнай аховы, вайскова-палявыя суды, выкарыстоўваліся «баржы смерці». Агулам ахвярамі антыбальшавіцкага тэрору там сталі каля 5 тыс. чалавек.

Разам з тым сёння няма абгрунтаваных падстаў казаць, што белы тэрор ажыццяўляўся паводле прыкметы класавай прыналежнасці ахвяр. Карных органаў, падобных паводле свайго маштабу і размаху да ВЧК, цэнтры белага руху таксама не стварылі.

*Другі этап* грамадзянскай вайны ў Расіі звязваецца з заканчэннем Першай сусветнай вайны і яе наступствамі. На працягу 1918 г. у выніку савецка-кайзераўскіх дамоваў і капітуляцыі Балгарыі, Турцыі, Аўстра-Венгрыі, а потым і самой Германіі ўтварыліся свае ўрады ў Эстоніі, Латвіі, Літве, Польшчы, Галіччыне, у астатняй Украіне; была таксама абвешчана *Беларуская Народная Рэспубліка*. У Адэсе і ў Крыме высадзіліся англа-французскія войскі; галоўны горад Азербайджана Баку апынуўся пад кантролем англічан. У Омску антыбальшавіцкія сілы ўсталявалі вайсковую дыктатуру на чале з адміралам Калчаком. Краіны Антанты прызналі Аляксандра Калчака «вярхоўным правіцелем Расіі». У адказ на наступ Чырвонай арміі на Доне (студзень-люты 1919 г.) і распачатую бальшавікамі палітыку «расказачвання» (пазбаўлення казакоў традыцыйна замацаваных за імі палітычных і вайсковых правоў) у сакавіку – траўні ўспыхнула паўстанне на Верхнім Доне. У той самы час войскі Калчака, наступаючы з усходу Расіі і падтрымліваючы паход белагвардзейцаў Дзянікіна на Маскву, занялі Уфу, Бугульму, Іжэўск і падышлі да самай Казані.

У сваю чаргу бальшавікі ў сакавіку 1919 г. утварылі *Камуністычны інтэрнацыянал* (*Камінтэрн*) як сусветную камуністычную партыю з секцыямі ў паасобных краінах і цэнтрам у Маскве. Якраз у гэты час камуністычным і анархісцкім сілам удаецца абвясціць савецкія рэспублікі ў Венгрыі (сакавік – ліпень) і Баварыі (красавік). Акрамя таго, прадстаўнікам Камінтэрна ў Заходняй Еўропе і ЗША ўдалося ўнесці свой уклад у пашырэнне незадавальнення сярод насель-



Белагвардзейскі бронецягнік «Адзіная Расія» пад Царыцынам, 1919 г.

ніцтва адпаведных дзяржаў умяшаннем у справы Расіі і яе суседзяў (рух «Рукі прэч ад Расіі!»).

Бальшавіцкія правадыры ў гэты перыяд істотна змянілі сваю ўнутраную аграрную палітыку, ліквідавалі непапулярныя камітэты беднаты і высунулі лозунг пра «саюз з серадняком і апору на беднату». Як вынік гэтага, пачало расці незадавальненне сялян на вялікіх тэрыторыях, кантраляваных калчакаўцамі.

Пачынаючы з красавіка 1919 г. можна гаварыць пра *трэці этап* грамадзянскай вайны. Узнік даволі моцны партызанскі рух у тыле сіл Калчака, а Чырвоная армія перайшла ў наступ на Усходнім фронце (красавік – чэрвень). У красавіку хваляванні сярод французскіх маракоў на Чорным моры прывялі да вываду адтуль флоту інтэрвентаў. Бальшавікі таксама ўтварылі Туркестанскі фронт і працягвалі адцясняць войскі Калчака на ўсход. У ліпені апошні, трымаючыся сваіх перакананняў пра «адзіную і непадзельную Расію», адхіліў прапанову генерала Карла-Густава Манергейма скіраваць на Петраград статысячную фінскую армію. Таксама Калчак уступіў у канфлікт са сваімі французскімі дарадцамі і вышэйзгаданым Чэхаславацкім корпусам, які абвясціў аб сваім нейтралітэце. Урэшце, калі надышла зіма, становішча арміі Калчака моцна пагоршылася. На пачатку студзеня 1920 г. ён пачаў адступаць ужо ў глыб Усходняй Сібіры, а пазней здаўся бальшавікам і быў расстраляны паводле прысуду рэвалюцыйнага трыбунала ў ноч з 6 на 7 лютага.

Улетку 1919 г. войскі Добраахвотніцкай арміі генерала Дзянікіна актыўна наступалі з паўднёвага ўсходу на Маскву, заняўшы Кіеў, Варонеж, Курск, Арол. Супраць іх змагаліся не толькі Чырвоная армія, але і аб'яднаныя ўзброеныя сілы Украінскай Народнай Рэспублікі ды Заходнеўкраінскай Народнай Рэспублікі пад камандай Сымона Пятлюры, а таксама партызаны на чале з таленавітым народным камандзірам, анархістам Нестарам Махно. У кастрычніку войскі арміі Дзянікіна пачалі адступаць; у сакавіку 1920 г. яе апошнія баяздольныя часткі эвакуіраваліся ў Крым, дзе яны перайшлі пад камандаванне генерала Пятра Урангеля.

Увесну 1919 г. пачалася *савецка-польская вайна*, актыўная фаза якой доўжылася з красавіка па кастрычнік. Наваствораная польская армія пад камандаваннем кіраўніка дзяржавы Юзафа Пілсудскага

вызваліла ад бальшавікоў Мінск і Кіеў, але ў чэрвені савецкія войскі на чале з Міхаілам Тухачэўскім перайшлі ў контрнаступ пад лозунгамі здзяйснення сусветнай рэвалюцыі і «ўз'яднання з пралетарыятам Германіі праз ліквідацыю панскай Польскай дзяржавы». У сярэдзіне жніўня Чырвоная армія была разбіта ў *бітве пад Варшавай*, страціўшы (забітымі, параненымі і палоннымі) не менш за 100 тыс. вайскоўцаў, і адступіла далёка на ўсход, на тэрыторыю цэнтральнай Беларусі. Пасля заключэння ў кастрычніку замірэння пачаліся бальшавіцка-польскія перамовы, вынікам якіх стала *Рыжская дамова* (сакавік 1921 г.). Паводле яе часткі тэрыторый Украіны і Беларусі адышлі да Польшчы, а бальшавікі мусілі пагадзіцца на існаванне фармальна незалежных Украінскай і Беларускай савецкіх рэспублік, якія яны тут жа цалкам сабе падпарадкавалі.

У траўні – кастрычніку 1919 г. Паўночна-Заходняя армія генерала Мікалая Юдзеніча два разы спрабавала заняць Петраград, але была разбітая Чырвонай арміяй, пасля чаго адступіла на тэрыторыю Эстоніі і да студзеня 1920 г. была расфарміраваная ўрадам гэтай краіны. На пачатку лютага таго самага года войскі і флот англа-амерыканскіх інтэрвентаў пакінулі Мурманск і Архангельск, і гэтыя тэрыторыі таксама перайшлі пад бальшавіцкі кантроль.

*Апошні этап* грамадзянскай вайны, межы якога гісторыкі вызначаюць ад восені 1920 да вясны 1921 г., быў адзначаны наступнымі падзеямі. У лістападзе 1920 г. Чырвонай арміі ўдалося дасягнуць апошняй перамогі над белагвардзейскімі сіламі: у Крыме былі разгромлены рэшткі войска генерала Урангеля.



Рэўваенсавет 1-й Коннай арміі чырвоных. Злева направа: Клімент Варашылаў, Сямён Будзённы (камандарм), Яфім Шчадзенка, 1920 г.

Да пачатку 1921 г. асноўныя франты грамадзянскай вайны перасталі існаваць. З тактычных меркаванняў яшчэ ў красавіку 1920 г. бальшавікі пайшлі на стварэнне так званай *Далёкаўсходняй рэспублікі* (руская абрэвіятура: ДВР) на чале з камуністамі і з удзелам у яе Устаноўчым сходзе прадстаўнікоў

партый меншавікоў, эсэраў ды іншых. У выніку паўстання антыбальшавіцкім сілам 26 траўня 1921 г. удалося стварыць у горадзе Уладзівастоку часовы ўрад Прымор'я, які ўзначаліў Спірыдон Мяркулаў. Але армія ДВР пад камандай Васілія Блюхера, пры поўнай падтрымцы Масквы, да канца 1922 г. здолела вызваліць Прымор'е ад узброеных фарміраванняў гэтага ўрада і японскіх інтэрвентаў. Пасля гэтага ДВР была ліквідавана і ўключана ў склад Савецкай Расіі.

Аднак апошні перыяд грамадзянскай вайны не быў для савецкай улады беспраблемным. Палітыка *ваеннага камунізму*, якая стала вынікам увядзення шэрагу прымусовых мераў у эканоміцы – найперш вышэйзгаданай харчразвёрсткі, а таксама ўраўнавальнага размеркавання паводле класавага прынцыпу, нацыяналізацыі ўсёй прамысловасці і ўвядзення ўсеагульнай працоўнай павіннасці, абавязковай прыналежнасці работнікаў да камуністычных прафсаюзаў – да пачатку 1921 г. паставіла краіну на мяжу гаспадарчага краху. Пачаўся сапраўдны харчовы і паліўны крызіс. Спыніліся заводы ў Петраградзе і іншых гарадах Расіі. Для шмат каго з дэмабілізаваных не было ані жытла, ані працы. Вытворчасць падала абвальнымі тэмпамі; скарачаліся пасяўныя плошчы, пагалоўе скаціны. Касмічных маштабаў дасягнула інфляцыя: у параўнанні з 1913 г. рубель патаннеў у 5600 разоў!

Палітыка ваеннага камунізму выклікала ўсё большую незадаволенасць сярод розных слаёў насельніцтва. Пачаліся сялянскія паўстанні, найбольш маштабным сярод іх было Тамбоўскае пад кіраўніцтвам эсэра Аляксандра Антонава (жнівень 1920 – чэрвень 1921). Узніклі хваляванні і ў пяцімільённай на той час Чырвонай арміі. Пры канцы 1920 – на пачатку 1921 г. супраць бальшавікоў выступіў былы камандзір кавалерыйскага палка Кірыл Вакулін, пазней стала вядома пра бунт чырвонаармейцаў камандзіра брыгады 1-й Коннай арміі Рыгора Маслакова. У сакавіку 1921 г. успыхнуў так званы Кранштацкі мяцеж маракоў Балтыйскага флоту, дзеля задушэння якога старшыня Рэўваенсавета Троцкі, галоўнакамандуючы войскамі Чырвонай арміі Сяргей Каменеў і камандарм Тухачэўскі не толькі скіравалі адборныя падраздзяленні арміі і ВЧК, але і мабілізавалі каля 300 дэлегатаў X з'езда бальшавіцкай партыі, што якраз у тыя дні адбываўся ў Маскве. Менавіта на гэтым з'ездзе бальшавікі былі

вымушаны пайсці на тактычныя палітычныя саступкі – абвясціць пра пачатак *новай эканамічнай палітыкі* (*НЭП*). Як заявіў у сваім выступе Ленін: «Толькі пагадненне з сялянствам можа выратаваць сацыялістычную рэвалюцыю, пакуль рэвалюцыя не пачалася ў іншых краінах». Гэтае рашэнне бальшавікоў, аднак, ужо не магло прадухіліць масавага голаду, які пачаўся ў шэрагу рэгіёнаў Савецкай Расіі ў 1921–1922 гг. і звёў у магілу не менш за пяць мільёнаў чалавек.

Аналізуючы прычыны адноснага поспеху бальшавікоў у расійскай грамадзянскай вайне, трэба адзначыць, што іх колькасна шматлікія праціўнікі сталі ахвярай сваіх памылковых уяўленняў пра тагачасны стан грамадства. Шмат хто з праціўнікаў Леніна ўтапічна верыў, што большасць насельнікаў былой Расійскай імперыі толькі і сніць пра адраджэнне «адзінай і непадзельнай Расіі»; другія меркавалі, што ўсе народы былой царскай Расіі аднолькава саспелі да стварэння эфектыўнай сістэмы народаўладдзя; трэція звязвалі сваю веру ў поспех толькі з матэрыяльнай і вайсковай падтрымкай заходніх краін. Найбольш цынічнымі і паслядоўнымі ў гэтай сітуацыі выявілі сябе бальшавікі, якія паставілі сабе за мэту любымі спосабамі ўтрымацца ва ўладзе.

***11.6. Неакаланіялізм бальшавіцкіх уладароў. Стварэнне СССР.*** Па меры атрымання ваенных перамог на розных франтах бальшавіцкае кіраўніцтва Савецкай Расіі ўсё больш актыўна прапагандавала ідэю экспарту сусветнай рэвалюцыі, галоўным прыхільнікам якой быў блізкі паплечнік Леніна Леў Троцкі. Фактычна ў гэтым выпадку гаворка павінна ісці пра разнавіднасць каланіялізму.

Галоўным інструментам такой палітыкі павінна была, безумоўна, стаць Чырвоная армія. Пасля сыходу ў выніку *Версальскай дамовы* нямецкіх войскаў з тэрыторыі Балтыі, Беларусі і Украіны, і асабліва пасля замірэння бальшавікоў з Польшчай, гэтай арміі на працягу прыкладна года ўдалося пазбавіць нацыянальныя ўкраінскі і беларускі ўрады кантролю над сваімі тэрыторыямі. Іх месца занялі марыянеткавыя савецкія ўрады *Украінскай ССР* і *Беларускай ССР*. Ужо ў ліпені 1918 г. бальшавікам удалося падпарадкаваць сабе паўночна-каўказскі рэгіён і абвясціць там аб стварэнні *Паўночна-Каўказскай савецкай рэспублікі*.

Апіраючыся на камуністычную агентуру Закаўказзя, на працягу 1920 – пачатку 1921 г. бальшавіцкім войскам удалося акупаваць Азербайджан, Арменію і Грузію і пасадзіць там падкантрольныя сабе ўрады. Акупацыя і падзел Арменіі адбыліся ў 1920 г. паводле таемнай дамовы бальшавіцкага ўрада з кіраўніком Турцыі Мустафой Кемалем. Дзеля большай цэнтралізацыі і ажыццяўлення поўнага кантролю над мясцовымі камуністычнымі кіраўнікамі рознага этнічнага паходжання 12 сакавіка 1922 г. Азербайджан, Арменія і Грузія былі аб'яднаны Масквою ў *Закаўказскую Савецкую Федэратыўную Сацыялістычную Рэспубліку* (*ЗСФСР*).

У лютым і верасні 1920 г. бальшавікі канчаткова ліквідавалі былыя *Хівінскае ханства* і *Бухарскі эмірат* у Сярэдняй Азіі, часова стварыўшы там быццам бы незалежныя народныя рэспублікі, што былі пазней далучаны да Савецкага Саюза. Кіраўнікі мусульманскіх камуністаў, якія, пачынаючы з 1917 г., ажыццяўлялі прабальшавіцкую ўладу на астатняй тэрыторыі Туркестана, былі паступова заменены на камуністаў-інтэрнацыяналістаў.

Захапіўшы цалкам або часткова суседнія краіны, бальшавіцкія правадыры Савецкай Расіі фізічна знішчылі або вымусілі выехаць за іх межы вялікую колькасць нацыянальных лідараў розных палітычных кірункаў, а таксама вайсковых правадыроў, такіх як Уладзімір Вінічэнка, Сымон Пятлюра, Мікіта Шапавал (Украіна), Вацлаў Ластоўскі, Антон Луцкевіч, Пётра Крачэўскі, Язэп Варонка, Канстанцін Езавітаў (Беларусь), Наман Чэлебіджыхан (Крым), Іраклій Цэрэтэлі, Мікалай-Карло Чхеідзэ, Ной Жарданія (Грузія), Аляксандр Хацісян, Амазасп Аганджанян, Сімон Врацян (Арменія), Насіб-бек Усуббекаў, Халіл-бек Хасмамедаў (Азербайджан), Мадамін-бек, Сеід Алім-хан, Джунаід-хан, Ібрагім-бек, Мустафа Шакай, Абдул Рауф Фітрат (краіны Сярэдняй Азіі), Гаяз Ісхакі (Татарстан), Ахмад Закі Валідзі (Башкартастан) і іншых. Некаторыя з іх, паверыўшы камуністычнай прапагандзе (4 лістапада 1921 г. УЦВК РСФСР прыняў пастанову аб амністыі для часткі ўдзельнікаў антыбальшавіцкай барацьбы), пазней вярталіся на радзіму, каб, у сваю чаргу, ужо ў савецкай краіне стаць ахвярамі бальшавіцкага тэрору.

Пазбавіўшы нацыянальныя эліты магчымасцяў рэальнага ўплыву на палітыку ў сваіх краінах, бальшавікі прыступілі да наступна-

га этапу стварэння «сусветнай рэспублікі саветаў». У 1922 г. на тэрыторыі былой Расійскай імперыі існавала 9 савецкіх рэспублік разам з Далёкаўсходняй, Харэзмінскай і Бухарскай. Але, як адзначае сучасны расійскі гісторык Сяргей Палтарак, рэальнай самастойнасці гэтыя ўтварэнні не мелі, бо іх усе ўзначальвалі прадстаўнікі адной (бальшавіцкай) партыі і ўсе асноўныя пытанні вырашаліся ў Маскве – у палітбюро ЦК і на пленумах ЦК гэтай партыі. Адзінае маскоўскае падпарадкаванне мелі і найважнейшыя дзяржаўныя структуры: Чырвоная армія і органы ВЧК (з 6 лютага 1922 г. – ГПУ, руская абрэвіятура для Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення). На прапанову Леніна, ЦК партыі бальшавікоў 6 кастрычніка 1922 г. ухваліў праект *Федэратыўнай дамовы*, паводле якога ўсім рэспублікам (на той час гэта былі Расійская СФСР, Украінская ССР, Беларуская ССР і Закаўказская СФСР) гарантаваліся роўныя правы ўнутры будучага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) і тэарэтычна давалася права свабоднага выхаду з гэтай, паводле сваёй сутнасці каланіяльнай, падпарадкаванай бальшавіцкай Расіі структуры.

Праект быў фармальна зацверджаны Першым з'ездам Саветаў СССР 30 снежня 1922 г., а ў студзені 1924 г. была прынятая першая *Канстытуцыя СССР*. Адпаведна змянілася і назва бальшавіцкай партыі: замест Расійскай яна пачала называцца Усесаюзнай камуністычнай партыяй (бальшавікоў), скарочана па-руску – ВКП(б). ГПУ было перайменаванае ў ОГПУ і легалізавалася як усёмагутнае саюзнае ведамства.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел тэрыторыі СССР не быў пастаянны. Так, у 1926 г. у склад новай імперыі фармальна ўваходзілі 6 саюзных рэспублік (да першых чатырох дадаліся Туркменская ССР і Узбекская ССР), 3 асобныя рэспублікі ў складзе ЗСФСР, 15 аўтаномных рэспублік, 17 аўтаномных абласцей, 114 акруг, два краі, а ўсяго разам 47 губерняў. Перад канчатковым распадам Савецкага Саюза ў 1989 г. у яго склад уваходзілі 15 саюзных рэспублік, 20 аўтаномных рэспублік, 8 аўтаномных абласцей, 10 аўтаномных (нацыянальных) акруг, 6 краёў, усяго разам 126 абласцей.

У 1920-х гг., згодна з тагачаснымі ўяўленнямі бальшавікоў пра нацыянальную палітыку, былі прынятыя асновы так званай *палітыкі каранізацыі*. Паколькі ў большасці нярускіх рэгіёнаў царскай Расіі

складалася такая сітуацыя, што рускамоўныя ў сваёй большасці гарады былі літаральна абкружаныя сельскімі мясцовасцямі, дзе насельніцтва размаўляла на сваіх нацыянальных мовах, то бальшавіцкія правадыры не бачылі іншай магчымасці заваявання мас, акрамя як падтрымліваць лаяльныя да сябе нацыянальныя кадры ў саюзных рэспубліках і аўтаномных адміністрацыйных утварэннях. Гэтая палітыка пачала згортвацца пры канцы 1920-х – сярэдзіне 1930-х гг., калі Сталін і яго атачэнне вырашылі вярнуцца да расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму ў яго бальшавіцкай версіі.

***11.7. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Савецкай Расіі і залежных ад яе краін у 20-я гады XX ст.*** 21 студзеня 1924 г. у Горках пад Масквой памёр лідар бальшавікоў Уладзімір Ленін. Фактычна ж у выніку цяжкай хваробы ён не ўдзельнічаў у палітычным жыцці краіны ад позняй восені 1922 г. Натуральна, у партыйным кіраўніцтве ў гэты час пачала абвастрацца барацьба за ўладу. На пленуме партыі бальшавікоў 3 красавіка 1922 г. была заснавана хутчэй канцылярская, чым палітычная, пасада – *генеральнага сакратара* (*генсека*) *ЦК* партыі. На гэтую пасаду, згодна з прапановай Леніна, быў выбраны Іосіф Сталін. З іншага боку, у савецкім кіраўніцтве найбольшымі арганізацыйнымі здольнасцямі на той момант вылучаўся Леў Троцкі.

Пачалася зацятая барацьба двух правадыроў, асабістыя стасункі якіх і раней не выглядалі добрымі. Гэта ўстрывожыла нават моцна хворага Леніна, які, паколькі адпаведных кандыдатаў на дыктатара ў партыі не бачыў, пачаў выступаць за калегіяльнае кіраўніцтва. Сталін, майстар апаратных гульняў і інтрыг, прыцягнуўшы на свой бок Каменева ды Зіноўева (якіх ён знішчыць у 1936 г.), перахапіў ініцыятыву падчас пахавання Леніна: у гэты час Троцкі якраз быў па дарозе на курорт у абхазскі Сухумі. Выступіць адкрыта супраць большасці палітбюро Троцкі не мог, бо ў свой час пагадзіўся з рэзалюцыяй X з'езда партыі, якая забараняла любую фракцыйную дзейнасць унутры яе.

У 1926 г. былыя праціўнікі – Троцкі, Каменеў, Зіноўеў – выступілі ў якасці аб'яднанай апазіцыі супраць Сталіна, Бухарына, Рыкава, Томскага, патрабуючы ўсталяваць больш-менш дэмакратычны кан-

Іосіф Сталін, Аляксей Рыкаў, Георгій Зіноўеў, Мікалай Бухарын у 1924 г.



троль над партапаратам. Пасля ўдзелу ў лістападаўскай дэманстрацыі 1927 года пад сваімі ўласнымі лозунгамі Троцкі і Зіноўеў і яшчэ 93 удзельнікі гэтай групоўкі былі выключаны з бальшавіцкай партыі.

Далейшы лёс Троцкага (пазбаўленне ўплывовых пасад у партыі і дзяржаве, выключэнне з партыі, высылка з СССР, нарэшце, яго забойства агентам сталінскіх спецслужбаў) быў прадвызначаны. Што да Каменева, Зіноўева, а таксама былых сталінскіх паплечнікаў Бухарына, Рыкава, Томскага, то бальшавіцкі правадыр знішчыў іх фізічна ў 1936–1938 гг.

Прапаноўваць альтэрнатыўную праграму развіцця савецкай імперыі ў першыя месяцы і гады пасля смерці Леніна таксама не выпадала. Прызначаны на пасаду старшыні Саўнаркама СССР Аляксей Рыкаў ажыццяўляў адносна памяркоўны сцэнар развіцця савецкай эканомікі, выкарыстоўваючы пазітыўныя бакі НЭПу. У 1925 г. валавы збор збожжавых у Савецкім Саюзе перавысіў сярэднегадавы ў Расійскай імперыі напярэдадні Першай сусветнай вайны; з'явілася магчымасць прадаваць за мяжу штогод прыкладна па 180 млн пудоў збожжа. У перыяд з 1922 па 1926 г. штогадовы прырост прамысловай вытворчасці складаў ад 30 да 40 %. Даволі паспяхова была праведзеная радыкальная *фінансавая рэформа*, якая ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам наркама фінансаў Рыгора Сакольнікава (Гірша Брыліянта). Уведзеныя ў абарачэнне савецкія залатыя чырвонцы пэўны час цаніліся на сусветных фінансавых рынках вышэй за брытанскі фунт стэрлінгаў.

Пры канцы 1926 г. на тэрыторыі Украіны паводле амерыканскага праекта пачалося будаўніцтва Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі



Будаўніцтва Новакузнецкага металургічнага камбіната. Канец 1920-х гг.

(Днепрагэс), на тэрыторыі Казахстана і Кыргызстана – пракладка Туркестана-Сібірскай чыгункі (Турксіб). Але самыя галоўныя новабудоўлі другой паловы 1920-х гг. разгортваліся на тэрыторыі РСФСР (завод сельгасмашын у Растове-на-Доне, электразавод у Маскве, Магнітагорскі і Кузнецкі металургічныя камбінаты).

Больш аптымістычнай пасля жахаў грамадзянскай вайны стала атмасфера ў расійскім грамадстве. Нягледзячы на ўсе бальшавіцкія перакосы, на «пільнае вока» ОГПУ, моладзь сялянскай у сваёй аснове дзяржавы ўбачыла жыццёвыя шанцы на атрыманне бясплатнай адукацыі і прафесіі, на паспяховы кар'ерны рост.

Аднак эканамічная сітуацыя не была вельмі добрай. Пры канцы 1920-х гадоў адставанне Расіі ў абсалютных паказчыках ад вядучых краін Захаду ўзрастала. Захоўваўся, з аднаго боку, велізарны лішак працоўнай сілы на вёсцы, а з другога боку – беспрацоўе ў гарадах, якое пастаянна павялічвалася (у 1924 г. складала 1 млн 240 тыс. чалавек). Не была пераадолена праблема нізкай таварнасці сельскагаспадарчай прадукцыі, што прыводзіла да зніжэння экспартнага патэнцыялу Расіі і рэспублік-сатэлітаў. У 1927–1928 гг. у СССР быў адзначаны сур'ёзны крызіс хлебанарыхтовак.

Усё гэта адбывалася на фоне ідэалагічнай барацьбы: бальшавікі-дагматыкі баяліся наступу «нэпманскай буржуазіі», які мог бы пазбавіць іх звыклых прывілеяў. Для партработнікаў ніжэйшага і сярэдняга ўзроўню быў уведзены так званы партмаксімум – фіксаваны аклад. А прывілеі партыйных вярхоў былі куды як больш значныя: партыйная наменклатура знаходзілася на поўным дзяржзабеспячэнні, мела багатыя пайкі, аўтамабілі, дачы. Як вынік, у працягу НЭПу не былі зацікаўленыя ані звычайныя партыйцы, якія надалей жылі паводле законаў «ваеннага камунізму», ані партыйныя бонзы.

***11.8. Змаганне бальшавікоў з рэлігіяй.*** Уклад ва ўнутрыпалітычныя канфлікты ўносіла дзейнасць ОГПУ: яе агенты рыхтавалі палітычныя працэсы, пільна сачылі за настроямі ў грамадстве. Сваім сур'ёзным ідэалагічным праціўнікам бальшавікі, натуральна, лічылі рэлігійныя канфесіі і іх слу́жак. Бальшавікі на чале з Леніным занялі пазіцыю ваяўнічага атэізму. У красавіку 1922 г. пачала сваю дзейнасць сумнавядомая Камісія па аддзяленні царквы ад дзяржавы, якую ўзначальваў чэкіст Яўгеній Тучкоў. Вынікі гэтай працы доўга сябе чакаць не прымусілі, хоць пераслед святароў розных канфесій, разбурэнне святыняў, рабаванне іх маёмасці пачаліся адразу пасля прыходу бальшавікоў да ўлады.

У 1917 г., напрыклад, у адной толькі Маскве існавала 568 дзейных цэркваў. За гады савецкай улады з іх былі разбураныя 426, астатнія пераважна зачынены або спаскуджаны. На пачатку 1920-х гг. бальшавікі арганізавалі шэраг спецаперацый па гвалтоўнай канфіскацыі каштоўнасцяў з праваслаўных цэркваў. Да 1 красавіка 1923 г., паводле афіцыйных звестак, у іх руках апынулася больш за 26 пудоў золата, 24,5 тыс. пудоў срэбра, паўтара пуда брыльянтаў і іншых каштоўных камянёў – на суму, роўную тагачасным 8 трлн рублёў.

У першай палове 1920-х гг. органы ВЧК–ГПУ спрабавалі арганізаваць судовы працэс над патрыярхам Рускай праваслаўнай царквы Ціханам (выбраны на гэты пасад 5 лістапада 1917 г.), а ў выніку змусілі яго пісаць пакаяннае пісьмо.



Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Ціхан (Васілій Бялавін)

У красавіку 1925 г. паводле рашэння Аргбюро ЦК партыі бальшавікоў быў створаны «*саюз ваяўнічых бязбожнікаў*» (канчатковая назва зацверджана ў 1929 г.) – арганізацыя, якая павінна была забяспечваць масавую падтрымку пагромным дзеянням улады ў дачыненні да ўсіх веравызнанняў. Арганізацыя была

распушчана ў 1947 г., пасля таго як у значнай ступені дасягнула заяўленых сталіністамі мэтаў.

Адначасова ОГПУ падтрымлівала стварэнне так званай абнаўленчай праваслаўнай царквы, якая аформілася ў 1922 г. і адразу аб'явіла пра сваю лаяльнасць да бальшавіцкай улады. Пасля смерці патрыярха Ціхана ў 1925 г. ОГПУ не давала магчымасці правесці выбары новага патрыярха, а месцазахавальнік патрыяршага трону мітрапаліт Пётр (Палянскі) быў неўзабаве пасля пачатку выканання сваіх паўнамоцтваў арыштаваны і амаль усе астатнія гады свайго жыцця правёў у турмах і высылках (расстраляны 10 кастрычніка 1937 г. у турме НКВД у Магнітагорску).

Яшчэ да яго смерці, насуперак кананічным правілам, бальшавікі прывялі да ўлады ў праваслаўнай царкве адносна лаяльнага да іх мітрапаліта Сергія (Страгародскага). Падчас Другой сусветнай вайны пад пільным вокам НКВД былі праведзены выбары новага патрыярха Рускай праваслаўнай царквы (ім стаў Сергій); таксама аднавіў сваю працу ў новым складзе Сінод.

Шмат якія праваслаўныя святары і іерархі былі фізічна знішчаныя бальшавіцкімі апрычнікамі. Так, яшчэ ў чэрвені 1918 г. быў схоплены пермскі праваслаўны архіепіскап Андронік (Нікольскі), які супраціўляўся бальшавіцкаму загаду рабавання цэркваў. Чэкісты выразалі ў яго шчокі, выкалалі вочы, абрэзалі вушы і нос і ў такім выглядзе вазілі па горадзе, перш чым расстралялі. Наогул толькі ў сувязі з канфіскацыяй бальшавікамі царкоўных каштоўнасцяў і рэліквій было расстраляна каля 8100 святароў і манахаў.

За першае дваццацігоддзе бальшавіцкай улады закатаваныя і забітыя былі: мітрапаліт Петраградскі і Гдоўскі Веньямін, мітрапаліты Ленінградскія Серафім (Чычагаў) і Іосіф (Петравых), мітрапаліт Казанскі і Свіяжскі Кірыл (Смірноў), мітрапаліты Горкаўскі і Арзамаскі Феафан (Тулякоў) і Яўгені (Зёрнаў), архіепіскап Казанскі і Свіяжскі Венедзікт (Плотнікаў), архіепіскап Самарскі Пётр (Руднеў). Расстрэльвалі і архіпастыраў нерасійскіх епархій – напрыклад, патрыяршага экзарха Украіны, мітрапаліта Кіеўскага Канстанціна (Дзьякава), мітрапаліта Кіеўскага і Галіцкага Уладзіміра (Багаяўленскага), архіепіскапа Мінскага і Беларускага Феафана (Семяняку), архіепіскапа Херсонскага і Мікалаеўскага Пракопія (Цітова), епіскапа

Адэскага Ціхана (Русінава), архіепіскапа Магілёўскага Паўліна (Крошачкіна). Наогул у 1937–1939 гг. быў фізічна вынішчаны амаль увесь даўнейшы епіскапат Рускай праваслаўнай царквы.

Татальны пераслед вернікаў-хрысціян у Расіі прывёў да ўзнікнення так званай катакомбнай царквы, якую ў другой палове 20-х гг. узначалілі вышэйзгаданыя праваслаўныя мітрапаліты Іосіф (Петравых) і Кірыл (Смірноў) і да якой у той ці іншай форме з часам далучыліся прадстаўнікі неправаслаўных адгалінаванняў, пратэстантаў, «іааннітаў», «фёдараўцаў», а пасля Другой сусветнай вайны – і ўкраінскіх грэка-католікаў. Яшчэ раней, на пачатку 20-х гадоў, аформілася *Руская замежная праваслаўная царква*, дзейнасць якой ажыццяўлялі афіцыйна рукапакладзеныя праваслаўныя іерархі, што былі змушаныя выехаць у эміграцыю.

Бязлітасную вайну бальшавікі вялі таксама супраць саміх храмаў – сімвалаў царквы. Так, у 1931 г. у цэнтры Масквы быў узарваны вялікі сабор Хрыста Збаўцы, які быў пабудаваны ў пачатку XIX ст. паводле праекта архітэктара Канстанціна Тона. На яго месцы стваральнікі «новага свету» хацелі ўзвесці велізарны Палац Саветаў, на даху якога збіраліся ўсталяваць 100-метровую статую Уладзіміра Леніна. Гэты план не быў ажыццёўлены ў сувязі з Другой сусветнай вайной, а пры канцы 1980-х – першай палове 1990-х гадоў храм быў наноў пабудаваны пры падтрымцы расійскага прэзідэнта Барыса Ельцына паводле праекта калектыву архітэктараў на чале з Міхаілам Пасохіным.

Зазналі пераслед і велізарныя абмежаванні з боку бальшавікоў і прыхільнікі *ісламу*. Толькі ў адным Татарстане да 1930 г. з 12 тыс. мусульманскіх мячэцяў было зачынена больш за 10 тыс. На ўсёй тэрыторыі СССР да 1937 г. да 97 % мулаў і муэдзінаў былі пазбаўлены магчымасці адпраўляць рэлігійныя абрады. Пасля смерці



Вярхоўны муфцій Рызаэтдзін Фахрэтдзінаў



Рабін
Ёсеф-Іцхок Шнеерсон

ў 1936 г. вярхоўнага муфція савецкіх мусульман Рызаэтдзіна Фахрэтдзінава пад ціскам НКВД новым вярхоўным муфціем прызначылі больш лаяльнага да бальшавікоў Габдрахмана Расулева.

Ужо ў 1920-х гг. *іудаізм* у Савецкай Расіі і на залежных ад яе тэрыторыях падвяргаўся жорсткім нападкам. Былі арыштаваны шмат якія габрэйскія духоўныя лідары, высланы рабін Ленінграда Ёсеф-Іцхок Шнеерсон, асуджаны на 10 гадоў турмы рабін Слуцка Іехезкель Абрамскі, расстраляны рабін Масквы Шмар'яху Медалье. З 1922 г. фактычна была забаронена дзейнасць усіх іудзейскіх навучальных устаноў; да пачатку 1930-х зачынілася мноства ешыботаў і хедараў. Шмат якія святары мусілі эміграваць з Савецкай Расіі. Да снежня 1933 г. бальшавікі закрылі 57 % усіх сінагог, што дзейнічалі раней на тэрыторыі Расіі і суседніх рэспублік.

З канца 1920-х гг. бальшавіцкая ўлада на месцах на загад з цэнтра пачала масава пераследаваць *будыстаў*: зачыняліся храмы (дацаны і хурулы); арыштоўвалі святароў, як у выпадку з 85-гадовым бурацкім ламам Агванам Даржыевым, які памёр у турэмнай бальніцы горада Улан-Удэ ў 1938 г.



Бурацкі лама
Агван Даржыеў

Маёмасць будысцкіх храмаў (жывапіс, скульптуру, кнігі) знішчалі, спальвалі, часткова вывозілі ў музеі. Да канца 30-х гг. будысцкая культура ў Калмыкіі і Бураціі фактычна перастала афіцыйна існаваць.

Масава ліквідоўваліся і *пратэстанцкія абшчыны*. Яшчэ ў 1919 г. у бальшавіцкай турме скончыў жыццё самагубствам суперінтэндант Маскоўскай

лютэранскай кансісторыі Паўль Вілігеродэ. Старшы пастар (пробст) лютэранскіх прыходаў Паволжа Натаніэль Гептнер, пачынаючы з 1922 г., неаднаразова арыштоўваўся, адбываў тэрміны пакарання ў турме і ў высылцы (памёр у вёсцы на рацэ Лене ў 1933 г.). Такі ж лёс чакаў шматлікіх іншых пастараў, якія не эмігравалі ў 1920-х –1930-х гг. Да 1937 г. у СССР не засталося ніводнага лютэранскага пастара (апошнімі былі арыштаваныя Паўль і Бруна Райхерты), а праз два гады былі канчаткова ліквідаваныя ўсе лютэранскія прыходы.

Яшчэ ў сакавіку 1923 г. ОГПУ пачало вобыскі і арышты сярод *баптыстаў і евангельскіх хрысціян* з наступнай ліквідацыяй іх абшчын. Да 1930 г. было арыштавана ўсё кіраўніцтва саюза вернікаў-пяцідзясятнікаў.

Натуральна, што *рыма-каталіцкім* святарам літасці ад савецкай улады таксама чакаць не прыходзілася: ОГПУ лёгка фабрыкавала супраць іх розныя справы – найчасцей за «шпіянаж на карысць панскай Польшчы». У 1919 г. быў пасаджаны ў турму магілёўскі біскуп Эдуард фон дэр Роп, якога, аднак, праз кароткі час абмянялі на арыштаванага ў Польшчы бальшавіка. У сакавіку 1923 г. у Петраградзе былі арыштаваны і асуджаныя 15 каталіцкіх святароў, сярод якіх – біскуп Ян Цепляк і пралат, беларус з паходжання Канстанцін Буткевіч. Апошні быў расстраляны, а Яна Цепляка бальшавікі памілавалі і дазволілі яму выехаць у эміграцыю. Арышты, зняволенні, высылкі рымакаталіцкіх святароў працягваліся і пазней. Тры гады катаргі на Салаўках у 1927 –1930 гг. адбываў беларускамоўны біскуп, адміністратар Мінскай дыяцэзіі Баляслаў Слоскан. Пазней ён быў высланы ў Сібір, а ў 1933 г. пасля настойлівых зваротаў Папы Рымскага яму было дазволена выехаць за мяжу. Пасля шматлікіх аперацый ОГПУ і НКВД па выкрыцці «польскай агентуры» пры канцы 1930-х гг.



Пралат
Канстанцін Буткевіч

дзейнасць рымакаталіцкага касцёла ў СССР была ў значнай ступені паралізаваная.

8 красавіка 1929 г. была прынятая пастанова УЦВК і Саўнаркама РСФСР «Аб рэлігійных аб'яднаннях», якая ўзаконіла велізарныя абмежаванні легальнай дзейнасці ўсіх канфесій Савецкай Расіі. З гэтага часу закрыццё храмаў, мячэцяў, малітоўных дамоў, арышты і забойствы святароў розных веравызнанняў сталі масавай з'явай. Будаўніцтва новых храмаў наогул забаранялася. Названая пастанова дзейнічала фактычна аж да краху камуністычнай улады ў пачатку 1990-х гг.

Усе дзеянні савецкай улады супраць канфесій, духоўных асоб і шчырых вернікаў суправаджаліся агрэсіўнай атэістычнай прапагандай, якая шчодра фінансавалася бальшавіцкім урадам.

***11.9. Знешняя палітыка позняленінскай і ранясталінскай Расіі.*** У Савецкай Расіі існавалі і знешнепалітычныя праблемы. Але яшчэ ў 1921 г. і асабліва на пасляваеннай Генуэзскай канферэнцыі (красавік-травень 1922 г.) бальшавіцкім дыпламатам на чале з наркамам замежных спраў Георгіем Чычэрыным удалося зрабіць істотныя крокі па дыпламатычным прызнанні Савецкай Расіі. Да 1925 г. у той ці іншай форме гэтае прызнанне адбылося з боку Вялікабрытаніі, Італіі, Нарвегіі, Аўстрыі, Грэцыі, Швецыі, Польшчы, краін Балтыі, Мексікі, некаторых дзяржаў Азіі.

Пасля паражэння ў савецка-польскай вайне 25 кастрычніка 1920 г. Чычэрын на пасяджэнні УЦВК у Маскве заявіў, што варта пайсці на вялікія саступкі дзеля заключэння мірнай дамовы з Польшчай, але пры адной умове: Польшча ні ў якай форме не павінна падтрымліваць стварэнне «буферных» незалежных дзяржаў – «ва Украіне, Беларусі і на Кубані». У польскім кіраўніцтве ішлі складаныя дэбаты наконт гэтай прапановы, але ў выніку згаданая раней Рыжская мірная дамова за 18 сакавіка 1921 г. фактычна зафіксавала менавіта такую пазіцыю.

16 красавіка 1922 г. была заключана (па старой памяці) чарговая дамова з Германіяй (цяпер – *Ваймарскай рэспублікай*). У выніку гэтага, сярод іншага, у 1927–1928 гг. на долю Германіі прыпадала ўжо больш за 30 % знешнегандлёвага абароту СССР.

З другой паловы 1920-х гадоў актыўна развівалася расійска-

нямецкае вайсковае супрацоўніцтва. На аснове заключанай у 1926 г. дамовы аб сяброўстве і нейтралітэце паміж Германіяй і Савецкім Саюзам пачаліся цесныя кантакты паміж ваенна-прамысловымі структурамі абедзвюх дзяржаў, а таксама паміж камандзірамі рэйхсверу (германскай арміі) і Чырвонай арміі. На расійскім авіязаводзе ў Філях (пад Масквой) быў размешчаны германскі заказ па вытворчасці баявых самалётаў фірмы «Юнкерс». У вытворчасці танкаў наладжвалася супрацоўніцтва паміж савецкім урадам і нямецкімі фірмамі «Гробтракторэн» і «Райнмэталь». У горадзе Чапаеўску (Куйбышаўская вобласць) з дапамогай Германіі быў пабудаваны хімічны завод «Бэрсоль», які вырабляў штодня прыкладна па 6 тон атрутных рэчываў.

Ліпецкая лётная вучэльня стала сапраўдным цэнтрам падрыхтоўкі для германскай вайсковай авіяцыі. Там удасканальвалі свае баявыя навыкі будучы гітлераўскі маршал авіяцыі Герман Гёрынг, генералы Люфтвафэ часоў Другой сусветнай вайны Карл Барлен, Альфрэд Бонер, Ота Дэслах, Гюнтэр Кортэн, Андрэас Нільзен, Карл Файт, будучыя лётчыкі-асы Альберт Блумензат, Эрнст Гайн, Эдмунд Росінг... У танкавай школе «КаМа» ў Казані пабывалі будучыя генералы гітлераўскага вермахта Гайнц Гудэрыян, Эрых Гёпнер. У Акадэміі Генштаба імя Фрунзэ ў Маскве сярод слухачоў былі будучыя фельдмаршалы рэйха Манфрэд фон Браўхіч, Вільгельм Кайтэль, Эрых фон Манштайн, Вальтэр Модэль ды іншыя.

У сваю чаргу, у Акадэміі германскага Генштаба слухалі лекцыі савецка-расійскія вайсковыя камандзіры: Павел Дыбенка, Аляксандр Ягораў, Аўгуст Корк, Іона Якір, Еранім Убарэвіч, Канстанцін Мерацкоў, Іосіф Уншліхт ды іншыя, а камандарм Тухачэўскі ў верасні 1932 г. быў прыняты прэзідэнтам Германіі, генерал-фельдмаршалам Паўлем фон Гіндэнбургам.

Савецка-расійскіх і германскіх вайскаводаў аб'ядноўвала іх супольная нянавісць да суседняй Польшчы. Так, у 1930 г. на сустрэчы з прадстаўнікамі фірмы «Райнмэталь» камандарм Убарэвіч дазволіў сабе наступнае выказванне: «Ці будзем мы праз два гады так далёка, каб змагчы адрэгуляваць межы і нанесці Польшчы смяротны ўдар? Мы павінны будзем зноў дзяліць Польшчу».

Пры гэтым, аднак, працяг арыентацыі бальшавіцкіх правадыроў



Рускі паэт Мікалай Гумілёў

на прывідную сусветную рэвалюцыю (напрыклад, падштурхоўванне камінтэрнаўскіх дзеячаў да стварэння закалотаў у Балгарыі і той жа Веймарскай рэспубліцы ў 1923 г., у Вялікабрытаніі ў 1927 г.) істотным чынам псаваў клімат двух- і шматбаковых адносінаў СССР з іншымі дзяржавамі. Да таго ж заставалася нявырашанай праблема міжнародных пазык Расіі, сума якіх у той час складала 18,5 млрд залатых рублёў.

У 1929 г. адбыўся ўзброены канфлікт паміж Савецкім Саюзам і гаміньданаўскім Кітаем праз парушэнне апошнім ранейшага пагаднення аб сумеснай эксплуатацыі Кітайска-Усходняй чыгункі.

***11.10. Культура і навука Савецкай Расіі ў 1917–1929 гг.*** Пасля 1917 г., як і раней, Расія дала свету нямала таленавітых навукоўцаў, літаратараў, мастакоў, людзей іншых творчых прафесій. Але менавіта тады ў гэтай краіне была створана палітычная сістэма, якая спарадзіла таталітарызаваную сацыякультурную міфалогію. Сёння паняцці «савецкая культура» і «культура савецкай эпохі» звычайна не атаясамліваюцца.

Рэвалюцыя і кастрычніцкі пераварот 1917 г. нанеслі расійскай культуры вялікія страты. Творчая інтэлігенцыя разглядалася бальшавікамі, якія захапілі ўладу, у якасці аднаго з найбольш небяспечных для свайго адзінаўладдзя праціўнікаў. Органы ВЧК, а потым ГПУ/ОГПУ расправіліся з шэрагам вядомых расійскіх творцаў (напрыклад, у 1921 г. за «пасобніцтва белагвардзейцам» быў расстраляны знакаміты рускі паэт Мікалай Гумілёў; памёр, пазбаўлены магчымасці выехаць на лячэнне за мяжу, Аляксандр Блок); яны ж прымусілі эміграваць на Захад вялікую колькасць творчых асоб.

Так, у 1922 г. на двух нямецкіх параходах з Савецкай Расіі былі высланы за мяжу каля двухсот вядомых дзеячаў інтэлігенцыі, най-

перш гуманітарнай: сярод іншых Мікалай Бярдзяеў, Сяргей Булгакаў, Сямён Франк, Мікалай Лоскі, Леў Карсавін, Піцірым Сарокін ды іншыя. Таксама пакінулі Расію пісьменнікі Іван Бунін (у 1933 г. атрымае Нобелеўскую прэмію), Марына Цвятаева, Уладзімір Хадасевіч, Аляксей Талстой, кампазітары Сяргей Рахманінаў, Сяргей Пракоф'еў, Ігар Стравінскі, балерына Ганна Паўлава, мастак Канстанцін Каровін, оперны спявак Фёдар Шаляпін, спявак шансона Аляксандр Вярцінскі, інжынер, адзін з вынаходнікаў сучаснага тэлебачання Уладзімір Зварыкін, вучоныхімік Уладзімір Іпацьеў, гісторык Сяргей Мельгуноў ды іншыя.




Рускі пісьменнік
Іван Бунін. Парыж, 1928 г.

Пры гэтым частка рускай інтэлігенцыі так ці іначай супрацоўнічала з бальшавікамі (паэты Сяргей Ясенін, Валерый Брусаў, згаданыя паэт Уладзімір Маякоўскі і тэатральны рэжысёр Усевалад Меерхольд, біёлаг Канстанцін Ціміразеў), іншыя спачувалі беламу руху (вышэйзгаданы Гумілёў, а таксама такія літаратары, як вышэйпамянёны Іван Бунін, Міхаіл Булгакаў, Аляксей Купрын, Зінаіда Гіпіус, Дзмітрый Меражкоўскі, лінгвіст Мікалай Трубяцкой).

Паэт Максімільян Валошын, празаікі Уладзімір Караленка і той жа Максім Горкі імкнуліся ратаваць калег ад чырвонага тэрору.

Савецкая ўлада і асабіста наркам асветы Анатоль Луначарскі зрабілі пэўныя пазітыўныя крокі ў набліжэнні здабыткаў расійскай і сусветнай культуры да звычайных людзей: быў нацыяналізаваны шэраг прыватных музеяў, карцінных галерэй, найбуйнейшыя тэатры Расіі. Меліся поспехі і ў пераадоленні суцэльнай непісьменнасці – як адзін з вынікаў прынятага 26 снежня 1919 г. адпаведнага дэкрэта Саўнаркама. Была створана Надзвычайная камісія па пераадоленні непісьменнасці (рускі скарот: лікбез). Толькі за першыя тры гады Савецкай улады курсы лікбезу прайшлі больш за 5 млн чалавек. Разам з тым у сярэдніх школах адмянялася вывучэнне класічных моў, а ўзамен уводзіліся ідэалагізаваныя грамадскія дысцыпліны.

Адукацыя то рабілася цалкам бясплатнай, то ў выніку цяжкай эканамічнай сітуацыі – зноў платнай.

Нягледзячы на прынятыя меры, у 1926 г. 45 % жыхароў РСФСР заставаліся непісьменнымі; вялікая колькасць мела толькі пачатковыя навыкі чытання і пісьма. У 20-я гг. бальшавікі не чынілі істотных перашкод навучанню ў школах не толькі на рускай, але і на іншых мовах, якімі карысталася насельніцтва новай імперыі. Былі зробленыя радыкальныя крокі, каб пашырыць доступ людзей да вышэйшай адукацыі: перыядычна скасоўвалася плата за навучанне; з 1919 г. пачалі функцыянаваць так званыя рабфакі, на якіх цягам трох гадоў вялася падрыхтоўка да паступлення ў ВНУ тых, хто не меў сярэдняй адукацыі. Аднак адмена вучоных ступеняў і званняў (1918) і вельмі слабая матэрыяльная база шмат якіх установаў, што атрымалі назву інстытутаў і ўніверсітэтаў, моцна зніжалі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Дзеля падрыхтоўкі «правільных» марксісцкіх кадраў для ВНУ ў 1921 г. быў заснаваны Інстытут чырвонай прафесуры.

У СССР высокімі тэмпамі разгортвалася сістэма прафесійнай падрыхтоўкі па рабочых спецыяльнасцях на базе ФЗН (устаноў фабрычна-заводскага навучання).

Даволі сур'ёзная як на тыя часы падтрымка аказвалася навуковым даследаванням. Пры наркамаце асветы быў заснаваны навуковы аддзел; навукоўцы, найперш у сферы негуманітарных навук, атрымлівалі харчовыя пайкі і іншую мінімальную матэрыяльную падтрымку. Былі заснаваныя дзясяткі новых навукова-даследчых інстытутаў: да 1927 г. іх агульная колькасць у СССР склала больш за 90. У гэты перыяд былі апублікаваныя значныя працы Івана Паўлава па фізіялогіі, Абрама Ёфэ па ядзернай фізіцы, Уладзіміра Вярнадскага па мінералогіі і геахіміі Зямлі, Мікалая Вавілава па генетыцы, Уладзіміра Сцяклова па матэматычнай фізіцы, Фрыдрыха Цандэра па ракетнай тэхніцы.

Адначасова няўхільна ўзмацняўся бальшавіцкі кантроль за складам думак інтэлігенцыі. У 1921 г. быў заснаваны аддзел агітацыі і прапаганды ЦК бальшавіцкай партыі (*Агітпрап*), а яшчэ годам пазней магутнае ведамства ідэалагічна-палітычнай цэнзуры – *Галоўліт*. У 1923 г. была створана *Галоўная рэпертуарная камісія*, якая павінна

была сачыць за ідэалагічнай выверанасцю тэатральных рэпертуараў. На працу названых ведамстваў выдаткоўваліся велізарныя бюджэтныя сродкі. Ужо тады была ўведзеная забарона на публікацыю твораў шэрагу літаратараў (рускія паэты Ганна Ахматава, Восіп Мандальштам, татарскі паэт Дэрдменд ды іншыя). Пачынаючы са студзеня 1922 г., правядзенне розных з'ездаў, літаратурна-мастацкіх нарадаў, стварэнне творчых суполак дазвалялася толькі з санкцыі ОГПУ.



Руская паэтэса
Ганна Ахматава

Тым не менш у названы перыяд у перыядычных выданнях, у кнігах, што выдаваліся ўзноўленымі прыватнымі і кааператыўнымі выдавецтвамі, яшчэ прысутнічалі элементы свабоды слова. Працягваў сваю дзейнасць створаны яшчэ ў 1916 г. гурток літаратурных крытыкаў-фармалістаў і лінгвістаў пад назвай «Таварыства вывучэння паэтычнай мовы» (руская абрэвіятура: «ОПОЯЗ»: Віктар Шклоўскі, Барыс Эйхенбаўм, Юрый Тынянаў, Раман Якабсон, Яўгеній Паліванаў ды іншыя). У 20-я гг. у Расіі дзейнічала нямала розных літаратурных груповак, самыя вядомыя сярод іх – «Серапіёнавы браты» (Усевалад Іванаў, Канстанцін Федзін, Міхаіл Зошчанка), «Перавал» (Міхаіл Прышвін, Эдуард Багрыцкі), «Леф» (Уладзімір Маякоўскі, Велімір Хлебнікаў, Мікалай Асееў, Восіп Брык), група імажыністаў (Сяргей Ясенін, Анатолій Марыенгоф, Вадзім Шаршаневіч), Расійская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў (РАПП: Дзям'ян Бедны, Міхаіл Шолахаў, Аляксандр Фадзееў). І ўсётакі сапраўдныя літаратурныя шэдэўры гэтага часу збольшага былі напісаныя іншымі творцамі – Міхаілам Булгакавым («Сабачае сэрца», «Дні Турбіных», «Белая гвардыя», «Бег»), Яўгеніем Замяціным («Мы»), Андрэем Платонавым («Чэвенгур»), Барысам Пільняком («Голы год», «Аповесць непагашанага месяца»), Ісакам Бабелем («Конармія»), Арцёмам Вясёлым («Расія, крывёю вымытая»), вершы, паэмы Барыса Пастарнака, тых жа Ахматавай і Мандальштама. Гэтую







Міхаіл Булгакаў Барыс Пастарнак Андрэй Платонаў

групу літаратараў бальшавіцкія ідэолагі ў абсалютнай большасці залічвалі да «спадарожных асоб» («попутчиков») сваёй рэвалюцыі.

Адметнай з'явай гэтай эпохі была творчасць літаратараў нярускіх народаў Расіі: аварскага паэта Махмуда з Кахаб-Расо, асецінскага паэта і празаіка Гіно Баракава, башкірскіх паэтаў Абуза і Тухвата Янабі, бурацкага паэта Салбанэ Туя, комі паэта Віктара Савіна, габрэйскіх творцаў паэта Іцыка Фефера, паэта і драматурга Шмуэла Галкіна, кумыкскага празаіка і драматурга Юсупа Герэева, лезгінскага паэта Сулеймана Стальскага, мардоўскага (макшанскага) паэта Захара Дарафеева, мардоўскага (эрзянскага) паэта Васілія Радаева, татарскага і башкірскага паэта Мажыта Гафуры, татарскага паэта Хадзі Такташа, татарскага паэта і драматурга Мірхайдара Файзуліна, удмурцкай паэткі Ашальчы Акі, чувашскіх паэтаў Мішы Сеспеля і Віктара Рзая, якуцкага паэта і празаіка Анемпадыста Сафронава, якуцкага паэта Аляксея Ексекюляха (Кулакоўскага), башкірскага празаіка Ібрагіма Кыпсака, калмыцкага празаіка і драматурга Німгіра Манджыева, празаіка комі Івана Сажына, марыйскага празаіка Валяр'яна Васільева-Улымарыя, татарскага празаіка Шарыфа Камала, удмурцкага празаіка Кедра-Мітрэя, чачэнскіх празаікаў Саіда Бадуева і Саідбея Арсанава, чувашскага празаіка Івана Юркіна, якуцкага празаіка Мікалая Няўстроева, адыгейскага драматурга Ібрагіма Цэя, асецінскіх драматургаў Елбіздыко Брытаева і Цамака Гадзіева,

башкірскага драматурга Мухаметша Бурангулава, бурацкага драматурга Хаца Намсараева, марыйскага драматурга С. Эчана (Савінава), чувашскага драматурга Георгія Тал-Мрзы ды іншых. Нямала хто з гэтых творцаў пры канцы 1930-х гадоў таксама стане ахвярай сталінскага тэрору.



Татарска-башкірскі паэт Мажыт Гафуры

Тагачасныя расійскія *мастакі* таксама стварылі свае творчыя суполкі – такія як «ВХУТЕМАС» (руская абрэвіятура назвы Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрняў), Таварыства маскоўскіх мастакоў, Таварыства мастакоў-станкавістаў, Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыйнай Расіі, «Майстры аналітычнага мастацтва», Таварыства маладых мастакоў. У гэтых суполках у той ці іншай меры раскрыліся таленты такіх творцаў, як рускія мастакі Канстанцін Медунецкі, Аляксандр Родчанка, руска-габрэйскі мастак Эль Лісіцкі ды іншыя.

У больш традыцыйнай манеры досыць плённа працавалі рускія мастакі Барыс Кустодзіеў, Барыс Іагансон, Канстанцін Юон, Ігар Грабар, Сяргей Герасімаў, Кузьма Пятроў-Водкін, Павел Філонаў. З Татарстанам цесна звязана творчасць мастачкі-партрэтысткі Надзеі Сапожнікавай, з Башкартастанам – Касіма Дэўлеткільдзеева. Увагі заслугоўвае творчасць крымска-татарскага графіка і жывапісца Усеіна Баданінскага.



Праца Сцяпана Эрзя з іспанскага музея Кірогі

Адметным стылем вылучаліся *скульптурныя працы* Івана Шадра, Мацвея Манізера. Шырокую вядомасць, у тым ліку па-за межамі Расіі, набылі працы мардоўскага скульптара Сцяпана Эрзя.

Свой уклад у культуру расійскага Поўдня ўнёс асецінскі разьбяр Сасланбек Ядзіеў.



Актор Васіль Качалаў (Шверубовіч)

У стылістыцы ар-дэко і канструктывізму значныя працы стварылі рускія *архітэктары* Аляксей Шчусеў, браты Аляксандр, Віктар і Леанід Весніны, Іван Леанідаў. Будынкі, узведзеныя Канстанцінам Мельнікавым, Іванам Голасавым, былі блізкія да традыцый заходнееўрапейскага функцыяналізму, а архітэктурныя працы Эль Лісіцкага – метадам галандскай школы «Дэ Стэйл» («Стыль»).

Дастаткова плённа, з выкарыстаннем мастацкага эксперымента, у названы перыяд працавалі Вялікі драматычны тэатр і Дзяржаўны тэатр камічнай оперы ў Петраградзе, тэатр Меерхольда, Камерны тэатр імя Вахтангава ў Маскве. Акрамя Меерхольда публіка высока ацэньвала творчасць такіх рэжысёраў, як Канстанцін Станіслаўскі, Уладзімір Неміровіч-Данчанка, Аляксандр Таіраў, Канстанцін Марджанаў, Валяр'ян Бебутаў. Надзвычай папулярнай была праца актораў Васіля Качалава (беларуса з паходжання), Марыі Ярмолавай, Міхаіла Чэхава (у 1928 г. выехаў у ЗША), Алісы Конен, Вольгі Кніпер-Чэхавай, Ігара Ільінскага, Марыі Бабанавай, Эраста Гарына, Міхаіла Жарава і іншых.



Тэатральны рэжысёр Усевалад Меерхольд

У *кінамастацтве* самай яскравай фігурай стаў вучань нямецкіх кінематаграфістаў экспрэсіяністскага напрамку Сяргей Эйзенштэйн, які ў 1925 г. стварыў свой знакаміты фільм «Браняносец «Пацёмкін».

Таленавітыя кінастужкі «Маці», «Нашчадак Чынгіс-хана» зняў таксама Усевалад Пудоўкін. У рэчышчы кінаавангарду працаваў Дзіга Вертаў.

Музыкант Аляксандр Цфасман у 1926 г. стварыў першы ў Маскве джазавы аркестр «АМА-джаз». Таленавітую аперэту «Жаніхі» напісаў кампазітар Ісак Дунаеўскі. Пастулова пачала набываць усеагульную папулярнасць творчасць эстраднага спевака Леаніда Уцёсава.



Кадр з мастацкага фільма «Браняносец «Пацёмкін» рэжысёра Сяргея Эйзенштэйна

Прыкметнай з'явай гэтай эпохі была творчасць башкірскага і татарскага кампазітара і спевака Газіза Альмухаметава, башкірскага кампазітара Хабібулы Ібрагімава, мардоўскага кампазітара і дырыжора Леаніда Воінава, марыйскага кампазітара Якава Эшпая, татарскіх кампазітараў Саліха Сайдашава, Султан-Ахмеда Габяшава, Васілія Вінаградава.

***11.11. Сталінская мадэрнізацыя і бальшавіцкі тэрор у 1929 і 1930-х гг.*** На XV з'ездзе бальшавіцкай партыі, які адбыўся ў снежні 1927 г., Сталін адчуваў сябе пераможцам. На гэты час у складзе партыйнага кіраўніцтва ўжо не было яго рэальных супернікаў – Троцкага, Каменева і Зіноўева. Пры не да канца высветленых абставінах памерлі старыя партыйцы, шмат у якіх пытаннях непрыхільныя да Сталіна Міхаіл Фрунзэ і Фелікс Дзяржынскі. Цяпер Сталін рыхтаваў новую палітыку – вялікага скачка ў «светлую будучыню». Яго доўгатэрміновымі паплечнікамі ў партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве зрабіліся Вячаслаў Молатаў (Скрабін), Міхаіл Калінін, Клімент Варашылаў (крыху пазней – Лазар Кагановіч, Андрэй Андрэеў), часовымі – Рыкаў, Бухарын, Сярго Арджанікідзэ, Станіслаў Касіёр, Яніс Рудзутак (усе яны не дажывуць да 1939 г.).

З'езд прыняў рашэнне аб фактычным згортванні палітыкі НЭПу і пачатку палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР (за што пазней заплацяць галавою Рыкаў і Бухарын). Натуральна, прымаецца і чарговая рэзалюцыя аб немагчымасці якой-колечы апазіцыі курсу «вернага ленінца» Сталіна і яго паплечнікаў.



Вячаслаў Молатаў
(Скрабін)



Старшыня савецкага
УЦВК Міхаіл Калінін

Трэба зазначыць, што ў 1928 г. у Расіі рэзка скараціліся ўсе віды прыватнага прадпрымальніцтва. Таварны голад абмяжоўваў аб'ём магчымых гандлёвых аперацый. Да таго ж дзяржава ціснула на вытворцаў зверху. З аднаго боку, прыватнікам быў адрэзаны шлях да банкаўскіх крэдытаў (на іх мелі права толькі дзяржпрадпрыемствы), на транспарце яны плацілі дыскрымінацыйна высокія тарыфы, а з іншага – яны мусілі сплачваць самыя высокія стаўкі падаткаў і збораў. Нарыхтоўчы крызіс прывёў да яшчэ большага «закручвання шрубаў» у дачыненні да прадпрымальных сялян – найбольш заможных (кулакоў) і так званых сераднякоў. Анулюваліся дамовы на здачу прыватнікам у арэнду прадпрыемстваў.

Савецкі дзяржаўны, эканамічны, партыйны апарат не перастае павялічвацца. У тым жа 1928 г. ён налічвае ўжо 4 млн чыноўнікаў. Але гэты гіганцкі апарат, кіраваны з цэнтра, не можа справіцца з кіраваннем краінай у нармальных умовах. Сталін бачыць у гэтым нагоду смела заняцца чысткай апарату. Найперш пад каток рэпрэсій трапляюць тыя, хто дазваляе сабе ўсумніцца ў мэтазгоднасці палітыкі паскоранай індустрыялізацыі і суцэльнай калектывізацыі. Пад гэтую марку прымаецца палітычнае рашэнне пра задушэнне ўсіх нацыянальных сіл у рэспубліках Савецкага Саюза і вяртанні да мадэрнізаванай даўняй імперскай ідэалагемы: «адзін цар (гэтым

разам правадыр партыі) – адна вера (гэтым разам бальшавіцкая) – адзін народ (велікарускі, перайменаваны ў савецкі)».

Каб надаць гэтаму працэсу новыя рысы – у першую чаргу ў мэтах прапаганды, – у 1928 г. прымаецца першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі. Народжаны ў нетрах дзвюх бюракратычных устаноў – Усесаюзнага савета народнай гаспадаркі (на чале з Валяр'янам Куйбышавым) і Дзяржплана (яго ўзначальваў Глеб Кржыжаноўскі), што ўвесь час спаборнічалі паміж сабою – гэты план павінен быў стаць своеасаблівым кампрамісам і даць людзям надзею, што планавая гаспадарка вырашыць праблемы з харчаваннем і побытавымі таварамі. Задачы першай пяцігодкі абмяркоўваліся на XVI партканферэнцыі бальшавікоў. Кіраўнік Саўнаркама Рыкаў, падпарадкоўваючыся дысцыпліне, мусіў бараніць праект, сутнасці якога ён не ўхваляў (за што і расплаціўся пасадай у 1930 і жыццём у 1936 г.).

Бальшавіцкае кіраўніцтва вызначае 1929 год як год вялікага пералому. Пад гэтым маецца на ўвазе вынішчэнне рэштак НЭПу; пачатак татальнай індустрыялізацыі – найперш за кошт суцэльнай калектывізацыі, адхіленне ад кіраўніцтва саюзных рэспублік так званых нацыянал-камуністаў. Адначасова пачынаецца рэканструкцыя старых заводаў у Маскве, Ленінградзе, Ніжнім Ноўгарадзе: заводы пашыралі, завозілі на іх імпартнае абсталяванне. Будаўніцтва новых прадпрыемстваў нярэдка вялося паводле праектаў, замоўленых за мяжою, найперш у Германіі і ЗША.

Пяцігадовы план вызначаў у якасці прыярытэтаў цяжкую прамысловасць, металургічную, машынабудаўнічую, хімічную індустрыю, а таксама электраэнергетыку. Самымі вядомымі новабудоўлямі лічыліся *Магнітагорскі і Кузнецкі металургічныя камбінаты.*



Магнітагорскі
металургічны камбінат.
*Здымак 1945 г.*

У той самы час будавалі *Сталінградскі, Чалябінскі трактарныя заводы*, вялізныя прадпрыемствы цяжкага машынабудавання ў Свярдлоўску, аўтамабільныя заводы ў Маскве і Ніжнім Ноўгарадзе. З вялікай цяжкасцю кіраўніцтва рэспублік-сатэлітаў Расіі дамагалася, каб і на іх тэрыторыі паўставалі значныя прамысловыя аб'екты, такія як трактарны завод у Харкаве або завод цяжкога машынабудавання ў Краматорску. Маскоўскае бальшавіцкае кіраўніцтва паслядоўна выконвала ленінскае разуменне цэнтра і перыферыі: апошняя павінна была заставацца ў сваёй аснове расійскім аграрным прыдаткам. Скіраванасць палітыкі індустрыялізацыі паводле сталінскага ўзору была відавочная. Узровень жыцця працоўных цікавіў бальшавікоў у апошнюю чаргу. Галоўным было падрыхтаваць забяспечаную тэхнікай і рэсурсамі Чырвоную армію, каб у зручны момант вярнуцца да палітыкі здзяйснення сусветнай рэвалюцыі. Бюджэтныя выдаткі на гэта ўвесь час павялічваліся: у 1928–1929 гг. яны складалі 880 млн руб., у 1931 – 1288 млн руб., а ў 1934 г. – 5 млрд руб.

За кошт каго і чаго ажыццяўляліся грандыёзныя планы паскоранай індустрыялізацыі Расіі? Найперш, вядома, у выніку абрабавання багацейшай часткі сялянства праз прымусовую і паскораную калектывізацыю – стварэнне кантраляваных партыйнымі органамі *калгасаў* і *саўгасаў*. У межах вырашэння гэтай задачы Прэзідыум УЦВК СССР 4 лютага 1930 г. прыняў сакрэтную інструкцыю, паводле якой пачалося масавае высяленне кулакоў разам з сем'ямі ў аддаленыя раёны Расіі і Казахстана, а таксама фактычна поўная канфіскацыя іх маёмасці. Але вынік гэтых захадаў не даў бальшавікам жаданага плёну: прадукцыйнасць працы ў наваствораных прымусова калектыўных гаспадарках пачала няўхільна падаць. Так, з 1928 па 1933 г. вытворчасць збожжа скарацілася з 73,3 да 69,9 млн т, але куды больш яскравым паказчыкам стала падзенне пагалоўя: буйной рагатай жывёлы (з 70,5 млн да 38,4 млн), коней (з 33,5 да 16,6 млн), свіней (з 26 да 12,1 млн), авечак і коз (з 146,7 да 50,2 млн). Страчаныя збожжа, жывёлу бальшавіцкія камісары спрабавалі кампенсаваць за кошт поўнай экспрапрыяцыі іх у калгаснікаў і членаў саўгасаў. У адказ перад пагрозай голаду апошнія пачалі выкрадаць забраныя ў іх ураджай і маёмасць. Савецкая ўлада неадкладна зрэагавала: 7 жніўня 1932 г. была прынятая пастанова УЦВК і Саўнаркама, згод-

на з якой такія дзеянні караліся расстрэлам і толькі пры наяўнасці змякчальных акалічнасцяў – турэмным зняволеннем тэрмінам не менш як на 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Не менш злавесным быў і прыняты пры канцы 1932 г. закон аб увядзенні ў СССР сістэмы ўнутраных пашпартоў. Гэтыя дакументы абмяжоўвалі свабоду перамяшчэння грамадзян, спрашчалі кантроль за імі. Галоўнае ж: паколькі пашпарты выдавалі толькі гарадскім жыхарам, то калгаснікі пашпартоў не атрымалі і апынуліся прымацаванымі да зямлі. Пачаўся *новы этап расійскага прыгону* – гэтым разам у імя светлай камуністычнай будучыні.

Меры непасрэднай помсты «непаслухмяным» сялянам былі жахлівымі: адбывалася татальная экспрапрыяцыя ўраджаяў у паўднёвай Расіі, суседняй Украіне, а часткова і ў Казахстане ды Беларусі, што прывяло да масавага голаду. Ахвярамі гэтага бальшавіцкага эксперыменту сталі мільёны людзей (паводле некаторых ацэнак, да 10 млн). Жудасных маштабаў голад набыў найперш ва Украіне. Людзі паміралі цэлымі сёламі; жывыя не мелі магчымасці хаваць памерлых. Часта сустракаліся выпадкі людаедства і паядання трупаў, у тым ліку дзіцячых. У гэты самы час на суседніх чыгуначных станцыях пад узброенай аховай знаходзіліся тысячы пудоў збожжа, прызначанага для вывазу, не ў апошнюю чаргу – за мяжу. Непасрэдную адказнасць за гэтае масавае злачынства неслі сакратар ЦК бальшавіцкай партыі Лазар Кагановіч, упаўнаважаны таго самага ЦК Павел Постышаў, а таксама камуністычныя кіраўнікі тагачаснай Украінскай ССР – Станіслаў Касіёр і Улас Чубар. Натуральна, што ўсё гэта рабілася не без ведама бальшавіцкага правадыра Сталіна.

Другой крыніцай паскоранай індустрыялізацыі Расіі пры канцы 1920-х – на пачатку 1930-х гг. была эмісія грошай. За чатыры гады, з пачатку 1929 да пачатку 1933 г. грашовая маса, што знаходзілася ў абарачэнні ў Савецкім Саюзе, павялічылася ў 4 разы. Усё меншы эфект давалі дзеянні ОГПУ па канфіскацыі ў насельніцтва золата і каштоўных камянёў (найбольш актыўныя ў 1928–1929 гг.). Усё гэта непазбежна вяло да падвышэння цэн на асноўныя спажывецкія тавары, якое было асабліва заўважным пачынаючы з 1931 г.

У 1935 г., на васямнаццатым годзе пасля рэвалюцыі, пераважная большасць насельніцтва Расіі і залежных ад яе рэспублік жыла горш,

чым да рэвалюцыі. Паводле афіцыйных савецкіх звестак, у 1935 г. спажыванне найважнейшых сельскагаспадарчых прадуктаў складала ў сярэднім штомесяц: хлеба і крупаў – 21,5 кг, бульбы – 15,9 кг, малака і малочных прадуктаў – 4,07 кг. Цікава параўнаць гэтыя лічбы з лічбамі, якія прыводзіліся Уладзімірам Леніным у адным з ягоных артыкулаў пачатку 1900-х гг. Як падлічыў Ленін, у 1892 г. наёмны парабак у Саратаўскай губерні спажываў у сярэднім у год 419,3 кг збожжавых прадуктаў. Савецкі ж грамадзянін у 1935 г. спажываў у сярэднім 261,6 кг такіх прадуктаў.

Пры канцы 1936 г. «цвёрдыя» савецкія цэны на спажывецкія тавары складалі: на белы хлеб – 1 р. 20 кап., на мяса – ад 5 да 9 руб. Кілаграм бульбы каштаваў 40 кап., кілаграм сала – 18 руб.; за мужчынскія туфлі трэба было плаціць у сярэднім 290 руб., за мужчынскія боты – 315 руб., за жаночыя чаравікі – 280 руб., за мужчынскае паліто – 350 руб., за дзіцячы касцюм – 288 руб., за мужчынскую кашулю – ад 39 да 60 руб.

У гэты самы час сярэдняя налічаная заработная плата рабочага была ў памеры 150–200 руб., пенсія – 25–50 руб. Бясплатны адпачынак складаў 12 дзён. Працоўныя павінны былі ў абавязковым парадку падпісвацца на дзяржаўную пазыку ў памеры двух- або чатырохтыднёвага заробку.

Савецкі знешні гандаль таксама рэзка скарачаўся. Калі ў 1930 г. яго агульны аб'ём складаў 1643 млн руб., то да 1935 г. ён знізіўся да 477 млн руб., а ў 1939 г. ужо не перавышаў 271 млн руб. і складаў крыху больш за 1 % ад усяго аб'ёму сусветнага гандлю.

Нельга не заўважыць, што ў асобных галінах савецкай эканомікі ўсё-такі, нягледзячы ні на што, а дзначаліся пэўныя поспехі. У абсалютных лічбах прамысловая вытворчасць (у асноўным за кошт металургіі, металаапрацоўкі, электраэнергетыкі) у 1937 г. перавысіла ўзровень 1932 г. на 120 %, хоць велізарнае адставанне ад індустрыяльных краін Захаду зменшылася адносна нязначна.

Яшчэ да вайны Савецкі Саюз здолеў у разы павялічыць вытворчасць бавоўны (з 0,7 млн т у 1913 г. да 2,5 млн т у 1939 г.) і забяспечыць сабе незалежнасць ад імпарту гэтай тэхнічнай культуры. За кошт значнага пашырэння адпаведных пасяўных плошчаў таксама ўдалося павялічыць вытворчасць цукровых буракоў і сланечнікавага алею.

Адной з самых галоўных крыніц рэалізацыі гіганцкіх планаў індустрыялізацыі было выкарыстанне *паднявольнай працы*. Першыя канцэнтрацыйныя лагеры з'явіліся ў Савецкай Расіі яшчэ ў 1918 г. і былі створаны з ініцыятывы самога Уладзіміра Леніна. Цяпер жа, у 1930-х гг., сістэме турмаў і канцэнтрацыйных лагераў, якая распачала сваё бурнае развіццё ў гады першай пяцігодкі, была адведзена роля «школы», «асяродку перавыхавання». Праца зняволеных уключаецца ў пяцігадовы план. У 1928 г. крымінальнае заканадаўства пачынае пераглядацца, прыстасоўваецца да пашырэння сістэмы лагераў, якія становяцца неабходнымі ў выніку рэзкага павелічэння колькасці вязняў. У 1930 г. задача аховы грамадства ад «асабліва сацыяльна небяспечных правапарушальнікаў шляхам ізаляцыі, спалучанай з грамадска карыснай працай, і прыстасавання іх да ўмоў працоўнага інтэрната» ўскладаецца на *папраўча-працоўныя лагеры*. Усе лагеры яшчэ ў 1929 г. былі перададзеныя ў падпарадкаванне ОГПУ, якое перад тым доўгія гады распараджалася лагерам-мадэллю – Салаўкамі. 7 красавіка 1930 г. ствараецца адмысловае ўпраўленне лагераў ОГПУ, якое годам пазней атрымоўвае поўную назву «Галоўнае ўпраўленне папраўча-працоўных лагераў ОГПУ» (руская абрэвіятура: ГУЛАГ). Праз некалькі гадоў пасля заснавання сістэма ўжо аб'ядноўвала 53 лагерныя ўпраўленні з тысячамі лагерных аддзяленняў і пунктаў; 425 калоній, а таксама больш за 2000 спецкамендатур, а агулам – больш за 30 000 месцаў зняволення. Штогод, з 1930 па 1956 г. у ГУЛАГу ўтрымлівалася ад 500 тыс. да 1,7 млн зняволеных, сярод якіх палітычныя складалі значную частку (да 54 % ад агульнай колькасці).




Зняволеныя Дзмітраўлага на будаўніцтве канала Масква – рака Волга, 1930-я гг.

Такім чынам, у 1930 г. ОГПУ становіцца найбуйнейшай будаўнічай арганізацыяй краіны. Валодаючы практычна неабмежаванай крыніцай некваліфікаванай рабочай сілы, ОГПУ выкарыстоўвае масавыя арышты інжынераў і тэхнікаў для кіраўніцтва работамі. Узнікае новы, чыста савецкі, інстытут – «шарашкі»: інжынеры, навукоўцы, даследчыкі працуюць па спецыяльнасці, але пры гэтым знаходзяцца ў зняволенні. На найбуйнейшых будоўлях, заводах-гігантах з'яўляліся інжынеры і тэхнікі, якія кіравалі працамі ў суправаджэнні вартавых. Найбуйнейшы аб'ект першай пяцігодкі, *Беламорска-Балтыйскі канал*, фактычна будавалі зняволеныя пад кіраўніцтвам «інжынераў-шкоднікаў».

Своеасаблівым рэсурсам індустрыялізацыі і калектывізацыі быў прапагандысцкі рэсурс, які ў сапраўднасці ўзаконьваў фальсіфікацыю рэальнага стану рэчаў у народнай гаспадарцы. Так, пачынаючы з 1933 г. у СССР новыя нормы нарыхтовак сельгаспрадукцыі вызначаліся для раёнаў і асобных калгасаў не на падставе рэальнага ўраджаю, сабранага на палетках да канца адпаведнага сезона, а на аснове гіпатэтычных выкладак, якім гэты ўраджай павінен быць паводле стану пасеваў яшчэ да пачатку жніва (так званы «біялагічны ўраджай»). Прыпіскі пагалоўя сельскагаспадарчай жывёлы хаваліся за кошт затушоўвання розніцы паміж жывой і прыдатнай для перапрацоўкі вагою жывёлы.

Наступным пасля 1929 г. годам пералому ў бальшавіцкай Расіі стаў 1934-ы. 10 ліпеня гэтага года пастановай ЦВК СССР ОГПУ было рэарганізаванае і ўвайшло ў склад новаўтворанага НКВД (руская абрэвіятура Наркамата ўнутраных спраў) СССР. На чале гэтага ведамства быў пастаўлены малавядомы да гэтага Генрых Ягода. Яму, безумоўна, было што даказваць свайму ўсёмагутнаму шэфу, Сталіну, і неўзабаве такая нагода падвярнулася.

Рэч у тым, што ў студзені-лютым таго самага года ў Маскве адбыўся XVII з'езд бальшавіцкай партыі, на якім упершыню пасля вымушанай эміграцыі Троцкага ў 1929 г. прагучалі (хутчэй, шэптам, у кулуарах) размовы, якія сведчылі пра недавер некаторых уплывовых партыйцаў да палітыкі Сталіна. Больш-менш адкрыта гэта выявілася таксама ў дыскусіі пра другую пяцігодку і тыя нерэальныя лічбы, якія прапаноўваліся сталінскімі паплечнікамі Молатавым

і Куйбышавым. У калідорах з'езда нават узнікла ідэя памяняць Сталіна на пасадзе генсека ВКП(б) на маладзейшага – Сяргея Кірава, які ўзначальваў Ленінградскую партарганізацыю і раней праславіўся «трыумфальным» змяшчэннем (пры дапамозе таго ж Сталіна) з адпаведнай пасады вернага ленінца Зіноўева. Для савецкага правадыра сама думка, што на з'ездзе ягонага «ордэна мечаносцаў» (так Сталін аднойчы назваў бальшавіцкую партыю) могуць яго неяк абмяркоўваць, была непрымальнай. І тым не менш вышэйзгаданы Кіраў абвясціў XVII з'езд «з'ездам пераможцаў» (між іншым, праз паўгода ў германскім Нюрнбергу дакладна такую самую назву дасць чарговаму з'езду нацысцкай партыі Адольф Гітлер). Сапраўдныя ж вынікі бальшавіцкага з'езда былі падведзеныя праз 5–6 гадоў, і яны аказаліся проста ашаламляльнымі, беспрэцэдэнтнымі для ўсёй найноўшай гісторыі: з 1966 дэлегатаў XVII партз'езда з вырашальным і дарадчым голасам за «контррэвалюцыйную дзейнасць» была асуджаная больш як палова – 1108 чалавек, а з 139 членаў і кандыдатаў у члены ЦК партыі, абраных на XVII з'ездзе партыі, 70 % былі арыштаваны і расстраляны ў 1937–1940 гг. як «ворагі народа». Узнікае пытанне: хто ж тады кіраваў Савецкай дзяржавай і хто падбіраў гэтыя кадры на працягу больш як дзесяці гадоў знаходжання Сталіна на пасадзе генсека партыі?

З Сяргеем Кіравым сітуацыя склалася для правадыра яшчэ прасцей: 1 снежня 1934 г. ён быў застрэлены маладым камуністам Леанідам Нікалаевым проста ў Смольным – тагачаснай сядзібе Ленінградскага абкама ВКП(б). Расследаванне, па сутнасці, не паспела пачацца, як у той жа дзень, 1 снежня, быў прыняты закон, што прадугледжваў разгляд палітычных спраў у паскораным парадку і неадкладнае выкананне прысудаў аб найвышэйшай меры пакарання. У наступныя гады будуць знішчаны мільёны расійскіх (і не толькі расійскіх) грамадзян, абвінавачаных у самых розных злачынствах. Адразу ж пасля забойства Кірава да смяротнага пакарання прыгаворваюцца 37 «белагвардзейцаў» у Ленінградзе, пасля яшчэ 33 у Маскве, потым новыя 28 у Кіеве. 8 красавіка 1935 г. асобны закон пашырае ўсе санкцыі Крымінальнага кодэкса, у тым ліку расстрэл, на дзяцей, пачынаючы з 12-гадовага ўзросту. Справы па палітычных абвінавачваннях цяпер пачалі разглядацца ў пазасудовым рэжыме так званымі

тройкамі, у склад якіх уваходзілі партыйныя кіраўнікі рэспублік і абласцей, пракуроры і начальнікі адпаведных упраўленняў НКВД. «Савецкі гуманізм» няўхільна набліжаўся да сваіх вяршыняў.

5 снежня 1936 г. VIII надзвычайны з'езд Саветаў прыняў новую Канстытуцыю СССР, якую нездарма назвалі сталінскай. На паперы працоўным савецкай імперыі даваліся вялікія правы, у рэальнасці малаабароненым заставалася і самае галоўнае права чалавека – права на жыццё. Так, гэтая канстытуцыя не дала шанцаў выжыць нават аднаму з яе галоўных аўтараў – ветэрану бальшавіцкай партыі Мікалаю Бухарыну.

Канстытуцыя 1936 года зафіксавала склад Савецкай дзяржавы: на той момант 11 саюзных рэспублік, сярод якіх РСФСР (*Расійская Федэрацыя*) уяўляла сабою спецыфічнае ўтварэнне. Фармальна яна не мела «сваёй» камуністычнай партыі і нават Акадэміі навук, але адпаведныя структуры Савецкага Саюза працавалі ў першую чаргу ў інтарэсах расійскага цэнтра.

У жніўні 1936 г., калі яшчэ праходзіла «ўсенароднае абмеркаванне» праекта сталінскай канстытуцыі, у Маскве адбываўся сфабрыкаваны працэс па справе «трацкісцка-зіноўеўскага аб'яднанага цэнтра». Зіноўева, Каменева і іншых былых партыйных кіраўнікоў за «шпіянаж, шкодніцтва і тэрарызм» прысудзілі да найвышэйшай меры пакарання і назаўтра расстралялі.

У студзені і чэрвені 1937 г. сталінская машына смерці дабралася да чарговай порцыі даўніх ленінцаў: былі расстраляны Рыгор Сакольнікаў, Георгій Пятакоў, а таксама згаданыя раней высокапастаўленыя камандзіры Чырвонай арміі Тухачэўскі, Убарэвіч, Якір і многія іншыя. Усяго да пачатку савецка-нямецкай вайны загінулі трое з пяці маршалаў, трое з чатырох камандармаў першага рангу, усе 12 камандармаў другога рангу, 60 з 67 камандзіраў карпусоў, 133 са 199 камандзіраў дывізій, 221 з 397 камандзіраў брыгад, усе 10 поўных адміралаў. У сакавіку 1938 г. прыйшла чарга «стаць да сценкі» чарговай групе былых бальшавіцкіх правадыроў – тым жа Бухарыну, Рыкаву, Рудзутаку, а таксама Мікалаю Красцінскаму, Хрысціяну Ракоўскаму.

Калі бальшавіцкія кіраўнікі самі спрычыніліся да стварэння партыйнай інквізіцыі і сталі яе ж ахвярамі, то ахвяры сталінскага

тэрору сярод звычайных грамадзян (а іх у выніку аказаліся мільёны) найчасцей былі вінаватыя ў тым, што трапілі ў расстрэльныя спісы, якія паводле зацверджаных бальшавікамі «кантрольных лічбаў» рыхтавалі органы НКВД на тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюза. Так, у верасні 1937 г. з НКВД у Палітбюро ЦК ВКП(б) паступіў «Спіс асоб, якія падлягаюць суду вайсковай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР». У яго былі ўключаны многія сотні прозвішчаў «ворагаў народа» з тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюза, ад Далёкаўсходняга краю да Беларускай і Украінскай ССР, ад паўночнай аўтаномнай рэспублікі Комі да Крыма. У спісе па БССР прапаноўвалася «асудзіць па першай катэгорыі» (гэта значыць да расстрэлу) 103 чалавекі; сярод іх былі вядомыя беларускія паэты і празаікі Анатоль Вольны (Ажгірэй), Алесь Дудар (Дайлідовіч), Міхась Зарэцкі (Касянкоў), Васіль Каваль (Кавалёў), Тодар Кляшторны, Міхась Кудзелька (Чарот), Юрка Лявонны (Юркевіч), Валеры Маракоў, Залман Півавараў, Янка Нёманскі (Іван Пятровіч), Васіль Сташэўскі, Юлі Таўбін, былы наркам асветы БССР Аляксандр Чарнушэвіч, былы намеснік наркама земляробства Аскар Сапрыцкі, былы адказны сакратар беларускага Саўнаркама Іван Бурдыка, навукоўцы Ананій Дзякаў (былы рэктар Белдзяржуніверсітэта), фізік Яўген Успенскі, вучоны ветэрынар Навум Замалін, географ Сцяпан Маргелаў, педагог Міхаіл Рыдзеўскі (былы загадчык вучэбнай часткі Мінскага педінстытута) і іншыя. На вышэйзгаданым спісе стаіць словы «за» і ўласнаручныя подпісы Сталіна, членаў палітбюро Молатава, Кагановіча, Варашылава і кі-


СПИСОК АРЕСТОВАННЫХ

1. АБАКУМОВ Николай Александрович
2. АВИЛОВ Василий Аристархович
3. АЛЬБЕРТ Федор Сергеевич
4. АЙНГОРН Исер Григорьевич
5. АНИШОВ Андрей Григорьевич
6. АЛЕКСА-АНГАРЕТИС Зигмонт Иванович
7. АНТИПЕНКО Александр Александрович
8. АРУТЮНЯН Рубен Артемьевич
9. АНТОНОВ Константин Владимирович
10. АФАНАСЬЕВ Николай Дмитриевич
11. АСОНСКИЙ Валерий Леонидович
12. БАБЕЛЬ Исак Эммануилович
13. БАБУЛИН Анатолий Николаевич
14. БАБУЛИН Виктор Николаевич
15. БАБУШКИН Марк Абрамович
16. БАДМАИН Радна Дорж
17. БАЗИЛЕВИЧ Алексей Дмитриевич
18. БАК Соломон Аркадьевич
19. БАЛАНИН Иван Григорьевич
20. БАРАНОВСКИЙ Семен Давидович
21. БАЛЫКИН Виген Никитович
22. БАРКОВ Александр Николаевич
23. БАТКИН Виктор Николаевич
24. БАТЦ Александр Фридрихович

Крыніца: http://worldofaphorism.ru/kratkie-biografii/isaak-babel

Адзін з расстрэльных спісаў з прозвішчам вядомага пісьменніка Ісака Бабеля, уласнаручна завізаваны Сталіным


ОГО СЕКРЕТНО
ПОДЛЕЖИТ ВОЗВРАТУ В 48 ЧАС.
ШИФРОВКА

Крыніца: http://baikvesti.ru

Шыфроўка партыйных кіраўнікоў Іркуцкай вобласці з просьбай дазволіць расстраляць звыш даведзенага ліміту 4 тыс. грамадзян.
Унізе можна бачыць візы членаў кіраўніцтва ВКП(б) на чале са Сталіным

раўніка савецкага НКВД Мікалая Яжова, а таксама дата: 7 верасня 1937 г. Выкананне расстрэлу большасці асоб з названага спісу адбылося ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. у Мінску. Такіх спісаў, дзе адным росчыркам пяра прадвызначаўся жахлівы лёс грамадзян «першай сацыялістычнай краіны», было нямала, хоць, вядома, далёка не ўсе такія спісы зацвярджаліся найвышэйшымі маскоўскімі бальшавіцкімі кіраўнікамі: мясцовыя ініцыятывы таксама віталіся.

Арыштоўвалі і ў шэрагу выпадкаў расстрэльвалі таксама членаў «сем'яў ворагаў народа» – жонак і мужоў асуджаных тройкамі. Іх малалетнія дзеці забіраліся і адпраўляліся ў спецыяльныя дзіцячыя інтэрнаты лагернага тыпу.

Дзе ж выконваліся смяротныя прысуды сталінскіх троек? Сёння дакументальна пацверджана існаванне дзясяткаў месцаў масавых расстрэлаў на тэрыторыі Расіі і былых саюзных рэспублік: Бутаўскі палігон паблізу вёскі Дрожжына (Маскоўская вобласць), «Сабачая Пустка» недалёка ад пасёлка Токсава (Ржэўскі раён), Левашоўская пустка на ўскраіне Ленінграда, Залатая Горка ў Чалябінску, урочышча Сандармох у Карэліі, некалькі пасёлкаў уздоўж берага ракі Лакчым у Комі, Курапаты (Брод) пад Мінскам і Шакотаўскі лес пад Гомелем (Беларусь), Быкіўня пад Кіевам (Украіна); большасць лагераў ГУЛАГу, такіх як Акмолінскі лагер недалёка ад Астаны (Казахстан) ды інш.

Якая ж колькасць грамадзян Расіі і залежных ад яе савецкіх рэспублік заплаціла сваімі жыццямі за жаданне Сталіна быць нязменным правадыром у Маскве? Розныя крыніцы падаюць розныя лічбы. Былы камуніст, а пазнейшы член Брытанскай акадэміі, аўтар даследа-

На месцы расстрэлу зняволеных НКВД у Львове, 1941 г.



Крыніца: http://photo-lviv.in.ua

вання «Вялікі тэрор. Сталінскія чысткі 30-х» (1968) Роберт Конквест называе лічбу 20 мільёнаў чалавек за ўвесь перыяд кіравання Сталіна, у якія ўвайшлі не толькі асобы, непасрэдна пакараныя смерцю, але і ахвяры масавага голаду, а таксама звязаных са зняволеннем у сталінскіх лагерах хвароб. Іншы член Брытанскай акадэміі, прафесар эканомікі ўніверсітэта ў Глазга Алек Ноўв на падставе архіўных і дэмаграфічных звестак, сабраных ім у 30-я гады, называе лічбу каля 11 млн чалавек, але гэта датычыць толькі перыяду да пачатку Другой сусветнай вайны. У сучаснай Расіі гісторыкі, найперш блізкія да сённяшняй улады, сцвярджаюць, што такія лічбы моцна перабольшаныя. Натуральна, дакладную лічбу смяротных ахвяр сталінскага тэрору (які ў савецкай і постсавецкай літаратуры сарамліва назвалі рэпрэсіямі) наўрад ці будзе магчыма хоць калі-небудзь дазнацца, бо да нас дайшлі далёка не ўсе дакументы, а выпадкаў, калі забойствы не дакументаваліся, у практыцы дзеянняў НКВД было нямала. Але нават у некаторыя расійскія ўніверсітэцкія падручнікі трапілі такія «звышдакладныя» лічбы: нібыта ў 1930–1953 гг. (да смерці Сталіна) па абвінавачанні ў контррэвалюцыйных злачынствах у СССР былі асуджаныя 3 млн 778 тыс. 234 асобы; з іх 786 тыс. 098 было расстраляна. Вядома, і гэтыя лічбы моцна ўражваюць нас, людзей пачатку XXI стагоддзя, але хіба можна казаць пра іх хоць нейкую мінімальную паўнату, калі па сёння з дзясяткаў тысяч ахвяр тых жа Курапатаў (пахаванні былі адкрытыя і даследаваныя беларускімі археолагамі) ідэнтыфікаваныя толькі некалькі прозвішчаў?

***11.12. Знешняя палітыка Савецкай Расіі ў 1930-х гг.*** У 1928 г. з ініцыятывы Сталіна VI кангрэс Камінтэрна назваў сацыял-дэмакратыю «самым небяспечным ворагам рабочага руху» і запатрабаваў ад камуністычных партый адмовіцца ад усялякага супрацоўніцтва з ёю. Гэта, сярод іншага, паспрыяла прыходу Гітлера да ўлады ў Германіі. Адначасова змянілася знешнепалітычнае становішча Расіі. У 1920-х гг. яе кіраўніцтва бачыла галоўную пагрозу для сябе ў Англіі, Францыі і ўсяляк імкнулася набыць сабе хаўрусніка ў асобе Ваймарскай рэспублікі. Аднак з прыходам да ўлады ў Германіі Гітлера, які не хаваў сваіх экспансіяніісцкіх намераў, расійскае бальшавіцкае кіраўніцтва атрымала канкурэнта ў змаганні за навязванне сваіх поглядаў і парадкаў іншым краінам. Урад Гітлера пачаў ігнараваць умовы Версальскага міру 1919 г., увёў усеагульны вайсковы абавязак, у 1935 г. акупаваў Рэйнскую вобласць, пачаў паскоранае даўзбраенне арміі і флоту. У 1936 г. паміж Германіяй і Японіяй быў заключаны «Антыкамінтэрнаўскі пакт», да якога неўзабаве далучылася Італія на чале з фашысцкім кіраўніком Беніта Мусаліні. Савецкая Расія ў перспектыве магла апынуцца пад пагрозай вайны на два франты, што ніяк не ўваходзіла ў планы Сталіна. У сувязі з гэтым пасля ўступлення СССР у Лігу Нацый (1934) савецкі ўрад падпісаў дамовы аб узаемадапамозе з Францыяй і Чэхаславакіяй; таксама палепшыліся расійска-англійскія адносіны. Аднак Сталін па-ранейшаму імкнуўся пераўтварыць Камінтэрн у звышцэнтралізаваную сусветную партыю, якая павінна была ўзгадняць з ім усе свае дзеянні. Савецкія вайсковыя спецыялісты і цэлыя падраздзяленні прымалі актыўны ўдзел у баявых дзеяннях на баку рэспубліканскага ўрада Іспаніі ў 1936–1939 гг.

З іншага боку, развязаўшы масавы тэрор супраць народаў Расіі і залежных ад яе краін у 1930-х гг., сталінскае кіраўніцтва, відавочна, страціла надзею на здзяйсненне поўнамаштабнай сусветнай рэвалюцыі і вырашыла папросту аднавіць сваё панаванне хоць бы на ўсёй або амаль усёй тэрыторыі былой царскай імперыі. Перашкодай гэтаму былі несавецкія ўрады Польшчы, Фінляндыі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Румыніі.

Такія планы, натуральна, не павялічвалі даверу да савецкіх кіраўнікоў з боку Англіі, Францыі, ЗША, не кажучы пра Польшчу,

краіны Балтыі або Фінляндыю. Дэмакратычныя краіны Захаду, у сваю чаргу, дапусцілі экспансію «антыкамінтэрнаўскага блока» ў Іспаніі, Эфіопіі, Маньчжурыі, захоп Германіяй (аншлюс) Аўстрыйскай рэспублікі. Апафеозам такой палітыкі стала падпісанне 30 верасня 1938 г. *Мюнхенскага пагаднення* паміж Англіяй, Францыяй, Германіяй і Італіяй, згодна з якім фактычна было дадзена зялёнае святло для гітлераўскага падзелу і акупацыі вялікай часткі тэрыторыі Чэхаславакіі. Англійскія і французскія палітыкі хацелі такім чынам абараніць сябе ад удзелу ў вядзенні вайны ў Еўропе і жорстка з гэтым пралічыліся.

На Далёкім Усходзе сітуацыя таксама была дастаткова крытычная: у 1938 і 1939 гг. адбыліся сутыкненні Чырвонай арміі і арміі японскага імператара ў раёне *возера Хасан*, паблізу кітайска-расійскай мяжы, і каля *ракі Халхін-Гол* у Манголіі. Толькі 13 красавіка 1941 г. паміж СССР і Японіяй быў нарэшце падпісаны пакт аб нейтралітэце (разарваны савецкім урадам у красавіку 1945 г.).

У той жа час Германія пачала размаўляць мовай ультыматумаў з Польшчай і Літвой, патрабуючы ад Польшчы так званага «Данцыгскага калідору» (тэрыторыі, якая дазволіла б злучыць нямецкую Усходнюю Прусію з Данцыгам-Гданьскам, што меў у той час статус вольнага горада), а ад Літвы – горад Клайпеду (Мемель) з прылеглай тэрыторыяй.

Тут сталінскі ўрад зноў выступіў з лозунгам стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Ініцыятыва канкрэтных дзеянняў, аднак, зыходзіла з боку Англіі і Францыі. 21 сакавіка 1939 г. амбасадар караля Вялікабрытаніі ў СССР Уільям Сідс уручыў савецкаму наркаму замежных спраў Максіму Літвінаву праект адпаведнай дэкларацыі, якую меліся падпісаць Англія, Францыя, Савецкі Саюз і Польшча. Але сталінскія дыпламаты пачалі абстаўляць падпісанне гэтай дэкларацыі рознымі ўмовамі і ўсяляк адцягвалі падпісанне. 3 траўня Літвінава, які меў рэпутацыю больш праанглійскага, чым прагерманскага дыпламата, адхіляюць ад пасады, якая пераходзіць да найбліжэйшага сталінскага паплечніка Молатава. Англійска-французска-савецкія перамовы па дыпламатычных каналах працягваліся, хоць і без колькі-небудзь заўважнага прагрэсу.

***11.13. Умовы развіцця адукацыі, навукі і культуры Савецкай Расіі ў 30-я гг. XX ст.*** У галіне асветы ў 30-я гады Савецкая Расія і некаторыя з залежных ад яе рэспублік фармальна дасягнулі істотных поспехаў. У гэты час было ўведзена абавязковае пачатковае навучанне, у гарадах абавязковай павінна была стаць школа-сямігодка. Павялічылася колькасць сярэдніх школ. Пры гэтым, аднак, значную долю ў змесце адукацыі займала ўсхваленне асабіста Сталіна і «мудрай палітыкі» яго бальшавіцкай партыі. Пасля чарговых хваляў сталінскага тэрору з падручнікаў выдзіраліся старонкі з прозвішчамі і выявамі асобаў, якія раптам з герояў ператварыліся ў «ворагаў народа». Навучальны працэс на ўсёй тэрыторыі савецкай імперыі ўніфікаваўся і рэгламентаваўся рознымі інструкцыямі.

Працягвалі працаваць школы для малапісьменных, курсы па ліквідацыі непісьменнасці. Паводле афіцыйных звестак у 1940 г. каля 90 % насельніцтва Савецкай Расіі ва ўзросце ад 9 да 50 гадоў ужо ўмелі чытаць і пісаць.

Высокімі былі тэмпы росту колькасці ўстаноў прафесійна-вытворчай адукацыі, ФЗН і тэхнікумаў: агулам у 1930-х гг. ва ўсім СССР іх закончыла каля 2,8 млн чалавек. Працавала 817 універсітэтаў і іншых ВНУ, якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у якіх, аднак, увесь час падала – у сувязі з радыкальным узмацненнем ідэалагізаванасці навучання і асабліва з прычыны арыштаў і забойства многіх навукоўцаў-выкладчыкаў падчас сталінскага тэрору. Тым не менш у інжынерна-тэхнічнай адукацыі былі і пазітыўныя зрухі.

У складаным становішчы апынулася расійска-савецкая навука. У Акадэміі навук СССР і рэспубліканскіх акадэміях стваральіся новыя інстытуты і лабараторыі, на базе якіх узнікалі навуковыя цэнтры. Ва ўмовах абвешчанага курса на індустрыялізацыю ўзрасла роля прыкладных навук. Важныя адкрыцці зрабілі навукоўцы Генрых Графціа, Міхаіл Шатэлен (энергетыка і электратэхніка), Аляксандр Ферсман (геалогія), Іван Бардзін (металургія), Сяргей Вавілаў (оптыка). Над стварэннем мадэляў баявой тэхнікі працавалі авіяканструктары Сяргей Ільюшын, Уладзімір Петлякоў, Арцём Мікаян, Аляксей Тупалеў, Аляксандр Якаўлеў; канструктары: бранятанкавай тэхнікі (Жазэф Коцін, Аляксандр Марозаў), артылерыйскай зброі (Іван Кляймёнаў, Васілій Грабін), стралковай зброі (Георгій Шпагін, Васілій

Дзегцяроў, Уладзімір Фёдараў) і іншыя.

Шмат хто з канструктараў (напрыклад, Сяргей Каралёў, Аляксей Тупалеў, Валянцін Глушко) быў арыштаваны і працаваў у спецыяльных лагерах («шарашках»). Яшчэ горшы лёс – фізічнае знішчэнне – чакаў такіх выбітных навукоўцаў, як фізікі Леў Шубнікаў, Ганс-Густаў Гельман, Барыс Гесэн, Аляксандр Саткевіч, радыётэхнік Валяр'ян Бажэнаў, матэматыкі Уладзімір Ігнатоўскі, Ян Шпільрэйн, мінералог Мікалай Федароўскі, хімік Мікалай Гарбуноў, глебазнаўцы беларус Якаў Афанасьеў і Мікалай Тулайкаў, гідрагеолаг Павел Бутаў, гідратэхнік і гідрадынамік Віктар Глушкоў…



Вучоны-геолаг Аляксандр Ферсман

Гуманітарныя навукі ў Расіі і іншых савецкіх рэспубліках былі практычна разгромленыя. Мноства навукоўцаў пасадзілі за краты (гісторыкі Яўген Тарле, Сяргей Платонаў, Мацвей Любаўскі, першы рэктар Белдзяржуніверсітэта Уладзімір Пічэта; філосаф Аляксей Лосеў, гісторык і мастацтвазнаўца Мікалай Ліхачоў, этнограф Мікалай Конрад, філолаг і культуролаг Дзмітрый Ліхачоў ды інш.). Эканамісты Аляксандр Чаянаў, Мікалай Кандрацьеў, Валяр'ян Асінскі-Абаленскі, філосаф Іван Лупал, этнограф Аляксандр Самайловіч, мовазнаўцы Яўгеній Паліванаў, Мікалай Дурнаво, Рыгор Ільінскі, Рыгор Цэрэтэлі, гісторыкі Уладзімір Беняшэвіч, Васілій Дружынін, Мікалай Лукін і іншыя вядомыя дзеячы навукі загінулі ад рук сталінскіх апрычнікаў.



Лінгвіст Яўгеній Паліванаў

У той самы час падтрымку з боку бальшавіцкіх кіраўнікоў атрымоўвалі вучоныя сумнеўнай якасці, такія як мовазнаўца Мікалай Мар, гісторык Пётр Паспелаў, філосаф Павел Юдзін.

У дачыненні да дзеячаў літаратуры і мастацтва бальшавікі паводзілі сябе яшчэ больш рашуча. Дзеля забеспячэння поўнага кантролю над гэтымі сферамі яны стварылі прафесійныя саюзы *мастакоў* (1931), *архітэктараў, кампазітараў* (абодва – 1932), *пісьменнікаў* (1934; дзеля гэтай мэты Сталін выкарыстаў аўтарытэт Максіма Горкага, які за тры гады перад тым канчаткова вярнуўся ў СССР). У 1932 г. было створана таксама *Усерасійскае тэатральнае таварыства*. Адзіным сапраўдным метадам мастацкай творчасці быў абвешчаны «сацыялістычны рэалізм» (*сацрэалізм*). Героем большасці формаў мастацкай творчасці сацрэалізму меўся стаць «просты савецкі чалавек», галоўная якасць якога – адчуванне ім поўнага шчасця толькі таму, што ён жыве пры бальшавіцкай уладзе на чале з яе вялікім правадыром. Такому літаратурнаму герою прызначаліся рознага кшталту ворагі, і яны, вядома, знаходзіліся – у выглядзе «класава чужых элементаў», «кулакоў і падкулачнікаў», «шкоднікаў», «шпіёнаў». Аўтары твораў павінны былі заўсёды станавіцца «на бок народа» або выказваць быццам бы яго думку. Паступова ў сацрэалістычных творах выпрацоўвалася іерархія вобразаў, на вяршыні якой стаялі бальшавіцкія правадыры Ленін і Сталін. Пасля пышнага святкавання 60-годдзя Сталіна ў 1939 г. ён і стаў першым галоўным героем. Парадныя партрэты жывапісцаў і скульптараў, творы літаратуры, кінематографа адлюстроўвалі вызначаныя самім жа Сталіным ідэалагемы: «Сталін – гэта Ленін сёння», «Правадыр – мудры кіраўнік краіны», «Правадыр – вялікі палкаводзец», «Правадыр – мудры настаўнік», «Правадыр – просты і душэўны, але строгі чалавек».




Плакат сталінскага часу

Высылкамі і расстрэламі караліся адхіленні творцаў ад сацрэалізму ў выглядзе, напрыклад, «аўтарства контррэвалюцыйных твораў», «фармалізму ў мастацтве» або «абароны кулацтва» (рускія паэты Восіп Мандальштам, Мікалай Клюеў, Павел Васільеў; празаікі Ісак Бабель, Барыс Пільняк; жывапісец і музыкант Мікалай Бруні; мастакі Леў Гальперын, Вера Ермалаева, Мікалай Сянкевіч, Міхаіл Каменскі; тэатральны рэжысёр Усевалад Меерхольд; рэлігійны філосаф Павел Фларэнскі). За «буржуазны нацыяналізм» і «шпіянаж на карысць буржуазных дзяржаў» расстрэльваліся і паміралі ў высылках не толькі (у вялікай колькасці) паэты, празаікі, драматургі ў савецкай Украіне, савецкай Беларусі ці ў савецкіх рэспубліках Сярэдняй Азіі, але і, напрыклад, башкірскія (Габдула Амантай, Булат Ішэмгул, Гайнан Хайры, Давут Юлтый), бурацкія (Базар Барадзійн, Дон Цыдэн), дагестанскія (Рабадан Нуроў), інгушскія (Тэмбат Бекаў), калмыцкія (Намто Ачыраў, Санджы Каляеў), крымска-татарскія (Амдзі Гірайбай, Абдула Лятыф-Задэ), мардоўскія (Фёдар Часнакоў), марыйскія (Нікан Ігнацьеў, Алык Іпай, Сяргей Чавайн, Осып Шайдар, Яныш Ялкайн, М. Шкетан), татарскія (Гумер Тулумбай, Шаміль Усманаў, Галімджан Ібрагімаў), чачэнскія (Шамсудзін Айсханаў, Абдзі Дудаеў, Саід Бадуеў, Ахмад Нажаеў), удмурцкія (Кузебай Герд), чувашскія (Аркадзій Арыс, Мікалай Шубасінні, Метры Юман, Несцер Янгас). Расстраляны быў і таленавіты башкірска-татарскі кампазітар ды спявак Газіз Альмухаметаў.

Тым не менш і ва ўмовах татальнага шукання ворагаў, страху, даносніцтва ў 30-я гады ў Расіі культурнае жыццё не замёрла. Менавіта тады з'явіліся (хоць былі апублікаваныя толькі ў рэдкіх выпадках) не толькі найлепшыя творы «расстралянага пакалення», але і такія літаратурныя шэдэўры, як творы раней згаданых пісьменнікаў: раман «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава, аповесці «Катлаван», «Ювенільнае мора», «Джан» Андрэя Платонава, эпапеі «Жыццё Кліма Самгіна» Максіма Горкага і «Ціхі Дон» Міхаіла Шолахава, малая проза Міхаіла Прышвіна, паэма Ганны Ахматавай «Рэквіем», таленавітыя паэтычныя зборнікі Барыса Пастарнака, а таксама паэзія і аповесць «Старая» Даніїла Хармса, лірыка Мікалая Забалоцкага, апавяданні Канстанціна Паўстоўскага.

Самабытнай з'явай 30-х гадоў была паэзія габрэйскіх паэтаў



Міхаіл Шолахаў на балконе свайго дома ў станіцы Вёшанскай (левы бераг Дона)

Пераца Маркіша, Льва (Лейба) Квітко, празаіка і драматурга Давіда Бергельсона. На іншых мовах народаў Расіі значныя творы напісалі: адыгейскі пісьменнік Тэмбот Керашаў, асецінскі паэт і празаік Барон Бацыеў, бурацкі драматург Намжыл Балдано, дагестанскія паэты: аварскі – Гамзат Цадаса, кумыцкі – Аткай Аджаматаў, лакскі і кумыцкі – Эфендзі Капіеў, лезгінскі – Тагір Хур'югскі, табасаранскі – Абумуслім Джафараў; калмыц кія паэты Канстанцін Эрэнджэнаў і Цэрэн Ліджынаў, карачаеўскі драматург і кампазітар Шахарбій Эбзееў, карэльскі паэт і празаік Тобіас Гутары, кумыкскі пісьменнік Аткай Аджаматаў, кумыцкі літаратар, тэатральны рэжысёр, кампазітар і актор Тэмір-Булат Бейбулатаў, татарскія літаратары Муса Джаліль, Даржыя Апакава, Ібрагім Газі, Каві Наджмі, удмурцкі празаік Міхаіл Лямін, удмурцкі драматург Ігнацій Гаўрылаў, чувашскія літаратары Іван Саламбек, Васіль Міта, Мікалай Шэлебі, Якаў Ухсай, чукоцкі празаік Тынэтэгын, эвенкійскі празаік Мікіта Сахараў, якуцкі празаік Мікалай Мардзінаў ды іншыя.

Прыцягвалі да сябе ўвагу працы рускіх мастакоў Пятра Канчалоўскага, Уладзіміра Фаворскага, Арыстарха Лянтулава, Паўла Корына, Аляксандра Дэйнекі, асецінскага мастака Аслан-Гірэя Хохава, татарскага мастака Бакі Урманчэ, бурацкага мастака і паэта Філіпа Балдаева, чукоцкага мастака, гравёра і паэта Міхаіла Вуквола; творы рускіх скульптараў Сяргея Канёнкава, Веры Мухінай, Мікалая Томскага, Аляксандра Мацвеева. Адметнымі былі таксама будынкі, спраектаваныя рускімі архітэктарамі Уладзімірам Шчуко, Аркадзіем Лангманам, Уладзімірам Рудневым, Іванам Фаміным, Уладзімірам Сямёнавым, Барысам Ёфанам, Уладзімірам Гельфрэйхам.

Тэатр у Савецкай Расіі перажываў крызіс. Тым не менш на сцэне гледачы маглі бачыць выбітных актораў – таго ж Васіля Качалава, Івана Масквіна, Алу Тарасаву, Мікалая Баталава. Працягвалі праца-

ваць вядомыя рэжысёры Неміровіч-Данчанка, Таіраў. Папулярнымі зрабіліся марыйскі актор Йыван Кырла, асецінская актрыса Васіліса Камаева ды іншыя. В ядомасцю карыстаўся Габрэйскі дзяржаўны тэатр у Маскве, галоўным рэжысёрам якога быў Саламон Міхоэлс.



Марыйскі актор Йыван Кырла ў кінафільме «Пуцёўка ў жыццё» (рэжысёр Мікалай Эк, 1931)

У галіне класічнай музыкі вылучаліся творы рускіх кампазітараў Сяргея Пракоф'ева (вярнуўся ў Расію ў 1936 г.), Дзмітрыя Шастаковіча, Мікалая Мяс юўскага, Дзмітрыя Кабалеўскага, асецінскага кампазітара Барыса Галаева, башкірскага кампазітара Султана Галяшы, татарскага кампазі тара і спявачкі Сары Садыкавай, чувашскага кампазітара Фёдара Паўлава. Зрэшты, опера Шастаковіча «Кацярына Ізмайлава» і яго ж балет «Светлы ручай» былі выключаны з рэпертуараў савецкіх тэатраў паводле асабістага ўказання Сталіна (за «какафонію ў музыцы»).



Галіна Уланава ў спектаклі «Бахчысарайскі фантан» на музыку Барыса Асаф'ева

Сярод оперных выканаўцаў, якія не эмігравалі з Расіі, вылучаўся сваім адметным голасам рускі спявак Сяргей Лемешаў.

Ва ўсім свеце сталі вядомыя імёны рускіх балерын Галіны Уланавай, Вольгі Лепяшынскай, габрэйска-рускіх танцора балета Асафа Месерэра, піяніста Эміля Гілельса, скрыпача Давіда Ойстраха, рускіх оперных спевакоў Аляксандра Пірагова, Антаніны Няждановай, Максіма Міхайлава, Надзеі Абу-

хавай. Музыку для аперэт, папулярныя песні пісалі Ісак Дунаеўскі, Мацвей Блантэр, Барыс Аляксандраў. Спявак Леанід Уцёсаў стварыў вядомы на той час ленінградскі джаз-аркестр.

У 1930-х гг. з'явіліся таленавітыя мастацкія кінастужкі «Чапаеў» (пастаноўка братоў Васільевых, у галоўнай ролі Барыс Бабачкін), «Вясёлыя дзецюкі» і «Цырк» (рэжысёр Рыгор Аляксандраў, выканаўца галоўных роляў Любоў Арлова), «Трынаццаць» (рэжысёр Міхаіл Ром, выканаўца галоўнай ролі Іван Навасельцаў).

***11.14. Перадумовы і пачатак Другой сусветнай вайны.*** 20 траўня 1939 г. старшыня Саўнаркама і наркам замежных спраў СССР Вячаслаў Молатаў нечакана шмат для каго прыняў германскага пасла ў Маскве графа Фрыдрыха-Вернера фон Шуленбурга. Адна заўвага Молатава ўразіла Шуленбурга: «...абодва ўрады павінны падумаць над тым, як стварыць лепшую палітычную аснову для іх адносінаў». Гэтая ідэя стала актыўна прасоўвацца савецкім часовым паверaным у Берліне Георгіем Астахавым, які пачаў весці актыўныя кансультацыі з уплывовымі палітыкамі рэйха. Усё гэта, натуральна, не ставарала найлепшага фону для англійска-французска-савецкіх перамоў, якія пачалі з розных прычынаў зацягвацца. Разам з тым Гітлер ужо распрацаваў план вайны супраць Польшчы і быў зацікаўлены ў тым, каб не дапусціць у той час вайны на два фронты – супраць Англіі і Францыі на захадзе і супраць СССР на ўсходзе. Падзеі развіваліся імкліва: 3 жніўня гітлераўскі шэф дыпламатыі Ёахім фон Рыбентроп сустрэўся з Астахавым у Берліне, і ў гэты ж самы дзень Молатаў зноў прыняў Шуленбурга ў Маскве. Наступныя два з паловай тыдні, відавочна, распрацоўваўся канчатковы тэкст савецка-германскага пакта, але пры гэтым бальшавіцкі ўрад імітаваў перамовы з англійска-французскай дэлегацыяй, якая ў сярэдзіне месяца прыбыла ў Маскву.

19 жніўня на таемным пасяджэнні палітбюро ЦК бальшавіцкай партыі Сталін абвясціў: «Мы зробім свой выбар, і ён зразумелы. Мы павінны прыняць нямецкую прапанову і ветліва адаслаць назад англійска-французскую місію. Першай перавагай, якую мы атрымаем, будзе знішчэнне Польшчы да самага наваколля Варшавы, уключаючы ўкраінскую Галіччыну». Палітбюро аднадушна падтры-

мала Сталіна, і ўжо назаўтра Гітлер і Сталін абмяняліся тэлеграмамі, у якіх канстатавалі, што падпісанне савецка-германскага пакта ў гэты момант стане «паваротным пунктам для сур'ёзнага паляпшэння палітычных адносінаў» паміж Расіяй і Германіяй.


СЕГОДНЯ В НОМЕРЕ:

Рекорды стахановцев Кузбасса

ИЗБИРАТЕЛЬНАЯ КАМПАНИЯ В НОВЫХ СОВЕТСКИХ РЕСПУБЛИКАХ И ОБЛАСТЯХ

Молатаў прыняты Гітлерам у Берліне. Старонка савецкай газеты, лістапад 1939 г.

23 жніўня 1939 г. у Маскву прыбыў Рыбентроп, і дамова была падпісаная. Сам тэкст дакумента нагадваў тэксты аналагічных «пактаў аб ненападзе», што заключаліся паміж рознымі дзяржавамі свету ў розныя гады. Асаблівасцю гэтай дамовы, аднак, было тое, што да яе далучаўся *сакрэтны пратакол*, дзе чорным па белым было напісана пра «размежаванне сфераў узаемных інтарэсаў» Расіі і Германіі ва Усходняй Еўропе. Гэтае размежаванне ў рэальнасці азначала знішчэнне і падзел Польшчы, аддачу пад савецкае ўладаранне незалежных Латвіі і Эстоніі (Літва павінна была напачатку застацца ў межах «сферы інтарэсаў» рэйха).

У некаторых гістарычных працах цалкам ігнаруецца пытанне, што ж стала падмуркам рэальнага збліжэння нацысцкай Германіі і бальшавіцкай Расіі пры канцы 1930-х гг. На наш погляд, тут адыграла сваю ролю, сярод іншага, сутнасная блізкасць гітлераўскага і сталінскага рэжымаў. Нягледзячы на з'яўленне ў неаднолькавых гістарычных умовах, нацысцкі і камуністычны тыпы таталітарызму мелі падобныя прыкметы:

– у абодвух выпадках было дасягнута поўнае дамінаванне аднойадзінай партыі (камуністычнай партыі ў СССР і нацыянал-сацыялістычнай партыі ў Германіі);
– і там, і там велізарную ролю адыгрывала ідэалогія, якая ўяўляла сабой сістэму ідэй (ідэя расавай переваrі ў Германіі, ідэя барацьбы пралетарыяту з капіталістычным ладам у СССР); ідэалогія

ахоплівала ўсе без вынятку сферы прыватнага і грамадскага жыцця і мелася быць агульнапрызнанай;

- для абодвух гэтых рэжымаў быў характэрны пастаянны пошук ворагаў, як унутраных, так і знешніх: Германія лічыла ворагамі камуністаў, сацыял-дэмакратаў, габрэяў; у СССР у ворагі залічвалі ўсіх, хто не прытрымліваўся класавай тэорыі марксізму-ленінізму;
- і там, і там існавалі разгалінаваная, шчодра фінансаваная дзяржавай сістэма прапаганды, татальны кантроль над СМІ, жорсткая цэнзура любой інфармацыі і ізаляцыя народа ад крыніц аб'ектыўнага інфармавання;
- і ў Германіі, і ў СССР было цалкам забяспечана падпарадкаванне ўсіх дзяржаўных установаў (войска, спецслужбы, суды, органы мясцовага самакіравання) кіраўнічай партыі;
- у абодвух выпадках адбывалася абсалютная ідэалізацыя вобраза правадыра рэжыму;
- важным складнікам таталітарных рэжымаў і Германіі, і СССР стала сістэма рэпрэсіўных органаў, якая склалася з судовых і пазасудовых органаў: ажыццяўляўся нагляд і кантроль над кожным грамадзянінам незалежна ад яго сацыяльнага становішча;
- і ў Германіі, і ў СССР масава ствараліся канцлагеры, у якія адпраўляліся тысячы людзей, у большасці выпадкаў невінаватых.

Такім чынам, становіцца відавочным падабенства асноўных тэндэнцый станаўлення таталітарных рэжымаў у Савецкім Саюзе пры Іосіфе Сталіне і ў Германіі пры Адольфе Гітлеру, прытым што ў дэталях існавалі пэўныя адрозненні паміж імі: напрыклад, савецкі рэжым ажыццяўляў тэрор супраць усіх народаў імперыі, у той час як нацысты асноўны ўдар наносілі па іншых расах і нацыянальнасцях.

***11.15. Саюзніцкія адносіны паміж бальшавіцкай Расіяй і нацысцкай Германіяй на першым этапе вайны.*** Пасля нападу Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. на захадзе і ўвядзення 17 верасня дывізій Чырвонай арміі на тэрыторыю тагачаснай усходняй Польшчы (Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь) савецкая імперыя і нямецкі рэйх падпісалі 28 верасня новую дамову (якая гэтым разам мела назву «аб сяброўстве і межах») і 2 новыя сакрэтныя пратаколы да яе. У першым пратаколе ўдакладнялася раней вызначанае размежаванне

сфер інтарэсаў рэйха і СССР: лёс Літвы перадаваўся цяпер у рукі бальшавікоў, а частка акупаванай тэрыторыі паміж рэкамі Наравам, Віслай, Санам і Заходнім Бугам адыходзіла да гітлераўскай Германіі. У другім сакрэтным пратаколе было зафіксавана, што абодва бакі «не дапусцяць на сваіх тэрыторыях ніякай польскай прапаганды, якая дзейнічае на тэрыторыі другой краіны. Яны ліквідуюць зародкі падобнай агітацыі на сваіх тэрыторыях і будуць інфармаваць адно аднаго пра захады, неабходныя дзеля гэтага».

Савецкія і некаторыя сучасныя расійскія гісторыкі сцвярджаюць, што бальшавіцкія кіраўнікі СССР, аддаўшы загад на ўвядзенне сіл Чырвонай арміі у Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь, «рабілі вымушаны крок» і «бралі пад ахову насельніцтва гэтых тэрыторый і іх маёмасць». Такога кшталту сцвярджэнні цалкам абвяргаюцца даўно ўжо апублікаванымі дакументамі з архіва міністэрства замежных спраў Германіі. У сакрэтнай тэлеграме Рыбентропа свайму паслу ў Маскве за 3 верасня 1939 г. (№ 253) апошняму прапаноўвалася абмеркаваць пытанне з Молатавым наконт таго, «ці палічыць Савецкі Саюз пажаданым, каб руская армія выступіла ў спрыяльны момант супраць тых польскіх вайсковых сіл, якія знаходзяцца ў рускай зоне ўплыву». У сваю чаргу пасол Шуленбург 17 верасня ў тэлеграме (№ 371) інфармаваў свайго шэфа наступным чынам: «Сталін у прысутнасці Молатава і Варашылава прыняў мяне ў 2 гадзіны ночы і заявіў, што Чырвоная армія перасячэ савецкую мяжу а шостай гадзіне раніцы на ўсёй яе працягласці ад Полацка да Камянец-Падольска». Больш даверлівыя адносіны паміж дзвюма дзяржавамі ў напружанай міжнароднай сітуацыі таго часу было б цяжка сабе ўявіць.

22 верасня 1939 г. на знак сумеснай перамогі Чырвонай арміі і гітлераўскага вермахта над зненавіджанай з абодвух бакоў Польшчай у беларускім Брэсце адбыўся *супольны савецка-германскі вайсковы парад*, які прымалі камандзір XIX механізаванага корпуса германскай арміі генерал Гайнц Гудэрыян і камандзір савецкай 29-й асобнай танкавай брыгады Сямён Крывашэін.

Кіраўнік савецкага ўрада Вячаслаў Молатаў падвёў вынікі гэтай вайны наступным чынам: «Кіраўнічыя колы Польшчы нямала фанабэрыліся «трываласцю» сваёй дзяржавы і «магутнасцю» свайго

© Bundesarchiv





Германска-савецкі супольны парад у Брэсце, які прымаюць генерал Г. Гудэрыян і камандарм С. Крывашэін, 22 верасня 1939 г. Злева – генерал Морыц фон Віктарын

войска. Аднак аказалася дастаткова кароткага ўдару па Польшчы з боку спачатку германскай арміі, а потым – Чырвонай Арміі, каб нічога не засталося ад гэтага звыродлівага стварэння Версальскай дамовы». Такім чынам, савецкае кіраўніцтва пацвердзіла свой чынны ўдзел у развязванні Другой сусветнай вайны.

Акт помсты Сталіна палякам за паражэнне ў савецка-польскай вайне 1920 г., аднак, меў свой жахлівы працяг. Калі Чырвоная армія ўвайшла на тэрыторыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, камандаванне польскай арміі дало загад сваім войскам на гэтай тэрыторыі трымацца палажэнняў Дамовы аб ненападзе паміж СССР і Польшчай за 25 ліпеня 1932 г. і не аказваць узброенага супраціву савецкім часткам. Далёка не ўсюды гэты загад выконваўся, але ў выніку вялікая колькасць вайскоўцаў – сярод якіх больш за 20 тысяч складалі толькі што прызваныя ў польскае войска (найперш з тэрыторый Украіны і Беларусі) афіцэры-рэзервісты з ліку настаўнікаў, медыкаў, інжынераў, цывільных службоўцаў – была інтэрнаваная органамі НКВД. Інтэрнаваных размясцілі ў некалькіх лагерах на тэрыторыі Расіі і Украіны. Па першым часе яны мелі адносна нармальныя ўмовы: ім дазвалялася насіць вайсковыя знакі адрознення, нават мець пры сабе халодную зброю; рацыён іх харчавання як на савецкія ўмовы быў не самы горшы. Аднак 5 сакавіка 1940 г. кіраўнік

НКВД Лаўрэнцій Берыя даслаў Сталіну дакладную нататку за №794/5, у якой абвінавацію інтэрнаваных вайскоўцаў у «антысавецкіх настроях» і вядзенні «антысавецкай агітацыі» і прапанаваў «справы аб знаходжанні ў лагерах для ваеннапалонных 14 700 чалавек, былых польскіх афіцэраў, чыноўнікаў, памешчыкаў, разведчыкаў, жандараў, асаднікаў і наглядчыкаў турмаў... разгледзець у асобым парадку, з прымяненнем да іх найвышэйшай меры пакарання – расстрэлу». У гэтай жа нататцы ў дадатак прапаноўвалася расстраляць 11 000 «былых памешчыкаў, фабрыкантаў, афіцэраў», якія знаходзіліся ў турмах Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. На згаданым дакуменце стаяць візы членаў бальшавіцкага палітбюро – Сталіна, Варашылава, Молатава, Анастаса Мікаяна з прыпіскай: «т. Калінін – за; т. Кагановіч – за». Інтэрнаваных асоб, якія знаходзіліся ў лагерах у Казельску (Смаленская вобласць), Асташкаве (Калінінская вобласць) і Старабельску (Варашылаўградская вобласць Украіны), на працягу трох тыдняў, да 10 красавіка 1940 г., дастаўлялі ў лес паблізу вёскі *Катынь*, недалёка ад Смаленска, а таксама ў Калінінскае і Харкаўскае ўпраўленні НКВД і забівалі стрэламі са стралковай зброі ў патыліцы. Ахвярамі гэтай «аперацыі» (разам з асобамі, забітымі ў Кіеве, Мінску, Херсоне) сталі 21 857 чалавек, сярод якіх значную частку складалі беларусы, украінцы, габрэі.



28 Sept 39

Deutsch-sowjetischer Grenz- und Freundschaftsvertrag.

Die Deutsche Reichsregierung und die Regierung der UdSSR betrachten es nach dem Auseinanderfallen des bisherigen polnischen Staates ausschliesslich als ihre Aufgabe, in diesen Gebieten die Ruhe und Ordnung wiederherzustellen und den dort lebenden Völkerschaften ein ihrer völkischen Eigenart entsprechendes friedliches Dasein zu sichern. Zu diesem Zwecke haben sie sich über folgendes geeinigt:

Artikel I

Die Deutsche Reichsregierung und die Regierung der UdSSR legen als Grenze der beiderseitigen Reichsinteressen im Gebiete des bisherigen polnischen Staates die Linie fest, die in der anliegenden Karte eingezeichnet ist und in einem ergänzenden Protokoll näher beschrieben werden soll.

Artikel II

Beide Teile erkennen die in Artikel I festgelegte Grenze der beiderseitigen Reichsinteressen als endgültig an und werden jegliche Einmischung dritter Mächte in diese Regelung ablehnen.

Artikel III

Сакрэтны пратакол да германска-савецкай дамовы за 28 верасня 1939 г.

Наступнай мэтай экспансіянізму сталінскай Расіі стала Фінляндыя, якая, як мы ведаем, здолела адстаяць сваю незалежнасць падчас расійскай грамадзянскай вайны. 14 кастрычніка 1920 г. паміж

Расіяй і Фінляндыяй быў заключаны пакт аб ненападзе, які ў 1934 г. быў пралангаваны на наступныя 10 гадоў.

Тым не менш, згодна з дадатковым пратаколам да сталінска-гітлераўскай дамовы за 23 жніўня 1939 г., Фінляндыя павінна была пагадзіцца на «тэрытарыяльна-палітычнае пераўладкаванне», і права на такое «пераўладкаванне» аддавалася маскоўскім бальшавікам. Адпаведныя дзеянні сталінскага ўрада і Чырвонай арміі не прымусілі сябе доўга чакаць. Савецкая Расія напала на Фінляндыю 30 лістапада 1939 г. без абвяшчэння вайны. У якасці падставы для нападу савецкая прапаганда вылучыла тэзіс, нібыта «праходжанне савецка-фінскай мяжы за 32 км ад Ленінграда несла пагрозу Савецкай дзяржаве і Ленінграду». Прапагандысты, аднак, забываліся дадаваць, што ўсё насельніцтва Фінляндыі на той час было меншым за насельніцтва таго ж Ленінграда з прыгарадамі.

Перад гэтым толькі ў верасні-кастрычніку дзеяч Камінтэрна, этнічны фін Ота Куўсінен пабываў у кабінеце Сталіна не менш за 20 разоў. Першыя дні савецка-фінскай вайны выявілі прычыну гэтых выклікаў. 1 снежня ў памежным гарадку Тэрыёкі раптоўна аб'явіў пра сваё існаванне «рабоча-сялянскі ўрад Дэмакратычнай Рэспублікі Фінляндыі» на чале з тым самым Куўсіненам.

Рушыўшы ў бой, савецкія дывізіі адразу ж наткнуліся на зацяты супраціў. Высветлілася, што Чырвоная армія была абсалютна не падрыхтаваная да вайны ў зімовых умовах. Перакінутыя з Украіны дывізіі не мелі зімовага абмундзіравання, пачаліся масавыя выпадкі абмаражэння. У савецкіх дывізій не хапала патрэбнай аўтаматычнай зброі. Савецкія транспартныя сродкі таксама не былі прыстасаваныя да баявых дзеянняў ва ўмовах суровай зімы. Чырвонаармейцы не ўмелі весці агонь на бягу, на лыжах. Раптоўна з'яўляючыся ў нечаканых месцах, фінскія снайперы наносілі савецкім войскам адчувальныя страты. Няўменне чырвонаармейцаў хадзіць на лыжах спрабавалі кампенсаваць мабілізацыяй у дзейную армію прафесійных лыжнікаў-спартсменаў, і шмат хто ў выніку бясслаўна загінуў.

Спробы адкінуць фінскую армію лабавым ударам па ўмацаваннях працяглай, але ўжо не надта сучаснай на той момант «лініі Манергейма» сканчваліся велізарнымі стратамі. Галоўныя камандзіры Чырвонай арміі дэманстравалі сваю некампетэнтнасць. Сталіну

давялося выклікаць з Далёкага Усходу генерала Рыгора Штэрна і замяніць камандуючага Ленінградскім фронтам генерала Мерацкова на маршала Сямёна Цімашэнку. Каб узняць дух савецкіх войскаў, на фронт былі адпраўлены добраахвотнікі – камсамольцы Ленінграда і Масквы. Шмат хто з іх прайшоў толькі кароткатэрміновую, якая доўжылася ўсяго некалькі тыдняў, вайсковую падрыхтоўку. Кінутыя ў бой добраахвотнікі неслі велізарныя страты.

У цэнтральных гарадах Расіі, Маскве і Ленінградзе, неўзабаве пачаў адчувацца недахоп харчавання. Незвычайна суровыя маразы ўзімку 1939–1940 гг. прывялі да транспартных перабояў. Вайна супраць маленькай Фінляндыі нечакана аказалася для савецкага кіраўніцтва зусім не пераможнай. Толькі ў пачатку лютага 1940 г., сканцэнтраваўшы на фронце 27 дывізій (якім супрацьстаялі толькі дзевяць фінскіх), тысячы гармат і танкаў, Чырвоная армія пад камандаваннем Цімашэнкі здолела прарваць «лінію Манергейма». Савецкія танкі выйшлі на аператыўную прастору, і Фінляндыі, якая сутыкнулася з перспектывай атрымання ў сябе ўрада Куўсінена, нічога не заставалася, як звярнуцца да СССР з просьбай аб замірэнні. 12 сакавіка 1940 г. была заключана мірная дамова, згодна з якой фактычна ўвесь Карэльскі перашыек і значная частка тэрыторый на поўнач ад яго, усё Ладажскае возера, шэраг астравоў у Фінскім заліве, часткі астравоў Рыбачы і Сярэдні аддаваліся Саветам. Таксама сталінскі ўрад атрымоўваў у арэнду тэрмінам на 30 гадоў паўвостраў Ханка. Разам з тым бальшавіцкі «ўрад» Фінляндыі давялося распусціць. Вернаму сталінцу Куўсінену ва ўзнагароду была дадзена Масквой пасада старшыні Вярхоўнага Савета новаўтворанай *Карэла-Фінскай ССР* (праіснавала да 1956 г. і была анексавана Расіяй).

Згодна з цяперашнімі ацэнкамі гісторыкаў, Савецкі Саюз страціў падчас зімовай вайны каля 100 тыс. чалавек забітымі супраць прыкладна 20 тыс. з боку фінскай арміі і мірнага насельніцтва. Але не толькі цяжкімі фізічнымі стратамі вымяраўся вынік фінскай вайны для сталінскай Расіі. У снежні 1939 г. Ліга Нацый фармальна асудзіла СССР за агрэсію і выключыла яго са складу Лігі. Да гэтага часу толькі тры дзяржавы былі асуджаныя Лігай Нацый як агрэсары: мілітарысцкая Японія, фашысцкая Італія і нацысцкая Германія. Цяпер да гэтага спісу дадаўся бальшавіцкі Савецкі Саюз.

Гэта ўсё, аднак, толькі развязала рукі сталінскаму кіраўніцтву Расіі, якое ў якасці наступных мішэняў сваёй агрэсіўнай палітыкі выбрала краіны Балтыі і румынскую Бесарабію. Адразу пасля сумеснага выступу СССР і Германіі супраць Польшчы на пачатку Другой сусветнай вайны Савецкі Саюз ва ўльтыматыўнай форме запатрабаваў ад урадаў Латвіі, Эстоніі і Літвы падпісання каланіяльных пагадненняў пра стварэнне на іх тэрыторыях савецкіх вайсковых баз. Такія пагадненні былі ў выніку падпісаны ўжо ў кастрычніку 1939 г., бо ўрады балтыйскіх краін апынуліся сам-насам супраць двух магутных на той час агрэсараў. Да савецкіх вайскоўцаў там неўзабаве далучыліся супрацоўнікі НКВД і вайсковай разведкі. Каб крыху пацешыць самалюбства літоўскіх кіраўнікоў, Вільня і Віленскі край былі перададзены Сталіным Літве. У снежні 1939 г. Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь былі фармальна далучаны да адпаведных савецкіх рэспублік.

Улетку 1940 г. у Латвіі, Літве і Эстоніі практычна адначасова былі здзейсненыя дзяржаўныя перавароты і ўсталяваныя бальшавіцкія рэжымы. У жніўні таго самага года былі створаныя Эстонская, Латвійская і Літоўская ССР у складзе Савецкага Саюза. Пры гэтым частка тэрыторый Эстоніі і Латвіі была далучана да Савецкай Расіі.

Нямецкі дыпламат Паўль Шміт, робячы нататкі пра сустрэчу Гітлера і Молатава 12 лістапада 1940 г. у Берліне, адзначыў, што «фюрэр выказаў сваё задавальненне» той акалічнасцю, што «дзякуючы абмену Літвы на Люблінскае ваяводства былі знятыя ўсе магчымыя непаразуменні паміж Расіяй і Германіяй» (маецца на ўвазе зафіксаваны вышэйзгаданым сакрэтным пратаколам да савецка-нямецкай дамовы за 28 верасня 1939 г. перападзел сфер інтарэсаў паміж Сталіным і Гітлерам).

28 чэрвеня 1940 г. войскі Чырвонай арміі пад камандай генерала арміі Георгія Жукава без абвяшчэння вайны Румыніі пераправіліся цераз Днестр і неўзабаве захапілі тэрыторыі Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Гэтыя тэрыторыі былі неўзабаве ўключаны ў склад Малдаўскай аўтаномнай (якая пасля гэтага стала саюзнай) рэспублікі і савецкай Украіны.

Гітлераўскія войскі ў Заходняй Еўропе дзейнічалі практычна сінхронна са сталінскімі ва Усходняй. У красавіку таго самага года вер-

махт акупаваў Данію, у траўні – Нідэрланды, Люксембург і Бельгію, у чэрвені капітулявалі Нарвегія і Францыя. Улетку 1940 г. Германія пачала сапраўдную паветраную вайну супраць Вялікабрытаніі, у якой, аднак, перамогі не атрымала. Гэта памяняла планы Гітлера: замест таго каб пачаць поўнамаштабную вайну супраць Лондана, ён прыняў рашэнне ў першую чаргу рыхтавацца да ваенных дзеянняў супраць Масквы. Увесну 1941 г. наступнымі ахвярамі гітлераўскіх нашэсцяў сталі Грэцыя і Югаславія. Сталін жа ў гэты час разбіраўся на новадалучаных савецкіх тэрыторыях з мясцовым насельніцтвам: дзясяткі тысяч палякаў, беларусаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў, эстонцаў былі дэпартаваны ў глыб тэрыторыі савецкай імперыі – найбольш на Поўнач Расіі, у Сібір і ў Казахстан.

Такім чынам, па лажэнні сакрэтных пратаколаў сталінска-гітлераўскіх пактаў 1939 года былі выкананы і нават перавыкананы.

З іншага боку, бальшавіцкі ўрад СССР у 1940–1941 гг. самым старанным чынам забяспечваў гітлераўскую Германію стратэгічнай сыравінай, нафтай і харчаваннем – фактычна дапамагаючы ёй у падрыхтоўцы вайны... супраць самога сябе.

Савецка-германскія эканамічныя адносіны вызначаліся гандлёвымі крэдытнымі дамовамі за 19 жніўня 1939 г. і 10 лютага 1940 г. Рэйху для вядзення вайны патрабаваліся стратэгічныя матэрыялы: яе эканоміка ў пачатку Другой сусветнай вайны знаходзілася ў вялікай залежнасці ад імпарту. Асабліва вострай была залежнасць па волаве – 90 %, па каўчуку – больш за 85 %, па тэкстыльнай сыравіне – блізу 70 %, па баксітах – 99 %. Германія мела таксама значную патрэбу ва ўвозе некаторых прадуктаў харчавання.

На працягу 17 месяцаў пасля падпісання савецка-германскага пакта і да нападу Германіі на СССР Германія атрымала ад Савецкага Саюза 865 тыс. тон нафты, 1462 тыс. тон збожжа, 101 тыс. тон бавоўны-сырцу, 11 тыс. тон ільну, больш за 1 млн тон лесаматэрыялаў, 15 тыс. тон азбесту, 14 тыс. тон медзі, 3 тыс. тон нікелю, 140 тыс. тон марганцавай руды, 26 тыс. тон хромавай руды, 184 тыс. тон фасфату, 2736 кг пла́ціны.

Пастаўкі выконваліся савецкім бокам з выключнай дакладнасцю і пунктуальнасцю. Апошні эшалон з сыравінай перасек савецкую мяжу ў бок Нямеччыны за некалькі гадзін да пачатку германскага

нападу ўначы 22 чэрвеня 1941 г. У той самы час тэхніка (у тым ліку ваенная), якую павінен быў пастаўляць у СССР нямецкі бок, паступала нерэгулярна, са спазненнем.

***11.16. Савецкі Саюз пасля нападу нацысцкай Германіі.*** Нягледзячы на тое што з дня нападу нямецкіх войскаў на рэспублікі Савецкага Саюза прайшло шмат дзясяткаў гадоў, па сёння сярод гісторыкаў няма адзінай думкі ў такіх, напрыклад, пытаннях: ці быў гэта напад сапраўды нечаканым для расійскага кіраўніцтва і ці не планаваў Сталін сам першым ударыць па войсках вермахта тады ж, улетку 1941 года?

Прывядзем напачатку дакументальна пацверджаныя факты. 26 чэрвеня 1940 г. быў прыняты ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, паводле якога прымаліся жорсткія меры па ўмацаванні дысцыпліны на працоўных месцах: уводзілася ўсеагульная васьмігадзінная працягласць працоўнага дня, сямідзённая працоўная нядзеля, пад страхам сур'ёзнага пакарання забараняўся самавольны сыход людзей з працы. У каментарах афіцыйных савецкіх СМІ савецкія людзі заклікаліся «ўсямерна ўмацоўваць абаронную магутнасць краіны». Паводле прынятага яшчэ 1 верасня 1939 г. закону аб усеагульным вайсковым абавязку праводзілася імклівае павелічэнне асабовага складу Чырвонай арміі. У студзені 1941 г. ён налічваў 4 млн 200 тыс. вайскоўцаў, а ўжо да 1 чэрвеня таго самага года гэтая лічба складала 5 мільёнаў. Толькі за адзін 1940 год былі сфарміраваны 42 новыя вайсковыя вучэльні. За перыяд са студзеня 1939 г. да 22 чэрвеня 1941 г. Чырвоная армія атрымала ад прамысловасці 17 745 баявых самалётаў, больш за 7 тыс. танкаў, 29 637 палявых артылерыйскіх установак, 52 407 мінамётаў. У складзе Ваенна-марскога флоту СССР на дзень пачатку вайны з Германіяй знаходзіліся тры лінкоры, сем крэйсераў, 59 лідараў і эсмінцаў, 218 падлодак, 269 тарпедных катараў, 2581 самалёт; берагавая абарона мела на ўзбраенні больш за тысячу гармат.

У студзені 1941 г. войскам асобых (патэнцыйных прыфрантавых) вайсковых акруг было загадана перайсці ў стан павышанай гатоўнасці да баявых дзеянняў. Тэрмінова на захад падцягвалі стратэгічныя рэзервы Чырвонай арміі з Урала, Забайкалля, рэспублік

Сярэдняй Азіі. З глыбіні Савецкага Саюза перадыслакаваліся 28 дывізій, 9 упраўленняў вайсковых карпусоў, чатыры ўпраўленні армій. Паводле сведчання савецкага маршала Андрэя Грэчкі, ужо праз 11 дзён пасля зацвярджэння Гітлерам 18 снежня 1940 г. плана вядзення вайны супраць СССР (так званы «*План Барбаросы*») гэты факт і асноўныя пункты рашэння германскага камандавання сталі вядомыя савецкай выведцы.

5 траўня 1941 г. было абвешчана аб прызначэнні Сталіна старшынёй Саўнаркама СССР – гэта сведчыла пра ўсведамленне маскоўскім кіраўніцтвам патэнцыйнай магчымасці пачатку вайны ў найбліжэйшы час. Савецкія разведчыкі і дыпламаты не раз перадавалі Сталіну звесткі пра тое, што плануецца напад Германіі на Савецкі Саюз і называлі канкрэтныя даты такога нападу, у тым ліку і дату 22 чэрвеня 1941 г.

Цяпер што да магчымасці нанясення Чырвонай арміяй прэвентыўнага ўдару па вермахце. Яшчэ раней, у снежні 1940 г. у Маскве была праведзена вялікая дзевяцідзённая нарада ўсяго найвышэйшага камандавання Чырвонай арміі, падчас якой вялікая ўвага аддавалася планаванню менавіта наступальнай аперацыі на патэнцыйных франтах будучай вайны. Сёе-тое ў гэтым пытанні прасвятляе таксама гэтак званы «план Жукава», прадстаўлены тагачасным начальнікам Генштаба Чырвонай арміі найвышэйшаму кіраўніцтву СССР 17 траўня 1941 г. Згодна з далучанай да дакладу картай савецкія войскі павінны былі нанесці папераджальныя ўдары па сілах вермахта з раёна Львова і Перамышля ў напрамку Кракава і далей на захад да Катавіцаў, Аполе, чэшскага Оламаўца і на поўнач, праз Лодзь, Ловіч, да самай мяжы Усходняй Прусіі, у той час як з раёна Брэста планаваўся ўдар на захад у напрамку Астралэнкі і Варшавы.

Канчатковая рэакцыя Сталіна на гэты план па сёння застаецца нам невядомай, і менавіта з гэтай прычыны існуюць розныя версіі гісторыкаў.

Так ці іначай, на досвітку 22 чэрвеня 1941 г. сілы вермахта пры падтрымцы іх хаўруснікаў адначасова атакавалі тэрыторыі Беларусі, Украіны, Малдовы, Расіі. У гэты дзень Сталін прамаўчаў, а да народаў СССР праз радыё звярнуўся наркам замежных спраў Молатаў. У сваёй прамове ён абвінаваціў гітлераўскую Германію, што яна «напала на

Савецкі Саюз без аб'яўлення вайны і не прад'явіўшы ніякіх прэтэнзій да яго». У сапраўднасці гэта не зусім так. А 4-й гадзіне ўранку 22 чэрвеня ў Берліне германскі рэйхсміністр замежных спраў Ёахім Рыбентроп сустрэўся з савецкім амбасадарам Уладзімірам Дэканозавым і ўручыў апошняму мемарандум, у якім патлумачыў, што «Германскі рэйх вырашыў прыняць контрмеры ў сувязі з недружалюбнымі паводзінамі Савецкага Саюза ў дачыненні да яе», якія праявіліся, сярод іншага, у заключэнні 5 красавіка 1941 г. скіраванага супраць Германіі пакта з Югаславіяй і ў «небывалай канцэнтрацыі расійскіх войскаў на германскай усходняй мяжы».

Паводле сучасных расійскіх гісторыкаў, суадносіны сіл паміж Германіяй і яе саюзнікамі, з аднаго боку, і Савецкім Саюзам, з другога, 22 чэрвеня 1941 г. выглядалі наступным чынам:

| *Колькасны склад жывой сілы і ўзбраенняў* | *Вермахт і саюзнікі, Венгрыя, Румынія і Фінляндыя (у т. л. на Усходнім фронце)* | *Чырвоная армія (у т. л. у дзейнай арміі)* |
|---|---|---|
| Жывая сіла, чалавек | 4 306 800 | 3 289 851 |
| Танкі | 6 700 (4 300) | 22 600 (14 200) |
| Самалёты | 13 700 (5 900) | 20 000 (9 200) |
| Гарматы і мінамёты (без мінамётаў 50-мм калібру) | 90 300 (47 200) | 76 500 (32 900) |

Як відаць, перавага сіл вермахта разам з саюзнікамі была ў жывой сіле, а па колькасці танкаў і самалётаў Чырвоная армія была значна наперадзе. Аднак у заходніх прымежных акругах на той момант было дыслакавана 170 дывізій і 2 брыгады, што складала 54 % колькасці ўсёй Чырвонай арміі (блізу 2,9 млн чалавек).

Самай вялікай праблемай савецкіх узброеных сіл у першыя месяцы вайны была дэзарганізацыя функцыянавання камандавання, вельмі кепскі стан сувязі. У выніку, напрыклад, ужо ў першы дзень вайны было знішчана 1200 баявых савецкіх самалётаў, пры гэтым большасці з іх нават не ўдалося падняцца ў паветра. Няўдалы загад галоўнакамандуючага савецкімі войскамі маршала Сямёна Цімашэнкі – перайсці ў наступ адразу на трох франтах – прывёў да таго, што

велізарная колькасць чырвонаармейцаў тут жа апынулася ў меншых і большых «катлах», падрыхтаваных камандзірамі войскаў праціўніка. Толькі на чацвёрты дзень вайны Стаўка Галоўнага Камандавання зразумела нерэальнасць спробаў арганізаваць контрнаступ. Да гэтага часу нямецкія войскі прасунуліся на розных напрамках ад 130 да 250 км у глыб тэрыторыі Савецкага Саюза. Перадавыя танкавыя сілы вермахта рассякалі савецкую абарону і імкліва рухаліся наперад, ахопліваючы сваімі клінамі значныя сілы Чырвонай арміі. 28 чэрвеня, праз тыдзень пасля пачатку вайны, была занятая сталіца Беларусі –Мінск. У рукі ворага патрапіла 319 тыс. палонных і вялікая колькасць ўзбраення. У стане маральнага паралічу знаходзіліся не толькі бальшавіцкі правадыр Сталін, але і камандуючы Заходняга фронту, генерал арміі Дзмітрый Паўлаў, які ў пачатку ліпеня быў выкліканы ў Маскву і расстраляны паводле прысуду вайсковага трыбунала. Такі ж лёс чакаў яго начальніка штаба генерала Уладзіміра Клімаўскіх. Сталін жа не толькі застаўся жывым-здаровым, але і прызначыў сябе старшынёй настворанага Дзяржаўнага Камітэта Абароны ды замяніў на пасадзе галоўнакамандуючага маршала Цімашэнку.

Нягледзячы на лакальныя поспехі Чырвонай арміі (напрыклад, пры абароне Магілёва), праз месяц пасля пачатку баявых дзеянняў яна страціла каля мільёна вайскоўцаў, у тым ліку каля 725 тысяч трапіла ў нямецкі палон і памірала там ад голаду, холаду і эсэсаўскіх здзекаў. Да восені 1941 г. у руках Германіі і яе хаўруснікаў апынуліся Эстонія, Латвія, Літва, Беларусь, Малдова, большая частка Украіны і Крыма, значныя абшары расійскай тэрыторыі.

8 верасня войскам групы «Поўнач» вермахта пад камандай фельдмаршала Вільгельма фон Лейба ўдалося дайсці да прыгарадаў Ленінграда і замкнуць блакаду вакол яго (з поўначы горад блакавалі саюзныя вермахту войскі Фінляндыі). 22 верасня Гітлер прыняў рашэнне «цалкам зруйнаваць Пецярбург» – пачаліся лютыя бамбаванні горада. Але самым цяжкім выпрабаваннем для жыхароў Ленінграда стаў голад. Пачалася масавая гібель насельніцтва: ужо ў снежні памерлі 53 тыс. чалавек, у наступныя месяцы памірала па 95–100 тыс.

У сярэдзіне верасня на левым беразе Дняпра сілы вермахта (група «Поўдзень» пад камандай фельдмаршала Герда фон Рундштэта) акружылі вялікую групоўку Паўднёва-Заходняга фронту Чырвонай

арміі, якім камандаваў генерал-палкоўнік Міхаіл Кірпанос. Гэта адбылося перш за ўсё таму, што Сталін ні ў якім разе не пагаджаўся на адступленне сваёй арміі з Кіева. Камандуючы фронтам скончыў жыццё самагубствам (паводле іншай версіі, загінуў ад асколка міны), а 19 верасня Кіеў усё адно быў пакінуты савецкімі войскамі.

На гэты момант (канец верасня) незваротныя страты жывой сілы Чырвонай арміі (забітыя, памерлыя ад ран і няшчасных здарэнняў) склалі ўнушальную лічбу – каля 2 млн 130 тыс. чалавек. Страты ў баявой тэхніцы склалі: 14 006 танкаў, 6988 самалётаў і 66 888 гармат і мінамётаў. Ваенна-марскі флот СССР страціў адзін крэйсер, 18 лідараў і эсмінцаў, 23 падводныя лодкі, 18 вартавых караблёў, 13 кананерскіх лодак, 37 загараджальных суднаў і тральшчыкаў. Усё гэта адбылося з Чырвонай арміяй і флотам на працягу толькі трох месяцаў і дзевяці дзён вайны, нягледзячы на масавы гераізм і самаахвярнасць соцень тысяч салдат і афіцэраў.

Трэба адзначыць, што вялікая доля страт Чырвонай арміі ў баявой тэхніцы не была вынікам непасрэднага знішчэння яе ворагам. Нямала было выпадкаў, калі, напрыклад, танкі проста псаваліся і траплялі ў рукі праціўніка або падчас руху патаналі ў балотах і вадаёмах.

30 верасня 1941 г. гітлераўскія войскі з раёна Смаленска (які яны захапілі яшчэ ў ліпені) пачалі наступ на Маскву. Група армій «Цэнтр» пад камандай фельдмаршала Федара фон Бока мела ў сваім распараджэнні 1,8 млн салдат і афіцэраў, 1700 танкаў і 1390 самалётаў. Ёй на гэтым напрамку супрацьстаяла групоўка Чырвонай арміі (тры франты пад камандай генералаў Івана Конева, Андрэя Яроменкі і маршала Сямёна Будзённага) у складзе 1,25 млн вайскоўцаў, 900 танкаў і 667 самалётаў. 7 кастрычніка, падышоўшы да Вязьмы, войскі вермахта абкружылі вялікую колькасць войскаў Чырвонай арміі: толькі пад Вязьмай і Бранскам у палон трапіла больш за 600 тыс. чырвонаармейцаў. Масква апынулася пад непасрэднай пагрозай акупацыі, большая частка ўрада і партыйна-савецкіх устаноў эвакуявалася на Волгу, у горад Куйбышаў (Самару). У выніку далейшых баявых дзеянняў гітлераўскім войскам удалося ў некаторых месцах падысці на адлегласць да 30 км ад расійскай сталіцы. Іх далейшаму наступу перашкаджалі прыродныя ўмовы – вялікія сумёты і маразы, бо жаўнеры вермахта не мелі адпаведнага абмундзіравання. Савец-

каму камандаванню ўдалося перакінуць з усходу краіны сібірскія дывізіі, улічыць досвед зімовай вайны супраць Фінляндыі.

5 і 6 снежня 1941 г. Чырвоная армія здолела перайсці ў контрнаступ (камандуючых франтоў Яроменку і Будзённага да гэтага часу замянілі генерал арміі Жукаў і маршал Цімашэнка). Да пачатку 1942 г. сілы вермахта былі адкінутыя на 100–150 км ад Масквы. Пазней былі вызваленыя расійскія гарады Тула, Разань, Арол, Растоў-на-Доне. Вялікая заслуга ў гэтых перамогах байцоў-сібіракоў: іх традыцыйныя навыкі ў абыходжанні са стралковай зброяй і ўменне лёгка прыстасоўвацца да суровай зімы вельмі прыдаліся Чырвонай арміі. Аднак сілы савецкіх войскаў увесну 1942 г. былі ў значнай ступені вычарпаныя, і вайсковыя камандзіры прапаноўвалі Сталіну стабілізаваць фронт, даць сабе перадышку, на што правадыр не пагадзіўся. У выніку гітлераўскія войскі нанеслі Чырвонай арміі некалькі сур'ёзных паражэнняў: так, у бітвах пад Ржэвам і Вязьмай загінула больш за 272 тыс. савецкіх салдат і афіцэраў, у раёне Варонежа і ракі Дон – больш за 370 тыс. Страты баявой тэхнікі падчас гэтых баталій: каля 3,4 тыс. танкаў, больш за 1300 самалётаў і больш за 21 тыс. гармат і мінамётаў.

Агулам за першы год вайны Чырвоная армія страціла большую колькасць асноўнай баявой тэхнікі, чым мела яе паводле стану на 22 чэрвеня 1941 г. Савецкім кіраўнікам з ужываннем законаў ваеннага часу ўдалося ў значнай ступені ўзнавіць вытворчасць ваеннай тэхнікі і амуніцыі, у асноўным на ўсходзе Расіі.

*Аб'ёмы вытворчасці асноўных відаў баявой тэхнікі і ўзбраення за гады вайны ў Савецкім Саюзе (адзінак)*

| *Від тэхнікі* | *Колькасць* |
|---|---|
| Танкі і самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі (САУ) | 98 300 |
| Баявыя самалёты | 122 100 |
| Гарматы і мінамёты | 525 200 |
| Стралковая зброя | 19 830 000 |
| Ваенныя караблі розных тыпаў | 70 |

Велізарныя ахвяры, панесеныя народамі савецкай імперыі падчас вайны, не маглі не адбіцца на настроях людзей. Унутраная сітуацыя ў «братнім» Савецкім Саюзе была таксама зусім не про-

стай. Ледзьве пачалася вайна, як «сацыялістычныя нацыянальныя адносіны» павінны былі вытрымаць сур'ёзныя выпрабаванні. Першыя расколіны з'явіліся ў нядаўна далучаных абласцях дзяржавы – у заходніх частках Беларусі і Украіны і ў Балтыі. Палітыка «чыстак» і дэпартацый карэнных жыхароў, першыя мерапрыемствы, праведзеныя савецкай уладай у 1939–1940 гг., пасеялі немалы страх і нянавісць да бальшавікоў сярод мясцовага насельніцтва. Нярэдка немцаў і іх хаўруснікаў там сустракалі як вызваліцеляў. Агулам каля 1 млн 200 тыс. савецкіх грамадзян удзельнічалі ў вайне на баку Германіі і яе сатэлітаў.

Але і ва ўнутраных раёнах справа ішла далёка не найлепшым чынам. І зноў у гэтым была вінавата савецкая дзяржава і яе рэпрэсіўная палітыка. Так, у жніўні 1941 года была ліквідаваная *аўтаномная рэспубліка немцаў Паволжа*, карэннае насельніцтва якой, немцы, пасялілася тут на два стагоддзі раней. Іх абвінавацілі ў супрацоўніцтве з гітлераўскай Германіяй, хоць у сапраўднасці яны былі ці ледзь не самай лаяльнай часткай насельніцтва Расіі. Савецкія немцы былі дэпартаваны на ўсход і крайнюю поўнач краіны. Такім чынам, першыя ўдары, якія падрывалі міжнацыянальныя адносіны, былі нанесеныя не акупантам-ворагам, а самой савецкай дзяржавай – дакладней, яе пільнымі органамі НКВД.

Пры канцы 1943 і ў пачатку 1944 г. па абвінавачанні ў супрацоўніцтве з ворагам з тэрыторый спрадвечнага пражывання былі выселены народы Каўказа: *чачэнцы*, *інгушы*, *балкарцы*, *карачаеўцы*, пазней *калмыкі* і *крымскія татары*. Заадно выдалілі і іншых «нярускіх» з Чарнаморскага ўзбярэжжа: *грэкаў*, *балгараў*, *крымчакоў* (напэўна, іх суседства было непрыемным для жыхароў тамтэйшых урадавых дачаў). Такі самы лёс напаткаў *курдаў*, *туркаў-месхецінцаў*. На поўначы Расіі цалкам выселілі *фінаў-інгерманландцаў*. Ва ўсіх выпадках ліквідавалася аўтаномія народаў – там, дзе яна існавала. Дэпартацыя закранула больш за мільён чалавек. Звычайна людзей грузілі ў вагоны для скаціны і адпраўлялі ў Сібір, на Урал і ў Сярэднюю Азію. Асноўная мэта дэпартацыі палягала ў тым, каб пасяліць у раёнах, дзе адчувалася напружанне, а таксама ўздоўж савецкіх межаў рускае насельніцтва. Гарады і вёскі Паўночнага Каўказа, Стаўрапальшчыны і Крыма былі заселены рускімі і ўкраінцамі.

Падчас вайны насельніцтва сталінскага ГУЛАГу сур'ёзна папоўнілася за кошт асоб, дэпартаваных з Прыбалтыкі, Заходняй Украіны і Беларусі, Малдовы, палякаў, немцаў, каўказцаў і крымскіх татараў, «паражэнчых элементаў», «акружэнцаў» і іншых «старых» і «новых» грамадзян СССР. Пазней з'явіліся асобы, «якія супрацоўнічалі з ворагам» – бургамістры, старасты, паліцаі, «члены нацыяналістычных арганізацый», уласаўцы, нямецкія і японскія ваенныя злачынцы. У дачыненні да апошніх катэгорый ужываўся ўказ 1943 г. аб смяротнай кары цераз павешанне або аб высылцы на катаргу.

Іх пасылалі на 17-ю шахту ў Варкуце, пазней – у Нарыльск і ў казахскі Джэзказган. Там фактычна існавалі лагеры знішчэння. Жыццё зняволеных было настолькі жудасным, што ў Нарыльску, напрыклад, былі выпадкі, калі зняволеныя аддавалі перавагу смерці пад коламі вагонаў… Паводле падлікаў даследчыкаў, толькі ў 1939 –1941 гг. у савецкіх лагерах памерлі 1,8 млн зняволеных. Трэба разумець, што віна гэтых людзей далёка не заўсёды была належным чынам даказана: нярэдка гэта былі ахвяры звычайных даносаў.

Вязні тарылі дарогі ў тундры на Крайняй Поўначы. Яны ўзвялі сталіцу калымскага краю горад Магадан. Яны пабудавалі таксама аэрадромы і пасадачныя пляцоўкі, у тым ліку падземныя, у Сароку, Анезе, Северадзвінску, Каргопалі, а таксама на Паўночным Урале і на Пячоры. Нявольніцкую працу выкарыстоўвалі на ваенных заводах, дзеля разбудовы партоў на Паўночным моры, пры пракладцы дарог на Урале, у Сібіры і Закаўказзі. Вязні паміралі тысячамі ад недаядання, катаржнай працы, нечалавечага абыходжання з імі з боку аховы і адміністрацыі лагераў, ад прадуманай энкавэдысцкай сістэмы прыніжэння чалавечай годнасці і знішчэння асобы. Памяншэнне колькасці зняволеных загадзя планавалася ў лагерах. Тыя, хто працаваў на цяжкіх работах, звычайна не жылі больш за тры гады. На месца памерлых прысылалі новых вязняў, і так гэтая машына круцілася бясконца.

Вельмі цяжкі быў лёс і абсалютнай большасці савецкіх ваеннапалонных, што траплялі ў нямецкія лагеры. Паводле звестак расійскіх даследчыкаў, іх агульная колькасць за ўсю вайну склала 4 млн 559 тыс. чалавек, нямецкія крыніцы падаюць іншую лічбу – 5 млн 160 тыс.



Калона савецкіх ваеннапалонных. 1941 г.

Даведзеныя да адчаю савецкія ваеннапалонныя стварылі падмурак новай з'явы – *Рускай вызваленчай арміі* (руская абрэвія тура: РОА). Каля яе вытокаў стаяў былы генерал Чырвонай арміі, камандзір 20-й арміі Андрэй Уласаў, які вызначыўся ў баях супраць гітлераўскіх войскаў пад Масквою і займеў рэпутацыю аднаго з улюбёных камандзіраў Сталіна. Перакінуты на Волхаўскі фронт пад Ленінград, Уласаў стаў намеснікам камандуючага фронту і камандзірам 2-й ударнай арміі, якая ў траўні-чэрвені 1942 г. апынулася ў акружэнні. Сам генерал Уласаў трапіў у нямецкі палон. Пачаўшы супрацоўнічаць з акупантамі, ён на пачатку 1943 г. стаў на чале нанова сфарміраванай РОА. Пачаткі гэтай арміі можна весці ад Рускай нацыянальнай народнай арміі (РННА), якая бы ла сфарміраваная ў верасні 1942 г. у раёне беларускага пасёлка Асінторф (цяпер – Дубровенскі раён Віцебскай вобласці), на чале з былым чырвонаармейскім палкоўнікам Уладзімірам Баерскім.

Афіцэры і салдаты РОА ўдзельнічалі ў шэрагу баёў на баку вермахта на Усходнім фронце, прытым іх рэпутацыя, асабліва ў былых заходніх савецкіх рэспубліках і пазней у Польшчы, у цэлым не была добрай. Прычынай гэтага быў іх актыўны ўдзел у рэпрэсіях супраць мірнага насельніцтва, што не хацела падпарадкоўвацца Гітлеру.

З часам РОА стала стрыжнем агульных узброеных сіл так званага «Камітэта вызвалення народаў Расіі» (руская абрэвіятура: КОНР), колькасны склад якіх у красавіку 1945 г. налічваў каля 130 тыс. чалавек. У гэты час сам Уласаў ды іншыя камандзіры вышэйзгаданых фарміраванняў ужо схіляліся на бок заходніх удзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. Сталіца Чэхаславакіі Прага была фактычна вы-

Парад уласаўскай арміі
пад расійскім трыкалорам.
22 чэрвеня 1943 г., Пскоў




звалена ад нямецкіх акупантаў 7 траўня 1945 г. сіламі 1-й пяхотнай дывізіі КОНР пад камандай генерал-маёра Сяргея Бунячэнкі.

Пры канцы вайны генерал Уласаў трапіў у савецкі палон, быў асуджаны за «здраду Радзіме» і пакараны смерцю 1 жніўня 1946 г.

***11.17. Фарміраванне антыгітлераўскай кааліцыі і карэнны пералом у баявых дзеяннях на савецка-нямецкім фронце.*** Ужо ў першыя дні вайны прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль, даўні праціўнік Сталіна і бальшавізму, выказаў публічную падтрымку Чырвонай арміі ў змаганні з вермахтам, «нягледзячы на розніцу палітычных сістэм Брытаніі і Расіі». 12 ліпеня 1941 г. паміж урадамі абедзвюх дзяржаў было заключана пагадненне аб узаемнай падтрымцы ў змаганні з нацысцкай Германіяй. Увосень таго ж года, падчас Маскоўскай канферэнцыі, да Вялікабрытаніі і СССР далучыліся ЗША. Так была запачаткавана *антыгітлераўская кааліцыя*, якая з часам пашыралася за кошт прыхільных да яе краін, і ў тым ліку эміграцыйных урадаў. Асабліва важную ролю напачатку адыгрывала ваенна-тэхнічнае і гуманітарнае супрацоўніцтва.

Панесеныя Чырвонай арміяй страты ў баявой і іншай тэхніцы, складанасці забеспячэння арміі і тылу харчаваннем, асабліва на першым этапе вайны, кампенсаваць было практычна немагчыма. І тут істотную ролю адыграла дапамога саюзнікаў СССР па кааліцыі.

Грунтуючыся на законе аб *ленд-лізе*, прынятым 11 сакаві ка1941 г., урад амерыканскага прэзідэнта Франкліна Дэлано Рузвельта пачаў аказваць вельмі значную ваенна-тэхнічную і іншую матэрыяльную дапамогу СССР. Пра яе аб'ёмы сведчаць наступныя табліцы.

### *Пастаўкі ЗША ў СССР (1941–1945)*

а) баявая і іншая тэхніка (адзінак):

| *Назва* | *Колькасць* |
|---|---|
| Танкі і самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі | 12 537 |
| Самалёты | 15 481 |
| Гарматы | 7 944 |
| Аўтаматы «Томсан» | 150 000 |
| Ваенныя караблі розных тыпаў | 362 |
| Аўтамабілі розных тыпаў | 409 500 |
| Матацыклы | 32 200 |
| Паравозы* | 1 900 |
| Дызель-электравозы* | 66 |
| Грузавыя вагоны | 11 075 |
| Металарэзныя станкі | 38 100 |
| Радыёстанцыі | 35 000 000 |
| Радыёлакатары | 989 |
| Прыёмнікі | 5 899 |
| Палявыя тэлефоны | 189 000 |

б) камплектавальныя:

| | |
|---|---|
| Аўтапакрышкі (шт.) | 3 606 000 |
| Чыгуначныя рэйкі (тыс. т) | 685,7 |
| Кабель палявы тэлефонны (міляў) | 956 700 |
| Кабель марскі (міляў) | 2 100 |
| Кабель падводны (міляў) | 1 100 |

в) матэрыялы, сыравіна, паліва, абмундзіраванне:

| | |
|---|---|
| Авіябензін (т) | 242 800 |
| Алюміній (т) | 256 400 |
| Выбуховыя рэчывы (т) | 295 600 |
| Бранявая сталь (т) | 827 185 |
| Каўчук натуральны (т) | 103 500 |
| Медзь першасная (т) | 387 700 |
| Мыльная аснова (т) | 60 000 000 |
| Шавецкая скура (т) | 10 500 000 |
| Боты вайсковыя (тыс. пар) | 1 500 |

г) прадукты харчавання (тон):

| | |
|---|---|
| Алей | 120 000 000 |
| Кансерваванае мяса | 664 464 000 |
| Масла | 12 000 000 |
| Мяса | 180 000 000 |
| Свіное сала | 144 000 000 |
| Цукар (да 1942 г.) | 610 000 |

*Новы этап* Другой сусветнай вайны, падчас якога сілы вермахта і яго саюзнікаў страцілі стратэгічную ініцыятыву, пачаўся са стварэннем у ліпені 1942 г. Сталінградскага фронту. Пасля няўдач Чырвонай арміі ў папярэдніх аперацыях на поўдні Расіі і на Каўказе пад пагрозай нацысцкай акупацыі апынуліся Паволжскі рэгіён і тэрыторыі на ўсход ад яго. 28 ліпеня 1942 г. Сталін падпісаў загад № 227, які атрымаў папулярную назву «Ні кроку назад!» Каб спыніць наступ варожай арміі, загад прадпісваў, сярод іншага: «...сфарміраваць у межах фронту ад аднаго да трох (гледзячы па сітуацыі) штрафных батальёнаў (па 800 чалавек), куды накіроўваць сярэдніх і старшых камандзіраў і адпаведных палітработнікаў усіх родаў войскаў, якія завінаваціліся ў парушэнні дысцыпліны па баязлівасці або маральнай няўстойлівасці, і ставіць іх на больш цяжкія ўчасткі фронту, каб даць ім магчымасць выкупіць крывёю свае злачынствы супраць Радзімы... Сфарміраваць у складзе армій па 3–5 добра ўзброеных загараджальных атрадаў (да 200 чалавек у кожным), паставіць іх у непасрэдным тыле няўстойлівых дывізій і абавязаць іх у выпадку панікі і бязладнага адыходу частак дывізіі расстрэльваць на месцы панікёраў і баязліўцаў і такім чынам дапамагчы сумленным байцам дывізій выканаць свой абавязак перад Радзімай».



Сталінград, бой у цэху завода «Красный Октябрь». 1942 г.

Тым не менш у сярэдзіне жніўня 1942 г.

войскі вермахта пры падтрымцы італьянскіх і румынскіх вайсковых злучэнняў фарсіравалі Дон, а 13 верасня ўварваліся ў Сталінград.

Пасля двух месяцаў кровапралітных баёў у гэтым горадзе, дзе названым войскам супрацьстаялі арміі пад камандай генералаў Васілія Чуйкова і Міхаіла Шумілава, злучэнні 6-й германскай палявой арміі пад камандай фельдмаршала Фрыдрыха фон Паўлюса трапілі ў акружэнне і былі разбіты (капітуляцыя адбылася 2 лютага 1943 г.). У выніку *бітвы за Сталінград* Германія і яе хаўруснікі страцілі каля 700 тыс. салдат і афіцэраў, больш за 1400 самалётаў і каля тысячы танкаў. Незваротныя страты Чырвонай арміі склалі 478 тыс. салдат і афіцэраў, 2,8 тыс. самалётаў, 4,3 тыс. танкаў.

Параза гітлераўскіх войскаў пад Сталінградам, па сутнасці, стала *паваротным пунктам* у ходзе вайны ва Усходняй Еўропе. У Чырвонай арміі адбылася замена старога пакалення камандзіраў: былі адхілены ад непасрэднага камандавання баявымі злучэннямі маршалы Клімент Варашылаў, Сямён Будзённы, Рыгор Кулік, Сямён Цімашэнка, шэраг генералаў і афіцэраў. На першыя месцы вылучыліся камандзіры, якія ўмелі дасягаць перамог – няхай сабе і коштам вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы: Георгій Жукаў, Іван Конеў, Аляксандр Васілеўскі, а таксама нядаўні вязень турмы НКВД Канстанцін Ракасоўскі ды іншыя.



Маршал Георгій Жукаў з камандзірамі саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі



Камандарм 2-га рангу Іван Конеў. *Здымак пачатку 1940-х гг.*



Маршал
Канстанцін Ракасоўскі
ў 1960-х гг.



Маршал Аляксандр
Васілеўскі.
*Здымак 1970-х гг.*

Паспяховыя дзеянні Чырвонай арміі ў першай палове 1943 г. дазволілі вызваліць каля 500 тыс. кв. км тэрыторыі, у асноўным расійскай, у тым ліку гарады Варонеж, Вязьму, Ржэў, Курск, Белгарад, Харкаў, часткі Паўночнага Каўказа і Данбаса. Пры канцы сакавіка 1943 г. была прарваная блакада Ленінграда.

На пачатку 1943 г. актывізаваўся партызанскі рух. Агулам на працягу ўсёй вайны ў партызанскіх фарміраваннях Расіі прымалі ўдзел больш за 250 тыс. чалавек (прыкладна ¼ ад агульнай колькасці партызан на тэрыторыі СССР), дзейнічалі 35 тыс. падпольшчыкаў. Супольнымі намаганнямі яны вывелі са строю 650 тыс. нямецкіх акупантаў і калабарантаў, падарвалі больш за 4 тыс. эшалонаў, сотні танкаў, аўтамашын, самалётаў, мастоў і іншых аб'ектаў інфраструктуры.

З надыходам лета 1943 г. гітлераўскія войскі зноў паспрабавалі перахапіць стратэгічную ініцыятыву на Усходнім фронце. Галоўныя падзеі адбываліся на *Курскай дузе*, дзе існаваў клін-выступ пазіцый Чырвонай арміі ў дыслакацыі войскаў праціўніка. Дзве групоўкі вермахта, якімі камандавалі фельдмаршалы Гюнтэр фон Клуге і Эрых фон Манштайн, павінны былі прабіць аснову выступу і ўзяць у кола абкружаныя злучэнні Чырвонай арміі. Ім супрацьстаялі войскі савецкіх, Цэнтральнага і Варонежскага, франтоў пад каман-

дай генералаў Канстанціна Ракасоўскага і Мікалая Ватуціна. Бітва пачалася 5 ліпеня, а яе кульмінацыяй стала танкавая баталія *пад Прохараўкай*, у якой з абодвух бакоў удзельнічала больш за 1,5 тыс. танкаў і самаходных артылерыйскіх установак (САУ). Напачатку наступ гітлераўскіх войскаў быў спынены, а падчас контрнаступу Чырвонай арміі ў жніўні былі вызвалены чарговыя значныя тэрыторыі Расіі і часткова Украіны. Увосень баявыя дзеянні разгарнуліся на расійска-ўкраінскім і расійска-беларускім памежжы, Чырвоная армія ўвайшла ва ўкраінскі Кіеў і беларускі Гомель.

Падзеі на савецка-германскім фронце істотна паўплывалі на палітычную сітуацыю ў Еўропе і свеце. Блок «Цэнтральнай восі дзяржаў» пачаў распадацца. У верасні 1943 г. у Маскве адбылася канферэнцыя кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў Савецкага Саюза, Вялікабрытаніі і ЗША, падчас якой былі прынятыя рашэнні давесці вайну з нацысцкай Германіяй і яе саюзнікамі да пераможнага канца, распрацаваныя прынцыпы пасляваеннага ўладкавання свету, намечаны план стварэння *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*.

На канферэнцыю, якая адбылася 28 лістапада – 1 снежня 1943 г. у іранскім *Тэгеране*, з удзелам Чэрчыля і Рузвельта, першы і апошні раз у жыцці самалётам прыляцеў Сталін. Гэты «подзвіг» ён здзейсніў не дарма: падчас канферэнцыі яму ўдалося дамагчыся ад кіраўнікоў ЗША і Вялікабрытаніі цвёрдага абяцання адкрыць у 1944 г. другі фронт на захадзе Еўропы, а галоўнае – абяцанняў гарантаваць далейшае існаванне палітычных сфераў уплыву на пасляваенны час.



Сталін, Рузвельт і Чэрчыль падчас Тэгеранскай канферэнцыі

Рашэнні Тэгеранскай канферэнцыі былі дэталізаваны на мірнай канферэнцыі, якая адбылася 4–11 лютага 1945 г. у крымскай *Ялце*. Заходнія лідары канчаткова пагадзіліся на пасляваенны падзел не толькі самой Германіі, але і ўсёй Еўропы. Не ўсе рашэнні гэтай канферэнцыі былі добра прадуманыя, што прывяло да кансервацыі сталінскіх парадкаў у савецкай імперыі і да шматгадовай «халоднай вайны».

***11.18. Заключны перыяд Другой сусветнай вайны. Разгром і капітуляцыя нацысцкай Германіі. Заканчэнне вайны ў Азіі.*** На пачатку 1944 г. Чырвоная армія пайшла ў новы наступ. Пры канцы студзеня высілкамі трох франтоў пад камандай генералаў Леаніда Говарава, Канстанціна Мерацкова і Маркіяна Папова, а таксама Балтыйскага флоту на чале з адміралам Уладзімірам Трыбуцам была канчаткова знятая блакада Ленінграда. Цягам двух наступных месяцаў савецкія войскі занялі большую частку Правабярэжнай Украіны і ў некаторых месцах выйшлі да даваенных межаў СССР. У траўні ад нацысцкіх войскаў быў ачышчаны Крым, крыху пазней Чырвоная армія выйшла да Карпатаў, дасягнула межаў Чэхаславакіі і ўступіла на тэрыторыю Румыніі, якая ў выніку перайшла на бок антыгітлераўскай кааліцыі.

У ліпені-жніўні 1944 г. адбылася адна з самых паспяховых аперацый Чырвонай арміі пад назвай «Баграціён». Войскі франтоў пад камандай маршала Ракасоўскага, генералаў Івана Баграмяна, Георгія Захарава і Івана Чарняхоўскага пры актыўнай падтрымцы беларускіх партызан занялі ўсю тэрыторыю даваеннай Беларусі. Савецкі Саюз вярнуў сабе кантроль над тэрыторыямі краін Балтыі (акрамя значнай часткі Курляндыі), Малдовы, Паўднёва-Заходняй Украіны. Былая хаўрусніца Германіі Балгарыя пры канцы жніўня аб'явіла Гітлеру вайну. У верасні было заключана замірэнне на савецка-фінскім фронце.

Адкрыццё саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі другога фронту 6 чэрвеня 1944 г., калі сумесныя англа-амерыканскія сілы на чале з генералам *Дуайтам Эйзенхаўэрам* пры падтрымцы патрыятычна настроеных французаў высадзіліся ў Францыі, паскорыла разгром гітлераўскай арміі.

На пачатку 1945 г. была пастаўлена задача дамагчыся канчатковай капітуляцыі вермахта. Чырвоная армія вяла актыўныя баявыя дзеянні ўжо толькі на тэрыторыях іншых краін. Паспяхова праведзеная *Вісла-Одэрская аперацыя* (12 студзеня – 3 лютага) дазволіла савецкім войскам у саюзе з польскімі пракамуністычнымі сіламі і партызанамі заняць большую частку Польшчы. Да сярэдзіны вясны 1945 г. войскі вермахта былі разбітыя на тэрыторыі Усходняй Прусіі, польска-нямецкага Памор'я (Памераніі). 13 лютага Чырвоная армія ўвайшла ў Будапешт, 4 красавіка – у Браціславу, 13 красавіка – у Вену. *Берлінская наступальная аперацыя*, якая вялася сіламі трох франтоў пад камандай маршалаў Жукава, Ракасоўскага, Конева, была не да канца падрыхтаванай, што асабліва выявілася ў вялікіх стратах жывой сілы (да 100 тыс. забітых і тых, хто прапаў без звестак) на Зелаўскіх узвышшах на ўсход ад Берліна. Тым не менш вялікая перавага савецкай арміі (у людзях у 2,5 разу, па гарматах і мінамётах у 4,2 разу, па танках і САУ ў 4,1 разу, па самалётах у 2,3 разу) дазволіла ім праз 10–12 дзён пасля пачатку аперацыі перайсці непасрэдна да штурму Берліна. 30 красавіка скончылі жыццё самагубствам Адольф Гітлер і яго найбліжэйшы памагаты, міністр прапаганды Ёзэф Гёбельс, а 2 траўня берлінскі гарнізон капітуляваў канчаткова. 8 траўня (паводле маскоўскага часу – 9 траўня) 1945 г. у берлінскім прыгарадзе *Карлсгорсце* быў падпісаны заключны, афіцыйны *акт капітуляцыі нацысцкай Германіі*. Назаўтра быў канчаткова зломлены супраціў гітлераўскіх войскаў у сталіцы Чэхаславакіі Празе.



Бітва за Берлін, красавік 1945 г.

Рашэнні праведзенай у нямецкім *Патсдаме* 7 ліпеня – 2 жніўня 1945 г. апошняй сумеснай канферэнцыі саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі, сярод іншага, пацвердзілі новыя межы Савецкага

Саюза (да яго былі далучаны Усходняя Прусія, тэрыторыі на Карэльскім перашыйку, у Балтыі, Бесарабіі). Частку тэрыторыі Беластоцкай вобласці БССР Сталін перадаў будучай камуністычнай Польшчы.

У адпаведнасці з рашэннямі канферэнцыі ў Ялце і Патсдаме Савецкая армія прыняла ўдзел у баявых дзеяннях *супраць Японіі на Далёкім Усходзе* (найперш у Маньчжурыі), якія яна пачала 9 жніўня 1945 г. У выніку сумесных аперацый узброеных сіл СССР і ЗША 2 верасня 1945 г. Японія таксама капітулявала. Расія атрымала тэрыторыю Паўднёвага Сахаліна і Курыльскія выспы (апошняе адбылося без згоды Японіі).

Так скончылася Другая сусветная вайна. У гэтай вайне, паводле афіцыйных падлікаў расійскіх гісторыкаў, Расія і залежныя ад яе савецкія рэспублікі страцілі 26,6 млн сваіх грамадзян, пры гэтым 17,9 млн склалі ахвяры сярод мірнага насельніцтва (з улікам тых, хто загінуў ад рук савецкага НКВД). Іншыя крыніцы падаюць нават большыя лічбы – да 41,98 млн чалавек (у тым ліку 22,57 млн мірнага насельніцтва). Беззваротныя страты Германіі і яе саюзнікаў за шэсць гадоў Другой сусветнай вайны склалі больш за 10 млн чалавек (паводле іншых падлікаў – да 12,15 млн).

Перамога над нацысцкай Германіяй і яе хаўруснікамі, з аднаго боку, дазволіла нанесці вырашальны ўдар па нацысцкай і фашысцкай ідэалогіі, але, з іншага боку, як адзначае згаданы раней расійскі гісторык Сяргей Палтарак, яна «паказала бесчалавечную сутнасць сталінскай сістэмы, яе пагардлівае стаўленне да людзей, іх жыццяў. Трагічнасць сітуацыі палягала ў тым, што гістарычную перамогу здабывалі не толькі салдаты, афіцэры і генералы і свабодныя працаўнікі тылу, але і мільёны бязвінна асуджаных грамадзян ды спецперасяленцаў».

На думку двух іншых аўтарытэтных гісторыкаў, нашага земляка Міхаіла Гелера і Аляксандра Некрыча, было б «справядліва ўскласці адказнасць за вялізныя ахвяры, панесеныя савецкім народам, не толькі на нямецкіх нацыстаў, іх сатэлітаў і калабарантаў, не толькі на перыпетыі вайны, на спадарожныя ёй няшчасці, але і на вышэйшае партыйна-палітычнае кіраўніцтва краіны. Аднак ніхто з членаў кіраўніцтва не быў асуджаны за гэтыя злачынствы».

***11.19. Тупіковая эвалюцыя сталінскага рэжыму (1946–1953): сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Савецкай Расіі і залежных ад яе краінах.*** Заканчэнне Другой сусветнай вайны прынесла жаданую свабоду далёка не ўсім яе ўдзельнікам і ахвярам, якім удалося выжыць. Пры канцы баявых дзеянняў у Еўропе на яе тэрыторыях знаходзілася больш за 5 млн грамадзян Расіі і залежных ад яе саюзных рэспублік. Згодна з ялцінскімі пагадненнямі яны падлягалі рэпатрыяцыі. Працэс рэпатрыяцыі доўжыўся да 1947 г. У СССР з дапамогай англійскіх, амерыканскіх, французскіх, польскіх і іншых уладаў было агулам рэпатрыявана 2 млн 272 тыс. савецкіх і «прыроўненых» да іх грамадзян (тых, хто свядома адмаўляўся ад навязанага ім грамадзянства да вайны). Пры гэтым вельмі значная іх колькасць была абвінавачаная ў здрадзе і калабаранцтве. Прысуды ў дачыненні да іх зноў жа выносіліся «тройкамі»: 20 % з ліку тых, хто вярнуўся на тэрыторыю СССР, атрымалі смяротны прысуд або 25 гадоў знаходжання ў лагерах; 15–20 % былі асуджаныя на тэрмін ад 5 да 10 гадоў; 10 % высланыя ў аддаленыя раёны Сібіры, дзе прабылі не менш за 6 гадоў; 15 % пасланыя на прымусовыя работы па аднаўленні разбураных вайной раёнаў, і толькі 15–20 % атрымалі дазвол вярнуцца дадому, але і яны не ўсе даехалі: нехта загінуў падчас транспартавання, а нехта, не чакаючы прыбыцця, уцёк і згубіўся.

У першыя пасляваенныя гады на тэрыторыі Савецкага Саюза працягвалі дзейнічаць узброеныя фарміраванні асоб, якія не прымалі савецкай палітыкі і не хацелі быць расстралянымі або апынуцца ў высылцы. У лясах Беларусі і Заходняй Украіны гэта былі падраздзяленні Арміі Краёвай, Украінскай Паўстанцкай арміі (УПА), у краінах Балтыі – атрады партызан, якіх называлі «ляснымі братамі». Велізарнымі намаганнямі савецкага МГБ і арміі яны былі канчаткова ліквідаваны толькі ў сярэдзіне 1950-х гг.

Перамога над нацысцкай Германіяй стала своеасаблівай індульгенцыяй сталінскаму рэжыму: пры наяўнасці такой колькасці бязвінных ахвяр гітлераўскіх войнаў і злачынстваў супраць мірнага насельніцтва прыгадваць Сталіну пра яго долю віны ў развязванні Другой сусветнай вайны і велізарных памылках ды праліках ва ўнутранай і знешняй палітыцы было практычна немагчыма, нават рызыкоўна.

Разбураны вайной Сталінград



Масква, 1947 г.



Вайна абышлася Расіі і залежным ад яе тэрыторыям СССР не толькі велізарнымі людскімі стратамі, пра якія гаворка ішла вышэй. Да гэтага можна дадаць больш за 1700 моцна разбураных гарадоў, 70 тыс. дашчэнту вынішчаных сёлаў і вёсак, 32 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, 65 тыс. км выведзеных са строю чыгуначных шляхоў і г. д. У цэлым сума матэрыяльнай шкоды ў 5,5 разу перавысіла памер нацыянальнага даходу, атрыманага ў 1940 г. Пачаўся няпросты, нягледзячы на рэпарацыі, атрыманыя ад пераможаных у вайне краін, працэс *аднаўлення эканомікі*.

Паводле зацверджанага ў 1946 г. *чацвёртага пяцігадовага плана*, выразны прыярытэт аддаваўся аднаўленню і пабудове прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу (ВПК). Клопат пра тое, як накарміць, апрануць, абуць насельніцтва, задаволіць яго іншыя, не надта вялікія на той час патрэбы, адкладаўся на нявызначаны тэрмін. Капіталаўкладанні ў пасляваенным Савецкім Саюзе на 88 % накіроўваліся на патрэбы развіцця машынабудавання і толькі на 12 % – у лёгкую прамысловасць. Сельская гаспадарка з гэтых капіталаўкладанняў фактычна не атрымлівала нічога: сагнаныя

ў калгасы і саўгасы сяляне па-ранейшаму павінны былі працаваць збольшага за «палачкі», якімі брыгадзіры сельгасбрыгад пазначалі адпрацаваныя працадні. У сярэднім, каб купіць, напрыклад, адзін кілаграм масла, калгаснік павінен быў адпрацаваць 60 працадзён. Жыхары вёсак, найперш моладзь, усялякімі праўдамі-няпраўдамі імкнулася абысці ўзаконенае згаданым намі раней рашэннем УЦВК з 1932 г. новае прыгоннае права і з'ехаць у горад, дзе патрабавалася некваліфікаваная працоўная сіла. З 1947 па 1950 г. колькасць вясковага насельніцтва ў Савецкім Саюзе скарацілася на 4 млн чалавек. У 1947 г., пасля вельмі засушлівага папярэдняга года, вялікую частку савецкіх тэрыторый ахапіў голад, загінулі сотні тысяч сялян, а мільёны канчаткова збяднелі, дайшлі да жабрацкага стану.

Развіццё пасляваеннай расійскай народнай гаспадаркі апіралася на буйныя індустрыяльныя раёны ўсходу краіны. Аднаўленне цяжкай прамысловасці было скончана ў цэлым пры канцы 1950 г. Значна ўзрасла, у параўнанні з даваенным узроўнем, вытворчасць сталі, пракату, станкоў і машын. Аднак патэнцыял савецкай цяжкай прамысловасці развіваўся на аснове састарэлых тэхналогій. Абсалютна занядбанай заставаліся такія стратэгічна важныя галіны, як нафтахімія: у паліўна-энергетычным балансе вялікая перавага, як і даўней, аддавалася вугалю.

У Расіі ў гэты час былі пабудаваны некалькі магутных электрастанцый на Волзе і на рацэ Ангары ў Сібіры, уведзены ў эксплуатацыю канал Волга – Дон.



Канал Волга – Дон пасля яго адкрыцця ў 1952 г.

Савецкі Саюз спяшаўся вырабіць *атамную бомбу*, каб не дапусціць стварэння перавагі ў свеце на карысць адзінага на той час уладальніка атамнай зброі – Злучаных Штатаў Амерыкі. На стварэнне атамнай бомбы былі мабілізаваны найлепшыя савецкія навукоўцы. Узначаліў гэтую працу ўсёма-

гутны «наркам тэрору» Лаўрэнцій Берыя, які ў той час займаў пост намесніка старшыні савецкага ўрада. Савецкая выведка пачала масава вербаваць агентаў дзеля здабывання любой інфармацыі, якая датычыла атамнай энергіі. На расійскай тэрыторыі з'явілася некалькі спецыялізаваных інстытутаў, закрытых гарадкоў і палігонаў; было створана спецыяльнае міністэрства сярэдняга машынабудавання – фактычна міністэрства будаўніцтва і выкарыстання атамнай энергіі. У 1949 г. Масква абвясціла аб стварэнні атамнай бомбы, а яшчэ праз чатыры гады – і пра стварэнне бомбы *вадароднай*, патэнцыял знішчэння якой быў беспрэцэдэнтным у свеце. За год да смерці Сталіна беспасярэднія ваенныя выдаткі СССР складалі амаль чвэрць усяго яго гадавога бюджэту.

Прымусовае выкарыстанне працоўнай сілы ў пасляваенны перыяд набыло новы размах. Вязні ГУЛАГу скіроўваліся для выканання самых цяжкіх прац на бязлюдных абшарах Крайняй Поўначы, Сібіры і Далёкага Усходу Расіі. У вырашальнай ступені іх рукамі і нярэдка коштам іх жыццяў будаваўся канал Волга – Дон, здабывалася золата і ўран, будаваліся ўстаноўкі па вытворчасці ядзернай энергіі. Трэба адзначыць, што жахлівыя ўмовы знаходжання ў ГУЛАГу, здзекі наглядчыкаў са зняволеных сталі прычынай шматлікіх бунтаў і сапраўдных паўстанняў вязняў; нярэдка імі кіравалі кадравыя афіцэры Савецкай арміі з ліку тых самых вязняў. У 1950 г. у розных лагерах адбыліся масавыя расстрэлы зняволеных: афіцэры МГБ выконвалі пастаўленую кіраўніцтвам задачу скараціць колькасць вязняў на 5 %.

У той самы час бальшавіцкае кіраўніцтва імкнулася прадэманстраваць усяму свету, як яно дбае пра інтарэсы звычайных людзей. Яшчэ ўвосень 1947 г. Сталін даў указанне скасаваць картачную сістэму забеспячэння насельніцтва найважнейшымі прадуктамі харчавання – крок, на які ў той час не маглі пайсці нават урады іншых пацярпелых у вайну еўрапейскіх краін. Аднак вынік такой акцыі сталінскага кіраўніцтва меў свой адваротны бок: устанаўленне фіксаваных цэн у СССР прывяло да таго, што рознічная цана 1 кг чорнага хлеба павялічылася з 1 да 3,40 руб., 1 кг мяса – з 14 да 30 руб., 1 кг цукру –з 5,50 да 15 руб., 1 кг масла – з 28 да 66 руб., 1 л малака – з 2,50 да 8 руб.

Мінімальная заработная плата складала 300 руб. у месяц. Сярэдняя заработная плата была роўная 475 руб. у 1946 г. і 550 руб. у 1947 г. Для нізкааплатных катэгорый рабочых і службоўцаў адначасова з усталяваннем адзіных дзяржаўных коштаў існавала надбаўка – да 110 руб. у месяц (у старым вылічэнні) у выглядзе павелічэння зарплаты для тых, хто зарабляў менш за 900 руб.

*Грашовая рэформа* канца 1947 г. фактычна канфіскоўвала наяўныя грошы ў насельніцтва. Фармальна абмен праводзіўся паводле курсу 10:1, аднак большыя (ад 3 тыс. руб.) сумы гатоўкі абменьваліся паводле горшых і горшых курсаў. Гэта моцна ўдарыла найперш па найлепшых працаўніках – высокакваліфікаваных рабочых, тэхнічнай інтэлігенцыі. Аднак партыйна-савецкія работнікі даведаліся пра меркаваны абмен раней за звычайных грамадзян і паспелі перавесці свае грошы на ашчадныя кніжкі, зрабілі іншыя аперацыі, што дазволіла ім нават выйграць у выніку гэтага абмену.

Сталінісцкая і неасталінісцкая прапаганда як вялікае дасягненне бальшавіцкага рэжыму пасля вайны падавала і цяпер падае той факт, што тады фактычна кожны год абвяшчалася зніжэнне рознічных цэн на важныя прадукты і тавары. Аднак гэтае зніжэнне адбывалася збольшага на фоне той самай нізкай прадукцыйнасці працы, асабліва ў сельскай гаспадарцы. Гісторыкі Міхаіл Гелер і Аляксандр Некрыч прааналізавалі сутнасць такога «цуду» і высветлілі наступнае. Сакрэт паніжэння коштаў надзвычай просты: ён заснаваны перш за ўсё на велізарным узлёце цэн пасля пачатку калектывізацыі. У сапраўднасці, калі прыняць цэны 1937 года за 100, то высвятліцца, што цэны на печаны жытні хлеб ўзраслі з 1928 па 1937 г. у 10,5 разу, а да 1952 г. амаль у 19 разоў! Цэны на ялавічыну 1-га гатунку ўзраслі з 1928 па 1937 г. у 15,7, а да 1952 г. – у 17 разоў; на свініну адпаведна ў 10,5 і ў 20,5 разу. Цана на селядцы вырасла да 1952 г. амаль у 15 разоў. Кошт цукру падняўся да 1937 г. у 6 разоў, а да 1952 г. у 15 разоў. Цана на алей павялічылася з 1928 па 1937 г. у 28 разоў, а з 1928 да 1952 г. у 34 разы. Цэны на яйкі ўзраслі з 1928 па 1937 г. у 11,3 разу, а да 1952 г. у 19,3 разу. І, нарэшце, кошты на бульбу падняліся з 1928 па 1937 г. у 5 разоў, а ў 1952 г. былі ў 11 разоў вышэйшымі за ўзровень цаны 1928 г.

Праблемы развіцця расійскага грамадства, з якімі сутыкнуліся бальшавіцкія лідары ў першыя пасляваенныя гады, прывялі да

ўзмацнення сярод іх жорсткай лініі. Супраць людзей, якія хоць чым маглі не спадабацца Сталіну і яго найбліжэйшаму атачэнню, усчыналіся кампаніі, узбуджаліся крымінальныя справы.

У 1946 г. у складзе савецкага ўрада, які цяпер пачаў называцца *Саветам Міністраў*, былі ўтвораны два міністэрствы, якія павінны былі гарантаваць непахіснасць мадэлі аднаасобнага кіравання Сталіна – Міністэрства ўнутраных спраў (руская абрэвіятура: МВД) і Міністэрства дзяржаўнай бяспекі (адпаведна: МГБ). Адначасова Берыя, узяўшы сабе за хаўрусніка Георгія Малянкова, пачынае разбірацца з прыхільнікамі іншага вернага сталінца, Андрэя Жданава. Пачалася чарговая хваля партыйных чыстак, ад якой пацярпела больш за 2 тыс. партыйных, дзяржаўных, гаспадарчых функцыянераў. Як заўсёды, не абышлося без расстрэлаў, ахвярамі якіх сталі, сярод іншых, асуджаныя па так званай «ленінградскай справе» старшыня Дзяржплана СССР Мікалай Вазнясенскі, сакратар ЦК ВКП(б) Аляксей Кузняцоў, старшыня Савета Міністраў РСФСР Міхаіл Радзіёнаў, першы сакратар Ленінградскага абкама і гаркама ВКП(б) Пётр Папкоў і іншыя.

Палітыка рэпрэсій закранула таксама шэраг камандзіраў Савецкай арміі і Ваенна-марскога флоту (ВМФ): партыйныя кіраўнікі баяліся, што генералы, адміралы, якія мелі досвед удзелу ў жахлівай вайне, могуць арганізаваць пераварот. У 1946 г. пад «суд гонару» былі аддадзеныя галоўнака мандуючы ВМФ адмірал Мікалай Кузняцоў, адміралы Леў Галер, Уладзімір Алафузаў, Георгій Сцяпанаў. Усе яны атрымалі турэмныя тэрміны ад 4 да 10 гадоў, аднак адмірал Кузняцоў у выніку быў вызвалены ад адбывання пакарання, а Галер памёр у турэмным лазарэце. У 1946 г. быў арыштаваны галоўны маршал авіяцыі Аляксандр Новікаў. Былі сфабрыкаваны таксама «справы» супраць маршала авіяцыі Сяргея Худзякова, генерал-палкоўні ка



Адмірал Мікалай Кузняцоў

Васілія Гордава, генерал-маёраў Паўла Панядзеліна і Мікалая Кірылава, у выніку чаго ўсе яны пасля некалькіх гадоў знаходжання ў турмах былі ў жніўні 1950 г. расстраляны. Стандартныя абвінавачванні (ніколі не даказаныя) супраць гэтых асоб гучалі як «шпіянаж на карысць англійскай і амерыканскай разведак», «здрада Радзіме». Пасля смерці Сталіна ўсіх вышэйзгаданых камандзіраў рэабілітавалі.

Сталін таксама працягваў палітыку масавых дэпартацый насельніцтва, скіраваную перадусім супраць жыхароў краін Балтыі, Заходняй Украіны і Беларусі, якія не падтрымлівалі палітыкі гвалтоўнай калектывізацыі. У першыя пасляваенныя гады ў названых краінах дзейнічалі і ўзброеныя рухі супраціву, напрыклад, *Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў* (украінская абрэвіятура: ОУН) ды інш.

Пры канцы 1948 г. у МГБ была сфабрыкавана яшчэ адна гучная справа – аб «Габрэйскім антыфашысцкім камітэце». Гэтая арганізацыя была створана падчас Другой сусветнай вайны савецкімі ўладамі дзеля «мабілізацыі савецкай і сусветнай грамадскай думкі супраць злачынстваў фашызму». Цяпер жа ў Савецкай Расіі пачыналася кампанія супраць «бязродных касмапалітаў», галоўнай мэтай якой была дыскрэдытацыя гістарычнай падзеі – заснавання на Блізкім Усходзе самастойнай *Дзяржавы Ізраіль*. Група вядомых дзеячаў-габрэяў (чыноўнікі, дзеячы культуры і мастацтва) была арыштаваная, шмат хто (Барыс Шымеліёвіч, Саламон Лазоўскі, Іосіф Юзэфовіч, Эмілія Тэўмін і іншыя) расстраляны.

Крыху пазней МГБ распрацавала яшчэ адну справу, якую пачалі называць «справай урачоў». Па ёй былі затрыманы дзясяткі вядомых дактароў, у асноўным таксама габрэяў (Мірон Воўсі, Міхаіл і Барыс Коганы, Якаў Этынгер, Аляксандр Фельдман, Мікалай Шарашэўскі, Аляксандр Грынштэйн і іншыя), але адразу пасля смерці Сталіна яны былі адпушчаны і ў большасці вярнуліся на ранейшае месца працы.

Пад наглядам МГБ, пры падтрымцы праваслаўнага патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія (Сіманскага), у 1946 г. быў скліканы так званы Львоўскі сабор грэка-каталіцкай царквы, у якім не прыняў удзел ніводзін дзейны на той час уніяцкі біскуп. На гэтым мерапрыемстве было вызначана далучыць грэка-каталіцкія епархіі да Рускай праваслаўнай царквы. Такое рашэнне не было падтрымана ні Ватыканам, ні вялікай колькасцю вернікаў, і грэка-каталіцкая царк-

ва ў СССР фактычна сышла ў падполле.

Бальшавіцкі правадыр Іосіф Сталін памёр 5 сакавіка 1953 г. Цісканіна на вуліцах Масквы падчас яго пахавання забрала жыцці соцень (паводле іншых звестак – тысяч) людзей і стала апошнім злавесным акордам у палітычнай біяграфіі бальшавіцкага тырана.


Копия.

РСФСР

СВИДЕТЕЛЬСТВО О СМЕРТИ II-А № 734924.

Гр. ЖУТ Арон Исаакович умер. 6.III.1953 марта тысяча девятьсот пятьдесят третьего возраст 45 лет причина смерти сдавление грудной клетки о чем в книге записей актов гражданского состояния о смерти 1953 года марта месяца 8 числа произведена соответствующая запись за № 825. Место смерти: город Москва, Московская область, республика РСФСР.
Место регистрации: Щербаковское райбюро ЗАГС г. Москвы. Дата выдачи 9 марта 1953 г.
и.о. Заведующий бюро записей актов гражданского состояния – Подпись.
ПЕЧАТЬ: Управление милиции гор. Москвы. Бюро записей актов гражданского состояния Щербаковского района.

Копія пасведчання аб смерці адной з ахвяр падзей падчас пахавання Сталіна

***11.20. Пасляваеннае ўладкаванне свету; знешняя палітыка савецкай імперыі позняе сталінскага часу.*** Спадзяванні многіх людзей, што ў пасляваенны час прадоўжыцца цеснае супрацоўніцтва краін, якія супольна перамагалі гітлераўскую Германію, аказаліся марнымі. Кіраўнікі Вялікабрытаніі і ЗША, беручы ўдзел у канферэнцыях у Тэгеране, Ялце і Патсдаме, фактычна пагадзіліся на працяг дыскрэдытаванай яшчэ перад вайной палітыкі падзелаў сфер інтарэсаў. Ад Сталіна патрабавалася толькі, каб ён паабяцаў, што ў краінах, якія трапляюць пад кантроль Расіі, будуць праведзены свабодныя дэмакратычныя выбары. Верыць у такое і чакаць гэтага ад чалавека, які сам ні ў якіх сапраўдных выбарах не ўдзельнічаў і ажыццяўляў дыктатарскую ўладу, апіраючыся на свой «ордэн мечаносцаў» – бальшавіцкую партыю, маглі толькі вельмі наіўныя людзі. Працэс анексіі чужых тэрыторый Расія прадоўжыла ў 1944 г.: 17 кастрычніка паводле Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР (!) у склад РСФСР была «добраахвотна» прынятая *Тувінская Народная Рэспубліка* (*Тыну-Тува*), незалежнасць якой СССР прызнаў яшчэ ў 1924 г.

Пад кантролем прысутных у Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі,

Румыніі савецкіх войскаў і агентуры МГБ на працягу 1946–1948 гг. там былі арганізаваны звычайныя выбарчыя фарсы, у выніку якіх пераможцамі нязменна абвяшчаліся мясцовыя камуністычныя партыі. У 1947 г. пад назвай «*Камінфарм*» была адроджаная мадэль новага бальшавіцкага Інтэрнацыянала з першапачатковай сядзібай у югаслаўскім Бялградзе.

З іншага боку, новы прэзідэнт ЗША Гары Труман абвясціў сваю дактрыну, дзе сусветная камуністычная пагроза падавалася перабольшана. Пры гэтым пацярпелым ад вайны еўрапейскім краінам дзеля аднаўлення іх эканамічнай і культурнай вагі прапаноўвалася вельмі значная дапамога ў выглядзе «плана Маршала» (назва паходзіць ад прозвішча тагачаснага дзяржсакратара ЗША Джорджа Маршала). Гэты план на суму 12,4 млрд тагачасных долараў ЗША 3 красавіка 1948 г. быў ухвалены Кангрэсам Злучаных Штатаў і разлічаны на 4 гады. Савецкі Саюз імгненна назваў гэты план «умяшаннем ва ўнутраныя справы еўрапейскіх краін», і не толькі сам адмовіўся прыняць дапамогу, але і змусіў да гэтага падпарадкаваныя сабе ўрады новых «краін народнай дэмакратыі» (яго не паслухалася толькі Югаславія), а таксама ўрад Фінляндыі, які трымаўся палітыкі падкрэсленай лаяльнасці да суседняй Расіі.

Лаяльнымі да Расіі былі ў той час таксама Балгарыя на чале з даўнім дзеячам Камінтэрна Георгіем Дзімітровым і Югаславія, якую ўзначальваў кіраўнік тамтэйшага партызанскага руху ў гады Другой сусветнай вайны Ёсіп Броз Ціта. Гэтыя абодва лідары распрацавалі праект мытнай уніі і магчымай будучай канфедэрацыі сацыялістычных краін Усходняй Еўропы. Такі праект, вядома, не мог спадабацца Сталіну. У выніку Югаславія (Георгій Дзімітроў якраз у гэты час памёр, і кіраўніцтва Балгарыяй перайшло ў рукі адкрытых сталіністаў) была фактычна абвешчана краінай-здрадніцай, а яе адносіны з СССР да 1956 г. былі замарожаны.

Узамен Савецкі Саюз прапанаваў сваім астатнім еўрапейскім сатэлітам стварыць новую паўкаланіяльную эканамічную структуру, якая была заснавана ў 1949 г. у Маскве пад назвай *Савета эканамічнай узаемадапамогі* (СЭУ). Функцыянаванне СЭУ мела на мэце прывязаць эканомікі краін-членаў да савецкай, што падразумявала іх уніфікацыю зноў-такі на савецкі ўзор.

Прывязванне ўсходнееўрапейскіх краін да савецкай імперыі ажыццяўлялася і праз адкрытае навязванне ім сталінскіх уяўленняў пра функцыянаванне дзяржавы на чале з камуністычнай партыяй. Адначасова з хваляй палітычных працэсаў у СССР аналагічныя працэсы супраць рэвізіяністаў адзіна слушнай сталінскай лініі адбыліся ў Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Балгарыі, Албаніі... Шэраг былых лідараў кампартый быў там пакараны смерцю.

У дачыненні да адносінаў краін савецкага блоку з астатнімі краінамі ў Еўропе ў другой палове 1940-х гг. усё часцей пачаў ужывацца тэрмін «*халодная вайна*». Падзел Еўропы на два ідэалагічна несумяшчальныя лагеры завяршыўся ў красавіку 1949 г. стварэннем *Арганізацыі Паўночнаатлантычнай дамовы* (англійская абрэвіятура: *НАТО*), у якую напачатку ўвайшлі Бельгія, Вялікабрытанія, Данія, ЗША, Ісландыя, Італія, Канада, Люксембург, Нарвегія, Нідэрланды, Партугалія, Францыя, а ў 1952 г. – таксама Грэцыя і Турцыя. У значнай ступені гэты вайскова-палітычны блок паўстаў у выніку савецкай блакады Заходняга Берліна, якая пачалася ўлетку 1948 г. і была знятая толькі пасля падпісання дамовы аб стварэнні НАТО.

У Азіі ў сферу расійска-савецкага ўплыву былі ўцягнутыя Паўночны В'етнам на чале з Хо Шы Мінам, Паўночная Карэя на чале з Кім Ір Сенам і Кітай, які 1 кастрычніка 1949 г. абвясціў сябе «народнай рэспублікай» пад кіраўніцтвам Мао Цзэдуна. Савецкія і кітайскія вайсковыя дарадцы і баявыя падраздзяленні ўдзельнічалі ў *вайне на Карэйскім паўвостраве*, якая працягвалася з чэрвеня 1950 па ліпень 1953 г.

***11.21. Навука і культура Савецкай Расіі ў 1940-х – пачатку 1950-х гг.*** Асноўныя дасягненні расійскай навукі ў гэты перыяд звязаныя з ваеннымі праектамі. Працягвалі сваю плённую працу згаданыя ў адпаведных раздзелах пра 1930-я і 1940-я гг. навукоўцы і канструктары. Эфектыўную сістэму лячэння параненых і асновы эпідэміялагічнай абароны распрацавалі хірургі Аляксандр Вішнеўскі і Юсцін Джанелідзэ. Вялікі ўклад у стварэнне савецкіх ядзерных і тэрмаядзерных установак і рэактараў унеслі Абрам Ёфэ, Георгій Флёраў, Леў Арцімовіч, Юлій Харытон, Ігар Там, Андрэй Сахараў, беларускі навуковец Якаў Зяльдовіч, нямецкія навукоўцы Манфрэд

фон Ардэнэ, Густаў Герц, Гайнц Барвіх, Нікалаўс Рыль, Гайнц Позэ, Макс Фольмер, Густаў Рыхтэр ды іншыя. Ака дэмікі Леў Ландау і Віталій Гінзбург у 1950 г. распрацавалі тэорыю звышправоднасці.

Разам з тым сталінская сістэма патрабавала ворагаў і ў навуцы. Так, з падачы ўлюбёнца правадыра, псеўданавукоўца Тараса Лысенкі ў 1949 г. быў учынены пагром расійскай школы генетыкаў (марганістаў), аб'яўленай ілжэнавукай. Яшчэ адной ілжэнавукай была названа кібернетыка.

«Няправільныя» з ідэалагічнага гледзішча выказванні філосафаў, гісторыкаў, эканамістаў і нават мовазнаўцаў суправаджаліся іх высылкай на поўнач або ў Сібір.

У 1947 г. у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук СССР была арганізавана дыскусія, падчас якой ацэньвалася гістарычная роля кіраўніка вызвольнай барацьбы народаў Паўночнага Каўказа ў XIX ст. Шаміля. Былі перагледжаны ранейшыя ацэнкі, і Шаміль быў абвешчаны агентам англійскай разведкі, а ўвесь яго рух – увасабленнем рэакцыі. Ідэолагі савецкай імперыі скідалі, такім чынам, свае апошнія маскі. Імперыя павінна была ў выніку зрабіцца велікарускай. Вялікія сілы былі кінуты на тое, каб распрацаваць міф аб адзінай старажытнарускай народнасці, згодна з якім велікаросам, натуральна, прыпісвалася роля «старэйшых братоў».

Пасля тэрору супраць вядучых расійскіх лінгвістаў, што меў месца ў 1930-х гг., найлепшыя лінгвісты расійскага паходжання, такія як, напрыклад, Раман Якабсон або Мікалай Трубяцкой, рабілі свае даследаванні за мяжою (ЗША, Чэхія, Францыя, Германія).

Сістэма адукацыі ў Расіі і большасці іншых рэспублік савецкай імперыі знаходзілася ў гэты час у крытычным стане. Не спрыяла яе развіццю абавязковая плата за навучанне ў старэйшых класах сярэдняй школы, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, уведзеная савецкім урадам у кастрычніку 1940 г. У выніку праведзеных рэформаў колькасць выпускнікоў гэтых устаноў скарацілася ўдвая.

Фактычна Сталін у той час пачаў фарміраванне новай саслоўнасці, а рабочыя і сяляне пазбавіліся шанцаў выйсці па-за межы свайго кола. Варта нагадаць, што ў сем'ях таго часу нормай было мець па пяцёра-сямёра дзяцей у сялян і па трое-чацвёра ў рабочых – плаціць



Аляксандр Твардоўскі



Муса Джаліль

за навучанне дваіх-траіх дзяцей шмат каму было проста не пад сілу. Што да матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў, то ў шмат якіх школах і ВНУ яна папросту адсутнічала.

Час вайны немінуча адбіўся на характары расійскай *літаратуры і мастацтва*. У 1940-я гг. значныя творы напісалі рускія літаратары Канстанцін Сіманаў і Сямён Гудзенка (лірыка), Аляксандр Твардоўскі (лірыка, паэма «Васілій Цёркін»), Васілій Гросман (аповесць «Народ неўміручы»), Віктар Някрасаў (аповесць «У акопах Сталінграда»), Аляксандр Бек (аповесць «Валакаламская шаша»), Эміль Казакевіч (аповесць «Зорка»), Вольга Берггольц (дзённікі), Ілья Эрэнбург (публіцыстыка). Пранікнёныя радкі належалі таксама габрэйскім паэтам Давіду Гафштэйну, Перэцу Маркішу і Іцыку Феферу, карэльскаму паэту Мікалаю Лайне, лакскаму паэту з Дагестана Абуталібу Гафураву, мардоўскаму паэту Аляксандру Мартынаву, татарскім паэтам Ахцяму Аміневу і згаданаму раней Мусе Джалілю. Сваімі творамі звярнулі на сябе ўвагу таксама татарскі празаік і паэт Абдула Ахметаў, хантыйскі паэт Рыгор Лазараў, чувашскі паэт Пётр Хузангай, башкірскія празаікі Сагіт Агіш і Кірэй Мэргэн, тувінскі драматург Віктар Кок-оол ды іншыя.



Кампазітар Дзмітрый Шастаковіч

Нягледзячы на тое што тэатральныя пастаноўкі ў гэты час асабліва жорстка цэнзураваліся, адметным талентам вылучалася творчасць такіх рускіх актораў, як Вера Марэцкая, Ала Тарасава, Міхаіл Жараў, Аляксей Грыбаў ды інш.

У часы вайны, жывучы ў блакадным Ленінградзе, кампазітар Дзмітрый Шастаковіч стварыў сваю знакамі тую *Сёмую сімфонію.*

Сярод музыкантаў Расіі звярнулі на сябе ўвагу таксама, сярод іншых, башкірскі кампазітар і дырыжор Масалім Валееў, карэльскі кампазітар Лаўры Ёўсінен, татарскія кампазітары Мансур Музафараў і Фарыд Ярулін, татарская оперная спявачка і кампазітар Мар'ям Рахманкулава, татарская спявачка і актрыса Галія Кайбіцкая.

Прыкметнымі з'явамі расійскага выяўленчага мастацтва сталі графічная серыя мастака Дзяменція Шмарынава «Не забудзем, не даруем!» (1942), асобныя карціны Аркадзія Пластава, а таксама згаданых вышэй жывапісцаў Сяргея Герасімава, ПятраКанчалоўскага, Паўла Корына, Аляксандра Дэйнекі, скульптара Веры Мухінай.



Дз. Шмарынаў. Маці
(з цыкла «Не забудзем, не даруем!»)

Аднаўляючы пасляваеннае аблічча расійскіх гарадоў, дастаткова плённа працавалі рускія архітэктары Леў Руднеў, Аляксандр Хракаў, Павел

Абросімаў, руска-габрэйскі архітэктар Міхаіл Баршч, башкірскі дойлід Барый Калімулін ды іншыя.



Тэатральны рэжысёр Саламон Міхоэлс

Пасляваенны час адзначаны далейшым узмацненнем ідэалагічнага кантролю над літаратурай і мастацтвам, які рабіўся з падачы сакратара ЦК ВКП(б) Андрэя Жданава і атрымаў назву «жданаўшчына». У 1946 г. Жданаў абрынуўся на савецкія літаратурныя часопісы «Ленинград» і «Звезда», вынікам чаго сталася забарона на публікацыі твораў паэтэсы Ганны Ахматавай і празаіка Міхаіла Зошчанкі. Былі жорстка асуджаны «безыдэйныя» кінафільмы «Вялікае жыццё» рэжысёра Леаніда Лукава і «Іван Жахлівы» (2-я серыя) вышэйпамянёнага Сяргея Эйзенштэйна, а таксама Шостая сімфонія Сяргея Пракоф'ева, опера «Вялікая дружба» Вано Мурадэлі.

У сувязі са справай «Габрэйскага антыфашысцкага цэнтра», пра якую гаворка ішла вышэй, быў учынены сапраўдны пагром габрэйскай літаратуры і культуры ў СССР. Расстралялі асоб, якія на той час былі галоўнымі прадстаўнікамі літаратуры на ідыш –Іцыка Фефера, Перэца Маркіша, Льва Квітко, Давіда Бергельсона, Давіда Гафштэйна, а рэжысёр Саламон Міхоэлс быў забіты агентамі МГБ проста падчас гастроляў яго тэатра ў Мінску.

***11.22. Крызіс камуністычна-савецкай сістэмы ў 1953–1985 гг.: хрушчоўскі этап.*** Яшчэ за некалькі гадзін да смерці Сталіна яго паплечнікі размеркавалі асноўныя пасады ў партыйна-савецкім кіраўніцтве. Старшынёй Савета Міністраў станавіўся Георгій Малянкоў – і на той момант гэта была рэальна найвышэйшая пасада ў савецкай імперыі. Дзве іншыя найвышэйшыя прыступкі займалі Лаўрэнцій Берыя, які зноў непасрэдна ўзначаліў службы бяспекі і парадку, і Мікіта Хрушчоў, які павінен быў засяродзіцца на партыйна-бюракратычнай працы.



Георгій Малянкоў



Лаўрэнцій Берыя



Мікіта Хрушчоў

Іншыя кіраўнікі Прэзідыума ЦК Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (КПСС – такую назву партыя насіла з 1952 г.), а найперш Лазар Кагановіч, Вячаслаў Молатаў, Клімент Варашылаў, Анастас Мікаян, а таксама Мікалай Булганін (які стаў міністрам абароны), больш за ўсё баяліся Берыі, пасля яго – Малянкова, таму да пачатку восені на першыя пазіцыі ў дзяржаве выйшаў Хрушчоў, якога і абралі першым сакратаром ЦК. З ініцыятывы апошняга яшчэ 26 чэрвеня проста на пасяджэнні Прэзідыума ЦК маршал Жукаў разам з некалькімі генераламі арыштаваў Берыю. Той быў неўзабаве аб'яўлены англійскім шпіёнам, асуджаны (але зусім не за ўчыненыя ім шматлікія злачынствы) і расстраляны 23 снежня таго самага года.

Георгій Малянкоў, узначаліўшы ўрад, у жніўні 1953 г. выказаўся за змены ў палітыцы інвестыцый на карысць лёгкай і харчовай прамысловасці, каб нармалізаваць рынак самых неабходных насельніцтву тавараў. Ён таксама выказаў думку, што пры наяўнасці вадародных і атамных бомбаў новая сусветная вайна непазбежна прывядзе да гібелі ўсёй цывілізацыі. Такія выказванні не маглі падабацца партыйна-савецкаму кіраўніцтву, дзе дамінавала ваенна-прамысловае лобі. Гэта прадвызначыла лёс Малянкова як кіраўніка ўрада: у лютым 1955 г. яго на гэтай пасадзе замяніў Мікалай Булганін. Трэба адзначыць, што ўрад да гэтага часу пачаў ажыццяўляць палітыку асцярожнай дэсталінізацыі: з высылак пачалі вяртацца ацалелыя партыйныя і савецкія функцыянеры, а крыху пазней – і іншыя нядаўнія

вязні. Палітычныя абвінавачванні былі знятыя з тых народаў, якія некалі былі дэпартаваны са сваіх гістарычных тэрыторый. Толькі па-ранейшаму не дазволілі вярнуцца на Паволжа мясцовым немцам, у перададзены Украінскай ССР Крым – крымскім татарам, а ў Грузію – туркам-месхецінцам.

XX з'езд КПСС (люты 1956 г.) стаў падзеяй, якая атрымала розгалас і па-за межамі савецкай імперыі. У першую чаргу гэта адбылося таму, што на закрытым пасяджэнні з'езда быў зачытаны даклад Хрушчова «Аб культе асобы і яго наступствах», у якім упершыню называліся некаторыя злачынствы сталінізму. Галоўная адказнасць за іх ускладалася на Сталіна і яго памагатых Яжова і Берыю; пра ўдзел свой ды іншых членаў партыйнага кіраўніцтва ў тэрорры Хрушчоў не сказаў ні слова. Не было пастаўлена пытанне аб адказнасці створанай кампартыяй сацыяльна-палітычнай сістэмы за тое, што адбылося. Акрамя таго, поўны тэкст хрушчоўскага дакладу ўпершыню быў апублікаваны толькі ў 1989 г., у часы перабудовы.

Тым не менш агучаны даклад дазволіў істотным чынам паскорыць працэс рэабілітацыі бязвінна асуджаных вязняў ГУЛАГу. Сотні тысяч людзей выйшлі на свабоду. Гэты працэс спрыяў распаўсюджванню крытычных думак наконт самога найвышэйшага кіраўніцтва СССР, асабліва сярод творчай і навуковай інтэлігенцыі ды моладзі. Захісталіся і пачалі знікаць з палітычнай арэны прасталінскія рэжымы ў «краінах народнай дэмакратыі». Увосень 1956 г. справа дайшла да адкрытых выступленняў рабочых і інтэлігенцыі ў Польшчы і Венгрыі. У Будапешце адбылося сапраўднае народнае паўстанне, якое было задушана савецкімі войскамі на загад Хрушчова, пры чынным удзеле будучага кіраўніка КГБ (руская абрэвіятура Камітэта дзяржбяспекі, што прыйшоў на змену ранейшаму МГБ) і КПСС Юрыя Андропава.

Хрушчоўскія антысталінскія выпады былі з незадавальненнем успрынятыя даўнімі сталінскімі паплечнікамі з партыйнага кіраўніцтва Расіі. У чэрвені 1957 г. група, якую ўзначалілі Молатаў, Кагановіч, Малянкоў, выступіла супраць Хрушчова і паспрабавала зняць яго з пасады кіраўніка партыі. Але, апіраючыся на падтрымку тагачаснага міністра абароны Жукава і верных яму вайсковых злучэнняў, Хрушчову ўдалося перамагчы. Удзельнікі «антыпар-

тыйнай групы» страцілі свае высокія пасады і ў большасці былі адпраўлены на гаспадарчую працу. Мікалай Булганін, які не выступіў на баку Хрушчова і Жукава, неўзабаве страціў пост старшыні Саўміна, які ў сакавіку 1958 г. заняў сам Хрушчоў. Зрэшты, на ўсялякі выпадак апошні, выкарыстаўшы фармальную нагоду абвінаваціць Жукава ў «банапартызме», неўзабаве дамогся таксама зняцця таго з пасады міністра абароны.

За гэты час савецкая эканоміка вялікіх поспехаў не дасягнула. Асаблівая ўвага хрушчоўскага кіраўніцтва была звернутая на сельскую гаспадарку. Але замест таго, каб ужываць выпрабаваныя ў свеце спосабы павышэння прадукцыйнасці адпаведнай вытворчасці, кіраўніцтва СССР вырашыла і далей ісці экстэнсіўным шляхам. Пачалася грандыёзная кампанія па *засваенні цалінных земляў*, найперш на тэрыторыі Казахскай ССР і ў Заходняй Сібіры. Велізарныя фінансавыя ўліванні па першым часе збольшага кампенсаваліся адносна высокімі ўраджаямі на новых угоддзях, але пазней усё большую і большую праблему пачалі ствараць так званыя чорныя буры, якія нішчылі пасевы. Спроба Мікіты Хрушчова запазычыць у ЗША досвед пашырэння пасеваў кукурузы, як найважнейшай злакавай і тэхнічнай культуры, без уліку кліматычных і сацыяльна-эканамічных умоў савецкіх рэспублік пацярпела няўдачу. У 1959 –1964 гг. сярэднегадавая вытворчасць збожжа на душу насельніцтва ў СССР рэдка калі перавышала ўзровень царскай Расіі паводле стану на 1913 г. Ад пачатку 1960-х гг. СССР зноў пачаў закупляць збожжа за мяжою.

У 1958 г. калгасы і саўгасы атрымалі ў сваё распараджэнне тэхніку, якая да таго належала *машынна-трактарным станцыям* (МТС), але чаканага эфекту гэта не дало: самі гаспадаркі не спраўляліся з аплатай і рамонтам тэхнікі, якасць якой была наогул невысокай.

У выніку правалаў сельскагаспадарчай палітыкі адмененыя пасля смерці Сталіна абавязковыя пастаўкі прадуктаў з сялянскіх падвор'яў паступова пачалі кампенсаваць праз уразанне зямельных участкаў, рознага кшталту забароны трымаць асабістую скаціну. Пры гэтым прапаганда раз за разам паўтарала высунуты Мікітам Хрушчовым лозунг «Дагонім і перагонім Амерыку!»

Па-ранейшаму жыхары вёскі не мелі пашпартоў і колькі-небудзь значных пенсійных выплат. У канчатковым выніку сельская гаспа-

дарка савецкай імперыі апынулася ў сур'ёзным крызісе: у 1962 г. рознічныя цэны на мяса былі падвышаныя на 3 %, а на масла – ажно на чвэрць. Гэта выклікала незадавальненне людзей, якое найбольш яскрава выявілася ў шматтысячнай дэманстрацыі рабочых 1 і 2 чэрвеня таго самага года ў *Навачаркаску* (Растоўская вобласць), расстралянай падцягнутымі туды войскамі і міліцыяй (загінула не менш за 26 чалавек, сярод іх некалькі дзяцей).




«Дагонім Амерыку!»
Прапагандысцкі плакат пачатку 1960-х гг.

У 1957 г. з ініцыятывы Хрушчова пачалася *рэформа кіравання прамысловасцю*. На тэрыторыі РСФСР былі створаны 67 саветаў народнай гаспадаркі (*саўнаргасаў*), якія павінны былі замяніць сабой галіновае кіраванне вытворчасцю. Напачатку рэформа давала пэўныя пазітыўныя вынікі, але па меры росту мясцовай бюракратыі, якая падмяніла сабою ранейшыя міністэрствы, сітуацыя пачала зноў пагаршацца. Па-ранейшаму ў развіцці эканомікі выразны акцэнт рабіўся на цяжкую прамысловасць, аб'ём якой складаў 3/4 ад агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці ў СССР.

Лёгкая прамысловасць у савецкіх рэспубліках надалей хранічна адставала ад цяжкай. Меліся праблемы і ў іншых галінах народнай гаспадаркі. З гэтай прычыны партыйным кіраўнікам давялося адмовіцца ад раней запланаваных паказчыкаў 6-й пяцігодкі (1956–1960) і прыняць цяпер ужо *сямігадовы план* (1959–1965), які, зрэшты, таксама да канца выкананы так і не быў.

І ўсё-такі першыя некалькі гадоў пасля смерці Сталіна запомніліся шмат каму з грамадзян савецкіх рэспублік шматлікімі ўрадавымі мерамі па паляпшэнні ўмоў жыцця насельніцтва, галоўным чынам гарадскога. 25 красавіка 1956 г. быў адменены антырабочы закон 1940 года, які прымацоўваў працоўных да іх прадпрыемстваў. Цяпер працоўныя маглі мяняць месца працы, паведаміўшы пра гэта адміні-

страцыі за два тыдні. Мінімальная заработная плата ў дзяржаўным сектары была падвышана прыкладна на 35 % і вызвалена ад падатку. Памер пенсій амаль падвоіўся; пенсійны ўзрост быў зніжаны да 60 гадоў для мужчын і 55 гадоў для жанчын. Калгаснікі ж надалей заставаліся абдзеленымі: толькі ў 1964 г. яны атрымалі права на пенсію, а пенсійны ўзрост надыходзіў для іх на пяць гадоў пазней, чым для іншых катэгорый працаўнікоў. Працягласць працоўнага тыдня была скарочана з 48 да 46 гадзін (для металургаў – 42 гадзіны, для шахцёраў і падлеткаў – 36). Водпуск па цяжарнасці і родах (скарочаны пры Сталіне да 70 дзён) зноў стаў 112-дзённым. Урад абавязаўся больш не прымушаць грамадзян да падпіскі на абавязковыя дзяржаўныя пазыкі (па якіх да гэтага забіралася каля 6 % гадавых заробкаў людзей), але на 20 гадоў замарозіў выплату працэнтаў па папярэдніх пазыках. Урэшце, досыць актыўна пачало паскарацца будаўніцтва жылля. Вельмі выгаднымі ўмовамі дзяржава заахвочвала будаваць кааператыўныя кватэры. За дзесяць гадоў, з 1955 па 1964 г., агульны гарадскі фонд жытла павялічыўся на 80 %, хоць істотным чынам жыллёвая праблема так і не была вырашана аж да самага канца існавання савецкай імперыі. Як, зрэшты, і харчовая праблема.

Няшмат сапраўдных поспехаў хрушчоўскае кіраўніцтва мела ў галіне *знешняй палітыкі*. Яна апіралася, з аднаго боку, на паказную зацікаўленасць савецкага кіраўніцтва ў наладжванні адносінаў з самымі markdown рознымі краінамі свету (візіты савецкіх кіраўнікоў у ЗША, Югаславію, Кітай), а з іншага боку, па-ранейшаму арыентавалася на прасоўванне камуністычнай утопіі ў свеце, прычым – з улікам дасягненняў савецкіх ядзершчыкаў – апошняе падмацоўвала малапрафесійным, а часам і прымітыўным ядзерным шантажом. Раней ужо казалася пра крывавае задушэнне народнага паўстання ў Венгрыі ў 1956 г. Перад гэтым, у 1955 г., Савецкі Саюз стварыў разам са сваімі еўрапейскімі краінамі-сатэлітамі ваенна-палітычны блок – *Арганізацыю краін Варшаўскай дамовы*, з дапамогай якога ён займеў дадатковыя сродкі ўплыву на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў тых краінах. У наступныя гады крамлёўскія кіраўнікі зрабілі ўсё дзеля таго, каб сапсаваць адносіны не толькі з Захадам (узвядзенне Берлінскага муру ў 1961 г., размяшчэнне савецкіх ракет на Кубе, паблізу тэрыторыі ЗША, і выкліканы гэтым Карыбскі крызіс 1962 г.), але і з некаторымі краінамі

народнай дэмакратыі – такімі як Кітай, Албанія, Румынія. Нягледзячы на тое што найбуйнейшым дзяржавам свету ўдалося дамовіцца аб падпісанні вельмі важнай Дамовы аб забароне ядзерных выпрабаванняў у атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой (*Маскоўская дамова* за 5 жніўня 1963 г.), мір у свеце падчас кіравання Хрушчовым савецкай кампартыяй і ўрадам больш трывалым, відавочна, не стаў.

У кастрычніку 1961 г. на XXII з'ездзе КПСС была прынята чарговая праграма, у якой савецкім людзям абяцалі, што да 1980 года будзе «ў асноўным пабудавана камуністычнае грамадства». Мікіта Хрушчоў таксама працягнуў тэму агучвання самых жахлівых сталінскіх злачынстваў. Дэлегаты з'езда выказаліся за вынас цела Сталіна з маўзалея на маскоўскай Краснай плошчы, дзе яно з 1953 г. ляжала побач з целам Леніна.

Аднак, каб надалей трымацца ва ўладзе, аднаго антысталінскага пафасу ўжо, відавочна, не хапала. Незадаволенасць хрушчоўскімі дзеяннямі ў розных сферах жыцця мацнела і мацнела.

***11.23. Навука і культура Савецкай Расіі ў 1953–1964 гг.*** Перапыненне найбольш адыёзных праяў сталінскага тэрору і паступовая дэсталінізацыя духоўнага жыцця Расіі стварылі адносна спрыяльныя ўмовы для ўздыму навукі і культуры ў краіне. Найбольшыя поспехі, безумоўна, былі дасягнуты ў засваенні космасу – найперш дзякуючы таленту канструктараў Сяргея Каралёва і Валянціна Глушко. 4 кастрычніка 1957 г. быў запушчаны *першы штучны спадарожнік*



Першы касманаўт Юрый Гагарын і канструктар касмічных караблёў Сяргей Каралёў

*Зямлі*, а 12 красавіка 1961 г. старшы лейтэнант ваенна-паветраных сіл Юрый Гагарын здзейсніў *першы палёт чалавека* ў космас.

У 1959 г. першыя здымкі паверхні Месяца з космасу атрымала савецкая станцыя «Луна-3». У 1963 г. здзейсніла палёт на арбіту Зямлі першая ў свеце жанчына-касманаўт Валянціна Церашкова, беларуска з паходжання.

Таксама ў некаторых іншых важных галінах навукі і тэхнікі Савецкаму Саюзу ўдалося выйсці на перадавыя па тым часе пазіцыі ў свеце. У горадзе Обнінску (Калужская вобласць) у 1954 г. была ўведзена ў эксплуатацыю першая ў свеце *атамная электрастанцыя*. Да чарговых бясспрэчных дасягненняў расійскай навукі і тэхнікі гэтага часу належаць: стварэнне Мікалаем Басавым і Аляксандрам Прохаравым першага ў свеце лазера (1954), увядзенне ў эксплуатацыю першага ў свеце рэактыўнага пасажырскага самалёта Ту-104 (канструктарскае бюро Тупалева, 1955), пабудова першага ў свеце атамнага ледакола (1957), стварэнне Віталіем Гінзбургам і Львом Пітаеўскім тэорыі звышплыўкасці (1958), выпрабаванне самай магутнай у гісторыі тэрмаядзернай бомбы, створанай пад кіраўніцтвам Ігара Курчатава (1961).

Пэўныя пазітыўныя зрухі ў другой палове 1950-х гг. мелі месца ў савецкай сістэме адукацыі. У 1958 г. была ўведзеная *абавязковая васьмігадовая адукацыя*, за два гады перад гэтым скасаваная плата за навучанне ў старэйшых класах і ВНУ, што існавала з 1940 г. Істотна павялічылася колькасць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, хоць якасць гэтай адукацыі па-ранейшаму рэдка калі адпавядала сусветным стандартам. Імкненне ж да татальнай уніфікацыі адукацыйнай сістэмы прыводзіла да пагаршэння сітуацыі з вывучэннем моў, гісторыі і культуры нярускіх народаў Расіі.

Перыяд хрушчоўскага кіравання быў адзначаны далейшым наступам на рэлігійнае жыццё ў краіне. Кіраўнік кампартыі і ўрада публічна паабяцаў калі не ў сярэдзіне, то да канца 60-х гадоў «паказаць апошняга папа ў тэлевізары». У гэты час па ўсёй савецкай імперыі пракацілася чарговая хваля закрыцця храмаў розных канфесій. Пераследаваліся духоўныя дзеячы, якія крытычна ставіліся да падобных захадаў улады. Асаблівы ўціск зазналі *евангельскія хрысціяне-баптысты*, якія дзеля абароны сваёй веры стварылі не-

легальны «Савет евангельскіх хрысціян-баптыстаў»; яго найбольш актыўныя чальцы арыштоўваліся, штрафаваліся, зазнавалі іншыя формы праследу за свае перакананні. Функцыю колішняга Саюза ваяўнічых бязбожнікаў у пэўнай ступені пераняло афіцыйнае савецкае таварыства «Веды», якое займалася актыўнай атэістычнай прапагандай. Дысцыпліна «Асновы навуковага атэізму» была абавязковай дысцыплінай у ВНУ Савецкага Саюза.

Спыненне адкрытага сталінскага тэрору, даклад Хрушчова на XX з'ездзе КПСС, спробы ўладаў дэмакратызаваць пэўныя сегменты грамадскага жыцця адразу ж пазітыўна адбіліся на стане і якасці расійскай *літаратуры і мастацтва.* Літаратура пачала адыгрываць вельмі значную ролю. Невялікая аповесць Ільі Эрэнбурга «Адліга» (1954) дала назву цэлай эпосе ў духоўным жыцці Расіі. Праз два месяцы пасля XX з'езда скончыў жыццё самагубствам першы сакратар Саюза пісьменнікаў СССР Аляксандр Фадзееў, які пры Сталіне даваў фармальную згоду на арышты і забойствы не аднаго пісьменніка ў СССР.

У друку з'явіліся такія вострыя творы, як раманы рускіх празаікаў Уладзіміра Дудзінцава «Не хлебам адзіным» і Веры Пановай «Поры года. З хронік горада Энска». Менш вядомай, але таксама адметнай з'явай стала публікацыя сатырычнага рамана мардоўскага пісьменніка Васілія Каламасава «Лаўгінаў». Антысталінскае крыло творцаў гуртавалася вакол часопісаў «Новый мир» (галоўны рэдактар Аляксандр Твардоўскі) і «Юность», які ўзначальваў Валянцін Катаеў, пазней – Барыс Палявой. Адкрытыя і прыхаваныя сталіністы мелі ў сваім распараджэнні часопісы «Октябрь» (Усевалад Кочатаў), «Нева» (Сяргей Варонін).

Велізарныя аўдыторыі ўжо пры канцы 1950-х гг. пачалі збіраць публічныя выступы паэтаў Яўгенія Еўтушэнкі, Бэлы Ахмадулінай, Андрэя Вазнясенскага, Роберта Раждзественскага, паэтаў-бардаў Булата Акуджавы, Аляксандра Галіча.

Пры гэтым асабіста Хрушчоў і яго партапарат імкнуліся сачыць за любымі рухамі, якія маглі б неяк паставіць пад сумнеў дамінаванне кампартыі. Пасля таго як, не маючы магчымасці надрукаваць у СССР раман «Доктар Жывага», пісьменнік старой школы Барыс Пастарнак здолеў апублікаваць яго за мяжой і ў 1958 г. атрымаў Нобелеўскую



Рускі паэт
Яўгеній Еўтушэнка



Паэт-бард Булат Акуджава

прэмію ў галіне літаратуры, пачалася кампанія ганьбавання гэтага творцы, цалкам у сталінскім духу. Пастарнак быў выключаны з саюза пісьменнікаў, уведзены ў стан дэпрэсіі і неўзабаве памёр. Што праўда, губляючы падтрымку інтэлігенцыі, у 1962 г. Хрушчоў усё-такі даў дазвол на публікацыю ў часопісе «Новый мир» антылагернай аповесці былога вязня ГУЛАГу таленавітага празаіка Аляксандра Салжаніцына «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» (зрэшты, твор не абышоўся без цэнзуравання). Пры канцы таго самага года адбылося сумнавядомае наведванне Хрушчовым выставы маладых маскоўскіх мастакоў і скульптараў у маскоўскім Манежы, якое скончылася пагромам усёй выставы.

Літаратурнае жыццё названай эпохі, аднак, не канцэнтравалася выключна ў Маскве і Ленінградзе. У іншых аўтаномных утварэннях РСФСР з'явіліся такія таленавітыя творцы, як аварскі паэт Расул Гамзатаў, башкірскі паэт Назар Наджмі, башкірскі празаік Мустай Карым, празаікі з Комі Якаў Рочаў, Васілій Юхнін, комі-ненецкі пісьменнік Іван Істомін, нанайскі пісьменнік Рыгор Ходжэр, ненецкі паэт Леанід Лапцуй, татарскі пісьменнік Ахмет Файзі, удмурцкі празаік Міхаіл Пятроў, хакаскі празаік Мікалай Дамажакаў, чувашскі і рускі паэт Генадзій Айгі.

Вярнуліся разам са сваімі народамі з месцаў сталінскіх дэпар-

тацый (дзе яны мелі поўную забарону на творчасць і на карыстанне роднай мовай) і ўключыліся ў літаратурны працэс таленавітыя творцы: калмыцкія пісьменнікі Давыд Кугульцінаў, Аляксей Бадмаеў, Канстанцін Эрэнджэнаў, балкарскія паэты Кайсын Кулієў, Танзіля Зумакулава, Керым Атараў, інгушскія творцы Ахмет Бокаў, Ахмет Вядзіжаў, Багаудзін Зязікаў, карачаеўская пісьменніца Халімат Байрамукава, крымска-татарскі літаратар Абдула Дэрменджы, кумыкскія драматургі і празаікі Магамед-Султан Ях'яеў, Амір Курбанаў, чачэнскія пісьменнікі Абузай Айдаміраў, Магамед Мусаеў, Хамзат Саракаеў, якуцкі празаік і драматург Суарун Амалоон, расійска-нямецкія літаратары Фрыдрых Больгер, Барыс Брайнін (Зэп Эстэрайхер), Ёган Варкентын.


Аварскі паэт з Дагестана Расул Гамзатаў

У расійскім жывапісе гэтай эпохі побач з раней згаданымі Фаворскім, Герасімавым, Корыным, Пластавым актыўна працуюць рускія мастакі Мікалай Рамадзін, Георгій Ніскі, Сямён Чуйкоў, Барыс Нямснскі, Мікалай Андронаў, скульптары Міхаіл Анікушын, Аляксандр Кібальнікаў, ненецкі мастак Іван Істомін, татарскі жывапісец і скульптар Бакі Урманчэ, татарскі мастак Кандрат Максімаў, хакаскі скульптар Ірына Карачакава-Карціна, чувашскі скульптар і графік Герасім Пілеш ды іншыя.

Новая з'ява гэтага часу – узнікненне «другога мастацтва». У 1954 г. у Маскве пачынае працаваць Студыя эксперыментальнага мастацтва пад кіраўніцтвам Элія Бялюціна. Пры канцы 50-х гг. вакол Яўгенія, Валянціны, Льва Крапіўніцкіх, Вольгі Патапавай, Аскара Рабіна ўзнікае так званая «Ліянозаўская група», у якую ўваходзілі рускія мастакі Уладзімір Нямухін, Лідзія Масцяркова, Барыс Свешнікаў, Аскар Рабін, маладыя паэты Генрых Сапгір, Усевалад Някрасаў ды іншыя.

Вядомасць набываюць працы рускіх архітэктараў Льва Рудне-

Крыніца: in-art.ru




Аскар Рабін. Памыйка № 8, 1958 г.

ва, Міхаіла Пасохіна. У 1961–1962 гг. у Маскве ўзводзіцца новы арыгінальны будынак Барадзінскай панарамы.

Адным з вядучых тэатраў Расіі ў гэты час зноў становіцца Ленінградскі Вялікі драматычны тэатр на чале з рэжысёрам Георгіем Таўстаногавым. Цікавыя рэжысёрскія працы прапануюць таксама рускія рэжысёры Алег Яфрэмаў, Анатолій Эфрас, іх татарскі калега Марсель Салімжанаў. Знакамітымі робяцца імёны такіх рускіх актораў, як Эліна Быстрыцкая, Кірыл Лаўроў, Сяргей Юрскі, Аляксей Баталаў, беларус з паходжання Інакенцій Смактуноўскі ды іншыя.

У 1958 г. першы і пакуль што апошні раз у гісторыі «Залатую пальмавую галінку» Міжнароднага кінафестывалю ў Канах атрымаў расійскі фільм «Ляцяць жураўлі» грузінскага рэжысёра Міхаіла Калатозава паводле сцэнара рускага драматурга Віктара Бокава. З наступнага года прэстыжны міжнародны кінафестываль пачаў праводзіцца таксама ў Маскве. У 1962 г. стужка тады

© Dennis Jarvis



Будынак Барадзінскай панарамы ў Маскве (архітэктары Аляксандр Карабельнікаў і Сяргей Кучанаў)

Кадр з фільма
Міхаіла Калатозава
«Ляцяць жураўлі».
У галоўнай ролі –
Аляксей Баталаў



маладога кінарэжысёра Аляксандра Таркоўскага «Іванава дзяцінства» (якая з вялікімі праблемамі прайшла праз партыйную цэнзуру) здабыла галоўную ўзнагароду Венецыянскага кінафестывалю.

У музычным мастацтве Расіі ў гэты час поспехам карысталіся творы рускіх кампазітараў Георгія Свірыдава, Мікалая Карэтнікава, рэабілітаванага па справе «ўрачоў-забойцаў» габрэйскага кампазітара Майсея Вайнберга, рускага дырыжора Яўгенія Мравінскага, карэльскіх кампазітараў Гельмера-Райнера Сінісала, Карла Раўціа, марыйскага кампазітара Аляксея Іскандарава, татарскіх кампазітараў Загіда Хабібуліна, Латыфа Хамідзі, Энвера Бакірава, Мансура Музафарава.

Сусветную вядомасць набывае творчасць рускіх оперных спевакоў Ірыны Архіпавай, Галіны Вішнеўскай, Валянціны Ляўко, Івана Пятрова, Аляксандра Вядзернікава, татарскага спевака Фахры Насрэтдзінава, габрэйска-рускіх балерыны Маі Плісецкай, піяніста Святаслава Рыхтэра, віртуоза-віяланчэліста Мсціслава Растраповіча. Пры канцы 1950-х гг. пачаў сваю кар'еру татарскі танцор балета Рудольф Нурэеў (Нурыеў), які ў 1961 г. не вярнуўся з гастроляў у Англіі і пазней зрабіў у эміграцыі бліскучую кар'еру.

***11.24. Хрушчоўская «адліга» і брэжнеўская «стагнацыя». Эканамічныя крызісы і чарговыя спробы рэформаў.*** Сапраўднае значэнне дэсталінізацыі Расіі глыбока разумела толькі адукаваная частка тагачаснага расійскага грамадства, але Мікіта Хрушчоў і ў дачыненні да яе не-не ды ўжываў гвалтоўныя, а часам і проста хамскія метады. Ён, амаль як і Сталін, імкнуўся павучаць пісьменнікаў, пра што ім пісаць, мастакоў – што ім маляваць або ляпіць, кампазітараў – якую

музыку ім ствараць. Вучоныя-гуманітарыі таксама адчувалі пільную ўвагу да ідэалагічнай выверанасці сваіх прац.

Чыноўнікі, стаміўшыся ад палітычных хістанняў то ў адзін, то ў іншы бок, рабіліся ўсё больш і больш незадаволенымі. Генералы і вышэйшыя афіцэры не маглі дараваць Хрушчову значнага скарачэння ўзброеных сіл падчас яго кіравання. На парадку дня паўстала пытанне адстаўкі кіраўніка партыі і ўрада. У кастрычніку 1964 г. адбыўся Пленум ЦК КПСС, на якім Хрушчоў быў пазбаўлены ўсіх сваіх пасад. Новым першым (пазней – генеральным) сакратаром ЦК КПСС стаў выхадзец з украінскай партнаменклатуры Леанід Брэжнеў, а на чале ўрада – Аляксей Касыгін, які да гэтага паспеў пакіраваць некалькімі міністэрствамі, пабыць старшынёй Саўнаркама і Саўміна РСФСР і папрацаваць намеснікам (у тым ліку першым) кіраўніка савецкага ўрада пры Маленкове, Булганіне і Хрушчове.

Забяспечваць ідэалагічную «правільнасць» партыйнай лініі даручылі асобе, якая паспела зрабіць кар'еру ў гэтай сферы яшчэ пры Сталіне, – сакратару ЦК па ідэалогіі Міхаілу Суславу. На доўгі час ён становіцца трэцім паводле ўплыву чалавекам у савецкай імперыі.



Леанід Брэжнеў і Аляксей Касыгін на трыбуне Маўзалея Леніна. 9 траўня 1965 г.

Характэрнай рысай грамадска-палітычнага жыцця сталі прапаганда ідэі стабільнасці ды стварэнне паказнога дабрабыту і ўдаванай еднасці «новай гістарычнай супольнасці – савецкага народа». Бясконцыя «ўдарныя працоўныя тыдні», «камсамольскія ініцыятывы», «юбілейныя вахты», «тыдні і месячнікі дружбы і культуры» ішлі адно за адным, заканчваліся рознымі святкаваннямі, раздачай узнагарод. Сам Брэжнеў да канца жыцця паспеў атрымаць пяць савецкіх зорак героя, безліч розных ордэнаў і прэмій.

Пры гэтым унутры савецкага кіраўніцтва не спынялася «паддыванная» барацьба: месцы як найбліжэй да ўладнага стырна імкнуліся













Прапагандысцкія плакаты брэжнеўскага часу

заняць то прадстаўнікі КГБ і ваенна-прамысловага комплексу, то выхадцы з нацыянальных рэспубліканскіх эліт, то рознага кшталту выскачкі і прайдзісветы.

Аднак у самыя першыя гады пасля адхілення ад улады Хрушчова ўрад Аляксея Касыгіна наважыўся правесці пэўныя рэформы, асновы якіх былі распрацаваныя харкаўскім вучоным-эканамістам Яўсеем Ліберманам. У прыватнасці, апошні прапанаваў зрабіць крытэрам ацэнкі дзейнасці прадпрыемства яго рэнтабельнасць, гэта значыць прыбытковасць. Трэба было ўлічваць дагэтуль невядомыя савецкай эканоміцы прынцыпы – попыт і прапанову, выкарыстоўва-



Яўсей Ліберман,
бацька «касыгінскай»
эканамічнай рэформы

ючы матэрыяльнае стымуляванне работнікаў і прадпрыемстваў у цэлым. Неабходнай умовай ажыццяўлення гэтай рэформы было даць прадпрыемствам шырокую аўтаномію, вызваліць іх ад дробязнай апекі з боку планавых органаў і дзяржкантролю. У сельскай гаспадарцы неабходна было істотна павялічыць капіталаўкладанні (а па сутнасці, пачаць іх рабіць), значна падвысіць закупачныя кошты прадукцыі, увесці льготную аплату звышпланавага ўраджаю, знізіць цэны на запчасткі і тэхніку, зменшыць стаўкі падаходнага падатку на сялян. Акрамя таго, сяляне нарэшце вызваляліся ад савецкага прыгону і маглі атрымаць пашпарты.

Прыняты ў 1966 г. восьмы пяцігадовы план грунтаваўся, наколькі гэта было магчымым ва ўмовах панавання партыйна-бюракратычнай сістэмы, на вышэйзгаданых прынцыпах. Афіцыйныя крыніцы сведчаць, што гэта дало вельмі значныя вынікі: на працягу 1966–1970 гг. сярэднегадавыя тэмпы росту нацыянальнага даходу СССР складалі 6,1 %.

Адразу зробім агаворку: савецкая статыстыка была вельмі своеасаблівай. У ліпені 2013 г. намеснік дырэктара Цэнтра развіцця Вышэйшай школы эканомікі Расійскай Федэрацыі Сяргей Смірноў абнародаваў праведзеныя ў яго ўстанове даследаванні працы Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення (ЦСУ) у савецкі час. Паводле іх, маштабы прыпісак у савецкай статыстыцы проста агаломшваюць (пра гэта сведчаць і аўтары ўніверсітэцкага падручніка па крыніцазнаўстве гісторыі Расіі, выдадзенага ў 1998 г., прафесар Ігар Данілеўскі ды інш.).

Паводле звестак ЦСУ, у 1990 г. прамысловасць СССР у параўнанні

з 1940 г. вырасла прыкладна ў 30 разоў, а ўсярэднены альтэрнатыўны індэкс вырас толькі ў 10 разоў. Атрымоўваецца, што да кожнай *выробленай умоўнай адзінкі прадукцыі* савецкая статыстыка, ігнаруючы існаванне інфляцыі, «дамалёўвала» *яшчэ дзве*!

Акрамя таго, згодна са звесткамі ЦСУ, за ўвесь пасляваенны перыяд тэмпы росту прамысловасці РСФСР у 93 % выпадкаў былі ніжэйшымі за тэмпы росту савецкай прамысловасці. Гэта дае ўсе падставы меркаваць, наколькі фальшывай была тэза, што свядома распаўсюджвалася і распаўсюджваецца рознага кшталту расійскімі шавіністамі і лжэпатрыётамі, нібыта Расія карміла саюзныя рэспублікі. Усё было якраз наадварот!

Афіцыйны паказчык росту прамысловасці на 3–4 % для ўсяго Савецкага Саюза – праз недаўлічванне савецкім статыстычным ведамствам тэмпаў рэальнай інфляцыі – фактычна быў раўназначны стагнацыі.

Калі, аднак, вярнуцца да паказчыкаў восьмай пяцігодкі, нельга ігнараваць той факт, што падчас яе на тэрыторыі РСФСР, напрыклад, былі ўведзены ў эксплуатацыю (няхай сабе і з недапрацоўкамі) такія значныя аб’екты, як Брацкая, Краснаярская і Саратаўская гідраэлектрастанцыі, першая чарга Волжскага аўтамабільнага завода ў Тальяці (пабудаваная сумесна з італьянскімі спецыялістамі), Заходне-Сібірскі металургічны камбінат, трыкатажныя фабрыкі ў Валгаградзе і Ленінагорску, абутковыя фабрыкі ў Валгаградзе і Чарапаўцы.

© Здымак П. Гуранчука



Брацкая ГЭС,
2008 г.

Хранічна адсталай галіной савецкай эканомікі была сельская гаспадарка. Адмовіўшыся ад чароўных сродкаў, прапанаваных Хрушчовым сельскай гаспадарцы, – ад кукурузы, далейшага пашырэння аб'ёмаў сяўбы ў засушлівых раёнах і г. д., новае кіраўніцтва звярнулася да іншых чароўных сродкаў, перш за ўсё да капіталаўкладанняў і хіміі. Пасля неўраджаю 1963 г., які быў пастаўлены ў віну Хрушчову, былі сур'ёзныя няўроды 1965, 1967, 1972 гг. і самы драматычны – у 1975 г. Каб прадухіліць неўраджаі, у сельскую гаспадарку рабілі зусім не малыя інвестыцыі: у 1973 г. доля капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку складала 26,5 % у параўнанні з 23 % пры канцы 60-х гг.; у 1975 г. гэтая доля наогул дасягнула 27 %. Агулам жа за перыяд з 1966 па 1980 г. у сельскую гаспадарку было накіравана каля 400 млрд тагачасных савецкіх рублёў. Інвестыцыі пайшлі збольшага на будаўніцтва хімічных прадпрыемстваў: у выніку, пачынаючы з 1970 г., Савецкі Саюз апярэдзіў ЗША па выкарыстанні ўгнаенняў. Значная частка ўжо выробленай сельскагаспадарчай прадукцыі гублялася падчас яе транспартавання, згнівала ў малападрыхтаваных сховішчах. Да таго ж уведзеная падчас касыгінскай рэформы гарантаваная аплата працы калгаснікаў у расійскіх умовах нараджала спажывецкія настроі, незацікаўленасць у павышэнні прадукцыйнасці сваёй працы.

Крызіс сельскай гаспадаркі фактычна не меў перспектыў быць пераадоленым. Становішча ў сельскай гаспадарцы адлюстроўвала агульную сітуацыю ў эканоміцы СССР, заснаванай на некампетэнтным умяшанні ўладаў у эканамічныя працэсы, на валюнтарызме, прыпісках і г. д.

У гады дзявятай пяцігодкі (1971–1975) рост савецкай эканомікі істотна запаволіўся нават на паперы. Яшчэ горшая сітуацыя склалася ў другой палове 1970-х гг. Савецкі ўрад спрабаваў падтрымліваць бачнасць дабрабыту людзей за кошт павелічэння распродажу прыродных рэсурсаў. Спрыяльныя ўмовы для гэтага ўтварыліся ў выніку засваення нафтавых і газавых радовішчаў Заходняй Сібіры, а таксама неаднаразовага скачка сусветных коштаў на энерганосьбіты ў сярэдзіне 70-х гг. Паводле ацэнак эканамістаў, СССР толькі ў 1970-х гг. атрымаў 180 млрд нафтадолараў, якія былі, аднак, выдаткаваныя не на вырашэнне вострых структурных праблем савецкай эканомікі, а на вайсковыя мэты, закупку харчавання, тавараў маса-

вага попыту ды на іншыя бягучыя патрэбы. Толькі закупкі збожжа за мяжою за 70-я гады выраслі больш чым у 10 разоў (1970 г. – 2,2 млн т, 1980 г. – 27,8 млн т, 1985 г. – 44,2 млн т). Вынік быў, тым не менш, слабы. Стандартны набор тавараў у харчовых крамах РСФСР (паза Масквой, Ленінградам і некаторымі іншымі буйнымі гарадамі) складаўся з аднаго-двух гатункаў чорнага і белага хлеба, запалак, воцату, солі, двух-трох відаў нізкагатунковых крупаў і макароны, алею або камбінаванага тлушчу, рыбных кансерваў (звычайна кілек і часціку), гарэлкі, пладова-ягаднага віна. Малако, смятана, сыр і масла траплялі ў крамы з перабоямі; пра каўбасы (акрамя крывянай і ліവернай) гаворкі нават не ішло.

Да сярэдзіны 1980-х гг. тэмпы эканамічнага росту Расіі няўхільна зніжаліся. Камуністычныя кіраўнікі ганарыліся велізарнымі аб'ёмамі здабычы нафты і вугалю (часта ігнаруючы праблемы навакольнага асяроддзя), у той час як свет пачаў актыўна пераходзіць на энергаашчадныя тэхналогіі, адмаўляўся ад доменнай вытворчасці ў металургіі, выкарыстоўваў комплексную механізацыю і аўтаматызацыю, найноўшую на той час электроніку. У Савецкім Саюзе, паводле стану на пачатак 1980-х гг., доля ручной працы складала ў прамысловасці ад 35 да 40 %, у будаўніцтве – ад 50 да 60 %, у сельскай гаспадарцы – да трох чвэрцяў ад усіх аб'ёмаў працы.

Вялікую нагрузку на эканоміку Расіі і залежных ад яе краін стваралі *ваенныя выдаткі*, на якія ў розным выглядзе ішло да 80 % нацыянальнага даходу СССР.

Абвастралася і дэмаграфічная сітуацыя: вёска імкліва бязлюднела. Штогод з карты Расіі знікала прыблізна па тры тысячы вёсак.



Крыніца: diletant.media/photo-collection




Прылаўкі расійскіх крамаў познесавецкага часу

Паводле сярэдняй працягласці жыцця Расія на пачатку 1980-х гг. займала ў свеце месца пры канцы чацвёртага дзясятка краін.

Не справіўшыся з выклікамі эканомікі, кіраўніцтва савецкай кампартыі, якое было ўжо далёка не ў працаздольным стане (сярэдні ўзрост членаў Палітбюро ЦК у 1980 г. перавысіў 71 год), узялося ствараць бачнасць росквіту асаблівай, «савецкай» дэмакратыі. Гэтаму павінна было паслужыць прыняцце ў 1977 г. *новай Канстытуцыі СССР*, якую назвалі «брэжнеўскай». Галоўнай навацыяй гэтага дэкларатыўнага дакумента было фіксаванне ў яго шостым артыкуле «кіроўнай і накіроўвальнай ролі КПСС». Як і ў папярэднія дзесяцігоддзі бальшавіцка-камуністычнага кіравання ў савецкай імперыі, выбары дэпутатаў розных узроўняў былі звычайным фарсам: на кожны мандат прэтэндаваў адзін кандыдат, вызначаны адпаведнымі партыйнымі органамі (фармальна сам ён мог быць і беспартыйным).

Разам з усім вышэйзгаданым савецкая мадэль развіцця грамадства ў некаторых сферах спрацоўвала лепш. У 1970-я гг. у Расіі і большасці іншых савецкіх рэспублік быў фармальна ажыццёўлены пераход да *ўсеагульнай 10-гадовай адукацыі*. У пэўнай ступені павялічваліся заробкі тых, хто працаваў у прамысловасці, будаўніцтве і асабліва ў сельскай гаспадарцы. Дзяржаўныя пенсіі збольшага забяспечвалі не надта высокія патрэбы савецкіх людзей. З'явіліся пэўныя зрухі ў вырашэнні жыллёвай праблемы, аднак для інтэлігенцыі – настаўнікаў, работнікаў сферы культуры, сярэдняга медыцынскага персаналу – гэтая праблема заставалася надзвычай вострай. Нярэдкімі ў гарадах былі выпадкі, калі працаўнікі гэтых сфер выходзілі на пенсію, так і не атрымаўшы асобнай добраўпарадкаванай кватэры (трэба мець на ўвазе, што свабодны рынак жылля ў СССР адсутнічаў).

***11.25. Савецкая знешняя палітыка ў 1965–1985 гг.*** Прыйшоўшы да ўлады, брэжнеўская групоўка паставіла тры прыярытэтныя задачы:

– паслядоўна ажыццяўляць палітыку падтрымкі «прагрэсіўных» рухаў і рэжымаў ва ўсім свеце. (Гэтая палітыка была асабліва актыўная – і часам перарастала ў непасрэдную інтэрвенцыю – у дачыненні да краін, якія знаходзіліся ў непасрэднай сферы ўплыву СССР: напрыклад, Афганістан);

Крыніца: news.bigmir.net



Падзеі ў Празе.
1968 г.

Крыніца: news.bigmir.net



– запабягаць пагрозе распаду сацыялістычнага лагера і яшчэ больш шчыльна згуртаваць яго ў палітычных, вайсковых і эканамічных адносінах;

– нармалізаваць дачыненні паміж Усходам і Захадам. (Гэты курс, які меў назвы «разрадка напружанасці», «мірнае суіснаванне», зрэшты, быў узяты толькі пасля абвастрэння ў пачатку 1970-х гг. канфлікту з Кітаем і пачатку збліжэння апошняга са Злучанымі Штатамі, калі савецкія кіраўнікі адчулі ўзнікненне новай небяспекі.)

Спосабы рэалізацыі гэтых задач можна праілюстраваць трыма найважнейшымі падзеямі ў знешняй палітыцы 1965–1985 гг. Гэта савецкая інтэрвенцыя ў Чэхаславакіі (1968 г.), падпісанне двух першых пагадненняў аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў падчас візіту амерыканскага прэзідэнта Рычарда Ніксана ў Маскву ў траўні 1972 г., уварванне Савецкага Саюза ў Афганістан (канец 1979 г.).

У першай палове 70-х гг. Масква таксама пагадзілася на заключэнне шэрагу двухбаковых пагадненняў аб узаемным прызнанні межаў з Заходняй Германіяй, Польшчай, Чэхаславакіяй. Было падпісана і чатырохбаковае пагадненне, якое да часу рэгулявала статус Заходняга Берліна. У 1975 г. СССР разам з 32 дзяржавамі Еўропы, ЗША,




Леанід Брэжнеў падпісвае Хельсінкскі акт. 1 жніўня 1975 г.

Канадай падпісаў Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, які сёння прынята называць *Хельсінкскім актам.* Фармальна савецкія кіраўнікі прызнавалі непарушнасць пасляваенных межаў, права іншых краін на суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць, а таксама бралі на сябе пэўныя абавязкі ў галіне выканання найважнейшых правоў чалавека.

Далейшыя падзеі ў свеце (працяг гонкі ядзерных узбраенняў паміж ЗША і СССР, савецкая інтэрвенцыя ў Афганістане, узмацненне рабочага і незалежнага прафсаюзнага руху ў Польшчы, арабска-ізраільскі канфлікт на Блізкім Усходзе) не прывялі да змяншэння міжнароднай напружанасці і далі магчымасць захоўваць у расійскім кіраўніцтве вырашальны ўплыў прыхільнікаў канфрантацыі з Захадам, прадстаўнікоў вайсковага лобі.

Кіраўніцтва Савецкага Саюза аказвала істотную матэрыяльную і вайскова-тэхнічную падтрымку шмат якім рэжымам у краінах трэцяга свету, што дэкляравалі сваю прыхільнасць да камуністычнай ідэалогіі або прыналежнасць да «нацыянальна-вызваленчага змагання» (Куба, В'етнам, Ангола, Мазамбік, Зімбабве, Эфіопія, Гвінея, Самалі, Паўднёвы Емен, Нікарагуа ды інш.).

У часы кіравання Брэжнева абвастрыўся канфлікт з *мааісцкім Кітаем*, што асабліва яскрава выявілася ў ваенных сутыкненнях Савецкай і Кітайскай народна-рэвалюцыйнай армій, самы востры сярод якіх меў месца на *востраве Даманскі* на далёкаўсходняй рацэ Усуры ў сакавіку 1969 г. Паводле некаторых сведчанняў, саступіўшы гэтую

тэрыторыю Кітаю, Савецкі Саюз праз некалькі месяцаў рыхтаваўся нанесці ядзерны ўдар па аб'ектах у КНР, але ад гэтага кроку яго засцераглі ЗША.

***11.26. Спробы духоўнага супраціву камуністычнай уладзе ў часы стагнацыі.*** Яшчэ за хрушчоўскім часам у СССР паступова нараджаліся зародкі арганізацый, удзельнікі якіх не пагаджаліся з палітыкай кампартыі ці яе асобнымі аспектамі. Адна з такіх груп, *Саюз патрыётаў Расіі*, узнікла ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце (МДУ) у 1956 г. Яе ўзначальваў аспірант кафедры гісторыі КПСС, выпускнік гістарычнага факультэта МДУ Леў Краснапеўцаў, які неўзабаве быў асуджаны на дзесяцігадовае зняволенне. Прыкладна ў той самы час у Сібіры ўтварылася нелегальная студэнцкая група «Свабода слова», якая была неўзабаве арыштавана і асуджана. Улетку 1958 г. група маладых людзей (Уладзімір Букоўскі, Эдуард Кузняцоў, Ілья Бакштэйн ды іншыя) арганізавала паэтычныя чытанні каля помніка Маякоўскаму ў Маскве, якія выйшлі за межы дазволенага камуністамі. Арганізатары чытанняў былі зняволены і асуджаны. У лістападзе таго самага года была выкрытая і арыштаваная яшчэ адна група студэнтаў МДУ, абвінавачаная ў заснаванні антысавецкай арганізацыі і спробе стварэння падпольнай друкарні. У 1959–1961 гг. пачалі з'яўляцца рукапісныя часопісы – такія, як «Сінтаксіс» (яго стваральнік Аляксандр Гінзбург быў выключаны з універсітэта, а потым асуджаны на два гады лагераў) або «Фенікс-61» (заснавальнік, былы студэнт Гісторыка-архіўнага інстытута Юрый Галанскаў быў арыштаваны значна пазней, у 1967 г.; памёр у лагеры).

Пры канцы 50-х гг. у Расіі нарадзіўся «самвыдат». Так была названа літаратура, якая распаўсюджвалася ў выглядзе машынапісаў. Сярод твораў, якія з'явіліся спачатку ў самвыдаце, былі ўспаміны Яўгеніі Гінзбург «Круты маршрут» і «Калымскія апавяданні» Варлама Шаламава. Гэтыя кнігі ніколі, аж да часу позняй перабудовы, не друкаваліся ў Савецкім Саюзе, але атрымалі шырокую вядомасць на Захадзе, дзе іх апублікавалі таксама і на рускай мове. Аўтары адбылі немалыя тэрміны ў савецкіх канцлагерах. Яны распавялі пра нечалавечыя пакуты мільёнаў людзей, якія сталі ахвярамі бальшавіцкага рэжыму.

7 верасня 1961 г. начальнік кафедры Вайсковай акадэміі імя Фрунзэ, удзельнік Другой сусветнай вайны генерал-маёр Пётр Грыгарэнка выступіў на маскоўскай раённай партыйнай канферэнцыі з крытыкай новай праграмы кампартыі. Яго адправілі служыць на Далёкі Усход, але там ён заснаваў «Саюз барацьбы за адраджэнне ленінізму», мэтай якога абвяшчалася «ліквідацыя ўсіх скрыўленняў ленінскага вучэння, адраджэнне ленінскіх нормаў партыйнага жыцця і вяртанне рэальнай улады саветам дэпутатаў працоўных». Пачынаючы з 1964 г., улады не раз змяшчалі Грыгарэнку ў псіхлякарні, потым неаднаразова арыштоўвалі і кідалі ў турмы. У 1977 г. ён быў пазбаўлены грамадзянства Расіі і мусіў застацца ў эміграцыі.

Брэжнеўска-суслаўскае кіраванне таксама пачалося з паказальных працэсаў супраць іншадумцаў. У верасні 1965 г. былі арыштаваны пісьменнікі Андрэй Сіняўскі і Юлій Даніэль за тое, што яны выдалі за мяжою пад псеўданімамі свае творы, якія былі ўжо ў надрукаваным выглядзе ўвезены ў Расію. У лютым 1966 г. іх прысудзілі кожнага да некалькіх гадоў лагераў. Гэта быў першы выразна палітычны працэс у пасляслалінскую эпоху.

У ЦК партыі быў накіраваны ліст з асуджэннем спробаў адрадзіць «метады культу асобы Сталіна»; сярод яго падпісантаў – знакамітыя фізікі, акадэмікі Леў Арцімовіч і Пётр Капіца; пісьменнікі Канстанцін Паўстоўскі, Віктар Някрасаў, Уладзімір Цендракоў, Карней Чукоўскі, Барыс Слуцкі, рэжысёры Георгій Таўстаногаў і Алег Яфрэмаў, актор Інакенцій Смактуноўскі, мастакі Сямён Чуйкоў, Барыс Няменскі ды інш.

Аднак камуністычныя ўлады ўжо не спыняліся: аб'ектамі іх пераследу сталі чарговыя асобы (дысідэнты), якія наважваліся мець і выказваць свае думкі наконт таго, што адбывалася ў савецкай імперыі – Леанід Барадзін, Ігар Агурцоў, Анатоль Марчанка, Андрэй Амальрык, Анатоль (Натан) Шчаранскі, Андрэй Цвердахлебаў, Людміла Аляксеева, Юрый Арлоў, Людміла Агапава, народжаная ў Беларусі Валерыя Навадворская, Аляксандр Падрабінек, праваслаўныя святары Глеб Якунін і Дзмітрый Дудко. Усе яны неаднаразова затрымліваліся спецслужбамі, іх арыштоўвалі, пазбаўлялі права працаваць і служыць; некаторыя мусілі пакінуць радзіму...

25 жніўня 1968 г. на знак пратэсту супраць увядзення савецкіх войскаў у Чэхаславакію група дысідэнтаў, у якую ўвайшлі паэтка

Наталля Гарбанеўская, фізік Павел Літвінаў, мастацтвазнаўца Віктар Файнберг, мовазнаўцы Ларыса Багараз і Канстанцін Бабіцкі, літаратар Вадзім Дэланэ, студэнтка Таццяна Баева, экс-студэнт, электрык Віктар Драмлюга, арганізавалі дэманстрацыю на Краснай плошчы ў Маскве. Усе яны былі арыштаваны, Гарбанеўскую і Файнберга адправілі ва ўстановы прымусовага псіхіятрычнага лячэння, Дэланэ і Драмлюга трапілі ў турму, Літвінаў, Багараз і Бабіцкі атрымалі тэрміны высылкі.



Наталля Гарбанеўская,
расійская паэтка і дысідэнтка

У СССР сярод дысідэнцкіх рухаў вылучаўся *крымска-татарскі нацыянальны рух*, узначалены токарам і электраслесарам Мустафой Джамілевым. У 1969 г. Джамілеў далучыўся да *«Ініцыятыўнай групы па абароне правоў чалавека ў СССР»*, іншымі актывістамі якой былі Пётр Якір, Віктар Красін, Таццяна Веліканава, Сяргей Кавалёў, Уладзімір Барысаў, Аляксандр Лавут, вышэйзгаданая Наталля Гарбанеўская ды іншыя.



Дысідэнт, змагар за правы крымскіх татараў Мустафа Джамілеў (*злева*) з Лявонам Баршчэўскім. *Здымак 2014 г.*



Расійскі дысідэнт Павел Літвінаў (*справа*) з Лявонам Баршчэўскім. *Здымак 2014 г.*



Акадэмік, праваабаронца
Андрэй Сахараў

Пасля падпісання Брэжневым Хельсінкскага акта як бы павінны былі з'явіцца фармальныя падставы для існавання грамадскіх арганізацый, якія б сачылі за выкананнем тых або іншых палажэнняў гэтага аб'ёмнага дакумента. 12 траўня 1976 г. у Маскве было абвешчана пра стварэнне *Маскоўскай Хельсінкскай групы* (МХГ). Адпаведная прэс-канферэнцыя адбылася на кватэры знакамітага фізіка-ядзершчыка, а ад пачатку 1960-х гг. актыўнага дысідэнта, акадэміка Андрэя Сахарава, які сваімі публічнымі выступамі актыўна прыцягваў увагу да фактаў парушэння найважнейшых правоў чалавека ўладамі СССР. Да МХГ далучыўся шмат хто са згаданых раней дысідэнтаў. Супраць іх у савецкай прэсе разгарнулася прапагандысцкая кампанія, пайшлі арышты, зняволенні, высылкі, прымусовыя выгнанні ў эміграцыю... 22 студзеня 1980 г. па дарозе на працу ў Акадэмію навук Сахараў быў затрыманы КГБ і разам з жонкай, таксама актыўнай удзельніцай МХГ Аленай Бонэр, высланы без усялякага судовага рашэння ў Ніжні Ноўгарад (тады – Горкі).



Літоўскі паэт і праваабаронца
Томас Вянцлава (*злева*)
з Лявонам Баршчэўскім.
*Здымак 2012 г.*

Расійскія дысідэнты, з якімі ў той або іншай ступені кантактавалі ўкраінцы Ляўко Лук'яненка, Вячаслаў Чарнавіл, Валянцін Мароз, Васіль Стус, Леанід Плюшч, Багдан і Міхайла Гарыні, Рыгор Чубай, беларус Міхал Кукабака, літовец Томас Вянцлава, азербайджанец Абульфаз Эльчыбей, грузін Звіяд Гамсахурдзія, армянін Георгій Хамізуры і іншыя, унеслі свой уклад у тое, што не далі брэжнеўскаму кіраўніцтву канчаткова вярнуцца да сталінскіх метадаў абыходжання з людзьмі.

Дзякуючы неймаверным высілкам, нярэдка рызыкуючы жыццём, яны інфармавалі сусветную грамадскую супольнасць пра злачынствы камуністычна-савецкіх уладароў, пра рэпрэсіі супраць любых іншадумцаў у СССР.

***11.27. Культура і навука Савецкай Расіі ў 1964–1985 гг.*** Хоць сам дысідэнцкі рух у Расіі не быў шматлікім, ён як бы атрымліваў немалое пашырэнне праз мастацкую творчасць, а найперш, вядома, праз літаратуру. Мастацкая проза і дакументальна-мастацкае даследаванне «Архіпелаг ГУЛАГ» Аляксандра Салжаніцына, празаічныя творы Юрыя Дамброўскага, Льва Копелева, Барыса Шыраева, іншыя кнігі, якія даходзілі да расійскага чытача ў самвыдаце або калі іх чыталі на замежных радыёстанцыях, расказвалі звычайным людзям страшную праўду пра нядаўна пераЖыты краінай бальшавіцкі тэрор. Працягвалася традыцыя друку самвыдатаўскіх выданняў (напрыклад, ленінградскага часопіса «37» у 1976 г., дзе былі, сярод іншага, змешчаныя вершы Вольгі Седаковай, Дзмітрыя Прыгава, Генрыка Сапгіра, а таксама не выдадзеныя да таго часу творы Барыса Пастарнака і Ганны Ахматавай).

Не ўпісваліся ў канон тагачаснай афіцыйнай ідэалогіі некаторыя песні Уладзіміра Высоцкага, Юлія Кіма, таго ж Аляксандра Галіча; лірыка Іосіфа Бродскага, ваенная проза Канстанціна Вараб'ёва, Рыгора Бакланава, Юрыя Бондарава, Вячаслава Кандрацьева, беларускага пісьменніка Васіля Быкава (у перакладзе і аўтарскім перакладзе на рускую мову); творы так званай вясковай прозы Васілія Шукшына, Барыса Мажаева, Фёдара Абрамава, Васілія Бялова, Валянціна Распуціна, творы на праблемныя тэмы сучаснасці Юрыя Трыфанава, Уладзіміра Цендракова, рускамоўныя раманы і аповесці кіргізскага

творцы Чынгіза Айтматава… Творчасць названых літаратараў гармашічна дапаўнялася творчасцю рускіх паэтаў, празаікаў, драматургаў – Барыса Слуцкага, Арсенія Таркоўскага, Навелы Матвеевай, Рымы Казаковай, Анатолія Жыгуліна, Сяргея Залыгіна, Данііла Граніна, Юрыя Нагібіна, Уладзіміра Маканіна, Андрэя Бітава, Веньяміна Каверына, Аляксандра Вампілава, аварскай паэтэсы Фазу Аліевай, адыгейскага паэта Ісхака Машбаша, адыгейскага паэта і празаіка Аскера Яўтыха, асецінскага драматурга Георгія Хугаева, башкірскіх паэтаў Батыра Валіда, Галі Мусы, Рамі Гарыпава, Рыната Хайрэтдзінава, башкірскага празаіка Ібрагіма Абдуліна, бурацкага паэта і празаіка Цакто Намтоева, габрэйска-рускага празаіка і драматурга Фрыдрыха Гарэнштэйна, комі празаіка Генадзія Фёдарава, калмыцкага паэта Ліджы Інджыева, калмыцкіх паэтаў і празаікаў Міхаіла Ханінава і Босі Сангаджыевай, карэльскіх творцаў Яака Ругаева, Уладзіміра Брэндаева, Тойва Флінка, мансійскага паэта і празаіка Ювана Шасталава, марыйскіх драматургаў і празаікаў Аляксандра Юзыкайна і Мікалая Рыбакова, татарскага паэта Сібгата Хакіма, татарскага паэта і празаіка Хасана Туфана, татарскіх празаікаў Амірхана Енікі і Гумера Башырава, татарскага драматурга Туфана Мінуліна, тувінскага паэта Даржу Мангуша, тувінскага празаіка Анатолія Емяльянава, тувінскага драматурга Уладзіміра Серэн-оола, удмурцкага паэта Флора Васільева, удмурцкага празаіка Рамана Валішына, чачэнскага пісьменніка Абдул-Хаміда Хамідава, чувашскага паэта і празаіка Юхма Мішшы, чукоцкага празаіка Юрыя Рытхэу, эвенкійскага пісьменніка Алітэта Нямтушкіна, якуцка-эвенкійскага паэта Мікалая Каліціна, юкагірскага паэта Улура Адо і іншых.


Крыніца: ruspekh.ru

Чукоцкі пісьменнік
Юрый Рытхэу

У *выяўленчым мастацтве* значную ўвагу прыцягнулі працы рускіх жывапісцаў Дзмітрыя Жылінскага, Віктара Іванова, Віктара Папкова, графіка Дзмітрыя Бісці, скульптараў Яўгенія Вучэціча, Уладзіміра Цыгаля, Дзмітрыя Шахаўскога, Алега Комава. Ініцыятыву, аднак, перахоплівала альтэрнатыўнае мастацтва. У 1964 г. з'явілася група «Рух», у склад якой уваходзілі Леў Нусберг, Галіна Біт, Франсіска Інфантэ ды іншыя. У 1967 г. у Ленінградзе Міхаіл Шэмякін (пазней эмігрант), Яўгеній Есауленка, Алег і Уладзімір Лігачовы, Анатолій Васільеў і іншыя мастакі абвясцілі пра стварэнне групы «Метафізічны сінтэтызм». Прыкладна ў той самы час у Маскве ўзнікае група «Мастакі Срэценскага бульвара», да якой належалі Эрык Булатаў, Аляксандр Піваварaў, Уладзімір Янкілеўскі, Алег Васільеў ды іншыя. У 1973 г. у Ленінградзе ўзнікае «Таварыства эксперыментальных выстаў» на чале з Юрыем Жаркіх; з 1976 г. робіцца вядомай праграма групы «Калектыўныя дзеянні» (Аляксей Манастырскі, Мікіта Аляксееў, Сяргей Рамашка); яшчэ пазней паўстаюць «Група 6-ці» (Аляксандр Тэгін, Ігар Капысцянскі, Сяргей Шарсцюк), «Мухаморы» (Мікіта Аляксееў, а таксама Свен Гундлах, Уладзімір і Сяргей Міроненкі), «Афрыка» на чале з Сяргеем Бугаевым, «Дзіцячы садок» (Сяргей Шутаў, Сяргей Волкаў, Уладзімір Наумец). У 1978 г. робіцца вядомай дзейнасць групы майстроў перформансу «Гняздо» (Генадзій Данской, Міхаіл Рашаль, Віктар Скерсіс). Парадзіруючы савецкую культуру сталінскага часу, працавалі Віталій Комар і Аляксандр Меламід (карціны «Сталін і музы», «Што рабіць?», «З дэманстрацыі», «Ленін жыў. Ленін жывы. Ленін будзе жыць» і іншыя, створаныя ў 1981–1983 гг.).


© Фонд Міхаіла Шэмякіна

Мастак Міхаіл Шэмякін

У працяг традыцыі, закладзенай яшчэ Хрушчовым, выставы авангардыстаў не толькі рабіліся аб'ектамі разгромнай крытыкі ў камуністычнай перыёдыцы, але супраць іх прымянялі бульдозеры і нават міліцэйскія дубінкі. Вышэйзгаданы Міхаіл Шэмякін, Леанід Лам дастаўляліся ў псіхлякарні, Івана Чуйкова дапытвалі ў КГБ.

Звярнулі на сябе ўвагу працы рускіх *скульптараў* Міхаіла Анікушына, Віталія Зайкова, расійска-габрэйскіх разьбяроў Ісака Бродскага, Льва Кербеля, татарскага скульптара Махмата Гасімава.

Сярод рускіх *архітэктараў* названай эпохі зарэкамендавалі сябе Якаў Белапольскі, Валянцін Каменскі, Мікалай Нікіцін, Міхаіл Пасохін.

У *класічнай музыцы* сусветную вядомасць займелі творы рускіх кампазітараў Радзівона Шчадрына, Андрэя Пятрова, Эдысана Дзянісава, Алены Фірсавай, Георгія Свірыдава, а таксама расійска-нямецкага кампазітара Альфрэда Шнітке і татарскага кампазітара ды выканаўцы Сафіі Губайдулінай. Таленавітыя творы належаць марыйскаму кампазітару Анатолю Лупаву, татарскім кампазітарам Алмазу Манасыпаву, Фасілю Ахметаву.

Сярод выканаўцаў найлепшых оперных партый вылучаліся рускія спевакі Алена Абразцова, Ірына Багачова, Тамара Мілашкіна, Тамара Сіняўская, Уладзімір Атлантаў, Аляксандр Варашыла, татарскі выканаўца Зінат Абасаў. Сусветнавядомай стала творчасць пастаноўшчыка *балетаў* Юрыя Грыгаровіча, такіх майстроў рускага балетнага танца,



Руска-нямецкі кампазітар
Альфрэд Шнітке



Расійска-татарскі кампазітар
Сафія Губайдуліна

як Кацярына Максімава, Надзея Паўлава, Наталля Бяссмертнава, Ніна Цімафеева, Уладзімір Васільеў, Вячаслаў Гардзееў, Аляксандр Багатыроў; татарскай балерыны Ліліі Сабітавай ды іншых.

Розгалас набыла творчасць рускіх дырыжораў Яўгенія Святланава і Уладзіміра Співакова, руска-асецінскага дырыжора Валерыя Гергіева, кабардзіна-балкарскага дырыжора Юрыя Тэмірканава, руска-габрэйскіх піяніста Гвідона Крэмера, альтыста-віртуоза і дырыжора Юрыя Башмета.

Вельмі папулярнымі былі *эстрадныя песні* кампазітараў Марка Фрадкіна, Эдуарда Калманоўскага, Аляксандры Пахмутавай, Давіда Тухманава, Аляксандра Зацэпіна, Яўгена Крылатава, Мікаэла Тарывердзіева ды іншых. Новай з'явай сталі выступы поп-гуртоў («вакальна-інструментальных ансамбляў») «Поющие гитары», «Веселые ребята», «Синяя птица», «Лейся, песня», «Цветы», «Земляне», «Самоцветы», «Поющие сердца», «Ариэль», «Голубые гитары», рок-гуртоў «Машина времени», «ДДТ» або «Аквариум». Ледзьве не ўвесь Савецкі Саюз ведаў і падчас канцэртаў падпяваў, у тым ліку па-беларуску, песні мінскага гурта «Песняры» на чале з Уладзімірам Мулявіным. Велізарнай папулярнасцю карысталіся такія рускія поп-выканаўцы, як Людміла Зыкіна, Вольга Воранец, Ірына Бржэўская, Аіда Вядзішчава, Ала Пугачова, Юрый Антонаў, Іосіф Кабзон, Леў Лешчанка, Сяргей Захараў, Валерый Ляонцьеў, Алена Камбурава, Жанна Бічэўская, татарскія спевакі Рэнат Ібрагімаў і Альберт Асадулін, нанайскі выканаўца Кола Бельды, руска-габрэйскія спевакі (якія пры канцы 60-х – пачатку 70-х гг. мусілі эміграваць на Захад) Эміль Гаравец, Ларыса Мондрус, Вадзім Мулерман, руска-польская спявачка Эдыта П'еха, руска-армянскі выканаўца Жан Татлян, руска-грэцкі спявак Лакі Кесоглу.

Савецкая цэнзура па-ранейшаму была вельмі пільная: уладатрымальнікі клапаціліся пра тое, каб савецкія грамадзяне не «паддаліся ўплыву буржуазнай ідэалогіі» праз творы літаратуры і мастацтва. З падачы спецслужбаў партыйнымі і камсамольскімі органамі ствараліся «чорныя спісы» выканаўцаў, якіх забаранялася слухаць у савецкай імперыі.

У *тэатральным мастацтве* Расіі знакавай падзеяй стала стварэнне ў 1964 г. маскоўскага Тэатра драмы і камедыі на Таганцы на чале



Приложение к письму
от 10 января 1985 года

**Пролетарии всех стран, соединяйтесь!**
**ВСЕСОЮЗНЫЙ ЛЕНИНСКИЙ КОММУНИСТИЧЕСКИЙ СОЮЗ МОЛОДЕЖИ**
**НИКОЛАЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ КОМИТЕТ ЛКСМ УКРАИНЫ**

Для служебного пользования
Секретарям ГК, РК ЛКСМ Украины

Направляем примерный перечень зарубежных музыкальных групп и исполнителей, в репертуаре которых содержатся идейно вредные произведения, а также список тарифицированных вокально-инструментальных ансамблей СССР.

Рекомендуем использовать эти сведения для усиления контроля за деятельностью дискотек.

Данной информацией необходимо обеспечить все ВИА и молодежные дискотеки района.

Секретарь обкома комсомола — П. Грншин

**Примерный перечень зарубежных музыкальных групп и исполнителей, в репертуаре которых содержатся идейно вредные произведения**

| Название коллектива | Что пропагандирует |
|---|---|
| 1. Секс Пистолз | — панк, насилие |
| 2. Б-52 | — панк, насилие |
| 3. Медиесс | — панк, насилие |
| 4. КЛЭШ | — панк, насилие |
| 5. Стрэнглэрс | — панк, насилие |
| 6. Кисс | — неофашизм, панк, насилие |
| 7. Крокус | — насилие, культ сильной личности |
| 8. Стикс | — насилие, вандализм |
| 9. Айрон Мейден | — насилие, религиозное мракобесие |
| 10. Джудас Прист | — антикоммунизм, расизм |
| 11. Ай Си Ди Си | — неофашизм, насилие |
| 12. Спаркс Спаркс | — неофашизм, расизм |
| 13. Блек Сабат | — насилие, религиозное мракобесие |
| 14. Элис Купер | — насилие, вандализм |
| 15. Назарет | — насилие, религиозный мистицизм, садизм |
| 16. Скорпион | — насилие |
| 17. Чингиз Хан | — антикоммунизм, национализм |
| 18. Уфо | — насилие |
| 19. Пинк Флойд (1983) | — извращение внешней политики СССР («Агрессия СССР в Афганистане») |
| 20. Толкинхедз | — миф о советской военной угрозе |
| 21. Перрон | — эротизм |
| 22. Боканион | — эротизм |
| 23. Оринджджинелз | — секс |
| 24. Донна Саммер | — эротизм |
| 25. Тина Тернер | — секс |
| 26. Джаниор Зиглиш (Регги) | — секс |
| 27. Кенед Хит | — гомосексуализм |
| 28. Манич Мешин | — эротизм |
| 29. Рамонэ | — панк |
| 30. Бан Хейлен | — антисоветская пропаганда |
| 31. Хулио Иглесиос | — неофашизм |
| 32. Язоо | — панк, насилие |
| 33. Данич Мод | — панк, насилие |
| 34. Виледж Пипл | — насилие |
| 35. Тен Си Си (10cc) | — неофашизм |
| 36. Стоджис | — насилие |
| 37. Бойз | — панк, насилие |
| 38. Блонди | — панк, насилие |

«ВЕРНО»
зав. общим отделом
обкома комсомола — Е. Пряжинская

Спіс твораў, забароненых для слухання ў СССР. 1985 г.

з рэжысёрам Юрыем Любімавым. У іншых рускіх тэатрах поспехам карысталіся спектаклі, пастаўленыя такімі рэжысёрамі, як Іосіф Хейфіц, Марк Захараў, Галіна Волчак, Раман Вікцюк, Валянцін Плучак, Георгій Таўстаногаў, Алег Яфрэмаў, Анатоль Эфрас. Адметныя пастаноўкі стварылі балкарскі рэжысёр Барыс Куліеў, асецінская рэжысёр і актрыса Зарыфа Брытаева, башкірскі рэжысёр і актор Рыфкат Ісрафілаў, карэльскі рэжысёр і актор Тойва Хаймі, руска-цыганскі рэжысёр, актор і спявак Мікалай Слічэнка ды іншыя. Сярод актораў тэатра, якія ярка праявілі сябе і ў кіно, варта назваць імёны Вольгі Аросевай, Руфіны Ніфантавай, Клары Лучко, Іны Чурыкавай, Людмілы Гурчанка, Анастасіі Вярцінскай, Святланы Немаляевай, Маргарыты Церахавай, Алы Дзямідавай, Наталлі Гундаравай, Наталлі Фацеевай, Ірыны Алфёравай, Расціслава Плята, Міхаіла Ульянава, Уладзіміра Самойлава, Анатоля Папанава, Юрыя Нікуліна, Андрэя Міронава, Алега Даля, Міхаіла Пугаўкіна, Юрыя Якаўлева, Алега Табакова, Уладзіміра Басава, Уладзіміра Высоцкага, татарскай актрысы Фірдаус Хайрулінай ды іншых.

Сярод *кінарэжысёраў* вялікую папулярнасць здабылі рускія творцы Андрэй Таркоўскі, Рыгор Чухрай, Станіслаў Растоцкі, Сяргей Бандарчук, Сяргей Герасімаў, Эльдар Разанаў, Леанід Гайдай, Мікіта Міхалкоў, Элем Клімаў, Ларыса Шапіцька, Аляксей Герман, Уладзімір Мяньшоў, Пётр Тадароўскі, Васілій Шукшын, беларус з паходжання Уладзімір Матыль, кінадакументаліст Міхаіл Ром, руска-татарскі



Кінарэжысёр Андрэй Таркоўскі

рэжысёр Вадзім Абдрашытаў, расійска-грузінскія рэжысёры Марлен Хуцыеў і Георгій Данелія ды іншыя. Не змаглі дайсці да гледача забароненыя цэнзурай мастацкія фільмы Аляксея Германа «Праверка на дарогах», «Мой сябар Іван Лапшын», знятая паводле рамана Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» на «Беларусьфільме» стужка расійскага рэжысёра Уладзіміра Бычкова «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка».

*Навука* ў Расіі і залежных ад яе савецкіх рэспубліках ужо не выйшла на ўзровень канца 50-х – пачатку 60-х гг. Аднак за кошт сур'ёзнага фінансавання дзяржавай мэтавых фундаментальных навукова-даследчых праграм (да 25 млрд руб. у 1980 г.) сетка навуковых установ і даследчых цэнтраў значна пашырылася. На першы план былі вылучаны задачы інтэнсіфікацыі навуковых даследаванняў і ўзмацнення сувязі навукі з вытворчасцю. Ствараліся рэгіянальныя, міжведамасныя каардынацыйныя навуковыя саветы. Каб ператварыць навуку ў рэальную прадукцыйную сілу, яшчэ ў 60-я гг. пачалі ствараць навукова-вытворчыя аб'яднанні (НВА), такія як Ленінградскае оптыка-механічнае аб'яднанне, ваенна-прамысловыя аб'яднанні па выпуску найноўшых узораў вайсковай тэхнікі (НВА «Энергія») ды іншыя. Усяго да 1985 г. у СССР дзейнічала 250 такіх НВА. Асабліва значнымі былі дасягненні савецкай навукі ў сферы тэарэтычнай і эксперыментальнай фізікі (квантавая электроніка і лазерная тэхніка). Важныя адкрыцці ў гэтых галінах здзейснілі Аляксандр Прохараў, Мікалай Басаў, Леў Арцімовіч, а таксама Ілья Ліўшыц, Аляксандр Андрэеў, Юрый Каган ды іншыя. У 1978 г. акадэміку Пятру Капіцу была прысуджана Нобелеўская прэмія па фізіцы «за фундаментальныя вынаходніцтвы і адкрыцці ў галіне фізікі нізкіх тэмператур».

Шырокі размах атрымалі даследаванні ў розных галінах хіміі і біялогіі. Поспехам савецкіх навукоўцаў сталі працы па расшыфроўцы


Акадэмік Пётр Капіца

структуры бялку, атрыманні штучных генаў (генная інжынерыя), лазерная медыцына. Але адначасова прапаноўваліся непрадуманыя і нават авантурныя навуковыя праекты: як, напрыклад, экалагічна небяспечная праграма «перакіду» вялікіх паўночных рэк у Сярэднюю Азію, рэалізацыя якой непазбежна прывяла б да бессэнсоўнага марнавання велізарных матэрыяльных і фінансавых сродкаў. У выпадку яе ажыццяўлення наступствы маглі быць катастрафічнымі для ўсёй планеты.

Развіццё гуманітарных даследаванняў у СССР надалей стрымлівалася жорсткімі ідэалагічнымі рамкамі, што асабліва згубна ўплывала на вывучэнне праблем савецкага перыяду айчыннай гісторыі. Значнае месца ў рабоце грамадазнаўцаў адводзілася стварэнню шматтомных прац, у тым ліку па гісторыі КПСС, Другой сусветнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, рабочага класа, сялянства і т. д., а таксама рознага кшталту юбілейных выданняў.

Варта ўзгадаць пра вядомых ва ўсім свеце філолагаў так званай «ленінградскай школы», да якой належалі Віктар Жырмунскі, Саламон Кацнельсон, Уладзімір Адмоні, а таксама звярнуць увагу на працы выбітных культуролагаў і філосафаў Міхаіла Бахціна, Сяргея Аверынцава ды іншых.

***11.28. Андропаўска-чарненкаўскае «міжцараванне»; прыход да ўлады Міхаіла Гарбачова; пачатак палітыкі паскарэння, галоснасці, перабудовы.*** Смерць Леаніда Брэжнева ў лістападзе 1982 г. Расія і залежныя ад яе савецкія рэспублікі сустрэлі з надзеяй. Камуністычную партыю ўзначаліў Юрый Андропаў. Вяртанне Андропава ў Сакратарыят ЦК (пасля працы там у 1962–1967 гг.), дзе ён замяніў памерлага ў лютым 1982 г. Суслава, зрабіла яго на шэсць апошніх месяцаў брэжнеўскай эпохі галоўным савецкім ідэолагам і тым самым дазволіла стаць канкурэнтам прызначанага Брэжневым сваім наступнікам Кан-

станціна Чарненкі (уплывовага сябра «днепрапятроўскай групоўкі»). У гэты час шмат хто пачаў дапытвацца праўдзівых прычын, якія змусілі савецкае кіраўніцтва аддаць перавагу чалавеку, кар'ера якога збольшага не адпавядала традыцыйным крытэрам выбару на пасаду кіраўніка партыі і дзяржавы.


Юрый Андропаў

Што праўда, яго канкурэнты былі або старэйшыя за яго, або хворыя, або проста занадта «шэрыя». Паводле распаўсюджанага меркавання, Юрый Андропаў быў кампетэнтны, і яго інтэлектуальныя якасці, веданне становішча ўнутры краіны, якое ён займеў за гады працы ў КДБ, яго дасведчанасць у пытаннях эканомікі, а таксама рэпутацыя прыхільніка навядзення парадку – усё гэта так ці іначай забяспечыла яму падтрымку тых, хто выступаў за пераход да больш эфектыўнай эканомікі і за пэўныя неабходныя перамены.

Разам з тым варта звярнуць увагу на ацэнку асобы Юрыя Андропава, якую прапануюць тыя ж Міхаіл Гелер і Аляксандр Некрыч:

«Калі Брэжнеў быў успрыняты на Захадзе на пачатку сваёй кар'еры генеральнага сакратара як «памяркоўны», то Андропаў быў прэзентаваны як дзяржаўны дзеяч новай школы яшчэ задоўга да таго, як ён стаў лідарам. Штаб Андропава – кансультанты ў Міжнародным аддзеле ЦК КПСС, у акадэмічных колах, у апараце КДБ – працаваў над стварэннем «вобраза» будучага генсека доўгія гады. Не засталіся ўбаку і некаторыя дысідэнты, ад якіх пайшлі легенды пра лібералізм Андропава. Урэшце намалявалася аблічча сур'ёзнага, энергічнага дзяржаўнага мужа, досыць цвёрдага, які, аднак, здольны кіраваць, не ўпадаючы ў ваяўнічую рыторыку і ў крайнасці кансерватыўнага экстрэмізму; асобу, якая ўмела разбіраецца ў хітраспляценнях міжнароднай палітыкі і сусветнага камуністычнага руху; эксперта па псіхалогіі Захаду і нават знаўцы яго культуры.

Чалавека, які душыў дысідэнцкі рух і паслаў у Афганістан ката-



Канстанцін Чарненка
з партыйнымі чыноўнікамі

вальныя каманды КГБ, заходнія СМІ ды прызнаныя эксперты ў савецкіх справах спрабавалі паказваць як ветлівага гаспадара, які гадзінамі гутарыць з дысідэнтамі ў сваім доме і пасля адпраўляе іх дадому на ўласнай машыне. Пра гэта пісала, напрыклад, «Вашынгтон пост»... Услед за ёй падобнае паўтарала «Нью-Ёрк таймс», распаўсюджваючы выдумкі пра высокаадукаванага вяльможу, які цудоўна валодае англійскай мовай і бавіць свой вольны час за французскім каньяком, чытаннем амерыканскіх раманаў і слуханнем «Голасу Амерыкі»...

Увесь кароткі перыяд кіравання Андропава быў адзначаны сабатажам усіх спробаў рэформаў, абвешчаных ім, а потым – пасля яго смерці ў лютым 1984 г. – абсалютнай стагнацыяй. Нарэшце выбраны наступным генсекам ЦК Чарненка нічым не запомніўся абсалютнай большасці грамадзян Расіі. У стане цяжкай хваробы ён не быў здольны выконваць нават звыклую для яго апаратную працу.

Ва ўнутранай палітыцы кароткае знаходжанне Андропава ва ўладзе было адзначана перш за ўсё паказальнай спробай скончыць з найбольш абуральнымі праявамі карупцыі, якая пашырылася ў свайго кшталту «сямейных колах» партыі з прычыны закаснеласці сістэмы і абсалютнай беспакаранасці пры Брэжневе вялікай колькасці мясцовых партыйных кіраўнікоў. Як старшыня КГБ Андропаў меў усю інфармацыю пра шматлікія справы, звязаныя з кумаўствам і карупцыяй сярод найвышэйшага слою савецкай наменклатуры, асабліва ў другой палове 1970-х гг. У гэты перыяд ценявая эканоміка разраслася да таго, што моцна закранула практычна ўсе сферы эканамічнай дзейнасці. Аднак і пазітыўная праграма Андропава шмат у чым звялася да агалашэння лозунгаў «умацавання дысцыпліны», «навядзення парадку» і адпаведных кампаній, якія толькі крыху ўскалыхнулі

партыйна-савецкае балота. Так, быў адпраўлены ў адстаўку кіраўнік Міністэрства ўнутраных спраў СССР Мікалай Шчолакаў, які пазней застрэліўся. У турму пасадзілі яго намесніка, зяця Брэжнева Юрыя Чурбанава. Свае пасады страцілі каля двух дзясяткаў іншых міністраў, 37 сакратароў розных абкамаў партыі. Але ўсё гэта былі чыста касметычныя меры, у той час як патрабаваліся радыкальныя перамены.



Міхаіл Гарбачоў

10 сакавіка 1985 г., адразу ж пасля смерці Канстанціна Чарненкі, новым генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны самы малады на той час член Палітбюро, 54-гадовы Міхаіл Гарбачоў. Гэта быў тыповы прадстаўнік партыйнага апарату, які меў рэпутацыю знаўцы савецкай сельскай гаспадаркі.

Напачатку Гарбачоў узяўся ажыццяўляць сфармуляваную ім задачу «ўдасканалення развітога сацыялізму». У адпаведнасці з гэтым была распрацавана стратэгія развіцця СССР, якую назвалі стратэгіяй паскарэння. Гэтае паскарэнне меркавалася ажыццявіць за кошт укаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы машынабудавання і актывізацыі «чалавечага фактару» праз паляпшэнне тэхналагічнай і працоўнай дысцыпліны, павышэнне адказнасці партыйна-гаспадарчых работнікаў розных узроўняў. Дзякуючы гэтаму ў 1985–1986 гг. удалося дамагчыся пэўнага ўздыму вытворчасці. У сваёй дзейнасці Гарбачоў апіраўся на новых асоб, якія ўвайшлі ў кіраўніцтва партыі і ўрада ў 1980-х гг., – Мікалая Рыжкова, Аляксандра Якаўлева, Эдуарда Шэварднадзэ, Ягора Лігачова, Барыса Ельцына, Анатоля Лук'янава ды іншых.

У траўні 1985 г. пачалася *антыалкагольная кампанія*, якая павінна была забяспечыць усеагульную цвярозасць і павысіць прадукцыйнасць працы. Да цвярозасці кампанія не прывяла, затое з'явіліся




Перабудовачныя плакаты




вялізныя чэргі па спіртныя напоі. Рэзка выраслі аб'ёмы нелегальнай вытворчасці і продажу самагону; узніклі праблемы з цукрам, які з'яўляецца важным кампанентам самагонаварэння. Узмацнілася сацыяльная напружанасць у грамадстве.

У красавіку 1986 г. выбухнула атамная электрастанцыя *ў Чарнобылі*, на памежжы Украіны і Беларусі. Партыйна-савецкае кіраўніцтва адразу не знайшло спосабаў ратаваць сотні тысяч людзей, што апынуліся пад пагрозай прамянёвых захворванняў. На пачатку чэрвеня таго самага года Гарбачоў на сакрэтным пасяджэнні Палітбюро канстатаваў: «Страты прадукцыі толькі цяпер ужо на 1 млрд 800 млн рублёў. Выдаткі на сам аб'ект ужо цяпер каля 2 млрд рублёў – словам, гаворка ідзе пра вельмі сур'ёзныя рэчы». У сваю чаргу, член Палітбюро, стары партыйны дзеяч і дыпламат Андрэй Грамыка настойваў: «Пытанне аб размяшчэнні АЭС не павінна вырашацца нідзе, акрамя дзяржаўнага кіраўніцтва. На Палітбюро павінна яно вырашацца, за гэтым сталом. Ужо цяпер трэба забараніць будаваць АЭС паблізу шчыльна населеных пунктаў. Што ў нас – няма месца? Мы не Бельгія, не Японія. Абсалютнай упэўненасці ў АЭС быць не можа. А мы будуем нават у Крыме! Неадкладна будаўніцтва трэба спыніць. Наогул у еўрапейскай частцы больш не пачынаць, а дзе

пачалі – спыніць». Аднак праз нейкі час кіраўнік савецкага ўрада Рыжкоў асудзіць тых, хто ўдзельнічаў у «Чарнобыльскім шляху» ў Мінску – у прыватнасці, выдатнага беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча ды акадэміка АН СССР Яўгенія Веліхава і скажа: «Трэба фарміраваць грамадскую думку па пытаннях атамнай энергіі, без якой нам не абысціся».

У траўні 1986 г. для кантролю за якасцю прадукцыі быў уведзены новы кантрольны орган, названы *дзяржпрыёмкай*. Гэта прывяло да павелічэння чыноўніцкага апарату і матэрыяльных выдаткаў – пры гэтым якасць прадукцыі практычна не палепшылася.

Навукова-тэхнічны прагрэс таксама не прыйшоў у савецкую эканоміку: дзеля гэтага толькі закліку да свядомасці аказалася недастаткова. У прадпрыемстваў не было матэрыяльных і эканамічных стымулаў для таго, каб абнаўляць і ўдасканальваць вытворчасць.

Неўзабаве кіраўніцтву краіны стала зразумелым, што палітыка паскарэння шмат у чым апіраецца на прыгожыя заклікі, не мае рэальных перспектыў, а для паўнавартаснага росту эканомікі патрэбны іншыя, больш кардынальныя меры.

У 1987 г. канцэпцыю паскарэння замянілі на канцэпцыю перабудовы. На прапанову Гарбачова тагачасныя вядучыя эканамісты Расіі (Леанід Абалкін, Абел Аганбегян, Таццяна Заслаўская, Павел Бунін ды іншыя) распрацавалі праграму эканамічных рэформаў. Яна прадугледжвала пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў на аснове гаспадарчага разліку і самафінансавання, развіццё прыватнага сектара эканомікі ў выглядзе кааператываў у горадзе і фермерства на вёсцы, адмову дзяржавы ад манаполіі знешняга гандлю, больш глыбокую інтэграцыю СССР у сусветны рынак, скарачэнне колькасці міністэрстваў, чыноўніцкага апарату. Некаторыя палажэнні праграмы супярэчылі ўсталяваным ідэалагічным стэрэатыпам, але тым не менш яна была прынята.

У ходзе рэалізацыі праграмы ў краіне адбыліся сур'ёзныя змены. У СССР пачалося фарміраванне прыватнага сектара. Прычым гэты працэс паступова набыў вельмі сур'ёзныя маштабы. Пачалі з'яўляцца кааператывы, усё больш людзей пераходзіла на індывідуальную працоўную дзейнасць, і да 1991 г. агульная колькасць прыватных прадпрымальнікаў у СССР перавысіла 8 млн чалавек.

Але ў дзяржаўным сектары эканомікі справы лепш так і не пайшлі. Адчувальных змяненняў праграма рэформаў у дзяржаўную эканоміку не прынесла. Рабілася відавочным, што эканоміка, заснаваная выключна на дзяржаўнай уласнасці, наогул не мае перспектыў, і Гарбачоў усё больш арыентаваўся на пераход да рынку. У той жа час меры, якія ім прапаноўваліся, не мелі паслядоўнага характару. Так, ён правёў праз Вярхоўны Савет СССР у чэрвені 1990 г. пастанову «Аб канцэпцыі пераходу да рэгуляванай рыначнай эканомікі», а пазней і канкрэтныя законы. Яны прадугледжвалі перавод прамысловых прадпрыемстваў на арэнду, паступовую дэцэнтралізацыю і раздзяржаўленне ўласнасці, стварэнне акцыянерных таварыстваў, развіццё прыватнага прадпрымальніцтва ды іншыя захады.

Аднак рэалізацыя большасці названых мерапрыемстваў адкладалася да 1991 г., а перавод толькі 20 % прадпрыемстваў на арэнду расцягнуўся ў Расіі ажно да 1995 г.

Генсек Гарбачоў баяўся не толькі кансерватараў, здольных спыніць рэформы, але і сацыяльнага выбуху, чым тлумачыцца яго пастаянная затрымка ў рэфармаванні крэдытнай і цэнавай палітыкі, цэнтралізаванай сістэмы забеспячэння. Усё гэта вяло да паглыблення эканамічнага крызісу.

Рэфармаванне сельскай гаспадаркі таксама насіла палавіністы характар. У траўні 1988 г. Гарбачоў абвясціў аб мэтазгоднасці арэнднага падраду на вёсцы: меркавалася заключэнне сялянамі або фермерамі дамовы аб арэндзе зямлі на 50 гадоў і поўнае распараджэнне атрыманай прадукцыяй. Аднак усе правы па надзяленні зямлёю, вызначэнні памераў індывідуальных участкаў і пагалоўя жывёлы павінны былі належаць калгасам, якія, вядома, не былі зацікаўленыя ў з'яўленні канкурэнта. Да лета 1991 г. на арэндных умовах апрацоўвалася толькі 2 % прыдатных да ўраблення зямель і ўтрымлівалася 3 % пагалоўя жывёлы. Самі ж калгасы ў ходзе рэформаў так і не атрымалі рэальнай самастойнасці, застаючыся пад пастаяннай, часам дробязнай апекай раённых партыйных уладаў.

Такім чынам, ніводная з рэформаў, пачатых у эканоміцы, за гады перабудовы так і не дала істотных пазітыўных вынікаў. З 1988 г. пачалося агульнае скарачэнне вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, з 1990 г. – у прамысловасці. Дэфіцыт элементарных прадуктаў хар-




У цэнтральным маскоўскім універмагу. Канец 1980-х гг.



Чарга па гарэлку ў расійскай краме пасля ўвядзення гарбачоўскіх нормаў




Чарга па хлеб у Пераяслаўлі-Залескім (Яраслаўская вобласць). 1991 г.

Крыніца: diletant.media

чавання прывёў да таго, што нават у Маскве было ўведзена іх нарміраванае размеркаванне (чаго не было ад 1947 г.). Чэргі па найважнейшыя прадукты ды іншыя тавары першай неабходнасці, наогул характэрныя для ўсяго савецкага часу, моцна павялічыліся. Ва ўмовах імклівага падзення ўзроўню жыцця насельніцтва простыя людзі ўсё менш верылі ў здольнасць уладаў дамагчыся перамен да лепшага.

Улетку 1989 г. пачаліся першыя масавыя страйкі рабочых, якія сталі з тых часоў звыклай з'явай. Нацыянальныя эліты нерасійскіх рэспублік былі незадаволены непаслядоўнасцю гарбачоўскіх рэформаў або ўвогуле самімі гэтымі рэформамі. Усё гэта таксама адбівалася не толькі на эканамічным, але і на палітычным становішчы Савецкага Саюза. У 1990–1991 гг. звыклай з'явай станавілася забеспячэнне насельніцтва найважнейшымі прадуктамі і прамысловымі таварамі на карткі.

Дэманстрацыя з лозунгам «Дэмакратыя – аснова перабудовы». Другая палова 1980-х гг.




У *знешняй палітыцы* адмова савецкіх кіраўнікоў ад ідэі ажыццяўлення сусветнай рэвалюцыі стала здзейсненым актам. На пачатку 1989 г. Савецкі Саюз вывеў свае войскі з Афганістана і скончыў, такім чынам, бессэнсоўную вайну, якая забрала жыцці немалой колькасці маладых расіян і не толькі. Спыненне актыўнай палітычнай падтрымкі камуністычных рэжымаў ва Усходняй Еўропе прывяло да падзення апошніх. У 1990 г. распаўся СЭУ, а ў пачатку 1991 г. – і Арганізацыя Варшаўскай дамовы. Актывізаваліся перамовы Гарбачова з амерыканскімі прэзідэнтамі па спыненні гонкі ўзбраенняў, якая моцна падрывала найперш савецкую эканоміку. У 1990 г. была падпісана дамова аб ліквідацыі ракет малога і сярэдняга дыяпазону дзеяння. Каб неяк залапіць дзіркі ў неэфектыўнай савецкай народнай гаспадарцы, савецкае кіраўніцтва пачало актыўна браць замежныя крэдыты, знешняя запазычанасць СССР вырасла ў некалькі разоў.

***11.29. Пачаткі дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў Савецкай Расіі і залежных ад яе краінах.*** Разам з тым несумненнай заслугай Міхаіла Гарбачова і часткі ягонага атачэння стала палітыка *галоснасці і дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця* СССР. Няўдачы эканамічных рэформаў па меры развіцця перабудовачных працэсаў пачалі ўсё больш актыўна кампенсавацца праз спробы рэфарматараў пашырыць працэсы дэмакратызацыі і галоснасці на Расію і іншыя савецкія рэспублікі. У рашэннях пленума ЦК КПСС, які адбыўся ў студзені 1987 г., галоўны лозунг перабудовы сфармулявалі наступным чынам: «Больш дэмакратыі,

больш сацыялізму». Мэтай меркаванай палітычнай рэформы было наданне сацыялізму «чалавечага аблічча».

Найбольшых поспехаў гэтая кампанія дасягнула ў сферы выкрыцця злачынстваў сталінізму. У 1987 г. пры ЦК КПСС была створана камісія па рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій на чале з сакратаром ЦК Аляксандрам Якаўлевым. Яна перагледзела ўсе сфальсіфікаваныя ў 1920-я – 1930-я гг. буйныя палітычныя справы. У 1989 г. былі прызнаныя незаконнымі і злачыннымі сталінскія дэпартацыі цэлых народаў; не адпаведнымі законнасці былі прызнаныя гвалтоўныя дзеянні бальшавіцкай улады супраць сялян у гады масавай калектывізацыі.

У 1988 г. у сувязі з 1000-годдзем хрышчэння Русі савецкае кіраўніцтва на чале з Гарбачовым абвясціла пра неабходнасць масавага вяртання храмаў розных канфесій вернікам і пра падтрымку закладання і пабудовы новых храмаў там, дзе ў гэтым была неабходнасць.

Велізарную ролю ў абуджэнні крытычнай свядомасці жыхароў савецкай імперыі да камуністаў і іх сістэмы адыгралі дзеячы літаратуры і мастацтва, рэдактары перыядычных выданняў, найперш літаратурна-мастацкіх часопісаў у Расіі, ва Украіне, у Беларусі. Пра гэта гаворка пойдзе ніжэй, у адпаведным раздзеле.

Пры канцы 80-х гг. ажывілася афіцыёзнае савецкае тэлебачанне, некаторыя перадачы якога сталі вельмі папулярнымі дзякуючы іх шчырасці і свабоднай танальнасці (праграмы «Погляд», «Дванаццаты паверх», «Да і пасля паўночы», «Пятае кола»). Гэтыя перадачы наважыліся звярнуцца да самых балючых і самых трагічных тэмаў, напрыклад, такіх як няўвага ўладаў да моладзі, якая прывяла да росту наркаманіі, алкагалізму і злачыннасці; экалагічныя катастрофы Чарнобыля, Арала і Волгі; самавольства бюракратыі і да т. п. Улетку 1990 г. канчаткова былі ліквідаваныя ўстановы савецкай цэнзуры і так званы спецхран.

Пачалі фармiравацца зародкі шматпартыйнасці. У траўні 1988 г. быў заснаваны *Дэмакратычны саюз* на чале са згаданай раней савецкай дысідэнткай Валерыяй Навадворскай. Пазней узнікаюць Дэмакратычная партыя на чале з інжынерам Мікалаем Траўкіным і Ліберальна-дэмакратычная партыя на чале з палкоўнікам запасу, цюрколагам Уладзімірам Жырыноўскім, апазіцыйнасць якіх да КПСС, аднак, па-сапраўднаму так і не выявілася.

Сталінізм, аднак, не здаваўся. Партыйныя кіраўнікі ў Маскве і на месцах у шматлікіх выпадках бачылі ў новай партыйнай палітыцы пагрозу свайму далейшаму палітычнаму існаванню і, галоўнае, дабрабыту. 13 сакавіка 1988 г. кансерватыўная газета «Советская Россия» апублікавала артыкул ленінградскай артадаксальнай камуністкі Ніны Андрэевай з красамоўнай назвай «Не магу паступіцца прынцыпамі», якую праз некалькі тыдняў кантраляваная Якаўлевым «Правда» назаве «маніфестам антыперабудовачных сіл».

Было зразумела, што ідэі перабудовы для большасці жыхароў імперыі па-ранейшаму заставаліся або незразумелымі, або непрымальнымі, бо думаць і нешта прадпрымаць паводле сваёй ініцыятывы савецкі чалавек у сваёй масе быў адвучаны.

На пачатку 1989 г. у Расіі і залежных ад яе рэспубліках былі праведзены *выбары народных дэпутатаў СССР*. Упершыню ў савецкай гісторыі ў гэтых выбарах маглі ўдзельнічаць альтэрнатыўныя кандыдаты. Але кіраўнічая наменклатура і спецслужбы зрабілі ўсё, каб трымаць працэс вылучэння і рэгістрацыі такіх кандыдатаў на месцах пад поўным сваім кантролем. У выніку ў Расіі непадпарадкаваныя КПСС і КГБ людзі атрымалі перавагу толькі на шэрагу акруг у Маскве, Ленінградзе і ў некаторых буйных прамысловых цэнтрах, у той час як у рэспубліках Балтыі ці ў Заходняй Украіне КПСС прайграла гэтыя выбары з грукатам. Каб забяспечыць хоць якое заўважнае прадстаўніцтва неартадаксальных сіл у будучым савецкім парламенце, Гарбачоў і яго атачэнне арганізавалі выбары часткі дэпутатаў ад грамадскіх арганізацый. Так, напрыклад, дэпутатам па спісах Акадэміі навук СССР здолеў стаць выпушчаны незадоўга перад тым з ніжагародскай высылкі акадэмік Андрэй Сахараў.

Па выніках выбараў у траўні 1989 г. быў скліканы *з'езд народных дэпутатаў СССР*, які выклікаў велізарную цікавасць сярод актыўных жыхароў імперыі (пасяджэнні з'езда ўжывую трансляваліся па савецкім тэлебачанні і радыё). Актыўная меншасць дэпутатаў неадкладна сфарміравала *Міжрэгіянальную дэпутацкую групу*, галоўнымі асобамі ў якой сталі той жа акадэмік Сахараў, а таксама юрыст Анатоль Сабчак, эканаміст Гаўрыіл Папоў, гісторык Юрый Афанасьеў, Барыс Ельцын – былы прадстаўнік высокай партыйнай наменклатуры, пазбаўлены сваёй пасады Гарбачовым. На пачатку

дзейнасці да гэтай групы (якая складалася з 388 чалавек, каля 20 % ад агульнай колькасці выбраных дэпутатаў) далучыліся прадстаўнікі саюзных рэспублік, сярод якіх былі беларускія пісьменнікі Васіль Быкаў і Алесь Адамовіч, эстонскія навукоўцы Мар'ю Лаўрысцін і Віктар Пальм (адзін з лідараў групы), украінскія літаратары Віталь Кароціч і Уладзімір Яварыўскі, вучоны Іван Вакарчук; літоўскі навуковец Антанас Бурачас, латышска-руская пісьменніца і журналістка Марына Касцянецкая, будучы кіраўнік незалежнай Беларусі фізік Станіслаў Шушкевіч ды іншыя. Гарбачоў выбраў тактыку манеўравання паміж кансерватыўнай большасцю і «міжрэгіяналамі», а таксама згуртаванымі фракцыямі дэпутатаў ад рэспублік Балтыі. Імкнучыся неяк утрымацца ва ўладзе, ён правёў праз з'езд народных дэпутатаў законапраект аб заснаванні пасады *прэзідэнта СССР* і 15 сакавіка 1990 г. быў зацверджаны з'ездам на гэтай пасадзе.

***11.30. Распад савецкай імперыі. Расійская Федэрацыя як самастойная дзяржава.*** Палітыка Гарбачова, папраўдзе, толькі паскарала распад савецкай імперыі. Увесну 1990 г. ва ўсіх яе частках прайшлі выбары ў Вярхоўныя Саветы адпаведных тэрыторый. Гэтыя выбары аказаліся больш дэмакратычнымі ў параўнанні з выбарамі народных дэпутатаў СССР, у выніку чаго нацыянальныя эліты, а найперш іх рэфарматарскія часткі, займелі істотнае прадстаўніцтва ў Расіі, а таксама ў рэспубліках Балтыі, ва Украіне, у Беларусі, Малдове, Грузіі, Арменіі, Азербайджане. Праз кароткі час пасля гэтых выбараў акты аб незалежнасці сваіх краін або пра пацверджанне раней абвешчанай незалежнасці прынялі ўсенародна абраныя парламенты краін



Першы прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Барыс Ельцын. *Здымак 1994 г.*

Балтыі, а таксама Грузіі і Арменіі. Неўзабаве Вярхоўныя Саветы РСФСР, Украіны і Беларусі прынялі свае дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, якія, аднак, пакідалі магчымасць заключэння рэальнай саюзнай дамовы. 12 чэрвеня 1991 г. Барыс Ельцын быў абраны ў выніку ўсенароднага галасавання прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі: за яго прагаласавалі 45,5 млн расіян (57,3 %), у той час як яго галоўны канкурэнт, былы саюзны прэм'ер Мікалай Рыжкоў набраў толькі каля 13,4 млн галасоў (16,9 %).

Міхаіл Гарбачоў апынуўся сярод маскоўскіх палітыкаў у пройгрышным стане: ініцыятыва рэформаў перайшла ад саюзнага цэнтра да Расіі і іншых складовых частак імперыі. На фоне далейшага фатальнага пагаршэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі іншага выйсця, акрамя як праводзіць сапраўды радыкальныя рэформы, не заставалася. Але Гарбачоў і яго атачэнне ўжо не мелі для гэтага ані крэдыту даверу, ані рэальных рэсурсаў. Давер да самога Гарбачова быў істотна падарваны таксама ў выніку зробленай з яго ведама спробы сіламі савецкіх войскаў акупаваць Літву, парламент якой у студзені 1991 г. абвясціў пра *аднаўленне незалежнасці* Літоўскай Рэспублікі. У выніку ваеннай авантуры, учыненай у Вільні 11–13 студзеня, загінулі людзі, збольшага маладыя.

Апошняе, на што спадзявалася крамлёўская групоўка, было заключэнне пад патранатам Міхаіла Гарбачова новай саюзнай дамовы.

У сакавіку 1991 г. з ініцыятывы савецкага кіраўніцтва быў арганізаваны рэферэндум, у якім у той ці іншай форме прынялі ўдзел жыхары 9 з 15 краін савецкай імперыі. Зацвярджаючы яшчэ ў снежні 1990 г. рашэнне аб правядзенні такога рэферэндуму, з'езд народных дэпутатаў СССР не прадугледзеў аніякіх заканадаўчых або юрыдычных наступстваў любога рашэння, за якое прагаласуе большасць. Мала таго, самі фармулёўкі пытанняў рэферэндуму выглядалі надзвычай заблытана: звычайным грамадзянам трэба было галасаваць за тое, што яны сабе наўрад ці неяк рэальна ўяўлялі – за «абноўлены Саюз». Хто, якім чынам і калі яго будзе «абнаўляць», не тлумачылася. Акрамя таго, парламенты рэспублік унеслі свае змены ў фармулёўкі і пералік пытанняў, што прапаноўваліся на рэферэндум, а ў Беларусі, насуперак дзейнаму заканадаўству, арганізацыяй рэферэндуму заняўся не Вярхоўны Савет, а яго прэзідыум.



Прэс-канферэнцыя путчыстаў у Маскве 19 жніўня 1991 г.

Згодна з вынікамі рэферэндуму 80 % жыхароў Расіі падтрымалі правядзенне ўсеагульных выбараў уласнага прэзідэнта, і толькі каля 50 % масквічоў і ленінградцаў выказалі жаданне захаваць Савецкі Саюз у прапанаваным выглядзе.

Так ці іначай, метадамі эканамічнага шантажу, выкарыстання кампрамату, сабранага КГБ на кіраўніцтвы рэспубліканскіх кампартый, саюзным кіраўнікам удалося дамагчыся ад дзевяці рэспублік згоды на падпісанне новай саюзнай дамовы, якое было прызначана на дзень 21 жніўня 1991 г. Але ў ноч на 19 жніўня, калі Міхаіл Гарбачоў знаходзіўся на сваёй дачы ў Крыме, група савецкіх кіраўнікоў на чале з шэфам КГБ Уладзімірам Кручковым, прэм'ер-міністрам СССР Валянцінам Паўлавым, міністрам абароны маршалам Дзмітрыем Язавым і міністрам унутраных спраў Барысам Пугам здзейсніла путч і паспрабавала перадаць уладу намінальнаму віцэ-прэзідэнту СССР Генадзію Янаеву.

У гэтай сітуацыі ўсенародна абраны прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын, аднак, ніяк не мог падпарадкавацца ініцыятыве дзеячаў сумнеўнай легітымнасці. Выдаўшы ўказ з асуджэннем путчу, ён згуртаваў вакол сябе актыўную частку насельніцтва Масквы і не даў путчыстам ажыццявіць свае намеры. Арганізатары путчу былі арыштаваны, а міністр Барыс Пуга скончыў жыццё самагубствам (гэтае самае зрабіў і захавальнік партыйнай касы КПСС Мікалай Кручына). Міхаіл Гарбачоў вярнуўся ў Маскву, але яго паўнамоцтвы на гэты момант нагадвалі палітычныя паўнамоцтвы сучаснай англійскай

каралевы. На яго вачах 23 жніўня 1991 г. Барыс Ельцын падпісаў указ аб спыненні дзейнасці кампартыі на тэрыторыі Расіі.

У гэтыя дні былі вернуты ва ўжытак дарэвалюцыйныя дзяржаўныя сімвалы Расіі – бела-сіне-чырвоны сцяг і герб з двухгаловым арлом (адпаведны федэральны закон будзе прыняты значна пазней, 25 снежня 2000 г.).



Дзяржаўны сцяг
Расійскай Федэрацыі
(1991 г.)



Дзяржаўны герб
Расійскай Федэрацыі,
зацверджаны ў 2000 г.

Сітуацыя разборак у Маскве паміж Гарбачовым, путчыстамі і Ельцыным выразна прадэманстравала дэпутатам Вярхоўных Саветаў рэспублік, што заставацца далей у выбухованебяспечнай імперыі папросту рызыкоўна. На працягу дзесяці дзён пасля краху путчу парламенты Эстоніі, Латвіі, Украіны, Беларусі, Малдовы, Азербайджана прынялі законы аб поўнай незалежнасці сваіх краін (Літва, Грузія, Арменія зрабілі гэта яшчэ раней). Праз пэўны час маскоўскім палітыкам стала зразумела, што яны ўжо не могуць сабраць кворум для пасяджэнняў з'езда народных дэпутатаў СССР, які, нагадваем, выконваў функцыі саюзнага парламента.

8 снежня 1991 г. падчас візіту ў Беларусь прэзідэнта Расіі Ельцына і новаабранага прэзідэнта Украіны Леаніда Краўчука ў *Віскулях* на беларускай Брэстчыне была падпісана дэкларацыя, у якой канста-



Падпісанне пагаднення ў Віскулях (Беларусь) 8 снежня 1991 г.
Злева направа сядзяць: Вітольд Фокін (прэм'ер міністр Украіны), Леанід Краўчук (прэзідэнт Украіны), Станіслаў Шушкевіч (старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі), Вячаслаў Кебіч (прэм'ер-міністр Беларусі), Барыс Ельцын (прэзідэнт Расіі), Генадзій Бурбуліс (дзяржсакратар Расіі)

тавалася, што Савецкі Саюз перастаў існаваць як геапалітычная рэальнасць. Узамен у якасці «абноўленага саюза» прапанавалася стварыць канфедэратыўнае ўтварэнне ў выглядзе Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) з цэнтрам у Мінску. Падрабязны механізм гэтага працэсу быў распрацаваны і прыняты на сустрэчы кіраўнікоў 11 былых савецкіх рэспублік у горадзе Алматы (Казахстан), якая адбылася 19–21 снежня 1991 г. і ў якой у якасці члена беларускай дэлегацыі прымаў удзел адзін з аўтараў гэтай кнігі.

Пасля таго як Міхаіл Гарбачоў 25 снежня склаў з сябе паўнамоцтвы прэзідэнта СССР, Расійская федэрацыя дэ-юрэ і дэ-факта зрабілася незалежнай і суверэннай дзяржавай, пасля чаго яе кіраўніцтва пачало ўсё больш і больш адыходзіць ад выканання першапачатковых віскулёўскіх і алматынскіх дамоўленасцяў. Так, нерасійскія саюзныя рэспублікі так і не атрымалі сваёй долі ў замежнай маёмасці Савецкага Саюза, у тым ліку той, што датычылася яго дыпламатычных прадстаўніцтваў. Не былі справядліва акцыянаваныя прадпры-

емствы (найперш паліўна-энергетычнага комплексу), у стварэнні і функцыянаванні якіх брала ўдзел далёка не толькі грамадзяне Расіі. Расійскія войскі так і не былі выведзеныя з тэрыторыі Малдовы або Грузіі (якая крыху пазней на пэўны час таксама далучылася да СНД).

Сённяшнія імперскія палітыкі і гісторыкі Расіі, а таксама расійскія сродкі дзяржаўнай і калядзяржаўнай прапаганды схільныя бачыць нейкі «заходні след» у распадзе савецкай імперыі, што адбыўся ў 1990–1991 гг. Факты, аднак, сведчаць зусім пра іншае.

Падчас сустрэчы прэзідэнта ЗША Джорджа Буша-старэйшага і прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова 17 ліпеня 1991 г. амерыканскі прэзідэнт адназначна заявіў Гарбачову: «З рэспублікамі вы разбераецеся. Нам нічога не дасць, калі СССР пачне распадацца…» 6 верасня таго ж года Дзяржсавет СССР афіцыйна прызнаў незалежнасць Латвіі, Літвы, Эстоніі, але супраць незалежнасці іншых рэспублік паранейшаму выступалі і гарбачоўскае кіраўніцтва Савецкага Саюза, і найбуйнейшыя краіны Захаду. Так, яшчэ 6 лістапада 1991 г., калі саюзныя структуры ўжо не функцыянавалі, тагачасны пасол ЗША ў Маскве Роберт Шварц Страўс на сустрэчы з Гарбачовым чарговы раз пацвердзіў такую пазіцыю: «…ЗША зацікаўленыя ў захаванні Саюза і ў поспеху Гарбачова».

Так або іначай, у самым канцы 1991 года пачаўся новы этап развіцця суверэннай расійскай дзяржаўнасці.

***11.31. Культура Расіі часоў перабудовы.*** Як ужо адзначалася вышэй, спробы гарбачоўскага партыйнага кіраўніцтва дэмакратызаваць грамадска-палітычнае жыццё ў савецкай імперыі другой паловы 1990-х гг. прывялі да небывалага ўсплёску зацікаўленасці даволі вялікай колькасці насельніцтва літаратурна-мастацкімі здабыткамі, якія замоўчваліся ў папярэднія гады камуністычнай улады.

Выхад у свет твораў, раней забароненых цэнзурай, прыпаў найперш на 1987–1989 гг.: тады масаваму чытачу сталі даступныя такія празаічныя творы несавецкіх аўтараў, як «Мы» Яўгенія Замяціна, «Сабачае сэрца» Міхаіла Булгакава, «Ювенільнае мора» і «Катлаван» Андрэя Платонава, «Калымскія апавяданні» Варлама Шаламава, «Аповесць непагашанай поўні» Барыса Пільняка, «Соф'я Пятроўна» Лідзіі Чукоўскай; забароненыя раней паэмы рускіх паэтаў Ганны Ах-

матавай («Рэквіем»), Аляксандра Твардоўскага («Па праву памяці»), аварскага паэта Расула Гамзатава («Людзі і цені»), калмыцкага паэта Міхаіла Ханінава («Мой шлях») і іншых. Акрамя мастацкай прозы пабачылі свет шматлікія мемуары, дакументы, дзённікі: успаміны Надзежды Мандальштам, Лізаветы Драбкінай, дзённік Канстанціна Сіманава «Вачыма чалавека майго пакалення» .

Кульмінацыйным пунктам працэсу вызвалення слова можна лічыць зняццё забароны з творчасці прадстаўнікоў трэцяй хвалі эміграцыі, якія пакінулі СССР у 1970-х гг. або наогул вызначаліся сваім дысідэнцтвам. У гэтым сэнсе значнай падзеяй стала выданне кніг паэзіі Іосіфа Бродскага і Аляксандра Галіча, прозы Віктара Някрасава, Васілія Аксёнава і асабліва Аляксандра Салжаніцына.

Свабода ў вырашэнні творчых задач, выбары рэпертуару, адмова ад адміністрацыйных метадаў кіраўніцтва ў другой палове 80-х гг. таксама далі свае вынікі ў галіне *тэатральнага мастацтва*. «Срэбнае вяселле» Аляксандра Мішарына ў тэатры МХАТ (пастаноўка Алега Яфрэмава), «Круты маршрут» паводле Яўгеніі Гінзбург у «Сучасніку» (пастаноўка Галіны Волчак), «Гавары!» паводле Валянціна Авечкіна ў Тэатры імя М. Ярмолавай (пастаноўка Валерыя Фокіна), «Цытата» Леаніда Зорына ў Тэатры імя Массавета (пастаноўка Паўла Хомскага), «Самазабойца» Мікалая Эрдмана ў тэатры на Таганцы (пастаноўка Юрыя Любімава), «Браты і сёстры» паводле Фёдара Абрамава ў ленінградскім Малым драматычным тэатры (пастаноўка Льва Додзіна) ды іншыя адлюстравалі перамены ў жыцці краіны. Сур'ёзным фактам узбагачэння рэпертуару тэатраў стала вяртанне на сцэну канфіскаваных з культурнай спадчыны краіны твораў савецкіх класікаў. Шмат якія тэатры паставілі «Сабачае сэрца» паводле Міхаіла Булгакава; п'еса Андрэя Платонава «14 чырвоных хатак» атрымала прызнанне ў пастаноўцы Аляксандра Дзекуна на сцэне Саратаўскага драматычнага тэатра.

Вельмі папулярнымі ў гэты час былі *мастацкія кінафільмы*, знятыя рэжысёрамі Эльдарам Разанавым («Забытая мелодыя для флейты», «Дарагая Алена Сяргееўна», «Нябёсы абяцаныя»), Пятром Тадароўскім («Інтэрдзяўчынка»), Леанідам Гайдаем («Прыватны дэтэктыў, або Аперацыя «Кааперацыя»), Сяргеем Салаўёвым («Ас-са»), Савам Кулішом («Трагедыя ў стылі рок»), Васіліем Пічулам («Малень-



Крыніца: 112.ua

Кінарэжысёр Эльдар Разанаў

кая Вера»), Ігарам Госцевым («Бязмежжа»), Аляксандрам Рагожкіным («Міс мільянерка»), Ісакам Фрыдбергам («Лялечка») і іншымі. Добра вядомымі ў Расіі былі фільм грузінскага рэжысёра Тэнгіза Абуладзэ «Пакаянне» (13,6 млн праглядаў у СССР), стужкі беларускіх рэжысёраў Віктара Дашука («Двое на востраве слёз») і Валерыя Рыбарава («Мяне завуць Арлекіна»).

Сярод *мастакоў-жывапісцаў* класічнай школы ў гэты час папулярнымі зрабіліся Ільля Глазуноў і Аляксандр Шылаў (хоць стаўленне да іх твораў па сёння неадназначнае), карэльскі мастак Алег Юнтунен. Цікава выглядалі эксперыменты з колерамі мастака Барыса Маркоўнікава.

Адметнымі былі працы башкірскіх мастакоў Міраса Даўлетбаева і Міхаіла Назарава. Легальна пачалі працаваць вядомыя мастакі авангарду і поставангарду (Дзмітрый Прыгаў, Ігар Вулах, Сяргей Міроненка, Георгій Кізевальтэр, Аляксандр Касянкоў, Леанід Іваноў ды іншыя). Вядомасць займелі *скульптурныя працы* дагестанскага разьбяра Юрыя Ішханава.

Асаблівае гучанне набылі творы руска-карэйскага рок-музыканта Віктара Цоя, а яго песня «Пераменаў!» стала своеасаблівым гімнам эпохі перабудовы.



Барыс Маркоўнікаў.
Чырвоны рытм. 1990 г.

Істотнае значэнне для дэмакратызацыі культурнага жыцця на савецкай прасторы мела стварэнне пры канцы 1986 г. *Савецкага Фонду культуры*, які ўзначаліў акадэмік Дзмітрый Ліхачоў.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Апазіцыя*** – групоўка асоб, не згодных з афіцыйнай дзяржаўнай палітыкай.

***Бальшавікі*** – удзельнікі палітычных груповак радыкальнага напрамку, якія выступалі ў гісторыі пад назвамі Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі (бальшавікоў), Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў), Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (КПСС). Мэтай дзейнасці гэтых груповак была поўная манапалізацыя і бестэрміновае ўтрыманне ў сваіх руках палітычнай улады ў Расіі і падкантрольных ёй краінах, элімінацыя любых палітычных апанентаў з выкарыстаннем неабмежаванай прапаганды, маніпулявання грамадскай свядомасцю, а пры неабходнасці – з дапамогай тэрору і фізічнага вынішчэння. Лідарамі бальшавіцкай групоўкі былі Уладзімір Ленін і Іосіф Сталін. Пазнейшыя кіраўнікі (Мікіта Хрушчоў, Леанід Брэжнеў ды іншыя) удасканальвалі метады тэрору праз яго «кропкавае» ўжыванне.

***Бюракратыя*** – праслойка грамадства, прадстаўнікі якой належаць да найвышэйшай чыноўніцкай адміністрацыі; у недэмакратычных дзяржавах бюракратыя трымае ў сваіх руках вырашэнне практычна ўсіх канкрэтных жыццёвых пытанняў грамадзян.

***Вялікая Айчынная вайна*** – прынятае ў савецкай і сучаснай расійскай гістарычнай літаратуры абазначэнне перыяду Другой сусветнай вайны пасля нападу Гітлера на Савецкі Саюз і перапыненне саюзніцкіх адносінаў паміж Гітлерам і Сталіным (чэрвень 1941 – травень 1945).

***Грамадзянская вайна ў Расіі*** – арганізаванае ўзброенае змаганне за ўладу, якое вялося ў 1918–1923 гг. па ўсёй краіне і ў асобных яе рэгіёнах паміж рознымі групоўкамі з выкарыстаннем замежнай вайсковай і фінансавай падтрымкі.

***ГУЛАГ*** – руская абрэвіятура назвы «Галоўнае ўпраўленне папраўча-працоўных лагераў». Гэты орган быў створаны паводле рашэння

бальшавікоў дзеля забеспячэння магчымасцяў арганізацыі паднявольнай працы ў Савецкім Саюзе. Афіцыйна функцыянаваў у 1934–1956 гг.

***Камунізм*** – утапічная мадэль бяскласавага грамадства будучыні, кожны ўдзельнік якога будзе працаваць без эканамічных стымулаў. Прыдумана нямецкімі мысьлярамі Карлам Марксам і Фрыдрыхам Энгельсам.

***Дыктатура*** – улада, не абмежаваная і не звязаная ніякімі законамі, прынятымі легітымнымі органамі, якая забяспечвае палітычнае панаванне той або іншай палітычнай групоўкі, а таксама спосаб утрымання гэтай улады; палітычны рэжым.

***Дэпартацыя*** – прымусовае перасяленне карэннага насельніцтва пэўнай тэрыторыі з ідэалагічных або палітычных прычын.

***Калгасы і саўгасы*** – бальшавіцкія структуры новага запрыгоньвання сялян. Ствараліся пачынаючы з канца 1920-х гг. гвалтоўнымі метадамі праз адбіранне ў сялян зямлі і інвентару пад выглядам «калектывізацыі сельскай гаспадаркі». Да сярэдзіны 1960-х гг. калгаснікі былі пазбаўлены права мець пашпарт, атрымоўваць грашовае ўзнагароджанне за сваю працу і дзяржаўныя пенсіі.

***Калабарацыя*** – добраахвотнае супрацоўніцтва з іншаземнымі акупантамі.

***Камсамол*** – структура, створаная бальшавіцкай групоўкай у 1918 г. дзеля прапагандавання сваіх метадаў кіравання сярод часткі моладзі ды ажыццяўлення палітычнага кантролю над усёй моладдзю Расіі і залежных ад яе краін.

***Кантрыбуцыя*** – прымусовыя плацяжы, якія спаганяюцца пасля заканчэння вайны краінамі-пераможцамі з пераможаных краін.

***Канцэсія*** – дамова аб перадачы на пэўны тэрмін прыналежных пэўнай дзяржаве прыродных багаццяў або гаспадарчых аб'ектаў.

***Культ асобы*** – прыдуманая постбальшавіцкімі камуністамі метафара для тлумачэння тэрору, арганізаванага ў Расіі і залежных ад яе краінах Сталіным і яго памагатымі.

***Латышскія стралкі*** – прафесійныя вайскоўцы былой расійскай арміі латышскага паходжання, якія ў першы час існавання бальшавіцкай улады забяспечвалі неабходны мінімум вайсковай сілы для яе ўтрымання маскоўскай кіраўнічай групоўкай. Вялікая колькасць іх была фізічна знішчана падчас сталінска-бальшавіцкага тэрору.

***Левыя эсэры*** – адзіная палітычная групоўка на тэрыторыі былой імператарскай Расіі, якой бальшавікі пасля захопу ўлады дазвалялі легальна дзейнічаць да сярэдзіны 1918 г., калі яны ўваходзілі таксама ў склад урада Леніна, і на кароткі тэрмін на пачатку 1920-х гг. Лідары групоўкі – Марыя Спірыдонава, Марк Натансон, Ісак Штэйнберг.

***Народныя камісарыяты*** (***наркаматы***) – структуры галіновага дзяржаўнага кіравання ў бальшавіцкіх урадах; у 1946 г. былі пераўтвораны ў міністэрствы.

***Наменклатура партыйная*** – у савецкі час вызначаны бальшавіцкімі ўладамі пералік асоб, якія рэкамендуюцца для заняцця партыйна-дзяржаўных пасадаў.

***НЭП*** (***новая эканамічная палітыка***) – палітыка вымушаных саступак бальшавіцкай групоўкі сялянам на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, абвешчаная ў 1921 г. Сутнасць НЭПу палягала ў замене гвалтоўнай харчразвёрсткі на харчовы падатак, дзякуючы якому селянін атрымоўваў магчымасць сам распараджацца рэшткамі выробленай ім сельгаспрадукцыі. Гэтыя крокі ўлады змусілі яе пагадзіцца таксама на абмежаванае функцыянаванне прыватнай уласнасці ў іншых сферах эканомікі. Гэтая палітыка была згорнутая пасля абвяшчэння палітыкі «калектывізацыі сельскай гаспадаркі» пры канцы 1920-х гг.

***Палітбюро*** (***у пэўны перыяд – Прэзідыум***) ***Цэнтральнага камітэта*** (***ЦК***) – назва калектыўнага дарадчага органа бальшавіцкай партыі, на пасяджэннях якога абмяркоўваліся найважнейшыя пытанні ажыццяўлення ўлады бальшавікоў у Расіі і залежных ад яе краінах.

***Перабудова*** (***перестройка***) – новы курс, абвешчаны кіраўніком расійскіх камуністаў Міхаілам Гарбачовым у другой палове 1980-х гг., паводле якога кіраўнічы рэжым на фоне сур'ёзнага сацыяльнага і эканамічнага крызісу павінен быў стварыць прыкметы ўнутрана- і знешнепалітычнай легітымізацыі. Палітыка пацярпела крах у сувязі з адарванасцю камуністычных функцыянераў ад рэалій жыцця народаў савецкай імперыі.

***Путч*** – дзяржаўны пераварот або яго спроба.

***Руская вызвольная армія*** – назва вайсковых злучэнняў так званага «Камітэта вызвалення народаў Расіі», створаных пад кантролем нацысцкай Германіі дзеля змагання з бальшавікамі на чале з былым савецкім генералам Андрэем Уласавым.

***Рэабілітацыя*** – вяртанне правоў і добрага імя раней рэпрэсаваным або інакш пакараным асобам.

***Савет народных камісараў*** – назва бальшавіцкіх урадаў да 1946 г. Пазней перайменаваны ў Савет міністраў.

***Савецкая ўлада*** – сістэма структур у Расіі і залежных ад яе краінах, якая была створана для фармальнага прыкрыцця рэальнай улады бальшавіцкай і постбальшавіцкай палітычнай групоўкі. Выбары ў саветы арганізоўваліся на безальтэрнатыўнай аснове пад поўным кантролем названай групоўкі. Фармальна найвышэйшымі органамі гэтай сістэмы з'яўляліся цэнтральныя выканаўчыя камітэты (пазней – Вярхоўныя Саветы) Расіі і залежных ад яе саюзных рэспублік, якія дапаўняліся губернскімі (пазней – абласнымі), павятовымі (пазней – раённымі), гарадскімі і сельскімі саветамі на месцах.

***Сацыялізм*** – паводле марксісцкай тэорыі, першая фаза камунізму, калі дапускаецца сацыяльнае расслаенне грамадства і існаванне іншай, акрамя агульнай, уласнасці на сродкі вытворчасці.

***Саюзныя рэспублікі*** – тэрытарыяльна-дзяржаўныя ўтварэнні, узаконеныя пры канцы 1922 г. дзеля забеспячэння бальшавіцка-імперскага кантролю над элітамі і насельніцтвам нярускіх нацыянальнасцяў.

***Свяшчэнны сінод Рускай праваслаўнай царквы*** – створаны ў 1943 г. пад кантролем бальшавіцкіх кіраўнікоў найвышэйшы орган канфесіі, які ўзначальваецца патрыярхам і традыцыйна цесна супрацоўнічае з любой расійскай дзяржаўнай уладай.

***Сепаратны мір*** – дамова аб міры, заключаная двума бакамі ваеннага канфлікту без згоды трэціх удзельнікаў.

***Стагнацыя*** – эканамічны крызіс.

***Сталінска-бальшавіцкі тэрор*** – сістэма мераў запалохвання і фізічнага вынішчэння насельніцтва Расіі з мэтай выключэння любых праяў крытыкі бальшавікоў за іх няўдачы ў ажыццяўленні сацыяльна-эканамічнай палітыкі, а таксама спынення спробаў ажыўлення іншанацыянальных эліт. Метады яго ажыццяўлення былі адпрацаваны падчас «чырвонага тэрору», абвешчанага ў ленінскі час.

***Устаноўчы сход*** – прадстаўнічы орган у Расіі, мэтай дзейнасці якога павінна было стаць вызначэнне дзяржаўнага ладу будучай Расіі. Яго дэпутаты былі выбраныя падчас усеагульных выбараў 1917 г., ужо пасля захопу ўлады бальшавікамі; тым не менш апошнія разагналі яго ў студзені 1918 г.

***Харчразвёрстка (продразвёрстка)*** – сістэма нарыхтовак сельгаспрадуктаў у Савецкай Расіі; існавала ў 1919–1921 гг. і палягала ў забеспячэнні прымусовай здачы сялянамі ўсёй выробленай імі сельгаспрадукцыі па вызначаных бальшавіцкімі чыноўнікамі коштах.

***Цэнтральны камітэт (ЦК)*** – кіраўнічы орган бальшавіцкай, потым камуністычнай, партыі, які з ацвярджаў прынятыя вузкім колам партыйных лідараў рашэнні.

***ЧК*** – руская размоўная абрэвіятура назвы «Надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам». Адпаведны орган быў створаны ў снежні 1917 г. для т эрарызавання насельніцтва, якое з тых або іншых пр ычын не падпарадкоўвалася бальшавіцкай уладзе. Паклаў пачатак існаванню бальшавіцкіх спецслужбаў, якія пазней функцыянавалі пад назвамі Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (руская размоўная абрэвіятура: ГПУ), Народнага камісарыята / міністэрства дзяржаўнай бяспекі (НКГБ/МГБ), Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў (КГБ). Гэтыя с труктуры дзейнічалі выключна на падставе рашэнняў кіраўнічых органаў бальшавіцкай партыі і выкарыстоўвалі самыя разнастайныя метады, уключна з тэрарыстычнымі.

***Халодная вайна*** – тэрмін, якім абазначаецца ідэалагічнае ды палітычнае супрацьстаянне Расіі і дэмакратычных краін Захаду. Сваіх найбольшых маштабаў яна дасягала ў 1946–1985 гг. і пасля 2014 г.

***Чырвоная армія*** – афіцыйная назва ўзброеных сіл бальшавіцкай дзяржавы, створаных у 1918 г. з ініцыятывы Льва Троцкага; з 1946 г. называлася Савецкай арміяй, якая пры канцы 1991 г. дала пачатак сучасным Узброеным сілам Расійскай Федэрацыі. Мела несумненныя заслугі ў нанясенні паражэння гітлераўскай Германіі і вайсковаму рэжыму Японіі ў Другой сусветнай вайне.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА

Арутюнов, А. А. Ленин. Личностная и политическая биография (Документы, факты, свидетельства): в 2 т. Москва: Вече, 2003. 960 с.

Боффа, Дж. История Советского Союза: в 2 т. / пер. с ит. Москва: Междунар. отношения, 1994. 1264 с.

В Политбюро ЦК КПСС...: По записям Анатолия Черняева, Вадима

Медведева, Георгия Шахназарова (1985–1991) / сост. А. Черняев (рук. проекта), А. Вебер, В. Медведев (Горбачев-Фонд). Москва: Альпина Бизнес Букс, 2006. 784 с.

Великая Отечественная война. Книга потерь / Г. Ф. Кривошеев [и др.]. Москва: Вече, 2009. 384 с.

Вішнеўскі, А. Ф. Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917–1953). Мінск: ТЭСЕЙ, 2002. 224 с.

Геллер, М. Я., Некрич, А. М. Утопия власти. Москва: МИК, 2000. 856 с.

Деготь, Е. Русское искусство XX века. Москва: Трилистник, 2002. 224 с.

История России. XX век / под ред. А. Б. Зубова: в 2 т. Москва: АСТ, 2009. Т. I – 1894–1939 гг.: 1024 с. Т. II – 1939–2007 гг.: 848 с.

История России. XX век / под ред. В. И. Меньковского и О. И. Яновского. Минск: РИВШ, 2005. С. 37–572.

Коряков, М. Живая история. 1917–1975. Мюнхен: Echo Press, 1977. 514 с.

Ложь и статистика: как данные об экономике СССР завысили в три раза // Финмаркет. 22.07.2013. *Рэжым доступу*: http://www.finmarket.ru/main/article/3407649.

Лубянка: Органы ВЧК–ОГПУ–НКВД–НКГБ–МГБ–МВД–КГБ / авторы-сост. А. И. Кокурин, Н. В. Петров. Москва: МФД, 2003. 768 с.

Маракоў, Л. Ахвяры і карнікі. Мінск: [б. в.], 2007. 440 с.

Мельтюхов, М. И., Проэктор, Д. М. Блицкриг в Европе, 1939 –1941. Польша. Москва: АСТ, Terra Fantastica, 2004. 480 с.

Ратьковский, И. Хроника красного террора ВЧК. Карающий меч революции. Москва: Яуза, 2017. 320 с.

СССР – Германия. 1939–1941: сб. документов / сост. Ю. Фельштинский. Вильнюс: Мокслас, 1989. Ч. 1: 128 с. Ч. 2: 192 с.

Савенко, С. И. История русской музыки XX столетия: От Скрябина до Шнитке. Москва: Музыка, 2008. 232 с.

Сміт, Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі / пер. з англ. Мінск: БФС, 1995. С. 124–157.

Улейчик, Н. Л. История культуры России XX века. Гродно: ГрГУ, 2014. 47 с.

Філіпенка, У. С. Гісторыя навейшага часу: вуч.-метад. комплекс для студэнтаў: у 2-х ч. Наваполацк: ПДУ, 2012. Ч. 1 – 268 с.; Ч. 2. – 356 с.

Хлевнюк, О. В. Хозяин. Сталин и утверждение сталинской диктатуры. Москва: РОССПЭН, 2012. 479 с.

Хоффманн, Й. История власовской армии / пер. с нем. Париж: YMCA-Press, 1990. 379 с.

Художественная культура. XVIII – начало XXI века: пособие / авт.-сост. С. Ю. Лебедев. Минск: Дизайн ПРО, 2007. С. 222–231, 237–247, 262–268, 288–305, 307–313, 319–326, 357–378.

Fischer, A., Prof. Dr. Sowjetische Außenpolitik 1917–1945. Stuttgart: Klett-Verlag, 1973. 137 S.

Germany and Revolution in Russia 1915–1918. Documents from the Archives of the German Foreign Ministry. Ed. by Z. A. B.Zeman. L., N. Y., Toronto, Oxford University Press, 1958. 158 p.

Hildermeier, M. Geschichte der Sowjetunion. 1917–1991. Entstehung und Niedergang des ersten sozialistischen Staates. 2. überarb. Aufl. München: C. H. Beck, 2017. 1348 S.

Hosking, G. A History of the Soviet Union. 1917–1991. N. Y.: Harpers Collins Publishers 2002. 525 p.

Schlaglichter der Weltgeschichte. In Zusammenarbeit mit Helmut M. Müller u. a. Bonn: Bundeszentrale für politische Bildung, 1992. S. 368–600.

Werth, N. Histoire de l'Union soviétique. De l'Empire russe à la Communauté des États indépendants. (Collection Themis histoire). Paris: Puf, 2008. 576 p.

Werth, N. La Terreur et le désarroi. Staline et son système. (Collection Tempus). Paris: Perrin, 2007. 614 p.

# 12. ПОСТСАВЕЦКАЯ РАСІЯ: ЭВАЛЮЦЫЯ АД ФАРМІРАВАННЯ АСНОЎ ДЭМАКРАТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ДА СПРОБ АДРАДЖЭННЯ ІМПЕРЫІ

***12.1. Расійская Федэрацыя за часамі прэзідэнта Барыса Ельцына.*** У тых умовах, якія склаліся ў Расіі пры канцы 1991 г. (велізарная інфляцыя, калапс эканомікі, пустыя паліцы ў дзяржаўных крамах), краіна вымушана была стаць на шлях радыкальных рэформаў. У кастрычніку 1991 г. новы ўрад на чале з эканамістам Ягорам Гайдарам прапанаваў праект рэформы, скіраванай на ўкараненне рынкавых адносінаў.

Спадзяванні рэфарматараў на поспех звязваліся з тым, што даведзены папярэднімі кіраўнікамі да паўжабрацкага стану расійскі народ быў гатовы ўспрыняць хуткую «шокавую тэрапію», і з тым, што Расіі ўдасца атрымаць буйныя стабілізацыйныя крэдыты ад *Міжнароднага валютнага фонду* (МВФ) ды з іншых значных замежных крыніц. Радыкальны характар рэформы дазваляў надаць ёй незваротны характар: любыя наступныя кіраўнікі, прыйшоўшы да ўлады, ужо не здолелі б без крывавай рэвалюцыі і тысяч ахвяр вярнуць назад неэфектыўную планавую эканоміку савецкага тыпу. Галоўнай задачай першага этапу рэформы стала імкненне да фінансавай стабілізацыі: г. зн. неабходна было ў найкарацейшыя тэрміны дасягнуць раўнавагі паміж платаздольным попытам насельніцтва, прадпрыемстваў і таварнай прапановай. Гэта было магчыма толькі пры вызваленні цэн.

Дзеля фарміравання новых рынкавых адносінаў і стварэння неабходных умоў патрабаваліся гады. У распараджэнні рэфарматараў былі месяцы – самае большае паўгода. Гэта быў складаны час і для грамадства, і для ўлады. Адказнасць за правядзенне рэформаў на сябе ўзяў прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын, які ў той момант асабіста ўзначаліў кабінет міністраў.

Першым мерапрыемствам урада па правядзенні рэформаў стала лібералізацыя эканомікі, якая ўключала ў сябе: пераход да свабодных цэн і свабоднага гандлю; дэмантаж планава-размеркавальнай сістэмы кіравання; адмену манаполіі знешняга гандлю і разняволенне эканомікі; увядзенне свабоднага рынкавага курсу рубля.

2 студзеня 1992 г. амаль усе цэны былі адпушчаны. Рашучым крокам стаў і апублікаваны 29 студзеня 1992 г. указ «Аб свабодзе гандлю», згодна з якім і прадпрыемствам (незалежна ад формаў уласнасці), і грамадзянам давалася права весці гандлёвую, пасярэдніцкую і закупачную дзейнасць без спецыяльных дазволаў. У гарадах і пасёлках пачалі ўзнікаць шматлікія стыхійныя, а пазней і арганізаваныя рынкі.

Паступова спажывецкі рынак пачаў насычацца таварамі. Упершыню ад часу НЭПу знік таварны дэфіцыт, што змяніла жыццё і псіхалогію расійскіх грамадзян. У вольным продажы з'явіліся тавары, якія раней савецкі чалавек наогул не мог купіць ні за якія грошы. Сярод іх былі не толькі прадметы раскошы, але і, скажам, найноўшыя лекі. Прадукты харчавання, што з'явіліся ў вольным продажы, прадухілілі рэальную ў той час пагрозу голаду.

Аднак наступствы лібералізацыі эканомікі былі вельмі неадназначнымі. З аднаго боку, імкліва знікаў дэфіцыт, з другога – не менш хутка раслі цэны. На працягу года яны выраслі ў 26 разоў. Такога выніку ніхто не чакаў: ані ўрад, які абяцаў, што кошты вырастуць не больш чым у тры разы, ані грамадзяне краіны, якія паверылі абяцанням і далі расійскай уладзе крэдыт даверу.

Беднасць, а часам і галеча, сталі звычайнай і распаўсюджанай з'явай. Сярэднямесячная налічаная заработная плата ў 1992 г. упала ў адпаведным эквіваленце да 22 долараў ЗША. Рацыён харчавання насельніцтва паводле агульнай каларыйнасці знізіўся на 30–40 %.

Яшчэ ў ліпені 1991 г. Вярхоўны Савет РСФСР прыняў закон аб прыватызацыі, зрабіўшы выбар на карысць так званай *ваўчарнай прыватызацыі*. «Народнай» прыватызацыі, якую абяцаў яшчэ тагачасны ўрад Івана Сілаева, не атрымалася, ды і не магло атрымацца. Але пры ўсіх выдатках працэсу прыватызацыі менавіта яна стварыла ўмовы для развіцця свабоднай эканамічнай сістэмы ў Расіі, стала адной з галоўных умоў, якія забяспечылі эканамічны ўздым Расіі



Віктар Чарнамырдзін

пазней, у 2000-я гады. Падчас прыватызацыі была *легалізавана прыватная ўласнасць*, якая стала матэрыяльнай асновай свабоды расійскіх грамадзян.

Першыя вынікі рэформаў тады, у 1990-х гг., былі вельмі цяжкімі для насельніцтва. Узровень жыцця значна знізіўся, абяцанні пазітыўных перамен да канца 1992 г. не былі выкананы. У краіне мацнела незадаволенасць. Усё гэта прывяло да магутнага супраціву далейшаму рэфармаванню эканомікі. Пад ціскам апазіцыі ўрад Ягора Гайдара мусіў сысці ў адстаўку. Наступны ўрад на чале з Віктарам Чарнамырдзіным, які быў сфарміраваны ў самым канцы 1992 г., запаволіў тэмпы рэформаў, але ў цэлым не адмовіўся ад раней прынятай стратэгіі на стварэнне рынкавай эканомікі ў Расіі. Зрэшты, найбольш балючыя крокі ўжо былі зробленыя да гэтага.

1993 год быў адзначаны актыўным фарміраваннем камерцыйных банкаў і фінансавага капіталу. Значная частка гэтага капіталу (да 2,5 млрд долараў ЗША ў 1995 г.) пачала вывозіцца з краіны. Такія працэсы прывялі да сур'ёзнага палітычнага крызісу, ініцыятарамі якога былі людзі, якія адчулі сябе абдзеленымі ў працэсе пераразмеркавання маёмасці ды капіталаў, і адкрыта прафашысцкія, шавіністычныя сілы. Прэзідэнт Барыс Ельцын вырашыў пайсці ў змаганні з імі на радыкальныя меры, што вылілася ў яго супрацьстаянне з Вярхоўным Саветам Расійскай Федэрацыі. Кіраўніцтва апошняга, разам з Канстытуцыйным судом, позняй восенню 1993 г. паспрабавала адхіліць Ельцына ад улады, але пацярпела няўдачу: пры гэтым у Маскве былі чалавечыя ахвяры. 12 снежня таго самага года ў Расіі на рэферэндуме была прынята новая Канстытуцыя, якая ўзаконьвала моцную прэзідэнцкую ўладу з двухпалатным (Савет Федэрацыі і Дзяржаўная Дума) парламентам.

На выбарах у Дзярждуму перавагу атрымалі прадстаўнікі камуністычнай партыі (КПРФ) на чале з Генадзіем Зюганавым і шаві-

ністычна-папулісцкай Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДПР) на чале з Уладзімірам Жырыноўскім. Урад павінен быў ісці з імі на кампрамісы, якія, аднак, палягалі найперш у забеспячэнні бязбеднага існавання новых расійскіх, ужо фармальна шматпартыйных, палітычных вяршкоў.

У 1994 г. у Расійскай Федэрацыі фактычна завяршылася ваўчарная прыватызацыя, вынікі якой былі не заўсёды пазітыўнымі. З яе скарысталіся таксама рознага кшталту прайдзісветы, якія з дапамогай створаных імі фінансавых пірамід скралі ў насельніцтва велізарныя сумы грошай. Толькі ў сталіцы краіны ад іх пацярпела каля двух мільёнаў чалавек.

Паглыбляўся раскол у дэмакратычным, рэфарматарскім лагеры. Прычынай рознагалоссяў сталі не толькі адрозненні ў поглядах на ліберальныя эканамічныя рэформы. Своеасаблівым водападзелам у дачыненнях адміністрацыі Ельцына і вялікай часткі дэмакратычна настроеных расійскіх палітыкаў сталі *падзеі 1990-х гг. у Чачні*. Падчас распаду СССР група чачэнскіх лідараў абвясціла незалежнасць Рэспублікі Ічкерыя, якая доўжылася ўсе 90-я гг., нягледзячы на адсутнасць яе афіцыйнага прызнання з боку іншых краін. У 1992 г. кіраўнік Чачні-Ічкерыі, былы савецкі генерал-маёр авіяцыі Джахар Дудаеў адмовіўся падпісаць пагадненне аб асацыяцыі з Расійскай Федэрацыяй – аналагічнае таму, якое падпісаў тагачасны прэзідэнт Татарстана Мінцімер Шайміеў (дамова з Татарстанам была фактычна скасаваная Масквою пазней, у 2006 г.).



Генерал Джахар Дудаеў, кіраўнік Чачні-Ічкерыі ў 1991–1996 гг.

Расія не прыняла гэтай адмовы і ў 1994 г. пачала вайну з мэтай цалкам падпарадкаваць сабе Чачню-Ічкерыю. Першы канфлікт у 1996 г. завяршыўся паражэннем рэгулярнай расійскай арміі і перамогай

незалежнікаў. Другая спроба падпарадкаваць рэспубліку ў 1999 г. (да таго часу Дудаеў быў забіты ў выніку спецаперацыі расійскіх спецслужбаў, а прэзідэнтам Чачні-Ічкерыі быў абраны былы савецкі палкоўнік Аслан Масхадаў) у Расіі атрымалася. Коштам вялікіх страт з абодвух бакоў, пасля акупацыі ўсёй тэрыторыі федэральнымі войскамі ў 2002 г. Расія абвясціла аб афіцыйным заканчэнні вайны. Аслан Масхадаў загінуў пазней, у 2005 г.

Незалежныя назіральнікі, журналісты прыводзілі шматлікія факты пра ўжыванне расійскімі вайсковымі падраздзяленнямі тэрору, у тым ліку супраць грамадзянскага насельніцтва Чачні, што не магло не быць заўважана расійскімі праваабаронцамі і ліберальнымі палітыкамі. За сваю пільную ўвагу да пакут чачэнцаў шмат хто пацярпеў: у прыватнасці, пры розных абставінах былі забіты чачэнскія рэпарцёры Рамзан Межыдаў (1999 г.), Адам Тэпсуркаеў (2000 г.), рускія журналісты Віктар Папкоў (2001 г.), Ганна Палітркоўская (2006 г.).

Абедзве расійска-чачэнскія вайны прывялі да вялікай шкоды і амаль цалкам разбурылі большую частку Чачні. Афіцыйнае апраўданне вайны расійскага ўрада з Чачнёй-Ічкерыяй выяўлялася ў словах пра «абарону тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі» і «змаганне з сепаратысцкімі, фундаменталісцкімі мусульманскімі групоўкамі».

У 1995 г. расійскаму ўраду нарэшце ўдалося дасягнуць стабілізацыі валюты: быў уведзены так званы валютны калідор, створаны золатавалютныя запасы ў памеры каля 13 млрд долараў ЗША. Адваротным бокам гэтай стабілізацыі сталі: недахоп крыніц унутраных інвестыцый, пагаршэнне агульнага гандлёвага балансу, далейшы спад вытворчасці і інш. Пры гэтым – найперш дзякуючы актыўнаму продажу нафты і газу за мяжу (Чарнамырдзін узначальваў на той час савет дырэктароў канцэрна-манапаліста «Газпрам») – агульны знешнегандлёвы прыбытак павялічыўся ў параўнанні з 1992 г. у тры разы і дасягнуў пры канцы 1995 г. 30 млрд долараў.

Неабходнасць фінансавання сваёй бюджэтнай сферы і падтрымкі лаяльных Расіі рэжымаў у некаторых былых савецкіх рэспубліках, асабліва ў Беларусі і Таджыкістане, змушала расійскія ўрады ўводзіць усё новыя і новыя федэральныя падаткі, якія разам з мясцовымі падаткамі дасягалі 90 капеек на 1 руб. прыбытку. Гэта непазбежна

вяло да пашырэння нелегальнага сектара эканомікі з крымінальным адценнем. Паводле расійскага гісторыка Уладлена Ізмозіка, у сярэдзіне 90-х гг. да 90 % прадпрыемстваў і фірмаў Расіі павінны былі плаціць мафіёзным структурам даніну за «ахову» ад іншых бандытаў, «спагнанне» пазык, подкуп і замену адпаведных судовых і арбітражных органаў. Раёны буйных гарадоў і цэлыя рэгіёны былі падзеленыя паміж сабою рознымі крымінальнымі групоўкамі («чачэнская», «тамбоўская», «казанская», «сонцаўская» ды іншыя мафіі).

У 1996 г. чарговыя выбары прэзідэнта Расіі выйграў моцна хворы на той час Барыс Ельцын, які атрымаў у другім туры галасавання больш за 53,8 % галасоў, у той час як за камуніста Генадзія Зюганава прагасавала крыху больш за 40,3 % выбаршчыкаў з ліку тых, што ўзялі ўдзел у галасаванні.

Той жа год быў адзначаны разнастайнымі палітычнымі канфліктамі. Прагрымелі выбухі ў маскоўскіх тралейбусах, метро, на вакзалах у Армавіры і Пяцігорску. Быў падарваны дзевяціпавярховы дом памежнікаў у Каспійску (Дагестан).

У 1997 г. расійскаму ўраду, у эканамічным блоку якога на той момант ключавую ролю адыгрывалі Анатолій Чубайс і Барыс Нямцоў, на думку шэрагу экспертаў, удалося ажывіць эканамічныя рэформы. Золатавалютныя рэзервы павялічыліся яшчэ на 4 млрд долараў ЗША. Аднак і гэтаму складу ўрада не ўдалося зрабіць рэальныя крокі ў напрамку структурнай перабудовы расійскай эканомікі, пераадолець наступствы дэіндустрыялізацыі, што мела месца ў вялікай колькасці рэгіёнаў пачынаючы з 1990 г.

Увосень 1997 г. былі дасягнуты пэўныя поспехі ў змяншэнні падатковага цяжару на прадпрыемствы, узяты пад кантроль некаторыя натуральныя манаполіі, узноўлена дзяржманаполія на продаж алкаголю. Інфляцыя апусцілася ніжэй за 11 %, быў атрыманы адносна высокі ўраджай збожжавых. Сярэдні заробак у краіне павялічыўся прыкладна да 1 млн тагачасных расійскіх рублёў (пасля праведзенай у 1998 г. дэнамінацыі – 1000 руб.).

Канцом часовай эканамічнай стабілізацыі сталі жнівень – верасень 1998 г. Прызначаны незадоўга перад тым Барысам Ельцыным новы прэм'ер-міністр, 36-гадовы Сяргей Кірыенка аб'явіў аб адмове ўрада надалей трымацца валютнага калідору і рабіць



Яўгеній Прымакоў

чарговыя выплаты па дзяржаўных кароткатэрміновых абавязацельствах (*дэфолт*). У выніку цягам 6 месяцаў курс долара ЗША ў адносінах да рубля вырас прыкладна ў 3,5 разу, а паказчык інфляцыі за 1998 г. склаў больш за 80 %.

Між тым у краіне нарастала сацыяльная напружанасць: узняліся новыя хвалі страйкавага руху ў рэгіёнах. Былі забітыя тэрарыстамі лідар апазіцыйнага руху вайскоўцаў генерал Леў Рохлін, а таксама застрэлена ў пад'ездзе свайго дома ў Пецярбургу вядомая дэмакратычная актывістка Галіна Старавойтава.

У верасні 1998 г. урад Кірыенкі адправілі ў адстаўку, а новым прэм'ер-міністрам РФ быў зацверджаны стаўленік спецслужбаў і расійскага ВПК Яўгеній Прымакоў.

Урад Прымакова абвясціў курс на ўзмацненне дзяржаўнага рэгулявання ў эканоміцы. Інфляцыя была запланавана на ўзроўні 30 % у год. Прымакову і яго камандзе ў пэўным сэнсе пашанцавала: якраз у той час пачаўся істотны рост цэн на нафту на сусветным рынку. Тым не менш спробы вярнуцца да савецкіх метадаў кіравання эканомікай (адпаведны блок ва ўрадзе ўзначальваў перакананы камуніст, былы сакратар ЦК КПСС Юрый Маслюкоў) не маглі аказацца паспяховымі. Так, з ініцыятывы гэтага ўрада істотна павялічылася грашовая маса: быў уключаны друкарскі станок. Разам з тым вырашальную ролю ў адстаўцы Прымакова з пасады прэм'ера, якая адбылася ўжо ў траўні 1999 г., адыграла якраз пазіцыя камуністаў: Генадзій Зюганаў баяўся моцнага канкурэнта на левым фланзе расійскага палітычнага бамонду. Факт застаецца фактам: хоць у Дзярждуме камуністы, як мантру, паўтаралі свае запэўніванні аб падтрымцы ўрада, аднак менавіта яны правальвалі там практычна ўсе ўнесеныя туды рынкавыя законапраекты (напрыклад, вельмі важны Зямельны кодэкс), а «прэм'ер парламенцкай большасці» не толькі не спрабаваў

націснуць на іх сваім аўтарытэтам, але і не выказваў сваёй незадаволенасці нават на словах. Да таго ж прадстаўнікі КПРФ пачалі шумную кампанію за вынясенне імпічменту прэзідэнту Ельцыну, што паставіла Прымакова ў практычна безвыходнае становішча.




Уладзімір Пуцін. *Здымак 2013 г.*

Да канца XX ст. Расія паводле сумы паказчыкаў эканамічнага развіцця апынулася на 55-м, а паводле паказчыкаў прамысловага развіцця – наогул на 95-м месцы ў свеце. Беспрацоўе закранула да 15 % працаздольнага насельніцтва краіны. 10 % самых заможных грамадзян РФ мелі сукупныя даходы, у 20 разоў вышэйшыя за сукупныя даходы дзесяці працэнтаў найбяднейшых грамадзян. Колькасць насельніцтва за 1990-я гг. скарацілася прыкладна з 150 млн да 146 млн чалавек.

У траўні 1999 г. урад Расіі ўзначаліў былы міністр унутраных спраў Сяргей Сцяпашын, але ўжо 9 жніўня таго самага года гэтую пасаду заняў былы (пры мэру Аляксандру Сабчаку) высокі санктпецярбургскі чыноўнік і кіраўнік Федэральнай службы бяспекі (ФСБ) Уладзімір Пуцін.

Прызначэнне Пуціна прэм'ер-міністрам супала (дагэтуль ідуць спрэчкі – выпадкова ці не) з тэрарыстычнымі актамі: выбухамі дамоў у Маскве, Буйнакску, Валгадонску, у выніку якіх загінула каля 300 цывільных жыхароў. Федэральныя ўлады ўсклалі адказнасць за гэтыя тэракты на «чачэнскіх баевікоў», і менавіта Уладзімір Пуцін пачаў выступаць перад СМІ ў якасці ратавальніка Расіі. Пры канцы 1999 г. прайшлі чарговыя выбары ў Дзярждуму, па выніках якіх прапуцінскі блок «Адзінства» атрымаў каля 20 % галасоў.

Так ці інакш, у апошні дзень 1999 года ў жывым эфіры Расійскага тэлебачання з'явіўся Барыс Ельцын і абвясціў, што ён сыходзіць у сувязі са станам здароўя ў адстаўку з паста прэзідэнта краіны. Выканаўцам абавязкаў прэзідэнта быў прызначаны зноў-такі Уладзімір Пуцін. Гэта прадвызначыла яго перамогу на прэзідэнцкіх выбарах,

якія адбыліся 26 сакавіка 2000 г. Паводле афіцыйных вынікаў ужо ў першым туры Пуцін набраў каля 52 % галасоў, у той час як яго найбліжэйшы канкурэнт, той жа камуніст Зюганаў, задаволіўся паказчыкам у межах 29,5 %. Астатнія галасы падзялілі дзевяць іншых кандыдатаў.

***12.2. Кіраванне Уладзіміра Пуціна.*** Самыя першыя крокі Пуціна на пасадах прэм'ер-міністра, а потым і прэзідэнта Расійскай Федэрацыі не пакідалі сумневу: галоўным у яго кіраванні будзе спроба адрадзіць імперыю (якую напачатку некаторыя паспрабуюць называць ліберальнай). Дзеянні расійскай арміі ў паўночнакаўказскай вайне (у іх быў уцягнуты і Дагестан) зрабіліся больш жорсткімі. Нашмат складаней было паводзіць сябе расійскаму прэзідэнту ў сітуацыі з катастрофай падводнай лодкі «Курск» у Барэнцавым моры (жнівень 2000 г.). Пасля шматлікіх спроб правесці выратавальную аперацыю сваімі рэсурсамі толькі праз тыдзень пасля здарэння былі прыцягнуты сілы нарвежскага флоту, з дапамогай якіх удалося дабрацца да затопленай лодкі. Аднак нікога з членаў экіпажа сярод жывых ужо не было…

Умацаванне ідэі адраджэння імперыі Уладзімір Пуцін пачаў з заснавання ў краіне (на думку шэрагу экспертаў, насуперак Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі) новых адміністрацыйных адзінак у выглядзе сямі *федэральных акруг*, якія ва ўладнай структуры фактычна былі пастаўлены вышэй за існуючыя губерні ды аўтаномнатэрытарыяльныя ўтварэнні. Савет Федэрацыі, вышэйшая палата расійскага парламента, перастаў быць органам, у якім засядалі кіраўнікі рэгіёнаў. Адначасова ствараліся праекты вайсковай, судовай, падатковай, аграрнай рэформаў. Пры правядзенні чарговых выбараў улады розных узроўняў выканаўчая ўлада пачала нашмат актыўней і агрэсіўней, чым раней, выкарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс. Як вынік, прапуцінская партыя «Единая Россия» неўзабаве займела большасць у Дзярждуме і ў шмат якіх органах мясцовага самакіравання, што дазволіла Пуціну афіцыйна зацвярджаць напрацоўкі сваёй адміністрацыі ў самых розных пытаннях.

Напачатку каманда Уладзіміра Пуціна крыху прыхоўвала сваё імкненне да дыскрымінацыі інтарэсаў нярускіх нацыянальных груп

у дзяржаве. Але, напрыклад, ужо 15 студзеня 2002 г. Дзярждума ўнесла папраўку ў Федэральны закон «Аб мовах народаў Расійскай Федэрацыі», якая вызначыла, што графічнай асновай дзяржаўнай мовы Расіі і ўсіх дзяржаўных моў рэспублік Федэрацыі абавязкова павінна быць кірыліца. Улады Татарстана ў адпаведнасці з заканадаўствам сваёй рэспублікі, аспрэчылі такое рашэнне ў Канстытуцыйным судзе Расіі. 16 лістапада 2004 г. гэты суд прызнаў права органа федэральнай заканадаўчай улады вызначаць графічную аснову дзяржаўных моў народаў Расіі, адхіліўшы тым самым спробы ўладаў Татарстана перавесці татарскую пісьменнасць з кірыліцы на лацінку. Канстытуцыйны суд адзначыў, што змяненне графічнай асновы дапушчальнае, калі яно «адпавядае гісторыка-культурным, сацыяльным і палітычным рэаліям і інтарэсам шматнацыянальнага народа Расіі». Але рашэнне такога пытання рэспублікай у аднабаковым парадку, маўляў, можа прывесці «да паслаблення федэратыўнага адзінства».

У стратэгіі ажыццяўлення ўлады новай камандай надзвычай важнае значэнне надавалася *масавым СМІ*. Некаторыя агульнадаступныя тэлеканалы былі рознымі спосабамі ліквідаваны, а папулярны грамадскі канал НТВ быў фактычна захоплены праўладнымі структурамі. Апазіцыйныя палітычныя групоўкі таксама трапілі пад жорсткі кантроль спецслужбаў.

Наогул, важным элементам палітыкі ўладаў стала сістэматычная дыфамацыя патэнцыйных канкурэнтаў як асоб карумпаваных, некампетэнтных і нават хворых. Ужо ўварванне расейскіх войскаў у Чачню ў верасні 1999 г. у адказ на дзеянні баевікоў і напады на шматкватэрныя жылыя дамы ў Маскве ды іншых гарадах Расіі было выкарыстана для стварэння іміджу Уладзіміра Пуціна як збаўцы нацыі. За гэтай кампаніяй стаяў гетэрагенны хаўрус, у які акрамя «сям'і» і тагачасных фінансавых магнатаў кшталту Барыса Беразоўскага ўваходзілі прадстаўнікі пэўных груповак у ФСБ і шэраг рэгіянальных лідараў. Парадаксальным чынам гэта надало вобразу новага расійскага лідара ў вачах значнай колькасці людзей рысы сумленнай, блізкай да народа, дынамічнай, моцнай асобы, здольнай скончыць з кумаўствам і безгаспадарнасцю эпохі Ельцына.

Але падчас распрацоўкі свайго ўласнага палітычнага курсу Ула-

дзімір Пуцін сутыкнуўся з няпростай задачай. З аднаго боку, ён павінен быў забяспечыць непахіснасць сваёй улады, а з другога – неабходна было знайсці вырашэнне вялікай колькасці праблем у эканоміцы і жыцці грамадства. Умацоўваючы свае пазіцыі ва ўладзе, новы прэзідэнт мусіў мець дачыненне з сіламі, якія сфармаваліся ўжо ў эпоху Ельцына: апарат з адміністрацыяй ранейшага прэзідэнта, урадавай бюракратыяй, буйнымі групамі капіталу і найбольш аўтарытэтнымі рэгіянальнымі кіраўнікамі.

Грошы, з дапамогай якіх пуцінская каманда рэальна магла ажыццяўляць сваю палітыку, былі знойдзены зноў-такі праз выкарыстанне кампрамату на існуючых алігархаў і поўнае падпарадкаванне ўраду самых прыбытковых кампаній Расіі – у асноўным тых, што належалі да нафта- і газаздабыўнай сферы. Так, усёмагутны «Газпрам» праз адпаведны націск на папярэдняе кіраўніцтва кампаніі быў перададзены ў кіраванне былому падначаленаму Уладзіміра Пуціна ў санкт-пецярбургскай мэрыі Аляксею Мілеру.

Прыйшоўшы да ўлады не без дапамогі непапулярных у народзе алігархаў, Пуцін праз пэўны час стаў дэманстраваць сваю нязгоду з імі. Пачынаючы прыкладна з сакавіка 2000 г. супраць шэрагу буйных прадпрымальнікаў пачаліся канкрэтныя дзеянні з выкарыстаннем СМІ і праваахоўных органаў. Гэта выклікала значны непакой, асабліва ў колах кіравання эканомікай. Але, па вялікім рахунку, Уладзімір Пуцін выступіў толькі супраць некаторых «палітычных» прадпрымальнікаў, такіх як Барыс Беразоўскі або Уладзімір Гусінскі, якія мелі значны палітычны ўплыў на СМІ. Пасля гэтага Гусінскі і Беразоўскі пакінулі краіну, а СМІ, кантраляваныя імі, трапілі ў рукі адміністрацыі Пуціна. У выніку апошняя атрымала новыя велізарныя магчымасці ўплываць на грамадскую думку.

Стаўленне прэзідэнта Пуціна да прадпрымальнікаў, не цалкам падкантрольных яму, выявілася зноў у выстаўленні ім абвінавачванняў супраць Міхаіла Хадаркоўскага, на той час самага багатага чалавека ў Расіі, які стаяў на чале нафтавай кампаніі ЮКОС. Гэта адбылося за некалькі месяцаў да выбараў у Дзяржпуму ў 2003 г. Хадаркоўскі падтрымліваў шэраг апазіцыйных партый і рухаў, а прэса сцвярджала, што ён мае таксама і прэзідэнцкія амбіцыі. Паколькі супраць яго і некаторых яго супрацоўнікаў была ўзбуджана крымінальная

справа, гэтыя захады адміністрацыі Пуціна былі інтэрпрэтаваныя як сігнал аб тым, што бу йныя фінансавыя групы павінны як мага далей трымацца ад палітыкі.

Аслабленне рэгіёнаў і адхіленне вялікіх фінансавых груповак ад прыняцця палітычных рашэнняў змянілі расстаноўку сіл у расійскай палітыцы. Цягам двух гадоў Уладзімір Пуцін здолеў умацаваць свае пазіцыі ва ўладзе і карэнным чынам змяніць палітычны баланс сіл. У наступныя гады гэтае ўмацаванне ішло далей.

Важным чыннікам функцыянавання новай улады з'яўлялася кадравая палітыка, якая паступова прыняла на ключавыя пазіцыі ў структуры выканаўчай улады людзей, якім Пуцін давяраў асабіста. Сярод іх было нямала супрацоўнікаў Федэральнай службы бяспекі, якіх ён ведаў з часоў службы ў савецкім КГБ або з той пары, калі ён сам стаяў на чале ФСБ. Адбылося зліццё чыноўнікаў так званай «пецярбургскай групоўкі» з супрацоўнікамі спецслужбаў, што істотным чынам узмацніла пазіцыі прэзідэнта Расіі ў супрацьстаянні з патэнцыяльнымі апанентамі.

Яшчэ адным элементам умацавання пазіцый Пуціна была падтрымка з боку большасці бізнэс-супольнасці. У той час як прэзідэнт рэзка пайшоў супраць асобных алігархаў – Беразоўскага, Гусінскага або Хадаркоўскага, іншым алігархам ён стварыў больш выгодныя рамкавыя ўмовы для дзейнасці. Нарэшце, трэба ўзяць пад увагу яшчэ адзін важны момант: адкрыта папулісцкія выказванні і некаторыя практычныя дзеянні Пуціна, асабліва што датычыць «апрацоўкі» СМІ, дазволілі яму стварыць пэўнага кшталту «саюз з масамі» – забяспечыць сабе істотную падтрымку сярод розных груп расійскага насельніцтва.

Узяўшы за аснову сваёй эканамічнай праграмы напрацоўкі шэрагу ліберальных эканамістаў і палітыкаў, урад, які да 2004 г. узначальваў Міхаіл Касьянаў, дасягнуў сур'ёзнага паляпшэння макраэканамічных паказчыкаў. Так, паводле афіцыйных звестак у 2000–2004 гг. у эканоміцы Расіі адзначаўся істотны рост аб'ёму валавага ўнутранага прадукту (ВУП): у 2000 – 10 %, у 2001 – 5,7 %, у 2002 – 4,9 %, у 2003 – 7,3 %, у 2004 – 7,2 %.

Адбыўся адчувальны рост прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, аб'ёмаў будаўніцтва, рэальных даходаў насельніцтва.



Крыніца: government.ru

Дзмітрый Мядзведзеў.
*Здымак 2013 г.*

Істотна знізілася колькасць людзей, якія жылі ніжэй за ўзровень беднасці. Але ліберальныя погляды Касьянава былі не даспадобы шмат каму з новага пуцінскага атачэння. Наступныя два ўрады Расіі ўзначальвалі асобы, звязаныя са спецыяльнымі службамі – Міхаіл Фрадкоў (да верасня 2007 г.) і Андрэй Зубкоў (да траўня 2008 г.).

Прэзідэнцкія выбары, якія адбыліся ў 2004 г., Уладзімір Пуцін выйграў з вялікім адрывам ад усіх супернікаў, набраўшы больш за 71 % галасоў, хоць міжнародныя назіральнікі з Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) адзначылі, што ў працэсе правядзення выбарчай кампаніі «не былі выкананыя важныя абавязацельствы, якія датычаць недыскрымінацыйнага стаўлення дзяржаўных СМІ да кандыдатаў і прынцыпу таемнага галасавання».

У наступны перыяд свайго кіравання прэзідэнт Пуцін стаў ініцыятарам некалькіх нацыянальных праектаў – «Адукацыя», «Ахова здароўя», «Даступнае жыллё» (усе – 2005 г.), якія ажыццяўляліся з рознай ступенню поспеху. Так, цягам пяці гадоў выканання апошняй з названых праграм план уводу новага жылля быў выкананы на 72,6 %, план павелічэння аб'ёмаў іпатэчнага крэдытнага фінансавання пабудовы жылля – на 81,5 %, план павелічэння долі сем'яў, здольных набыць кватэру або дом з дапамогай уласных і пазычаных сродкаў, – на 66 %. Працэнт зношанасці жыллёвага фонду не змяніўся і застаўся на ўзроўні 60 %. Разам з тым дзякуючы найперш высокім сусветным цэнам на газ і нафту рост ВУП Расіі і ў гэты перыяд дасягаў (паводле афіцыйных звестак) узроўню да 8 % у год.

У 2008 г. згодна з дзейнай Канстытуцыяй Уладзімір Пуцін не мог балатавацца на чарговы прэзідэнцкі тэрмін. Пры канцы 2007 г. ён

назваў наступнікам свайго супрацоўніка, юрыста, а на той момант віцэ-прэм'ера ўрада Дзмітрыя Мядзведзева. Падчас выбараў 2008 г. Мядзведзеў, нягледзячы на тое, што адмовіўся ўдзельнічаць у перадвыбарных дэбатах, лёгка перамог сваіх супернікаў, атрымаўшы, паводле звестак Цэнтральнай выбарчай камісіі РФ, прыкладна 70 % галасоў. Пры гэтым назіральнікі ад АБСЕ так і не змаглі дамовіцца з расійскімі ўладамі, каб прыняць удзел у назіранні за выбарчым працэсам.

Уладзімір Пуцін ізноў заняў пасаду кіраўніка расійскага ўрада. Трэба заўважыць, што якраз у гэты час назіралася зніжэнне цэн на энерганосьбіты на сусветным рынку, што пачало вельмі істотна ўплываць на стан расійскай эканомікі. Рост прамысловай вытворчасці ў Расіі запаволіўся: у 2008 г. ён склаў толькі 2,1 %, а ў 2009 г. ужо скараціўся на 10,8 %. Інвестыцыі, якія ў 2007 г. выраслі на 21,1 %, у наступным годзе павялічыліся толькі на 9,1 працэнта, каб у 2009 г. скараціцца на 17 адсоткаў. Гэты крызіс яшчэ раз падкрэсліў, наколькі Расія з яе эканомікай, арыентаванай на гандаль энерганосьбітамі, залежала ад кан'юнктуры на сусветным рынку.

У адказ на рэзкае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі Дзмітрый Мядзведзеў увосень 2009 г. абвясціў аб неабходнасці паскоранай мадэрнізацыі. Тэхналагічнае абнаўленне ўсёй сферы вытворчасці планавалася ажыццяўляць з дапамогай замежных інвестараў ды імпартных тэхналогій. Каб актыўна спрыяць развіццю, Мядзведзеў заклікаў да пераўтварэння дзяржаўнага сектара, а таксама да асцярожнай прыватызацыі. На словах асаблівая ўвага павінна была аддавацца развіццю ўласнага навукова-тэхнічнага патэнцыялу, але канкрэтныя крокі ў гэтым напрамку былі вельмі сціплыя. Што праўда, сваім указам новы расійскі прэзідэнт у 2010 г. загадаў пачаць амбітны праект пабудовы велізарнага інавацыйнага цэнтра (навукаграда) у Сколкаве (Маскоўская вобласць). Да 2020 г. у гэты праект мелася быць укладзена каля 40 млрд долараў адных толькі бюджэтных сродкаў. Ужо сёння стала зразумелым, што ажыццяўленне гэтага праекта не дае чаканых вынікаў: пры яго стварэнні выкарыстоўваюцца састарэлыя распрацоўкі; ад 60 да 80 % першапачаткова заяўленых удзельнікаў з праекта ўжо выйшлі; маюць месца вялікія памеры крадзяжу бюджэтных сродкаў і карупцыя. Не да канца прадуманымі

аказаліся і лагістычныя параметры праекта. Самае ж галоўнае, што, на думку навуковага кіраўніка Інавацыйнага інстытута пры Маскоўскім фізіка-тэхнічным інстытуце Юрыя Амосава, ва ўмовах, калі ў Расіі адсутнічае попыт на інавацыі, створаныя ў Сколкаве праекты па вялікім рахунку не здолеюць вывесці расійскую эканоміку на інавацыйны шлях развіцця. Падобнай пазіцыі прытрымліваюцца, напрыклад, і эксперты з вядомай расійскай аўдытарска-кансалтынгавай кампаніі ФБК.

У палітычнай сферы Мядзведзеў зрабіў усё, на што быў здольны, каб умацаваць ва ўладзе існуючы рэжым. Адразу пасля атрымання прэзідэнцкіх паўнамоцтваў ён паклапаціўся пра тое, каб тэрмін такіх паўнамоцтваў у будучым (пасля 2012 г.) складаў не чатыры (як было дагэтуль), а шэсць гадоў, а Дзярждума павінна была перавыбірацца раз на 5 гадоў (замест ранейшых чатырох).

Да гэтага моманту кіраўнічая партыя «Единая Россия» на чале з Пуціным мела 315 з 450 месцаў у Дзярждуме, і зацвердзіць там адпаведныя папраўкі ў канстытуцыю не ўяўляла ніякай цяжкасці.

Так або іначай, палітыка прэзідэнта Мядзведзева і прэм'ера Пуціна ў 2008–2012 гг. не мела выразных пазітыўных вынікаў. На наступных выбарах у Дзярждуму, якія адбыліся ў снежні 2011 г., паводле афіцыйных звестак партыя Пуціна – Мядзведзева набрала менш за палову галасоў. Пры гэтым, напрыклад, у Яраслаўскай вобласці працэнт падтрымкі гэтай партыі ледзьве перавысіў 29 пунктаў. Паводле альтэрнатыўнага падліку галасоў, арганізаванага грамадскай асацыяцыяй «Голас», па ўсёй краіне за «Единую Россию» рэальна прагаласавала крыху менш за 35 % выбаршчыкаў з ліку тых, што прынялі ўдзел у галасаванні. Прэса і незалежныя назіральнікі ў адзін голас пачалі весці гаворку пра масавыя фальсіфікацыі і неабмежаванае выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу з боку расійскай выканаўчай улады ў цэнтры і на месцах. Пасля выбараў у Маскве і шэрагу іншых буйных гарадоў Расіі прайшлі дэманстрацыі пратэсту, масавасць якіх была ў краіне самай вялікай пасля 1995 г. Шмат у каго з расіян выклікалі пытанні і афіцыйныя лічбы, абвешчаныя па выніках прэзідэнцкіх выбараў 2012 г., згодна з якімі Уладзімір Пуцін (а ён зноў удзельнічаў у выбарах) меўся набраць 63,6 % галасоў. Усе яго канкурэнты на гэтых выбарах таксама ў адзін голас заявілі пра

непразрыстасць падліку галасоў у шматлікіх выпадках, а галоўнае, пра заведама няроўныя ўмовы, у якіх знаходзіліся, з аднаго боку, сам Пуцін, з іншага – усе яго супернікі.

Каб вярнуць давер сапраўды большасці выбаршчыкаў, кіраўнічай партыі (якую ўзначаліў пасля прызначэння на пасаду кіраўніка ўрада Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў) заставаліся два шляхі: істотным чынам палепшыць жыццё грамадзян або арганізаваць хоць бы невялікую «пераможную вайну». Быў выбраны значна прасцейшы ў расійскіх умовах другі шлях. Кіраўніцтва РФ мела ў гэтым немалы досвед. Задушэнне чачэнскага супраціву пры канцы 1990-х – на пачатку 2000-х гг. прынесла вялікія палітычныя дывідэнды ўнутры краіны Уладзіміру Пуціну.

Яшчэ ў 1994 г. рускі філосаф Юрый Барадай сфармуляваў канцэпцыю «ўз'яднання Расійскай імперыі». Яго галоўнай рухальнай сілай павінны былі стаць рускія, якія воляю гістарычнага лёсу апынуліся за межамі Расійскай Федэрацыі. Прычым «апорны стрыжань» аб'яднання філосаф вызначаў так: «Без Беларусі, Усходняй Украіны і Наваросіі, без Крыма і рускай часткі Казахстана Расіі не жыць».

Пры канцы 2006 г., выступаючы ў Доме Дзяржавіна ў Санкт-Пецярбургу на сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй напярэдадні Года рускай мовы, прэзідэнт Уладзімір Пуцін падкрэсліў: «Рускі свет можа і павінен аб'яднаць усіх, каму дарагія рускае слова і руская культура, дзе б яны ні жылі, у Расіі ці за яе межамі». «Часцей ужывайце гэтае словазлучэнне – *рускі свет*», – заклікаў Пуцін творчых інтэлігентаў падчас гэтай сустрэчы.

Указам прэзідэнта Расіі за 21 чэрвеня 2007 г. быў створаны фонд «Русский мир», прыярытэтам дзейнасці якога, як высветлілася пазней, стала зусім не падтрымка расійскай культуры: яго рэальная дзейнасць, на думку некаторых расійскіх і іншых экспертаў, шмат у чым нагадвае дзейнасць колішняга Камінтэрна.

У 2008 г. ва ўмовах жорсткага эканамічнага крызісу пасля атрымання прэзідэнцкага мандата Дзмітрыем Мядзведзевым расійскія войскі былі выкарыстаны для таго, каб адлучыць ад тэрыторыі Грузіі аўтаномныя рэспублікі Абхазію і Паўднёвую Асецію, якія атрымалі фармальную незалежнасць, а ў сапраўднасці сталі сатэлітамі Расіі.

Цяпер, калі Пуцін другі раз на выбарах атрымаў прэзідэнцкія

паўнамоцтвы, патрабавалася новая вайна. Нагоду для яе вядзення крамлёўскім кіраўнікам даў палітычны крызіс у суседняй Украіне, які пачаўся позняй восенню 2013 г. і прывёў у лютым наступнага года да ўцёкаў з краіны ўкраінскага прэзідэнта Віктара Януковіча і яго скарумпаванага найбліжэйшага атачэння. Паводле заключанай раней дамовы паміж РФ і Украінай, Расійская Федэрацыя захоўвала за сабой права на 25 гадоў распараджацца ваенна-марской базай у крымскім Севастопалі і ўтрымліваць у гэтым украінскім рэгіёне да 25 тыс. сваіх вайскоўцаў. Гэтыя сілы былі выкарыстаны для захопу будынка парламента Крымскай аўтаноміі і паспешлівага абвяшчэння рэферэндуму аб незалежнасці Крыма. Рэферэндум, без запрашэння міжнародных назіральнікаў, праводзіўся ў рэкордна кароткія для сусветнай гісторыі тэрміны: ад дня абвяшчэння да дня правядзення плебісцыту прайшло 17 дзён (!), хоць на пачатку было абвешчана, што рэферэндум мае адбыцца праз няпоўныя тры месяцы. Фармальна ініцыятарам рэферэндуму выступала партыя «Русское единство», якая мела чатырохпрацэнтнае прадстаўніцтва ў Вярхоўным Савеце Крыма. У бюлетэнях для галасавання не былі пададзеныя словы для выбару ТАК або НЕ – як гэта павінна рабіцца згодна з міжнароднымі рэкамендацыямі па правядзенні выбараў і рэферэндумаў. Гэта адкрывала магчымасці для неабмежаваных фальсіфікацый.

Створаная насуперак украінскаму заканадаўству Цэнтральная выбарчая камісія Крыма неадкладна абвясціла вынікі плебісцыту 16 сакавіка 2014 г., згодна з якімі больш за 95 % яго ўдзельнікаў прагаласавала за «незалежнасць Крыма» з наступным яго далучэннем да Расіі. У Маскве не зацягвалі з тым, каб «падаць руку братняму народу Крыма», і ўсяго за некалькі дзён прынялі федэральны закон аб прыёме гэтай часткі ўкраінскай тэрыторыі ў склад РФ. У гэтым законе не выказвалася стаўленне да абавязацельстваў, прынятых урадам Расіі пры далучэнні да ліку ўдзельнікаў Хельсінкскага акта ў 1992 г., згодна з якім Расія павінна была паважаць тэрытарыяльную цэласнасць іншых краін-падпісантаў гэтага акта (да якіх належала і Украіна).

*Меджліс (парламент) крымска-татарскага народа*, які рэпрэзентаваў інтарэсы карэннага крымскага насельніцтва, не прызнаў вынікаў крымскага рэферэндуму і неўзабаве стаў аб'ектам ціску

і рэпрэсій з боку расійскай улады. Яго старшыні, народнаму дэпутату Украіны Рэфату Чубараву, расійскія ўлады папросту забаранілі знаходзіцца ў Крыме. Не можа туды сёння легальна прыехаць і згаданы намі раней лідар крымскіх татараў, праваабаронца, дэпутат украінскага парламента Мустафа Джамілеў. Між іншым, калі Уладзімір Пуцін у 1975 г. пачынаў сваю службу ў савецкім КГБ, Джамілеў чацвёрты раз адбываў пакаранне ў савецкай турме і трымаў чарговую галадоўку на знак пратэсту супраць жорсткага абыходжання з ім. Так гісторыя зрабіла яшчэ адзін свой галавакружны паварот…

Вынікі паспешліва арганізаванага, насуперак дзейнай Канстытуцыі Украіны і міжнародным нормам, галасавання ў Крыме не былі прызнаныя абсалютнай большасцю краін свету – з выняткам КНДР, Афганістана, Венесуэлы, Кубы, Нікарагуа і Сірыі. Яшчэ 7 сакавіка 2014 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю рэкамендацыйнага характару ў падтрымку тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны, абвясціўшы, што агульнакрымскі рэферэндум 16 сакавіка 2014 г. не мае законнай сілы. У сваю чаргу, 19 снежня 2016 г. тая ж Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю «Сітуацыя з правамі чалавека ў Аўтаномнай Рэспубліцы Крым і горадзе Севастопалі (Украіна)», у якой сітуацыя ў Крыме ахарактарызаваная як «часовая акупацыя» і «анексія» Расійскай Федэрацыяй часткі тэрыторыі Украіны – Аўтаномнай Рэспублікі Крым і горада Севастопаля.

Каб адцягнуць увагу сваёй і міжнароднай грамадскасці ад сітуацыі ў Крыме, расійскае кіраўніцтва вырашыла пашырыць сваю экспансію. У тым жа 2014 г. прарасійскімі сіламі ва ўсходняй частцы Украіны было абвешчана аб стварэнні нібыта незалежных Луганскай народнай рэспублікі (ЛНР) і Данецкай народнай рэспублікі (ДНР). Адкуль растуць ногі гэтых «рэспублік», можна сабе ўявіць хоць бы на падставе таго факта, што сын згаданага намі раней тэарэтыка адраджэння Расійскай імперыі Юрыя Барадая Аляксандр ад самага пачатку ўзначальваў урад самаабвешчанай ДНР (на момант падрыхтоўкі гэтай кнігі да друку ён – намеснік кіраўніка гэтага ўрада).

Гэтыя ўтварэнні былі ўзятыя пад кантроль вайсковымі фарміраваннямі, у якіх, паводле прызнання самога расійскага прэзідэнта, бралі і бяруць удзел «расійскія добраахвотнікі». Спробы стварыць

падобныя «рэспублікі» вакол Харкава, Марыупаля або Адэсы поспеху не мелі дзякуючы пазіцыі большасці тамтэйшага насельніцтва і ўзмацненню ўкраінскіх узброеных сіл.

Дзеянні кіраўніцтва Расіі ва Украіне, учыненыя насуперак міжнародным дамовам гэтай жа краіны і прынятым нормам міжнароднага права, змусілі нават пасіўныя на міжнароднай арэне краіны падтрымаць палітыку санкцый, прапанаваную ЗША і ўсімі 27 краінамі Еўрапейскага саюза.

Экспансіяніcцкія дзеянні крамлёўскіх палітыкаў маўкліва, а часам і амаль адкрыта ўхваляліся іерархамі Рускай праваслаўнай царквы ды іншых традыцыйных расійскіх канфесій. Яшчэ ў 2007 г., падчас першага тэрміну прэзідэнцтва Уладзіміра Пуціна, прадстаўнікам Маскоўскага патрыярхату ўдалося дамагчыся для сябе прызнання свайго фармальнага апякунства над прыходамі Рускай замежнай праваслаўнай царквы.

Разам з тым, анексія Крыма, расійская падтрымка сепаратыстаў ва ўсходняй частцы Украіны і заходнія санкцыі ў адказ на расійскае эмбарга на прадукты харчавання – усё гэта прывяло да крызісу ў эканоміцы Расіі.

Нават згодна з падлікамі праўрадавага Знешэканомбанка Расійскай Федэрацыі (руская абрэвіятура: ВЭБ), з лістапада 2014 г. (эмбарга ўступіла ў сілу ў жніўні-верасні таго самага года) да сярэдзіны 2017 г. рост коштаў на спажывецкія тавары склаў 25,7 %. У выніку цягам трох гадоў эскалацыі канфлікту Расіі з Украінай і Захадам грамадзяне Расіі страцілі амаль 20 % сваіх прыбыткаў. З кастрычніка 2014 да траўня 2017 г. рэальныя даходы расіян зменшыліся на 19,2 %. Усё за гэты час падаражэла. Большасць цэн на прадукты харчавання вырасла ў сярэднім на 28,5 %, прамысловых тавараў – на 26,2 %, паслугі – на 21,3 % . Шмат якія жыхары Расіі вярнуліся да метадаў, правераных падчас сур'ёзных крызісаў камуністычнай эпохі, – зноў пачала карміцца са сваіх уласных садоў і участкаў, трымаць свойскую птушку або свіней на дачах. Гэтак робіць 32 % рэспандэнтаў. «Вярнуліся архаічныя формы выжывання, вядомыя да 1990 года, а ніякіх актыўных інавацыйных практык няма», – падкрэсліваюць эксперты ВЭБ.

Сёння пенсіі ў Расіі – адны з самых нізкіх у Еўропе (у сярэднім

блізу 13,7 тыс. руб. у год, г. зн. крыху больш за 200 долараў ЗША ў месяц). З 2014 г. яны таксама зменшыліся ў рэальным вылічэнні амаль на 7 %.

Паводле сучасных ацэнак экспертаў расійскай Вышэйшай школы эканомікі (ВШЭ), у 2–4 кварталах 2016 г. ВУП Расіі павялічваўся з хуткасцю 0,1 % у квартал. Такую сітуацыю нельга лічыць ажыўленнем, а больш слушна разглядаць як стагнацыю.

Паводле звестак Федэральнай службы дзяржстатыстыкі РФ (Расстату) і ВЭБ, аб'ём ВУП краіны ў 2016 г. знізіўся на 0,2 % (у 2015 г. – на 2,8 %). У першым квартале 2017 г. ВУП Расіі упаў яшчэ на 0,3 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Індэкс прамысловай вытворчасці за першы квартал 2017 г. вырас толькі на 0,1 %. Нязначна павялічылася вытворчасць сыравіны і прамежкавых тавараў, а выпуск інвестыцыйных і спажывецкіх тавараў, наадварот, знізіўся. У першым квартале 2017 г. рост адбыўся толькі ў нешматлікіх галінах: так, павялічыліся аб'ёмы вытворчасці электрады цеплаэнергіі і здабычы карысных выкапняў (галоўным чынам за кошт здабычы газу і вугалю, якія акрамя ўнутранага спажывання ідуць на экспарт) ды пяску. На 0,7 % вырасла вытворчасць прадуктаў сельскай гаспадаркі.

У астатніх сферах вытворчасці назіраецца падзенне. Больш за ўсё знізілася вытворчасць у сферы водазабеспячэння, водаадвядзення і ўтылізацыі адходаў (-5,1 %), а таксама ў сферы будаўніцтва (-4,3 %). У прыватнасці, у краіне было пабудавана на 25,8 % менш жылых дамоў, чым годам раней. Прыкметы стагнацыі, якая можа змяніцца рэцэсіяй, назіраюцца таксама ў дынаміцы фондавых індэксаў, якія адлюстроўваюць кошт акцый расійскіх кампаній, і ў дынаміцы інвестыцый у асноўны капітал.

Толькі пры канцы 2017 г., найперш дзякуючы зноў-такі больш спрыяльнай кан'юнктуры на паліўным рынку ў свеце, расійскаму ўраду ўдалося дасягнуць адносна невялікага (у межах 2 %) эканамічнага росту.

Тым не менш ва ўмовах, калі нацыянальнай ідэяй для вялікай колькасці расіян стала пашырэнне тэрыторыі імперыі, адміністрацыя Пуціна – Мядзведзева адчула сябе досыць камфортна. Гэта дазволіла ёй уцягнуць краіну ў яшчэ адзін сумнеўны знешнепалітычны пра-

ект – выступіць у падтрымку аўтарытарнага рэжыму сірыйскага прэзідэнта Башара Асада ў канфлікце апошняга з апазіцыяй. Пачынаючы з верасня 2015 г., расійская армія адкрыта ўмяшалася ў гэты канфлікт. Не дасягнуўшы, аднак, якой-небудзь рэальнай выгады і страціўшы жыцці дзясяткаў вайскоўцаў, у тым ліку высокапастаўленых афіцэраў, а таксама нямала ваеннай тэхнікі, Расія вуснамі свайго прэзідэнта пры канцы 2017 г. афіцыйна абвясціла аб пачатку вываду з Сірыі сваіх войскаў.

На думку заходніх аналітыкаў, ход вайны ў Сірыі сведчыць, што гнаны Захадам і падтрыманы Расіяй прэзідэнт Асад – толькі нязначная фігура ў шахматнай партыі, якую разыгрываюць на Блізкім Усходзе больш моцныя сусветныя дзяржавы. План па Сірыі, які прапануюць шматлікія амерыканскія эксперты, складаецца з трох асноўных этапаў. Першае – гэта абавязковае адхіленне ад пасады прэзідэнта Башара Асада. Другое: усталяванне ў Сірыі рэжыму бяспекі, які забяспечыць нармальнае існаванне грамадзянскай супольнасці. І трэцяе: стварэнне баяздольных сіл абароны, якія не дазволяць так званай «ісламскай дзяржаве» (ІД) скарыстацца зменай улады дзеля захопу новых тэрыторый. Аднак у ажыццяўленні гэтага плана Захад не можа спадзявацца на дапамогу Расіі. Для Масквы, адзначаюць эксперты, першачарговая задача ў Сірыі палягае не ў тым, каб стабілізаваць краіну, а каб рабіць як мага больш крокаў насуперак Злучаным Штатам.

Палітолаг Уладзімір Іназемцаў нядаўна адзначаў: «Цяпер, калі сам Пуцін і шмат якія расійскія чыноўнікі прызнаюць, што ўжо некалькі тысяч расіян ваююць на баку ІД, удары па ім і наогул стабілізацыя ў Сірыі ў значнай меры правакуюць уцёкі гэтых баевікоў. Таму… нанясенне ўдараў за мяжою, пра якія кажа Пуцін, можа прывесці да нечаканых для яго вынікаў і да зваротнай інфільтрацыі баевікоў ІД у Расію».

Эксперты звяртаюць увагу і на другі чыннік: невялікая вайна за межамі краіны дазваляе прэзідэнту Пуціну спісаць на яе эканамічныя праблемы Расіі, якія ўсё павялічваюцца. Да таго ж узмацненне ваенна-прамысловага комплексу дапамагае расійскай уладзе змагацца з эканамічным спадам, ствараючы дадатковыя працоўныя месцы. Паводле некаторых падлікаў, цяпер на вайну працуюць прыкладна 16 % працаздольных расіян.

Не выпадкова таксама, што ў апошнія месяцы 2017 г. у Крамлі з візітамі пабываў цэлы шэраг лідараў і дыпламатаў вядучых арабскіх дзяржаў. Так, пасля сустрэчы прадстаўнікоў Масквы і Эр-Рыяда Сірыя паабяцала ўкласці ў расійскую эканоміку ў бліжэйшы час 10 млрд долараў.

Якая ж сітуацыя складалася на палітычным полі ў Расіі да канца 2017 года? Ранейшае пакаленне апазіцыйных лідараў страціла свае ўплывы, а большасць з іх папросту ўжо не жыве. Так, у лютым 2015 г. у цэнтры Масквы быў забіты ўплывовы апазіцыйны палітык Барыс Нямцоў, і абставіны гэтага забойства па сёння да канца не раскрыты. Актыўныя дзеянні аднаго з арганізатараў масавых пратэстаў у 2011–2017 гг. Аляксея Навальнага прывялі да таго, што ён быў абвінавачаны расійскай пракуратурай у розных злоўжываннях і адхілены ад магчымасці ўдзельнічаць у чарговых прэзідэнцкіх выбарах.

Допінгавы скандал на Алімпіядзе, якую Расія праводзіла ў 2014 г. у Сочы, прывёў да таго, што кантраляваны ўладамі (насуперак Алімпійскай хартыі) Нацыянальны алімпійскі камітэт Расіі быў выключаны са складу Міжнароднага алімпійскага камітэта, і на зімовай Алімпіядзе 2018 г. у карэйскім Пхёнчхане расійская зборная выступала пад нейтральным алімпійскім флагам. Расія таксама атрымала права правесці ў 2018 г. чарговы чэмпіянат свету па футболе.

Паводле звестак расійскага Цэнтрвыбаркама, на *чарговых прэзідэнцкіх выбарах*, што адбыліся 18 сакавіка 2018 г., Уладзімір Пуцін перамог у першым туры, набраўшы 76,69 % галасоў тых, хто браў удзел у гэтых выбарах.



© Фота Улада Докшына (ovdinfo.org)

Акцыя пратэсту «Ён нам не Цар!»
пасля чарговых прэзідэнцкіх выбараў.
Масква, травень 2018 г.

***12.3. Культура і навука Расіі постсавецкага часу.*** Пасля распаду СССР у 1991 г. і крушэння камунізму перад расійскімі мастакамі адкрыліся новыя магчымасці. Сёння можна весці гаворку пра адносна поўную свабоду аб'яднанняў і творчага выяўлення. З'явіліся мастацкія групоўкі і прыватныя галерэі; з іх шмат якія карыстаюцца спонсарскай падтрымкай банкаў і камерцыйных прадпрыемстваў. Што да стылю, то ў сучасным мастацтве можна знайсці ўсё: ад неапрымітывізму ды стылізацый пад народныя промыслы да сюррэалізму і абстракцыянізму. Кардынальнае змяненне сістэмы каштоўнасцяў прывяло да глыбокага крызісу грамадскай думкі. Шмат каго цяпер займае пытанне, ці не сказіць новы дух камерцыі тое высокае пакліканне, на якое ў культурным і палітычным жыцці Расіі заўсёды прэтэндавала мастацтва?

Сярод старэйшага постсавецкага пакалення расійскіх *мастакоў* сёння найбольш папулярныя паводле паказчыкаў продажу выкананых імі прац Георгій Гур'янаў, Цімур Новікаў, Леанід Пурыгін, Валерый Кашлякоў. Рэйтынг прац маладых мастакоў узначальвае Яўгеній Антуф'еў, за ім ідуць Цімафей Радзя, Ягор Кошалеў. Цікавыя творы ёсць у даробку інгушскага мастака Дауда Аздоева, татарскага жывапісца Азада Хабібуліна, удмурцкага мастака Валерыя Чтака, якуцкага мастака Ісая Капітонава.


Крыніца: nekropole.info

Эрнст Неізвесны. Прарок

Вельмі вядомымі (хоць і неадназначна ацэненымі) сталі працы рускага *скульптара* Вячаслава Клыкава, расійска-грузінскага разьбяра Зураба Цэрэтэлі, а таксама асецінскага скульптара Станіслава Тавасіева, чачэнскага скульптара Дарчы Хасаханава, дагестанска-лезгінскага разьбяра Шарыфа Шахмарданава. Вярнуліся ў Расію шматлікія творы руска-габрэйскага скульптара-эмігранта Эрнста Неізвеснага.

У расійскай *архітэктуры* вядомасць набылі працы рускіх архітэк-

тараў Уладзіміра Белавусава, Юрыя Гнядоўскага, Уладзіміра Кубасава, Уладзіміра Папова, Ірыны Бенуа, татарскіх дойлідаў Іскандэра Сайфуліна, Саяра Айдарава.

У літаратуры ў гэты час яскрава пра сябе заявілі рускія творцы Людміла Петрушэўская, Віктар Ерафееў, Віктар Пялевін, Уладзімір Сарокін, Таццяна Талстая, Вячаслаў П'ецух, адыгейскі празаік Сафер Панеш, башкірскі паэт Сафуан Алібай, башкірскі празаік і драматург Нажыб Асанбаеў, марыйскі празаік Юрый Салаўёў-Косатан, татарская пісьменніца Гузель Яхіна, тувінскі паэт Майнай Саая, хакаскі празаік Андрэй Халараў, чачэнскі паэт Зелімхан Яндарбі, чачэнскі празаік Канта Ібрагімаў, чувашскія паэты Пурхі Ахван, Альбіна Юрату ды іншыя.

Як і ў папярэдні перыяд, значныя пастаноўкі ў розных расійскіх тэатрах ажыццявілі рускія рэжысёры Галіна Волчак, Алег Табакоў, Валерый Фокін, да іх, сяр од іншых, далучыліся Пётр Фаменка, татарскі рэжысёр Рашыд Загідулін.

У *кінамастацтве* побач з выбітнымі рускімі рэжысёрамі Эльдарам Разанавым, Мікітам Міхалковым, Аляксандрам Рагожкіным, Леанідам Гайдаем, Пятром Тадароўскім вылучыліся такія яскравыя асобы, як Аляксандр Сакураў, Андрэй Звягінцаў, Андрэй Балабанаў, Павел Лунгін, Аляксей Учыцель, Рэната Літвінава, Кірыл Сярэбранікаў, Павел Чухрай, руска-габрэйскі пастаноўшчык Дзмітрый Астрахан, руска-марыйскі кінарэжысёр Андрэй Эшпай ды іншыя. Папулярнымі зрабіліся рускія акторы Канстанцін Хабенскі, Сяргей Гармаш, Кацярына Вілкова, Аляксандр Балуеў, Сяргей Бязрукаў, Аляксей Чадаў, Андрэй Мярзлікін, Ак сана Акіньшына, Сяргей Макавецкі, Ганна Кавальчук, татарскія актрысы Чулпан Хаматава, Роза Хайруліна і г. д.

Сярод *кампазітараў* постсавецкай Расіі варта адзначыць творы рускіх музыкантаў Эдуарда Арцём'ева, Ільі Дэмуцкага, Антона Лубчанкі, карэльскага кампазітара Аляксандра Белабародава, татарскіх кампазітараў Іраіды Юсупавай, Зульфіі Раупавай.

Сапраўдную славу, у тым ліку па-за межамі Расіі, займелі сучасныя рускія *оперныя выканаўцы* Ганна Нятрэбка, Дзмітрый Хварастоўскі, Вольга Барадзіна, Сяргей Лейферкус, Вячаслаў Полазаў, башкірскія спевакі Таццяна Ніканорава і Ільдар Абдразакаў, бурацкая спявачка

Вольга Жыгмітава, татарская спявачка Венера Гімадзіева, а таксама рускія *балерыны* Ульяна Лапаткіна, Святлана Захарава, Дзіяна Вішнёва, бурацкая балерына Марыя Магзолава. Шмат каго здзіўляе сваім унікальным голасам чачэнскі спявак Шарып Умханаў.

Дасягненні расійскай *навукі* апошніх гадоў маюць супярэчлівы характар. Вялікая колькасць таленавітых навукоўцаў выехала за мяжу, галоўная прычына гэтага – фінансаванне навуковых даследаванняў паводле астаткавага прынцыпу, немалыя бюракратычныя перашкоды, слабая матэрыяльна-тэхнічная база шмат якіх навуковых цэнтраў.

Разам з тым у 2000-х гг. некалькі расійскіх вучоных атрымалі Нобелеўскія прэміі ў галіне фізікі: беларус Жарэс Алфёраў (2000), а таксама Аляксей Абрыкосаў і Віталій Гінзбург (2003), Андрэй Гейм і Канстанцін Навасёлаў (2010). Павялічылася колькасць навукова-папулярных часопісаў і выдадзеных кніг падобнага характару. У 2014 г. урадам Расіі была зацверджана Дзяржаўная праграма развіцця навукі і тэхналогій на 2013 –2020 гг.; у выніку палепшылася фінансаванне некаторых навуковых напрамкаў, найперш звязаных з ВПК. Так, бюджэтнае фінансаванне фундаментальных даследаванняў на 2017 год павінна было скласці 89 524 214,1 тыс. руб. (каля 1,5 млрд долараў ЗША).

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Алігархія*** – рэжым, пры якім палітычная ўлада ў краіне належыць вузкаму колу асоб. Як правіла, гэтыя асобы з'яўляюцца мільярдэрамі і мультымільянерамі, належаць да вайскова-палітычнай эліты або спецслужбаў і дапамагаюць вызначаным імі палітычным кіраўнікам у забеспячэнні трываласці функцыянавання такога рэжыму.

***Анексія*** – гвалтоўны захоп тэрыторыі чужой краіны або яе часткі.

***Ваўчар*** – каштоўная папера мэтавага прызначэння, якая павінна гарантаваць бясплатную перадачу яе трымальніку часткі былой агульнадзяржаўнай маёмасці.

***Вялікадзяржаўны шавінізм*** – агрэсіўная форма нацыяналізму вялікай паводле тэрыторыі і насельніцтва дзяржавы ў дачыненні да малых дзяржаў.

***Губернатар*** – найвышэйшая службовая асоба рэгіёна – суб'екта сучаснай Расійскай Федэрацыі; пачынаючы з 2012 г. выбіраецца насельніцтвам з ліку падтрыманых прэзідэнтам кандыдатур.

***Дзяржаўная Дума Расійскай Федэрацыі*** – ніжэйшая палата сучаснага расійскага парламента, у якой засядаюць прадстаўнікі розных палітычных груповак.

***Контррэформы*** – рэформы, скіраваныя на в яртанне да р анейшых парадкаў.

***«Ліберальная імперыя»*** – канцэпцыя ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, у межах якой моцная дэмакратычная дзяржава з рынкавай эканомікай ажыццяўляе экспансію ў іншых дзяржавах з мэтай дасягнення стабільнасці ў зносінах з апошнімі. Грунтуецца на ідэі стварэння «прывабнага вобраза» экспансіяніцкай дзяржавы.

***Прыватызацыя*** – раздзяржаўленне маёмасці, якое праводзіцца з ініцыя тывысамой дзяржавы.

***Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі*** – кіраўнік сучаснай Расійскай дзяржавы, які мае амаль не абмежаваныя паўнамоцтвы ў ажыццяўленні яе ўнутранай і знешняй палітыкі, з'яўляецца вярхоўным галоўнакамандуючым расійскай арміі, валодае правам роспуску Дзярждумы. Гэтую пасаду дагэтуль займалі 3 асобы: Барыс Ельцын, Уладзімір Пуцін і Дзмітрый Мядзведзеў.

***«Рускі свет»*** – паўафіцыйная дактрына ўладаў сучаснай Расійскай Федэрацыі, згодна з якой яны прыўлашчылі права «бараніць інтарэсы рускамоўнага насельніцтва» па ўсім свеце, асабліва ў постсавецкіх дзяржавах.

***Савет Федэрацыі*** – вышэйшая палата сучаснага расійскага парламента, у якой фармальна прадстаўлены рэгіёны дзяржавы.

***Савет муфціяў*** – адна з цэнтралізаваных арганізацый мусульман сучаснай Расіі, створаная ў 1996 г. на чале з шэйхам Равілем Гайнутдзінам.

***Суд прысяжных*** – суд, вердыкт у якім наконт вінаватасці або невінаватасці абвінавачаных выносяць асобы, якія прынялі спецыяльную прысягу.

***Федэральная служба бяспекі (скарочана: ФСБ)*** – орган, афіцыйна створаны дзеля абароны бяспекі Расійскай Федэрацыі і падпарадкаваны непасрэдна прэзідэнту краіны. Кадравы склад ФСБ сфарміраваўся на аснове супрацоўнікаў былога Камітэта дзяржбяспекі СССР.

***Ценевая эканоміка*** – сістэма вытворчасці, якая існуе насуперак дзейнаму ў краіне заканадаўству.

## ЛІТАРАТУРА ДА РАЗДЗЕЛА


Абарин, В., Сидорова, Г. «Русский мир», б ессмысленный и беспощадный. 15.02.2015 // *Рэжым доступу*: https://www.svoboda.org/a/26855650.html.

Аликин, А. Экономика России: От спада к стагнации и обратно к спаду? // Иносми.ру. Россия сегодня. 4.05.2017. *Рэжым доступу*: https://inosmi.ru/economic/20170504/239278406.html.

Андреева, Е. Ю. Постмодернизм: Искусство второй половины XX – начала XXI века. С.-Петербург: Азбука-классика, 2007. 488 с.

Возрождение российского искусства в конце XX века – начале XXI века: монография / под ред. Ю. А. Бревновой. Новосибирск: Изд-во «СибАК», 2016. 108 с.

Гайдар, Е. Т. Дни поражений и побед. Москва: ВАГРИУС, 1996. 365 с.

Зыгарь, М. Вся кремлевская рать. Краткая история современной России. 2-е изд. Москва: Альпина-Паблишер, 2018. 408 с.

История России / под ред. В. И. Меньковского и О. И. Яновского. Минск: РИВШ, 2005. С. 573–657.

Короткевич, В. И. История современной России. 1991–2003: учеб. пособие. С.-Петербург: Изд-во Санкт-Петербургского ун-та, 2004. 296 с.

Крайз, С. Придуманный мир Путина. О чем молчат в России. Москва: Алгоритм, 2017. 224 с.

Нагаева, Г. История России в формате ЕГЭ. Новейшее время. Ростов-на-Дону: Феникс, 2017. С. 63–69.

Путин, В. В. 100 и 1 цитата. Москва: Проспект, 2017. 192 с.

Церашковіч, П. Глабальныя праблемы чалавецтва: нарысы эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі сучаснасці. Мінск: Зміцер Колас, 2017. 176 с.

Чубайс, И. Б. Чубайс против Путина. Чем заменить «вертикаль власти». (Проект «Путин»). Москва: Алгоритм, 2016. 208 с.

Эпоха Ельцина: Очерки политической истории / Ю. М. Батурин [и др.]. Москва: ВАГРИУС, 2001. 815 с.

Lourie, R. Putin: His Downfall and Russia's Coming Crash. N. Y.: Thomas Dunne Books – St. Martin's Press, 2017. 272 p.

Morozov, V. Russia's Postcolonial Identity: A Subaltern Empire in a Eurocentric World. Basingstoke, N. Y.: Palgrave Macmillan, 2015. 209+viii p.

Rosja. Rozważania imperiologiczne / red. A. Skrzypek, S. Bieleń. Warszawa: ASPRA, 2015. 262 s.

Roxburgh, A. The Strongman. Vladimir Putin and the Struggle for Russia. London: I. B. Tauris, 2014. 398 p.

Schröder, Hans Henning, Prof., Dr. Russland unter den Präsidenten Putin und Medwedew, 1999–2012. (Bundeszentrale für politische Bildung, 6.07.2012) *Рэжым доступу*: https://www.bpb.de/internationales/europa/russland/47926/russland-unter-den-praesidenten-putin-und-medwedew-1999-2012?p=all.

Van Herpen, M. Putin's Propaganda Machine. Lanham, MD – N. Y.: Rowman & Littlefield, 2016. 319 p.

# 13. ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ: КУДЫ ІДЗЕ РАСІЯ?

У сённяшняй Расійскай Федэрацыі існуе дзіўная блытаніна з імперскай ідэалогіяй. З аднаго боку, адбываецца ўшанаванне памяці ахвяр сталінскага тэрору, а з другога – усё часцей з'яўляюцца думкі пра тое, што «не ўсё так кепска было ў СССР». Больш за тое, трагедыя, маўляў, была якраз у тым, што Саюз развалiўся. У адных газетах пішуць пра рускіх дваран, пра іх высокую духоўнасць, узгадваюць Аляксандра Салжаніцына, а ў другіх – пра тое, якім «магутным дзяржаўнікам быў Сталін».

«Для Расіі, з яе гіганцкай тэрыторыяй і незлічонай колькасцю карысных выкапняў у яе нетрах «ніякай альтэрнатывы «чырвонай мадэлі» няма і быць не можа, і гісторыя гэта даказала», – чытаем у Іллі Пажыдаева ў артыкуле, дзе ён, сярод іншага, перасцерагае: «Гаворка пры гэтым ідзе не пра Хрушчова, Брэжнева, Чарненку і іншых падобных маразматыкаў. Яны менавіта з прычыны сваёй абсалютнай дзяржаўнай бяздарнасці і ідыятызму, зрэшты, і заклалі наш цяперашні імперыялістычны падмурак. А гаворка ідзе пра Леніна, Сталіна, Мао, Дэн Сяопіна , Хо Шы Міна, Фі дэля Кастра, Гамаль Абдэль Насэра ды іншых вельмі нешматлікіх кіраўнікоў-геніяў такога маштабу. Дык вось адзіная нацыя магчымая толькі пры іх і пры іхняй палітыцы». Яшчэ ў адным месцы той самы Пажыдаеў піша: «Калі Руская Праваслаўная Царква наважыцца далучыць Сталіна да грона святых, то гэтае яе рашэнне будзе адным з самых смелых і значных за шмат апошніх гадоў. І самае галоўнае – гэта будзе абсалютна справядліва!» (сайт «Русская Народная Линия»). Заўважым, што ўсё гэта піша не пенсіянер, а 30-гадовы дыпламаваны юрыст: будучыню Расіі ён бачыць фактычна ў панаванні ў ёй тэрарыстаў.

Першы са згаданых артыкулаў з'явіўся не дзе-небудзь, а ў маскоўскай «Литературной газете» 4 лістапада 2016 г. – у дзень, калі Расія дванаццаты раз адзначала свой Дзень народнага адзінства.

У 2005 г., калі Расія яшчэ знаходзілася ў стане выпаўзання з багны бальшавіцкай ідэалогіі, там вырашылі прыдумаць «галоўнае расійскае нацыянальнае свята», але так, каб яно больш-менш супадала са святкаваннем 7 лістапада – днём бальшавіцкага тэрарыстычнага перавароту.

Расійскія прыўладныя ідэолагі пачалі шукаць нешта гераічнае. Пасля напружаных пошукаў, нарэшце, знайшлі: «4 лістапада 1612 года воіны народнага апалчэння пад камандаваннем Кузьмы Мініна і Дзмітрыя Пажарскага штурмам узялі Кітай-горад, вызваліўшы Маскву ад польскіх інтэрвентаў». Тое, што ў войску гэтых самых «інтэрвентаў» у большасці ваявалі беларусы, а таксама літоўцы, украінцы і нават самі велікаросы, згаданых ідэолагаў, здаецца, не надта хвалявала. Якім чынам гэтая перамога магла б стаць агульнарасійскай, расійскім народам таксама ніхто не патлумачыў. Наўрад ці жыхары Каўказа або волжска-ўральскія ды сібірскія народы ўбачылі ў гэтай даце хоць нешта святочнае для сябе…

У апошнія гады ў Расіі пачалася глабальная пераацэнка гістарычных падзей. Некаторыя сумленныя гісторыкі адразу ўзнялі трывогу: маўляў, гэтае дзіўнае свята ніякім чынам не можа аб'яднаць усе народы федэрацыі, большасць з якіх у той час жыла зусім не пад святлом крамлёўскіх зорак. Калі разабрацца, наогул там святкаваць няма чаго, бо пасля таго як Маскву вызвалілі, яшчэ шэсць гадоў у дзяржаве панавала «смута» – войны з суседзямі і міжусобіцы працягваліся. Дзень народнага адзінства мае, такім чынам, вельмі сумнеўны, хісткі гістарычны падмурак.

Але больш істотным выглядае іншае. Асноўная маса расіян, якая скептычна глядзіць на любыя гучныя ініцыятывы любых уладаў, і гэтую ініцыятыву, мякка кажучы, не сустрэла з вялікім энтузіязмам. Затое да святочных шэсцяў у гонар гэтай даты далучыўся, скажам, «Рух супраць нелегальнай іміграцыі» – тыя асобы, што голяць галовы, змагаюцца за «этнічную чысціню Расіі» і лупцуюць «чорных». Яны пачалі выходзіць на дэманстрацыі з лозунгамі «Расія для рускіх!» Такая хваля пракацілася не толькі па Маскве, але і па ўсіх буйных гарадах Расіі. У выніку ў прэсе падобныя зборышчы пачалі называць «Днём фашыста». Улада кінулася разганяць і арыштоўваць іх удзельнікаў, але выставіць ім сур'ёзных абвінавачванняў папросту не

было каму. Нешта падобнае адбываецца цяпер у Расіі штогод, прычым колькасць нацыянал-шавіністаў там, прынамсі, не змяншаецца.

У 2016 г. на Дзень адзінства ў Маскве быў адкрыты помнік кіеўскаму князю Уладзіміру. І зноў завіравалі дыскусіі, у якіх адны расейскія гісторыкі счапіліся з іншымі. Думка пра тое, што Уладзімір да Масквы не мае ніякага дачынення, што ў сапраўднасці такі помнік «з'яўляецца, перш за ўсё, прыкметай узмацнення рэлігійнай экспансіі ў Расіі», дзе царква «ператварылася ў своеасаблівага алігарха, які валодае велізарнай фінансавай моцай», перакрываецца версіяй пра тое , што «Уладзімір стварыў тую самую агульнасць, якую мы цяпер называем *Рускім светам*».

Між тым з'яўленне помніка князю Уладзіміру у Маскве выглядае цалкам лагічным пасля таго, як у 2014 г. прэзідэнт Пуцін заявіў у Крыме, што «менавіта тут, у Крыме, у старажытным Херсанэсе... прыняў хрышчэнне князь Уладзімір, а пасля была ахрышчана і ўся Русь». Гэта было нічым іншым, як і дэалагічным абгрунтаваннем далучэння Крыма да Расійскай Федэрацыі.

Хістанні ў розныя бакі ў расійскай імперскай ідэалогіі цягнуцца яшчэ з царскай эпохі. А цяперашнім часам ізноў пачалася глабальная пераацэнка гістарычных падзей. Мясцовыя публіцысты і нават людзі з навуковымі ступенямі ў вялікай колькасці выкінулі на кніжны рынак Расіі і суседніх краін свае опусы, у якіх яны то даводзяць надзвычайную старажытнасць рускай нацыі і яе паходжанне ад гіпербарэяў, то літаральна лямантуюць, што Украіна, Беларусь або Казахстан – гэта «недадзяржавы» або, нават больш вытанчана, «эканамічна непатрэбныя структуры». Федэральныя тэлеканалы расказваюць даверлівым гледачам пра тое, што нібыта ў Рыме знойдзены рэшткі старадаўняй рускай «избы».

Вядомы беларускі журналіст і літаратар Аляксандр Лукашук не так даўно сказаў: «Будучае змяніць немагчыма – змяніць можна толькі мінулае». Вось у Расіі сёй-той і спрабуе гэта рабіць, прытым вельмі актыўна.

Але куды ўсё-такі ідзе сённяшняя Расія? У сваёй нядаўна выдадзенай кнізе «Чубайс супраць Пуціна. Чым замяніць сённяшнюю вертыкаль улады?» палітолаг, брат аднаго з «архітэктараў ельцынскай Расіі» і яго палітычны апанент (паводле ўласных слоў) Ігар Чубайс

ускладае надзею на пазітыўныя змены ў будучай Расіі, на тое, што некалі ў Расіі вертыкаль улады цяперашняга кшталту будзе замененая «шырокім самакіраваннем». На жаль, мы вымушаны выказаць вялікія сумневы ў тым, што некалі нешта такое ў прынцыпе можа адбыцца. Па-першае, амаль тысячагадовая гісторыя існавання Маскоўскай і Расійскай дзяржавы паказвае, што ніколі ў гісторыі ўладныя колы па-сапраўднаму не былі зацікаўлены ў тым, каб нешта падобнае мела месца. Можна, вядома, паверыць у шчырасць слоў першага прэзідэнта РФ Барыса Ельцына, які ў жніўні 1990 г. прапанаваў расійскім аўтаноміям браць «столькі суверэнітэту, колькі яны здольныя праглынуць», але, прыкладам, падзеі дзвюх чачэнскіх войнаў 1990-х гг., большасць якіх адбывалася пры тым жа Ельцыне, паказваюць, што гэта былі адно словы… Па-другое, знаходжанне пры любой уладзе, хоць самай маленькай, у гэтай краіне заўсёды звязвалася з велізарнымі эканамічнымі выгодамі для адпаведных людзей. Насіць на руцэ гадзіннік коштам у некалькі тысяч долараў лічыцца фірмовым знакам сённяшняй расійскай улады і асоб, якія яе непасрэдна абслугоўваюць.

На жаль, сённяшнія праблемы Расіі ва ўзаемадачыненнях з яе суседзямі не з'яўляюцца вынікам дзейнасці цяперашняга кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі і яе сучасных эліт. Каранёў гэтых з'яў трэба дашуквацца ў глыбокай мінуўшчыне, якая і стварыла ментальнасць гэтых самых эліт. Шэраг даследчыкаў выказвае меркаванне, што паваротным момантам у расійскай гісторыі стала Высокае і Позняе Сярэднявечча: тады на велікарускіх землях пачала фармавацца яшчэ адна ўсходнеславянская супольнасць, наўгародска-пскоўская (ці дзве асобныя), адметнасць якой знішчыла Масква праз заваяванне і татальнае падпарадкаванне сабе. З таго часу ўсё мацней і мацней пачалі сябе выяўляць адрозненні дзяржаўнага ладу еўрапейскіх краін і Маскоўскай дзяржавы (пазней – Расійскай імперыі, Савецкага Саюза, Расійскай Федэрацыі). Да Пятра І Расія фактычна функцыянавала як асобная цывілізацыя. Апошняй у Еўропе яна ліквідавала прыгон, апошняй увяла канстытуцыйную манархію, не маючы аж да рэвалюцыі 1905 г. ні канстытуцыі, ні парламента (у той самы час як Польшча і Фінляндыя мелі і тое, і другое)… На жаль, і сёння на самым высокім узроўні ў нашых усходніх суседзяў чуюцца галасы, што

Расія – гэта, па-ранейшаму, нейкая незвычайная цывілізацыя, пры гэтым дэ-факта падразумяваецца яе «асаблівая чысціня» і – што самае горшае – «вышэйшасць» у параўнанні з суседнімі «недадзяржавамі» і нават іншымі цывілізацыямі. Усё гэта і сілкуе рознага кшталту радыкальныя (часам нацысцкія) групоўкі, небяспеку якіх сёння не варта недаацэньваць.

Амаль усе аўтары гэтай кнігі маюць у сваім радаводзе велікарускія карані. Ім асабліва баліць душа за цяперашнюю Расію, якая, нягледзячы на велізарныя багацці сваіх нетраў, так і не навучылася належным чынам будаваць уласную эканоміку, а самае галоўнае – разумець і паважаць іншыя народы свету, у тым ліку сваіх найбліжэйшых суседзяў. Цэбры нянавісці і хлусні штодня выліваюцца на тых жыхароў былой імперыі, якія хочуць мець уласную мову, культуру і жыць паводле правіл, усталяваных імі самімі.

У 1974 г. на савецкія экраны выйшаў зняты выдатнымі рэжысёрамі розных нацыянальнасцяў – Міхаілам Ромам, Элемам Клімавым, Марленам Хуцыевым, Германам Лаўровым – дакументальны фільм пад назвай «І ўсё-такі я веру». Аўтары-складальнікі гэтай кнігі таксама ўсё-такі вераць, што вялікадзяржаўны шавінізм і ксенафобія, якія досыць моцна ўкараніліся сярод эліт суседняй дзяржавы, калі-небудзь там будуць пераадолены. Абы гэта толькі адбылося без чарговых усяленскіх катастроф.

# ХРАНАЛОГІЯ НАЙВАЖНЕЙШЫХ ПАДЗЕЙ У ГІСТОРЫІ РАСІІ

**(усе даты да 1 сакавіка 1918 г. падаюцца паводле юліянскага календара)**

V –IV тыс. да н. э. – засяленне тэрыторыі сённяшняй еўрапейскай часткі Расіі на поўначы плямёнамі археалагічнай культуры ямачна-грабеньчатай керамікі (большасць даследчыкаў адносіць іх да продкаў сучасных фіна-ўграў), на поўдні – плямёнамі днепра-данецкай культуры, якія, магчыма, размаўлялі на праіндаеўрапейскай мове.

II тыс. да н. э. – час засялення часткі сучаснай тэрыторыі паўднёва-заходняй Расіі протаскіфскімі плямёнамі археалагічнай культуры драўляных (зрубавых) пахаванняў.

II – I тыс. да н. э. – час засялення тэрыторыі басейна Волгі і Акі прота-балцкімі плямёнамі фацьянаўскай археалагічнай культуры.

VIII –IX стст. н. э. – прыход з захаду на землі сучаснай Расіі, заселеныя фіна-ўгорскімі і часткова балцкімі плямёнамі, славянскіх плямён вяцічаў (роменска-баршчоўская культура), пскоўскіх крывічоў (культура доўгіх курганоў) і ільменскіх славенаў (культура сопак). З'яўленне на наўгародскіх землях (у Ладазе) першых скандынаўскіх (варажскіх) дружын.

IX ст. – княжанне ў Ноўгарадзе Рурыка і яго швагра Алега; падпарадкаванне Ноўгарадам Кіева (княжанне там сына Рурыка Ігара). Узнікненне Кіеўскай Русі.

980-я гг. – звяржэнне наўгародскім князем Уладзімірам Святаслававічам кіеўскага князя Яраполка.

Канец X – пачатак XI ст. – пачатак хрышчэння ўсходніх славян кіеўскім князем Уладзімірам.

1010–1034 гг.– княжанне ў Ноўгарадзе (у 1016 –1054 гг., з перапынкам, таксама ў Кіеве) Яраслава Уладзіміравіча (Мудрага).

1020 і 1067 гг. – войны кіеўскіх і наўгародскіх князёў з полацкімі Ізяслававічамі.

1055–1067, 1078–1088 гг. – княжанне ў Ноўгарадзе Ізяслававічаў.

1067 –1078, 1094–1095 гг. – княжанне ў Ноўгарадзе Святаслававічаў.

1136 г. – утварэнне Наўгародскай феадальнай рэспублікі (праіснавала да 1479 г.).

Першая палова XII ст. – узвышэнне Растова-Суздальскага княства на чале з Юрыем Далгарукім, сынам вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха.

1147 г. – магчымая дата заснавання горада Масквы Юрыем Далгарукім (?).

1157–1174 гг. – княжанне ва Уладзіміры Андрэя Багалюбскага, сына Юрыя Далгарукага і дачкі палавецкага хана Аепы; узвышэнне Уладзімірскага княства.

1176 –1212 гг. – княжанне ва Уладзіміры Усевалада Вялікае Гняздо, малодшага брата Андрэя Багалюбскага.

31 траўня 1223 г. – разгром аб'яднаных усходнеславянска-палавецкіх войскаў манголамі на рацэ Калцы.

1237 г. – пачатак нашэсця войскаў мангольскага хана Бату (Батыя) на паўночна-ўсходнеславянскія землі.

1240 –1242 гг. – уварванне сіл шведскіх і лівонскіх рыцараў на наўгародскія землі; перамогі над імі князя Аляксандра Неўскага.

1243 г. – утварэнне Залатой Арды; прызначэнне ханам Арды Батыем уладзімірскага князя Яраслава Уладзіміравіча вялікім князем кіеўскім.

1246 г. – Батый карае смерцю кіеўскага князя Міхаіла Усеваладавіча.

1249 –1263 гг. – княжанне (паводле ханскага ярлыка) Аляксандра Неўскага ва Уладзіміры.

1299 г. – пераезд кіеўскага праваслаўнага мітрапаліта Максіма ва Уладзімір.

1318, 1325 гг. – хан Залатой Арды Узбек карае смерцю ўладзімірскіх князёў Міхаіла Яраслававіча і яго сына Дзмітрыя.

1327 г. – паўстанне супраць Залатой Арды жыхароў Цвяры; задушана войскамі маскоўскага князя Івана Каліты.

1331 г. – ярлык ад хана Узбека на княжанне ва Уладзіміры атрымоўвае Іван Каліта (княжыў да 1341 г.).

Пачатак 1330-х гг. – пераезд праваслаўнага мітрапаліта Пятра з Уладзіміра ў Маскву.

1348 г. – абвяшчэнне незалежнасці Пскоўскай рэспублікі (праіснавала да 1510 г.).

1350 г. – узмацненне самастойнасці Вялікага княства Разанскага (праіснавала да 1521 г.).

1362 г. – маскоўскі князь Дзмітрый (Данской) атрымоўвае ад ханскага цемніка Мамая ярлык на ўладзімірскае княжанне.

1368, 1370, 1372 гг. – паходы вялікага князя Альгерда на Маскву.

8 верасня 1380 г. – разгром войска Мамая на Куліковым полі аб'яднанымі сіламі ўсходнеславянскіх княстваў на чале з Дзмітрыем Данскім.

1382 г. – знішчэнне Масквы ханам Залатой Арды Тахтамышам.

1385–1485 гг. – існаванне самастойнага Цвярскога княства.

1389–1425 гг. – княжанне ва Уладзіміры (паводле ярлыка, выдадзенага ханскім паслом Шахматам) Васілія I, сына Дзмітрыя Данскога.

1404 г. – утварэнне Смаленскага ваяводства, якое знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Вялікага Княства Літоўскага.

1425–1433 гг. – княжанне ў Маскве і Уладзіміры (паводле ярлыка, выдадзенага ханам Улу Мухамедам) Васілія II Цёмнага, сына Васілія I і Соф'і Вітаўтаўны.

1439 г. – маскоўскі праваслаўны мітрапаліт Ісідар падтрымлівае Фларэнтыйскую дамову аб аб'яднанні праваслаўнай царквы з рымакаталіцкай; гэтае рашэнне не прымае Васілій Цёмны і адхіляе Ісідара ад пасады мітрапаліта.

1447 г. – Васілій Цёмны абвяшчае сябе гасударом Маскоўскім і ўсяе Русі; годам пазней такі ж тытул атрымоўвае яго сын Іван III.

Кастрычнік-лістапад 1480 г. – стаянне расійскіх войскаў і войскаў хана Ахмата на рэчцы Угры; фактычнае набыццё маскоўскімі ўладарамі незалежнасці ад ханаў Залатой Арды.

1492–1494 гг. – першая абвешчаная вайна Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ.

1497 г. – выданне Іванам III свайго Судзебніка.

1500–1503 гг. – другая вайна Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ.

1503 г. – сабор Маскоўскай праваслаўнай царквы, на якім асуджаны за ерась Ніл Сорскі.

1505–1533 г. – уладаранне ў Маскоўскай дзяржаве Васілія III.

1506–1508, 1512–1522 гг. – трэцяя і чацвёртая войны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ.

1514 г. – захоп Масквой Смаленска.

8 верасня 1514 г. – паражэнне войскаў Масковіі ў бітве пад Оршай супраць войскаў ВКЛ і Польшчы.

1521 г. – разрабаванне Масквы крымскімі татарамі на чале з ханам Мухамед-Гірэем.

1533–1584 гг. – уладаранне ў Маскве Івана IV Жахлівага (у 1547 г. абвясціў сябе гасударом Расійскага царства).

1534–1537 г. – пятая вайна Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ.

1549 г. – першы Земскі сабор («сабор замірэння») Івана IV у Маскве.

1550 г. – выдадзены Судзебнік Івана IV.

1551 г. – Стагаловы сабор расійскай праваслаўнай царквы ў Маскве.

1552 г. – захоп расійскімі войскамі Казані; падпарадкаванне Казанскага ханства.

1556 г. – захоп Масквой Астрахані; ліквідацыя Астраханскага ханства.

1558–1583 гг. – Лівонская (Інфлянцкая) вайна. Акупацыя Полацка ў 1563–1579 гг.

1565–1572 гг. – апрычніна ў Расіі.

Чэрвень-ліпень 1566 г. – другі Земскі сабор у Маскве.

Травень 1571 г. – крымскі хан Дэўлет-Гірэй спальвае Маскву.

Ліпень 1572 г. – перамога расійскіх войскаў над крымскімі татарамі ў бітве каля Моладзяў.

1575–1576 г. – указам Івана IV Сімяон Бекбулатавіч аб'яўлены вялікім князем Маскоўскім.

1581 г. – забойства Іванам Жахлівым свайго спадкаемцы на троне Івана Іванавіча.

1582 г. – атрады Ермака заваёўваюць Сібірскае ханства.

1584–1598 г. – цараванне ў Масковіі Фёдара Іванавіча пры фактычным кіраванні дзяржавай Барыса Гадунова.

1589 г. – стварэнне асобнага ад Канстанцінопаля расійскага патрыярхату царквы ўсходняга абраду.

1591 г. – смерць царэвіча Дзмітрыя Іванавіча ў Угліччы.

24 лістапада 1597 г. – выданне царом Фёдарам Іванавічам указа аб запрыгоньванні сялян.

1598–1605 гг. – афіцыйнае цараванне Барыса Гадунова.

1601–1603 гг. – масавы голад у Расіі.

1603–1613 гг. – Смутны час у Расійскім царстве.

1604–1605 гг. – паход Ілжэдзмітрыя I на Маскву. Каранаванне яго на расійскага цара пасля смерці Барыса Гадунова.

17 траўня 1606 г. – дзяржаўны пераварот у Маскве, звяржэнне і забойства Ілжэдзмітрыя I.

1606–1610 гг. – цараванне Васілія Шуйскага.

1606–1607 гг. – паўстанне пад кіраўніцтвам Івана Балотнікава.

1607–1610 гг. – ваенныя дзеянні з боку атрадаў Ілжэдзмітрыя II.

1609–1618 гг. – ваенныя дзеянні атрадаў Швецыі і Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Расійскай дзяржавы.

1610–1612 гг. – ваенныя дзеянні войскаў Уладзіслава Вазы на Смаленшчыне і ў Маскве.

27 жніўня 1610 г. – прыняцце прысягі каралевічам Уладзіславам у якасці расійскага цара.

Сакавік 1611 г. – выступленне Першага апалчэння пад камандай Пракопія Ляпунова.

24 чэрвеня 1612 гг. – разгром расійскіх войскаў атрадамі Рэчы Паспалітай у бітве пад Клушынам.

Красавік-кастрычнік 1612 г. – ваенныя дзеянні Другога апалчэння на чале з Кузьмой Мініным і Дзмітрыем Пажарскім. Вызваленне Масквы ад войскаў Уладзіслава Вазы.

1613–1645 гг. – цараванне Міхаіла Фёдаравіча Раманава.

1632–1634 гг. – вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (Смаленская вайна).

1637 г. – захоп турэцкай крэпасці Азоў данскімі і запарожскімі казакамі.

1645–1676 гг. – цараванне Аляксея Міхайлавіча.

1649 г. – прыняцце Сабornага Улажэння; канчатковае запрыгоньванне расійскіх сялян.

1652–1666 гг. – знаходжанне Нікана на пасадзе маскоўскага праваслаўнага патрыярха; рэфармаванне царквы.

8 студзеня 1654 г. – паводле рашэння ўкраінскай казацкай рады ў Пераяславе Левабярэжная Украіна часова пераходзіць у расійскае падданства.

1654–1667 гг. – вайна Расійскага царства з Рэччу Паспалітай за Беларусь, якая завяршылася Андрусаўскім замірэннем (10 студзеня 1667 г.) тэрмінам на 13 з паловай гадоў.

1662 г. – народнае паўстанне («медны бунт») у Маскве.

1670–1671 гг. – сялянска-казацкая вайна пад кіраўніцвам Сцяпана Разіна.

1672–1681 гг. – расійска-турэцкая вайна.

1676–1682 гг. – цараванне Фёдара Аляксеевіча.

1682–1696 гг. – супольнае цараванне Івана V Аляксеевіча і Пятра I Аляксеевіча пры рэгенцтве царэўны Соф'і Аляксееўны (да 1689 г.).

1696–1725 гг. – аднаасобнае цараванне Пятра I (з 1721 г. абвясціў сябе ўсерасійскім імператарам).

1697–1698 гг. – знаходжанне Пятра I у Заходняй Еўропе.

1700–1721 гг. – Паўночная вайна паміж Паўночным саюзам (Расія, Данія, Саксонія, Рэч Паспалітая) і Швецыяй.

1703 г. – заснаванне Пятром I горада Санкт-Пецярбурга як новай сталіцы Расійскай дзяржавы.

1721 г. – далучэнне (паводле Ніштацкай мірнай дамовы) Эстляндыі, Ліфляндыі, Інгерманландыі і часткі Карэліі да Расіі.

27 чэрвеня 1709 г. – перамога войска на чале з Пятром I у бітве з арміяй шведскага караля Карла XII пад Палтавай (Украіна).

24 студзеня 1722 г. – указ Пятра I аб стварэнні «Табеля аб рангах».

1725 г. – заснаванне Пецярбургскай Акадэміі навук.

1725–1727 гг. – уладаранне імператрыцы Кацярыны I.

1727–1730 гг. – уладаранне імператара Пятра II.

1730–1740 гг. – уладаранне імператрыцы Ганны Іванаўны; «біронаўшчына».

1730-я – 1740-я гг. – далучэнне да Расійскай імперыі Малога і Сярэдняга жузаў Казахстана.

17 кастрычніка 1740 – 25 лі стапада 1741 г. – рэгенцтва Эрнста Ёгана Бірона (да 7 лістапада 1740 г.) і Ганны Леапольдаўны пры малалетнім цару Іване Антонавічу.

25 лістапада 1741 г. – прыход да ўлады ў выніку дзяржаўнага перавароту Лізаветы Пятроўны (імператрыца ўсерасійская да 1761 г.).

1755 г. – заснаванне імператарскага ўніверсітэта ў Маскве.

1756–1762 гг. – удзел Расіі ў Сямігадовай вайне на б аку Аўстрыі, Францыі, Саксоніі супраць Прусіі, Вялікабрытаніі і шэрагу нямецкіх герцагстваў.

1756 г. – заснаванне Імператарскага тэатра ў Пецярбургу.

1761–1762 гг. – уладаранне імператара Пятра III. Пачатак знаходжання дынастыі Гальштэйн-Готарф-Раманавых на расійскім троне.

18 лютага 1762 г. – абвяшчэнне імператарскага Маніфеста аб вольнасці дваранства.

22 верасня 1762 г. – прыход да ўлады ў выніку дзяржаўнага перавароту Кацярыны II (імператрыца ўсерасійская да 1796 г.).

1764 г. – ліквідацыя Кацярынай украінскага гетманства і стварэнне Маларасійскага генерал-губернатарства.

1767 г. – уведзена забарона сялянам падаваць скаргі на памешчыкаў.

1767–1768 гг. – праца створанай Кацярынай «Камісіі па Улажэннях».

1768–1774 гг. – расійска-турэцкая вайна. Пашырэнне тэрыторыі Расіі за кошт земляў паўночных узбярэжжаў Чорнага і Каспійскага мораў, а таксама прычарнаморскіх стэпаў.

1771 г. – поўнае далучэнне Калмыцкага ханства да Расіі.

1772–1795 гг. – актыўны ўдзел Расійскай імперыі ў трох падзелах Рэчы Паспалітай і пашырэнне імперскай тэрыторыі на захад.

1773–1775 гг. – сялянска-казацкая вайна на чале з Емяльянам Пугачовым.

1775 г. – адміністрацыйная рэформа Кацярыны II. Ліквідацыя Запарожскай Сечы.

1783 г. – ліквідацыя Крымскага ханства і далучэнне Крыма да Расійскай імперыі.

1785 г. – прынятыя Жалаваныя граматы дваранству і гарадам.

1786 г. – зацверджаны Статут народных вучэльняў.

1787–1791 гг. – расійска-турэцкая вайна. Адсоўванне мяжы паміж імперыямі да Днястра.

1788–1790 гг. – расійска-шведская вайна.

Сакавік-лістапад 1794 г. – паўстанне ў Рэчы Паспалітай пад камандай Тадэвуша Касцюшкі. Задушэнне паўстання войскамі Аляксандра Суворава. Разня ў варшаўскай Празе.

1796–1801 гг. – уладаранне імператара Паўла I.

1799 г. – італьянскі і швейцарскі паходы расійскіх экспедыцыйных сіл пад камандай Аляксандра Суворава.

12 сакавіка 1801 г. – прыход да ўлады ў выніку дзяржаўнага перавароту Аляксандра I (імператар усерасійскі да 1825 г.).

1801 г. – з'яўленне першага ў гісторыі праекта расійскай канстытуцыі.

1801 г. – далучэнне да Расіі Усходняй Грузіі, Картлі і Кахецііі.

1801 г. – указ аб дазволе недваранам купляць ненаселеныя землі.

1802 г. – утварэнне васьмі міністэрстваў: унутраных спраў, замежных спраў, ваеннага, ваенна-марскога, юстыцыі, камерцыі, фінансаў, народнай асветы.

1803 г. – указ «Аб вольных хлебаробах» аб наданні памешчыкам права адпускаць прыгонных на волю з зямлёй за выкуп.

1803 г. – першае расійскае кругасветнае падарожжа пад камандай Ёгана (Івана) Крузенштэрна.

1804 г. – зацвярджэнне першага ўніверсітэцкага статута.

1805 г. – удзел Расіі ў трэцяй і чацвёртай антыфранцузскіх кааліцыях.

1805 г. – паражэнне расійска-аўстрыйскіх войскаў у бітве з Напалеонам пад Аўстэрліцам.

1807 г. – Тыльзіцкі мір з Францыяй.

1808 г. – расійска-шведская вайна.

1809 г. – план дзяржаўных пераўтварэнняў Міхаіла Спяранскага.

1809 г. – Фрыдрыхсгамскі мір са Швецыяй; далучэнне Фінляндыі і Аланскіх выспаў да Расіі.

1810 г. – стварэнне імператарам Дзяржаўнага савета.

1812 г. – высылка ініцыятара расійскіх рэформаў Міхаіла Спяранскага ў Сібір.

1812 г. – Бухарэсцкая мірная дамова з Турцыяй; далучэнне Бесарабіі да Расіі.

1812 г. – пераход войскаў Напалеона цераз Нёман; пачатак Айчыннай вайны Расіі (скончылася ў 1813 г.).

26 жніўня 1812 г. – Барадзінская бітва.

1813–1814 гг. – замежныя паходы расійскай арміі.

18–19 сакавіка 1814 г. – уступленне аўстрыйскіх, вюртэмбергскіх, прускіх і расійскіх войскаў у Парыж; адхіленне Напалеона ад улады.

Кастрычнік 1815 г. – стварэнне манархамі Аўстрыі, Прусіі і Расіі кансерватыўнага Свяшчэннага саюза (канчаткова распаўся падчас Крымскай вайны).

Канец 1810-х – пачатак 1820-х гг. – стварэнне ў Расійскай імперыі шэрагу таемных антыцарскіх таварыстваў.

1825 г. – выступленне дзекабрыстаў на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу.

1825–1855 гг. – уладаранне імператара Мікалая І.

1826–1828 гг. – расійска-персідская вайна; далучэнне Нахічэвані і Эрэвана да Расіі.

1827 г. – выдадзена распараджэнне аб прыёме дзяцей сялян толькі ў пачатковыя школы; канчаткова ўстаноўлена рыса аселасці для габрэяў імперыі.

1828 г. – павятовыя вучэльні аддзеленыя ад гімназій, вучыцца ў якіх атрымалі магчымасць толькі дзеці дваран і чыноўнікаў.

1828–1829 гг. – расійска-турэцкая вайна; Расія атрымала большую частку ўсходняга берага Чорнага мора і дэльту Дуная.

Лістапад 1830 – кастрычнік 1831 гг.– антырасійскае паўстанне ў Польшчы і былым ВКЛ. Задушана царскімі войскамі пад камандай фельдмаршала Івана Паскевіча.

1832 г. – абнародавана прапанова міністра народнай асветы Сяргея Уварава пакласці ў аснову ўсёй унутранай палітыкі ўрада лозунг «Самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць!»; узнікненне тэорыі афіцыйнай народнасці.

1833 г. – публікацыя Поўнага збору законаў Расійскай імперыі і Збору законаў Расійскай імперыі.

1835 г. – першае скарачэнне аўтаноміі расійскіх універсітэтаў.

1837–1841 гг. – рэформа Пятра Кісялёва ў справе кіравання дзяржаўнымі сялянамі.

1849 г. – удзел Расіі ў задушэнні венгерскай рэвалюцыі.

1851 г. – увод у эксплуатацыю чыгункі Санкт-Пецярбург – Масква.

1853–1856 гг. – Крымская вайна; паражэнне Расійскай імперыі.

1855–1881 гг. – уладаранне імператара Аляксандра ІІ.

1857 г. – створаны сакрэтны камітэт па справах памешчыцкіх сялян.

1858 г. – падпісаны ўказ, які даваў асабістую свабоду ўдзельным сялянам.

1860 г. – прапанаваны праект «Палажэння аб сялянах».

19 лютага 1861 г. – абнародаваны імператарскі маніфест аб скасаванні прыгоннага права.

Лістапад 1830 – кастрычнік 1831 гг.– антырасійскае паўстанне ў Польшчы і былым ВКЛ. Задушана царскімі войскамі пад камандай фельдмаршала Івана Паскевіча.

1863 г. – прыняцце новага ўніверсітэцкага статута, пашырэнне аўтаноміі ўніверсітэтаў.

1864 г. – земская рэформа: падпісана «Палажэнне аб губернскіх і павятовых земскіх установах».

1864 г. – стварэнне бессаслоўных, галосных і незалежных судоў; увядзенне суда прысяжных.

Кастрычнік 1864 г. – канчатковае задушэнне паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве расійскімі вайсковымі і паліцэйскімі сіламі.

19 лістапада 1864 г. – прыняты гімназічны статут, пачатак стварэння класічных і рэальных гімназій.

1865 г. – прынятыя «Часовыя правілы для друку», скасавана папярэдняя цэнзура для кніг і прэсы.

1865 г. – узяцце Ташкента войскамі пад камандай Міхаіла Чарняева.

4 красавіка 1866 г. – няўдалы замах Дзмітрыя Каракозава на Аляксандра II.

1867 г. – продаж Расіяй Аляскі Паўночна-Амерыканскім Злучаным Штатам; далучэнне вялікай часткі Цэнтральнай Азіі да Расіі і стварэнне Туркестанскага генерал-губернатарства Расійскай імперыі.

1870 г. – стварэнне Таварыства перасоўных майстэрняў расійскіх мастакоў-рэалістаў.

1871 г. – Лонданская канферэнцыя; адмена артыкулаў Парыжскай дамовы аб нейтралізацыі Чорнага мора.

1873 г. – хівінскі паход расійскіх войскаў, ператварэнне Хівінскага ханства ў васала Расійскай імперыі.

1873 г. – стварэнне Саюза трох імператараў (Расіі, Аўстрыі і Прусіі) супраць Асманскай імперыі.

1874 г. – увядзенне ўсесаслоўнай вайсковай павіннасці, скасаванне рэкрутчыны.

1874 г. – «Паход у народ» сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

1875 г. – Пецярбургская дамова паміж Расіяй і Японіяй; прызнанне апошняй вострава Сахаліна выключна расійскім валоданнем.

1876 г. – дзейнасць народніцкай арганізацыі «Зямля і воля» дзеля прапаганды ідэй расійскага абшчыннага сацыялізму.

1877 г. – пачатак расійска-турэцкай вайны; узяцце турэцкай Плеўны расійскімі войскамі пад камандаваннем генерала Міхаіла Скобелева. Вайна скончылася мірнай дамовай у 1878 г.

1879 г. – тэрарыстычная дзейнасць арганізацыі «Народная воля»: «паляванне на цара».

1880 г. – выбух у Зімовым палацы, арганізаваны нарадавольцам Сцяпанам Халтурыным.

1881 г. – забойства Аляксандра II нарадавольцам Ігнатам Грынявіцкім.

1855–1894 гг. – уладаранне імператара Аляксандра III.

29 красавіка 1881 г. – абвяшчэнне царскага Маніфеста аб непахіснасці самадзяржаўя.

1881 г. – указ аб пераводзе сялян на абавязковы выкуп у інтарэсах памешчыкаў.

1883 г. – стварэнне Сялянскага банка, праз які сялянам пачынаюць выдавацца крэдыты для набыцця зямлі.

1883 г. – стварэнне ў Жэневе групы «Вызваленне працы»; пачатак расійскай сацыял-дэмакратыі.

1884 г. – увядзенне новага ўніверсітэцкага статута, ліквідацыя ўніверсітэцкай аўтаноміі ў Расіі.

1885 г. – завяршэнне далучэння Цэнтральнай Азіі да Расіі.

1885 г. – Марозаўскі страйк з вылучэннем працоўнымі эканамічных патрабаванняў.

6 чэрвеня 1887 г. – заключана расійска-германская «дамова перастрахоўкі» – пацверджанне існавання саюза трох імператараў.

1890 г. – земская контррэформа, праз якую быў узмоцнены кантроль імператарскай улады над мясцовым самакіраваннем.

1890 г. – пачатак значнага эканамічнага ўздыму Расіі.

1891 г. – пачатак будаўніцтва Транссібірскай магістралі з мэтай падтрымання адзінства імперскай прасторы Расіі.

1894–1917 гг. – уладаранне імператара Мікалая II.

1895 г. – увядзенне дзяржаўнай манаполіі на продаж гарэлкі.

Лістапад 1895 г. – стварэнне пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» на чале з Уладзімірам Ульянавым.

18 траўня 1896 г. – «Хадынская катастрофа» падчас каранацыі Мікалая II.

1897 г. –грашовая рэформа Сяргея Вітэ; увядзенне залатога стандарту рубля.

1897 г. – арганізаваны першы ўсерасійскі перапіс насельніцтва.

1–3 сакавіка 1898 г. – першы з’езд РСДРП у Мінску.

1899 г. – пачатак эканамічнага крызісу, які нанёс сур’ёзны ўдар па эканоміцы Расіі.

1900–1902 гг. – першая расійская палярная экспедыцыя на чале з баронам Эдуардам Толем.

Сакавік 1901 г.– студэнцкія і рабочыя бунты ў буйных гарадах Расіі; у некаторых з іх уведзена ваеннае становішча.

1902 г. – стварэнне партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).

1904–1905 гг. – расійска-японская вайна.

9 студзеня 1905 г. – «Крывавая нядзеля»: пачатак першай рускай рэвалюцыі.

Красавік 1905 г.– узнікненне чарнасоценных Рускай манархічнай партыі і «Саюза рускага народа».

12 траўня–1 чэрвеня 1905 г. – усеагульны страйк у Іванава-Васкрасенску; стварэнне першага савета рабочых дэпутатаў.

14–15 траўня 1905 г. – паражэнне расійскага флоту ў Цусімскай бітве.

14–24 чэрвеня 1905 г. – паўстанне маракоў на браняносцы «Пацёмкін».
23 жніўня 1905 г. – Портсмуцкая мірная дамова з Японіяй.
7 кастрычніка 1905 г. – пачатак Усерасійскага палітычнага страйку.
12–18 кастрычніка 1905 г. – устаноўчы з'езд канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (кадэтаў).
13 кастрычніка 1905 г. – стварэнне Пецярбургскага Савета рабочых дэпутатаў на чале з Львом Троцкім.
17 кастрычніка 1905 г. – маніфест Мікалая II «Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку».
Лістапад 1905 г. – Утварэнне «Саюза 17 кастрычніка» (партыі акцябрыстаў).
9–19 снежня 1905 г. – Маскоўскае ўзброенае паўстанне.
27 красавіка – 8 ліпеня 1906 г. – пасяджэнні I Дзяржаўнай думы.
9 лістапада 1906 г. – пачатак аграрнай рэформы Пятра Сталыпіна.
20 лютага–2 чэрвеня 1907 г. – праца II Дзяржаўнай думы.
1 лістапада 1907 г. – 9 ліпеня 1912 г. – дзейнасць III Дзяржаўнай думы.
1908 г. – стварэнне чарнасоценнага «Саюза Міхаіла Архангела».
15 лістапада 1912 г. – 25 лютага 1917 г. – праца IV Дзяржаўнай думы.
19 ліпеня 1914 г. – аб'яўленне Германіяй вайны Расіі. Пачатак Першай сусветнай вайны (скончылася ў лістападзе 1918 г.).
Жнівень 1914 г. – сталіца Расійскай імперыі атрымоўвае новую назву – Петраград.
7–14 верасня 1914 г. – першая Мазурская бітва; паражэнне расійскіх войскаў і іх адступленне з Усходняй Прусіі.
2 студзеня – 12 красавіка 1915 г. – наступ расійскіх войскаў у Карпатах.
7–22 лютага 1915 г. – другая Мазурская бітва; наступ германскіх войскаў.
Лета 1915 г. – аўстрыйска-германскія наступальныя аперацыі ў Заходняй Украіне і Польшчы; войскі Цэнтральных дзяржаў займаюць Перамышль, Львоў, Варшаву.
Верасень-кастрычнік 1915 г. – наступ германскіх войскаў на т эрыторыю Беларусі і Літвы; заняцце Вільні; стабілізацыя сітуацыі на беларуска-літоўскім участку фронту.
Люты – красавік 1916 г. – наступ расійскіх войскаў у Турцыі і ва Усходняй Арменіі.
22 траўня–31 ліпеня 1916 г. – брусілаўскі прарыў на аўстра-венгерскім фронце.
17 снежня 1916 г. – забойства Рыгора Распуціна ў Пецярбургу.

27 лютага 1917 г. – Лютаўская рэвалюцыя; звяржэнне самадзяржаўя ў Расіі.

2–3 сакавіка 1917 г. – дэкларацыя аб утварэнні Часовага ўрада на чале з князем Георгіем Львовым.

9–24 чэрвеня 1917 г. – I Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Ліпень 1917 г. – антыўрадавыя выступленні ў Петраградзе з актыўным удзелам бальшавікоў.

12–15 жніўня 1917 г. – Дзяржаўная нарада ў Маскве.

25 жніўня–1 верасня 1917 г. – карнілаўскі мяцеж.

14–22 верасня 1917 г. – Усерасійская дэмакратычная нарада ў Петраградзе.

12 кастрычніка 1917 г. – утварэнне петраградскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) на чале з Львом Троцкім.

24–25 кастрычніка 1917 г. – узброены бальшавіцкі пераварот і звяржэнне Часовага ўрада.

25 кастрычніка 1917 г. – адкрыццё II Усерасійскага з'езда Саветаў; утварэнне першага бальшавіцкага ўрада (Савета народных камісараў – СНК) на чале з Уладзімірам Леніным.

26 кастрычніка 1917 г. – прынятыя дэкрэты саветаў аб міры, аб зямлі і Дэкларацыя правоў народаў Расіі.

7 лістапада 1917 г. – абвяшчэнне ў Кіеве Украінскай Народнай Рэспублікі.

12 лістапада 1917 г. – выбары ў Устаноўчы сход.

7 снежня 1917 г. – прынята рашэнне бальшавіцкага ўрада аб стварэнні Усерасійскай надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй (ВЧК).

14 снежня 1917 г. – прыняты дэкрэт Усерасійскага Цэнтральнага выканаўчага камітэта (УЦВК) аб нацыяналізацыі банкаў.

18 снежня 1917 г. – абвешчана незалежнасць Фінляндыі.

1918–1922 гг. – грамадзянская вайна на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. Час чырвонага і белага тэрору.

Першая палова 1918 г. – стварэнне бальшавікамі Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

6 студзеня 1918 г. – разгон бальшавікамі Устаноўчага сходу.

28 студзеня 1918 г. – абвяшчэнне ў Екацярынадары (сёння Краснадар) незалежнасці Кубанскай Народнай Рэспублікі.

3 лютага 1918 г. – абвяшчэнне ў Вільні незалежнасці Літоўскай дзяржавы.

Сакавік 1918 г. – перанос бальшавікамі расійскай сталіцы з Петраграда ў Маскву; пераход краіны на грыгарыянскі каляндар; рэформа правапісу велікарускай мовы.

3 сакавіка (паводле грыгарыянскага календара) 1918 г. – заключэнне Брэсцкага міру.

25 сакавіка 1918 г. – абвяшчэнне ў Мінску незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

25 траўня 1918 г. – пачатак паўстання Чэхаславацкага корпуса ў Расіі.

6 ліпеня 1918 г. – леваэсэраўскае выступленне супраць ленінскага ўрада ў Маскве.

10 ліпеня 1918 г. – прыняцце першай Канстытуцыі РСФСР.

Лета 1918 г. – стварэнне першых савецкіх канцэнтрацыйных лагераў.

16 студзеня 1920 г. – зняцце блакады Савецкай Расіі з боку Антанты.

1920 г. – савецка-польская вайна; паражэнне Чырвонай арміі.

28 лютага – 18 сакавіка 1921 г. – кранштацкае антыбальшавіцкае паўстанне.

8–16 сакавіка 1921 г. – X з'езд бальшавіцкай партыі, на якім прынята рашэнне аб новай эканамічнай палітыцы (НЭП).

18 сакавіка 1921 г. – Рыжская мірная дамова РСФСР з Польшчай.

3 красавіка 1922 г. – Іосіф Джугашвілі (Сталін) абраны генеральным сакратаром бальшавіцкай партыі.

10 красавіка – 19 траўня 1922 г. – міжнародная Генуэзская канферэнцыя з удзелам сСавецкай Расіі.

16 красавіка 1922 г. – у горадзе Рапала заключана сепаратная мірная дамова РСФСР з Германіяй.

1921–1922 гг. – масавы голад у расійскім Паволжы, ахвярамі якога сталі да 5 млн чалавек.

8 чэрвеня 1922 г. – створаны Галоўліт, орган татальнай бальшавіцкай цэнзуры.

Снежань 1922 г. – стварэнне Савецкага Саюза (СССР).

30 снежня 1922 г. – першы з'езд Саветаў СССР.

1922 – пачатак 1940-х гг. – антырэлігійны тэрор у СССР: рэпрэсіі супраць святароў розных канфесій; масавае гвалтоўнае закрыццё храмаў, канфіскацыя царкоўнай маёмасці.

1923–1929 гг. – пад кіраўніцтвам ВЧК/ОГПУ функцыянуюць Паўноч-

ныя лагеры спецыяльнага прызначэння (СЛОН), у якіх актыўна выкарыстоўваецца і праца палітычных зняволеных.

26 студзеня 1924 г. – пасля смерці бальшавіцкага правадыра Леніна горад Петраград перайменаваны ў Ленінград.

31 студзеня 1924 г. – зацверджана першая Канстытуцыя СССР.

Красавік 1926 г. – фарміраванне ўнутры бальшавіцкай партыі апазіцыі на чале з Львом Троцкім і Георгіем Зіноўевым.

Кастрычнік 1928 г. – снежань 1932 г. – першая пяцігодка і пачатак індустрыялізацыі ў СССР.

Студзень 1929 г. – Леў Троцкі высланы за межы Савецкага Саюза.

1929 г. – пачатак суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

1931 – верасень 1944 г. – дэпартацыі фінаў-інгерманландцаў у Архангельскую вобласць і на іншыя тэрыторыі СССР.

1 кастрычніка 1930 г. – пераўтварэнне раней створанага ўпраўлення папраўча-працоўных лагераў ОГПУ ў Галоўнае ўпраўленне лагераў (ГУЛАГ), якое праіснавала да 1956 г.

1931–1934 гг. – стварэнне ў СССР цэнтралізаваных, падкантрольных уладзе творчых саюзаў пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў, кампазітараў, для якіх аб авязковым з’яўлялася прызнанне дактрыны сацы яліст ычнага рэалізму.

1932–1933 гг. – масавы голад у Расіі і залежных ад яе краінах (Украіна, Казахстан, Беларусь), ахвярамі якога сталі да 10 млн чалавек.

1933–1937 гг. – другі пяцігадовы план у СССР.

1 снежня 1934 г. – забойства бальшавіцкага кіраўніка Ленінграда Сяргея Кірава. Разгортванне масавага тэрору ў СССР.

5 снежня 1936 г. – прыняцце другой Канстытуцыі СССР.

1936–1938 гг. – фізічна вынішчаны амаль усе даўнейшыя лідары бальшавіцкай партыі (Леў Каменеў, Георгій Зіноўеў, Мікалай Бухарын, Аляксей Рыкаў, Рыгор Сакольнікаў, Аляксандр Шляпнікаў, Георгій Ломаў-Апокаў, Міхаіл Томскі), а таксама шэраг вядомых армейскіх камандзіраў (Міхаіл Тухачэўскі, Васілій Блюхер, Аляксандр Ягораў, Іона Якір, Еранім Убарэвіч, Юкумс Вацэціс, Павел Дыбенка).

1937 г. – пік масавага тэрору бальшавіцкай улады супраць грамадзян СССР.

1938–1939 гг. – узброеныя канфлікты СССР з Японіяй у Маньчжурыі і Манголіі.

23 жніўня 1939 г. – у Маскве падпісаны савецка-германскі пакт аб ненападзе (пакт Молатава-Рыбентропа) і сакрэтны пратакол да яе.

1 верасня 1939 г. – напад Германіі на Польшчу; пачатак Другой сусветнай вайны.

17 верасня 1939 г. – уваход савецкіх войскаў на ўсходнія тэрыторыі Польскай Рэспублікі (Заходнюю Беларусь і Украіну).

28 верасня 1939 г. – падпісаныя савецка-германская дамова «аб дружбе і межах» і два сакрэтныя пратаколы да яе.

30 лістапада 1939 г. – 12 сакавіка 1940 г. – савецка-фінская вайна; далейшае пашырэнне савецкай тэрыторыі.

Сакавік-красавік 1940 г. – масавыя расстрэлы інтэрнаваных афіцэраў арміі Польскай Рэспублікі ў Катыні і іншых месцах на тэрыторыі СССР.

28 чэрвеня 1940 г. – увядзенне савецкіх войскаў у Бесарабію.

Чэрвень-ліпень 1940 г. – пачатак савецкай акупацыі Латвіі, Літвы і Эстоніі.

21 жніўня 1940 г. – у Мексіцы ў выніку замаху, арганізаванага НКВД, памірае Леў Троцкі.

22 чэрвеня 1941 г. – напад нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў на Савецкі Саюз; у СССР абвешчана пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

Чэрвень-верасень 1941 г. – армія Гітлера і яго хаўруснікаў акупуе вялікую частку еўрапейскай тэрыторыі СССР і выходзіць на подступы да Масквы.

Жнівень 1941 г. – пачатак масавай дэпартацыі немцаў Паволжа ў аддаленыя рэгіёны СССР.

8 верасня 1941 г. – 27 студзеня 1944 г. – блакада горада Ленінграда сіламі германскага вермахта і арміі Фінляндыі.

30 верасня 1941 г. – 20 красавіка 1942 г. – бітва за Маскву, у выніку якой ліквідуецца непасрэдная пагроза захопу нямецкімі войскамі расійскай сталіцы.

13 кастрычніка 1941 г. – падпісана савецка-японская дамова аб нейтралітэце.

17 ліпеня 1942 г. – 2 лютага 1943 г. – Сталінградская бітва, якая завяршаецца перамогай Чырвонай арміі; карэнны пералом у вайне на савецка-германскім фронце.

Кастрычнік 1943 г. – ліпень 1944 г. – масавая дэпартацыя народаў Паўночнага Каўказа і Крыма (калмыкі, карачаеўцы, чачэнцы, інгушы,

балкарцы, крымскія татары, туркі-месхецінцы) на ўсходнія тэрыторыі СССР.

5 ліпеня – 23 жніўня 1943 г. – бітва пад Курскам.

4–11 лютага 1945 г. – у Ялце (Крым) праходзіць канферэнцыя кіраўнікоў Вялікабрытаніі, ЗША і СССР аб пасляваенным уладкаванні свету; яе вынікі замацаваныя ў рашэннях Патсдамскай канферэнцыі (17 ліпеня – 2 жніўня 1945 г.).

8 (9 паводле маскоўскага часу) траўня 1945 г. – падпісанне акта аб безумоўнай капітуляцыі Германіі.

2 верасня 1945 г. – падпісаны акт аб безумоўнай капітуляцыі Японіі; канец Другой сусветнай вайны.

1 кастрычніка 1945 г. – 20 лістапада 1946 г. – Нюрнбергскі працэс над галоўнымі германскімі ваеннымі злачынцамі.

1946–1950 гг. – чацвёртая пяцігодка ў СССР; аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі.

1946 г. – пачатак халоднай вайны Савецкага Саюза і заходніх краін.

Жнівень 1948 г. – пачатак кампаніі па барацьбе з марганізмам і касмапалітызмам.

1946–1947 гг. – масавы голад у Расіі (часткова таксама ва Украіне і Малдове), ахвярамі якога сталі больш за 1 млн чалавек.

5–8 студзеня 1949 г. – стварэнне ў Маскве Савета Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ).

29 жніўня 1949 г. – першае выпрабаванне атамнай бомбы ў СССР.

1952 г. – бальшавіцкая партыя атрымлівае новую назву – Камуністычная партыя Савецкага Саюза (КПСС).

Сакавік 1953 г. – смерць Сталіна; прыход да ўлады новага кіраўніцтва КПСС на чале з Мікітам Хрушчовым.

1954 г. – пачатак засваення цалінных земляў на Паўднёвым Урале, у Паволжы, Крыме, на Далёкім Усходзе і ў Казахскай ССР.

27 чэрвеня 1954 г. – пуск першай у свеце атамнай электрастанцыі ў Обнінску.

14 траўня 1955 г. – стварэнне ваеннай Арганізацыі Варшаўскай дамовы.

14–25 лютага 1956 г. – XX з’езд КПСС, падчас якога ўпершыню ў СССР абнародуюцца факты пра сталінскі тэрор.

30 чэрвеня 1956 г. – прынята антысталінская пастанова Цэнтральнага камітэта КПСС «Аб пераадоленні культу асобы і яго наступстваў».

Пачатак лістапада 1956 г. – задушэнне савецкімі войскамі пад камандай маршала Георгія Жукава антыкамуністычнага паўстання ў Венгрыі.

4 кастрычніка 1957 г. – у СССР здзейснены запуск першага ў свеце штучнага спадарожніка Зямлі.

Лістапад 1959 г. – стварэнне падкантрольнага ўладам Саюза журналістаў СССР.

12 красавіка 1961 г. – першы палёт чалавека ў космас, здзейснены Юрыем Гагарыным на касмічным караблі «Восток».

Верасень-лістапад 1962 г. – Карыбскі крызіс ва ўзаемаадносінах СССР і ЗША.

5 жніўня 1963 г. – у Маскве падпісана Дамова аб забароне ядзерных выпрабаванняў у атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой.

14 кастрычніка 1964 г. – Мікіта Хрушчоў адхілены ад пасад кіраўніка КПСС і савецкага ўрада. Новымі кіраўнікамі сталі адпаведна Леанід Брэжнеў і Аляксей Касыгін.

18 сакавіка 1965 г. – першы выхад чалавека ў адкрыты космас, здзейснены Аляксеем Лявонавым падчас палёту на касмічным караблі «Восход-2».

1965 г. – рэформа гаспадарчага механізму кіравання эканомікай у СССР (рэформа Яўсея Лібермана, касыгінская рэформа).

Восень 1965 г. – пачатак у Маскве судовага працэсу супраць літаратараў Андрэя Сіняўскага і Юлія Даніэля.

Лістапад 1965 г. – стварэнне падкантрольнага ўладам Саюза кінематаграфістаў СССР.

21 жніўня 1968 г. – інтэрвенцыя краін Варшаўскай дамовы ў Чэхаславакію.

1968 г. – акадэмік Андрэй Сахараў піша брашуру «Роздум аб прагрэсе, мірным суіснаванні і інтэлектуальнай свабодзе» з крытыкай палітыкі савецкага кіраўніцтва.

Сакавік – жнівень 1969 г. – узброеныя сутыкненні сіл Савецкай арміі і Кітайскай народна-рэвалюцыйнай арміі на межах СССР і Кітая.

24 лістапада 1969 г. – СССР далучыўся да міжнароднай Дамовы аб непашырэнні ядзернай зброі.

26 траўня 1972 г. – падпісанне ў Маскве «Асноў узаемаадносінаў паміж СССР і ЗША», а таксама пагадненняў аб абмежаванні супрацьракетнай абароны і стратэгічных узбраенняў; абвешчаны пачатак палітыкі разрадкі.

Люты 1974 г. – высылка з СССР Аляксандра Салжаніцына, аўтара антысталінскіх літаратурных твораў.

15–21 ліпеня 1975 г. – сумесны савецка-амерыканскі касмічны палёт па праграме «Саюз-Апалон».

30 ліпеня – 1 жніўня 1975 г. – Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (Хельсінкі); падпісанне Заключнага акта 33 краінамі Еўропы, ЗША і Канадай (ад імя СССР свой подпіс паставіў Леанід Брэжнеў).

12 траўня 1976 г. – абвешчана аб стварэнні Маскоўскай Хельсінкскай групы, у якую ўвайшлі праваабаронцы Юрый Арлоў, Алена Бонэр, Людміла Аляксеева, Аляксандр Гінзбург, Пётр Грыгарэнка ды іншыя.

7 кастрычніка 1977 г. – прыняцце канстытуцыі «развітога сацыялізму» ў СССР.

18 чэрвеня 1979 г. – падпісанне ў Вене кіраўнікамі СССР і ЗША другога пагаднення аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў (выконвалася дэ-факта).

24 снежня 1979 г. – пачатак інтэрвенцыі савецкіх войскаў у Афганістане.

Студзень 1980 г. – высылка акадэміка Сахарава ў Горкі (Ніжні Ноўгарад).

19 ліпеня – 3 жніўня 1980 г. – XXII летнія Алімпійскія гульні ў Маскве, Таліне, Ленінградзе, Кіеве і Мінску.

24 траўня 1982 г. – прыняцце ў СССР Харчовай праграмы, якая так і не была выканана.

Лістапад 1982 г. – сакавік 1985 г. – на чале савецкай кампартыі стаяць цяжкахворыя генсекі Юрый Андропаў (да лютага 1984 г.) і Канстанцін Чарненка.

11 сакавіка 1985 г. – кіраўніком КПСС абіраецца Міхаіл Гарбачоў; пачатак палітыкі галоснасці, эканамічнага паскарэння.

19–21 лістапада 1985 г. – сустрэча Міхаіла Гарбачова і прэзідэнта ЗША Роналда Рэйгана ў Жэневе; аднаўленне савецка-амерыканскага палітычнага дыялогу.

26 красавіка 1986 г. – катастрофа на Чарнобыльскай АЭС (Паўночная Украіна); замоўчванне яе наступстваў савецкім партыйным кіраўніцтвам.

Чэрвень-ліпень 1987 г. – пачатак палітыкі перабудовы ў СССР.

9 красавіка 1989 г. – брутальны разгон савецкімі вайсковымі часткамі мірнай дэманстрацыі ў Тбілісі.

25 траўня – 9 чэрвеня 1989 г. – у Маскве адбываецца першы з’езд народ-

ных дэпутатаў СССР, абраных на аснове змяненняў у Канстытуцыі СССР.

11 сакавіка 1990 г. – прыняцце новаабраным Вярхоўным Саветам Літвы акта аднаўлення незалежнасці Літоўскай рэспублікі.

1 траўня–12 чэрвеня 1990 г. – адбываецца першы з'езд усенароднаабраных дэпутатаў РСФСР; прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Расіі.

Студзень 1991 г. – увядзенне савецкіх войскаў у Вільню; спроба дзяржаўнага перавароту ў Літве.

17 сакавіка 1991 г. – з парушэннем законаў у частцы рэспублік Савецкага Саюза праводзіцца рэферэндум аб захаванні савецкай імперыі.

12 чэрвеня 1991 г.– абранне Барыса Ельцына першым прэзідэнтам Расіі.

1 ліпеня 1991 г. – роспуск у Празе Арганізацыі Варшаўскай дамовы.

19–21 жніўня 1991 г.– няўдалая спроба дзяржаўнага перавароту ў СССР (путч ГКЧП); пачатак заключнага этапу распаду савецкай імперыі.

8–21 снежня 1991 г. – падпісанне ў Віскулях (Беларусь) і ў Алматы (Казахстан) кіраўнікамі Расіі, Украіны, Беларусі ды васьмі іншых рэспублік былога СССР дакументаў аб роспуску Савецкага Саюза і дамовы аб фарміраванні Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

25 снежня 1991 г. – Міхаіл Гарбачоў складае з сябе абавязкі прэзідэнта СССР.

2 студзеня 1992 г. – абвешчана лібералізацыя цэн у Расіі.

1 лютага 1992 г.– прымаецца дэкларацыя Расіі і ЗША аб спыненні халоднай вайны.

13 сакавіка 1992 г. – парафіраванне ў Маскве Федэральнай дамовы рэспублік у складзе Расійскай Федэрацыі.

25 красавіка 1993 г. – адбываецца ўсерасійскі рэферэндум аб даверы палітыцы прэзідэнта Расіі, на якім Бар ыс Ельцын атрымоўвае вотум даверу.

Чэрвень 1993 г. – працуе канстытуцыйная нарада па па дрыхтоўцы праекта новай Канстытуцыі Расіі.

21 верасня 1993 г. – падпісаны ўказ Барыса Ельцына «Аб паэтапнай канстытуцыйнай рэформе», у якім абвешчана аб роспуску Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі.

3–4 кастрычніка 1993 г. –дэманстрацыі і ўзброеныя выступленні пракамуністычнай апазіцыі ў Маскве; штурм будынка Вярхоўнага Са-

вета рэгулярнымі войскамі і АМАПам, пасля якога арыштоўваюць некаторых кіраўнікоў Вярхоўнага Савета.

12 снежня 1993 г. – першыя выбары ў Дзяржаўную Думу і Савет Федэрацыі; рэферэндум па зацвярджэнні новай Канстытуцыі Расіі.

11 снежня 1994 г. – пачатак узброенага канфлікту ў Чачні-Ічкерыі; паражэнне расійскіх войскаў пры спробе захапіць сталіцу рэспублікі горад Грозны.

Ліпень 1996 г. – выбары прэзідэнта Расійскай Федэрацыі: на другі тэрмін абраны Барыс Ельцын.

31 жніўня 1996 г. – падпісанне мірнага пагаднення паміж расійскім урадам і ўрадам Чачні-Ічкерыі ў Хасаўюрце.

Жнівень 1998 г. – тэхнічны дэфолт і імклівае абясцэньванне расійскага рубля.

Жнівень 1999 г. – прызначэнне Уладзіміра Пуціна кіраўніком расійскага ўрада.

1999 г. – шматразовыя выбухі жылых дамоў у розных гарадах Расіі.

25 снежня 1999 г. – у Маскве падпісана пагадненне аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, шэраг палажэнняў якога ўваходзяць у супярэчнасць з Канстытуцыямі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь.

31 снежня 1999 г. – абнародаваны ўказ аб добраахвотным спыненні выканання паўнамоцтваў прэзідэнта Расіі Барысам Ельцыным.

26 сакавіка 2000 г. – абранне Уладзіміра Пуціна новым прэзідэнтам Расіі.

13 траўня 2000 г. – выдадзены ўказ прэзідэнта Пуціна аб стварэнні ў Расіі 7 федэральных акругаў і зацвярджэнне Палажэння аб паўнамоцным прадстаўніку прэзідэнта Расіі ў федэральнай акрузе.

Жнівень 2000 г. – гібель у Баранцавым моры экіпажа (118 чал.) расійскай атамнай падводнай лодкі «Курск».

Кастрычнік 2002 г. – захоп тэрарыстамі мюзікла «Норд-Ост» у Маскве на Дуброўцы.

Сакавік 2004 г. – абранне Уладзіміра Пуціна прэзідэнтам Расіі на другі тэрмін.

Верасень 2004 г. – захоп тэрарыстамі школы ў Беслане (Паўночная Асеція).

2005 г. – першы «Рускі марш» экстрэмісцкіх шавіністычных сіл.

2006 г. – міжэтнічны канфлікт у горадзе Кандапозе (Карэлія).

Травень 2008 г. – прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі абраны Дзмітрый Мядзведзеў.

Жнівень 2008 г. – вайна Расіі з Грузіяй; усталяваны кантроль расійскіх войскаў над тэрыторыямі Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

2009 г. – крызіс прамысловай гаспадаркі ў Расіі; амаль поўнае спусташэнне Стабілізацыйнага фонду дзеля падтрымання крэдытаздольнасці банкаў.

11 снежня 2010 г. – сутыкненні футбольных заўзятараў з АМАПам на Манежнай плошчы ў Маскве.

2011 г. – забарона «Руху супраць нелегальнай іміграцыі» як фашысцкай арганізацыі.

Травень 2012 г. – прэзідэнтам Расіі на чарговы тэрмін абраны Уладзімір Пуцін; старшынёй урада зацверджаны Дзмітрый Мядзведзеў; масавыя акцыі пратэсту ў Маскве; прыняцце дакумента аб павышэнні канкурэнтаздольнасці расійскіх ВНУ («Праект 5–100»).

Чэрвень 2012 г. – аднаўленне выбараў кіраўнікоў рэгіёнаў у Расійскай Федэрацыі.

Ліпень 2012 г. – уступленне Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю (ВТО).

2013 г. – тэракты 21 кастрычніка, 29 і 30 снежня ў Валгаградзе; самая моцная за 115 гадоў паводка на Далёкім Усходзе (верасень-кастрычнік).

2014 г. – XXII зімовыя Алімпійскія гульні у расійскім Сочы (з 7 па 23 лютага); уключэнне ў выніку вайсковай аперацыі Рэспублікі Крым у склад Расіі, не прызнанае абсалютнай большасцю краін свету (сакавік); фактычная падтрымка Расіяй утварэння неканстытуцыйных структур ДНР і ЛНР на тэрыторыі Украіны.

2015 г. – уступленне ў сілу дамовы аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС); забойства аднаго з лідараў расійскай палітычнай апазіцыі Барыса Нямцова (люты); пачатак ваеннай аперацыі Расіі ў Сірыі (верасень); катастрофа самалёта А-321 над Сінайскім паўвостравам (кастрычнік); збіццё турэцкім самалётам расійскага Су-24 паблізу турэцка-сірыйскай мяжы (снежань).

2016 г. – пробны ракетны пуск з касмадрома «Усходні», першага постсавецкага грамадзянскага касмадрома Расіі (красавік); забойства амбасадара Расіі ў Турцыі Андрэя Карлава (снежань).

2017 г. – значны спад у расійскай эканоміцы; істотны рост коштаў на

прадукты харчавання і на тарыфы ЖКГ; пры гэтым сярэдняя заработная плата ў большасці рэгіёнаў застаецца на дакрызісным узроўні.

Травень 2017 г. – ураган у Маскве і Маскоўскай вобласці.

2018 г. – абранне 4-га прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна на другі тэрмін (сумарна – чацвёрты); пажар у гандлёва-забаўляльным цэнтры «Зімовая вішня» ў Кемераве (25–26 сакавіка); акцыі пратэсту супраць абвешчаных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў (5 траўня).

# АСНОЎНЫЯ КРЫНІЦЫ

Анисимов, Е. В. Иллюстрированная история России. С.-Петербург: Норинт, 2003. 208 с.

Анисимов, Е. История России от Рюрика до Путина. Люди. События. Факты. 4-е изд., доп. С.-Петербург [и др.]: Питер, 2018. 624 с.

Вологодско-Пермская летопись / предисл. Б. М. Клосса. Москва: Рукописные памятники Древней Руси, 2006. 432 с.

Всеобщая история России с древнейших времён до конца XVIII века / О. Яновский [и др.]. Москва: Наше Слово; ЭКСМО, 2008. 622 с.

Геллер, М. История Российской империи. В 3 т. Москва: МИК, 1997. Т. I – 448 с., т. II – 320 с., т. III – 304 с.

Грушевский, Мих. Иллюстрированная история Украины. С приложениями и дополнениями. Донецк: «ПКФ» «БАО», 2011. 768 с.

Густынская летопись / подг. Ю. В. Анхимюк [и др.]. С.-Петербург: Дмитрий Буланин, 2003. 202 с.

Дворниченко, А. Ю. [и др.]. Русская история с древнейших времен до наших дней. Изд. 4-е. С.-Петербург: Лань, 2004. 448 с.

Ипатьевская летопись. (Серия «Русские летописи», т. 11). Рязань: Александрия, 2001. 674 с.

История Отечества в терминах и понятиях. Словарь-справочник / сост. В. Блохин. Москва: Курсив; Смоленск: Русич, 1999. 527 с.

История России (IX – начало XXI в.) / под ред. А. Ю. Дворниченко и В. С. Измозика. 3-е изд., испр. и доп. Москва: Гардарики, 2007. 479 с.

История России и Украины (IX–XVIII вв.): учеб. пособие / под ред. О. А. Яновского. Минск: БГУ, 2012. 503 с.

История России и Украины (XIX – начало XX в.): в 2 ч. / под ред. В. В. Сергеенковой, О. А. Яновского, В. И. Меньковского. Ч. 2. Минск: БГУ, 2010. 535 с.

История России с древнейших времен до наших дней / А. Сахаров, В. Шестаков, Л. Морозова. Москва: АСТ, 2017. 1744 с.

Краткая художественная энциклопедия. Искусство стран и народов мира. Т. 3. Москва: Сов. Энцикл., 1971. С. 301–767.

Краткий курс истории России с древнейших времён до начала XXI в.: учеб. пособие / Р. А. Арсланов [и др.]; под ред. В. В. Керова. Москва: Астрель, 2013. 846 с.

Культурология. История культуры России / сост. А. И. Алексеев [и др.]. С.-Петербург: СЗЗТГУ, 2005. 220 с.

Лаврентьевская летопись. (Серия «Русские летописи», т. 12). Рязань: Александрия, 2001. 586 с.

Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. (Серия «Русские летописи», т. 10). Рязань: Александрия, 2001. 656 с.

Новгородские летописи. В 2 кн. (Серия «Русские летописи»). Рязань: Александрия. 2002. Кн.1: 308 с.; кн. 2: 292 с.

Платонов, С. Ф. Учебник русской истории. С.-Петербург: Наука, 1994. 429 с.

Повесть временных лет / подгот. текста, пер., ст. и коммент. Д. С. Лихачева; под ред. В. И. Адриановой-Перетц; [доп. М. Б. Свердлова]. 2-е изд., испр. и доп. С.-Петербург: Наука, 1996. 667 с.

Радзивилловская летопись / подг. М. С. Приселков. Москва: Наука, 1989. 177 с.

Словарь исторических терминов по дисциплине «Отечественная история» / сост. Р. Х. Хайретдинов. Уфа: УГНТУ, 2007. 41 с.

Соловьев, С. М. Чтения и рассказы по истории России. Москва: Правда, 1990. 768 с.

Трусаў, А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Выд. 2-е, папр. Мінск: Зміцер Колас, 2017. 356 с.

Фортунатов, В. В. История: учеб. пособие. Стандарт третьего поколения. Для бакалавров. С.-Петербург [и др.]: Питер, 2013. 464 с.

Хрестоматия по истории России с древнейших времен. В 4 т. / сост. И. В. Бабич [и др.]. Москва: Междунар. отношения, 1994–1995. Т. 1: 352 с. Т. 2 (ч. 1): 279 с.

Bazylow, L., Wieczorkiewicz, P. Historia Rosji. Wrocław: Ossolineum, 2006. 632 s.

Bezemer, J. W., Jansen, M. C. Een geschiedenis van Rusland: van Rurik tot Poetin. Amsterdam: Van Oorschot, 2008 (7e druk). 490 blz.

Christian, D. A History of Russia, Central Asia and Mongolia. [Hoboken, NJ:] Wiley-Blackwell. Vol. 1 – 1998, 498 p.; vol. 2 – 2018, 696 p.

Dějiny Ruska / M. Švankmajer, V. Veber, Z. Sládek, V. Moulis. Praha: Lidové noviny, 2017. 504 s.

Magocsi, P. R. A History of Ukraine. Toronto: University Press, 2010. 896 p.
Opeide, G. Russisk historie fra Rjurik til Gorbatsjov. Fakta og resonnement. Oslo: Solum, 2009. 231 s.
Riasanovsky, N., Steinberg, M. A History of Russia. Eighth Edition. Oxford Univ. Press, 2016. 816 p.
Strahl, Ph., Herrmann, E. Geschichte des russischen Staates. [Ravensburg:] Nabu Press (Taschenbuch), 2011. 500 S.
The Cambridge History of Russia. Cambridge University Press, 2006. Vol. 1 / ed. by Maureen Perrie, 777 (+xxii) p.; vol. 2 / ed. by Dominic Lieven, 765 (+xx) p.; vol. 3 / ed. by Ronald Grigor Suny, 842 (+xxii) p.

# ЗМЕСТ


1. Пачаткі расійскай гісторыі ............ 3

2. Кіеўская Русь і сучасная Расія ............ 11
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 27
   Літаратура да раздзела ............ 28

3. Наўгародская Русь ............ 30
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 52
   Літаратура да раздзела ............ 53

4. Маскоўскае княства і Залатая Арда ............ 54
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 90
   Літаратура да раздзела ............ 92

5. Этнічная гісторыя і традыцыйная культура неславянскіх народаў Наўгародскай, Маскоўскай і Паўднёвай Русі ............ 94
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 102
   Літаратура да раздзела ............ 103

6. Масковія-Расія ў XVI ст. ............ 105
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 126
   Літаратура да раздзела ............ 128

7. Смутны час у Маскоўскай дзяржаве. Маскоўскае царства ад пачатку ўладарання Раманавых і да канца XVII ст. ............ 129
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 174
   Літаратура да раздзела ............ 176

8. Расійская імперыя ў XVIII ст. ............ 177
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 210
   Літаратура да раздзела ............ 212

9. Расійская імперыя ў XIX – пачатку XX ст. ............ 214
   Асноўныя тэрміны і паняцці ............ 261
   Літаратура да раздзела ............ 265

10. Асаблівасці ўзнікнення і эвалюцыя Расійскай імперыі (падагульненне) ........ 267
Асноўныя тэрміны і паняцці ........ 303
Літаратура да раздзела ........ 304

11. Савецкая Расія і залежныя ад яе краіны (1917–1991) ........ 306
Асноўныя тэрміны і паняцці ........ 467
Літаратура да раздзела ........ 471

12. Постсавецкая Расія: эвалюцыя ад фарміравання асноў дэмакратычнага развіцця да спроб адраджэння імперыі ........ 474
Асноўныя тэрміны і паняцці ........ 498
Літаратура да раздзела ........ 500

13. Замест заключэння: куды ідзе Расія? ........ 502

Храналогія найважнейшых падзей у гісторыі Расіі ........ 507
Асноўныя крыніцы ........ 530

**Гісторыя** Расіі ад сярэднявечча да сучаснасці : нарысы / аўт.-склад. Алег
Г51 Трусаў, Лявон Баршчэўскі, Аляксей Хадыка. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2018. — 536 с. [іл.].
ISBN 978-985-23-0012-4.

Гісторыя Расіі нязменна выклікала цікавасць еўрапейскіх народаў, а найперш суседзяў. Гэтая кніга ўяўляе сабой спробу даць сінтэтычнае асэнсаванне расійскай гісторыі ад Сярэднявечча да нашых дзён, з беларускага гледзішча і на беларускай мове. У аснову кнігі пакладзены вынікі даследаванняў як расійскіх гісторыкаў і археолагаў, так і іх калег з розных краін Еўропы. Выданне забяспечана грунтоўнай бібліяграфіяй на 12 мовах свету. У кнізе таксама змешчана вялікая колькасць ілюстрацый, частка якіх ніколі не публікавалася.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца гісторыяй.

**УДК 94(47+57)**
**ББК 63.3(2)**

Навукова-папулярнае выданне

# ГІСТОРЫЯ РАСІІ
## ад Сярэднявечча да сучаснасці

*Нарысы*

Карэктар *Алена Трусава*
Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

Падпісана да друку 17.09.2018. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 27,88. Ум. друк. арк. 31,16.
Наклад 300 асобнікаў. Заказ № 46.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.









ISBN 978-985-23-0012-4
9 789852 300124



# ГІСТОРЫЯ РАСІІ